891.792-3
М 91

Р. МУРАШКА

# СЫН

РОМАН

*Выданьне другое, папраўленае*

974 С8
ПР 1938
1948 г.
ПЕРАВЕРКА 1948 г.

ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БЕ...
МЕНСК

Тэхрэдактар Х. АБРАМАВА
Карэктар Ю. ЖЫДОВІЧ
Здана ў друкарню 10-І—33 г..
Падпісана да друку 13-ІѴ—33 г.

Инв.
1964 г.

Ул. Галоўлітбелу №А 1128
Заказ № 269—5000 экз.
«Палесдрук», Гомель

*Авангарду змаганьня за будучыню рабочае клясы і ўсяго паднявоненага чалавецтва — сталёвай бальшавіцкай гвардыі—*

ПРЫСЬВЯЧАЮ.

ІНВ. ПРАВЕРКА 1948 г.

ЧАСТКА ПЕРШАЯ

# ПАХІ ЗЯМЛІ

## *МАТКА З СЫНАМ*

— ЧАГО ты плачаш, мамка?—пытаўся ў Агапы сын Ігнась.

— Не, сынку, я ня плачу... Гэта самі сьлёзы ідуць, з ветру ўвайшоўшы.

Але дапытлівы погляд хлапчуковых воч ня зусім згодзен быў з тым, што сказала маці, і трывога ў іх здрыганулася, калі ён убачыў, што маці адвярнулася к прыпечку, а плечы скалануліся раптам, і яна заплакала. Ціха ўстаў з лавы Ігнась, таксама ціха падышоў да маткі і, абняўшы квола, ласкава і сур'ёзна загаманіў:

— Вось бачыш, мамка, плачаш, а казала, што сьлёзы з ветру ідуць.

Агапа не магла больш сутрываць. Ашчаперыўшы моцна рыжаватую сынаву галаву, яна моцна заплакала на ўсю хату. Сьлёзы раўчукамі пацяклі з воч, бо ня было моцы трымаць у сабе, цяплом расплыліся на падстрыжанай пад лучыну галаве.

— Мамка!.. Дарагая! Чаго ты плачаш? Ну, скажы... Я-ж люблю цябе, моцна люблю!

І з усяе шчырасьці, колькі быць яе можа ў сына да маткі, цалаваць пачаў яе худыя, сухія рукі.

— Ведаю, сынку, ведаю, што любіш.

Свае пяшчоты матчыны яна магла выказаць найлепш толькі ў пацалунках, якія нясупынна пасыпаліся на рыжаватую Ігнасёву галаву. У пяшчотах да сына патроху прыходзіў спакой.

— Мамка, скажы, чаго ты плачаш?

— У нас... хлеба няма, хлопчык мой. Хадзіла заработак сыскваць, дык усе адказваюць: ці няма малочанага, ці сабе трэба, ці гаспадароў няма дома. Сыскаць цяжка загарованае сваім мазалём, сьлязьмі заплаканае.

Ад сваіх апошніх горных слоў зноў горна стала Агапе. Але сын бачыў, што нельга матку пакінуць так сам-на-сам з яе горам, бо яна зноў будзе моцна плакаць.

— На той год, мамка, увесну, я наймуся каровы пасьвіць. За лета мы поўна-поўна заробім—і хлеба, і сала, і каўбас.

— Ты яшчэ малы, сынок мой, я ня пушчу цябе.

— А я сам пайду...

Яны стаялі ўсё яшчэ ля прыпечку. Шкадавала маці Ігнася, ой як шкадавала,—выказаць нельга. І ён шкадаваў матку, а розум па прыродзе не хлапечы падказваў, што трэба зрабіць нешта такое, каб маці ня плакала. Трэба будзе пайсьці ў заработкі, няйначай трэба будзе.

Так парашыў Ігнаська, цьвёрда парашыў, бо лічыў сябе ўжо дарослым,—гора дапамагае ўзросту і раньняму пазнаваньню жыцьця горкага, як рэдзька, як палын. І праз усё жыцьцё тады застаецца ў гадох гэтая палыновая горкасьць, атрутаю выпальвае добрае і радаснае, што можа толькі даць маладосьць. Тады жыцьцё бывае яшчэ больш горкім, больш цяжкім—да самае сьмерці ня зьнікае вострасьць адчуваньня прапашчых ні за былінку маладых год. Вось нейкае здаволеньне бывае часамі—корпаешся, корпаешся ў мінулым сваім, успамінаеш сябе маленькім пухнырыкам—і якая магутная прыгажосьць асьвятляе пастарэўшыя ў шуканьнях вочы, калі з мінулага хоць адна невялічкая дзіцячая радасьць прамільгне перад табою; а ня знойдзеш, дык і сёньні дзень апаўецца чарнатой і боязкасьцю за далейшае, за будучае.

У мінулым у Ігнася ня было ніякае радасьці, не ўспаміналася нічога прыгожага, як ня было яго і ў мацеры, у гаротнае бабылькі Агапы.

— А ты схадзіла-б, мамка, к Андрэю Рубцовых... У яго-ж поўна ўсяго: і хлеба, і да хлеба,—пазычыла-б з паўпуда мукі.

— Маўчы, Ігнаська!—жаласьліва крыкнула Агапа.—Маўчы, не кажы больш нічога пра Андрэя.

І матчына рука закрыла яму рот, быццам баялася Агапа, што не паслухае сын і вось зараз зноў будзе гаварыць пра Андрэя.

## *НА ПАЛЕТКУ ЗА КАРОЎМІ*

ЗІМА перайшла марозамі, сьнегам, адлегамі. Растаў сьнег. Пазьбягала з палеткаў вада каламутная. Сонца замілавалася зямлёю, сваёю спрадвечнаю падарожніцаю ў лёгкім паветраным жыцьці; а тая, каб не разгледзелася сонца, каб не пакінула замілоўвацца і лашчыць,

пасьпешна ўбіраццa ўзялася ў самыя лепшыя ўборы свае; і зацьвілі сады—зелянцы белым і ружовым, і напаілася паветра прыемным вясновым дурманом. Паадскаквала на папары зялёная травіца.

Весела зарыкалі каровы на вуліцы. Пастушкова труба звонам тонкім з падскокамі прывітаньне паслала вясьне.

Спраўдзіў Ігнась. Ён не забыўся сьлёз матчыных тады, увосень дажджавую. І хоць ня пушчала, але ён спрытным маладым розумам дайшоў, як гэта зрабіць, і ўладзіў: на сельскім сходзе Ігнася згадзілі ў пастухі.

Штораніцы выпраўляла з сьлязьмі радасьці і жалю свайго „гаспадарыка" Агапа. Адцьвітала вясна.

Ігнась ужо ведаў кожную карову ў чарадзе, як гукаць і чыя яна. Часамі нуднавата было. Пастушкі-самапасцы ня надта чамусьці таварышавалі з ім. Яны расьлі пры бацькох, часам ня зусім бедна, і хаўрус вялі з такімі-ж, як і самі. З Ігнася любілі пакпіць, але ён ня ўсе іхныя кпіны разумеў.

Сёньня ня нудна было Ігнасю. Назьбіраўшы кругленькіх гладкіх каменчыкаў, ён разаслаў свой халацік і пачаў гуляць у „бурду" сам з сабою, вельмі здаволены, калі падкінутыя ўсе пяць каменчыкаў, як адзін, падалі на рукі. Захапіўшыся гульнёю, ня прыкмеціў ён, як нейчы цень уссунуўся на халацік. Потым нешта штурхнула моцна, аж каменчыкі пасыпаліся ва ўсе бакі. Ігнась ускочыў; крокаў за дваццаць бег, задраўшы хвост, малады бычок.

„А каб на цябе немач ліхая ўскочыла",—падумаў.

Але раптам радасна-вясёлы рогат пачуўся за плячыма, і яго акружыла куча хлапчукоў і дзяўчат. Ігнась дагадаўся, што гэта яны ўзагналі бычка, вельмі змыснага па прыродзе, які, мабыць, стаяў і глядзеў, што робіць Ігнась,—вядома, яны.

— Ігнась-магнас! Іг-г-г...нус! Чырвонагаловік. Падасінавік!

Кожны з сваім і па-рознаму стараўся навыперадкі зрабіць Ігнасю балюча. Але самы старэйшы ў гурце, Паўлюк, навёў трохі цішыню і парадак, а сам сеў на край Ігнасёвага халаціка. Сьціпла і ціха сьмяяліся ўсе. Ігнась цярпліва чакаў чарговае кпіны і ўжо сабраў каменчыкі, каб пакласьці ў кішэню, як Паўлюк узяў яго за руку і высыпаў іх перад сабою.

— Слухай, ты не хавай... Вось давай згуляем з табой у бурду, і калі ты абыграеш мяне, дык наш гурт будзе ўвесь тыдзень пасьвіцца з тваёю чарадою, а мы адвароч-вацьмам табе каровы.

А калі прайграеш, дык ты нам.

— Ня хочу я.

— Што табе цяжка? Ня хочу... Давай!

Добра ўмеў гуляць Ігнась, але адмовіўся-б з вялікаю ахвотаю. Не хацеў ён нікому адварочваць кароў, не хацеў, каб і яму хто адварочваў. І гэттака ж ён добра ведаў, што калі адмовіцца, дык ня мінуць абразы, высьмешак і зьдзеку.

— Давай!

— Га-га-га... хі-хі-хі... Го-го-го...—зарагаталі, захіхікалі і загагокалі гусакамі сябры Паўлюковы.

— Ну, ціха!—спыніў ен рогат.

Пачалі гуляць.

Добра гуляў і Паўлюк. Сябры яго пакінулі сьмяяцца—яны захапіліся ўжо, гледзячы на гульню. Чорныя, белыя, русыя галовы з ускалмычанымі касмылямі папрыцісkaліся адна к аднэй,—сачылі.

Сонца павялічыла цень чалавечы на цэлую галаву, калі Паўлюк злосна кінуў каменчыкі: ён нагуляў толькі дзьве з паловаю „бурды" і прайграў. Было ўмоўлена на тры,—верх астаўся Ігнасёў.

Усе з цікавасьцю пазіралі на абодвух. Раптам Паўлюк да Ігнася:

— І ты, пажар, думаў, што мы напраўду гэта чараду табе пасьвіць будзем!

Не пасьпеў той ніякага адказу даць, як моцныя Паўлюковы пальцы падмацавалі словы.

Бедныя рыжыя валасы! Як часта былі яны прычынаю гаротных сьлёз. Якіх толькі зьдзекаў і глуму праз іх не даводзілася цярпець Ігнасю.

Балюча скубянуў Паўлюк за валасы, аж іскры, здаецца, пасыпаліся з воч. Мабыць, гэтага чакалі і Паўлюковыя хлопцы, бо ўраз-жа вэрхал узьняўся каля Ігнася.

— Рады быў, што Паўлюк каровы адварочваць будзе,—гі-гі-гі-гі-гі.

— Пажар! Пажар!

— Ціха, ён паскардіцца бацьку, тады будзе вам.

— Бацьку... О-го-го-го!—лопаліся з рогату жываты.

— Бацьку... Той недзе сабакам сена косіць! Няхай паспрабуе, знойдзе.

— У-у-у,—чорт рыжы!

І з падскокамі, высьмешкамі і здаволеным рогатам уся зграя пабегла к гурту, радая, што пацэшылася. І заўсёды вось гэтак: прыбягуць, напацьвельваюцца, наглумяцца, наскубуць за валасы—і пабеглі.

Хацелася плакаць Ігнасю. Шчымелі валасы. Не, ён ня злосны быў на іх, не на хлапцоў, а на валасы. Хоць яны рыжыя, і часта крыўдзілі яго, але не, ён ня злосны на іх, бо мама іх гэтак любіць і ўвечары, як Ігнась прыганяе

каровы, абдымае яго, плача і сьмяецца, зноў плача і горача-горача цалуе ў чырвона-рыжую галаву.

— У мяне галава такая-ж рыжая, як у дзядзькі Андрэя барада, мама,—пажартаваў ён раз.

Маці тады закрыла яму рот рукою, і радасьць перапынілася плачам з моцнымі любымі пацалункамі...

Усё-ж такі яму крыўдна, ой, як крыўдна было, як плакаць хацелася. Але замест плачу ён пачаў думаць...

„Бацька“... Якое далёкае слова. Далёкае, але, успамянуўшы яго, лягчэй рабілася, і сьлёзы высыхалі на вачох і ў іх ласкавей зазірала сонца. І яму здавалася, што гэта яно, сонца, толькі яго так песьціць, бо ён пакрыўджаны, бо слова „бацька“... Радасны смутак агарнуў разам з медзянымі косамі сонца.

Задумаўся—забыўся глыбока.

Ці думаюць так у такія гады? Думаюць, мабыць. Аб чым і як? Ну, гэта ўжо іх справа. Ігнась жа і думаў, і не.

Бываюць такія часіны, калі на ўражаньні багатая натура—хоць і пакрыўджаная—ды захопіцца чым-небудзь. Тады і смутак, і журба з радасьцю памяшаюцца, і настрой нейкі, шмат якім людзям нязнаны, наплывае. Сядзіш, глядзіш, а ў ваччу красуюць карункамі мары.

Ой, мары-мары! Чым быў-бы бяз вас сьвет, чым былі-б людзі, чым жыцьцё было-б? Бывае пасьля іх радасьць прыходзіць, бывае гора,—на час ці назаўсёды.

Ігнась сядзеў, калі ў ягоны настрой бястурботны яна ўвайшла.

— Ігнась!

Ён азірнуўся і ўбачыў яе. Пасьля таго настрою абуджэньне павінна была-б даць будзённае і няпрыемнае ўражаньне. Але не: яна сама была падобна да прыгожае думкі-мары. Як кветка палявая, з чорнымі кучарамі, босая, з блакітам у вачох, яна аздобіла, прадоўжыла настрой яго.

— Сядзь, Люба.

— Ты зусім забыўся пра каровы, Ігнась. Ужо з паўчарады было ў шкодзе, добра, што я наверапілася ды адвярнула.

І гэта будзённасьці настрою не надало, бо голас Любінціхі і чысты, задуменны, як шэпты вясновага лесу, перавіўся з мяккаю зелянінаю палёў. Уяўлялася нават, як каровы на поўны рот хапаюць зялёны авёс, і як Люба, расчырванеўшыся, бяжыць, а валасы раскідаюцца свавольна і паўз вушы сьвішча вецер.

— Ды ты плакаў?

— Я?.. Не, гэта так.

Яна стаяла перад ім на каленцах і зазірала ў вочы, а загарэлая рука адкідала валасы з ілба і гладзіла з маладою шчырасьцю іх агністую чырвань.

Кожнага разу, калі Ігнасю было нейк ніякавата, кожнага разу, калі абражалі яго, кожнага разу, калі давалі зразумець, што ён не такі, як усе, што бацька яго недзе „сабакам сена косіць", зьяўлялася Люба, прэч гнала смутак і жарбу, прыносіла радасьць, часіны сьветлыя давала.

## *ЛЮБА*

ДЗІЎНЫМ было гэтае таварышаваньне дзяўчыны з хлапчуком. Дзіўным таму, што Люба была старэй гады на тры за Ігнася, а можа і таму, што ня пасьвіла чужых кароў, як той.

Мусіць, ня ў тым справа.

Каб можа Любін бацька жыў, як Агапа, дык і яго-б дачка штораніцы гнала праз усе сяло каровы. Патрэбы ў гэтым як раз ня было.

Люба—адна дачка і адно дзіця ў свайго бацькі; і бацька яе не абы-хто, а сельскі стараста. Гады тры пабыў нават і за валаснога старшыню. Пасьля, як зьмясьцілі яго са старшынёўства, плётка вужакаю папаўзла па сяле:

— Дароша Аксюту, ці чулі, выперлі з воласьці,—кажуць, хабароў залішня набраўся.

А зрэшты казалі, што мана гэта ўсё.

Мана манаю, а што да праўды, дык і сам Дарош не хаваў ад людзей, усе бачылі, як жыве. Жонка ня тое, што чужыя бабы ў парваных андаракох, а заўсёды ў крамненькім, у прыгожым. Пра дачку і казаць няма што: як паненку ўбіралі. Ды ці-ж дзіва,—абрабляць зямлю пасаблялі за дармоўшчынку швагры ды швагеркі, а грошы прыбывалі (акром Дароша, жонка толькі ведала, колькі новенькіх чырвончыкаў схавана ў скураной калітцы). Стаўшы за старшыню, з першага-ж году скінуў Дарош сваю даматканую жакетку, а пашыў пінжак з крамнага сукна,—казалі, каб ярчэй кідаўся ў вочы мужыку старшынёўскі мідаль. Э, ці мала чаго наказаць могуць людзі.

Пасьля воласьці ізноў-жа ня вельмі ўзяўся Дарош за гаспадарку,—дарэмна бабы плёткі плялі. Зьмянілі на сяле старасту, і на яго месца стаў той самы Дарош,—хоць з паніжэньнем але ўсё-ж начальства, дый пад бокам. І жыве

добра. Не адно зайздросьлівае вока ацэньвала Дарошаву будоўлю, гладкія коні, каровы, а што ў скрынях ды кублох жончыных, толькі дагадвацца хіба трэба было. І як на зло ўсяму сялу—ня сам робіць Дарош на зямлі, а расьце на ёй лепш, чымся ў людзей. І заўжды, калі гутарка дзе ўсчнецца пра Дароша, дык і гавораць, уздыхаючы:

— Ды яно-ж, на яго страх... Багатаму і чорт у кашу дбае.

Люба жыла ў бацькоў, як фарфуровая лялька ў панскіх дзяцей. Чаго толькі хоч—і зьесьці, і знасіць, і схадзіць. А больш што патрэбна мужыцкаму дзіцяці, хоць і стараставаму ці старшынёваму.

Ня гэтак даўно адкрылася ў сяле народная школка. Тады Люба пакінула хадзіць вучыцца па хатах і першую яе прыняла настаўніца. За ёю сьледам пайшлі і больш. Але-ж яна была пярэдняю.

— Вучыся вось, дык сама можа будзеш у настаўніцах,— гаварыў ёй бацька, здаволена гледзячы на жонку.

— Расьпісацца як сьлед хай навучыцца.

— Я буду за настаўніцу, мама,—ціха казала Люба.

І лёгкія ды плыўкія, бы тыя пёрцы птушыныя, думкі пераносілі павольна ў будучыню, і бачыла яна сябе настаўніцаю, ня жорсткаю, ня злоснаю, а добраю дзецям, што шкадуюць яе, як роднае маткі. Жаласьлівасьць расла ў ёй з самага малку, жаласьлівасьць і спогадзь да ўсіх слабых, гаротных і нянавісьць разам да ўсіх чорствых людзей. Так, яна будзе вучыць некалі ўсіх гэтых малых гаротнікаў, будзе пушчаць у сьвет, паказваць ім дарогу ў жыцьцё.

За характар свой, толькі дзякуючы яму, пасябравала і з Ігнасём. Часта, ідучы ў школу ці дадому, бачыла яго Люба, сухога, галоднага, апранутага ў грубое зрэб'е, у пазьбіватых вязовых лапціках з кастравымі аборкамі. І пацягнуло Любу к Ігнасю. Бо бачыла, як суседнія хлапчукі шкілююць з яго і як нясьмела, баючыся ступіць лішняга кроку, не адыходзіць ён ад сваіх разбураных варотцаў у двары. Ведала Люба добра і Агапу і, не зважаючы на свой малы ўзрост, рада была-б пасобіць чым, бо тым самым пасобіла-б і Ігнасю, якога крыўдзяць чужыя дзеці.

Аднае зімы ў школе была елка. Настаўніца панакупляла ўсякіх падарункаў. Елку прыгожа ўвабралі.

Думка распукнулася раптам у галаве Любы і зацьвіла пышнаю кветкаю рашэньня: Ігнася трэба павесьці на елку. Перш чымся зрабіць, яна запыталася ў настаўніцы, а тая дык яшчэ пахваліла. Добрая была ў іх настаўніца. За нейкі дзень вывучыла Люба з Ігнасём напамяць вершык. Вось з тым і пайшлі яны на елку. Люба была тады ўжо ў трэцім аддзяленьні.

Які-ж рады быў Ігнась пасьля елкі. Саромліва, але добра пераказаў ён вывучаны верш і за гэта настаўніца надавала яму падарункаў ды сказала, каб на другую зіму маці прысылала ў школу вучыцца.

Вось гэтак і пасябравалі Ігнась з Любаю.

На другую зіму не ўдалося Ігнасю пайсьці ў школу, ня было ў чым і з чым. Ён дык пайшоў-бы, але маці ня пусьціла.

— Як-жа ты, сыночку мой, пойдеш. Ты-ж ня выседзіш галодны. Усе дзеці палуднаваць будуць... Ведаеш-жа, Ігнасёк, што ў нас няма чаго ўзяць.

— Мамка, я хлеба з сольлю зьем, і добра будзе. Абы вучыцца толькі, мама.

— Ня трэба, ня трэба гэтак, мой сынку, мой любы Ігнась. Няхай некалі на тсй год. Я зараблю грошай, няпрыменна зараблю, ды спраўлю табе чаботкі.

— Ну, добра, мама, я пачакаю.

Так і не пайшоў тае зімы вучыцца Ігнась. А Любу тымчасам бацька аддаў у гімназію ў горад. Любіна маці ўсім выхвалялася, што дачка іх вучыцца разам з панскімі дзяцьмі, і што прынялі яе, уважаючы на бацькаву службу—гарадзкое начальства дапамагло.

Але і ў горадзе Люба не забывалася пра свайго Ігнася. Прыяжджаючы на сьвяты дадому, заходзіла пагуляць. Падабалася і яна Агапе, і рада была бабылька добраму сяброўству сына.

Асабліва ўлетку дабрыня была ім. Любу не прыганялі дома рабіць, толькі вучыся, чытай. І дзень пры дні ішла яна ды ішла, як вада, на поплаў, у палетак, на рэчку. Заўсёды апранутая чыста, у новую сукенку гімназісткі, як яна падабалася такая Ігнасю.

За малым ня штодня бачыліся. Вось і гэтага разу таксама гуляла Люба ў палетку, трапіла на чараду і павыганяла са шкоды кароў.

„Мілая, прыгожая Люба",—думаў, сарамяжа гледзячы на яе, Ігнась і адчуваў, што прывыкаў да яе, як брат да сястры.

І неўзаметку, як сястры, расказаў маладой дзяўчыне пра ўсе дні без яе, пра гора і радасьць маладога хлапечага жыцьця.

Аднаму апавядаючы, а другой—шкадуючы яго, было гэтак добра добра разам.

„Дарагая, харошая Люба",—думаў Ігнась і сёньня, чуючы лёгкі ласкавы дотык Любіных рук.

Вялікае хараство ў сардэчнай блізкасьці аднаго з адным і ў кволай адданасьці ёй прыгожая радасьць.

ПАКАСІЛІ. Паплавы выбрыліся гладка, як хлопцы ў сьвята перад пагулянкамі. Пааджыналіся з жытамі, аўсамі. Надышла жоўтая восень. Стала пахмурна і няпрыветна ў палетку,— чужым нейкім, здаецца, не сваім. Дажджы пайшлі, спагнаць стараюцца за лета, па самае нельга напаіць старую, ссохшую бабулю-зямлю.

„Дзяды" прысьпелі і Ігнась пакінуў пасьвіць. Сабраўся заработак. Зіму можна пражыць.

Ігнась зноў, як і летась, выказаў мацеры сваю патаемную думку: ён пойдзе ў школу. Яго аднагодкі ўжо канчалі ў гэтым годзе, некаторым асталося па году, а ён яшчэ толькі паступае. Гэтае зімы абавязкова трэба, бо недзе на той год-можа і самому не захочацца.

Хіба-ж магла быць матка супроць гэтага?—ніколі. Яна даўно ўжо думку песьціла, што Ігнась яе выйдзе ў людзі. Яна паклапоціцца, каб гэта спраўдзілася.

Ігнась пайшоў у школу, у лапціках у новенькіх пайшоў, бо маці ня справіла „чаботак", як казала, не зарабіла на іх. Цяжка жыць!

Настаўніца прыняла (ласкава-добрая настаўніца!), выдала кніжку і сшытак. Акуратна, дзень пры дні хадзіў вучыцца. Дома ўвесь вольны час аддаваў лемантару.

Колькі радасьці было ў закурэлай са шчылінамі-вакенцамі хаце ў Агапы, калі нешта пад каляды Ігнась ужо прачытаў разборна першае апавяданьнейка. Сьвет новы адчыніўся перад Ігнасём ва ўсёй прывабнай і бліскучай прынаднасьці. Быццам ён толькі і жыць пачаў. Такою любаю, такою дарагою стала яму кніга. А горад, пра які ён вычытаў, закрануў цікавасьць і нязьведаным яшчэ захапленьнем прыцяг сэрца. Але ня было часу марыць.

— Мама! Як весела мне і як я люблю цябе.

Дзьверы, як на зло, перарвалі, што адвечнае і няўмірушчае ў людзях, што выклікае жаласьлівасьць і пачуцьцё абароны да меншага, да слабейшага, кіруецца чым у прыродзе сьвет, што сэрца саграе, імкненьні сьветлыя ўзбуджае.

Адарваліся адно ад аднаго. Нібы засароміліся свае хвілёвае радасьці.

А ў хату ўвайшла Люба. Колькі разоў ужо—ці сьлёзы, ці гора—яна зьяўлялася. Ігнась прывык яе бачыць,—часта была патрэбна яна са сваім сьмелым задушэўным голасам, з адкрытым бязьмежжам сваіх воч. Цяпер прысьпела нібы зьнячэўку на першы баль вясёласьці, мо' на першыя прось-

веткі будучага. Пераступіла парог, стала. Зразумела, што быў лішні яе прыход і, сьмелая, збочылася нясьмела ў мыцельніку.

— Дык што-ж ты гэта, Любка... Хадзі, хадзі сюды,— нарэшце вымавіла Агапа.

Нешта сьціскала ёй горла, не давала выйсьця патрэбным словам. Гэтае нешта—Агапа дагадалася—было прыемнымі сьлязьмі радасьці. Не заўважылі іх толькі Ігнась з Любаю, бо нечаканая сустрэча на крыху адсунула гэтую радасьць, а можа і зусім перамяшалася з ёю і стала большаю і прыгажэйшаю.

— А я прыехала на каляды,—казала Люба.—Ня ведала, што ты ўмееш чытаць, а то прывезла-б кніжак. Няхай некалі на вялікдзень.

## НАВАЛЬНІЦА

ІШОЎ год за годам.

Ігнась вучыўся і пасьвіў, пасьвіў і вучыўся.

Як і даўней, хлопцы цураліся яго і ня любілі. Ігнась таксама ня надта ліп да іх, больш адзін быў. Адзінота прымушае чалавека назіраць і паглыбляцца ў самога сябе. Гэтак і Ігнась, паглыбляўся ў думкі і з аднаго паступова рабілася два: адзін—быў надворна сур'ёзны, маўклівы, заўсёды ціхі ў людзях, уцякаў ад шумлівых гутарак і жвавых гульняў, а другі замыкаўся ў сябе сам-на-сам і ўсё думаў пра нешта спаважна.

Якраз нядзелька была. Раніца. Сонейка ўсплыло і схавалася. У цьмянасьць увабралася іржышча, трава. Аднекуль дзьмухнула пахмурнасьцю. Рэдкія хмары спаўзьліся, згусьлі над палеткам. Замоўклі птушкі. Ціха зрабілася ў палёх.

Ігнась зьвярнуў чараду на палетак і сеў ад ветру на пакамлычанай зялёным быльнёгам шырокай мяжы.

Раптам блісьнула на небасхіле. А потым бліжэй, часьцей—і пачала палыскацца яснатою высокая чорная далеч над самым палеткам. Проста над галавою трэснула-грукнула і з лёскатам-гудам разышлося вакол. Як-бы шум нейк пачуўся з ветрам. Каровы стаўкліся ў кучу. Адале блескам агністым засьляпіла вочы, нібы паветра разадралася і расшчапілася напал зямля...

Калі Ігнась трохі апрытомеў, дык дрыжэньне водгукаў далёкага памёрла, шум прыляцеў і апратаў палетак сваім

тудзеньнем. За першымі гарошынамі-кроплямі нібы хмары да зямлі спусьціліся і косымі перахватамі граду пачалі касіць палетак.

Ігнась падкурчыў ногі і схаваўся пад халацік.

Роўна барабаніў дождж, напярэймы лапацеў па Ігнасю, а ён сядзеў і мімаволі прыслухоўваўся. Галава ніжэй ды ніжэй хілілася на грудзі, роўным рабілася дыханьне. Але рэзкая вільгаць пралезла пад халацік; пачало ўздрыгваць пад пахамі. Ня злазячы з сухога, ён лепш падгібаў пад сябе крыскі, захутаўся шчыльна і задрамаў.

Парыўчаты подых ветру змысна расхлябесьціў халацік. Нехаця ўскочыў Ігнась, здрыгануўся. Нечаканы пераскок з цяпла да холаду ўраз папрасіў заляскацець зубамі. Ігнась глянуў назад, дзе трэба, каб была чарада, і дрыжучы нацёг на плечы апранаху.

Град перасьціх. Але каровы, ня чуючы голасу Ігнася, адна за аднэй паднялі хвасты і выладзіліся на дарогу — у цёплым хляве, вядома, куды лепш. Дождж-імга цярушыць ледзь-ледзь, нібы на частае сітка прасейваючы буйныя кроплі.

Ігнась зьмікіціў, што яшчэ рана, ён быў задрамаў толькі, і дождж ужо меншае Калі пусьціць дадому каровы, дык не ацярэбішся ад наракань няў, упічышчаў і праклёнаў. Падкасаўшы нагавіцы, ён сьцёбнуў пераймаць. Але і каровы зразумелі быццам, і задняя дробным ляным трухам пагнала пярэднюю, а тая трэцюю і ўся чарада пацялёпкалася к сялу.

Забыліся, мусіць, каровы, што ў Ігнася пуга доўгая і што моцна ён бегае. Не пасьпела пярэдняя дабегчы да канца сяла, як Ігнась зьбіў яе на бок, а за ёю і ўсю чараду і загнаў зноў на палетак.

Пацішэла нібы ды пацямнела зноў. Такім чужым і няпрыветным зрабіўся палетак. Сьветлыя фарбы палёў пачарнелі, забрудзілі. Сама сабою запаўзла далёка ў сэрца бяскрыўдная журба, ахутвала няпрошаная. А пад нагамі мяккая ліпучая сьлізіна — гнілоцьце. Таму і нудна быць на палетку ў такі час, таму і дрыжык дробненькімі гургункамі бегае па целе.

Мабыць нуду такую самую адчувалі і каровы, бо глыбокадумна галовы паспушчалі; рэшта нюхаюць траву, нехаця выбіраючы па каліву, нібы хочучы сказаць:

„Дзе ж там відана, каб у такое надвор'е..“

Зялёнае каліва аставалася за тоўстаю губою і морда каровы рабілася ні-то сур'ёзна-важнаю, ні-то дуркаватымкім

Цемрач апаноўвала палеткам. Хмара большая за п... заняўшы з паўнеба, паволі, але рашуча насоўвалася спалохам страшнаватае было ў яе чорнай рашучасьцю асобу, ледзь

гэта на нябачных ніцінках спушчае на зямлю нуду, каб павыганяць усё жывое, каб аднэй астацца ўладарыць беспадзельна на палетку. І ўсё жывое нібы падначальвалася і, не аскірзаючыся лезла ў свае норы, гнёзды, пад межы і лісткі.

Глыбокай чуласьцю разумеў Ігнась прыроду. Яму самому заманулася да хаты. Але—як-бы доказ рэзкай супярэчнасьці ва ўсім—мёртвую сьціш прарвалі жаласьліва-дзіцячая піскліваcьць ды нечы гартанны клёкат.

Вухам пазнаў Ігнась адкуль плылі гукі. Загоны за два, а мо' і тры, на сінявата-чорным фоне хмары ён убачыў...

Вялізны коршак узьляцеў ад зямлі, злосьнікам агідным малюючыся на цёмным палатне неба. Мяркуючы быццам што зрабіць, ён зноў сплыў да зямлі. Дзіцячы піскліві плач сустрэў яго. Лёгкія крылы коршака бязьлітасьці хвасталі па зямлі і час-за-часам узьлятаў ён угору, а потым спушчаўся ўніз зноў і зноў, па-драпежніцку старанна робячы сваю работу.

Ігнась захапіўся, гледзячы, забыўся на каровы: нярухома стаяў з утаропленым туды зіркам аж датуль, пакуль асаблівая жаласьліваcьць ня зрухнула з месца. Сьляпая просьба аб дапамозе ўжо ня так свабодна і лёгка ляцела насустрач яму.

Моўчкі, але значна на палетку плыла пахмурная ўрачыстасьць. Ігнась толькі, захапіўшыся бачанаю супярэчнасьцю, не падпадаў пад велічны ўплыў яе магутнае сілы.

Недалёка ўперадзе ён бачыў ужо мэту свае бягі, дзе з нечым жаўтаватым сашчапіўся прагавіта крылаты драпежнік. Прызвычаіўшыся за кароўмі, ляснуў Ігнась пугаю па вільготным іржышчы. У гэтым бязьлітасным ляску коршак пачуў небясьпеку і з нездаволеным піцьканьнем шпарка ўзьняўся да роднае стыхіі.

Перад Ігнасём ляжала пашчыканае і пашкумачанае на кроў шчанё. Зусім нядаўна яшчэ прарэзаліся вочкі—бедны! Слабенькі шчанючок, страціўшы сваю невялічкую моц у барацьбе з злым ворагам, імаверна ўспоўз на босыя ступакі свайго збаўцы, паклаўшы чырвона-крывавыя плямы і тут-жа зьлізаўшы іх разам з брудам.

— Як ты папаў сюды, мой дурненькі?—запытаўся, нібы і сапраўды чакаць можна было адказу, Ігнась.

Крысаю старога халаціка, пашытага з мацерынае камізэлькі, ён абацёр па шэрсьці сваю знаходку. Кволенькае
Калі[illegible]дрыгвала цяпер дробнымі дрыжыкамі, як толькі далёкага [illegible]шыся ад сьмерці і адразу папаўшы ў колкі

Над галовамі ўгары шуганула буйно. Ігнась успамянуў пра коршака і сунуў шчанючка пад халацік бліжэй да цела. Тады глянуў угору. Так, гэта ён, іхны вораг, толькі што нязграбна праляцеў, падхоплены ў колькі разоў больш дужым, магутным віхорам, не аддаючыся ўсё-ж такі без барацьбы.

„Будзе вялікая навальніца"—падумаў Ігнась, пачуўшы здалёку пагрозны шум.

Ён не памыліўся. Толькі гэта намерыўся быў крануцца да чарады, што нязвычайна, нібы няжывая стаяла ўнурыўшыся, як буйныя кроплі дажджу захлёпалі часта і цяжка, рытмуючыся з недалёкім ужо шумам у страшную і прыгожую музыку навальніцы.

Няпрыемна хавацца ад дажджу ў мокрым ды яшчэ і на мокрым. Трымценьне напала на Ігнася і зрабілася холадна. Ён прыціснуў бліжэй да цела сваю знаходку. Шчанючок таксама трымцеў і трымценьне казытала Ігнася. Ён крануўсяісьці, але, зрушыўшы з месца, быццам адразу страціў увесь запас цяплыні. Вось-бы раптам пераступіць парог—і ў хаце. Не, старэнькая матчына хата далекавата.

Дождж паліў раўчукамі. Каралі кропель яго знайшлі сабе дарожку і пад Ігнасёў халацік. А на палетку па мокрым змроку дня рассыпаліся ў грымотах бліскавіцы і што далей, тым больш і тым часьцей. Шчанючок задрыжэў дробна, сунучы сваю мордачку Ігнасю пад паху. Ігнась перасадзіў яго да голага цела, каб цяплей было. Але не пасьпеў яшчэ зашпіліць халаціка, як вочы зашчурыліся ад яснага колкага сьвятла, а вушы аглушыла розгалосым звонам, і адчуў Ігнась, як яму зрабілася лёгка і добра, як быццам у ясным павуцінным палетку ён задрамаў салодка з ружовым тамленьнем у грудзёх і быццам нехта праменісты, прыгожы на варце яго дрымотаў стаў.

## ДЗЬВЕ ЧАРАДЫ

ГУЛЯЛА навальніца, жудасьцю сваёю рызыкавала. Успалошылася ўсё сяло—ня было чарады. На двор-жа страшна было вылезьці: само неба, здаецца, лілося на зямлю і разпо-разу зіхацелі агністыя маланкі, сатрасаючы звонкім трупценьнем шыбы вокан.

Але, калі боязнасьць за каровы пераважыла над спалохам перад разьюшанаю стыхіяю за сваю ўласную асобу, ледзь

ня ўсё сяло высыпала ў поле—кожны з посьцілкаю на галаве—шукаць. Думка ў кожнага баязьліва сьвідравала мазгі—„можа ляжыць дзе чарада ўпавал пабітая“. Разьбіты, пашчэпаны на стрэмачкі, магутны векавы вяз за канцом сяла сьведчыў, што непажаданыя думкі лезуць у галаву не без падставы.

Уперадзе ўсіх ветрыкам лёгкім ляцела Люба. Аднэй з пярэдніх выбегла ў палетак і Агапа. Не палохалася яна за каровы; думаючы пра горшае, яна быццам прасіла каго, маліла, што лепш няхай пабіта будзе ўся чарада, абы толькі астаўся жывы яе Ігнась. Вялікім, неабдымным, нязьмерным можа быць каханьне мацеры!

А тымчасам чарады ня відаць было. Ня ведалі, куды кінуцца, дзе шукаць яе на вялізным палетку. Толькі, калі Люба ўзьбегла на недалёкі ўзгорак і махнула рукою на сябе, усе грэйма навыперадкі сыпанулі туды.

Нібы спагадваючы з людзкога імкненьня, навальніца пачала патроху сунімацца. Дождж з раўчукоў паволі пераходзіў на кроплі, а маланкі адблісквалі ўжо далёка і нясьмела.

З узгорку людзі ўбачылі ў лагчыне чараду. У цеснай кучы, пагарбеўшы, стаялі каровы. Адлягло ад сэрца ў напалоханага натоўпу—каровы былі, здаецца, усе. У гэты момант, акром гаротнае маткі ды мо‘ яшчэ Любы, ніхто ня думаў пра пастуха.

Хмары разышліся. Выплюшчыўся баязьлівы праменчык і прылашчыў мокрую зямлю. Зноў стаў у палетку дзень, ясны, сонечны, зноў палетак пачаў убіраць у сябе прыгажосьць фарбаў. Заціўкалі, засьвісталі і застрачылі на ўсе галасы крылатыя жылачы палёў. Пад уплывам цяпла разбрыліся каровы і тут толькі заўважыла чалавечая грамада, што няма пастуха.

Захлупіла ў грудзёх Агапіных ад шпаркае бягі. Падбегшы к чарадзе, яна стала. Але ў агульным парадку і супакоі адчула, як балюча сьціснулася сэрца, а сіроцкасьць становішча захапіла ўсю; казала, здаецца, нешта, што з сынам нядобра. І яна пайшла ад другое чарады, ад людзкое, у якое дрыжэлі рукі і балела сэрца нядаўна за сваю маемасьць, што была цяпер у поўным парадку, цэлая, не зважаючы на тое, што няма пастушка, не каровы-ж, а чалавека.

Хто-ні-хто пачалі вылучваць свае каровы і гнаць—хто ў хлеў, а хто на пашу. Ніхто ня зрухнуўся з месца, стоячы ў грамадзе, ніхто не пакінуў сваіх кароў, не паварухнуў пальцам, каб пасобіць гаротнай кабеціне знайсьці

сына. Наадварот, у паасобных кучках чутны былі зусім неласкавыя выгукі:

— Ці-ж гэта пастух?

— Галапупанку хлеб далі, а ён!..

— Плата за дабрату сельскую...

— Дох-бы нечага з голаду з мацераю са сваёю!

— Пагнаць к чорту гэтага байструка!

Толькі адзін з усяго натоўпу, той самы Андрэй, сусед Агапін, у якога Ігнась некалі раіў мацеры пазычыць хлеба, толькі ён адзін ня меў, мабыць, аднолькавых думак з усімі. Яго каровы адны з усяе чарады хадзілі на месцы, а сам ён азіраўся вакол, бы назіраў каго. А далей, відаць, засаромеўся нечага, бо, схапіўшы дубец, і ён пагнаў сваіх кароў за другімі. Прагнаўшы з паўзагона,—яшчэ супыніўся і зноў паглядзеў узад, як-бы забыўшыся чаго. Але ў той-жа самы час вынырнула з-за ўзгорку Агапа. Убачыўшы яе, рыжы Андрэй хуценька засьпяшаўся ў сяло.

Агапа ледзь перасоўвала з адчаю ногі. Ня зморанасьць, не, адабрала ў яе заўсёдышнюю трываласьць—адчуваньне небясьпекі страціць сына, астацца аднэй без свайго Ігнаські, дрыжучым спалохам напоўніла ўсю істоту. Колькі разоў клікала любоўна „Ігнась!"—палетак прыносіў назад яе голас без адказу. Ад нявыказнага жалю падгіналіся ногі, тонкімі іголкамі калола пад сэрца, забівала дух.

Удзьвёх з Любаю засталася Агапа. Тэй таксама было шкода Ігнася, як ня шкода было больш нікому, апроч маткі. Адна яна асталася з няшчаснаю кабецінаю ў полі. Але жаль такі, як у Агапы, не апанаваў Любаю,—яна была ўпэўнена, што Ігнась знойдзецца,—жывы, здаровы.

Бягучы ўперадзе, Люба заўважыла ў разоры нешта цьмянае. Больш прадчуваньне, чымся зрок, не спадманула шчырую дзяўчыну. Яна падбегла і пацягнула апранаху. Ігнась, яе добры, любы Ігнась тут, у лужыне вады. Ён знойдзены, але вочы яго моцна заплюшчаны і рукі ня ўздымаюцца. А можа ён сьпіць моцна? Не!.. І яна звонка гукнула:

— Цётка!

Зьнямажаная Агапа пачула воклік (слова „цётка" ні да кога не магло тычыцца, акром яе). Улева ад сябе яна ўбачыла ў Любіных руках халацік. Сьлёзы туман разаслалі перад вачыма: Ігнась там... Ён ня чуў голасу, кволага матчынага голасу, якога так слухаў заўсёды. І, сьпяшаючыся, спрабавала адгадаць, што магло здарыцца з Ігнасём. Ці жывы хоць? Страшны малюнак уставаў перад вачыма, што Ігнась няжывы і з ёю ня будзе больш яе сыночка. Бегчы не магла, але ішла хутка. Крылаў жадала-б яна на гэты

час, каб пераляцець раптам к сыну, але крылы былі не патрэбны: пяць крокаў—і Ігнась увесь мокры ў разоры ляжыць перад ёю.

Мука тугі нязьмернае паказалася на твары ў Агапы, мука нявыказнага гора, калі стала яна на калені перад Ігнасём. Сьлёзы нагарнуліся ў Любы. А маці сілы ня мела падняць няпрытомнае цела свайго ўлюбёнца, дрыжучымі паслабеўшымі рукамі толькі выцегла яго з разоры.

Ці ёй здалося, ці гэта праўда, Ігнась паварухнуўся.

— Любачка—бачыла?

Люба бачыла, але ня тое, што Агапа і, засунуўшы руку ў запазуху няпрытомнага Ігнася, дастала звонка заскавытаўшага шчанючка. Які час мінуў, пакуль Агапа дагадалася абмацаць галаву, рукі і ўсё цела ў Ігнася. Потым паслухала сэрца. Невялічкаму кволаму маятніку чалавечага організму яшчэ не канцы былі.

— Любка! Сэрца-ж б'ецца... Што з ім рабіць?.. Ігнаська!

Паклікала яна над самым вухам і пачала тармасаваць, падымаць галаву, варушыць рукі. Хвіліна, дзьве... Роспач зноў заступіла месца кволае надзеі ў абедзьвюх. Яны ўжо больш ня ведалі, што і рабіць, калі Ігнась раскрыў вочы. Потым уздыхнуў ціха, як уздыхаюць зьнямоžаныя ў цяжкай барацьбе з хваробаю. Надзея вярнулася са сьлязьмі радасьці на заплаканыя вочы мацеры.

— Сынок! Ігнаська! Ці бачыш ты?

Ён бачыў іх і мацаваўся нешта праказаць, але слабасьць перасільвала, і слоў ня чуваць было. Радасьць, што Ігнась жывы, вярнула сілу мацеры і яна падняла сына. Цяпер ён трохі лягчэйшы быў, можа таму, што сіла жыцьцёвая варочалася назад у цела і брала яго ў свае рукі. Як малое дзіцянё, узяла сына на рукі Агапа і панесла. Смутная і радасная з халацікам і шчанём у руках Люба пайшла пазадзе.

## ХВАРОБА

ДОЎГА хварэў Ігнась. Тыдні заступалі і адыходзілі, а хвароба трымала ў агідных кіпцюрох маладое жыцьцё.

Ігнась тады на полі быў толькі прыглушаны маланкаю і каб знайшлі яго на хуткім часе, дык тыдні хваробы моʻ ўкараціліся-б. Прыглушаны праляжаў ён на халодным дажджы ў вадзе і прастыў. Хвароба перайшла ў запаленьне.

Астатнія лахманы прадала Агапа—лячыла сына. Колькі ночай бяз сну выседзела яна каля рыжае дарагое галоўкі.

Гледзячы на мукі сынавы, чарнела, недаядала, сохла. Ніхто не спагадваў з яе гора, ніхто нарокам нават не пашкадаваў. Прасіла раз у суседзяў каня—завезьці хворага ў больніцу. Ёй проста не адказалі, але так пэўна далі зразумець, што яна больш ні ў кога не прасіла. Была ў яе калясачка, у якой вазіла калісь маленькага Ігнася. Цяпер павезла ў ёй хворага за некалькі вёрст у больніцу.

Трэ' было плакаць, ды сьлёзы ня ішлі—ужо выплакаліся ўсе; толькі і думаць высталася, чаму гэтак сьвет створаны, што людзі ў ім колюцца, ніжуцца адзін з адным без адхланку. „Дзе гэта праўда? Дзе гэта шчасьце?" Часта пытаецца сама ў сябе і не знаходзіць іх.

І сэрца чарствела, рабілася каменным, толькі адно кволае пачуцьцё і засталося ў ім—матчынае каханьне да сына—усе іншыя радасьці жыцьця незваротна загінулі для яе.

Раз, пасьля шмат тыдняў ад навальніцы, даведалася Люба. Ігнась спаў. Яна запыталася ў Агапы—ці лепш яму.

— Здаецца лепш, дзеткі. Але трэба вось сёньня яшчэ павезьці ў больніцу.

— Я вам пасоблю, цётка.

— Дзякую, Любка, можа ня трэба. Бацькі даведаюцца, а потым будуць маракаваць.

— Не, цётухна, і не гаварыце. Яны ведаюць, нічога ня будуць казаць.

Супроць такое ўпартасьці не знайшлося ў Агапы слоў, і яна стала зьбірацца ў дарогу. Калі ўжо вышла на двор слаць пасьцель у калясцы, Ігнась прачнуўся і ўбачыў Любу. Сьветлая радасьць паказалася ў вачох, упрыгожыла бляды, сухі твар.

— Люба,—прашаптаў, і ў адным толькі слове вылілася з яго сэрца ўсё, што хацеў сказаць.

— Ты мо' хочаш чаго, Ігнась?

— Не. А дзе мама?

— На двары, цябе выбіраецца везьці ў больніцу.

Увайшла Агапа.

— Паедам, Ігнаська.

Заміж адказу ён глядзеў на Любу, як-бы чаго пытаўся моўчкі.

— І Люба, сынок, хоча з намі.

Ён пажывеў і ўстаў. Маці хутка падбегла і падтрымала. З дзіўнаю руплівасьцю сьцерагла яна сілы хворага і дзякуючы тому здароўе хутчэй варочалася да Ігнася. Кладучыся ў каляску, ён варочаў галавою, быццам упэўніваўся, ці ўсе тут.

— Ах, я і забылася, сынок... З радасьці, дзеткі... Кіяш! Кіяш!—паклікала.—Ня можа без яго ехаць.

З маленькага слабенькага некалі шчанючка вырас дужы сабака, з тонкім пруткім хвастом, і імя яму даў сам Ігнась. Рос ён непамерна, як і ўсякая жывая істота, на якую зусім ці мала аддаюць увагі, а калі заўважаюць, дык дужа дзівяцца, калі гэта магло яго так выгнаць.

Калі толькі Ігнась прачынаўся ад сну-забыцьця, дык прасіў матку паклікаць у хату Кіяша. За якою важнаю работаю ня быў-бы той, заўсёды з вясёлым віхлястым відам бег чвалам дадому. Гэта ўвайшло ў звычай у сяброў: калі Ігнась хацеў бачыць Кіяша, дык ведаў, што яго няма ў хаце, а той, пачуўшы Агапін голас, садзіў проста ў хату, бо ведаў, што патрэбен Ігнасю і што ў яго можна сарваць часам смачнае перапечкі ці рэдкага, але пахучага крупніку.

З кожнаю яздою ў больніцу Ігнась браў з сабою ў горад сабаку. Сёньня ён правіла свайго не захацеў зьмяняць і Любе выпала магчымасьць наглядзецца досыць на сяброўства хлапчука і сабакі.

Ігнась быў здаволен. І ад гэтага парываньне нейкае жвавае і балзёрае поўніла грудзі, а вочы радасна праменіліся бліщчастым сьвятлом.

— Табе добра сёньня, сынок?—пыталася, і без таго перакакаўшыся, Агапа.

— Добра, мама.

Погляд яго ласкава пераскаквае з мацеры на Любу, на Кіяша і жмурыцца няпрывыкла ад яснага сонца.

Дымком тамленьня пераліваецца на сінім небасхіле празрысты дзень. Весела і ў той-жа самы час неяк мякка-цяжкавата песьцяць вока гэтыя малюнкі. Павекі самі па сабе паволі плюшчацца, а мяккі звон-шум у паветры плавае, калыша. Цягне на сон.

*

У БОЛЬНІЦЫ доўга чакалі чаргі, і калі выклікалі, доктар з прыемнасьцю заўважыў на добры выгляд у Ігнася. Выстукаўшы і паслухаўшы, ён параіў патроху гуляць на паветры, есьці здароўшую страву,—і праз два-тры тыдні хлапец будзе здаровым як належыць.

— Лякарства не патрэбна ўжо,—дадаў ён.

— Праз тыдзень, калі ня будзе горш, абавязкова наведайцеся. А вы самі здаровы?—спытаўся раптам доктар у Агапы.

— Дзякуй, паночку! Здарова, здаецца,—якое цяпер у ліха здароўе.

Доктар правёў яе кароткім поглядам і паківаў галавою.

На калідоры рэзка пахла лекамі, масьляністаю афарбоўкаю сьцен, потам і гнільлю чалавечага цела.

Пачуўшы прыемныя словы ад доктара, цяпер агідна было тут на калідоры, дзе сядзелі, стаялі і ляжалі з паперавязванымі рукамі і нагамі, з чырвона-сьлязучымі вачмі,— сухотныя, васьпяныя, тыфусныя, з бясьсільным адхаркваньнем, уздыхамі і енчаньнем. Першы раз заўважыла Агапа, як тут няма чым дыхаць, і боязнасьць, што можна схапіць якую пошасьць, выпхнула за дзьверы.

Ігнась дыбаў паволі сам. Слабасьць дык яшчэ моцная адчувалася, але запэўніваньні доктаравы выклікалі жаданьне рухацца самому, бяз чужое дапамогі. Надакучыла ўжо хвароба, хацелася зноў стаць дужаму, як раней.

Люба сядзела і пазірала на дзьверы больніцы. Чакаючы Агапу з Ігнасём, яна не заўважыла, як Кіяш выскачыў на вуліцу і зьнік. Любе ўспамянулася ранішняя гутарка з Агапаю і падумалася, якая добрая ў Ігнася маці. А жыве вось кепска, горш за ўсіх у сяле. На двор вышлі Ігнась з Агапаю.

— Доктар сказаў, Любка, што не патрэбны ўжо лякарствы! Колькі выстрадаў, сынок мой...

Яе сухі і жоўты твар на хвіліну ўтраціў сваю радасьць і па пары буйных сьлёз выкацілася на шчокі па зморшчках.

— Цяпер будзе здаровы,—узбадзёрыла Люба.—А дзе-ж гэта Кіяш?—запыталася наўмысьля, каб накіраваць на другое думкі Агапіны, бо сьлёзы яе і гаротнасьць шчыпалі балюча за сэрца.

На вуліцы пачуўся сабачы лемант і ў браму ўскочыў Кіяш з кавалкам мяса ў зубах. Віляючы хвастом, сабака падбег да каляскі.

— Дзе ты ўзяў, гад?—добрадушна запыталася Агапа.

Кіяш віляў хвастом і лез у каляску.

## *РАДАСЬЦЬ ГАРАПАШНІЦКАЯ*

АЧУНЯЎ Ігнась. Зноў пацягнуліся доўгаю чарадою дні нішчаньня. У пашы адмовіла сяло. Часіны перападалі, дык дзень пры дні хадзіў з маткаю ў заработкі. Дзе іх ня ведалі: і суседзі, і засуседзі, і пан з-за ракі, і ў горадзе.

Зноў мінула лета. Што раніцы па сонцы пад восеньскай імгою хадзіў Ігнась у сады абіраць ябыкі. Праз цэлы дзень

у заработках аб скібцы чарствога хлеба з кавалкам селядца. Дадому прыносіў саракоўкі ці пяцьдзесяткі і са здаволеным пачуцьцём каханьня аддаваў да грошыка матцы. Агапа зарабляла тыя самыя саракоўкі на гарадзкіх агародах. Дзе там было Ігнасю падавацца далей вучыцца, хто яго прыняў-бы гэткага, хоць ён і скончыў першым народную школу.

Пажоўклым лісьцем адсыпалася восень. А з восеньню разам міналіся і заработкі, бо ўзімку хіба дзён колькі трапіцца пайсьці і то за шчасьцем. Ігнась асеў дома.

Нудныя дні насталі для яго. Сумота. Люба вось ужо каторую зіму вучыцца ў гімназіі. З яе адсутнасьцю нікога з блізкіх не засталося ў Ігнася. Ня было ў яго ні хаўрусу, ні колегаваньня ні з кім больш са сваіх аднагодкаў ці малодшых; не хацеў падпадаць пад высьмешкі, дый толку мала—хадзіць, скажам, на вячоркі. Праседжваў дні дома, раніцою пасабляючы матцы па гаспадарцы, а ўвечары забаўляючыся з Кіяшом.

Разумны сабака стаў Кіяш. Ігнась навучыў яго заносіць і прыносіць розныя рэчы. Кіяш паслухмяна рабіў, што загадваў гаспадар, і быў відавочна здаволены, калі ўгадваў думку. Ігнась тады лашчыў сабаку, даваў яму розныя прыгожыя імёны і частаваў кавалкам хлеба ці бульбінаю. Бывала, што Кіяш памыляўся,—Ігнась весела рагатаў з сабачае незразумеласьці. Сабака сарамяжа павільваў хвастом, быццам сказаць хацеў:

— Бывае-ж такі выпадак, што як ня ўнікаеш, а ўсё-ж спатыкнешся.

Ігнась добрадушна глядзіў сабачую морду.

Гэтак праходзілі першыя зімовыя дні і вечары. Кіяш з посьпехам усвойваў Ігнасёву навуку, але гэта не магло задаволіць самога Ігнася.

І раз пад вечар, абуўшыся ў новыя лапці з белымі анучкамі, пайшоў ён да настаўніцы. Тая была дома. Адказаўшы на прывітаньне, ласкава запыталася:

— Што скажаш, Ігнась?

— Я хацеў прасіць у вас кніжак пачытаць.

— Бяда з кніжкамі... З школьнае бібліотэкі не магу даць, бо на выпадак чаго—наедзе начальства... Ды ты-ж, здаецца, і перачытаў яе ўсю

Сьцяўшы сэрца, слухаў Ігнась, і раней, чымся настаўніца магла адмовіць у просьбе, загаманіў:

— Как вы ведалі толькі, як кепска жыць... Такая нудота. Цэлыя вечары няма чаго рабіць, ні вылезьці куды. Лепш-бы зусім ужо няпісьменным быць, каб ня ведаць ні аб чым. Цяпер мяне цягне кніга і з кніжкаю я не адзінокі. Ды вы ўсё гэта ведаеце і дарма я вам кажу.

Спаважна выслухала настаўніца шчырыя словы. Прасачыўшы за яго думкаю, яна падумала, што хлопец стане чалавекам, ня схіліцца перад жыцьцём, і ад шчырага добрага сэрца захацелася памагчы яму.

Ігнась любіў марыць аб будучым жыцьці, асабліва пасьля таго, як узяўся чытаць. Гадзінамі сядзіць, бывае, у куточку дзе і ўсё думае. Не па-хлапечаму і разважаць пачаў.

— Я дам табе, Ігнась, пару кніжак, толькі з умоваю, што, прачытаўшы, ты перакажаш мне зьмест. Праз дзесяць дзён прыходзь—яшчэ дам, у мяне ёсьць цікавыя кніжкі—свае ўласныя.

Настаўніца падышла да шафы з шклянымі дзьверцамі, выбрала дзьве кніжкі і дала Ігнасю.

— „Юры Міласлаўскі“ і „Капітанская дачка“.

Адчуўшы ў руках жаданыя кнігі, Ігнась прамармытаў нейкую падзяку і вышаў.

Вясёлы зьявіўся дадому.

— Чаго ты рады такі Ігнась?—запыталася маці.

— Хадзіў да настаўніцы... дала чытаць кніжак. Са школьных, казала, няможна, а са сваіх дала.

— Ты-ж падзякаваў хаця, сынок?—боязна запыталася маці.

Здаецца... Ну, вядома падзякаваў, хіба-ж ён мог не падзякаваць за такую ласку.

— Увечары, калі ты будзеш прасьці ці шыць, я чытацьму ўголас, каб і ты ведала, што напісана ў гэтых кніжках! А пасьля, як прачытаю, раскажу настаўніцы і за цябе.

Пры агульнай радасьці быў заўсёды і Кіяш; і тут сама ён круціўся пад нагамі, лез да рук.

Больш спакойныя дні пацяклі для маткі з сынам. Дзень праходзіў у рабоце—колькі таго дня, а наступаў вечар і Ігнась разгортваў кніжку. Пад роўнае сынава чытаньне бзыкала звонка ў руках у Агапы лёгкае верацяно. На гэты час сьціхаў пад сталом і Кіяш.

Паступова абое ўцягаліся ў чытаньне кніг: аднаму хацелася чытаць усё больш і больш, а другой слухаць. І так ужо сталася, што і маці, і сын нецярпліва чакалі на вечар. Толькі і асьвятляліся смутныя вочы радасьцю, што кніжкаю: разам з героямі апавяданьняў жылі яны іхным жыцьцём, іхнымі радасьцямі, іх горам у той момант.

Толькі, як скончыў Ігнась чытаць абедзьве кніжкі, Агапа сказала:

— Ты папытай, сынок, у настаўніцы, можа ў яе ёсьць кніжкі пра наша мужыцкае жыцьцё.

— Добра, мама, я папытаю.

Яна жадала паслухаць пра жыцьцё такіх, як сама, і ў кніжках, можа, знайсьці адказ на некаторыя цьмяныя пытаньні. Да таго-ж хацелася таксама—ці ведаюць тыя людзі, што пішуць кніжкі, пра такіх Агап ды Ігнасёў.

З чытаньнем лягчэй жылося, здаецца, спакайней, бо на час чытаньня забывалася пра гора і бядоты. У Ігнася часам прачыналася ранейшая нуда, але гэта таму, што ня было Любы. Але, нудзячыся, і супакойваў сам сябе:

— Чаго-ж шкадаваць, што няма Любы. Яна-ж ня дзе-небудзь, не прападзе. Вывучыцца вось і стане чалавекам. Не шкадаваць трэба, а радавацца.

Але, не ўважаючы на самазапэўніваньні, довады і доказы нуднавата было бяз добрае Любы. Ігнась жадаў моўчкі, каб хутчэй гэта яна прыяжджала. А потым думаў, што няможна кінуць вучэньне і рашыў, што і лепш будзе, калі разлука сьцягнецца абоім, бо ў сустрэчы затое радасьней будзе. Вось толькі пераказаць-бы свае думкі, сваю нуду без яе, каб ведала яна.

І Ігнась браў сшытак і запісваў у яго ўсё, што перажываў адзін тут бяз Любы.

Калі траплялася, дык Ігнась ішоў з цэпам у заработкі. Усё трохі пасабляў мацеры. Агапа радавалася, гледзячы на сына. Яна бачыла, што дажыве сьмерці пры сыне, што з голаду не давядзецца хадзіць прасіць у людзей на старасьць.

Ігнась як-бы сачыў за матчынымі думкамі і з кожным днём выказваў ёй больш спагады. Каб больш прыемна было ёй, турбаваўся з работаю, а толькі выстанецца вольная часінка—зараз-жа за кніжку.

Ужо другі раз памяняў Ігнась у настаўніцы кніжкі і ўзяў тых, якіх хацела маці. Уважна слухала Агапа чытаньне і сьлёзы часта рабілі мокрым яе твар. І ў кніжках знаходзіла яна гаротных, і з кніжак чула пра несправядлівасьць людзкую. Толькі зацікавілася яно ў кніжках, казалася, што спрадвеку цягнецца гэтак, дык значыць і канца яму няма.

І нешта аднаго разу ў Агапы вынікла думка: трэба аддаць Ігнася ў горад вучыцца на якога сьлесара, бо без работы ўсё адно як бяз рук. А ня маючы зямлі, з аднэю хаткаю, з голаду хіба памерці.

Тымчасам Ігнась працаваў, рос, вучыўся, чытаючы кніжкі.

ЛЮБА ў гімназіі сярод незнаёмых і знаёмых таварышак па вучэньні таксама з нецярплівасьцю чакала на сьвяты. Часта думала яна, як пражывае Ігнась, як маецца добрая, гаротная Агапа, ці здаровы.

Раз на тыдні прыяжджаў бацька, прывозіў харчы. Заўсёды, калі бачыла Люба яго, дык памыкалася запытацца пра Ігнася. І кожнага разу, не сказаўшы ні слова, адварочвалася—чырвоны сорам замыкаў вусны. А потым узнадзейвала сябе, што зробіць гэта другім разам.

У чаканьні вельмі марудна цягнуўся тыдзень, а школьныя турботы праз цэлыя дні павялічвалі тэрмін. Бывала часамі, такімі прыкрымі рабіліся ёй розныя задачнікі ды граматыкі. І гатовая ўжо, здаецца, кінуць вурокі, яна крута перадумвала і садзілася за кніжкі.

Аднае нядзелькі зранку яшчэ ўвабралася па-сьвятковаму, думаючы сустрэць бацьку. Гаспадыня кватэры — старая чыноўніца-п'яніца—заскаліла хітра вока і сьмяшком праказала:

— Гуляць—хі-хі-хі-хі. Ідзі пагуляй, Любка,—Юркевіч чакае ўжо на мосьце. Алеська пабегла туды, быстрэйшая яна за цябе.

— А я вось не пайду на мост, а сустракацьму бацьку.

Ня чакаючы далейшае размовы, яна хутка вышла.

— Сьцерва!—нечакана ў злосьці падумала на гаспадыню.—Па сабе мяркуе... Калі сама штовечара прымае розных знаёмых, дык думае, што і я пабягу к Юркевічу.

Юркевіч быў павятовец (вучыўся ў павятовым гарадзкім вучылішчы) і, паводле чутак, вучыўся вельмі дрэнна. Не ўважаючы на беднасьць бацькоў—дробных шляхцічаў,—заўсёды меў на гуляньне грошы, а гуляньне ў яго было першым клопатам. Вось і на кватэру да Любы з таварышкаю ходзіць па два, па тры разы на тыдні.

На кватэры разам з Любаю жыла таварышка па клясе Алеська, бойкая, вясёлая дзяўчынка. Адна бяда ў яе толькі: як і Юркевіч, гуляць любіць. І вурокі быццам пасьпявае вучыць, і ўбірацца, а гуляць—дык конча. Можа гэта і зьвяло іх з Юркевічам.

Любе цяжэй было з вурокамі. Больш за Алеську і чытала, і пісала, і завучвала. Але за тое і адказвала лепш на вуроках, ды на экзамэнах.

„Гэта-ж цікава, як яны вучацца. Юркевіч, нічога ня ведаючы, як баран, а пераходзіць з клясы ў клясу".

У глыбіні душы няпрыемнае пачуцьцё варушылася ў яе да Юркевіча.

— Чаму ня вучыцца як сьлед? Бацькі-ж трацяцца, сабе ў лішнім адмаўляюць, а ён, глядзі... Пагулянкамі толькі і цікавіцца.

Доўга гуляла на вуліцы Люба. Шмат з сяла прыехала ў горад, а бацькі ня відаць. Гуляць больш не хацелася і яна павярнулася ісьці да кватэры.

Абрыдла ўжо ў гэтым горадзе за колькі год, што яна вучыцца тут. Няхай-бы хоць на сьвяты хутчэй пушчалі. Не раней як праз паўтара тыдні яшчэ.

— Люба Дарошаўна—аклікнуў знаёмы голас.

Цераз вуліцу перайшоў і прывітаўся Юркевіч.

— Гуляеце?

— Не, дадому іду!—варожа адрэзала яна.

— Паслухайце, Люба... Ды што гэта з вамі сёньня такое? Алеська злосная—адна ўцякла на раку, а вы таксама—вунь якая.

Ён гаварыў у тоне старэйшага, старанна выпучваючы грудзі пад чорнымі гузікамі павятоўскае формы.

— Мне ўсё гэта зусім ня цікава...

— Чаму?

— Таму, што ня люблю я гэтага і, па-другое, зараз прыедзе бацька і я іду на кватэру.

— Дык я правяду вас.

— Няма чаго. І сама патраплю,—і Люба шпарка пайшла ад Юркевіча.

Бацька ня прыехаў таго дня, толькі пераслаў суседам паўтара рублі грошай.

— Перакажыце тату, каб у тую сераду прыехаў па мяне.

А больш нічога не запыталася—у суседа тым больш няёмка было-б, бо ніхто не спагадаў Ігнасю. І, успамянуўшы пра канікулы, прыемна ўяўляць Любе, як захутаецца ў кажушок на санках і будзе слухаць у дарозе марозныя рыпы. І гэтак прыемна будзе на марозе падстаўляць твар халоднаму колкаму ветру перад сустрэчаю дома!

Юркевіч таго дня гуляць ня прышоў. Алеська, загневаўшыся на яго, скрыва пазірала і на Любу, быццам тая вінавата была ў яе гневе.

Увесь тыдзень сядзела Люба за кніжкамі, нікуды ня вылазячы. У суботу дырэктар нечакана паведаміў, што канікулы пачнуцца не з серады, а з гэтае нядзелі. Як узрадавалася Люба!

— Субота!.. Сёньня канец заняткам!

Лёгка-лёгка забілася сэрца і з радасьці падхапіла Люба пад руку Алеську і бегма пацягла на вуліцу.

— Люба, ты звар'яцела?! Пусьці!

Насупіліся бровы ў Любы—дагалалася, чаго Алеся злуе, за Юркевіча. Вось дзівачка!

— Ты злосная на мяне, Алеся?

— Ды не, нашто ты валачэш мяне...

— Ну, дык бывай, Алеська, праз два тыдні ўбачымся. Я сёньня дадому.

Алеська зірнула падазрона. Люба ўся палала з радасьці. Растаў гнеў у Алескі—шчыра разьвіталася з таварышкаю.

## ЗІМОВЫЯ КРАСКІ

НАТОМЛЕНАЯ, але радасная ўвайшла ў хату Люба. Дома не чакалі. Першыя хвіліны — аглядваньне родных куткоў—ці не зьмянілася што? а потым: усё—даўно знаёмае.

Папалуднаваўшы, Люба апранулася ў кажушок і сабралася ісьці.

— Куды ты, Люба?—пытаецца маці.

— На вуліцу.

— Ня ідзі нідзе далёка, вячэраць будзем.

На вуліцы весела перад нядзелькаю. Па ледзяных горках коўзаюцца дзеці. Бегаюць адна да аднае дзяўчаты, умаўляюцца—куды зьбірацца гуляць. І адна аднэй уздагон гукаюць:

— Глядзі-ж прыходзь! Музыкі будуць!

Бачыла агульную вясёласьць Люба і самой захацелася з ёю зьліцца. Будуць музыкі, будуць хлопцы з дзяўчатамі скакаць. Не, усё гэта ня тое, не яе.

Павольна пайшла яна вуліцаю. А куды ідзе—ня думала.

„Ехаць цягло, а тут гэтак нудна“

З думак вышла тады, калі разгледзелася, што зьвярнула ў школьны двор (па старой прывычцы). Чаго-ж ёй ісьці сюды? Але якраз ляпнулі дзьверы і Люба мусіла ўжо ісьці да настаўніцы. Раптам—якое вялікае зьдзіўленьне і разам радасьць.

— Ігнась! Як ведала што ты тут.

А Ігнась з неспадзеўку ня мог і адказаць нічога. Толькі гэта і хвіліны мо' не цяглося. Няёмкасьць, як чужая тут паміж іх, зусім непатрэбная, адляцела і не зьвярнулася. Ігнась з Любаю вышлі з двара і павольна пайшлі вуліцаю.

На іх дралі вочы бабы, злосьненька ўсьміхаліся суседзі і ўсе, каму не лянота, узіраліся і праводзілі вачыма, каб пагрэць пасьля языкі, прыхлусіўшы ў сто разоў.

А яны, вінавайцы мо' па сваёй маладосьці, ня чулі, ня бачылі нічога. Ды хіба маглі бачыць! Столькі часу прайшло, як разлучылі іх розныя жыцьцёвыя сьцежкі. Сустрэча-ж пасьля доўгіх тыдняў не павінна замыкацца ў назіраньне таго, што дзеецца вакол.

Успаміналі сваё—цяпер ужо далёкае—мінулае: палетак, школу, сумесныя гульні. І такім блізкім з далёкага пахла, такім любым і сьветлым, што яны поўнасьцю былі ў тым далёкім. Ня было месца сучаснаму, а тым больш будучаму, невядомаму. Ігнась адчуваў, якім дарагім зьвязала яго Люба ў мінулым, а Люба бачыла пякрыўджанага ўсімі Ігнася і кволае ды крохкае пачуцьцё ў ёй расло і мацнела і хацелася быць доўга, доўга гэтак, як цяпер.

Самі сабой выплывалі малюнкі вясны-маладзіцы, прыгожае сьвята палетку. Якое вясёлае жыцьцё вакол—журботна-вясёлае... Сягонешні мароз схаваўся, зьнік, зіма прапала; а перад вачыма цьвітуць у кветках паплавы, палеткі, зелянеюць радасна дрэвы, рунь, наліваецца жыцьцём усё, шырыцца, поўніцца, расьце.

Заўсёды вось так перад вачыма дарослага ў гэткіх ружова-ясных, прыгожых малюнках-успамінах праходзяць яго мінулае, яго дзяцінныя часы. Колькі ружовых фарбаў, колькі сьветлых часін, колькі вясёласьці, вытканае з дзіцячае бястурботнасьці, з якім прыемным смуткам успамінаецца ўсё пасьля... Зялёная з імху, страха; разбураны, забруджаны сьвіньнямі ганак; тут-жа насупроць збутвелы плот, а каля яго шумлівы ў вецер вяз; на вязу шпакоўня з шчабетнікамі-вераб'ямі; а над усім гэтым плоймы ластавак у сінім бяскраі вышыні пад сонцам. З усім зьвязаны тыя ці іншыя выдатныя часіны жыцьця, што клінам вечным увайшлі ў памяць і пакінулі ў ёй, які ніколі ня згладзіцца, сьлед кволасьці, сьлед хараства.

Гутарылася весела абоім, быццам на пагулянцы, ды ня ўзімку, а ў моры сонца, не на вуліцы паміж гор сьнегу, а на неабдымнай для вока прасторы зелянін. Проста выпала з галавы як непатрэбнае, што гэта-ж не надоўга, на два толькі тыдні і потым зноў пойдуць дні работы, дробныя клопаты імглівенькае, шэрае будзёншчыны.

Як прышлі ў хату, Агапы ня было дома. З сабачаю аддансьцю Кіяш кінуўся к гаспадару і ветла абнюхаў і аблізаў Любіны рукі.

— Пазнаў? Пазнаў, Кіяш?—церабіў яго за вушы і гладзіў рады Ігнась.

А задаволены Кіяш стаў круціцца каля Любы, скакаць на грудзі.

— Люба! Глядзі, Люба, нават Кіяш не забыў цябе! А цяпер хадзі сюды, Люба, угадай, што я пакажу табе. Ну, угадай...

Люба ведала, што Ігнась не маленькі ўжо, не блазьнюк, значыць, ня мог паказаць цацкі якое, але-ж ён не настолькі і багаты, каб прыдбаць рэч дарагую і цікавую.

— Можа сільлё ці птушку?

— Ай, не, я гэтым не займаюся.

— Дык можа кніжку?

— Не.

— Дык ты маніш толькі, жартуеш.

— Ой, не, не. Ты толькі не ўгадала. І не ўгадаеш, мусіць. Кніжкі я чытаю, дык яны відны, вунь ляжаць і сёньня вось хадзіў да настаўніцы, але яна сказала, што больш няма, а заўтра паедзе ў горад ды прывязе. А ты думала, чаго я быў там?

— Ня ведаю, гуляць мо' хадзіў.

— Я поўна, поўна чытаю цяпер кніг. Уголас чытаю, дык слухае і мама. Кніжкі пасталі маімі лепшымі прыяцелямі.

— Лепшымі за мяне! Ігнась?

— Не, Люба, не! За цябе ня лепшыя...

— Добра Ігнась, чытай.

— Але-ж мы загаманіліся і я зноў забыў паказаць табе, што хацеў. Угадай хутчэй, Люба.

— А ты сам вазьмі ды ўгадай, паказаўшы—гэта лепей будзе.

Калі Ігнась дастаў з палічкі жоўценькі сшытак, Люба запыталася:

— Мабыць малюнкі?

Яна вельмі любіла малюнкі.

— Ды не, я ня ўмею маляваць,—сарамяжа азваўся Ігнась і падаў Любе сшытак.—Я гэтак нудзіўся. Гуляць нідзе ня гуляў. А як часам ня было ні работы, ні кніжак, думаў і ўсё гэта запісваў. Мне здавалася, што, перапісваючы на паперу, я пераказваю свае думкі таму, хто павінен іх ведаць. Папера і пяро сталі такімі-ж сябрамі мне, як і кніжка.

Люба чытала сшытак, а Ігнась апраўдваўся.

— Я часта ўспамінаў цябе, даўнейшае, і як гулялі разам. Усё запісваў...

Сорам пахварбаваў у чырвонае Любіны шчокі і ад таг
яшчэ больш нязграбны зрабіўся Ігнась. Але Люба не пакі
дала ўзірацца ў роўныя няцьвёрдыя літаркі і Ігнась пача
супакойвацца.

„Ну, нашто б ён пісаў, каб Люба цяпер не прачытала"

Люба ўжо дачытвала апошнюю старонку, калі прышл
Агапа.

— А-а а, я і ня ведала, што ў нас госьця! Дзе-ж т
цяпер, Любка?

Люба пакінула чытаць, але сшытка ня пушчала з рук
перагортвала.

— Вучуся яшчэ, цётка.

— Добра, дзеткі, вось гэта добра. Я свайго Ігнася ўс
думала вывучыць, аж не давялося.

— Ігнась мне пахваліўся, што не пакідае кніжкі. З кн
і самаму можна навучыцца.

— Дык-жэ ж, Любка... Як толькі вольная часінка, ды
грэйма за кніжку, і ежа не ў галаве. Мо' на сьвяты пус
цілі?—запыталася яна, любоўна гледзячы на дзяўчыну.

— На два тыдні, цётухна.

Агапа вышла ў сенцы нечага. А Люба перагортвала ў
сшытак. Ігнась украдкі пазіраў на яе і маўчаў.

„Што яна думае?.. Што яна скажа?"—у віхары дум
пралятали запытаньні.

Любе хацелася нешта сказаць, усёю істотаю імкнула
яна перарваць маўчанку, але быццам не ставала рашучась
І маўчалі гэтак абое, адно аднаго саромеючыся. Адале я
сказала:

— Табе не патрэбен гэты сшытак, Ігнась?

Ён не знайшоў што адказаць.

— Я вазьму сабе.

— Навошта ён табе?—запытаўся, нарэшце, Ігнась.

— Трэба.

— Нашто трэба?

Гінуў сьлед нядаўняе няёмкасьці. Кароценькія жар
хутка разагналі саромлівую напружанасьць. Зноў паст
яны Ігнасём і Любаю.

— Тут-жа пра мяне шмат напісана.

— Але гэта я пісаў для сябе.

— Пісаў для сябе, а напісанае будзе мне.

Апошнія словы пачула Агапа, увайшоўшы знадвор

— Не, ня дам,—жартуючы ухапіў Ігнась сшытак.

— Не, дасі!—вырвала Люба.

— Дай, Ігнаська, у цябе-ж яшчэ ёсьць?—як на дзяцей з цацкамі, азвалася Агапа.

— І яшчэ ёсьць?—запыталася Люба.

— Няма. Гэта мама думае пра чыстыя, нясьпісаныя.

— А ты сабе напішаш, сынок, — падтрымала Любу і Агапа.

— Напраўду, Ігнась, ты сабе напішаш, а гэта я вазьму.

— Бяры, што ўжо з табою зробіш. Але як напішу, дык ты увесну зноў адбярэш у мяне, хітрая. Калі не напішу, дык забяру назад.

— Можа напішаш.

— Напішаш, сынок, напішаш... А што-ж ты будзеш рабіць,—супакоіла Агапа.

— І вясною некалі зноў дасі пачытаць,—сказала Люба.

— Не, больш ня дам.

Лёгка стала гутарыцца, бяз усякага сораму глядзелі яны адно аднаму ў вочы. Было хораша, лёгка.

Ігнась апавядаў—колькі і што прачытаў бяз Любы. З захапленьнем пераказваў выдатныя зьявы з апавяданьняў і раманаў.

Дзень зьмяніўся на вечар. Заіскрыўся на вокнах месяц, асьвятліўшы рысачкі, лісьцікі і цудоўныя малюнкі, што малады марозік за кароткі вечаровы час намаляваў на шыбах.

Люба ўспамянула, што ёй час дахаты,—казалі-ж, каб ня бавілася.

— І праўда, ідзі, каб не казалі нічога хаця,—згадзіўся Ігнась.

У яго голасе Люба пачула шкадаваньне.

— Мы-ж часта будзем бачыцца.

Да сябе яна не запрашала Ігнася. Ведала, як скрыва паглядзелі-б бацькі і які гвалт узьняўся-б пасьля ў хаце.

— Заўтра прыдзі, Люба. Заўтра-ж нядзеля.

— Але прыдзі, Любка, пагуляй,—папрасіла і Агапа.

Люба схавала сшытак, наставіла каўнер у кажушку і разьвіталіся.

На двары перамігрваліся нярухомыя зоркі. Віднata, хоць чытай. Мароз мацнеў. Пачалі патрэскваць гулка калы ў платох. Пераліўным звонам плыў па сяле сабачы брэх.

А сяло стаяла задуменнае, нібы белаю хлёркаю палітае ўсё сонным зьзяньнем месяца.

ЧАСТА сустракаліся Ігнась з Любаю. Як вясновая думка-мара, прамігнуліся неўзаметку сьвяты. Прайшло два тыдні. Заўсёды гэтак бывае, калі поўніцца радасьцю сэрца, калі весёласьць буяніць цераз верх.

Ігнась сядзеў каля акна і пазіраў на вуліцу. Пад сонцам адталі вокны і пацёкі пацяклі на лаву.

Яшчэ ўчора бачыў Ігнась Любу, гаманіў з ёю, гуляў весела. Яшчэ толькі ўчора сказала яна, што сёньня бацька завязе яе зноў у горад. І ён сеў за сталом, усадзіў у акно галаву і чакаў, калі будзе ехаць Люба.

Маці колькі разоў ужо казала, каб ўцякаў ад акна—вокны растаюць і ідзе пара—учадзець можна. Ігнась ня чуў і пазіраў у той канец, адкуль мелася ехаць Люба.

Сонца не па-зімоваму прыгрэла вуліцу. Перапырхваючы з месца на месца, спакойна атрэпваліся пакудлычаныя верабʻі. Яны шукалі ежы, грэбліся з піскам і шчэбетам у брудных камлыгах сьнегу. Ігнась бачыў, як яны рады сонцу і якая згода і прыяцельства пануе ў іхных шэрых сямейках.

Але вось раптам спалохана ўспырхнулі яны і паселі на плот. Адале Ігнась убачыў канёву галаву, усяго яго. А ў санках, захутаўшыся ў свой кажушок, пазірае бокам на Ігнасёвы вокны Люба.

Ігнась схіліўся і махнуў рукою. Люба адказала. Мабыць заўважыў бацька, бо, нешта буркнуўшы дачцы, сьцебануў па хвасьце каня, і санкі схаваліся за вялікаю гарою сьнегу.

Ігнась правёў Любу. Зноў пацягнуліся дні будзёншчыны шэрае, нуднае. Зноў узяўся за сваю ранейшую работу: за чытаньне і пісаньне. Паступова яго думкі набывалі разважлівасьць, а разважаньні гублялі рэштку свае дзіцячае афарбоўкі. Сурʻёзнасьць, маладая сталасьць голасна набывалі правы, патрабавалі сабе належнага месца.

Колькі дзён прайшло, як паехала Люба, і па сялу, а вельмі на тым канцы, дзе жылі Ігнась і Люба, бабы пашлі малоць языкамі, што „Агапін байструк любошчы завёў з Аксютаваю Любаю". А ўжо, калі пачалі балбатаць, дык вядома, каб увесьці ў вушы каму сьлед.

Хутка дачуўся пра гэта Любін бацька. Першае-ж нядзелі, паехаўшы ў горад, ён буйна пагаварыў з дачкою. А ў канцы размовы, прыціскваючы на кожным слове, кінуў у твар дачцы:

— Калі толькі праўду мелюць, дык глядзі, каб я больш пра гэта ня чуў і табе не казаў. Не на тое я цябе вучу, каб з якім галапупкам зьвязвалася.

— Тата!..—перапыніла яго Люба, але больш не сказала ні слова.

— Ну, што тата. Чаго добрага яшчэ...

Ён не дагаварыў і строга паглядзеў на маўклівую Любу.

Ігнась таксама чуў пра ўсе плёткі. Што далей, дык тым больш мудравалі, хто як мог.

Шпарчэйшыя і дасьціпнейшыя на язык, дык нават жанілі Ігнася з Любаю.

— Вось глядзі балазе... Байструкі ўсе, на іх страх, надта змысныя. А гэты і казаць няма чаго. Перацягне Аксютаву гаспадарку.

— Дзе гэта відана, каб вучаная па-гарадзкому, праз колькі год, ды каб вышла замуж за старца. Ня будзе таго!

І прыемна, і няпрыемна было чуць Ігнасю, бо гаварылі часткаю і праўду—ён закахаўся ў Любу, а часткаю—і большаю—хлусьню, што каму толькі на язык успадзе—ня думаў перацягваць ён Аксютавае гаспадаркі. Мабыць, чула і Агапа пра плёткі, але сыну не казала. А ўсё сяло, як з прывязі спушчанае, гаркала, брахала на адзінокую гаротную кабеціну з сынам. Дарэмна брахала.

У маўклівай згодзе абое стараліся менш паказвацца ў людзі, хіба толькі па канечнай патрэбе. Па кніжкі да настаўніцы Ігнась хадзіў увечары, як толькі цямнела на дварэ, каб ня бачыў ніхто. Зусім не давалі ніякіх прычын для разматых зводаў, але што: людзкіх языкоў на прывязь не пабярэш.

І мусіць таму, што ўсё сяло асабліва варожа настроілася да Агапы з Ігнасём, ён пачаў часьцей задумвацца пра сваё будучае. Аднаго разу, прышоўшы знадворку, Ігнась сказаў мацеры:

— Увесну, мама, пайду я вучыцца за сьлесара.

— Дзе-ж ты грошай возьмеш, сынок, плаціць за вучэньне?

— Мне, здаецца, што калі ўмовіцца добра з гаспадаром, дык можна і нічога не плаціць.

— Як ты ўмовішся, сынок?

Матка вя была супроць намераў сына.

— А можна згадзіцца рабіць больш, і нават хатнюю работу.

Магчыма, што сын яе думаў і добра—каб толькі гэтая думка спраўдзілася, каб стаў ён чалавекам. Колькі ночай ня спала, усё думала пра гэта, а ён і сам вось думае—загаманіў:

— А праз колькі месяцаў, мама, спадзяюся, што гаспадар пачне мне плаціць. Хоць на харчы можа заробіцца.

— Добра-б сынок,—проста сказала Агапа.

— Вось толькі табе пакуль што цяжка будзе харчаваць абоіх, - задуменна праказаў Ігнась.

Ён бачыў усю цяжкасьць становішча і палохаўся—не за сябе, а за мацеру, але іначай нельга зрабіць: каб жыць, трэба рашыцца і пайсьці ў гэта.

— Што-ж парадзіць, Ігнаська, мой любы, дарагі сынок, калі больш няма ў якія дзьверы стукнуцца. Падкармлю вось парсючкоў, мо сточым канцы з канцамі на год, а там—бог бацька.

— Некалі станем на ногі, няпраўда, лепш стане жыць,—паддаў сабе бадзёрасьці Ігнась і як-быццам узнадзеіліся трохі абое.

Дый трэ' было ўзнадзейвацца, бо больш нічога сьветлага не ясьнела ўперадзе. Вострымі калючкамі нялюдзкага гора ўсланы іхны шлях да жыцьця, усе сьцежкі спавіты туманамі са сьлёз.

...Зіма падходзіла к свайму канцу.

ЧАСТКА ДРУГАЯ

# НА ЗАЛОМЕ

## *ВЯСНА Ў МАЙСТЭРНІ*

ЗНОЎ была вясна—прыгожая, маладая. Зноў радасьцю спавівала, зноў давала надзеі. Зноў у выглядзе кожнага пад прыгрэвам усё большым, мацнейшым з цягам дзён сонечная бадзёрасьць зьменьвала сабою пераможны адбітак зімы—на ўсіх, на ўсім. Ды хіба-ж магло быць іначай?

У дашчанай майстэрні Ігнась з грукатам і лёскатам выпростваў на калодзе вялікія лісты бляхі. З ім разам грукацелі па ўсёй майстэрні яшчэ з пяць хлапцоў. Зрэдку перакідаліся яны скупымі цяжкімі словамі, дый то ў сквярліва-лапатлівым звоне бляхі нельга было пачуць іх.

Ігнась рабіў сваю работу ахвотна, лёгка—ён хутка скеміў сваё штукарства, і рукі яго заўсёды былі на сваім месцы: адна, не адпушчаючы ліста бляхі, зграбна адсоўвае і падсоўвае яго, а другая—з лёгкім дзеравяным малатком—дасьціпна пападае заўсёды туды, дзе патрабуецца выцяць мякка ці жорстка. Натхненьне ахапляла яго, выклікала маладую да сябе ўпэўненасьць, надзеі асьвятлялі твар, рабілі прыгожа-сьветлым, ясным. Бо іначай і не магло быць: сьвяціла бадзёра сонца, цёпла грэла праз невялікія пару вокан іржавую, закіданую бляхаю майстэрню. Цягло на двор, уладна клікала зьліцца з сонцам, з вясновым шумам-гоманам.

Ігнась паглядзеў у акно і сашчурыў вочы.

Па тротуары ішлі дзеці, мужчыны, кабеты, і ва ўсіх весела шчурыліся вочы і ўсе нязвычна паварочвалі зрок направа, усе пазіралі ў акно майстэрні. Міжволі вусны складаліся на ўсьмешку і твары рабіліся блізка-знаёмымі такімі па-дзіцячаму простымі.

Як-бы ў адказ гэтым усьмешкам, Ігнась і сам усьміхнуўся. Вясёлая ўсьмешлівасьць ня сышла з твару, а расплылася шырока і засталася надоўга так.

Вось прайшла дзяўчына. І яна па-дзявоцку, маладо, люба шчурыць свае мілыя вочкі. Зірнула ў акно майстэрні. Ігнась яшчэ больш прасьвятліў усьмешку—дзяўчына ня

так. як усе, а па-свойму сапраўды зірнула, працяла глыбока шыбу і ўпялася на кароценькае імгненьне ў Ігнася.

Разам з сонечнаю любаю шыраю вырасла ў грудзёх пагарачэлых замяшаньне. Нават не на хвіліну, на адно толькі імгненьне было гэта ўзаемнае сузіраньне,—бягучаю, маўклівую сустрэчаю маладых воч. Потым раптоўна палахлівы цянёк узьбег на вясновую радасьць усьмешкі і дзяўчына стромка хіснулася на бок. Адначасова брэх сабачы заліўчасты пахаладзіў шчурыньне воч, украў сонечную шыр. Ігнась выскачыў на двор.

Малюпаценькі сабачка боязна ціснуў пад сябе хвост і ня зусім ахвотна—толькі бачачы сілу свайго сустрэчнага—даваўся абнюхаць Кіяшу. А дзяўчына, адбегшы на сярэдзіну вуліцы, клікала зусім незнаёмым Ігнасю імем свайго сабачку. Яна ўжо не глядзела на Ігнася, і погляд воч быў абыякавы, яна ня шчурылася, ня было ў іх тае цікавасьці, сьмяхотнасьці. Клікала сабачку. Па тоне голасу Ігнась пачуў: губляла цярплівасьць.

— Кіяш!.. На-цю!

Вельмі хутка і надта сур'ёзна гукнуў ён на сабаку. І ад гэтае напружнасьці замяшаўся зноў, пачырванеў. Але нібы зноў цягло зірнуць на дзяўчыну. Глянуў і больш пачырванеў, пагладзіў Кіяша.

— Ідзі ляж... Ідзі.

Кіяш адбег. Ігнась павярнуўся.

Дзяўчыны ня было ўжо—яна толькі-што зьвярнула на суседнюю вуліцу.

Таварышы па майстэрні бачылі ўсю сцэну на вуліцы і сустрэлі Ігнася згодным і колкім рогатам і сьмешкамі.

— Ыш, чорт, на паненак зазіраецца.

— Нібыта яму сабака патрэбен быў.

— Убачыў-бы цябе на дварэ стары Зусь, пачасаў-бы тады патыліцу,—сказаў сур'ёзны Арон, пакідаючы на час работу.

— А цікава было-б бачыць гэта,—задзіракавата падхапіў лісьлівы гуляй-вецер Юзік.

Апошняе значыла, што Юзіку па сваёй прыроднай лісьлівасьці ці проста па нейкім гарэзьлівым жаданьні хацелася расказаць пра гэты нікчэмны выпадак з новенькім у майстэрні гаспадару бляхарні. Але таварышы з такім дакорам зірнулі, што ён змоўк.

— Думаеш, Зусь дабавіць к твайму заработку за гэта—неяк цьвёрда сказаў Арон.—А ці ведаеш, што зрабіў бы балюча вось яму, падумай. Вазьмі, стань на яго месца—лягчэй было-б табе? Дый гэтак: каму была-б карысьць? Усё таму-ж Зусю, якога ў душы ты сам ня любіш, з якога

часта сьмяешся. А дазнаўся-б толькі Зусь—глядзі—на рубля з саракоўкаю і менш зарабіў-бы за месяц. Ці пасьмяяўся-б тады, зарабляючы ўсяго якіх дзесяць рублёў.

Ігнась з падзякаю зірнуў на мала знаёмага яму Арона. І хлопцы слухалі ягоныя словы і, відаць, згаджаліся з ім. А твар Юзікаў сьвіціўся ўсё тэю-ж гарэзасьцю.

— Цікава, чорт вазьмі тваю маму, пабачыць усё-ж такі, як будзе злаваць Зусь.

Але рашуча і з пагрозаю наперабой сказалі яму тры астатніх:

— Ну, глядзі!.. Дагадайся толькі зрабіць!..

Гэта ўжо значыла поўна і тон падобных слоў, і сэнс іхны былі, бадай, добра вядомы Юзіку.

Трывога ў Ігнася, што прасьлізнулася была пры першых Юзікавых словах, цяпер памалу ўляглася, забылася і ён ужо зусім супакоіўся. Перад вачыма зьявіўся вінавайца ўсяе гаворкі, вясновы вобраз нядаўняе дзяўчыны. І ўспамянулася ўсё спачатку: сонца, усьмешкі, шчураньне воч і заліўчасты Кіяшоў брэх.

— Зусь!.. Зусь ідзе!—пасьпешныя словы перарвалі нітку мілалюбых успамінаў.

Шчыра загрукалі дзеравяныя малаткі, і лопат бляхі нанаў запоўніў іржавую майстэрню.

Спаважна і ціха ўвайшоў Зусь. Яшчэ ў парозе ён аглядзеў зорка—ці ўсе хлопцы на сваёй рабоце. Потым наблізіўся к Ігнасю і на адну хвіліну прышчурыў вокам на Ігнасеву работу—на роўна паскладаныя бляшаныя лісты— і здаволены, відаць, бо ні слова не сказаў, адышоўся пад другіх.

Юзік парываўся нешта зрабіць—па ўсёй выхадцы ягонай дагадацца можна было. Але хлопцы асяроджана і разьмерана прасталі бляху і жорсткасьць, здаецца, сыпалася з іхнымі малаткамі. Дарма, што Юзік гарэзьлівы такі пустазвон і часам, дзякуючы таму, шкадлівы, ён зразумеў, мусібыць, халодную і цьвёрдую асяроджанасьць таварышоў.

Паглядзеў і яго работы стараваты Зусь, і маўчанка раптам загаманіла.

— Пакажы, пакажы, Юзік, мне верхні ліст, самы верхні... Ага, я так і ведаў... Табе трэба паглядзець, як робіць Ігнась, хоць ён і новы яшчэ. Твая работа варта таго, каб я вылічваў з цябе штодзень па шастаку. Але на сёньня ўжо дарую... Толькі, каб больш ня было гэтага.

Настрой у яго быў нечым прыўзьняты сёньня. Проста-ж так сабе ён не дараваў за брак.

— На тым тыдні, хлопцы,—голас Зусеў павольна, урачыста вышаў са старэчых грудзей:—мы перабярэмся з гэтага катушка ў вялікую відную майстэрню.

Калі гаворыць гаспадар, трэба кінуць работу, але так неўзаметку яму, быццам толькі на адно імкненьне, на аднае поўхвіліны, бо іначай рэзка-кінецца ў вочы яму і перапыніцца тады павольны, урачысты голас і ён яшчэ гатоў залаваць і нават палаяць за нядбайнасьць: умець трэба рабіць, каб і працаваць, і слухаць адначасна гаспадара.

— У нашай майстэрні будуць розныя аддзяленьні, усялякую дробязь вырабляць будзем.

Са слоў гаспадаровых Ігнасю ўпадабала новая майстэрня. Там, напэўна, ня пяць ужо хлапцоў, а значна больш знойдуць, гэтак, як і ён сабе, кавалак хлеба. Ён не памыляўся пра колькасьць рабочых, гаспадар гаварыў, смакуючы сьлінявста кожнае слова:

— У кожнае аддзяленьне паставіцца па пяць-шэсьць чалавек. А гэта, я вам усё кажу да таго, каб падрыхтаваліся да новых парадкаў, якія я ўвяду там. Заработак будзе ад вырабатку. Калі хто мае добрых і сумленых хлопцаў, не гультаёў ды абібокаў, а сумленных, кажу, ды шчырых (Зусь паглядзеў на Ігнася), прыводзьце—прыму. Што—добрая справа?—ужо зусім не па-гаспадарскаму скончыў ён, і вочы павужэлі ад здаволенасьці.

— Вядома, добрая! Будзем сумленна рабіць! І рабочыя знойдуцца!—загаманілі ўсе розна, адрыўчата і ня зусім сьмела, вядома, як з гаспадаром.

— А цяпер мне—рабіць. Пагаманілі і досыць!

І раз ужо сказаў гаспадар, думаць няма чаго, а бяз нічога ніякага грукаць малаткамі па блясе—і ўсё.

## СОЦЫЯЛ-ДЭМОКРАТ

ТАГО-Ж дня, скончыўшы работу, Ігнась сказаў на вуліцы Арону:

— Ты добры сябра, Арон, і я ніколі не забудуся а тваёй помачы мне сёньня.

Той дзіўна-пахмурана і рэзка адказаў Ігнасю:

— Не забывайся для таго, каб не пакінуць бяз помачы такога-ж, як сам.

Не ўважаючы на рэзкую пахмурнасьць Аронавых слоў, нібы высечаных з каменю, ласкавым цяплом—не адчуваны

яшчэ—дыхнула на Ігнася ад іх, а сам Арон з далёкага і малазнаёмага зрабіўся такім блізкім-блізкім. Гэтыя словы разам напамянулі яму вёску, жыцьцё ў ёй з маткаю да гораду, суседзяў і ўсіх вакольных. Ні такіх слоў, ні такое справы ні ад кога ня чуў і ня бачыў ён з маткаю за ўсё маладое жыцьцё. Ён памкнуўся ўжо сказаць аб гэтым голасна, каб і Арон ведаў, але той, праказаўшы „Я дадому“, матнуў нязграбна галавою на разьвітаньне, і павярнуў у гразкі завулак.

Нейкім дзіўным, халодна-дзіўным і разам сваім быў Арон для Ігнася. Апошні хацеў-бы больш пагаварыць з ім, хацеў-бы расказаць яму пра ўсё сваё гора і пакуты, не абмінуўшы і тых маленькіх кропелек сьветлае радасьці, што прыкоўвалі яго да жыцьця.—„Ён упадабаўся-б мацеры і Любе“,—падумаў з гэтым.

Недалёкія хмары несьлі з сабою вечаровы змрок. Ігнась схамянуўся. Трэ' былоісьці выконваць свой абавязак перад гаспадаром, як ён умовіўся: нанасіць у самавар вады і накалоць на заўтра дроў. Гэта было яго штодзённая работа ўвечары, пасьля майстэрні. Ды гаспадар яшчэ мог пасláць з даручэньнем к заказчыкам ці па куплю. Ён завярнуўся і шпарка пайшоў у свой брудны катух, заміж пакою, з адным маленькім акенцам. Там некалі Зусь складваў новую бляху ды інструмант, і адтуль пачалася майстэрня.

З таго дня Ігнась больш пэўна трымаў сябе ў майстэрні і на вачох ў Зуся. Прыродная несьмеласьць гублялася ў прысутнасьці заўсёды сур'ёзнага Арона. У думках Ігнась яго лічыў сваім першым сябрам пасьля мацеры і Любы.

Праз некалькі дзён усё па-старому было яшчэ ў дашчанай бляхарні Зуся, і сам ён прыходзіў, разы два на дні хмурны і асяроджаны. Прычынаю гэтага была, відаць, справа з новаю майстэрняю. Часамі без усялякага бачнага выпадку ён раптам злаваў і лаяўся густа і агідна, як лаюцца часам старыя.

Аднаго такога дня, калі Ігнась зноў вышаў разам з Аронам, той сам загаманіў і радаснаю ўрачыстасьцю павявала ад яго слоў і яго самога—нязграбнага, але магутнага ў сваёй цьвёрдасьці.

— Ты ня чуў?—запытаньне пераможна гэтак навісла над Ігнасём.—Ты ня ведаеш, чаму Зусь не вясёлы, а сумны і злосны прыходзіць у майстэрню? Ты ня ведаеш, чаму мы робім усё ў тэй-жа самай старэнькай майстэрні, хоць, паводле Зусевых слоў, ужо прайшлі тыя некалькі дзён, пасьля якіх мы павінны былі перабрацца ў новую?

Цяжкім бобам бяз супынку сыпаў запытаньні Арон, не даючы Ігнасю застанавіцца думкаю ні на адным і здагадац-

ца, чаму-ж гэта так. Але можа здаволіўшыся тым ураджаньнем, якое запытаньні пакінулі на слухача, Арон павольна, быццам смакуючы кожнае слова, сказаў:

— Цяпер штодня Зусь будзе хадзіць да нас злосны... Забаставалі пячкуры на новай майстэрні. І пакуль Зусь ня зробіць чаго хочуць яны, дык печы не пачнуць дыміцца і майстэрня не адчыніцца. Забастоўка!..—пажвавеўшы, сказаў Арон.

На адну хвіліну сышоў з яго твару цень сур'ёзнасьці. З радасным блескам у вачч зірнуў ён на Ігнася.

— Арон, я ня ведаю, што гэта за забастоўка,—неяк нясьмела сказаў Ігнась.

Ён баяўся зрабіць няпрыемнае сябру сваімі словамі, сваёю незнальлю. Ён думаў, што Арон, як звычайна, паглядзіць на яго сур'ёзна, скажа слоў два і засьпяшаецца дахаты. Але неспадзявана Арон тым самым тонам пераможнае радасьці зусім па-таварыску, цёпла запытаўся.

— А хацеў-бы ведаць?

Не даючы адказаць, ён загаварыў далей:

— Ты ў мяне ні разу ня быў... Зойдзем.

Ігнась—поўны падзякі к яму —пайшоў па гразкім завулку з Аронам. Па дарозе ён думаў аб невядомай забастоўцы, аб вёсцы, пра матку і Любу і, нарэшце, зноў варочаўся к тэй-жа самай забастоўцы, пячкуром, майстэрні к Зусю.

— Ты любіш чытаць кніжкі?—пераняў яго абрывістыя думкі Арон.

— Я?.. Люблю. Дома ў вёсцы настаўніца мне давала. Чытаў Рослаўлева, „Юрыя Міласлаўскага". „Капітанскую дачку..." Цікавыя кніжкі?!-ні то сказаў упэўнена, ні то запытаўся Ігнась.

Арон нешта прамармытаў сабе пад нос і больш не сказаў ні слова да самае хаты.

Кватэра яго была ў звычайным старэнькім, трохі бруднаватым доме. Як увайшлі яны з адных дзьвярэй на кухню зірнула асьцярожна старая жанчына,—маршчыністая з сівізнаю ў чорных валасох, і таксама асьцярожна схавалася.

Арон прайшоў к дзьвярам направа. Гэта быў яго пакойчык. Пераборка паміж сьцен, не дацягнутая да стол адгароджавла яго ад другіх пакояў. Дзеравяны ложак прыбраны сьціпла і чыста, прытуліўся да акна. У кутку сьціснуўся пад кучаю кніг трыногі столік. Убранства пакоя дапаўняла ці то карціна, ці то фотографічны здымак старой яўрэйскае сям'і. Фарбы карціны паліналі і большаю часткаю хаваліся пад мушынымі сьлядамі.

За крэсла ці зэдлік ля стала Арону была высокая скрыня, але ён пасадзіў Ігнася на ложку. Сам-жа падняў века цяжкае скрыні. У пары бялізны і сьвятковай вопратцы загорнутыя ляжалі дзесяткі са два кніжак, якія ён паволі выняў на стол. Нібы раздумаючы, што ўзяць з іх, ён перакінуў адну па аднэй і, ня спыніўшыся ні на воднай, падаў Ігнасю ўсе.

— Паглядзі і выберы сабе што.

Кнігі ўсе былі незнаёмыя і малазразумелыя Ігнасю. Але з усяе кучы ён выбраў дзьве і паказаў Арону. Той моўчкі кіўнуў галавой і рэшту схаваў назад у скрыню, добра ўхутаўшы зноў ў бялізну.

Тымчасам Ігнась, перагортваючы выбраныя кніжкі, спыніўся ўважна на аднэй старонцы. Спыніўся і паглядзеў на Арона. І, паглядзеўшы, запытаўся:

— Скажы, Арон... Я тут не разумею нешта... Што гэта за соцыял-дэмократы?..

Арон узьняўся ад скрыні і суровы твар яго ажывіўся раптам. Агнёвай вільгацьцю заблішчэлі вочы, а голас загучэў маладо-маладо, малоджай за яго дзевятнаццаць ці дваццаць год.

— Соцыял-дэмократы гэта людзі, такія-ж, як і я з табою. Ты ня ведаеш яшчэ іх, Ігнась, але калі толькі пазнаёмішся з іх вучэньнем, з тым, чаго яны дамагаюцца,—ты будзеш такім-жа, як і яны. Соцыял-дэмократы—гэта мы-ж самі. Гэта людзі рабочыя, што працуюць з молатам, за варштатамі, на заводах і фабрыках. Рабочым у гэтых вялікіх майстэрнях жывецца часам ня лепш, чымся нам у Зуся, або яшчэ і горш. Але закон—цар і міністры,—уся ўлада, канчаючы самым найлахудрым паліцыянтам, стражнікам, гарадавым, стаіць за гаспадароў фабрык і заводаў. Рабочы зарабляе столькі, каб не памерці з голаду з сям'ёю. Ці павінен ён больш атрымліваць, чымся яму даюць? Можа ён ня варты большага? Сябры рабочых, разумныя вучоныя людзі, якія ўзьненавідзелі царскі парадак і законы, знайшлі, што гэта ня так: рабочы зарабляе значна больш, чымся яму плацяць, а рэшта ідзе ў кішэні гаспадаром фабрык і заводаў—буржуям.

Арон спыніўся на часінку, дыхнуў глыбока і з тэю-ж напружанасьцю ўсё адукоўваў Ігнася, які дасюль нічога гэтага ня чуў.

— І вось разумнейшыя з рабочых прынялі гэтае вучэньне, бо яно праўдзівае, і павялі работу так, як яно вучыць. А яно вучыць злучацца рабочых і ў шчыльнай грамадзе, колектывам выступаць супроць сваіх прыгнятацеляў, фабрыкантаў—буржуяў і іх абаронцаў: цара і паліцыі. Тыя людзі

рабочыя, якія злучаюцца для барацьбы, і завуцца социял-дэмократамі. Яны лічаць, што іх вучэньне апраўдаецца тады, калі ўсе фабрыкі і заводы пяройдуць да рабочых, а зямля да сялян, і калі і тыя, і другія будуць распараджацца сваім жыцьцём самі, без паноў і падпанкаў. Гэта вялікія, прыгожыя людзі, Ігнась! Але цяпер улада арыштоўвае іх, саджае ў турмы, вешае, расстрэльвае.

Пахмура-ціха і грозна ў сваёй пахмурнасьці скончыў Арон. Румянец выступіў на сухарлявыя шчокі.

Ігнась шырока-шырока адкрыў вочы. Новыя грандыёзныя, журботна-магутныя краявіды жыцьця паўсталі на ўсю сваю веліч, зьдзівілі яго. Ён і не падазраваў усяго таго, што дзеецца дзесьці на сьвеце.

— Я ня ўсё зразумеў, братка,—вымавіў ён, нарэшце—але... як кепска, відаць, жыць такім, як мы, на сьвеце. Я з маткаю... Часта на аднэй скарынцы хлеба... без зямлі жылі і жывём пакуль... Эх!.. Думалася, што гэтак і трэба жыць. І такія думкі пакорлівыя чуў я нават ад свае роднае маткі.

— Гэта цемра людзкая, Ігнась, вінна! Каб людзі былі больш вучанымі, ці хоць-бы добра пісьменнымі, каб яны больш ведалі жыцьцё па-за сваёй вёскай, валасьцю, тады было-б трохі інача.

— А як вучыцца? У школах жыцьцю ня вучаць і не ўспамінаюць нават. У кніжках, якія я чытаў, пра расказанае табою сёньня я не сустракаў ні слова. Ня пішуць...

— Праўда. У школах ня вучаць, дый ня могуць вучыць. А ў кніжках людзі пішуць. Кніжка—лепшы сябра чалавека. Бываюць розныя і кніжкі, таксама як і людзі,—падумаўшы сказаў Арон.—У гэтых-жа кніжках, што ты ўзяў, якраз тое аб чым я казаў.

— Я хочу чытаць, Арон. Ты будзеш мне даваць... Тольк шмат чаго ня ўцямлю сабе.

— Я табе заўсёды растлумачу,—папярэдліва перапыніў яго Арон.—Можаш нават прыходзіць да мяне часьцей. А ў вольны час можам хадзіць за горад, у лес, і будзе разам чытаць.

Ігнась нічога больш не сказаў. Ен глядзеў на ўзяты кніжкі.

— Яшчэ вось што: гэтых кніжак у цябе ніхто не павіне бачыць. Ты мне абяцаеш?

— Абяцаю,—шчыра і проста адказаў Ігнась.

— Бо можа быць вельмі і вельмі няпрыемна. Данюхаецца паліцыя і тады... Арышт, зьдзекі, а потым суд і турм

З гэтымі словамі Ігнась адчуў, якія вялізны абавяза ускладаецца на яго цяпер. І ад гэтага адчуваньня харо

расьць і героічнасьць захапіла ўсю яго маладую істоту. Поўна ён ня мог гаварыць, калі ў ім адбывалася стварэньне пачатку вялікіх перамен, ён толькі сказаў:

— Я ўсё зраблю, што ты сказаў.

— Гаварыць таксама нікому пакуль не гавары, надалей будзе віцаць.

Зразуменьне адказнасьці вялікае напружала Ігнася. Ён глыбока, удумліва слухаў Арона.

— Цяпер схавай кніжкі за пазуху, вось так.

Ігнась паслухаў яго і, схаваўшы кніжкі, горача разьвітаўся. Паціснуўшы моцна руку Ігнасю, Арон сказаў:

— Будзем бачыцца гэтак. Бывай!

## *СУСТРЭЧЫ*

НА двары было віднавата яшчэ, калі Ігнась пайшоў ад Арона. Цяпер хацелася пахадзіць трохі ды падумаць пра ўсё, што казаў Арон.

А гутарка цікавая была. Яна то штурхала Ігнася на нешта вялізна-вялікае то, здаецца, моцна трымала ля сябе і не давала быццам кроку даць, не ўспамянуўшы ні слова з таго, што гаварылася. Няведамае будучае захапляла гарачымі думкамі і гэтак хвалявала і цягло ўладна на шырэйшыя прасторы жыцьця. Першы раз гэта сталася на кароткім жыцьці ў яго, што ягоныя думкі-мары пачалі апранацца ў гэткія прыгожыя целавыя вобразы.

Але грубая нярадасная будзёншчына атручвала салодыч пазнаньня таго няведамага. Вось майстэрня, а там зараз і дом Зусеў.

Якімі інакшымі вачыма Ігнась паглядзеў на ўсё гэта.

„Дык, значыцца, і я працую замалым не дарма на старога Зуся... Яму карысьць... А я быццам вучуся, дык гэта і ёсьць мой заработак?“

Цяжка рабілася, раздумваючы пра жыцьцё. Але вытрымавасьць, якая падарожнічае заўсёды з беднасьцю, прымусіла ўзяцца за дровы і за ваду на Зусеў самавар.

Зрабіўшы работу, ён пайшоў на кухню і сеў перад газьнічкаю. На мізэрнае сьвятло пазіраючы, на мірганьне газьнічкі і куродым, задумаўся Ігнась. Ад задуменнасьці адарвала яго ўвайшоўшая раптам наймічка.

— І злосны-ж сёньня гаспадар, Ігнасёк, каб ты ведаў ну, проста хоць ты на вочы не находзь яму.

— Чаго-ж ён?

— Чэрці яго ведаюць... То яму тое нядобра, то яму гэта ня так, а то трэцяе трэба іначай. Ды вось ідзе, здаецца і сам сюды.

Гаспадар сапраўды зайшоў на кухню.

Ігнась устаў ад газьнічкі, а наймічка пачала ў парадак перастаўляць пасудак.

— Свайго часу няма ніколі на работу,—заўважыў ён наймічцы.—А табе, хлапец, спаць час, няма чаго дарма газу пячы. Ідзі ды ўставай лепш зараней.

І, правёўшы сіваватым поглядам па кухні, ён пайшоў у свае пакоі.

— Але, ну проста трываць нельга за апошнія дні. Есьць і есьць, як іржа жалеза, на яго ўсё ліхое. Але-ж бяз дай табе прычыны,—паскардзілася наймічка, стараватая ўжо дзеўка Настуля.

— У самога, бач, мабыць, справы не ў парадку, дык і спаганяе абы на кім,—сказаў Ігнась.

— Дык-жэ ж. Гэта-ж я чула, Ігнасёк, што там з майстэрняю ў яго нешта ня выходзіцца.

— Як гэта?—запытаўся, быццам ня ведаючы Ігнась.

— Ня чуў?—веры не даючы, спыталася Настуля, і загаманіла зноў.

— Ня сышліся ў грашох нешта ці якое ліха, дык рабочыя ўзялі дый кінулі на палове. Сам, кажуць, рабі калі гэтак. І, дальбог, добра зрабілі, я рада.

— А трэба спаць ісьці, бо гатоў прывалачыся зноў,—сказаў, пайшоўшы, Ігнась.

У сваім катушку ён хутка распрануўся і паддаўся зноў сваім думкам на цьвёрдым саламяным сяньнічку. Пасьля ўсіх сёнешніх здарэньняў і ежа ня брала. Доўга ня спаў Ігнась. Лежачы дагары і ўзіраючыся ў чорную цемрадзь, ён марыў,—сьмела і прыгожа пакуль і замгнуў.

Назаўтра ўстаў рана-раненька, яшчэ толькі разьвіднівала. Але не падаючы ніякага знаку, што прачнуўся, дастаў з-пад сяньніка кніжку і прачытаў колькі старонак. Прачытанае было надта новым, але яно толькі падмацоўвала і пашырала гаворанае Аронам учора і таму рабілася блізкім і зразумелым Ігнасю. Гэтак прачытаў ён з паўкніжачкі, калі прысьпеў час зьбірацца на работу. Пасьнедаў сухога хлеба з кавалачкам сала. Ня елася. Схаваўшы кніжкі на сабе, бо пакідаць было небясьпечна, пайшоў у бляхарню.

Да паўдня працавалася марудна, доўга. Але затое па паўдні, калі сонца, здаецца, пасабляць узялося, час прабег шпарка. Яшчэ за работаю Ігнась парашыў убачыцца сёньн

з Любаю. Даўно гутарыў з ёю, а цяпер асабліва хацелася ўбачыцца і аддаць ёй частку свайго настрою і адчуваньняў.

На гэтым тыдні быў апошні дзень работы—заходзіла субота. Цёпла разьвітаўшыся з Аронам, Ігнась пасьпяшыў к Любе.

Горад быў повен вясновых пахаў. Распукнуўся і зацьвіў першым цьветам пахучы бэз. Гарадзкія сады сабраліся вось-вось пырснуць зялёным жыцьцём. А крыластыя гарадзкія мяшканцы пераклікаліся пра вясёлую ўтому на захадзе сонца.

Маладым рокатам бурчэлі вуліцы,—публіка гуляла. Вяснова-сьвятковая вопратка гэтак пасавала з надвор'ем і з часам году.

Ігнася захапляла надвор'е. Настрой вясновы, ласкавы бадзёрыў і поўніў грудзі лёгкасьцю. Але-ж нейкім паказным і фальшывым быў гэты вясновы цьвет і людзкая здаволенасьць. Радасны сьмех і вясновыя ўсьмешкі здаваліся высьмешкаю над сапраўднай радасьцю.

„Гэта-ж толькі знадворку,—дома брудна, мізэрна, недаедзь. Хіба гэта ўсё можа быць радасьцю і весялосьцю?“

Супярэчныя думкі бунтавалі маладую кроў. Цяжка было разабрацца ва ўсім. Ігнась з натугаю волі паспрабаваў прагнаць думкі і паддацца вяснова-вечароваму настрою перад срстрэчаю з Любай.

Раптам на Ігнася павеяла чымсьці нядаўна-прыгожым, такім прыемным сэрцу. Насустрэч з пажылою багата адзетаю жанчынаю ішла тая дзяўчына. Перад вачыма ўстаў сонечны дзень, вясновыя ўсьмешкі прахожых і прыгожы вобраз стромкае дзяўчынкі. Міжволі Ігнась пачырванеў—гэтага разу ад блізкага суседзтва з маладымі чыстымі вачмі... Яны ішлі і гаманілі. Дзяўчына казала сваёй падарожніцы пра здарэньне з ёю, калі яна ішла з „Люсікам“ дадому.

— Які прыгожы сабака. А разумны, каб ты ведала, маман.

Гэта яна казала пра Кіяша. Праходзячы, дзяўчыка на адну часіну сьлізгнула па Ігнасёвым твары цікавым поглядам.

Даўнейшая неаб'ёмная сонечная шыра разраслася ў грудзёх лапушыстаю краскаю. Разьмінуліся. Ігнась азірнуўся паглядзець усьлед ёй, вінавайцы свайго ўзбурана-любага настрою, і адчуў, як шлёпнуў сваім цяжкім ботам на нечую нагу.

— Ідзе, мужычыла!.. Яшчэ і на тротуар узьлез... Вунь брук!

Штурхнуўшы Ігнася, блішчасты малады рызыкант-панок апрануты з пад іголачкі, з капялюшом у руцэ, падышоў к прыгожай дзяўчыне з маткаю. Усьлед яму нявэтла гыркнуў Кіяш, а ў Ігнася ў момант зьявілася невядома адкуль глухая нязьмі̇роная злосьць. Над хвілёваю прыгожаю сонечнасьцю навісла яна, вострая, выклікала тупую нуду. Сучаснае становішча, становішча на раздарожжы, заўладалі няпрыемна да самае Любінае кватэры. Нуда калола ў вочы бязрадасьцю гэтага становішча і гэтак балюча адчувалася боль у сэрцы. Здаецца, пабляклі сьвежыя вясновыя фарбы, а гукі вечаровыя зрабліся такімі чужымі і варожымі. Няпрыветла пазіралі гасьцінныя на погляд дамы. На сэрцы холад і варожасьць. Толькі знаёмая кватэра прыгрэла ўспамінамі аб Любе, аб далёкім дзяцінным і таму любым, дарагім. Прыйшоўшы, ён адразу папросіць у Любы пайсьці з ім куды далей ад людзей. Там бяз сьведкі, гэтага фальшывага вясёлага шоламу, ён успамяне мінулае і раскажа пра свае думкі цяпер, пра сваё жыцьцё і шмат пра што, чаго Любіня ведае. Як і заўсёды, Люба гэтакая чулая, адгукнецца на ягоныя сумненьні і ўзнадзеіць думкі-мары.

У гэтым настроі, з думкамі бясхітрасьці простымі зайшоў Ігнась да Любы.

Яе ня было дома. І калі гаспадыня сказала, што яна можа хутка прыдзе, можна пачакаць, дык уся прыгажосьць чаканае сустрэчы з ёю, ціхая радасьць надуманае размовы адсунулася і стала ўдалёку няпрыкметна. Нядаўная нуда аднавілася ад таго, што трэба чакаць, і цьмяны сум атуліў узбуранае сэрца.

Ён застаўся пасядзець. Каб ня вельмі сьцяглося, пачаў перагортваць кніжкі, што ляжалі на стале. Гэта былі школьныя падручнікі: задачнік, арытмэтыка, геаграфія, гісторыя, закон божы, катэхізіс... „Розныя бываюць кніжкі", подумалася Ігнасю—успамянуліся Аронавы словы. Выплыў вобраз Аронаў з бліскучымі гузікамі-вачыма. Вось сур'ёзнасьць разумная, адкрытая набягае на твар яму...

Спачатку і да канца пачало прыпамінацца ўчарашняе ў Арона. Як той загаманіў з ім на вуліцы... як запрасіў да сябе... пакойчык... кніжкі... размова... Успаміны абрываліся на гэтым і ішло ўжо сёнешняе. Вясна... радасьць... вясёлыя ўсьмешкі. А ў ім бадзёрасьць. Потым гукі голасу, радасьць... Потым „Мужычыла!.. Вунь брук!" Злосьць, нязьміроная злосьць схапіла яго тады ў свае абдымкі. Ці гэта з таго, што той сказаў, ці з таго што падышоў к ёй? — запытаўся ў думак Ігнась, і пасьпешна адказаў: „І з таго і з таго разам".

Крыўда выціснулася з нуды пад уплывам думак. Стала крыўдна ні-то на каго, ні-то на самога сябе за сваю няўдаласьць, за няздатнасьць.

Прыдзе Люба. Пачнуцца ўспаміны. Пяшчотная чуласьць Любінага сэрца падтрымае яго. З маленства думкі-мары,— лятуценныя, плыўкія стануць больш наяўнымі.

„Не!“

З сілаю матнуў ён галавою.

„Не! Ён возьме ў рукі жыцьцё. Вось гэтымі бядняцка-гарапашніцкімі, яшчэ слабымі, але маладымі рукамі ён скруціць яго ў тры столкі!“

Нехта грукнуў дзьвярыма. Ігнась адсунуў ад сябе кніжкі.

У вучнёўскай вопратцы павятоўца ўвайшоў зухаваты дзяцюк. Убачыўшы Ігнася, ён грэбліва паморшчыўся і зайшоў у гаспадынін пакой. Кіяш выскаліў зубы; бліскучая гладкая шэрсьць на хібу пастала стырчмаком.

З гаспадынінага пакою тымчасам пачулася занадта галосная гаворка і няпрыемны рогат гэтак сьмяюцца звычайна, калі застаюцца сам-на-сам малады распусны з старою. Ігнась ня слухаў, бо яго карэжыў голы адкрытны сьмех, з якога можна разумець і зьмест самое гутаркі, якая выклікала яго.

Пасьля новага мацнейшага выбуху рогату павятовец адчыніў дзьверы і падышоў к Ігнасю. Па дарозе ён пацёг за вуха Кіяша, але той гэтак варожа гыркнуў, што ён здрыгануўся ад нечаканасьці.

— Ыш які злосны. Так, так...

Перад Ігнасём ён стаў, узяўся ў бокі і загаманіў:

— А ты, чмут, чакаеш Любы? Яна табе сваячка ці што?.. Ці можа ты кахаеш яе?—га-га-га-га-га!

Ігнася ўзарваў нахабны тон гэтага маладога зуха, але ён адказаў спакойна:

— А табе што?

— Эгэ, ды ты задзірака добры, відаць.

— Я не задзіраюся.

— Так-так-так,—самаўпэўнена затакаў ён і закурыў куплёную цыгарку.

Наступіла маўчанка. Праз хвіліну, нешта надумаўшыся, размоўца сказаў:

— Я ня раю табе хадзіць сюды.

Нібы ўшчыкнуў хто моцна, балюча Ігнася і ён, пасьпешна блытаючы словы, узбурана крыкнуў:

— У цябе не папытаюся!.. І не хачу больш гаварыць з такім дурнем!

— Што?.. Пудзіла вясковае! У цябе-ж боты дзёгцем сьмярдзяць!

Усясільная нуда тонкай плеўкай заслала хвілёвую злосьц і зрабілася абыякава і тупа. Зноў Ігнась ня чуў больш, што сказаў той; ледзь-ледзь адчуваючы, як-бы праз туман, чуў ён толькі гук голасу, не разумеючы, што і да чаго гаво рыцца. Са словамі „Чуеш? чуеш?" павятовец тузануў яго за рукаў, калі злосны брэх разьліўся на ўвесь пакой і праг наў ад Ігнася нуду. Перад вачыма бліснулі заднікі ясна начышчаных гамашаў і разлупленая штаніна недарэчна целяпнулася і зьнікла за гаспадыніны дзьверы. Кіяш ахі біўшыся, стаяў пад дзьвярыма.

У гэты момант за акном прамільгнула дзявочая фігура. Кіяш сустрэў першым Любу.

## У МАТКІ

НЯДЗЕЛЮ Ігнась прабыў у маткі.

Туды ішлі разам з Любаю. У дарозе адно аднаму пера казалі пра ўсе свае перажываньні. Люба апавядала пр школьныя парадкі. Не падабаліся яны ёй. Строгі дырэкта гімназіі. Неадвязныя клясныя наздральніцы і неахайны ман стырскі поп з каламутнымі вачмі, ад якога на вуроках веч нясе гарэлкаю. Любіла яна лепш за ўсё географію. Выкла чык такі жвавы і крыху сьмешны. Заўсёды на вурок у яго ёсьц у запасе шмат анэкдотаў і кароценькіх апавяданьняў з быт і жыцьця тае краіны, якая вывучаецца. Гэта—сьветлы пр мень у яе вучнёўскім жыцьці. А горш за ўсё—Люба сар мяжа, але шчыра прызналася — дакучлівая ўвязьлівасьц гэтага Юркевіча.

О... Ігнась ужо знае яго. Але Кіяш добра падскуб ям рызыканцкі хвост.

І адкуль ён грошы бярэ пры бедных бацькох? А як пер ходзіць з клясы ў клясу, дык проста дзіўна. Ня вучы вурокаў і ніколі ня ведае іх. Настаўніцтва ня надта і па квае з яго: баіцца ці паважае, а завошта ці чаму—цяжк сказаць.

Гэтак ахарактарызавала Люба Юркевіча. Бязумоўна, я пераварваць яго ня можа. Толькі дзякуючы задзіракавась ягонай пры сустрэчах трэба гаварыць. Што расказала Люб было ня надта прыемна Ігнасю, але і думаць пра гэта прымусіла асабліва.

— Ат...—махнуў ён рукою.

За два тыдні адсутнасьці ён зьдзівіўся, як пераменіла матка.

„Як яна пахуднела“, думаў Ігнась, седзячы з маткаю за мізэрным сьнеданьнем. „Бедная, бедная! Толькі вочы адны і асталіся“.

Сапраўды толькі вочы адны засталіся ў Агапы, бліскучыя, сумныя. Як прышоў сын, яны ажывіліся раптоўнаю радасьцю, быццам іх прыгрэла пасьля журботнае ночы яснае сонца. І гэтак праз увесь дзень сьвіціліся яны, а сама Агапа пасьпешна бегала па хаце, то прыбіраючы якую анучу, то засьцілаючы на крывенькі стол белы настольнік, то садзілася каля сына—і ўсё пыталася, ці добра-ж там яму ў горадзе, ці не галодны ён хаця, ці ня цяжка рабіць. І на ўсе сыноўныя адказы ўсьміхалася ціхаю сонечнаю ўсьмешкаю і ў тон адказам ківала сівеючаю галавою.

— У сьлесара можа лепш было-б, сынок?

— Можа і так, але што гаварыць цяпер... Добра і тут, мамка,—ўзнадзейваючы, казаў ён.

Ідучы, пад уплывам сьвежага перажытага ён думаў расказаць мацеры шмат-шмат. Толькі калі прышоў і ўбачыў яе—адны косьці замест цела—дык зразумеў імгненна, што нельга трывожыць.

Увесь дзень ён быў папярэдліва-ласкавым з ёю, суцяшаў марамі аб будучым. Няўседлівы Кіяш скакаў на грудзі і кожнага разу стараўся лізнуць мокрым языком твар.

Неяк ціха, журботна-весела прайшла гэтая нядзелька. Ігнась глядзеў без адхланку ў бліскучыя вочы мацеры і радаваў, і радаваў яе ўсё новымі надзеямі, што далей большымі і сьмялейшымі.

Ён пахваліўся, што гаспадар здаволены ад яго работы, і можна спадзявацца, што хутка будзе плаціць.

— Дай божа, дай божа, — сказала Агапа, і закашляла раптам моцна і хэаравіта.

Балюча кальнула Ігнася і атуліла кволаю жаласьлівасьцю да мацеры.

Кропелькі поту дробныя, дробныя пазьліваліся на твары ў Агапы.

І стала больш журботнаю вясёласьць у матчынай сустрэчы з сынам, пабляклі праменьні вясновага сонца. Але гэта ненадоўга было, бо сын загладзіў вострую напружанасьць далейшаю гутаркаю. Нельга-ж пакідаць уражаньня, што ён журыцца, што ў яго пахмурна на сэрцы. Хай яна верыць у яго надзеі, хай спадзяецца ўбачыць яго чалавекам, прычакаць дабра і спакою.

Прамільгнуў матыльком сьветлакрылым дзень. Пад вечар, на захадзе сонца ўжо, Ігнась сабраў свае клуначкі. Трэ' было сёньня ісьці ў горад, каб заўтра не спазьніцца на работу.

Трохі цяжка было выходзіць, не пакінуўшы тут хоць часткі сваіх думак і не адчуўшы трыпятаньня роднага сэрца ў тахту з сур'ёзнымі перажываньнямі аднюсенькага сына і адзінага блізкага чалавека. Бо ніхто ня можа быць больш блізкім і зразумелым матцы за роднага сына, а ў таго ня можа быць больш спачуваючае істоты за матку.

І так, не сказаўшы ні слова пра пачатак сур'ёзных зру-хаў у сваім душэўным жыцьці, Ігнась разьвітаўся з маткаю. І, выходзячы, загледзеў, як патухла бліскучасьць яе воч і як ціха, бяз гуку, задрыжэлі вусны.

## ПРАХВОСТУ НЯМА ПОСТУ

УМЛЯВАЙ дрымоце пакалыхваўся надыходзячым захадам цёплы ліпнёвы дзень.

Недалёка за горадам, у той бок, дзе цягне чыгунка, у невялічкай бярозавай дубровачцы сядзелі Ігнась з Аронам, дачытваючы цікавую кніжку пра будучае чалавецтва. Я дастаў недзе Арон, бо ўся яго мізэрная бібліотэчка пера-чыталася ўжо Ігнасём.

Арон прыдбаў у Ігнасю ўдзячнага і здольнага вучня. З самы кароткі час увесь зьмест яго бібліотэчкі быў наг-тулькі перажованы, што Ігнась з большага жвава абгавар-ваў з Аронам розныя рэволюцыйныя пытаньні. Назычан прыродаю багатым выбражэньнем, ён хутка ўцяміў саб вобраз рэволюцыі, як адзіны агнёвы чысьцільнік, праз які павінна прайсьці чалавецтва, каб разбурыць увесь бру і сьмецьце, што нагадавалася стагодзьдзямі, і ступіць у нова-зорнае будучае.

Вось дзе яго мары, вось з чым разлучыць яго хі толькі сьмерць. Шлях рэволюцыі няўхільна зьвязан з ё з гэтаю недарэчнаю сьмерцю. Цяпер разуменьне жыцьц кругавіды яго сьветаадчуваньня далёка вышлі за меж свайго сяла і гораду, аддаліліся пад тое, што завец новым няведамым будучым. Прыгожыя далі!

— Ігнась! Ігнась!

Ён так задумаўся, што Арон вымушаны быў тармас-нуць яго за рукаў.

— Дрэнны, брат з цябе консьпіратар.

Ігнась вінавата ўсьміхнуўся.

— Зірні,—паказаў Арон пальцам пад чыгунку.—На Юзік яшчэ з нейкім.

Ігнась глянуў і жорсткі цень лёг на адбітак яго мар.

— Чакай... Ня можа быць! Ну але, гэта ён. П'яныя... Пра нешта мяркуюць. Яны накіроўваюцца сюды, Арон трэба схавацца і паслухаць, пра што яны гавораць.

— Дык хто-ж гэта такі?

— Пасьля... Перш паслухаем.

Па тоне голасу Арон улавіў, што ў Ігнася вырвалася ня проста жаданьне паслухаць, пра што разважаюць п'яныя, а нешта большае. І гэтак сама асьцярожна, як і ён, хаваючыся за дрэвы, забег няпрыкмечаным за блізкі куст алешніку.

П'яныя сябры тымчасам сышлі з палатна чыгункі і заламалі проста ў дубровачку. Гаманілі яны ня надта голасна, але з выяўнымі і рэзкімі рухамі рук і, як відаць, цалкам захапіліся ў гутарцы. На асабліва цікавых, мабыць, мясьцінах гутаркі разважаньні прарэзваліся п'яным выгукам ды моцным слаўцом.

Кіяш, ціха прытуліўшыся да Ігнасёвых ног, адказваў на гэта зусм не ласкавым мармытаньнем. Але датыркненьне Ігнасёвае рукі супакойвала яго, і сабака ціха сядзеў за кустом.

Са свае надзейнае засядкі хлапцом было зручна сачыць за п'янымі. Тыя не адчувалі чужое прысутнасьці, не зважаючы на наяўныя адзнакі зьмятае густое травы, на шматкі паперы і газэт, у якія Арон з Ігнасём загортвалі свой полудзень. Ступіўшы колькі крокаў ад мясьціны, дзе нядаўна сядзелі патрывожаныя хлапцы, п'янчугі грузка паселі паблізу ад кустоў.

Выбранае імі месца вельмі добра давала мажлівасьць Ігнасю з Аронам падслухаць і выглядзець усё, што будзе рабіцца. Ніводнага слова, ніводнага руху не маглі прамінуць яны. І зусім ня зьдзівіла іх, калі Юркевіч (гэта ён быў з Юзікам) дастаў з кішэні паўпляшкі і з п'янаю сілаю паставіў перад Юзікам. З сваіх кішэнь Юзік выцяг каўбасу з сітніцаю, з паўдзесятак пірожных і разгарнуў усё гэта перад сабою. Калі з пляшкі выняўся корак і моцны пах коньяку задражніў у носе, Юзік мармытнуў нешта, а потым загаманіў:

— Я хацеў-бы мець столькі грошай, як ты, Юркевіч... каб купляць вось гэтакае пітво і смачныя пірожныя. Адкуль яны толькі і бяруцца ў цябе?

— Ха-ха! Адкуль, пытаеш,—здаволены заіржаў Юркевіч і перапытаў:

— А ты як думаеш?

— Я думаю, яны самі табе ў кішэню ідуць.

— Во, гэта ты праўду сказаў... Самі! Ты хацеў-бы мець столькі грошай?

— Уга, хацеў-бы я паглядзець на таго дурня, што не захацеў-бы, каб яму грошы самі плылі ў кішэню, —і жартуючы і сур'ёзна сказаў Юзік.

— Ладна, вось выпі лепш.

Юзік не здаваўся на просьбы. Коньяку ён і ня нюхаў ніколі ні-то каб піў, а майстра выпіць ён быў вялікі. Пляшка ў прывычных руках павярнулася на лоб і прыемнае пітво забулькала пасьпешна ў вузкім горлачку. А калі адліп, нарэшце, ад дарагое пляшкі, кроў радасна і шпарка запульсавала ў жылах, ружовы туман-тлум ударыў у галаву і атуліў сонечнаю казкаю. Нейкі глухі пачуваўся Юркевічаў голас. Той нешта гаварыў, раз-по-раз нахабна і рызыкоўна ўсьміхаючыся. Гэтая ўсьмешка прыцягвала Юзіка, хоць зусім невядома было яму, што хаваецца ў Юркевічавай галаве, што выклікае гэтую ўпэўненую ўсьмешку.

Юзік зрабіў патугу (такі блізкі і добры яму стаў гэты Юркевіч) падсунуцца да яго і выказаць шчыра пра ўсё сваё задаваленьне. Але целу не знайшлося цьвёрдага і ўстойлівага апірышча і яно па-здрадніцку схілілася ля ног у Юркевіча.

— Закусі...закусі,—сказаў той аўторытэтна.—Лепш будзе.

Юзік паслухаў, нявернымі пальцамі загроб кавалак сітніцы і каўбасы. І пакуль зайздросна і моўчкі чмякаў, Юркевіч упарта глядзеў на яго і меркаваў штось.

Ігнась ужо расчараваўся, седзячы ў засядцы, і нават пакаяўся, што зацёг і Арона, калі, зірнуўшы на цёплую хэўру, заўважыў тое, што ўмацавала яго падазрэньні і прымусіла астацца. Юркевіч напорна меркаваў пра нешта, і гэта не магло ня ўспасьці на вока Ігнасю.

Апошні раз чмякнуў Юзік і ўздыхнуў задаволены, як-бы прарабіў цяжкую работу, пасьля якое зрабілася яму лягчэй і лепш. Тады Юркевіч, таксама напорна пазіраючы, усё з тэю самаю таемнаю ўсьмешкаю, распачаў зноў гутарку. Для яго размоўцы вышла гэта зусім неўзаметку, бо пачаў Юркевіч здалёку, з гатунку таго самага коньяку, што гэтак лагодна і прыемна пахне і моцным тлумам поўніць галаву.

— Юркевіч... Я першы раз п'ю гэты коньяк... ці чорт яго ведае, як ты яго завеш, але скажу, што хацеў-бы піць часьцей.

— Хіба хто забараняе?

Юркевіч так зьдзівіўся, кажучы гэта, што гледзячы на яго, зьдзівіўся і Юзік. Сапраўды быццам ніхто не забараняў Юзіку піць коньяк і ў яго для гэтага былі вялізныя магчымасьці, і што пра ўсе гэтыя рэчы Юзік быццам даведаўся

толькі вось цяпер, пачуўшы Юркевічава зьдзіўленьне ў словах „хіба хто забараняе?“ Не-яно дык ніхто не забараняў, але-ж і ня вельмі дазваляў. Юркевіча запытаньне цэліла ў яго самыя патайныя думкі, і таму, што было яно раптоўнае і адказвала на яго жаданьні, Юзік захліпнуўся ад блізкасьці вырашэньня.

— Хіба хто забараняе?—быццам ня ўцяміўшы сабе як сьлед запытаньня, перапытаў ён.—Ды ніхто не забараняе. Але дзе грошы возьмеш? Дзе?

— Толькі хацець трэба, а ўзяць можна.

— Хацець... Што—хацець... Ну, вось я хачу, а дзе-ж яны? Дзе? Ня ідуць самі. Што—ня ідуць! Хоць кішэні і шырокія ды праход надта вузкі—ха-ха!

Вочы ў яго заблішчэлі. Ён парагатаў трошкі і пахмура сьціх, дагадваючыся мабыць і не, што блізка ўжо нейкае вырашэньне за гэтымі далiманамі. Бо чаму-ж-бы тады гэты Юркевіч, якога ён толькі толькі знае, чаму-б ён настойваў на такой размове? Чаго-б ён круціўся сабакам вакол гэтага коньяку і грошай? Не, ён нешта ведае, але сказаць ня хоча.

А празорлівы Юркевіч ужо адгадаў, відаць, ягоныя вёрткія і баязьлівыя думкі і, адгадаўшы, прагна ўсьміхнуўся. Потым зусім не да тону, ціха, ат сабе, гуляючы словамі, сказаў:

— Чмут-нябожчык... Хіба-ж ты ня хочаш спадзявацца на мяне. Я табе дам грошы! І не калі-небудзь, а зараз, ужо вымаю...

Ён азірнуўся ўпарта ў бакі і рэзка тармасануў з кішэні руку.

— Вось!

Кроў выцяла ў галаву Юзіку і зрабіла яе яшчэ менш паслухмянаю: у Юркевіча ў пальцах лапацелі дзьве сіненькія паперкі па пяць рублёў. Але не давялося Юзіку вось зараз адчуць іх прыемна-ласкавае шапаценьне ў сваёй руцэ... Са злосным брэхам зварухнуліся кусты і Кіяш скочыў на Юркевіча.

Паплылі некуды сіненькія паперкі на ваччу ў Юзіка і жах ахапіў балюча: зьнікнуць яны і другі раз не давядзецца іх убачыць, ні адчуць у руках, ні мацаць у кішэні і выціраць перад тым спацелыя пальцы, каб ня ўпэцкаць дарагі паперак. І яго ўзьняло так хутка, як і сам ён не спадзяваўся на сябе. Жах паменшаў. Юзік кінуўся бараніць ад сабакі Юркевіча. Але помач яго не патрабавалася, бо ўсё скончылася таксама раптоўна, як і пачалося. Толькі гэта ён ускочыў, як можа ўскочыць п'яны чалавек з цяжкаю галавою, рэзкі працяжны сьвіст паклікаў сабаку за кусты.

У руцэ ў Юркевіча бліснуў чорны рэвальвэр. Здрыганулася лісьце на бліжэйшым кусьце. Трэск ад стрэлу ірвануўся ў той бок, дзе пабеглі два хлопцы з сабакамі. А як толькі заціх гук ад стрэлу, удалёку было ціха, як у дамавіне. Аціх шум разам з водгаласам ляснога рэха на стрэл. Не шапацелі кусты.

СУМНА заўважыў Юзік, што рука Юркевіча ня трымае больш прыгожых сіненькіх пяцірублёвак. Трыпяткім поглядам шукаючы, дзе-б яны маглі дзецца, сустрэўся ён з пашкумачаным разьюшаным позіркам Юркевіча і спусьціў у зямлю вочы. Нешта такое вычытаў на яго твары, у вачох, што безнадзейнасьцю ахутала, як сном, прыкрым, нядобрым. Не агукнуўся ні словам, чакаў, што загамоніць Юркевіч, што ён па нейкім праве першы павінен парушыць маўчанку. І Юркевіч загаманіў, і загаманіў неспадзявана з абразаю, голасна-піскьлява крыкнуў.

— Кавалак куцьці ты! Саладуха! Трус п'яны першае маркі! А яшчэ коньяку яму, грошай... За што?

За апошнімі словамі ён зірнуў з пагардаю на прадмет міжвольнага расплатку за чужыя грахі. Увесь выраз фігуры апошняга, яго прыгнечаны няўдачаю выгляд сьведчалі пра такую мізэрнасьць і прыніжанасьць, пра такую крыўду і жаласьлівасьць, што Юркевіч—яшчэ аб тым самым—але ўжо мякка, нібы ўзнадзейваючы, загаманіў:

— Дзе-ж відана?.. Тут пападаеш у рыскоўнае становішча, а ён сабе хоць-бы што якое. Пакуль сабраўся, дык... Сьмяхоцьце адно дый годзе!

Як-бы хочучы пацьвердзіць свае апошнія словы, ён рассыпаўся дробным ненатуральным рогатам.

Усё, што адбылося за такі кароткі час, трохі выцьверазіла Юзіка. На рогат Юркевічаў няпрыемны вуху і на словы, якія ўкалолі яго самалюбнасьць, ён адказаў блытана, але з пачуцьцём самастойнасьці:

— Я ў час сабраўся пасобіць. І ня вінен-жа я, што сабака выходзіць дужэйшы за цябе.

У вачох у Юркевіча запаліліся аганькі абразы і злосьці і ён пасьпешна паварухнуўся. Юзік заўважыў гэта і здаволены здагадаўся, што адказ трапіў куды сьлед. Але на тым-жа часе зьмяніўся выраз твару ў Юркевіча, быццам памякчэў і ўвабраўся ў зусім простую добрадушную сьмяхотлівасьць:

— Зусім праўда... Маладзец, Юзік! Я ўзбурыўся з неспадзяванасьці, я-ж сам вінен. А ты ўсё адно куцьця, непаваротны—ой які.

Зноў жорсткасьць ранейшая прагучэла ў яго голасе. Юзік падумаў: „Як чалавек можа гэтак на адным часе мяняць свой голас і быць ці вясёла-добрадушным, лагодным добрым прыяцелем, ці жорсткім і варожым, як самы злосны няпрыяцель".

Юркевіч ня даў яму дадумаць да канца сваіх думак. Сочачы за станам яго, Юркевіч сказаў голасам ранейшага шчодрага Юркевіча:

— Дык мы-ж няскончылі справы. Як ты думаеш, Юзік, а?

Словы па-братняму гучэлі ласкава, і такі просты і блізкі рабіўся ён Юзіку.

— Сапраўды ня скончылі,—адказаў ён шчыра.

Неяк радасна і шпарка закалацілася сэрца, як гэта бывае перад вялікаю-вялікаю радасьцю. Аж чырвань пырснула ў шчокі Юзіку. Ён напрудзіў сілы, каб сагнаць яе, здрадніцкую, і астацца такім халодным, абыякавым. Гэта яму не ўдавалася. Усё цела жыло ўжо радаснаю млосьцю, бадзёрыла, напружвалася быццам прыняць нешта вельмі прыемнае і жаданае.

— Сволачы яны вялікія,—пачуў Юзік апошнія словы Юркевіча.—Праўда-ж?

Юзіку не хацелася слухаць пра гэта, не хацелася варочацца ад свайго прыемнага настрою да будзённага зьместу слоў.Ківам галавы ён згадзіўся з Юркевічам, бо цяжка было намагацца гаманіць, зусім, ня ў тахту думкам працэджваць чужыя халодныя словы. Бо пасірацеў-бы настрой і было-б так, як некалькі хвілін таму, няёмка і прыкра. Ён нават ня цяміў, пра каго гэта сказаў Юркевіч і не хацеў ведаць—перад вачыма ажывала мала-па-малу: дарога сюды, выпіўка з закусваньнем, казытлівая размова і лапаткія сінія пяцірублёўкі ў руцэ ў Юркевіча.

„Можа яны тут дзе і валяюцца? Можа ён выпусьціў іх тады і забыўся прыбраць?“

Жаданых паперак ня было. Колкім холадам уляцела ў настрой нездаволеньне і боязкасьць ня ўбачыць больш іх, не адчуць у пальцах пяшчотнага шалпаценьня.

— Сядзь, за месца, плаціць ня будзеш,—ласкава азваўся Юркевіч.

Лёганькая ўсьмешачка ўспырхнула з яго вуснаў і ў момант зьляцела і зьнікла ў зялёнай лісьцьвяной прасторы. Юзік ня бачыў гэтага. Яму было няёмка перад Юркевічам, цяжка было ўзьняць зірк, як-бы тыя думкі, што ўладалі, не дазвалялі. Нібы ўгадваў іх Юркевіч і ад таго расла няпрыемная нязручнасьць. Ён адказаў на запрашэньне блытанымі вінаватымі словамі з ценем дакору Юркевічу за яго непатрэбную гульню з ім, як з малым. Але вышла гэта як адказ-жарт на жарт-запытаньне:

— Няма чым і плаціць, хоць-бы хацеў. Калі запрасіў, дык і плаці ўжо.

— Вось ты гэта праўду сказаў. Зусім згодзен.

— Ды тут бяз усякае згоды ўжо трэба, як запрасіў...

Салодзенькі камячок ад сэрца падплыў к горлу, перапыніў на паўдарозе намечаныя словы.

„Зноў тая самая гутарка. К таму самаму хіліцца", прамільгнулася ў галаве.

— Юзік,—Юркевіч праказаў цьвёрда і рашуча і Юзік дагадаўся, што разьвязка іхнае праходкі ў лес блізка ўжо.— Вось, што...

Юзік глянуў на яго і ўваччу вясёла-пярэстым замільгалі прыемныя колеры. Юркевіч трымаў зноў адну ці некалькі тых новенькіх шалпаткіх пяцірублёвак. Салодкі камячок вырас, пашырыўся да нязвычайных памераў, вось-вось папырхнецца ім. Хацелася нешта сказаць ды словы ня ішлі. Ён толькі прамармытаў нешта, што—і сам ня ведаў і ўвесь выказаў поўную паслухмянасьць і ўвагу.

— Вось што... Я ледзьве не забыўся... Сволачны гэты сабака перабіў усю рахубу. Я абяцаць абяцаў, а выканаць і забыўся быў.

Нібы схамянуўся Юркевіч і як-бы прасіў прабачэньня, што ня выканаў абяцанага.

— Не, Юзік... Ах, сволачны сабака, — зноў напамянуў ён Юзіку пра сабаку і падаў павольна-мякка, па-кашэччу грошы.

Юзік памацаў у пальцах паперку і ў тон Юркевічаваму голасу гаварыў:

— Каб ня так хутка ўсё адбылося, я-б яму паказаў. Паскудны сабака!

Потым, баючыся, што Юркевіч можа абдумацца ці зноў што здарыцца і дарагая паперка ўцячэ ў яго з рук, пасьпешна схаваў у кішэню.

— Калі патрэбны будуць грошы, зьвяртайся да мяне, заўсёды пасаблю.

Юзік ня ведаў, чым адказаць на такую добрадзейнасьць, якая нібы з неба ўпала і асьвятліла радасьцю яго надзеі, а жаданьні ператварыла ў справу. І ён намацваў у кішэні пяцірублёўку і моцна прыціскваў да цела, усёю істотаю жадаючы адчуваць яе датыркненьне, яе блізкасьць.

— Ты ведаеш, чый гэта сабака? — упарта круціўся навокал сабачае тэмы Юркевіч.

— Нашага аднаго, з бляхарні... Рыжага такога, Ігнася.

— Што яму патрэбна было тут? У лесе за горадам,— нібы пытаўся ў каго Юркевіч. Потым бадзёра ўстрыпянуў-

шыся, ён загаманіў ужо да Юзіка:—Ведаеш, тут нешта ёсьць. Ты павінен разьведаць пра гэта. І потым мне скажаш. А калі-б гэта? Ну, тае нядзелі няхай. Паназірай толькі ды разьведай.

— Добра... Добра, зраблю.

Як толькі даў сваю згоду, раптам зрабілася няпрыемна Юзіку і цяжка. Нешта падказвала, што згаджаецца ён зусім не на сумленную справу. І прыпамянулася такая-ж самая немаль гісторыя ў майстэрні пра Ігнася. Тады ўсе хлопцы на чале з Аронам узрушыліся і выказалі думку, што гэта нясумленна, што гэта ён зрабіў-бы нібы сам сабе. Таварыскае і разам непрыяцельскае засуджэньне ягонае прапановы тады прымусіла адмовіцца ад свайго намеру.

„Гэтае тут немаль тое-ж самае“, назольна лезла ў галаву. Але праз нейкія сэкунды прыпаміналася кволае шалпаценьне сіненькае паперкі і ўжо спакусьлівы яе вобраз праганяў назольныя, няпрыемныя думкі, і рука імкнулася намацаць яе ў кішэні.

— Добра, у нядзелю скажу,—пераказаў пасьпешна, быццам баючыся, каб не сказаць наадварот. І падумаў: „А сустрэцца-ж дзе? Ён не гаворыць“.

Але Юркевіч зноў нібыта ўгадаў яго думку, сам сказаў.

— На мосьце, ураніцы.

## *У НОВАЙ МАЙСТЭРНІ*

У НАСТУПНЫМ тыдні Зусь перабраў рабочых у новую майстэрню. Яна займала вялікую рагавую будыніну на Цаглянай вуліцы, якраз на другім баку рынку, ля галоўнага ўезду ў горад. Новым і сьвежым выглядам пахваліцца яна не магла, але вядома, што нельга было прыраўнаваць яе да старое бляхарні.

Звонку на паўсьцяны ўдаўжыню нац уваходам Зусь загадаў прыбіць размалёваную мо'ў дваццаць фарбаў шыльду. Чаго толькі ня вымалевана было там на ёй: і таркі, і чайнікі, і конаўкі, і друшлакі, і клямкі, і сьлесакі, і паяньне, чыстка і палуда самавараў. Дах на бляхарні, зроблены со старое Зусевае бляхі, маляры папэцкалі ў чырвоную бліщчастую фарбу.

З выпадку вялікага сьвята (бо што ж гэта калі ня сьвята Зусю) гаспадар апрануўся ў палішчасты—некалі зашмаль-

цаваны і потым адчышчаны крыху, так што на ўсю вуліцу адносіла бэнзынам—лапсардак. Жаўтавата сівую бараду яго падпіраў крухмалёвы каўнерык, падноўлены шчоткаю з мелам. На падсіненую сарочку з накрухмаленымі грудзьмі, прыкрытымі атласнаю жылеткаю, зьвісалі шырокія хвасты чорнага гальштука. І хадзіў ён, урачыста выпучваючы грудзі і выстаўляючы паважна правую нагу ў чорным наваксаваным гамашы. Раз-по-разу падымаў ён руку, каб пагладзіць шырокую расчэсаную бараду ці пачапаць густыя пэйсы і мо' сотым разам пацягнуць за кончыкі валасоў, паглядзець, ці ня вылез выпадкова стары, аджыўшы валасок. Потым гаспадарскім вокам любоўна аглядаў ён новыя сталы, шафачкі пры сьценах з рознымі інструмантамі, розныя прыскрынкі, варстаты чырвоныя, яшча з гострым пахам цэглы і гліны гараны, праводзячы крытычным поглядам па жаўтаватай масьлянай афарбоўцы рам на вокнах. Каторы раз спрабаваў, ці моцныя клямкі на дзьвярох, адчыняў і зачыняў дзьверы, пазіраючы, як добра прыстаюць к вушаком, і важна і сур'ёзна не пакідаў хадзіць.

Рабочыя чалавек дваццаць уважна і нават з пашанаю пазіралі на старога, але дужага яшчэ Зуся. Упаўшэпат яны перагаварваліся зрэдку паміж сабою, рабілі свае заўвагі пра абсталяваньне майстэрні, а некаторыя бралі на прыцэл хвосьцікі Зусевага лапсардака, яго каўнерык, жалетку, а асабліва стаўбунаватую з гузікамі на версе чорную шапку. Як праўду кажучы, злоснага намеру ня было ў гэтых едкіх шэптах-перашэптах, і кожны адчуваў, што ў Зусевым жыцьці, у ягонай дзейнасьці адбываецца вялікая перамена і што яны не абмінае таксама і іх, што і яны пэўным парадкам уцягнуты сюды і адыгрываюць нейкую ролю ва ўсім.

Калі Зусь абмацаў і аглядзеў усё аж па некалькі разоў і пераканаўся, што нічога не схавалася ад яго вока, што ўсё, чаму патрэбна быць на сваім месцы, добра і моцна—ён прыпынуўся на сярэдзіне перад рабочымі і спаважна па гаспадарску кашлянуў у кулак (вялікаму караблю—вялікае і плаваньне).

Заварушыліся каля чысьценькіх сталоў рабочыя, папрыпіскаліся бліжэй адзін да аднаго. Чакалі. Дагадаліся, што Зусь маецца сказаць нешта. Напярэдзе з краю стаялі і Арон з Ігнасем. Юзік утуліўся недзе за плячыма пазадзе, зусім не даючы знаку, што ён тут разам з усімі.

— Хлопцы!—так пачаў сваю прамову Зусь.—Усё, што вы бачыце перад сабою, доўга падрыхтоўвалася і доўга будавалася. На новую майстэрню патрачаны вялікія грошы. Поўна, ой поўна грошай пазычалася, каб дабудаваць яе

Стала больш і вас, маіх памочнікаў. І каб апраўдаць усё патрачанае, трэба кожнаму шчыра і сумленна працаваць, а ўважаючы па працы ўжо будзе кожнаму і плата. Новым нанятым я ўстанавіў ужо заработак і мы пагадзіліся. Старыя рабочыя з бляхарні астаюцца на тым самым заработку, з невялікаю трохі зьменаю. Сёньня тут перад усімі пахваліць трэба Ігнася. З сёнешняга дня я стаўлю яго на работу паяльшчыкам і вызначаю яму па чатыры грыўні на дзень.

Ледзь чутны шэпт прашумеў па грамадзе.

Зусь спыніўся і паглядзеў доўгім працінаючым поглядам у рабочых. Ад яго зроку не ўвайшоўся і Ігнась, да яго несладзявана павярнулася сваёю кішэняю гаспадарская дабрата. І гэтак лёгка і добра зрабілася Ігнасю, пасьвятлела, здаецца, у майстэрні і стала весялей. А Зусь гаварыў далей:

— Заўтра я ўсіх расстаўлю ў майстэрні і выдам інструмант. А сёньня— сьвята. Гуляй, хлопцы! А каб весялей было— вось вам на гарэлку!

Ён спраўна дастаў з портманэта трохрублёўку і кінуў у сярэдзіну рабочых.

— Падкідаць! падкідаць гаспадара!—скрозь шум, які перасьцігнуў апошнія словы Зуся, разьляцеліся на ўсю майстэрню галасы.

Два дужых малайцы ўраз апынуліся каля гаспадара, і не пасьпеў той апамятацца, як нешта з пяць пар рук разы тры падкінулі яго пад самую столь.

Толькі Ігнась з Аронам ня зрушылі з месца, ды Юзік нязграбна астаўся пазадзе. Яму прыпамяталася чамусьці першае здарэньне ў бляхарні ў вясновы ясны дзень, а потым... Рука дрыготка сунулася ў кішэню. У агульны сьвяточны настрой уварвалася супярэчнае няпрыемнае задаваленьне. Весялосьці ня было месца на заўсёды вясёлым Юзікавым твары.

— А цяпер усе вольныя,—ацерабіўшыся, сказаў ласкава Зусь.—Пі, гуляй, хлопцы!

Ён па-гаспадарскаму рухава махнуў рукою, як быццам адчуўшы бывалешнюю маладосьць.

Кучка рабочых ня прымусіла сябе чакаць на другое запрашэньне і з грукатам і галасам высыпалася на вуліцу. На вуліцы ўгаварыліся ўсёю грамадою пайсьці ў вялікі, па-тутэйшаму, шынок, што прысвоіў сабе гучную назву „Рэнскавага паграбу“, прапіць гаспадаровы тры рублі.

ЗУСЕВАЯ ўрачыстасьць пярэйсьця ў новую майстэрн
была ў панядзелак. Гэтага дня людзей у горадзе был
менш (як не кірмашовы дзень), а таму і „Рэнскавы пограб
меў толькі двух трох гасьцей. Было рана і заядлым вып
вакам яшчэ хапала да вечара часу, каб выпадкова не абм
нуць Пэйсахава „ціхае прыстані".

У гэты самы час компанія ад Зуся і ўваліла ў шыно
Гаспадар яго—касавокі Пэйсах з прычыны гэтакага ра
тоўнага пашырэньня аўторытэту свае прыстойнае ўстанов
аж прысеў у радасным зьдзіўленьні за прыкрамкам. Так
гасьцём варт і насустрач выйсьці.

Але не паказаў знаку Пэйсах, захаваў на самое д
свайго сэрца вялікую здаволенасьць і напусьціў на сяб
каб трошкі, дык важнасьць. Гэта яму, вядома, ані не пер
шкаджалі на запытаньні старэйшага з компаніі Ціма
схіліцца ніжка ў адзнаку таго, што ён гатоў хоць зар
пачаставаць „добрых людзей" усім, што ў яго толькі ёсь
найлепшага.

— Ша, мы зробім усё гэта вельмі добра. Антык ма
пальчыкі аблізаць!

Ён падышоў да трох, што раней прышлі і цяпер сядзе
над пляшкамі піва ў кутку. Вось дзе выказалася ўся ве
ласьць Пэйсахава. З нізкімі паклонамі ён перавёў тых тр
у суседні пакойчык без дзьвярэй; седзячы там, можна бы
бачыць, што робіцца тут.

— Толькі трошкі прабачце, от зусім трошачкі... Мо
вам яшчэ дабавіць. Можа і закусіць. Смажанае рыбы... Гэ
ня рыба—а мяса. А варшаўскае каўбасы, дык я вам п
сакрэтам толькі магу сказаць, толькі сёньня яна ў мя
заўтра ня будзе.

Тры пітцы перамовіліся параю слоў ды зірнулі на гу
рабочых.

А Пэйсах ужо, як тут і быў ён.

— Тры кварты гарэлкі пакуль што,—перапыніў я
Цімох,—хутчэй толькі, а то ты вельмі шчабяткі, як я ба
і толку з цябе ні на кіпець.

У момант саставілі адзін к аднаму сталы, як на вясел
і ўсе паселі наўкруга.

— Зараз-зараз... Як бачыце зараз... Як пальцам кіўну
Пэйсах ужо ня мог умоўчаць, ён шчабятаў, як вераб
выразна падымаючы і размахваючы рукамі. Тымчасам па
пеў ён парасстаўляць пляшкі. А прынёсшы чаркі, хі
ўсьміхнуўся некуды на бок і нізка схіліўшыся над ста
пад самае вуха Цімаху, сказаў так ціха, каб чулі ўсе:

— А закуска, ой добрая... Мармэляд, а не закуска. Я вам ня дам варшаўскае каўбасы і рыбы ня дам.

— Чаму?—запытаўся нехта.

Пэйсах паціснуў плячыма.

— Вы пытаеце чаму? Пэйсах ня хоча ашукваць. Нашто ашукваць! Лепшая закуска да гарэлкі селядцы.

— Ну хутчэй ты,—ня вытрымаў заядлы выпівака Цімох.— Абы-што цягні—ня порах, не парве.

— Навошта казаць „абы што“. Навошта абражаць: „абы што“. У Пэйсаха селядцы не селядцы, а адно масла. Я магу на спробу даць, калі ня верыце,—пакрыўджана даказаў Пэйсах.

— А што-б табе.. Ну, давай селядцы!—з нецярплівасьцю крыкнуў Цімох.

— Давай! Давай!—закрычалі галасы.

Пэйсах доўга не чакаў. Згінаючыся, як тая галінка на вярбе ў ветраны дзень, ён ураз дастаў з дзежачкі селядцы, спаласнуў у вядзерцы, раскрышыў на талерку і зьверху наліў воцату.

— Можа цыбулькі?

— Каб табе спрахнуць, нечага, давай,—сярдзіта ўжо прабурчэў Цімох і ўзяўся разьліваць.

— Адно масла... Адно масла,—прыказаў Пэйсах.

— Ды стаў ты барджэй, на цябе ўсё ліхое.

— Адна чвэрць хвілінкі...

— Дзе-ж гэта Юзік?—папытаўся нехта ў застольлі.

— Не павінен астацца.

Арон з Ігнасём раней убачылі, што няма яго, а цяпер заўважылі і ўсе. Але тады, як некаторыя ўжо сталі падсьміхацца з Юзіка, бразнулі нясьмела дзьверы і ён прышоў. Сустрэлі яго галасы—адны насьмешліва, другія нецярпліва, а трэція—проста, каб абы-што сказаць.

— Калі гэта Юзік пакінуў піць гарэлку, што пачынае цурацца кампаніі!

— На манаха, ці што, пастрыгчыся задумаў!

Арон з Ігнасём моўчкі назіралі за Юзікам, а той стараўся ўсё апраўдацца ад нападак.

— Я толькі ў двор забег на адну хвілінку. Дый не спазьніўся-ж, вы яшчэ не пачалі нават.

— Маглі-б і пачаць,—сказаў нечакана Арон і бачыў, як сьціснуўся ў камячок за сталом Юзік, і як рука яго здрыганулася, бяручы чарку.

— Ну, дык за ўсю нашу кампанію—агалясіў Цімох і выпіў.

За ім выпілі ўсе. Нават не асталіся ад усіх Ігнась з Аронам.

Больш за ўсіх і спраўней піў Юзік, быццам старанцаецца гэтаю хочучы заваяваць сабе ў таварышоў думку, як аб

добрым сябру. Цьвярозага гэта стараннасьць падштурхнула на нядобрыя. благія думкі аб Юзіку, але ў застольлі яны не заўважылася. У паводзінах Юзікавых прасьлізгвала наяўн жаданьне напіцца, ап'янець, чаго відавочна ён дасягаў: в бляды твар пачаў выступаць румянец, кроў лёгка зайграл на шчоках.

Якраз тады бразнулі звонка і дрыгутка ўваходныя дзьверы І гэты гук глухою трывогаю адгукнуўся ў Ігнася ў сэрцы Ён глянуў на Арона і ўбачыў, што той упяў напружан зірк насустрач увайшоўшым. І яшчэ нешта падобнае д нясьмеласьці, да боязкасьці прызнацца самому сабе ў тым што ёсьць, заглядзеў Ігнась у Аронавым зірку. Ад гэтаг быццам насунулася і на яго нерашучасьць ды боязкасьц Прадчуваньне, што блізка зусім нешта дрэннае, благо што з хвіліны на хвіліну паказацца гатова, прасякнула ў момак яго сьвядомасьць. Для таго, каб быццам папярэдзіць то Ігнась павярнуўся паглядзець, хто гэта прышоў.

Іх было тры—з грубымі тварамі, нявысокія, шырокі ў плячох, як карчы. З таго, як яны саплі і ня зусім цьвёрд стаялі на нагах, відаць было, што яны ўжо пасьпелі ведз добра падпіць

— Гэй, Пэйсах! Што-ж не сустракаеш?

— Ці мо госьці не да спадобы?

— Гыш, жыдзіла якую капэлю падабраў сабе сёньня,- задзіракавата сказаў трэці.

Усе тры адчувалі сябе нібы дома. Выбегшаму насустра Пэйсаху чорны вусаты ў лякаваных ботах „бутэ...камі" кры кнуў:

— Што-ж ня прымаеш, жыдава морда! Нябось, трэб каб рады быў, што больш гарэлкі-вып'ецца.

Чамусьці захацелася Ігнасю зірнуць на Юзіка, можа к паглядзець, што ён робіць і адчувае, ці каб праверы свае першыя ўражаньні аб трох незнаёмых. Юзік сядз нярухома, схіліўшы на рукі галаву, як добра зап'янеўш і ні-то драмаў, ні-то і зусім спаў. Ігнась памкнуўся са ўявіць яго твар і вочы, такія хлусьлівыя, але над вух задзірліва-нахабна пракрычаў чорны вусаты:

— Пэйсах! Заплачуць твае жыдзіныя пэйсы ад так сустрэчы. Жыва!... Дзьве кварты гарэлкі! Як застыў,—ы сучы сын...

— Зараз, зараз... Во-то-то, як бачыце.

Пэйсах баязьліва пабег... свой прыкрамак: цьвяроз відаць было б, як калаціліся... яго рукі. Аднак усяе гэт размовы досыць было, каб прыцягнуць увагу рабо

з Зусевае майстэрні. Зыркія хлопцы былі сярод іх, усё адно, што прысак. І, не зважаючы на п'янаваты шум у галаве, а можа ён нават пасобіў гэтаму, некаторых быццам штурхнула ўсхапіцца з застольля; але да часу як-бы прыкаваліся да свайго месца кожны. Толькі Цімох узяў чамусьці парожную пляшку з канца стала і паставіў перад сабою, нібыта сказаць хацеў Пэйсаху ці сваім таварышом, што замест яе трэба паставіць поўную.

Арон з Ігнасём угледзелі, што і Цімох пазірае спадылба на новых гасьцей, Цімох-жа здаваўся Ігнасю адным з самых лепшых новых прыяцеляў, які ня любіў вельмі, калі гаварылі пра яго прыяцельскасьць. У такіх выпадках ён таргане звычайна рыжым сваім вусам і скажа.

— Ат, выдумалі пра п'яніцу Цімоха.

Скажа і завернецца ў другі бок. Добрым прыяцельскім чалавекам быў адзінокі бадзяй-Цімох.

Усяго гэтага ня ведалі пра яго новыя таварышы па рабоце, як ня ведалі і Ігнась з Аронам.

Новыя прышляцы тымчасам не пакідалі рызындаваць. Чорны вусаты, падобны да варвольнае бочкі, быў, відаць, галавою хэўры. Як толькі П..йсах прыгатаваў ім гарэлку, дык з ранейшаю задзіркаватасьцю крыкнуў ён:

— Ты думаеш, мабыць, што мы і без стала абыйсьціся можам! Ыш—пассоўвалі...

Ігнась адчуў балюча, што гэтыя словы ўжо ёсьць зачэпкаю, толькі якою—яшчэ ня мог уцяміць. Было ясна адно, што сёньня іхныя сьцежкі жыцьця прыходзяць да нейкае сутычкі са сьцежкамі вось гэтых задзіракаватых выпівакаў. Яго думкі перабіў раптам рэзкі і моцны штуршок.

„Пачынаецца", прабегла ў зморaных думках. Нібы праз сон Ігнась убачыў зморшчаны злосьцю круглы, як гарбуз твар чорнага вусатага. Недзе далёка дыблісnуў Юзік са спалоханымі вачыма. І адчуў Ігнась неспадзявана, як яму ахнулі тупа пад духі—і даўнейшая вясновая нуда запяла ўсё ў пакоі ад вачэй, пакінуўшы шэры і цьмяны пробліск. Таксама раптам у пакоі ўсчаўся вялікі гоман, крыкі, грукат, шум, браскацeньне, быццам усё, што было ў Пэйсахавым шынку, нават сталы і зэдлікі, пляшкі і келіхі, што ўсё ажыло, зарухалася і загаманіла. Забраскалі часта дзьвярыма. Затупалі поўна нагамі. Джвэгнула нешта цяжка і ўсё перасіліў потым немы, прарэзьлівы голас... Потым нехта клікаў яго. Ігнася... А яшчэ потым яго панесьлі і ня гэтак далёка звонка брахаў Кіяш. Потым цьмяна пачуўся грукат калёс па бруку і памяць ужо зусім зьнікла. Ігнась нічога ня чуў і ня бачыў.

— НУ, гэта ты зусім дарэмна, хлопча,—жартліва казі
Арон, калі Ігнась адкрыў вочы.

Ён ляжаў на мяккай спружыністай канапе. Паветр
ў багатым пакоі было чыстае і прыемнае, крыху-кры
нейка пахкае—ці мо то ад вазонаў, якіх поўна было ў п
кої, ці так ад чаго. А Арон тымчасам гаманіў і жарты ў
ўпляталіся ў яго сур'ёзныя словы і нібы дакорам гучэ
для Ігнася, нібы казалі пра яго нявытрыманасьць, п
слабасьць.

— Здорава ён цябе пад духі цяў, сволач. Цяпер
можаш сьмела ўступаць на шырокую рэволюцыйную да
гу.—Гэта ж табе проста першае рэволюцыйнае хрышчэны

— Ня сьмейся, Арон. Скажы... Скажы лепш, што там был

Пры гэтых словах трохі ўсьцягнуўся і ўзапёрся на лока

— А ты вось паляжы лепш трохі, гэта-ж я жарт
пасьмяяўся з цябе,—як бацька сыну, сказаў Арон.

Ігнась не паслухаў. Паварушыўшыся, мусіць адчуў ся
здаровым, бо ў тую-ж часіну спусьціў далоў ногі і с
насупроць Арона.

— Не, ты мне скажы, што там было?

— Гэ, каб ты ведаў брат!..

Ён не даказаў. Вочы бліснулі ўздымнаю радасьцю і ў
стухлі. У дзьверы пастукалі ціхенька.

— Ні слова!—сказаў ён і, павярнуўшыся да дзьвяр
гукнуў:

— Але... можа!

Тут толькі Ігнась заўважыў усю прытульнасьць пак
у якім ён сядзеў з Аронам, аднак добра аглядзець увесь
было часу. Дзьверы адчыніліся і зачыніліся зноў. І ў мом
гарачая хваля ад сэрца пырскамі выцела ў шчокі...

— А-а-а-а, наш хворы зусім здароў ужо!

У парозе стаяла тая вясновая дзяўчына, з якою Іг
сустракаўся два разы. Адзін раз яму асабліва памятл
будзе.

— А з вас ну і добрая міласэрная сястра,—дадала
ў Аронаў бок і гульліва паргразіла на яго пальцам.

— А мы, ведаеце, як умеем, па-простаму,—груба ад
нуўся Арон і холадам падзьмула на дзяўчыну ад яго адк

Ігнасю нязручна зрабілася ў гэтай абстаноўцы—
неспадзяванага прыходу дзяўчыны, і ад Аронавых с
грубых і халодных. Здалося, што ён наўмысьля адказ
такі грубы і каб згладзіць паўстаўшую напятасьць загам
Загаманіў пра тое, што ня быў хворы, нават і ня д

хварэць. А гэта дык так толькі, выпадкова—сам вінаваты. Словы блыталіся ў яго, і нязручнасьць ня толькі ня гінула, а ўшчэ ўзмацавалася, вырасла, у абдымкі ўзяла Ігнася і моцна прыціснула да сябе.

Арон сядзеў пахмурны. Ігнасёвая нязручнасьць не кранулася яго. Разы два кінуў ён поглядам на Ігнася і завярнуўся, стаў глядзець некуды. Нязручнасьць датыркнулася і дзяўчыны і тая быццам пацьмянела, пачуўшы адказ Аронаў: усё адно як холад яго слоў нагнаў на люстраную паверхню яе вясёласьці цьмянага налёту—празрыстая аблачынка ўзьбегла на твар ёй. І ці то ўстыла ад гэтага яна, ці то ўтаіла, захавала далёка свае пачуцьці. Рысы твару папрасьцелі, пагрубелі, сталі падобнымі да рысаў твару старасьвецкае статуэткі. На фоне агульнае нязручнасьці толькі вочы яе адны адблісквалі зеленаватым блескам, і з таго блеску вычытаць можна было трохі неспадзяванасьць, гонар, цікавасьць і разам сьмяхотлівасьць.

Арон пакінуў глядзець кудысьці і, перасіліўшы сябе, зьвярнуўся да яе:

— Прабачце... мой прыяцель, вось ён, пытаўся, што адбылося там. Бачыце, я ня ведаю нічога і таму не адказаў яму.

— Ах, вы пра гэта... Сапраўды нічога ня ведаеце?

Дзяўчына зірнула недаверліва на Арона, скалатнула лёгка галавою, быццам атрэпваючы з сябе няёмкасьць, і засьмялялася.

За суседняю сьцяною праз адны толькі дзьверы загаманілі мужчынскія галасы. Дзяўчына бяз гуку перасьцерагла хлапцоў, прыўзьняўшы палец да вуснаў, ды раптам завярнулася і вышла.

Нешта прывабнае было для Ігнася ў гэтым кароткім, што адбылося. Вясёласьць перапыніла іх сур'ёзна-напружаны настрой і, перапыніўшы сама пахаладнела ад яго сур'ёзнасьці. Але не магло яно пр цягнуцца надоўга і сур'ёзнасьць тады адышлася, саступіла месца дзявоцкаму лёгкаму сьмеху. І прывольна, і прыгожа, і загадкава разам было ўсё, што адбылося, Ігнасю.

Арон павярнуўся, каб пачуць, пра што гамоняць у суседнім пакоі. Ігнась-жа глядзеў перад сабою, а ў ваччу была поўная неразьбярыха, мітусь перажываньняў не пасьпела загладзіцца яшчэ. Але паступова яно губляла сваё значэньне і сур'ёзны выраз твару надаў погляду цьвёрдасьці. Ён памкнуўся быў ужо загаманіць з Аронам, калі той, як і дзяўчына, перасьцярог яго і ціха, але моцна, паклаў яму на плячо руку. Ігнась зірнуў на Арона, зразумеў. Бяз гуку, бяз шолаху павярнуўся і, як Арон, устыў.

На твары ў Арона заскакалі гургункі, а ўпалыя шчок ўпалі яшчэ глыбей; чорныя бровы зрабіліся яшча чарней шымі, рашуча сьціснуліся вусны.

Ігнась ужо цалкам аўладаў сабою. Ранейшыя пачуцьі і адчуваньні згінулі ці, як праўду, асяродзіліся ў новым напрамку, да новае мэты. Быў увесь ён асьцярожнасьць, быў увесь увага і рашучасьць.

Галасы вышлі з суседняга пакою і пацiхлі недзе ў дальшых пакоях. Лёгкія крокі неўзабаве наблізіліся да дзьвярэй у якія вышла дзяўчына. Не папярэдзіўшы аб сабе, убегла яна і засьмяялася тым самым сваім бяскрыўдным лёгкім сьмехам.

— Вы не дагадваецеся?

Усьмешка прамільгнула на вуснах у Арона.

— Дагадваемся, але ўсё-ж такі, у чым справа?

Дзяўчына не адказала. Яна падышла пад акно, зірнула на двор і толькі тады вярнулася і села ў мяккае крэсла каля канапы.

— Прыяжджаў памочнік пристава.

— Гэта я ведаю,—перапыніў яе Арон,—такі самаўпэўнены начальніцкі голас можа быць толькі ў прадстаўніка гэтай шаноўнае інстытуцыі.

З вуліцы пачулася, як паехаў рамізьнік.

— Аднак, вы наглядальнасьць добрую маеце. Праўда, прыяжджаў прадстаўнік паліцыі. Чаго б вы думалі?

— Цяжка сказаць. У доме пана... пана...

— Ня пана, а гласнага земскае ўправы,—суха перапыніла дзяўчына.

— Прабачайце, зусім ня ведаю, чаго мог быць у доме гласнага памочнік пристава,—чорства адказаў Арон.

— Ды адкуль-жа мы можам ведаць—бляхары няшчасныя, даказаў за Арона Ігнась.

Дзяўчына хітравата паглядзела на абодвух. З Ігнасёвымі словамі сухасьць сплыла з яе твару і гульлівая вясёласьць заіграла на шчоках.

— Праўда што, адкуль гэткім рабочым, ды яшчэ бляхаром, ведаць, чаго мог прыехаць памочнік пристава. Адны словам, не стае толькі бога: прыехаў, ну што-ж, з богам паехаў—таксама з богам. Якія вы няшчырыя, аднак.

— Шчырасьць хіба ёсьць за метку ў рабочага,—адсек Арон.

— Калі вы ня хочаце гэтак, ну што-ж, няхай будзе т

На далейшую размову прышоў сам гаспадар дому—глас земскае ўправы Няслаўскі. Прывітаўшыся добрадуш з хлапцамі, ён пазнаёміўся вельмі проста, падсеў да іх, і р пачаў новую гутарку.

— Ну, мае сымпатычныя юнакі, як адчуваеце сябе? Вам малады чалавек, варта было адпачыць,—павярнуўся ён да Ігнася.

— Дзякую... Мы вам, пане Няслаўскі... (дачка суха зірнула на Ігнася).

Няслаўскі з крыхою дакору ў словах перапыніў яго і навучальна, па-бацькаўску, сказаў:

— Завеце мяне проста дзядзькам Няслаўскім ці Вадзімам Пятровічам.

Арон праціяў яго ўсяго гострым нахмураным позіркам, а Ігнась адказаў:

— Да старэйшага ды яшчэ начальства трэба гаварыць з павагаю, а на імя ды па бацьку ў нас на сяле размаўляюць мужык з мужыком.

— Тата, яны гэткія няшчырыя хлопцы,—заўважыла дачка.

— Лара,—сказаў ёй строга Няслаўскі.—Вось што, мае паважаныя маладыя людзі, вы яшчэ, мусіць, незнаёмы: гэта мая дачка—будзьце знаёмы... Дык вось я ведаю, што вы рабочыя. Але бачыце, нельга ўсіх рабочых мераць на адзін капыл,—з першага разу, прынамсі, мне гэтак кінулася ў вочы. Але ня думайце супярэчыць,—вы далёка пойдзеце, нябожы. Калі толькі ў вас стане сілы волі, дык вы пераможаце свой лёс і прымусіце яго слугаваць вам, а не наадварот.

— Тата, ты ўжо ім казань сваю пачаў гаварыць. Ня думай, што яны гэткія цёмныя.

— Прабачайце нам, Ларыса Вадзімаўна, я згодзен лепш з вашым бацькам, толькі мала разумею яго,—загаманіў Арон;—але цяпер я хацеў-бы больш практычна паставіць гутарку. Вы якраз, Вадзім Пятровіч, увайшлі на тым часе, калі мы з Ларысаю Вадзімаўнаю падыходзілі да самае справы.

— Та-та-та! Пра што-ж вы гэта? Калі пра тое, што прыяжджаў памочнік прыстава, дык гэта глупства,—ну наконт вас прыяджаў. Але я сказаў, што вас у мяне няма. Так... Так... І гэта яшчэ нічога. Галоўнае—ён надта падозраных думак аб вас, вось што.

— Што-ж яму патрэбна было?—пагражаюча, спытаўся Ігнась і адчуў, з якою вялікаю сілаю загарэлася ў ім раптам нянавісьць да гэтага прыстаўскага памочніка, да ўсяе паліцыі, да ўсяго начальства.

Няслаўскі ціха казаў далей.

— Усё гэта глупства. Ці паверыце, яму чамусьці здалося, ці нехта там сказаў, што вы ня проста рабочыя.

— Брэша ён!—абурана выгукнуў Ігнась.—Я поўнае сяло сьведак прыстаўлю, што я з мужыкоў, сын наймічкі і нават ня ведаю, хто мой бацька.

Груба праказаў апошнія словы Ігнась, можа нават і ня цямячы, які глыбокі сэнс яго слоў пра сваю радаслоўную.

— Вы прабачце, дзядзька Няслаўскі, калі вас можа абра-
зіла, я не хацеў гэтага, я толькі супроць чалавечае не-
справядлівасьці над людзьмі.

— Ды не, што вы, я і на ўвазе ня меў, каб абразіцца, бо
вы зусім праўду сказалі. Я не пра тое хацеў, хлопцы...
Памочнік пристава падазрае вас, ну, як тут сказаць, ну,
у вашай адукацыі. І ён сказаў, што вы ня зусім рабочыя,
а хлопцы, ды ого яшчэ якія хлопцы,—раскінуў рукі Няслаў-
скі.—А калі грубей сказаць, ен лічыць вас за бунтароў.

— За бунтароў?—працадзіў праз зубы Арон.

— Толькі не зважайце на гэта, бо я давёў яму нягрун-
тоўнасьць падазрэньня, і мне, як гласнаму земскае ўправы,
ён паверыў.

— Дзякуем, — праказаў Ігнась. Абурэньне ў яго крыху
міналася, стан душэўнае роўнавагі ўціскаўся ў свае рамкі.

Загаманіў Арон.

— На чым-жа грунтаваўся пан памочнік прыстава, пада-
граючы нас у бунтарстве?

— Цяжка сказаць...

— А гэтая бойка, тата,—уставіла Ларыса.

— Лара, я не прасіў, каб ты падказвала мне!

Ларыса надзьмулася і пачала камячыць паясок ад свайго
гарнітура.

— Невядома яшчэ супроць каго можа паказаць бойка. Ды
там і бойкі ня было такое. Проста п'яныя разбойш
напалі на рабочых і больш нічога. І вось якраз на іх трэб
паляваць памочніку прыстава паліцыі,—хмуры праказаў Арон

— Яно праўда, але вы забываеце пра тое, што аднам
з гэтых разбойцаў акрывавілі ўсю галаву.

— Па заслугах плата.

І абодва—і ён і Ігнась—падумалі: „Гэта напэўна Цімо
зрабіў".

— Каб вы не пасьпяшылі адразу выбрацца адтуль, ды
ясна, што было-б горш. Праз пятнаццаць хвілін там бы
гарадавыя і, вядома, некаторых пазабіралі.

— Чаго і трэ' было чакаць. А каго забралі?

— Як сказаў памочнік прыстава—двух рабочых.

— Я гэтак і думаў.

— Гадзюкі!—неспадзявана заявіла Ларыса і ўся ўспалы-
нулася раптам, заірдзела.

— Ларыса,—навучальна праказаў Няслаўскі:—табе ніх
не даваў права казаць гэтак.

— А яны... Яны самі далі гэтае права, і ты, тата,
затыкай мне рот!

І зноў Ларыса, толькі ўжо хутка-хутка, нэрвова быц
перабірае пальцамі складачкі свайго гарнітура.

— Часам ты бываеш права, дачка, толькі не цяпер.

— Цяпер вам,—зьвярнуўся Няслаўскі да хлопцаў,—баяцца няма чаго, але на далей трэба сьцерагчыся.

— Дзякуем,—за сябе і за Ігнася праказаў Арон.

— Ня дзякуйце,—адказаў Няслаўскі.

— Мы зрабілі толькі тое, што павінен зрабіць кожны сумленны чалавек,—дадала Ларыса.

Хлопцы разьвіталіся з Няслаўскімі і ўжо былі пайшлі, калі Ларыса дагнала іх і параіла ісьці не парадным ходам на вуліцу, а чорным праз сад, адкуль можна выйсьці на глухі завулак.

— І яшчэ... Я з бацькам просім вас, каб заходзілі калі гуляць... Мы-ж ужо знаёмы.

Калі Ігнась з Аронам, ня сустрэўшы нікога, вышлі ў сад, Ларыса вярнулася ў пакой, дзе сядзеў бацька.

— Я казала, тата, што хоць яны і рабочыя, але ня гэткія, якімі рэкомэндуюць сябе.

— Праўда Лара. У іх прыкметна, хоць трохі і цьмяная— дысцыпліна, дысцыпліна ў пачуцьці і адчуваньнях. Яны здольныя хлопцы, дачка.

— Такія людзі патрэбны цяпер, тата,—сказала Ларыса і, спусьціўшы галаву на рукі, задумалася ў куточку канапы.

Тымчасам Арон з Ігнасём знайшлі варотцы ў плоце. Было відаць, што праз іх мала калі ходзяць, бо клямка і ўся акоўка заіржавелі і густая трава парасла з-пад нізу. Перш чым адчыніць Арон запытаўся ў Ігнася, куды ён думае ісьці.

— І сам ня ведаю.

— Дык хадзем да мяне.

І акружнаю дарогаю па глухіх і малалюдных завулках хлопцы пашыбавалі да Аронавае кватэры.

### З ЖЫЦЬЦЯ ЗЬЛЕПЛЕНЫЯ

ГЛАСНЫ Няслаўскі спраўдзіў; асабліва апасвацца паліцыі ня было падстаў Ігнасю з Аронам, а, ясьней кажучы, у тае ня было прычэпкі, таго кончыка, ухапіўшыся за які можна-б разматаць і ўвесь клубок, праўда, невялічкі пакуль-што. Як і раней—да здарэньня—хадзілі ў майстэрню на работу Арон з Ігнасём. Памаленьку і зусім неўзаметку для вонку вялі сваю пропаганду. З слова на слова, дзень-прыдні пасоўвалася яна наперад, паглыблялася, пушчала карэньні глыбока ў пладавітаю глебу.

Ігнась жыў у Арона. Узяўшы ў гаспадара першыя заробленыя грошы, ён разьвітаўся з Зусеваю кватэраю і з самім гаспадаром, без асаблівага жалю пакінуўшы пануры катушок з адным акенцам. З радасьці, што хоць крыху зможа пасобіць мацеры, яе цяжкому гору, недаедзі,—першае ж нядзелі схадзіў у сяло і ўзрадваў Агапу.

Ах, як рада была яна! Колькі радасных сьлёз вылілася на яе пажоўклыя сухія шчокі! Як глядзела яна на свайго сыночка, на свайго Ігнаську, які з хлопчыка стаў ужо сапраўды мужным хлопцам, рукі якога загрубелі і памацнелі з мазалёў. Як маленькае дзіцянё, як даўно-даўно некалі, гладзіла яна трохі пацьмянеўшыя рыжаватыя валасы яго, абдымала за шырокія дужыя плечы і усё плакала, плакала сьлязьмі радасьці.

І неяк забыўся Ігнась тады пры матцы на сваё гарадзкое жыцьцё, неяк адступілася яно і ў туман пахаваліся сябры, таварышы з майстэрні, знаёмыя. І змоўкла быццам яго сумленьне, сумленьне змаганьня за такіх сама зьняволеных, як і матка. Матчыная радасьць узьвялічылася над усім. Было гэтак добра. Гордасьць поўніла грудзі вялікім уздымам сонечнае прыгажосьці. За колькі год сьвядомага жыцьця ён ад сэрца ўсьцешыў матку першы раз, і сапраўды адчула тая, што будзе пры кім дапнець ёй, што сын дагледзіць яе апошніх дзён.

Толькі на ростані ўявілася яму цалкам уся шэрань будзёншчыны, з усімі сваімі цяжкасьцямі і горам, і прыгажосьць нядаўная стала далёкаю і недасяжнаю, бо толькі праз шлях барацьбы з кроўю можна дасягнуць радасьці, толькі ён можа даць зьняволеным долю і шчасьце. Значыць, прагажосьць і шчасьце ў барацьбе, у ёй, і толькі ў ёй!

Праз тры дні пасьля здарэньня ў Пэйсахавым шынку прышлі на работу Цімох з Яўхімам, малапрыкметным цікім рабочым. Гэта пра іх арышт казаў Няслаўскаму прыстаўскі памочнік.

— Што было... Што было,—адказваючы на роспыты казаў Цімох,—ды расквасіў пляшкаю галаву аднаму, другі раз мо' не палезе. У паліцыі... пыталі ўсё: хто ты, ды што ды з кім і дзе. А я проста... Ніхто і ні з кім, нічога. Піл на дармоўшчынку гаспадарскую, ну і справа кончана. І не мяшай, калі п'юць людзі, а то біты, як сабака, будзеш. Страшылі, ды што мне з іхнага страху. Пляваць хацеў Цімох.

І з жорсткасьцю прыступаў да работы, зрэдку і густа сплёўваючы пад ногі.

— Не, ты скажы, як цябе частавалі там!—крычалі з другога канца.

— А ты схадзі паспытай, дык будзеш ведаць, ці смачна,— аскірзаўся Цімох.

— А Яўхім не абзываецца нават, мусіць, вельмі добра было.

— З вамі было-б лепш,—адказаў і за Яўхіма Цімох.

Яўхім маўчаў. Але і ў маўчанцы аднаго, і ў лёгкіх жартах другіх быў адзін зьмест і адзін сэнс. Жарты таварыскія, бяз ценю насьмешкі, казаліся, каб падтрымаць таварыша, каб узбадзёрыць яго.

Аднаго дня нешта Арон атрымаў ліст. У лісьце зусім ні аб чым ня пісалася. Толькі па расшыфраваньні ўскрывалася пэўная думка. Аўтар, нехта Барыс, пісаў, што Арона чакае цэлы пакунак нейкіх рэчаў на чарговай станцыі ў знаёмага чалавека.

Поезд ішоў а 9-ай гадзіне ўвечары і Арон хутка сабраўся ехаць. Пераапрануўшыся ў свой сьвятковы гарнітур, ён разьвітаўся з Ігнасём.

— Заўтра ўраніцы чакай.

Чула спаў гэтае ночы Ігнась. Думкі вярзьліся ўсё розныя, атулялі дакучлівым роем. Часамі боязкасьць па Арону сьціскала абцугамі сэрца, і рабілася шкода і яго і сябе, сябе таму, што адзін адзінюткі бяз чулага і разьбітнога Арона. А калі засынаў, дык сьнілася ўсё вялікая чорная лапа-рука, растапырвала пальцы, працягвалася над ім і Аронам. Устаў Ігнась рана-раненька, зірнуў на гаспадарскі гадзіньнік. Было па шостай, а поезд прыходзіў у шэсьць трыццаць. Але чамусьці ўбілася ў галаву, што гадзіньнік не сьпяшаецца, а цяпер будзе больш. Ігнась хуценька памыўся і апрануўся. Не, вядома, ён ня мог чакаць Арона тут. Заплікнуўшы праз пяты ў дзесяты аплікі дамотканае жакеткі, Ігнась выладзіўся на вокзал.

Але не адышоўшы яшчэ мо' крокаў ста ад кватэры, пачуў, што яго нехта гукае ззаду. Ігнась азірнуўся. Ля брамы стаяў Арон. Радасны зьвярнуўся Ігнась назад.

У пакоі пытаўся:

— Дзе твае рэчы? Не маглі-ж ашукаць цябе.

— А няўжо ты думаў, што я чамадан цэлы прыпру. У нас, брат, гэтак няможна.

Кажучы, ён распрануўся і разьдзеўся аж да сподняе бялізны. Толькі тады Ігнась заўважыў, што Арон патаўшчаў за адну ноч надзвычайна, і дагадаўся.

Ён ужо нецярпліва чакаў, каб хутчэй пабачыць гэты таемны багаж. Калі Арон разгрузіўся канчаткова, дык на падлозе ляжалі цэлыя кучы розных папераў, газэт, кніжак. Але Ігнасю не ўдалося здаволіць свае цікавасьці. Арон сказаў толькі, што гэта ўсё сьвежая партыйная літаратура і што

разабраць давядзецца прышоўшы з работы. З гэтымі словамі ён загарнуў усё ў газэціну і вынес некуды на двор.

Па рабоце, папалуднаваўшы, Ігнась запытаўся, чаму Арон гэтак рана прыехаў. Той расказаў цэлую гісторыю. Вышла, што па прыезьдзе на станцыю ён успаў на вока паліцэйскім сачком. Правалэндаўшыся ноч, ён узяў, нарэшце, літаратуру. Але тут паўстала пытаньне, як вывезьці. Прехаць поездам — нямінуча пападзеш, бо пры паяздох, асабліва на вокзалах, цэлыя атрады шпікаў. Тады яго выручылі свае таварышы — чыгуначнікі; два чалавекі ўзяліся завесьці яго на дрызіне. Такім парадкам ён і прыехаў на цэлую гадзіну раней.

Пад час разбору літаратуры на дварэ залемантаваў Кіяш. У момант літаратура адправілася ў групку. Усьлед затым Ігнась выбег, і зьдзівіўся.

Прышоў Яўхім. Супроць свайму звычаю, ён весела, але саромліва сказаў:

— А я да вас, хлопцы.

— Праходзь.

— Вось толькі сесьці няма дзе ў нас, — сказаў Арон, — але не бяда, сядай хоць на ложку.

— А я да вас, хлопцы... — быццам аднаўляючы перапыненую гутарку, — сказаў Яўхім. — Вельмі цяжка, браткі, так цяжка, што проста і сказаць нельга. Я бачу, што вы не такія, як усе. Нават Цімох, і ён ня тое.

— Што ты, Яўхім! Нельга адчайвацца так, — сказаў Арон.

— Вось і я да таго-ж дадумаўся. Мяне ўсе лічаць ціхім, негаваркім, а можа і не сябром, але, паверыце, гэта таму, што заўсёды я думаю... Думаю аб пражытым, аб цяперашнім жыцьці, а яшчэ больш пра далейшае.

— Думаць трэба, — цёпла сказаў Арон. — Трэба... бо інакш чалавек нічым ня розьніўся-б ад жывёлы. Гэта дадатны бок кожнае разумнае істоты.

— Я разумею, Арон. Але-ж толькі думаць яшчэ мала, ці мо' надта поўна. Я ўжо ўвесь адурнеў з гэтых думак.

— Бяз думак нельга жыць. Думкі заўсёды павінны вырашаць нешта. І чалавек, надумаўшыся што, павінен нешта і рабіць. Той, хто думае і робіць, той займае месца ў жыцьці, той разумна жыве.

— Вось я і думаў, хлопцы. Ужо да таго дадумваўся, што казаў сам сабе: „Кінь, ня дуры“, і часта клаўся спаць думаючы жыць, як набяжыць. Але ня мог.

— Скажы, — запытаў яго раптам Ігнась, — ты кніжкі якія ці газэты чытаеш?

— Ды што, сказаць папраўдзе, не падабаюцца мне гэтыя кніжкі ды газэты.

— Праўда,—сказаў Арон,—але-ж трэба ўмець чытаць кніжкі. Усякая кніжка карысная па-свойму, толькі з яе трэба браць тое, што патрабуецца жыцьцём і што ім вымагаецца.

— І на кожную кніжку ёсьць свой чытач,—дадаў Ігнась.

— Ты жанаты, Яўхім?—запытаўся Арон.

— Не, я жыву са старымі бацькамі, ды пры мне яшчэ брат, дзесяць гадоў. А з таго заработку... Каб не свая хатка нейкая на юрох, дык хоць воўкам вый.

— Так. брат Яўхім Што год міне, дык горш і горш робіцца жыць. Ані цар, ані чыноўнікі палец аб палец ня выцялі, каб палегчыць жыцьцё.

— І ня вытнуць,—дадаў Ігнась.

— Ну, можа цар то і ня ведае, што робяць чыноўнікі.

— Забудзь, Яўхім,—чыноўнікі выконваюць царову волю і ўсё робіцца па яго загадах.

— Як-жа выкруціцца з гэтага? Няўжо паміраць, маючы здароўе, сілу? Паміраць з голаду?

— Але-ж, каб ня было ніякага ратунку. Толькі здумай, ці мала ёсьць такіх, як ты і мы... І на сілу не пакрыўджаны, моцныя, як дубы, але бяда, што адукацыі не стае ім, асьвечанасьці. Ня ведаюць яны, што робіцца на сьвеце. Эх, цемра людзкая! Колькі сілы забрала яна, колькі здольных людзей загінула праз яе.

— Арон! Ігнась!—раптам усклікнуў Яўхім.—Як да родных братоў прышоў я і прашу, дайце рады, як жыць.

Ён нізка спусьціў галаву і ўтаропіўся вачыма перад сабою.

Арон сказаў:

— Жыцьцё можна накіраваць. Толькі кожны ў асобку ня здолее таго, каб перайначыць жыцьцё; дык трэба злучыць усю змучаную галодную сілу і паказаць сябе, як сілу. Вось дзе ратунак, Яўхім.

І, не даючы сябе перапыніць, Арон устаў і пачаў хадзіць па пакоі, размаўляючы як-бы сам з сабою:

— Даўно ўжо людзі зразумелі, што нельга гэтак жыць. Яшчэ нас ня было на сьвеце... Роўна трыццаць тры гады таму парыскія рабочыя ў Францыі забунтавалі і прагналі свайго караля; семдзесят дзён трымалі ў сваіх руках Парыж, сталіцу Францыі. Але прамахнуліся, нарабілі памылак і тысячы комунараў, верных сыноў рэволюцыі, палілі сваёю кроўю вуліцы Парыжу. У Францыі цяпер рэспубліка—народная ўлада, але рабочы стогне, як і стагнаў. А ў нас... дзесяткі і сотні лепшых сыноў народу, ці гніюць на катарзе, ці хаваюцца ад царскіх апрычнікаў за граніцаю. Колькі сілы марнее пад царскім бізуном. Вось справядлівасьць людзкая... Сьмерць гэткай справядлівасьці!

— Я заўжды думаў, Арон, што ты чалавек. Каб ведаў, як ты узбадзёрыў мяне. Ды гэта-ж жыцьцё ня шкода аддаць

— Вучыцца трэба, вучыцца, Яўхім,—весялей ужо загаманіў Арон,—я табе дам кніжак. Толькі глядзі, каб гэты кніжак, ніхто чужы ў цябе ня бачыў.

Замест адказу Яўхім моцна пацiснуў руку Арону.

Як і перад Ігнасём першага разу пакорпаўся Арон у скрынцы і даў Яўхіму пару кніжачак.

Як пайшоў Яўхім, Арон сказаў Ігнасю:

— Вось з гэтага выйдзе рэволюцыянэр, калі хопіць сілы волі і цьвёрдасьці, калі ён усьвядоміць сабе інтарэсы свае клясы.

— А з Цімаха не,—сказаў Ігнась.

— Чаму ты думаеш?

— Так. Цімох стараваты. Вельмі шмат ужо старога захавалася ў ім, надта ўжо не працівіцца ён гэтаму.

— Ты праўду кажаш.

— З яго можа быць добры салдат, барацьбіт супроц поліцыі, адным словам,—чорнарабочы баец за свабоду.

— Глядзі, Ігнась,—раптам загаманіў Арон,—я прывё вельмі важныя і прыемныя навіны. Ужо некалькі тыдня бастуюць рабочыя на поўдні Расіі—у Кіеве, і ў Нікалаеве і ў Кацярынаславе, і ў Харкаве. Усеагульная забастоўк ахапіла ўсю прамысловасьць. З 1894 году ніводзін год н можа параўнацца з гэтым па велічыні ўздыму і шыры разгону рэволюцыйнае хвалі.

— Дык значыць рэволюцыя блізка!—радасна падхапі Ігнась. Не, Ігнась, можна памыліцца, вельмі слабая яшч ў нас організацыя, значна слабейшая чымся за граніцаю Праўда, мы маладыя, рабочая кляса Расіі наогул малада мала яшчэ маем вопыту...

— Ды гэта нічога, толькі ўзбудзіць трэба ўсіх, паклікаі голасна і пакомандаваць імі, тады ад гэтае сілы пад адны напорам, як ад ветру, паваліцца царскі трон. Бо гэта буд ня вецер, а бура!

— Не, Ігнась. Трэба, каб гэтая бура была бураю разу наю, каб яна ня была сьляпою.

— Хіба-ж ня кожны рабочы ведае, хто яго вораг, у чь яго няшчасьце?

— Вось у тым і ўся бяда, што яшчэ ня кожны рабо ведае, у чым яго няшчасьце і хто вінаваты ў ім. Ды яшч як на тое, добра трэба разумець, хто вораг і як з ім ра правіцца.

— Поўна навукі патрэбна,—задуменна праказаў Ігнас

— І вялікую работу прарабіць, каб працерабіць шлях, па якім павінны пайсьці атрады рэволюцыі. Вось нядаўна скончыўся другі зьезд партыі... Калі мы не ўявім сабе ўсяе сутнасьці яго, пакуль ён ня стане для нас ясьней яснага, ня можам мы змагацца за рэволюцыю, ня можам падымаць рабочыя масы на барацьбу.

Ён дастаў з печы літаратуру і пачаў раскладваць. Ігнась ухапіўся за газэты і брошуры.

## СХОДКА Ў ДУБРОЎЦЫ

НЕШТА аднаго разу Арон сказаў Ігнасю, што назаўтра пад вечар, у бярозавай дуброўцы, дзе яны ня раз чыталі кніжкі, зьбярэцца сходка. Пачуўшы пра тое, Ігнась запытаўся.

— Каго нам варта ўзяць з сваіх хлопцаў?

— А ты як думаеш?

— Мне думаецца, трэба сказаць Яўхіму і... Цімаху. Чым большы кадр рэволюцыянэраў будзе выхоўвацца, тым лепш будзе для рэволюцыйнага руху. А Цімох... Галоўнае, яму няма чаго траціць.

— Так, можна і Цімаха. А больш?

— Больш нікога.

— А я лічу патрэбным запрасіць яшчэ аднаго...

Тут Арон загаманіў зусім ціха, зьнізіўшы голас да шэпту. І шэптам адказваў яму нешта Ігнась. Хвілін дзесяць шапталі гэтак, дагаманіўшыся, нарэшце, да нейкае згоды. Мусіць Ігнась супярэчыў нешта, але потым сказаў:

— Калі толькі не сарвецца, дык добра задумана.

— Трэба зрабіць, пакуль ня позна.

— Так, я разумею цяпер. Ведаеш што, Арон, нам патрэбна зброя. Хоць-бы рэвольвэры на першы пачатак. Трэба быць гатовымі, а то што мы з голымі рукамі.

— Праўда. Але бяз грошай нічога ня выскураеш.

— Глупства. Два месяцы не даясі трохі, вось табе і грошы.

— Як табе здаецца...

На рабоце ў майстэрні было грукатна і шумліва. Ляскацела бляха, жухалі горaны, сіпела пад паяльнікамі серабрыстае волава. Грук і гоман, гоман і шум.

Аднаго за адным абыходзіць Зусь усіх рабочых. Старымі, але зоркімі вачыма неймаверна аглядвае работу ў кожнага і, не знайшоўшы хібы, ідзе павольнаю гаспадарскаю

хадою на двор. Рукі, пазакладваныя ззаду, пстрыкаюць па-старэчаму здаволена пальцамі.

На полудні Ігнась зышоўся выпадкова з Яўхімам і сказаў, каб ён зайшоў разам з Цімахом на кватэру да Арона.

— Справа ёсьць,—адказаў ён на маўклівае запытаньне.

А тымчасам Арон паклікаў Юзіка і накіраваўся з ім на двор. Колькі часу хадзілі яны, размаўляючы пра нешта. Калі Юзік нясьмела адказваў, ня гледзячы ў вочы таварышу, дык Арон слухаў уважна, а калі Юзік маўчаў, дык Арон працінаў яго гострым поглядам чорных воч і халадок засьцілаў твар яго і рабіўся ён увесь тады напята-пруткім і цьвёрдакаменным. Юзік ішоў упоравень, неяк вінавата перасоўваючы ногі, быццам няёмкасьцю спутаны быў. А Арон лёгка і спружыніста ставіў нагу, усё адно як на паляваньні, чуючы недалёка здабычу. І відаць было яшчэ, як Юзік адмаўляў у нечым, пра нешта гаварыў няўпэўнена. А як адышоўся Арон, дык усьмешка горкая і едкая зайграла ў яго на вусах і хутка зьнікла. Арон-чалавек стаў звычайным хлопцам, рабочым з Зусевае майстэрні.

На другі дзень, ідучы на работу, Ігнась загаманіў з Аронам пра Няслаўскіх.

— Калі памятаеш, дык я з дачкою знаёмы даўно, яшчэ з вясны.

— І калі я не памыліўся,—сказаў Арон,—яна была прычынаю нашага з табою знаёмства.

— Дык жэ-ж. Потым я нешта раз сустракаўся з ёю на вуліцы, ішоў да Любы,—ты, здаецца, ня знаеш яе?

— З тваіх размоў толькі.

— Каб ты ведаў, Арон, якая яна добрая і чулая дзяўчына. Ёй яшчэ год засталося вучыцца ў гімназіі. Я цябе конча зьвяду калі з ёю. Але Няслаўскія... нешта ў іх ёсьць такое.

— Пакуль адно можна сказаць: Няслаўскі няшчыры царскі чыноўнік,—а наконт ідэй (бяз ідэй, абы якіх, рэдка можа быць чалавек) я не бяруся меркаваць. Вось калі разьведаю лепш ды пагаманю, тады скажу.

— Розьніца ўсё-ж такі паміж бацькам і дачкою ёсьць.

— У бацькі больш пастарэлае ўстрыманасьці, а ў дачкі — экзальтаванасьці. Але пародзьдзе адно.

— Другі раз я сустрэў яе на вуліцы з пажылаю і багата ўбранаю паняю. Апошнюю яна называла маман.

— Па французску—мама.

— І яшчэ...—Ігнась запнуўся і панура сьціснуў на хвіліну зубы.—Нейкі хлюст, знаёмы Ларысы Няслаўскай, назваў мяне мужычылам.

— Вось гэта нам ня зусім абыякава,—зацікавіўся раптам Няслаўскімі Арон. Калі іхныя знаёмыя такія, дык мала лепшыя і самі Няслаўскія. Ты чаго глядзіш?—запытаў ён Ігнася.

— Я не дачуў тваіх апошніх слоў.

— Ах толькі, і ўсё? Я кажу, што факт на вуліцы ўскрывае нам адну адмоўную рысу Няслаўскіх.

— Чаму?

— Таму, што сярод іх знаёмых ёсьць ці людзі белае косьці і галубое крыві, ці людзі, якія перафарбавалі чорны колер яе на белы... Але мы нешта ня бачылі ў доме паважанае маман Няслаўскае. І ні бацька, ні дачка ні слова не абазваліся пра яе. Але, нарэшце, гэта ня цікава. У нас больш важныя справы.

Ігнась папнуўся быў сказаць яшчэ нешта, але Арон быццам забыў пра гутарку,—глядзеў сабе ў ногі. Блізка была майстэрня. Так Ігнась нічога больш і не сказаў.

Па рабоце, як было ўмоўлена зараней з Аронам, Ігнась пайшоў на кватэру адзін, за ім неўзабаве пастукаліся ў дзьверы і Яўхім з Цімахом. Ігнась забраў трохі літаратуры, а трохі даў Цімаху і Яўхіму, паведаміўшы пра сходку.

— Усякія такія сходкі забаронены і вінавайцы ў іх караюцца паліцыяй. І з намі можа ўсялякае здарыцца. А цяпер пайшлі.

Схаваўшыся ў двары насупроць, Арон бачыў, як уваходзілі і выходзілі Ігнась з Яўхімам і Цімахом, і як толькі пайшлі ўжо, Арон прапусьціў іх, паглядзеў на бакі, заскочыў на кватэру. Там усю літаратуру, усё, што магло-б паказаць аб рэволюцыйнай чыннасьці кватаранцаў, сабраў у кучу. Потым высунуў з вушакоў невялічкі парог у сваім-жа пакойчыку. Адчынілася невялічкая адтуліна пад паллогу як дзьвюм рукам прасунуцца. Арон пакідаў у адтуліну брошуры ды паперы і засунуў парог. Пакой зноў набыў свой натуральны выгляд. Абабегшы вокам вакол, Арон насунуў на лоб шапку і, мармычучы пад нос нейкую песеньку, вышаў на двор. Якую часіну пастаяў (як бы думаў што зрабіць), а потым пасьвістаўціхутка і да яго падбег Кіяш.

Арон пагладзіў ласкава сабаку і выступіў на вуліцу. На завулку нічога няпрыкметна было. Аднаго зірку хапіла Арону, каб убачыць гэта. Адразу прыбавіўшы кроку, Арон хутка пайшоў сьледам за таварышамі.

Хвілін праз пяць ён убачыў іх паводдаль. Хлопцы ішлі, быццам спацыруючы. Тады Арон убавіў кроку і пайшоў ужо назіркам.

Сухі і цёплы восеньскі дзень спрыяў быццам сёнешняй пагулянцы хлопцаў. Гарачае сонца нізілася павольна к заходу. У паветры, як у сьне, плавала даўжэзнае серабрыстае

павуціньне. І гэтак прывольна было і люба на надворку, толькі адышоўшыся трохі далей, з пыльнага гораду на зялё нную мураву, пад мяккую засень малачавага бярэзьніку. Н ясна чыстым небе ні хмаркі, ні аблачынкі. Як прыгожа бл кітная матэрыя працягнута над галовамі. Ні ветрыка. Бы цам млее ўсё навакол, апавітае серабрыстымі ніткамі з па вуціньня, быццам дрэмле і сьніць першыя сны-казкі. Павод даль трохі працяглася крывулістая вузкая рэчка Лакн Паветра, як і ўсё назакол, напоена салодкаю томкаю няру хомасьцю. Вось з-за залому выплыў бруднавата-чырвоны таварны поезд і ўжо праз якое паўхвіліны, адсопваючы ў задуменьні, ён агінае горад і цяжка, неахвотна паўзе н вокзал. Селянін з возам на рабрыстым мышаку чакае цяр пліва, калі працягнуцца вагоны. Ён ужо налічыў цэлы дваццаць штук, а яны ўсё паўзуць і канца-краю, здаецц няма ім.

Арон зусім спыніў крок, пабачыўшы, што хлопцы па сталі на пераезьдзе. Ен сышоўся на бок і сеў. Кіяш пацёр морду аб яго калені, высалапіў язык, лёг паблізу. Як н сур'ёзна было становішча, як ні адказна і ні небясьпечн сёнешняе асабліва, а Арону захацелася раптам легчы дагары раскінуць рукі і ногі, глядзець проста перад сабою ў вы сокі блакіт і прагна ўдыхаць густыя восеньскія пахі.

Уздыхнулася Арону. Ці ўспамянулася яму што, ці шкал чаго зрабілася? Ці можа ўздумалася, чаму вось кожны ч лавек ня можа адчуваць усяе прыгажосьці, што навако і скарыстацца ўволю з усяе дабраты яе?

Думкі, неадчэпныя думкі заўсёды з Аронам. Паку і жыць будзе, не расплывуцца, ня зьнікнуць яны. Хіба мо дажыве таго часу... А не, і сьмерць наклічуць яны, неадчэ ныя, надта ўжо сілу сваю ўзялі над ім. Але будзе бур Будзе навальніца. Вітаньне буры!

Кіяш шорсткім языком лізнуў руку. Зацвыркаў ля ву раньні цвыркун; халадок ускалыхнуў асьцярожна млявы сп кой і скінуў чары дрымотнасьці.

Арон устаў, зірнуў на пройдзеную дарогу, на бакі і н перад. Таварны поезд даплыў ужо да вокзалу; селяні нідзе ня відаць на дарозе; хлопцы ўступілі ў дубровачк Кіяш быццам гукаў пасьпяшыць. Вось ён зірнуў на Аро потым на дуброўку, а потым зноў на Арона. Дыхнуў пе шым подыхам ветрык. Арон засьвістаў, ідучы, нейкую б ную раздольную песьню. Кіяш заскакаў, закруціўся п нагамі.

На ўмоўленым сходачным месцы Арон застаў гру з 15 таварышоў, большую палову ён знаў, а з рэштаю знаёміўся тут-жа, проста падаючы руку, як-бы знаёмы ў

быў колькі год. Таварышы яму казалі пра кожнага новага, хто і адкуль, калі і як зблізіўся з арганізацыяю.

Адзін таварыш з мястэчка за 30 вёрст прывёў з сабою парабка-літвіна з двара Няслаўскага. Арон хвіліну ветла пагаманіў з таварышамі і сказаў:

— Больш пасьля пагутарым.

Тымчасам падышлі яшчэ трое чыгуначнікаў з вокзалу ды два хлапцы з гораду. Усіх сабралася на сходку чалавек дваццаць.

Пагаманіўшы са старэйшымі таварышамі, Арон з Ігнасём параздавалі літаратуру—і сходка пачалася.

Перш Арон паведаміў аб апошніх падзеях на поўдні, аб другім зьезьдзе партыі і пастановах, якія прыняты там, а потым спыніўся на асабліва важных.

Ад дзённяшняе дрымоты папрачыналіся вечаровыя птушкі вытылінкваць сталі ў розныя галасы аб сваім абуджэньні. Сонца яшчэ не схавалася, але раса ўжо густа пакрапіла апавітую тонкаю густою сеткаю з павуціньня высокую траву. Заблішчэлі вясёлкамі ў апошніх чырвоных праменьнях чыстыя дробныя кропелькі. Першы туман, лёгкі і рэдкі, як пара над гаршком, пачаў уздымацца над рэчкаю, гусьцець і большаць.

Сонца заходзіла, распырскваючы чырвоня медзяныя пыркі на траве, па белай кары маладых бярозак. І зямля астывала пад апошнімі халаднеючымі пацалункамі сонца, і было прыемна на першай вечаровай расе пад уладаю гарачых, цьвёрдых слоў Арона. Яшчэ колькі таварышоў гаварылі пасьля яго. Падаў добрую думку літвін, парабак Няслаўскага.

Ён казаў, што соцыял-дэмократы не вядуць агітацыі і прапаганды сярод парабкоў, гэтых усьцяж зьняволеных і прыгнечаных людзей. Дзякуючы таму, сярод парабкоў у дварох маюць некаторы ўплыў ідэі соцыялістаў-рэволюцыянэраў, а ў апошнім часе наглядаецца агітацыя за зямлю нейкае Беларускае соцыялістычнае грамады.

— Парабком бывае часамі яшчэ горш, чымся рабочым фабрык і заводаў. Парабка памешчык можа часта зьмяніць, выкінуўшы бяз усякіх, асабліва ў летні сэзон, калі наплыў сялянскае рабочае сілы запруджвае двары. Нам трэба ўзяць пад сваё кіраваньне рабочых у дварох, трэба распаўсюдзіць соцыял-дэмократычны ўплыў на парабкоў.

Арон выказаў думку аб утварэньні комітэту организацыі.

— Усе апошнія падзеі гавораць, што рэволюцыйны рух мацнее і пашыраецца. У нашым павеце група расьце. Вынікаюць новыя задачы, работа становіцца больш сур'ёзнаю. Аднаму таварышу ці двум цяжка ўгледзець за ўсім, што робіцца і што трэба зрабіць.

Сходка цалкам ухваліла прапанову і даручыла зрабіць гэта Арону.

Потым ён вынес на сходку прапанову, каб азнаёміцца кожнаму са становішчам у павеце, а галоўнае—з настроямі паслухаць кожнага таварыша. Першы стаў апавядаць літвін але толькі гэта ён сказаў некалькі слоў, як Кіяш узьняў галаву і замармытаў на кусты. Ігнась пагладзіў яго і паспрабаваў супакоіць. Але сабака выскаліў зубы, ірвануўся з рук Ігнась зразумеў.

Перапыніўшы прамоўцу, ён сказаў, зьбіваючыся ў словах

— Паблізу ёсьць нехта... я лічу небясьпечным больш сядзець тут... Сабака мае добрае чуцьцё і папярэджвае нас Гэты нехта ня можа быць за прыяцеля нам. Я прапаную разыйсьціся.

Арон хутка ацаніў становішча. Махнуўшы рукою, прыняў на сябе ўвагу ўсіх, хоць было гэта даволі цяжка зрабіць вытрымаць спакой, ведаючы, што за плячыма ў цябе недзе, можа зусім блізка, хаваецца вораг. Ігнась ухапіў за шыю Кіяша і сьціснуў яму морду, не даючы забрахаць, каб не пагоршыць і без таго небясьпечнага становішча.

Тымчасам Арон казаў:

— Усім разыходзіцца... Хоць куды. Па адным, па два чалавекі, каб ня гэтак прыкметна было. Змрок ужо пачынае засьцілаць зямлю... Скарыстоўвайце мясцовасьць—куды лепш, туды і ўцякайце, але ня конча адразу дахаты, там можа быць пастка...

У гэтую хвіліну Кіяш ірвануўся з рук Ігнасёвых так моцна, што той ня ўтрымаў яго. Варожы брэх сабакі паляцеў насустрач кустом.

— Разыходзіцца,—хутка, але спакойна, прапанаваў Арон,—не забывайце пра літаратуру. Бывайце, таварышы!

Ён падбег к Ігнасю. Усе сыпнулі хто куды. Ігнась сьвіснуў на Кіяша, і той ціха і пакорліва пабег за імі пад палатно чыгункі. Палянка згалела ўмомант.

Недзе на краі дуброўкі праляскацеў стрэл, за ім другі і трэці. Нехта голас падаў „Стой!“ Зусім недалёка пачуўся моцны тупат: бег нехта.

Арон з Ігнасём перапаўзьлі чыгунку і ў абход выладзіліся берагам ракі. На кожным кроку прыслухоўваліся яшчэ ўважна і бяз шолаху пасоўваліся ўперад. Кіяш нячутна бег упоравень.

Не адышлі яны яшчэ і пяцьдзесят крокаў ад чыгункі, як з боку ў іх зашасьцела нешта па мокрай траве. Ураз абодва паляглі. Ігнась прыцісну̂ў морду Кіяшу да зямлі.

Бег чалавек, абарочваючыся боязна на бягу ўзад і ўзіраючыся ў пустэльны змрок. Крокаў дзесяць было ад яго

двух хлапцоў. Але ён не заўважыў іх: ня спыняючыся бегчы, ён хутка зьнік у цемры. Затое заўважылі яго добра і пазналі Арон з Ігнасём.

— Ты бачыў? Пазнаў?

— Так. Адразу пазнаў.

— Памятаеш, што я казаў. Гэта яго работа. Мы добра задумалі...

Шэпты перарваліся і абодва сябры сіганулі зусім у другі бок ад таго, куды прабег нядаўна чалавек.

Хвілін праз дзесяць Арон схапіў Ігнася за рукаў і загаманіў ціха:

— Ісьці на кватэру цяпер няможна. Трэба недзе пераначаваць.

— Ці выратуемся мы гэтым? А брошуры-ж, кніжкі, паперы?

— Ня знойдуць, яны ў надзейным месцы.

— Ды не, я пакінуў тамсама, дзе і былі.

— Я схаваў. Як ты пайшоў з хлапцамі, я схаваў.

Густы туман зьліўся на балоце ў цьмянюткую процьму. За два крокі ня відаць нічога.

— Я думаю,—загаманіў Ігнась,— вельмі добра будзе... хадзем да мяне ў сяло. Пераначуем у мае маткі. А заўтра на работу. Недзе ня былі і нічога ня ведалі...

Арон лэпнуў яго па плячы.

— Пайшлі!

Балота скончылася і сябры неўзабаве выйшлі на дарогу. У палетку туман быў не такі густы, як у балоце. У баку недзе драў горла драч. Узьляталі паўз дарогу перапёлкі.

Арон з Ігнасём шыбавалі шпарка па дарозе ў сяло.

### *ТУМАНОМ АПАВІТАЕ*

ЖАНОЧАЯ гімназія стаяла на высокай горцы паміж ракою і вялікаю сажалкаю. Месьцілася ўся яна ў трох вялікаватых будынках, агароджаная наўкола высокім, нібы сьцяною, парканам. Рэчка Лакна вялікаю крывулінаю агінала яе, зусім блізка падступаючыся з левага боку. Тварам гімназія стаяла якраз насупроць вуліцы, якая цягла па вялікім мосьце праз Лакну ў цэнтр гораду. Улева вяла вузенькая вуліца па кладках цераз раку на другі бок. Вулічка была крывая, брудная ў восьнь і звалася Крывасёлкамі.

За плячыма гімназіі, на той бок Лакны, раскінуліся шыро-
ка яўрэйскія магілкі, цесна ўстаўленыя шматлікімі помні-
камі.

Улетку, а асабліва ўвесну і ўвосень, калі вучнёўская моладзь жыве ў горадзе, весела і ажыўлёна ў гэтай частцы гораду, і гімназія, калі глядзець з ракі, уяўляецца як-бы паўвыспаю. Па рацэ снуюць чаўны ды лодкі, а ў іх з большага ўсё вучні і вучнёўкі—з павятовага гарадзкога вучылішча ды з гімназіі. Рогат, жарты, прысьмешкі на рэцэ пасталі звычайнымі зьявішчамі для гораду, а калі дык і гулкая песьня рассыплецца маладымі галасамі па зялёных вербавых берагох.

Вось і гэтае восені так. Якраз нейкі невялічкі весеньскі сьвяток. Высыпала моладзь з гімназіі і хто куды. Якая частка рассыпалася па мосьце і кладках, частка па вуліцах, а нелепая—на лодкі і чаўны ў пагулянку па рацэ. Папрыходзілі і павятоўцы. Хутка іх чорная характэрная форма памяшалася з гімназійнаю. Толькі Люба з невялікаю групкаю таварышак ня ўзяла ўдзелу ў агульнай вясёласьці. З кніжкамі пад пахаю, задуменная і сур'ёзная накіравалася яна проста да кватэры. Цяпер яе кватэра была трохі бліжэй да гімназіі, у доме аднае старое пэнсіённае настаўніцы з гімназіі, сын якое маскоўскі студэнт—штогод прыяжджаў улетку на пабыўку да маткі.

Пакой Любін, куткавы, адным акном на раку, а другім на вуліцу, быў сьціпленькі і чысты. Ложак заўсёды прыбраны і засланы акуратна. Ва ўсім відаць клапатлівую дзявоцкую руку.

Разам з Любаю на кватэры жыла і вучнёўка Алеся, якая некалі крыўдзілася на сваю таварышку за Юркевіча. Апошні вучылішча скончыў у гэтым годзе, але часта бывае і тут. З Любаю ў яго гаворыцца заўсёды туга, ня леціцца, але заўжды яе вызваляе з такога становішча Алеся. Яна запрашае Юркевіча на праходку ці на човен на раку, і справа вырашаецца заўжды лёгка, бяз лішніх і неаптрэбных слоў.

Вось і сёньня Алеська сустрэлася з Юркевічам: толькі вышаўшы з гімназіі і аддаўшы Любе свае кніжкі, пайшлі недзе бадзяцца па горадзе. Люба прышла да кватэры з другою сваёю таварышкаю—Сасноўскаю Вераю,—любаю прыгожаю дзяўчынкаю. Што ў яе было любага, дык гэта вочы такія задуменныя, глыбокія, як мора, ды ціхасьць яе не проста сьціслая, а сталая, разумная. І ёй, як і Любе, засталося вучыцца толькі адзін год.

— Нам трэба пасьпяшаць, Верка, а то хутка, мусіць, папрыходзяць. Паабяцалі ж, здаецца.

— Калі ёсьць з чым сьпяшацца, дык трэба.

— Як-жа няма, а папалуднаваць хоць крыху якую.

— А я дык думаю пасьля ўжо.

— Не. Вера, я не палуднавала, дый ты-ж таксама. Значыцца, ты мне пасобіш гора гараваць.

— Сапраўды, вялікае гора. Калі ты хіба настойваеш ўжо гэтак, я пасаблю. Толькі, Люба... Скажы мне, што ў нас будзе і хто прыдзе?

— Дальбог, Вера, ну як табе сказаць... Будуць хлопцы і дзяўчаты. І замест таго, каб бяз толку валаводзіцца дзе ды зубы прадаваць, вось пагаворым трохі па-сяброўску. Мы-ж ужо дарослыя людзі і на адных сьмешках ня выедзеш. Кожны з нас думае жыць неяк далей.

— Ды яно не паміраць-жа ўжо. Мы толькі пачынаем жыць, яшчэ і ня бачылі гэтага самага жыцьця.

І, не перапыняючы гутаркі, Люба прынесла полудзень, і абедзьве дзяўчыны папалуднавалі.

— За госьцю я ў цябе сёньня,—засьмяялася Вера;—усё адно як на попрадках.

— Праўда, Вера, цягне ўсё-ткі ў вёску. Там своеасаблівая прыгажосьць ва ўсім, нават у самым мізэрным. Узяць тыя самыя попрадкі... Колькі працы над гэтым ільном, часта галодныя—з аднэю чорстваю скарынкаю, а зьбяруцца ў месца дзяўчаты і за гэтаю няшчаснаю зрэбнаю ніткаю вясёлыя песьні.

— Чаму ж толькі вясёлыя?

— Бываюць і жаласьлівыя, турботныя, але і ў іх свая прыгажосьць. Ох, гэта беднае, забітае гарапашнае сялянства!

Вера зьдзіўлена паглядзела на Любу.

— Ты, Вера, не паверыш мне,—не прыкмячаючы Верынага зірку казала Люба,—што часамі, ну гэтак сэрца баліць, проста ня ведаеш дзе дзявацца.

— Ты зусім сур'ёзна кажаш, Люба,—ні-то запыталася ў таварышкі, ні-то ўпэўнена сказала Вера,—ты-ж робіш гэтым сабе гора.

— Так і сапраўды Вера,—сказала была Люба, і ня скончыла таго, пра што думала, бо ў самы раз увайшлі знадворку і пастукалі ў дзьверы хлопцы. Яна адчыніла і папрасіла садзіцца дзе можна.

— Нудуеце, адзінокія дзяўчаткі,—усчалі жарты хлопцы.

— Хіба ў вашай хэўры,—адказалі тыя.

— А наша хэўра дык зусім ня нудуецца. Паглядзіце, якія мы вясёлыя і бадзёрыя,—праказаў сапраўды бадзёры вучань апошняе клясы павятовага вучылішча.

— Дзе вам,—пажартавалі дзяўчаты.

— Жарты жартамі, дзяўчаты і хлопцы, але, здаецца, час пачаць з другога,—сказаў другі вучань на прозьвішча Грыбок.

— Я таксама думаю... сказаў трэці.—Часу няма.

— Не, хлопцы, чакалі мы вас, мусіце пачакаць і вы.

— Навошта,—запытаўся першы, Іваніцкі,—хіба чакаем яшчэ каго?

— Вось у тым-жа і справа ўся,—адказала Люба,—ужо без ранейшага суму ў голасе. Цяпер, наадварот, яна лёгка пачырванела і радасьць наяўна прабілася напаверх у яе словах. Яна чакала. Можа не пасьпелі яшчэ хлопцы намерыцца дапытацца ў Любы, хто яшчэ павінен прыйсьці, як на двары нехта загаманіў. Але другога голасу ў адказ яму ня чуваць было. Потым усьлед за ціхім грукам у дзьверы прышоў Ігнась.

— Цяпер мы ўсе ўжо?—запытаўся Іваніцкі.

— Як быццам,— адказала Люба і пазнаёміла Ігнася з хлопцамі.

— Тады можна пачынаць.

З ракі прыляцела раптам прыпеўка популярнае студэнцкае песьні: „Пой, пой, тоска пройдет"...

— З аднэю песьняю не пярэйдзе туга,—замаганіла Люба.

Слаліся сьпевы па рацэ, і весела, і раздольна было на лодках і чаўнох, не зважаючы на ўвесь смутак, аб якім гаварылася ў сьпевах.

Ігнась зацікавіўся і зірнуў на раку. Рачная вясёласьць упадабалася яму. Але з рнуўшы спахмурнеў умэнт і адвярнуўся ад акна. Люба заўважыла і сама паглядзела туды; якраз насупроць кватэры, у сьвежа нафарбаванай лодцы плыў Юркевіч з Алеськаю.

— Трэба пасьпяшаць, —сказала Люба,—а то чаго добрага яшчэ надумаюцца сюды.

— Сябры!

Нейкі выраз таемнасьці зьявіўся на твары ў Іваніцкага.

— З цяперашняга часу гэтае слова павінна зьвязаць нас у адно. Мы сабраліся сюды не таму, каб пажартаваць, як жартуюць вучні на вуліцах і на рацэ,—наш абавязак, наша павіннасьць больш адказная. Усе мы—дзеці вёскі, і дзеці вёскі прыгнечанае, беларускае. Дасюль яшчэ стогне беларускі мужык пад царскаю несправядлівасьцю. Хіба-ж вы ня ведаеце.

Перад вочы ў Ігнася выплыў вобраз маткі, худое, няшчаснае, але сілаю волі ён прагнаў яго, каб не прамінуць нічога са слоў Іваніцкага.

— Беларускі народ,—казаў далей Іваніцкі,—меўшы некалі сваё слаўнае мінулае, беларускі народ, які жыве больш

чым у шасьцёх губэрнях, вы ведаеце іх пад назваю „Северо-западного края“, і які налічвае больш за дзесяць мільёнаў душ, гэта пакрыўджаны моцна народ ня можа нідзе слова сказаць свайго беларускага. Мы, беларусы, самае старае племя (ад радзімічаў, крывічаў, дрыгавічаў), слова ня можам сказаць, нам заткнулі рот. Ды ці-ж гэта можа быць так! Ды ці-ж гэта праўда на сьвеце! Некалі беларус быў слаўны, і магутны і далёка чуваць было яго за межамі. Далёка ня трэба хадзіць за гістарычнымі фактамі. Узяць літоўскае княства. Настолькі моцная была беларуская культура, што перамагла сабою, працягла літоўскую дзяржаўнасьць. Літоўскія князі мелі беларускую мову за мову дзяржаўную вось што было.

Пасьля гэтага ўступу, ён цішэй ужо паведаміў, што верныя сыны беларускага народу, якіх сам лёс паслаў у людзі і адкрыў ім вочы,—пецярбурскія студэнты-беларусы,—роўна год назад у спрадвечным беларускім горадзе Менску ўтварылі Беларускую рэволюцыйную грамаду. За цэлы год грамада сапраўды, зрабілася Грамадою, бо хто-ж стане цурацца свайго роднага беларускага слова. Хто ня хоча бачыць яго роўным спаміж усіх моваў. Сёлета Грамада зьехалася на свой першы зьезд і прыняла пэўную програму для свае працы, стала звацца „Беларускаю социялістычнаю грамадаю“.

„Ага, дык вось што такое Беларуская социялістычная грамада“, падумаў Ігнась... „Наш таварыш літвін казаў праўду“.

— Вось гэтая програма... Беларускі народ мае права, мае моц патрабаваць ад нас, сваіх дзяцей, абароны яго вольнасьці, згодна вось з гэтаю програмаю.

Іваніцкі разгарнуў ліст сьпісанае паперы, распластаў яго і паклаў перад сабою на стол.

„Шкада, аднак, што няма Арона“, зноў падумалася Ігнасю „Паглядзімо“.

Не падабалася яму нешта ў прамоўцы Іваніцкага. І вялікае жаданьне, і самаахвярнасьць за народ, а нешта вось не падабаецца. Гаварыў ён шчыра, гэта відаць было з прамовы, словы выліваліся проста з сэрца, а фальшывае штосьці. Як бывае часам лісьлівы ябеднік, каб лепш падкусіць, пад'едзе быццам з сэрцам на далоні: „Я ўвесь з табою, на, бяры мяне“, а пасьля бачыш—гадзіна чорная і ў роце чорна.

Нешта ад падобнага нагадаў Ігнасю сваёю прамоваю Іваніцкі. Нешта такое мяккае, сьлізкае, не зважаючы на ўсю сваю цьвёрдасьць і палкасьць.

„Нешта ня тое“, думаў ён.

Сталі чытаць програму. Першае, што зьдзівіла Ігнася, гэта лёзунг: „Працавіта бедната ўсіх краёў, злучайся“. Со-

цыял-дэмократычны лёзунг, толькі перакручаны, замiж „Пролетары ўсіх краёў, злучайцеся“ — „Працавіта бедната ўсіх краёў, злучайся“. Чаму-ж беднага, а не рабочыя?

Як прачыталі першы пункт, Ігнась папрасіў растлумачыць, як разумець, што „Беларуская соцыялістычная грамада» ёсьць організацыя соцыяльна-політычная беларускага працавітага народу“.

— Якога працавітага народу?

— Таго народу, які гаруе на зямлі, — адказаў Іваніцкі.

— А ці здолее вось гэты народ, з такою організацыяю на чале, як „Беларуская соцыялістычная грамада“, раскінуць цяперашні капіталістычны парадак. Тут недакладнасьць нейкая, я думаю.

На Ігнасёвае запытаньне спатыкнуўся Іваніцкі. Спрабаваў быў адказаць нешта, але доказу ня выходзіла, і ён толькі блытаўся ў думках.

Загаварыў Ігнась.

— Што такое капіталістычны парадак? Гэта ў першую чаргу эксплёатацыя і прыгнечаньне рабочага капіталістамі, фабрыкантамі і заводчыкамі і толькі ў другую—прыгнечаньне сялянства памешчыкамі, зьбядненьне сялянства, вось. Такім парадкам, ці можа працавіты народ, які ўладае зямлёю і працуе на ей, раскінуць капіталістычны парадак? Ня можа. Бо ён ня мае дачыненьня да фабрык і заводаў. Калі ён толькі і дастукаецца зямлі, адбярэ яе, скажам, у дзяржавы, ці ў памешчыка, ды і то ён не разбурыць капіталістычнага парадку. Бо фабрыкі і заводы астануцца ўсёадно ў руках капіталістаў, якія маюць капіталы, а рабочы як быў, так і астанецца прыгнечаным пад іхняю ўладаю. Гэта-ж трэба разумець. Нават каб і здарылася тое, што зямля адышла-б пад народ, хіба ён утрымаў-бы зямлю? Не.

— Чаму не?—перапыніў Іваніцкі.—Чаму не, калі гэтага народу цэлыя мільёны, калі ён—сіла?!

— Таму, што вы забываеце другую сілу, вярней кажучы—другіх дзьве сілы: самых капіталістаў і рабочых. Раз толькі фабрыкант і заводчык астанецца на сваёй фабрыцы і заводзе, ён вызваліць свайго брата на зямлі—памешчыка.

— Няпраўда,—сказала Люба.

Ігнась ня зірнуў нават на яе і цьвёрда адказаў:

— Гэта праўда, і праўдаю яна ёсьць і будзе. У руках у капіталістаў уся сіла, а ня ў руках памешчыцкіх.

— Сіла ў руках у цара,—праказаў Грыбок.

— Няхай будзе гэтак, сіла ў руках у цара. Няўжо-ж здолее бедната сьпіхнуць цара? Ды пакуль яна зьбярэцца з сваіх вёсак ды кранецца з месца, дык яе перастраляе царскае войска, якое хутка выклікаюць царскія чыноўнікі праз

тэлеграф. Аружэйныя заводы дадуць войску самую лепшую зброю, чыгунка перавязе яго ў адзін дзень з аднаго канца Расіі на другі. Удзельнікі ўбунцея і адабраньні зямлі будуць пастраляны, а зямля аддасца тым самым памешчыкам, якія прыедуць за плячыма ў войска. Ці будзе разбураны капіталістычны парадак, пытаюся я ў вас?

— Гэта ня так, ня так ты тлумачыш,—падхапілася Люба. „Беларуская социялістычная грамада“ мае на мэце скінуць цара разам з пролетарыятам усіх народаў Расіі.

Ігнась змоўчаў, а Іваніцкі стаў чытаць програму далей.

Там, дзе казалася як пра найбольшую свабоду пры незалежнай дэмократычнай рэспубліцы, аб політычных правох народу, Ігнась заўважыў, што яны нібыта адпавядаюць пунктам конституцыі дэмократычнае рэспублікі з програмы социял-дэмократычнае партыі.

„Адным словам, блытаніна нейкая“, мільганулася ў Ігнася думка. „Але чаму наблытана, няўжо складалі яе людзі, якія зусім не разьбіраюцца ў політычных пытаньнях“.

Да канца ўважліва слухаў Ігнась програму. Не перапыняў ніхто і з рэшты. Ужо калі Іваніцкі скончыў, тады Ігнась зноў запытаўся:

— А вось скажыце мне, чаго-ж у канчатковай мэце дамагаецца „Беларуская социялістычная грамада?“

— Перайсьці на социялістычную гаспадарку.

— Значыць социялізму?

— Так,—нясьмела адказаў Іваніцкі.

— Ігнась, ты зьбіваеш з панталыку,—сказала яму Люба.

— Ня я зьбіваю з панталыку, а ваша програма зьбіта з яго і вас блытае,—надта рэзка адказаў Ігнась. Няпраўда ўкалола яго ў жывое.

— Ня лаяцца, нарэшце, пазьбіраліся мы сюды, Люба,—праказала Вера Сасноўская, і з гэтымі словамі зірнула на Ігнася.—Я шмат чаго не разумею з усяго гэтага, а хачу зразумець. Дарэчы, аб социялізьме я зусім нічога ня ведаю і ня чула дасюль.

Тут пачалі ўсе, кожны на свой лад, тлумачыць.

Іваніцкі гнуў у бок социялістаў-рэволюцыянэраў. Яго падтрымлівала Люба. А Грыбок і трэці вучань зусім слаба разьбіраліся ў гэтых пытаньнях і толькі ўстаўлялі свае заўважваньні, ня хочучы паказаць, што нічога не разумеюць.

Любе, відаць, няпрыемна было і няёмка, што Ігнась гэтак жорстка крытыкаваў іхныя думкі і ідэі, складзеныя ў програму партыі іх гарапашнага народу. Але няёмка ёй было яшчэ і таму, што ў Ігнасёвых словах яна адчувала драбочкі праўды, і гэтыя, здавалася ёй, драбочкі б'юць вельмі моцна па програме Грамады. Цяжка было адмовіцца ад яе

(гэтая-ж програма вызваляе народ ад нішчаньня, ад галадаваньня, яна дае зямлю ўсяму народу), а потым цяжка было ня прызнаць праўды Ігнасёвых слоў—яна-ж яго ведае змалку. І Люба стала бараніць погляды Іваніцкага, ня прызнаўшыся ва ўсім, што адчувала і пра што думала. Чаму ня прызналася?—ды можа таму, што была адным з ініцыятараў склікаsucceeded сходкі. Можа і таму.

Адна Вера шчыра выказала свае думкі, і Ігнась у душы цёпла дзякаваў ёй за гэта. На Любу ён ні-то каб зазлаваў, не, яна аддалілася неяк ад яго, стала менш знаёмаю і больш чужою.

— Не, вы-ж паглядзіце, якая недасканалая ваша програма,—казаў Ігнась.—Я з вёскі, блізка што пролетары, бо ў мае маткі толькі адна хаціна і ёсьць усяго. Цяпер я працую наймітам ў майстэрні. Я зараблю толькі-толькі, каб не памерці з голаду, аб дапамозе матцы я ўжо не кажу, пакуль яна мае рукі ды ногі, ды заробіць што-кольвечы па панскіх дварох. І, вядома, пакутуе, а ня жыве. Вось цяпер адкажыце, як-жа мне будзе жыць пры вашым соцыялізьме? А мне, выходзіць, і месца няма, бо я працую ў майстэрні, або на фабрыцы ці на заводзе.

— Кожнаму чалавеку даецца права абрабляць зямлю сваімі рукамі,—заўважыў Іваніцкі.

— З аднае зямлі ня будзе жыць чалавек, дый той, хто працуе на ёй, не пражыве з яе. Вазьміце плугі, бароны, косы, сярпы, ды ці мала што ў гаспадарцы,—думаеце, зямля вырабіць усё гэта. Не, толькі рабочыя на заводах. Дык, па-вашаму, рабочы будзе жыць, як і цяпер, у кіпцюрох свайго гаспадара! Гэта, па-вашаму, соцыялізм? Па-мойму, не.

— У програме ня так напісана, як ты кажаш,—сказала Люба.

— Якраз, гэтак,—уступілася за Ігнася Вера.

— Ты-ж толькі нядаўна казала, што не разумееш прачытанага,—сказаў ёй рэзка трэці вучань.

— Праўда, я не разумела, што да чаго, але я памятаю, што напісана, і Ігнась праўдзіва кажа, калі заўважвае на блытаніну ў програме.

— Яшчэ адно і самае важнае,—сказаў Ігнась.—Грамада, скажам, імкнецца ўстанавіць соцыялізм—добра, а з боку дзяржаўнага—чаго яна дамагаецца? Незалежнае дэмократычнае рэспублікі, у якой будуць кіраваць разам з селянінам і рабочым і капіталісты, і той-жа памешчык, і той самы паліцыянт. А далей што? З такім ладам мы ўжо ўзялі ў рукі соцыялізм? Ды не, глядзіце, каб цар зноў ня сеў на карак.

— У Расіі пад сто мільёнаў сялянства,—гэта такая сіла, якая даможацца свайго,—сказаў Іваніцкі.

— Да соцыялізму можна прыйсьці толькі праз соцыяльную рэволюцыю, толькі праз захоп улады рабочаю клясаю і сялянствам, з аддачаю фабрык і заводаў пад рабочых, таксама як і зямлі пад сялянства. Толькі соцыяльная рэволюцыя мазольнымі рукамі рабочага зьнішчыць усё прыгнечаньне працоўных, усю эксплёатацыю чалавека чалавекам. Вось пасьля чаго магчыма будзе соцыялізм. А ў програме „Беларускае соцыялістычнае грамады" цьмяна ўсё, накідана, накручана і больш нічога. Програма Грамады змагаецца за селяніна таксама, як і за капіталіста.

— Не, Ігнась, усё гэта ня так, як ты кажаш,—азвалася Люба.

Усе маўчалі. Іваніцкі і той сядзеў, утупіўшы вочы: казаць ня было чаго. Тады Люба, бачачы агульнае замяшаньне, прапанавала скончыць гутарку.

— Я то-ж думаю,—працадзіў Іваніцкі,—зьбяромся яшчэ... Толькі ня гэтак, як сёньня.

Ігнась засьмяяўся ў думках над пакрыўджанасьцю Іваніцкага, а што ён пакрыўдзіўся, гэта зусім наяўна відаць было кожнаму.

Пакрыўджана была і Люба—у чым больш, невядома: ці ў сваіх перакананьнях, ці ў сэрцы, дзе дасюль жыло цёплае, прыгожае пачуцьцё да Ігнася. І, як усе сталі разыходзіцца, разьвіталася з ім халодна. Зьнікла заўсёдышная пры сустрэчах і разьвітаньнях з ім сяброўская пяшчотнасьць і сонечны погляд пацьмянеў ад набегшай раптам хмаркі крыўды.

На рацэ, як і гадзіну назад, блыталіся лодкі, чаўны, але Любе апрыкрыла глядзець туды, не хацелася слухаць надакучнага ўжо: „Пой, пой, тоска пройдет".

Яна стаяла перад акном і глядзела на вуліцу, па якой павольна; не сьпяшаючы, ішоў Ігнась побач з Вераю. Сьлёзы нагарнуліся на вочы, але, каб ня пусьціць іх, сьціснула з натугаю малапаслухмяныя вусны. Потым рашэньне прамільгнулася нейкае ў ясна пабліскваючым поглядзе. Павольна, але акуратна надзела і прышпіліла капялюшык. Потым зірнула ў акно зноў.

Ігнася з Вераю ня відаць было ўжо на вуліцы.

Тады, рашучая і заклапочная, вышла на вуліцу Люба і хутка-хутка пайшла ў цэнтр гораду.

АРОН сядзеў у акне, падпёршы галаву рукамі, і думаў, калі прышоў Ігнась. Чырвонае мора праменьняў пры заходзе сонца залівала пакойчык. Выпукла выступала на сьцяне карціна старое яўрэйскае сям'і. На карціне асабліва вызначаюцца, як жывыя, дзьве фігуры: стары яўрэй з сіваватаю барадою, падстрыжанаю кліночкам, з аглабаватым носам і да дзіва разумнымі, журботнымі вачыма, і хлопчык гадоў дзевяць-дзесяць, з упарта-задуменным выразам воч.

Неяк разам у вочы Ігнасю ўпала вялікае падабенства паміж задуменным хлопчыкам з карціны і цяперашнім Аронам у мяккім асьвятленьні заходу сонца: адзін манэр упінаць погляд, адзін манэр схіляць наперад крыху галаву. І так нязвычайна гэта было ў абодвух, што ўся фігура і таго, і другога неяк згладжвалася і пакідалася ва ўяўленьні толькі адна галава з правільнымі неяўрэйскімі нават рысамі твару. Таксама, як і ў Арона, у хлопчыка моцна сьціснуты вусны, а нягустыя бровы ссунуты ўпарта над задуменна-зоркім поглядам чорных воч.

Яшчэ раз зірнуў Ігнась на карціну, а потым зноў на Арона—так хацелася яму давесьці гэтае падабенства паміж абодвума, ці можа ачароўвала яго суровая і глыбокая прыгажосьць задуменных воч. Але давесьці таго яму не ўдалося: правая рука Аронава ўпала на калена, а сам ён, напалову завярнуўшыся, з запытаньнем глядзеў на Ігнася.

— Ведаеш, Арон! Да душы, сьпяшаўся з вялікаю навіною, каб расказаць, а цяпер і язык ня вернецца. Каб ты толькі бачыў сябе тады, як думаеш вось гэтак. Гэта-ж любата адна!

Ня сьцямваючы аб чым гаворыць Ігнась, Арон сядзеў перад акном і цень глыбокае задуменнасьці ўсё яшчэ бегаў па твары. Відаць было, што ён стараецца атрапнуцца, скінуць з галавы гэтыя ўладныя чары задуменнасьці і ўлавіць сэнс Ігнасёвае гаворкі.

Адале разамкнуліся вусны і з лёгкаю ўсьмешкаю на праясьнелым твары ён запытаўся:

— Пра што ты казаў, Ігнась? Ну, забі мяне,—ня чуў.

— Ты вельмі моцна, мабыць, думаў?

— Праўда. У кожнага чалавека ёсьць думкі. Бываюць лёгкія, павярховыя, як матылькі, а бываюць і глыбокія і такія ўладныя, што цяжка вырвацца з-пад іх магутнага ўплыву.

— Ты гэтак сёньня думаў?

— Так.

— Каб ты ведаў, які падобны быў ты ў гэты час да таго хлапчука з карціны, ну, проста—ты сам.

Цень задуменнасьці імгненна згас на твары ў Арона. Але праз хвіліну ён ужо перамог сябе.

— Сядзь Ігнась, я табе хачу расказаць нешта.

Ен счакаў хвіліну, калі ўлежыцца раптоўнае ўзбурэньне, і тады загаманіў зноў. І калі Ігнась сеў побач, Арон загаманіў ціха, спакойна, з адценьнем лёгкага смутку ў голасе.

— Як памятаю сябе, жылі мы—сям'я доктара Шнэйдэра—у горадзе Варшаве. Дзяцей у сям'і жыло пяцёра са мною: тры хлопчыкі ды дзьве дзяўчынкі. Але цікавіў мяне заўжды бацька. Тады, калі да другіх дзяцей ён быў надта строгі, праўда, ня жорсткі,—са мною ён абыходзіўся заўжды ласкава. Доктар Шнэйдэр лічыўся за выдатнага чалавека ў горадзе. Сярод абываталяў і ўлады ён карыстаўся давер'ем, як добры доктар, адменны знаўца і практык мэдыцыны. Але не хацеў ён заўважаць таго, а больш браў на ўвагу другое. Шнэйдэраў дом лічыўся за прытулак для ўсіх соцыялістаў, хто-б яны ні былі. Знаходзілі прытулак у яго і соцыял-дэмократы. Добра памятаю цяпер, як аднойчы ўвечары да нас прышоў малады рэволюцыянэр, у студэнцкай форме. Два дні, якія ён прабыў у нас, надоўга застануцца ў маёй памяці. Мне ішоў тады пятнаццаты год, я быў старанным вучнем, і ўсе казалі, што я пайду далёка ў жыцьці. На пятнаццатым годзе я стаў соцыял-дэмскратам, і настаўнік мой—студэнт Пецярбурскага політэхнікуму—не забудзецца мною да самое сьмерці. Нездарма ўсе хатнія надта апасваліся таго, што цэлымі днямі я сядзеў задуменна над кнігамі, ніколі ня гуляў са сваімі сёстрамі і братамі. Так, я пайшоў далёка... Украдкі ад сям'і я перапісваўся са сваім настаўнікам-студэнтам. Цэлых два гады пакуль сувязь ня спынілася—я не атрымаў адказу на тры апошніх сваіх лісты. Пасьля я даведаўся, што студэнт загінуў у Шлісэльбурскай крэпасьці. Мінуў мне шаснаццаты год і я намогся перад бацькам ехаць вучыцца (абраў я сабе Пецярбурскі політэхнікум). Намер мой задаволіў бацьку. На ад'езьдзе ён паклікаў мяне ў свой габінэт і там выкрылася ўсё... Доктар Шнэйдэр, мой бацька праз шаснаццаць год, ня быў маім бацькам, як ня было ў мяне ні маткі, ні братоў, ні сясьцёр...

Спачуваючы, Ігнась спытаўся:

— Арон!.. Скажы, Арон, хто-ж твае бацькі?

— Невядома... Хаця колькі я мучыўся, колькі я стараўся даведацца пра гэта. А ўрэшце ўсе адно... Два гады вучыўся я ў політэхнікуме. Доктар Шнэйдэр, не зважаючы на ўсё, акуратна дасылаў грошы. Аднак, я ня прымаў яго ласкі сабе: грошы рэгулярна ішлі на рэволюцыйную работу. Праз два гады організацыя наша правалілася, а лепш кажучы, праваліў яе адзін провокатар, і ў самы момант арышту мне ўдалося ўцячы. З таго часу доктар Шнэйдэр згубіў мяне і з таго ж часу і я нічога ня ведаю пра доктара Шнэйдэра. Усяго давялося пабачыць і перажыць за гэты час, пакуль не апынуўся я вось тут, у нашым гарадку. А рэшту ты сам ведаеш. Дык вось, Ігнась, чаму я падобны да гэтага хлопчыка на карціне, якую мне на ад'езьдзе ў політэхнікум даў доктар Шнэйдэр. Жыву па пашпарце (падробленым, бязумоўна) на імя рабочага Арона, які ня памятае хто яго бацькі. Чым цяжэй, Ігнась, асабістае гора, тым больш нянавісьці... нянавісьці да ўсяго сучаснага соцыяльнага ладу. І ў гэтым мая радасьць, Ігнась.

Моўчкі слухаў Ігнась журботную аповесьць сына невядамых бацькоў, сына, які ніколі, мо' і не даведаецца пра іх, сына, які аддае ўсё свае сілы і здольнасьці, урэшце, самае дарагое—жыцьцё—за вызваленьне такіх як сам.

Тым часам як абудва хлопцы сядзелі ўсё яшчэ пад уражаньнем расказанага, у доме Няслаўскіх некалькі чалавек ціха і патаемна гаманілі пра нешта. У гутарцы часта ўспаміналіся імя Ігнасёва і Аронава. Невадомыя людзі абурана размахвалі рукамі і злавалі. Усю гутарку скончыў Няслаўскі.

— Факт—гэта ёсьць факт. За горадам была падпольная сходка, на якую поліцыя па нейчым даносе зрабіла аблаву, і я згодзен, як казалі і некаторыя, што сходка не абышлася бяз удзелу нашых новых знаёмых. Ды іначай і не магло быць. Ва ўсякім разе пра гэта ня трэба забываць.

— Так. Магчыма яно і добра,—перапыніў нехта,—а вось другое—са сходкаю пры павятовым вучылішчы зусім дрэнна.

— Хто-ж вам вінен, калі ў вас, сябры, мазгі нагэтулькі рэдзенькія, што вы!..

— Ды ня ў тым справа, дзядзька Няслаўскі,—умяшаўся нехта трэці.

— Спрачацца аб гэтым няма чаго. Што мінула, таго не пераставіш наперад. У хуткім часе мы зьбярэмся да мяне на сходку, на якой трэ' будзе падладзіць сапсаванае вамі. І трэба, сябры, больш думаць. Мала, ой як мала, аднае чорненькае літаркі на паперы. Ну, дык бывайце, бо мне зараз на службу. Неўзабаве, я-ж кажу, зробім сходку.

СХОДКА ў Няслаўскіх адбылася нешта пад вечар. На ёй быў і Арон, запрошаны Няслаўскім. Запрашаўся і Ігнась, але, абмеркаваўшы добра, хлопцы парашылі, што трэба пайсьці аднаму Арону. Пасьля той убачыў, як яны добра зрабілі, што не пайшлі ўдвух.

Па сутнасьці сходка ў Няслаўскіх была зборышчам беларускіх грамадаўцаў, пра якіх ён меў трохі інформацыі ад літвіна з двара Няслаўскага і ад Ігнася са сходу ў Любы. Гэтаю сходкаю яны ўздумалі рэабілітавацца сябе, давёўшы супраціўнікам грмадаўскае праграмы ўсю яе пэўнасьць, праўдзівасьць і дасканаласьць. Пабітыя Ігнасём на сходцы ў Любы, думалі выехаць на перамозе тут з дапамогаю старога ліса Няслаўскага. Яны спадзяваліся на яго розум, адукацыю і, нарэшце, на яго старыя гады, што было ў іх вядомаю адзнакаю праўды.

Але выйшла зусім наадварот. Проста, але едка і часамі нават груба, паглыбляў Арон сказанае Ігнасём на першай сходцы грамадаўцаў. Калі яму між слоў заўважалі на грубасьць, дык ён адказваў, што рабочыя ў гімназіях і унівэрсытэтах ня вучыліся і ня вучацца, дзе ўжо ім з далікатнымі размовамі.

— У вас, аднак, цікава ўсё гэта выходзіць,— спаважна казаў Няслаўскі.—Па вашаму, рабочыя—соль зямлі.

— Ніводная справа бяз солі ня варыцца, паважаны Вадзім Пятровіч,—гостра адказаў Арон.

— Вы жартасловіце, Арон, а паміж іншым, што з таго?

— Вы можа жартачкамі гэтак думаеце і імпэрыю загубіць?—злосьненька заўважыў нехта збоку.

— І панства свабоды ўстанавіць на зямлі?

— Ды вы з усіх бакоў на мяне ўжо, як я бачу. Хоць-бы вы пасобілі, Ларыса Вадзімаўна.

— Я вас не падтрымліваю, хоць ня згодна і з імі.

— Гмг-г,—працёг Няслаўскі.

— Вось вам і м-мгу. Самадзяржаўе крыві патрабуе. Яно само просіцца на кроў!..

— Так, так—пахваліў яе Арон.

—... Дайце яму кроў, ягоную ўласную кроў! Тэрор царызму! Чаго вы паціхлі? Папужаліся? Вось вы які! Так, я бачу, што вы няздольны на гэткую рэч. Ці вам узьняць сьмелыя галовы, злучыцца ў патаемныя сталёвыя дружыны? Ці вам узяцца за бомбу і рэвольвэр?

— Ціха!—устрывожана паглядзеў навакол Няслаўскі.— Раскрычалася.

— Ага, вось вам боязна, боязна нават таго, што я гавару мацней за вас. А я, ведаеце, не баюся, хоць і ведаю, што вось тут... зусім блізка... за аднэю сьцяною ў нас—паліцыя.

— Паліцыя?... Дзе? Ты з глузду зьехала,—устрывожана загаманілі ўсе, паўскакаўшы з крэслаў, а сам Няслаўскі толькі сьціснуўся вожычкам.

— Папужаліся... Рэвалюцыянэры! Ды не, будзьце спакойныя, няма паліцыі.

— Дык што-ж ты мелеш,—уздыхнуў бацька.

— Але, бачыце, як нацужала вас мліва. Ня бойцеся, такіх, як вы, паліцыя ня будзе шукаць і вы ёй не патрэбны. Яна даведаецца пра вас толькі тады, як ня трэба будзе ведаць.

— Лара!..

Гэта Няслаўскі скарыстаў к часу сваё бацькава права і гняўліва глянуў на дачку.

— Ты заўсёды гэтак: „Лара! . Лара!..“ Рот затыкаеш, калі гавару праўду,—перакрывіла яна бацьку.

Тады загаманілі ўсе—гарох рассыпаўся—толькі не на Ларысу. Мімаходзь чапалі яе, быццам абразіць баяліся гэтым бацьку. Але на справе ім і сказаць ня было чаго супроць яе слоў.

Арону ўпадабалася Ларысіна выступленьне. І калі толькі не накіруецца на сапраўдны рэвалюцыйны шлях яе гарачая палкая экзальтаванасьць, дык ясна, што ёй месца ўжо прыгатавана недзе ў бомбістаў—эсэраў. „А шкада—энэргічная, рухавая і рашучая дзяўчына“, падумаў Арон і зарагатаў.

— Разьбілі вас, Ларыса Вадзімаўна: ну, куды вам з вашымі бомбачкамі, ды рэвольвэрамі. Навошта вам жыцьцё вернападданых царскіх саноўнікаў? Якая-ж вы, аднак, а... Жывуць няхай на здароўе!

Ягоныя словы пад'юдзілі ўсіх і яны на чале з Няслаўскім кінуліся спаганяць, што выцерпелі ад Ларысы, на Ароне.

— Ага, і вы за яе!

— Бачыце, я сказаў, што вы ўлопаецеся!

— Даруйце, я ні за кога. Дзе мне разабрацца ва ўсіх тонкасьцях... Я лепш буду сам за сябе.

— Я, ды сам, ды я з сабою—вось і колектыў. Колектывісты!—укалоў Няслаўскі.

„Эге, аднак, далёка залазяць. Трэба адпудзіць трохі“, падумаў Арон. І ў тон Няслаўскаму адказаў:

— А вы, ды ён, ды той, ды ўсе вы, нарэшце, вось і панства свабоды на Беларусі.

Адказ дасягнаў мэты.

— Не, вы пра гэта ня мерцеся,—загаманіў Няслаўскі і, пахапіўшыся, што сказаў ня сьлед, дадаў цішэй:—Гэта сьвятая справа.

— Эх, грэшныя людзі, а за сьвятую справу ўзяліся. Сьвятую справу весьці, дык самім сьвятымі трэба быць.

З усьмешкаю пазірала Ларыса, яна зладволена была. Арон добра падсек гэтых „соцыялістаў“. Сьмех адзін, сьмех і гора, а яны ў свабоду лезуць, што ўпала з неба ім. Сваімі рукамі здабываць трэба яе!

— Вы праўду гэта, Ларыса Вадзімаўна,—жартліва пацьвердзіў Арон.—Сваімі рукамі здабываць трэ' яе... Чужымі рукамі жар заграбаць.

— Пра што вы?—запыталася яна, не разумеючы.

— А вы толькі што сказалі: „Сваімі рукамі трэба здабываць яе“. Каго яе? Свабоду, я думаю.

— Так, вы праўду кажаце.

У гэтым мы з вамі салідарны Ларыса Вадзімаўна,—чужымі рукамі жар заграбаць. А вы не? Не, відаць, адмаўляцеся. Якія-ж вы соцыялісты пасьля таго.

— А вы з мужыком пагаманіце свамі вось гэтымі шпількамі,—кінуў уколаты Няслаўскі.

— Дзе нам з мужыком. Я зроду і ў вочы ня бачыў мужыка.

— А вы паглядзіце,—кінуў нехта з-за плячэй, дык не аднаго, а сто мільёнаў убачыце ў Расіі.

— Што вы кажаце... Я баюся з такою вялізарнаю сілаю справу мець.

Тут у гутарку ўступіла дзяўчына, што сядзела пазадзе. У надышоўшым змроку ня відаць было ні хто яна, ні якая з твару. Але Няслаўскі паращыў, мусіць, працягваць спрэчкі, і запаліў лямпу. Дзяўчына гаварыла:

— Вы пагледзелі-б, Арон, як жыве гэты гаротны мужык, як ён бядуе. Гэта-ж самы няшчасны чалавек на зямлі.

Дзяўчынін голас дрыжэў, калі яна гаварыла, і ўся фігура яе быццам уяўляла сабою ўсё гора і няшчасьце сялянства.

— Пра няшчасьце зацягнула, Люба,—узарвалася з месца раптам Ларыса.

— Лара!—з дакорам зірнуў на яе бацька.

— Зноў... Добра я маўчу!

Нездаволеная села яна, абхапіла тонкімі белымі рукамі калены.

„Тая самая Ігнасёвая Люба. Аднак, яна пакідае лепшае ўражаньне, чымся ўсе гэтыя бяз году тыдзень правадыры шматмільённага сялянства“, падумаў Арон.

— А хто кажа, што сялянству добра жыць?—сказаў ён ціха.—Я пытаюся, хто кажа? Кепска жыць нашаму селяніну, кепска, бо на ім, як на тым кані, выяжджаюць са сваімі дварамі памешчыкі, выяжджае монархія

— На якім і вы хочаце выехаць, самі пра тое ня думаючы,—заўважыў пакрыўджаны Іваніцкі.

Ён уступіў у спрэчку, думаючы адыграцца тут, пасьля спрэчкі з Ігнасём.

— Яшчэ невядома. Хто на кім ці на чым выяжджае, або ўжо едзе. Пакуль, што дык вы асядлалі, здаецца, свой уласны язык.

— Гэта нясумленныя спрэчкі,—сказаў Няслаўскі і пакрыўдзіўся.

— Паважаны Вадзім Пятровіч, дык як-ж я гэта магу ехаць на мужыку? Хто гэта давядзе? Я толькі кажу, што вашыя надзеі на адно сялянства рассыплюцца на порах і мая праўда, калі я згаджаюся са словамі Ларысы Вадзімаўны,—зьвярнуўся да яе Арон.

Тая сядзела і пазяхала, думаючы, чаму ня прышоў той другі, Ігнась. У ім нешта такое шляхетнае, ня мужыцкае і не рабочае. Нешта такое інтэлігентнае, сьвядома шляхетнае.

І другая думала пра Ігнася. Люба. Думала і сама сабе дакарала, што пасварылася на сходцы. І гэты Арон, такі-ж самы, абое яны гэткія. Але чаму яны ня любяць „сьвятое справы" беларускага мужыка, чаму? А ён узяў дый пайшоў з Вераю. „Дурная я", узбурылася тут-жа Люба. „Ці можна гэтак думаць. Пайшоў, ну і пашоў. Вера-ж ня ведала, што будзе Ігнась..."

Думкі Любіны сталі зноў роўнымі, з дакорамі самой сабе за сварку з Ігнасём. Ён гэткі добры і калі выбіваецца на дарогу, дык я ж яму быццам не жадаю добрага. Не хацела-ж некалі, каб стаяў ён перад сваім дваром у падраным зрэбным каптане, не, хацела, каб крыўдзілі дзеці, шкадавала. Дык і цяпер-жа павінна шкадаваць, павінна жадаць яму шчасьця. І неяк не ўслухоўвалася ўжо ў спрэчкі, якія зноў распаліліся.

Абедзьве дзяўчыны думалі пра аднаго, кожная па-свойму і кожная па-свойму намагалася нечага дасягнуць, і ў гэтым вечым Ігнась быў наперадзе.

А той, хто вінен быў у гэтых думках, тымчасам ня сядзеў дома. Як сышоў Арон, ён памыўся, апрануўся ў чыстае і пайшоў пахадзіць па вуліцах. І быццам зусім выпадкова трапілася—у цэнтры сустрэў Веру Сасноўскую.

— Зусім ня думала сустрэць цябе, Ігнась.

— Можа не хацела,—сказаў ён.

— Не, проста так ня думала.

— А мне надакучыла сядзець. Аднаму нудна, дык я і пайшоў мераць гарадзкі брук.

— Ты-ж, здаецца, не адзін на кватэры, каб нудзіцца.

— Ды не адзін, але таварыша няма якраз, вось і нудна аднаму.

А чаму нудна, гэтак і не сказаў Ігнась. Нудзіўся ён таму, што ведаў пра сходку ў Няслаўскага, ведаў, што і Люба там. Стой, ці праўда таму, што Люба там і што ён ня з ёю. Пры гэтай думцы Ігнась зачырванеўся: перад вочы выплыла стромкая фігура вясновае дзяўчыны з Ларысіным тварам і Люба ў той жа час зьнікла, на месцы яе асталося вясёлае шчырыньне воч з зеленаватым блескам. І радасна было ад гэтага Ігнасю і няёмка, і, вядучы такую сур'ёзна-халодную гутарку з Employee Вераю, ён не прыкмячаў, як загінаў паволі на тую вуліцу, дзе жылі Няслаўскія. Кінуўшы вокам, Ігнась здагадаўся— і чаму, ён такі халодны з Вераю, і чаму зьнік вобраз Любін, і чаму урэшце, ён павярнуў на гэтую вуліцу.

У куткавым пакоі ў Няслаўскіх гарэў агонь, хоць на вуліцы яшчэ добра відно было.

„Хоць-бы зірнуць, толькі зірнуць. Выпала-ж вось не пайсьці“, прамігалася ў галаве.

— А табе сапраўды нудна, Ігнась, як я бачу.

— Што зробіш. Праўда, хоць вазьмі ды ідзі спаць дахаты.—Туды і сюды прайшлі яны паўз дом Няслаўскіх. Як дайшлі да другое вуліцы, дык Вера засьпяшалася чамусьці дамоў. На ростані яна пажартавала, што бацькі яшчэ гатовы шукаць,—каб ня думалі, што загінула дзе.

Ігнась і рад быў разьвітацца. Пасьля можна вярнуцца назад.

— А мне тут бліжэй,—паказаў ён рукою ў бок да Няслаўскіх.—Будзем бачыцца. Бывайма!

Тымчасам спрачацца ў Няслаўскага не пакінулі. Моўчы сядзеўшы, Ларыса зусім запазяхалася. Арон заўважыў гэта і запытаўся:

— Вам ня цікава хіба?

— Чаму... Рота-ж нельга расчыніць,—кіўнула яна галавою на бацьку.

— І небясьпечна дазваляць, бо ў вас зубкі востранькія.

— Ат, пайду лепш, аж спаць захацелася.

Кіўком галавы яна разьвіталася з адным Аронам і вышла. Арон парашыў намагчыся скончыць дарэмнае словагаварэньне: Ілбы дубовыя!.. Ім давядзеш, але не пераканаеш. І ён рэзка ўвязаўся зноў у спрэчкі.

Ларыса сказала няпраўду, што пойдзе спаць. Заміж таго, каб накіравацца ў спальню, яна лёгка зьбегла па сходачках уніз і вышла на ганак. Пасьля ўсяе слоўнае траскатні ў пакоі ёй лёгка падыхнулася на сьвежым вечаровым паветры.

На вуліцы ня было нікога, як згалела ўсіх. Увечары самая пагулянка ў цэнтры, асьветленым газавымі ліхтарамі.

Ларыса ўжо была павярнулася пайсьці сапраўды спаць калі на драўляным тротуары зьлева пачуліся нерашучы павольныя крокі. Яна прысланілася да вушака і упяла зірк ў рэдкі шараваты змрок на вуліцы. Сама ня ведае чаму асталася, пачуўшы крокі. Сэрца, здаецца, у сумным чаканьн загадала ёй, а ногі бяз сілы, без супярэчаньня не пасьмел не падначаліцца. І вось яна чакае, чаго—і сама ня ведае

А Ігнась—гэта" ён ішоў—павольна падыходзіў да дом Няслаўскіх. І жадалася яму сустрэчы з Ларысаю, і неяк баяўся ён таго, і ў барацьбе гэтых супярэчаньняў то падал і ўздымалася сэрца, то захліпалася ў нечаканым прадчу ваньні нечага, што мусіць адбыцца сёньня. Не пагуляць пайшоў ён, адна думка цягнула яго, адно жаданьне—убачыць

„Ліха ведае..." думаў ён. „Неспакойна як, а... Дурнот гэта", рашаў ужо ён, а галава вярнулася на вокны дом і вочы старанна абмацвалі іх, мысьлёва ўяўляючы пакой дзе можа быць яна.

Сама па с.бе прыціхала хада, быццам ногі прырастал да тротуару. У вокнах ня відаць было нікога. Выразна пустэчаю глядзелі яны на Ігнася, ледзь-ледзь бялеючы фіран камі. Няма. Няўжо яшчэ ня скончылі сходкі? Яна напэўн там. Ідучы, ён думаў: можа прысьпее пад канец, калі скон чыцца сходка; удзельнікаў будзе праводзіць... Няма. Захапі ліся надта спрэчкамі.

Нявыразна лёгкі, як дымок, сум апавіў сэрца.

„Што-ж, няхай спрачаюцца. Спаць лепш пайсьці, от.."

— Ігнась!— паклікаў голас з ганку, такі знаёмы, такі бліз голас.

З голасам разам сьціхла быццам стукацець сэрца, захлі нулася ў чаканых гуках, а потым выскачыла з гэтае нявол і бясконца моцна закалацілася-загрукала.

А Ларыса, гукнуўшы, сьледам за гэтым зьбегла на тротуа і пайшла насустрач. Наскрозь зямлі прайсьці рад быў Ігнась такое няёмкасьці нагнала раптоўная сустрэча.

— Чаму вы ня прышлі сёньня? Вас-жа таксама запраша

Ігнась ужо папраўіўся; няёмкасьць зьнікала; лёгка і радась білася сэрца. І ён схлусіў:

— Ня было як мне ісьці. Заняты быў дужа. Часу н было.

— Як-жа гэта па такім запрашэньні ды часу ня был Глядзіце!—строга згразіла яна жартамі.

Уся нуда і смутак адляцелі раптам ад яе, таксама я і пазяханьне,—далёка-далёка недзе ткаліся фантастычн мары.

...Усё гэта так загадкава...Прыгожа... Цікава... А на сходц Нацягаў за вушы ўсіх гэтых аслоў, як сам захацеў (гэт

яна пра прыхільнікаў бацькавых, якіх пераспрачаў Ігнась у Любы). А чаго з імі цацкацца—дурні. І, успамянуўшы пра няпрыемнае грамадаўцам здарэньне, Ларыса сказала:

— А шкада, што ня прышлі вы сёньня. З вамі конча ўсчаў-бы спрэчку бацька, за тое... Ведаеце?

— Са мною? Барані божа... Аб чым мы можам спрачацца?

— А хітрун які, паглядзіце, і ня ведае. Можа і пра сходку, дзе вы спрачаліся па програме Грамады, нічога ня ведаеце.

— Ды я нічога.

— Нічога... Ха-ха-ха!.—зарагатала заразьліва Ларыса. Зусім нічога. Ну, дык я вам скажу: добра, вельмі добра, што вы паказалі, ім на чым сьвет круціцца! Варта ім. няхай ня пруцца куды ня сьлед! І ўсё-ж такі бацька на вас трохі гневацца будзе, што ня прышлі; ён хацеў адпомсьціцца вам за гэта самае.

— Што паробіш, калі часу ня было.

— Кажыце сабе, часу ня было. Ну, але ўжо добра, бацька ня бачыцьме які час, а там—сэрца ня камень, адляжа—можа ладом абыдзецца.

— Я нешта не разумею, чаму гэта ваш бацька ды зацікаўлен вельмі ў гэтай справе.

— О, папыталіся б вы ў яго. Пойдзем хіба?

— Не-не, не магу.

— Не хачу, можа. Што-ж прымушаць ня буду. А там усе напалі на сябра вашага, на Арона. Скажыце, хто ён?

— Рабочы, з аднае майстэрні,—адказаў Ігнась і сэрца сьціснулася быццам: „Чаго яна цікавіцца ім?"

— Я не пра тое... Па народнасьці хто?

— Хто яго ведае. Ды яўрэй-жа, мусіць.

— Вось табе і сябар. Ня ведае пра сябра, хто ён. Дык там напалі на яго вельмі.

— Як напалі?

— Ды ўсё тое-ж самае. І сёньня толькі працяг спрэчак, якія вы ўсчалі па програме тады. Але, ведаеце, у мяне ёсьць сказаць вам нешта важнае. Зойдзем да нас.

— Не, я не магу.

— Ну, добра... Дык вось што, пойдзем у сад. Згодны?

Ігнась ня мог больш адмаўляць, не хапіла сілы. Як хлапчучок, як дзіцё за старэйшым, паслушны пайшоў за ёю ў сад. У кружку з кустоў маліньніку там стаяла лавачка, сплеценая з моцных ракітавых дубцоў. Падышоўшы да яе, Ларыса пацягнула Ігнася за рукаў.

— Ды ня стойце-ж вы, сядайце, праўды ў нагах усё адно няма. Які вы нясьмелы.

Седзячы ўпоравень, ён адчуваў Ларысіну цёплую руку і, адчуваючы, жадалася падсунуцца яшчэ бліжэй, схілцца галавамі адно да аднаго...

Восеньскі ветрык шаволіў паціху, нібы шкадуючы, кволыя пасмачкі дзяўчыніных валасоў, неўзаметку свавольнічаў з белым, не павосеньскаму маёвым убраньнем, падхопваў струменчыкі паху духоў з Ларысінае хусьцінкі. Так прыгожа было ўсё гэта, такою бадзёрасьцю поўніла Ігнася, што грудзі высока ўздымаліся ад радаснага напружаньня, давалі прастору для новага, яшчэ нязьведанага агромністага пачуцьця, якое людзі нібыта завуць каханьнем.

— Чаго-ж вы маўчыцё?—запыталася Ларыса, цешачыся і сама гэтаю маўчанкаю сам-на-сам з тым, да якога былі думкі яе на сёнешняй сходцы.

— А я думаў, што вам прыемна, каб маўчаць і таму не гаварыў. І прытым вы-ж абяцалі гаварыць пра нешта важнае.

— Я ўжо і забылася... Ага! Праз знаёмага памочніка прыстава бацька дачуўся, што ў паліцыю быў зроблен данос на сходку за горадам. Аблава, якую наладзіла паліцыя, не ўдалася.

— Так, не ўдалася.

— Адкуль вы ведаеце?—пахапілася Ларыса.

— Ды я толькі пераказваю вашы словы за вамі, нічога я ня ведаю.

— Няўжо? Усё гэта ў вас толькі так ды нічога. Але справа ня ў тым. Паліцэйскага, які хацеў надта падслугаваць і выстраліў разы тры ўздагон некаму, прагналі з паліцыі, бо хацелі, каб усё асталося ціха, каб ніхто нічога і ня ведаў. А гэта на тое быццам, каб палавіць усіх жыўцом. Цікава гэта вам ці не, толькі ня ведаю.

— Так сабе.

— Ігнась!—голас па-чужому няпрыемна пацьвярдзеў Ларысін.—Я ня раю, Ігнась, пацьвяляцца са мною гэтак. Усё, пра што я расказала, было і вы павінны ведаць пра яго.

Ігнась маўчаў, дый ня мог ён нічога адказаць, ён чакаў, чым скончыцца гэтая размова. Неспадзявана Ларыса схілілася к Ігнасю, так што пасмачкі валасоў радасна казытнулі яго сваім пахам і ціха прашаптала:

— Падазраюць, што сходка наладжана вамі... вамі двума з Аронам. Бацька казаў. Больш у мяне няма чаго сказаць вам,—уголас дадала яна.

— Загадкава выдумана,—праказаў ціха, але з крыхою жарту Ігнась.

— Што хочаце гаварыце. Я ня маю ніякага права дапытвацца ў вас праўды. А цяпер (яна ўстала), я чую, разыхо-

дзіцца сходка. Ня трэба, каб вас бачылі тут. Вось па гэтай сьцежачцы цераз сад выхад на вуліцу. Ды я ўжо паказвала адзяго разу, Ігнась...

І падала руку.

— Бывай... здароў!

— Ларыса!—прашаптаў ён.

Павярнулася ўжо была бегчы,—кволым шэптам праказанае імя спыніла.

— Я слухаю, Ігнась.

— Нічога... Жадаю вам шчасьця,—праказаў ён.

— А вам поўнага посьпеху ў справе.

Павярнулася і зьнікла за маліньнікам у гушчыні цёмнага начнога саду.

„Ня тое... ня тое сказаць думаў"... ідучы шпарка з саду, думаў Ігнась.

## ПАДПОЛЬЛЕ

НА пасяджэньне комітэту, якое склікаў Арон неўзабаве пасьля сходкі ў Няслаўскіх, зьявіўся і таварыш з павету, Дуб. Сапраўды гэта быў дуб: плячысты, рукі як гольле, ногі, што моцныя жалезныя карэньні. Галаву, як дубовую дзежку на крыху выгнутых плячох, ён трымаў проста з нахілам наперад. Карыстаўся Дуб не малым посьпехам сярод сялянства. Арон палічыў патрэбным увесьці яго ў склад комітэту групы, бо такі толькі чалавек здолеў-бы падтрымаць моцную сувязь местачковых раёнаў з горадам.

Не дарма так доўга думаў ён над справаю організаваньня, комітэт быў падабраны вельмі ўдала. Перш за ўсё зьвязваліся ў адно рабочыя саматужных прадпрыемстваў, сам Арон з Ігнасём—прадстаўнікі ад бляхарні; адзін таварыш, прозьвішчам Майзэль—з піўнога бровару, на якім працавала чалавек пятнаццаць рабочых; чацьверты—чыгуначнік „Стрэлка" і пяты—вядомы ўжо таварыш Дуб. Такім чынам, комітэт, як і мысьліў Арон, павінен быў зматаць усе ніткі сувязі ў адзін кіруючы клубок.

Збор комітэту Арон прызначыў на нядзелю.

На гэты дзень зачынялася і Зусева бляхарня, а таму было вельмі зручна зрабіць сходку якраз у нядзелю. Гэты дзень для пасяджэньня добра быў яшчэ і тым, што ў горад зьяжджаецца шмат людзей і невялічкае комітэцкае ажыўленьне зусім неўзаметку будзе.

Ігнась падручыўся ўзяць на сябе арганізаваць „тэхнік… пасяджэньня. Яшчэ напярэдадні ён умовіўся з Яўхімам, к… той даў ім на дзень свае хаткі. Хатка стаяла на самым кр… гораду пры гарадзкім выгане. І Яўхім згадзіўся выправі… да сваяка бацькоў, а сам з малым братам застаўся вартава…

Раненька Ігнась выправіўся на часовую „комітэцк… кватэру", як жартуючы назвалі яе на сьнеданьні з Арон… Там на кватэры ён мусіў пачакаць усіх комітэтчыкаў, а … таго на выпадак якое небясьпекі падаць знак Арону, паслаўш… аднаго вартаўн ка. Чамусьці рады быў Ігнась пайсьці адз… пакуль зьбяруцца таварышы, на важную справу.

Ідучы к Яўхімавай хатцы, ён бачыў абодвух вартаўнік… на сваёй варце. Дзьверы ў хатцы былі зашчэплены на кр… чок. Ігнась адшчапіў і ўважна агледзеў цёмныя сенцы б… столі. Усё было ў парадку. У хаце ён сеў за стол і загл… дзеўся ў акно.

Хмурная раніца пачала распагоджвацца. Выплішчыла… халаднаватае сонца, памалу растапляючы падшорхлую … начнога марозу гразь. На вуліцы шчабяталі панадзімат… вераб'і.

„Хутка і зіма", падумаў Ігнась. Не падабалася яму хало… ная жорсткая зіма, так памятная яму ў вёсцы. Ня люб… таму, што ў сьвядомасьці зіма перапляталася цесна з голад… з горам. „Вось сабачае жыцьцё, каб ты запаветрала неча… Жывеш-жывеш марнеючы і, калі ласка, з голаду здыха…

Вясна і лета шмат успамінаў прыгожых намасьцілі ў Іг… сёвай галаве. Самыя прыемныя часы з Любаю ў яго бы… ўвесну і ўлетку. „Чаму канечне з Любаю,—яна цяпер злуец… чудная... А можа і я вінен, хто яго ведае".

Але, падумаўшы крыху, пакорпаўшыся дзесьці на д… памяці, парашыў, што ў сварцы вінна Люба, а ня ён. Ш… з ёю зрабілася—узвальваў на яе ўсе грахі апошняга Ігна… такім парадкам апраўдваючы цалкам сябе.

„Нават Арону паскардзілася", засьмяяўся ў душы … „А вось мне ні разу не казала, што ведае Няслаўскага. Ак… ваецца, грамадаўскае гняздо там у іх".

Так паступова перадумваючы апошнія падзеі і апр… дваючы сябе зусім, Ігнась упёрся ў той незабытны ве… у садзе з Ларысаю.

— Ня тое хацеў сказаць,—з шкадаваньнем пераказаў… тыя свае словы пасьля разьвітаньня з Няслаўскаю.

І з гэтым пераскочыў раптам да самага важнага... Ча… Ларыса не паведаміла пра аблаву Арона, а вось чаму… яму сказала. Як гэта разумець? А на ростані быццам на „… аклікнула,—ці можа яму здалося так?

„З дачкою памешчыка зьвязаўся", загаманіў неспадзявана чужы, але сяброўскі голас.

Ігнась азірнуўся і ўздыхнуў. Ён быў адзін у хаце. Перадумваньне гэтага нядаўнага, што прайшло, было прыемна, як першы дзень сьвядомасьці маладога жыцьця. Праменіста-прыгожае і балючае разам. Ён доўга яшчэ не пакінуў-бы думаць, каб у шыбу не пастукалі ціха. Ігнась глянуў на двор і адказаў такім самым лёгкім стукам—можна заходзіць.

„Вось і комітэт будзе".

Перад сустрэчаю з таварышамі ён натужыўся, скалатнуў рашуча, упарта галавою, прагнаў з патугаю прывабна-спакусьлівыя думкі. У хату зайшлі Арон з чыгуначнікам і Дубам.

— Вось наша сёнешняя і консьпіратыўка,—бадзёра прамовіў Арон.

— Парахня з яе сыплецца,—кінуў па хаце гаспадарскім вокам Дуб.

— На наш век хопіць,—усьміхнуўся, рады іх бадзёрасьці, Ігнась.

— А што больш трэба,—уступіў у гутарку і чыгуначнік.

— Ну, сядайце, хлопцы, адпачывайце. А там і Майзэль прысьпее. Дуб, мусіць, вёрст з дваццатак усмаліў сёньня.

— Эт, глупства! Каб яшчэ з дваццатак. Гэта-ж праходка, толькі шкада, што без дзяўчыны.

— А дзяўчына бадай не шкадавала-б, каб прайшла,—засьмяяўся чыгуначнік.

— Хіба ж я кахаць ня ўмею. Глядзі, якія ў Дуба рукі!..

— Бярвеньні,—пераняў са сьмехам той.

— Гэта нішто. Толькі абняць дзяўчыну ды прыціснуць да сэрца...

— Дык і канцы ёй,—жаласьліва праказаў Арон і ўсе зарагаталі, а сам Дуб-мацней за ўсіх.

— Не ўгадалі вы, таварышы, ажывее дзяўчына. У мяне-ж сэрца залатое, а ў ім каханьня бяз меры, яно і ажывавіць. Гэта, каб вось жандараў якіх ці вураднікаў,—голас яго стаў сухі, бязьлітасны,—вось каго люблю—без канца і меры. Узяў-бы, здаецца, парачку іх, у руку па адным...

— Ну, гэтых ужо сэрца не ажывіла-б,—гледзячы на яго дужацкія рукі, сказаў Ігнась.

Хвілін праз пятнаццаць, незаўважаных за жвавую гутаркаю, прышоў Майзэль—сухі, жоўты, гадоў дваццаці шасьці, сямі, рабочы.

— Нешта цябе і піва не папраўляе,—сказаў Арон.

— Згарыць яно няхай, гэтае піва, разам з тым бровазам-дзе яно выrabляецца! Яно мяне на той сьвет ужане!—нэрвова і хутка праказаў Майзэль.

— Рана стаў думаць пра той сьвет,—загаманіў Дуб.—Т
вось на мяне зірні - бачыш? То-та. Ты вось раней да кан
выспытай на гэтым сьвеце—выспрабуй, а потым глядзі яшч
ці ёсьць у цябе кашуля пра сьмерць, ці пазычаць ня трэб

— Без кашулі прыемней—вошы ня будзе на чым затры
мацца,—агрызнуўся пахмура півавар.

— Можа ты і праўду кажаш. Але-ж ня варта так казаш
зусім ня варта. К чорту сьмерць і той сьвет! На д'ябла ян
нам здалося. Жыцьі Жыцьцё ў рукі браць трэба! Вось так

Дуб шырока разьвёў рукі і, схапіўшы з лавы Арон
і чыгуначніка, дадаў:

— Вось так і трымаць, ня пушчаць нікуды!.. Моцна тры
маць!

Так прыціснуў іх да сябе, што яны піскнулі і пача
вырывацца.

— Няхай цябе зусім,—ацерабіўшыся, сказаў чыгуначнік.—
Цябе і сьмерць ня возьме, спужаецца. На ліха ты ёй так
страшны.

— Вось як браць трэба жыцьцё ў рукі, а не каб жыцьцё
цябе ў свае,—гледзячы ў бліскучыя вочы Майзэлю, даказ
Дуб.

— Ты-б вось паспрабаваў піва гнаць у нас,—ціша
загаманіў той, быццам ня зусім упэўнены, што Дуб н
ўправіўся-б

— Браток ты мой!.. Горы давай—варочаць буду, аб
ведаў, што наша яно, ня чыё, а наша.

— Пачнём, хлопцы,—перапыніў іх Арон.

— Дык давай тады мне сказаць,—папрасіў нэрвов
Майзэль.

— Таварышы, памятайце, што часу няма і дзела трэ
гаварыць, спраў поўна.

— Да справы кажу,—паглядзеў на Дуба Майзэль.—
упадобаў той яму (такі рады жыцьцю!).

— Давай.

— Вы думалі, можа, чаму я спазьніўся. Ох, гора мн
бяда з гэтым броварам, каб ён там на порах рассыпаўс
Іду, часу няма, а тут як на зло, бачу, ідзе Баргон. Ня ве
еце вы яго? Бундавец і як раз самы цёмны падазроны б
давец. Думаў—абыйду як паўз бок, уцяку. Дзе там...
ужо ўшчапіўся за руку і... „Здароў, хавэр Майзэль"... па
і панёс, як упуджаны конь. З гэткімі „хавэрамі" пры ра
хацеў бы я толькі гаманіць. Штодня вось так, дыхнуць
даюць, на шчэпку высушылі. Наш бровар—ня бров
а прытулак розных цёмных элемэнтаў. Розныя Баргон
шмаргоны шмаргаюцца на бровары, каля бровару, п'ю
піва і ашукваюць рабочых.

— Вось сьцервяцы!—не сьцярпеў Дуб.

— На бровары я адзін калом супроць іх... Жонка ўжо дома пытаецца, чаму гэта ад піва худзеюць, а не папраўляюцца. А нядаўна заблудзіў адзін сыёністы (хэдэрам яшчэ сьмярдзіць—не абветраў), і ён за бедную яўрэйскую вуліцу. Што вы скажаце пра гэта? Даводзіў яму, даводзіў хіба давядзеш? Яму страляй у лоб—усё адно. Дык пад канец я ня выцерпеў ды пляшкаю з-пад піва! Увесь нос расквасіў. Больш ня бачылі я ад таго. Добра, што гэтаму яшчэ не паверылі рабочыя. Дальбог, канцы мне хутка там, калі ня будзе помачы.

Вось якая ў нас плавае рыба.

— Ракі, а ня рыба,—сплюнуўшы праз зубы, заўважыў Дуб.

— Нямала ў нас усюды такіх ракаў,—сказаў Арон.— На словах адно, прыкрываюцца слоўнаю рэволюцыйнасьцю, а на справе—назад гнуць, публіка!

— Тут трэба будаваць работу на экономічнай падставе,— загаманіў чыгуначнік.—За кожную дробязь, што называецца, чапіцца да гаспадара, каб бачылі рабочыя, хто бароніць іхныя інтарэсы.

— Не пасабляе адно гэтае чапляньне. Па сабе ведаю. Гурткі трэба організоўваць, высоўваць лепшых рабочых у гурткі і вучыць іх там,—супярэчыў Майзэль.

Дуб неймаверна ківаў галавою ў тахту слоў. Майзэль яшчэ парываўся нэрвова нешта гаварыць. Дужака-Дуб маўчаў і глядзеў на свайго суседа збоку, на чыгуначніка.

— Калі мы будзем рабіць гэтак, як казалі, дык правалім... Па-мойму, трэба намагацца, каб усе рабочыя ведалі, што гэта за бундаўцы, ды ня толькі яны. Ёсьць яшчэ і эсэры...

— Пастой-пастой, як ты будзеш гэта рабіць, каб усе рабочыя ведалі?—выскачыў Майзэль.

— Так, як я казаў,—заўважыў чыгуначнік Стрэлка.

— Значыць, экономічная барацьба з прадпрыемцам?— кінуў Дуб.

— Якая хоч, абы рабочыя пераканаліся, што толькі соцыял-дэмократы вядуць яе і бароняць іхныя інтарэсы.

— Ня ведаю,—прамармытаў зноў Дуб.

— Робіце памылку, таварышы, сказаў Арон—Час чыста экономічнае барацьбы па рознай дробязі мінуў. Згуртаваць і ўзяць пад сябе рабочых можна, але ня гурткоўшчынаю, якую прапанаваў Майзэль.

— А чым? Як ты думаеш?

— Ня ведаю,—дадаў Стрэлка.

— Вось бачыце, ня трэба па-сьляпому толькі стаяць за свае некаторыя прынцыпы. Вы робіце памылку. Час чыста экономічных запатрабаваньняў у барацьбе мінуў, кажу, і час гурткоўшчыны таксама. Адно з адным увязана. Мясцовыя ўмовы адно, а што прыглядацца трэба да агульнага становішча—гэта другое.

— Ну, ну, паслухаем—арай.

— Жыцьцё не стаіць на месцы, яно круціць, як калаўротак, разумееце? Мы-ж павінны ісьці паперадзе ў жыцьця. Ад нас патрабуецца на сёнешні дзень узьняць масы на барацьбу з монархіяй, на зьнішчэньне праз рэволюцыю царызму і рэштак прыгоньніцтва, за грамадзкую роўнапраўнасьць усіх стажаў і ў першую чаргу рабочых і сялян. Трэба дзейнічаць масавым спосабам. Шырокая агітацыя павінна замяніць вузкую гурткоўшчыну—і паставіць справу пропаганды з найбольш выяўленымі агітацыяй. Вось шляхі работы. А выключна на экономічнай барацьбе далёка ня вытыцнешся. Вазьміце паўднёва-расійскія стачкі,—яны ўжо аб'яднаны агульным палітычным мотывам. Бясправнасьць рабочых пераступіла ўсякія межы. Экономіка трымаецца на палітыцы і палітыка вынікае з экономікі. Экономічная барацьба павінна быць і палітычнаю барацьбою рабочае клясы за свае правы, а не за кавалак чорстваго хлеба на сёнешні дзень.

— Я цалкам згодзен з Аронам,—падтрымаў яго Дуб.

Ігнась таксама быў за гэта. Падрабязна так ён ня мог выказаць у сваіх словах.

— Я ня згодзен,—сказаў чыгуначнік.—На экономіцы трымаецца палітыка. А рабочы на галодны жывот ня вельмі будзе баставаць, скажам, за палітыку.

Майзэль устаў, прабег па хаце і зноў сеў да стала.

— Ды зразумей-жа, ты, гаварыў Арон чыгуначніку,—што справа блізіць да рэволюцыі. На першай-жа вярсьце свайго змаганьня соцыял-дэмократы ставяць—скінуць самадзяржаўе. А ты цалкам са сваёю экономічнаю барацьбою. Наша задача цяпер—дасягнуць моцнае баявое організацыі.

— Ясна,—сказаў маўклівы дагэтуль Майзэль.

— Прымаецца,—зацьвердзіў Дуб.—А ты, брат (да чыгуначніка) пакінь свой экономізм.

Ігнась, слухаючы ўсе спрэчкі, быў яшчэ ў руках тых думак успамінаў. Нічога не казаў ён Арону пра сваю сустрэчу з Ларысаю Няслаўскаю, пра сваю гутарку ў садзе, ня было сілы, адвагі ня было сказаць. А цяпер момант якраз насьпеў. Апошнія Аронавы словы надалі яму бадзёрае цьвёрдасьці і калі ўжо пасяджэньне канчалася, ён паведаміў, што пачуў ад Ларысы.

— Нехта вядзе здрадніцкую работу.

Вочы ў Дуба блiснулі пагрозным агеньчыкам.

— Вось-бы ўзяць яго ў рукі.

— Ды пашкадаваць,—засьмяяўся сур'ёзны чыгуначнік.

— Мала ня было-б.

— Кожнаму трэба сачыць больш за самім сабою, асьцерагацца,—сказаў Арон.

— Ці ня думаеш ты, што ў кожным з нас сядзіць здраднік?—ускочыў Майзэль.

— Кожнаму трэба сачыць за самім сабою,—нібы не пачуўшы слоў Майзэлевых, пераказаў Арон.—За кожным сваім крокам сачыць, каб не даваць магчымасьці каму-небудзь стаць здраднікам. У нас па тэхніцы работы яшчэ мала зроблена. З такою тэхнікаю і зброі не дастанеш нідзе, а калі і дастанеш, дык паліцыя на другі-ж дзень будзе ведаць. Больш дысцыпліны.

З гадзіну яшчэ гаварылі аб практыцы работы, дзяліліся вопытам. Потым усе ўсталі. Дуб выцег з кішэні мяшок з тутуном і стаў частаваць махоркаю.

— Золота, а не махорка.

— У цябе ўсё золота: сэрца ў цябе залатое, махорка залатая...

— Я сам залаты,—зарагатаў ён.

— Ты брат, Дуб, там каля двароў паглядзі. Трэба ўзяцца за парабкаў.

— Яўхім ідзе,— сказаў Ігнась.—Пачакайце, я выбегу.

У сенцах Яўхім сказаў Ігнасю, што бацьку, мусіць, надакучыла ў сваякоў, дык ідзе дахаты.

— Трэба выбірацца,—заскочыўшы ў хату, сказаў Ігнась.

— Што такое?

— Ды стары Яўхімаў занудзіўся бяз дому, ідзе.

І хлопцы разьвіталіся, каб, вышаўшы па адным, накіравацца адразу хто куды.

— Трымайся, Дубок,—гаварыў Арон, зморшчыўшыся, калі той ад шчырага сэрца сьціснуў яму руку.

— Утрымаемся!.. А ты кінь свой эканомізм, браток,—раіў ён ад сябе ўжо чыгуначніку.

Першы вышаў Дуб. Пераступаючы парог, ён забыўся ці не пасьпеў нагнуцца і моцна стукнуўся ілбом аб вушак.

— Нічога. Мацней будзе,—пажартаваў ён і пайшоў на выган.

Чыгуначнік накіраваўся ў другі бок, а Майзэль проста ў горад. А калі ўсе разбрыліся, Арон з Ігнасём акружнаю дарогаю, агінаючы палову гораду, накіраваліся да кватэры.

Адышоўшыся трохі ад Яўхімавае хаты, Арон зірнуў на Ігнася і, як-бы не пакідаючы ранейшае гутаркі, сказаў:

— Я прайшоў тады з Любаю да яе кватэры. Простая, мілая дзяўчына. А ты дарэмна пасварыўся з ёю.

Сэрца ўпала, здаецца, у Ігнася.

— Яна казала табе?

— Усё расказала. У цябе няма, Ігнась кемкасьці ў падыходзе да сваіх супрацоўнікаў. Не аб літасьці я кажу, бязумоўна, а якраз аб падыходзе. Ты-ж не зразумеў Любы ў спрэчках, ня вылучыў яе з гушчы грамадаўцаў.

— Ды яна горш за ўсіх нападала на мяне.

— Спрэчку ад спрэчкі трэба адрозьніваць. Я раю табе не парываць з ёю.

— Ці-ж я ўжо так сварыўся, каб зусім пакінуць сяброўства.

— Як-бы не сварыўся, але давёў ёй слаба і толькі пакрыўдзіў. Тваё рэзкае выступленьне было неспадзявана,— так, напрыклад, гаварыла Люба.

— Я ня сам узьбіўся на іхную сходку, мяне запрасілі.

— Яно то гэтак, але ты ні разу да таго не раскрываў сваіх думак Любе, разумееш. Ня ведала яна добра цябе,— суха адказаў Арон і ўжо праз усю дарогу больш не сказаў ні слова маўкліваму Ігнасю

У чорных сьнегавых хмарах з поўначы насоўвалася зіма.

## НА БРОВАРЫ. ХТО КАГО?

НЕАХВОТНА, марудна паўзуць лаўгія зімовыя месяцы Мароз і сьнег, адлега і мароз. Рыпіць самотна пад палазамі сьнег. У падраным кажушку бяжыць упоравень з санкамі мужычок—грэецца. І, бягучы, думае:

„Неважнецкая сёлета зіма... Есьці як на зло поўна есца— пропашчы нейкія на людзей насланы. Птушкі—боскія стварэньні—і тыя, адчыніш дзьверы, у сенцы ляцяць, у хату, быццам уцякаюць ад чаго, і пішчаць усё неяк гэтак жалабна, як чуюць благое што. Кепска, ой кепска прабавіцца зіму, каб хоць на насеньне высталася. Не дацягнецца да вялікадня, ой не дацягнецца“.

Разважае сам з сабою мужычок, падганяючы зморануюхудзенькую кабылку на дарозе ў горад.

Мешчанін з кашэлкаю ў руцэ хутае вільготны нос у каўнер халоднага паліта—ідзе на рынак. Цяжка хадзіць зра-

білася, ня хочацца. Вось ідзеш, а ведаеш, што дарэмна, бо ня купіш нічога, няма вельмі за што дый не вязе мужык. Цяжка жыць.

На саматужных невялікіх прадпрыемствах зьбіраюцца ў кучкі рабочыя і, час-ад часу пазіраючы, ці ня ідзе гаспадар, аб нечым патаемна разважаюць. І гаспадар прадпрыемства неяк падазрона аглядае кожнага рабочага.

Аднаго разу прышоў Майзэль на работу такі спакойны, з бундаўцамі ня лаецца, ня нэрвуецца, зусім ня той чалавек, дый годзі.

— Ці не знайшоў ты часам свайго бога, Майзэль,—памаленьку ўкалоў яго чорненькі рухавы Нахамчык. Гэта значыла, што пачынаецца барацьба—лаянка, як і штодня.

— Так, брат, Нахамчык, я знайшоў бога, толькі не свайго, а вашага,—жартуе Майзэль і вясёлая ўсьмешка спакоем асьвятляе твар яго.

Закід Нахамчыкаў быццам растаў на паўдарозе, не дайшоўшы да Майзэля. І Нахамчык ужо насупваецца, ён ня ведае, чаму сёньня Майзэль гэткі вясёлы, калі ён ня можа быць такі.

— Змоўк ваш бог, Нахамчык,—з калючкаю пад'ехаў саладзільшчык Лейба (на ўчарашняй сходцы Бунду ён пакінуў арганізацыю). Можа таму і спакойны Майзэль, можа і ўсьмешачкі яго не злавіць, не сарваць з вуснаў і не растаптаць пад нагамі Нахамчыку. Ад комітэцкага пасяджэньня ўжо двух рабочых вырваў з Бунду Майзэль. Цяпер сілы на бровары роўныя. Можа таму і ня лаецца Майзэль. бо моцныя людзі ніколі ня лаюцца—моцаю сваёю даводзяць і пераконваюць.

Нахамчык не жартуе, як звычайна, калі яму ў злосьці заўважае Майзэль: „А і здало-ж цябе на жарты—каб табе лопнуць", і калі Нахамчык, адчуваючы бясьсільле супрацоўніка і сваю моц адказвае: „А цябе на рускага соцыялдэмократа, ха-ха-ха-ха!" Цяпер не рагоча Нахамчык, бачыць што няма чаго рагатаць, яшчэ за вар'ята палічаць. Ведае нешта Майзэль, ой ведае, каб яму гэтак лопнуць. Ня быў-бы ён такі сёньня цьвёрды. Але дурны Нахамчык, ну што можа ведаць Майзэль. „Не, ён навучыўся адказваць у нас, у нас,—на жарты колкімі жартамі, а я і злую. Я паказаў сёньня сваю слабасьць, трэба схаваць яе, ня трэба паказваць. Вось і ўчора, каб не Баргон, палавіла-б усіх паліцыя. Маладзец у іх Баргон, нюхам чуе, калі будзе паліцыя і раз: у восем аблава, трэба ўцякаць. Загінулі-б яны без Баргона, залатая галава!"

А пакуль Нахамчык думае гэтак, прыходзіць Баргон. Весялее Нахамчык.

— Гут морген, на бровар!

— Гутэ ёр, гутэ ёр,—падбягае да яго Нахамчык і вітаецца за руку. Потым бяжыць і падстаўляе пад крант квартовую конаўку і поўнаю піва падносіць Баргону. Добра пасьнедаўшы, той ужо захацеў піць і зайшоўся на бровар.

На хвіліну пакідаецца работа, адстаўляюцца піўныя пляшкі, вёдры з півам, пакідаецца солад і нават печ меншыць свой агонь. Выпіўшы піва. Баргон садзіцца на даўгі стол. Нахамчык, здаволены, трэ рукі. „Ой гэты наш Баргончык, гэта-ж золата, а не Баргончык! Зараз будзе алох Майзэлю".

А той увесь скурчыўся і галаву спусьціў уніз, быццам піва там у яго цячэ па зямлі, не глядзіць на Баргона з Нахамчыкам.

„Спужаўся"—круціцца ў галаве Нахамчыкавай. „Нічога, зараз пасьмелім". І Нахамчык ужо гатоў.

— Ну, хавэр Майзэль, давайце паглядзімо таго вашага бога.

— Зараз, хавэр Нахамчык, дайце толькі закаркаваць гэтую пляшку,—гаворыць спакойна Майзэль.—Ну, вось і я ўжо.

Як толькі сказаў ён гэта, дык два былыя бундаўцы. цяпер сябры Майзэлевы, схапіўшы па палёну, сталі ў дзьверы.

— Што гэта такое будзе?—з трывогаю спытаўся Нахамчык.

— А гэта тое будзе, каб бог ня ўцёк,—і Майзэль бліснуў гострымі вачыма на Баргона.

— Што бог! Які бог? Дурні вы абодва!..—закрычаў Баргон.

— Нахамчык, ня пужайся!.. Глядзі на бога. Вось бог! Ён яшчэ сьмярдзіць паліцыяю, ой як сьмярдзіць.—Рука з пляшкаю ткнулася ў Баргона.

Ногі раптам памлелі ў Нахамчыка.

— Ня пужайся, Нахамчык, няма чаго! Мы толькі злавілі паліцэйскага шпіка. Глядзі, як зьбялела ваша золата! Стой Баргончык! Бундаўцаў-Нахамчыкаў табе можна ашукаць, але ня нас. Хто ўчора, як гад, пралез у паліцыю перад сходам Бунду? Хто ўчора прышоў на той самы сход і сказаў: „Уцякайце, будзе, паліцыя, будзе аблава?"

Перамлелі ногі ў Нахамчыка. Баргон паварухнуў непаслухмяным языком. І закрычалі раптам на бровары. Нечая пляшка стукнула ў зубы Баргону і кроў заліла таго, пачырваніла зьбялелы твар. Нахамчык з кулакамі падскочыў к Баргону. З вуліцы пастукаў нехта моцна, затрос дзьверы.

— Паліцыя!—загаласіў нема Нахамчык.

— Адчыні!—крычалі звадворку.

Лейба адскочыў ад дзьвярэй, Баргон скарыстаўся з моманту, шамнуў у акно і зьнік. Ніхто за ім ня думаў і бегчы. Ў бровар уварваўся Ігнась.

— Халера на вашу галаву!—закрычаў Майзэль.—Нашто пусьцілі? Лаві, лаві яго!

Ігнась схапіў яго за руку і ледзьве выцег на мароз.

Праз хвіліну ўбег Майзэль.

— Лейба! Я бягу! Вельмі важная справа! Работа не ўцячэ і бровар не згарыць. Калі папытаецца гаспадар, скажыце—жонка захварэла.

Пасьпешна апрануўшыся, ён кінуўся даганяць Ігнася. За Майзэлем выскачыў і Нахамчык—пабег у свой бундаўскі комітэт.

Узбурэньне і ліхаманкавая дзейнасьць захапіла абодва комітэты: і соцыял-дэмократаў і бундаўцаў. Толькі розьніца невялікая была ў іхняй дзейнасьці. Соцыял-дэмократычны спорна сабраўся на сваё пасяджэньне ў кватэры ў Арона.

— Ах, ты чорт!..—вылаяўся Майзэль.—Як з неба ўпала.

— Трэ' было чакаць,—сказаў Арон.

А бундаўскі ў гэты час сабраўся і распырхнуўся. Умэнт зьнішчылі ўсе яўкі, перамянілі адрасы, зьмянілі комітэцкую кватэру, а самі комітэтчыкі, як краты, пазалазілі глыбока ў свае падпольныя норы. Двух лідэраў на нявызначаны час зараз-жа з балаголамі выправілі ў мястэчковую глуш. Справы і дакуманты арганізацыі так запраторылі, што і самім пасьля не знайсьці. На ўсе прадпрыемствы, дзе толькі былі бундаўцы, загад паляцеў... А ўсё гэты Нахамчык са сваім Баргонам, каб яму ня выдыхаць.

Пасьля вэрхалу на бровар прышоў гаспадар і адразу заўважыў, што няма двух рабочых.

— Ужо няма ні Майзэля, ні Нахамчыка...—уздыхнуў гаспадар і раптам зазлаваў.—Пабеглі па сваіх бундах-шмундах. Ой, гвалт, без нажа рэжуць. Піва, піва нашто паразьлівалі? Нарабілі поўна, дык разьліваеце. Каб вам у рабро такая работа! Што мне рабіць з імі, што рабіць?

На самую гарачку нахапіўся якраз Нахамчык.

— З работы ўцякаеш? Толькі абы грошы браць... Каб вас за пуп узяло! Глядзі ты, які ён рабочы! Глядзі, што я зараблю з ім! Хоць бяры ды бровар зачыняй!

— Эксплёататар!—адрэзаў яму ціха Нахамчык.

Рабочыя сьціху сьмяяліся, паадварочваўшыся.

— Ня трэба мне такіх рабочых. К д'яблу ідзі на работу, а мне не патрэбна!

Нахамчык вылупіў вочы.

— Але к д'яблу! Не патрэбна.

І доўга яшчэ рызындаваў гаспадар па бровары. Як толькі трохі прыціх (гэта значыла, што злосьць прайшла), Лейба сказаў, што Майзэль пайшоў дадому—жонка захварэла.

— Каб бадай яна захварэла...

— На тваю галаву казана,—прамармытаў Лейба.

— Як Майзэль прыдзе—да мяне пашліце,—загадаў гаспадар і вышаў.

Уздагон яму паляцеў бяскрыўдны корак ды спозьнена грукнулася ў зачыненыя дзьверы горла пабітае пляшкі.

— Хваробы табе на жывот!

— Каб ты ня выдыхаў, Брасілька!

— Дакруцішся... Дажывеш—няпраўда.

— А ты сплюнь, Нахамчык, лягчэй будзе,—маючы на ўвазе апошняе здарэньне з гаспадаром, спагадліва сказаў Лейба.

— Сам сплюнь. Добра жартаваць табе.

— А памятаеш, як ты нядаўна жартаваў, вось сёньня нават.

— Агонь іх няхай спаліць гэтыя жарты. Ой Брасіль, пузаты, трасца тваёй мацеры! Піва яго паўцякала, калі я выбег на часіну.

— Не бядуй... Гараваньнем справе не пасобіш.

— Халера яго ня возьме, калі адмовіць ад работы, а мне хіба свой язык жуй заміж хлеба.

— Неразумна гаворыш, Нахамчык, неразумна. Хоць ты і ня горшы ў Бундзе.

— Пакінь Бунд, не чапай яго.

— Табе баліць ад гэтага?

— Ды ня скачацца глядзі.

— Выступіў бы ты, Нахамчык, з Бунду. Ня я, а сэрца маё раіць табе.

— Можа галава?..

— Я думаю, усё адно. Прапашчы ты чалавек, Нахамчык са сваім Бундам.

— Што Бунд? Што табе Бунд?

— Галовы людзям дурыць. Ну навошта, скажы на літасьць, быць яму самастойна? Навошта, я пытаю, яўрэйскі саюз соцыял-дэмократаў, калі ёсьць партыя соцыял-дэмократаў?

— Ты ўжо поўна ведаеш, як я бачу.

— Можа табе ня добра слухаць сёньня, дык я пакіну. Ці можа цябе рэжа, што гаспадар сказаў. Кінь, кінь, Нахамчык, галавы не забівай. Ды калі ён падумае зрабіць гэта, дык мы ўсе пакінем работу. Праўда?

— Не прагоніць. Не дапусьцім!—праказалі рабочыя.

Нахамчык дзіўна паглядзеў на Лейбу.

— Толькі вось з Бундам—пакінь яго. Кажу табе, з ім кашы ня зварыш.

Змоўк жартлівы Нахамчык, як-бы яго і на бровары няма. І Лейба ўважліва кінуў на яго вокам, сьціх—паглыбіўся ў работу. Уплыў сёнешніх здарэньняў відаць быў на рабочых: рабілі яны бяз гуку, роўна, не перастаючы, як машыны. Кожны ў думках правіраў наказаньне за сёньня, кожны ацэньваў тое, што адбылося, і глыбока недзе ўпляталіся ў прыгожы вянок цьвёрдыя думкі.

Калі дзень пачаў убірацца ў цьмяна-смуглявую вопратку вечара, а на бровары запалілі задымелыя лямпы, тады прышоў Майзэль. У кароткім пінжачку і нявысокай зімовай шапцы, ён быў як хлапчук. А яшчэ на марозе паружавелі трохі шчокі, і ён выдаваў на бадзёрага жыцьцю радага малайца.

Але радасьці няпрыкметна было на ім, бадай, бліжэй бязвусы твар выказваў руплівую заклапочанасьць. Прышоўшы, ён не распрануўся і ня стаў на работу, а прысеў на шырокую калодку і глыбока дыхнуў, як-бы змарыўся на цяжкай рабоце. Да яго падышоў Лейба.

— Брасіль наказваў табе, каб зайшоў да яго як прыдзеш.

Гэта надало, мусіць, рухавасьці Майзэлю, уліло ў бязьдзейнасьць новую энэргію і, як апечаны, ён ускочыў з калодкі. Але перанэрваваўся, перагарэў і роўным спакойным голасам сказаў:

— Хлопцы! Таварышы! Зараз-жа кідайце работу—не такі дзень сёньня, каб стаяць спакойна і гнуць сьпіну!

Гэткае чароўнае ўражаньне пакідалі ягоныя словы і гэтак пераконвалі яны сваёю вялікаю моцаю, што ўсе пакідалі работу і паслухмяна падступілі бліжэй.

— Што такое, Майзэль?

— Дзе што нарабілася?

— Проста кажы, адразу!

— Таварышы! У гэты дзень, калі мы потам выціскаем сабе акраец хлеба, у гэты дзень недзе робіцца вялікая страшэнная справа. Не дамо адбыцца ёй! Пашлем вінавайцам людзкога гора і крыўдзіцелям наш рабочы праклён!

— Ты пра справу!

— Ай Майзэль, Майзэль!..

Ад іхных слоў запаліўся Майзэль, ірвануўся наперад, але потым адумаўся і рэзнуў:

— Цар пачаў вайну з японцам. У гэты дзень адбываецца вялікае страшэннае зладзейства!

— К чорту вайну!

— Крыві мала яшчэ, ці што?

— Далоў вайну!

— Вось і я кажу. Далоў вайну і з ёю разам монархію! Сёньня ўжо недзе далёка, за тысячы вёрст адгэтуль, на манчжурскай зямлі льлецца салдацкая кроў. Льлецца салдацкая кроў таму, што гэтага жадае цар і капіталісты, якім хочацца загібаць у свае рукі чужы народ, чужую зямлю. Прэч захопы, не патрэбна нам чужая зямля, ня хочам мы няволіць чужы народ!

— А што мы зробім?—азваўся, што маўчаў дасюль, Нахамчык.

Расчыніліся дзьверы з двара і ў шчыліну прасунулася перш галава, а потым і ўвесь Бросіль. У настаўшым зацішку перад новым бурным уздымам (ведалі рабочыя, што занэрвуецца Майзэль наастатку) па кашэчаму падышоў ён да сходкі; Майзэль заўважыў яго.

— Хадзі, гаспадар, сюды, хадзі, Бросіль, паслухай... І вось мы, социял-дэмократы, ня хочам гэтае бойні, ня хочам крыві, бо кроў тая ёсьць наша рабочая і сялянская кроў. Тутэйшы комітэт социял-дэмократычнае партыі пастанавіў абвясьціць у адзнаку протэсту аднадневую політычную забастоўку.

Нават Нахамчык і той на час пакінуў свае бундаўскія прынцыпы і моўчкам згадзіўся.

— Я бачу, гаспадар ня згодзен, ці дзіва. На колькі дзесяткаў вёдраў у яго менш піва будзе. Таварышы! Забастоўка—гэта пакуль што наша адзінае права, права сілы, права злучанае колектыўнае моцы рабочых. Будзем карыстацца з яго. На сёньня канец рабоце!

— Канец!

— Годзі!

— Баставаць!

— Таварышы! За гэты час нам трэба—паводле пастановы социял-дэмократычнага комітэту—зьняць рабочых з работы ў млынох, яны яшчэ ня ведаюць. Апранацца—і пайшлі таварышы!

Пакуль шпарка ўсе апраналіся, Майзэль даваў кожнаму загад: аднаму ісьці на млын Фрыдманаў, другому—на Мышалоўскі, трэцяму на астатні. А потым сказаў, каб абвясьцілі ўсім саматужнікам па трох вуліцах, што ўвайшлі ў раён Майзэля. Заміж інструкцый ён наказаў рабочым вылучыць па 1-2 лепшых хлопцаў на кожным прадпрыемстве, якія-б не дазвалялі працаваць у дзень забастоўкі.

Кучка рабочых, упусьціўшы ў бровар воблак марознага паветра, суладным рыпаценьнем рассыпалася па горадзе.

— Каб вам галовы паскручваць,—прамармынуў гаспадар зачыняючы бровар.

*

НАЗАЎТРА горад прачнуўся ціхі, бесклапотны. На вуліцах няма звычайнага руху: не бягуць вучні з кніжкамі, ня ідуць на рынак кабеты, на рамізьніцкай стойцы няма ніводнага рамізьніка. Спакойна ў горадзе, крамы і тыя не адчыняюцца. Быццам горад рыхтуецца да пахаваньня вялікае асобы. Адных дымоў гэта ня тычыцца: цягнуцца яны марудна з комінаў і марудна растаюць у паветры. Жудасна неяк у гэтай цішыні. Вераб'і толькі ды галкі, гэтыя спрадвечныя жыхары беларускага гораду, не шманаюць, як быццам іх ня тычыцца агульнае жыцьцё—сваім птушыным шумам і голасам праганяюць трохі цішыню. З людзей адны гарадавыя, як калы, адзінотна тырчаць каля паласатых вартавых будак, ня сыходзячы з месца. Вусатыя твары на шырокіх плячох гэткія, абыякавыя, тупыя, як-бы з дзерва павысечваныя.

Гэта з самае раніцы. А туды пад паўдня, гадзіне а дзесятай, сталі адкідацца акенніцы і прачыняцца форткі ў вокнах. Цікаўны і пудлівы абыватаць адным вокам пазіраў з-за фіранкі на вуліцу. А на вуліцы што ўбачыш: вуліца як вуліца і вераб'і нідзе не падзеліся, грабуцца ва ўчарашнім брудзе. Хіба што адлега на дварэ.

Вось прайшлі па галоўнай вуліцы тры чалавекі: гэта рабочыя з Зусевае бляхарні і сярод іх Цімох з Яўхімам. Яны правяраюць—ці падначаліўся абыватаць комітэцкаму загаду. Пакуль што поўная паслухмянасьць: ні ў воднай крамцы, ні ў майстэрні не адчыніліся яшчэ дзьверы. І яны сьпяшаюцца абыйсьці свой раён, каб хутчэй паведаміць Арона.

Толькі пад самага паўдня змысны абыватаць пачынае сьмялець, бо гэта самы яго час. Спачатку нясьмела і рэдка, а потым часьцей, хоць і боязна, сталі адчыняцца варотцы з двароў, вылазіць галовы. Потым па вуліцах пабеглі вучнёўкі і вучні, апранутыя па-сьвяточнаму, бяз кніжак у руках. Іх ніхто не чапаў. Тады абыватаць і зусім рашуча высунуўся з двара і сьмела стаў перад сваім домам. А як пасьвятлела сонца, памалу ажыві ў горад. Па-сьвяточнаму ўвабраныя людзі (як быццам загадаў хто гэтак)—ішоў народ на вуліцу гуляць. А потым з канца гораду прыляцелі моцныя гукі сьпеваў і на галоўную вуліцу выступіла кучка рабочых, што ішла ў радох па шэсьць чалавек. Наперадзе калыхаўся чырвона-чырвоны на новенькім гладка выструганым дзяржаньні сьцяг.

На галоўнай вуліцы кучка рабочых узялася шпарка расьці. Людзі, што гулялі па тротуары, бачылі ў радох на бруку сваіх сяброў, знаёмых і са словамі: „А я думаў, што гэта такое, але і ты тут. Ну, дык хадзем..." і далучаліся ззаду.

Неўзабаве кучка вырасла ў сур'ёзную вялікую дэмонстрацыю протэсту супроць вайны, з пяяньнем рэволюцыйных песень, з удзелам палахлівага абывателя.

Зьбянтэжаныя стаяць каля сваіх будак гарадавыя. Ня відаць конных стражнікаў. Толькі турма ачэплена ланцугом з турэмных вартаўнікоў. Ды невялікаму рэзэрву паліцэйскіх адданы загад быць напагатове.

З небасхілу выплыла хмара, потым другая, трэцяя. З усіх бакоў плылі яны, зьліваліся ў адну чорную гушчэчу і зьвісалі над горадам. За іх цемру схавалася яснае, але халоднае зімовае сонца. З сілаю ірвануўся вецер, нібы дасюль трымалі яго дзе ў адсадзе, зарыпацеў адчыненымі варотамі двароў, залескацеў бляшаным дахам, пазганяў заціікаўшых вераб'еў з вуліцы ды закруціў выпадкова галчынае пяцо. Хмары натоўпам густым пасталі над самым горадам. Засьвістаў і загуў у камінох зімовы вецер; камякамі пухкімі, мокрымі сьнег паваліў.

ЧАСТКА ТРЭЦЯЯ

# ПАД СЬЦЯГАМ ЗЬНЯДОЛЕНЫХ

## МАЁЎКА

КВОЛЫ ветрык лашчыў зялёную маладую травіцу, быццам задуменна шаптаў ціхую смутную казку бярозам. Яшчэ маладыя, але ўжо крывыя і пагорбленыя выснаваліся яны паабапал доўгага роўнага шляху. І мяккім маёвым лісьцем шумяць бярозы, і мяккая засень кладзецца ад іх празрыстае, рэдкае яшчэ зяляніны на сьвежую травіцу. З бярозы на бярозу кулямі перашмыгваюць чорныя, як у сажы ўсе, шпакі. Перасьмешнікі дражняць зблудзіўшую з лесу на шлях сіваваронку.

Далёка ўперадзе закукавала шэрая зязюлька. „Кук-ку-кук-ку"!—з цягучым перапынкам выгуквае яна, і не адна з дзяўчат, што мараць аб будучым, ідучы па шляху, міжвольна прыслухоўваецца і лічыць гэтыя кук-ку.

— Пракукуй, зязюлька, колькі жыць мне яшчэ?—моўчкі пытаецца кожная, з нейкім лёгкім налётам смутку і журбы на сэрцы.

— Кук-ку!

— Раз...

— Кук-ку!

— Два,—ужо аўтаматычна думае кожная: лёгкія думкі-пёрцы нясуць шпарка-шпарка ў нязнаную далячынь.

— Кук-ку!—абзываецца трэці раз зязюлька і змаўкае пакрыўджаная, бо яснавокія дзяўчаткі на шляху ня лічаць, колькі год ім жыць яшчэ. Іхныя думкі перасьцігнулі дзявоцка-традыцыйнае жаданьне, і яно чапляецца ў прывабным павуціньні з ружовых чароўных лятуценьняў.

Нядаўна з бакавое палявое дарожкі-сьцежачкі на шлях, спрадвечны бярозавы шлях—мо пяты ці дзесяты раз засаджаны прысадамі, гэтую палявую беларускую чыгунку, што праз колькі стагодзьдзяў зьвязвае ў адно сёлы, мястэчкі, гарады, лясы і палі доўгім зялёным касьніком—прыгожым, родным,—на шлях гэты першаю маёваю раніцаю зьвярнула група бадзёрых і смутных маладых дзяўчат-гімназістак. У карычневых сукенках, з чорнымі фартушкамі, скрышчанымі

ззаду сваімі канцамі, у руках нясуць яны капялюшыкі, усе як адной. Цяжкія косы зьвісаюць у кожнае за плячыма, ярчэючы чырвонымі новымі стужкамі-ўплёткамі. Спадаюць косы па сьпіне, хаваюць ад яснага сонца бела-белыя шыі, паварушваюцца павольна прыгожа ў павольнасьці сваёй, цьвёрдымі бліскучымі зьмеямі пад тахту крокаў.

Ідуць дзяўчаты роўна і стройна, як-бы скованыя нейкім непарушаным абяцаньнем-кляцьбою, у прыгожых дзявоцкіх шэрагах. Прутка ступае на цьвёрды, убіты шлях нага, спружыніцца роўны крок; насустрач ветру бягуць у руках капялюшыкі; бліскучыя, прынадныя, пабліскваюць за плячыма косы-зьмеі; прагна ўдыхаецца крамянымі дзявоцкімі грудзьмі густое маёвае паветра. А вочы імкнуцца ў далёкі цёмнасіні лес, што раскінуўся зялёным туманом наперадзе ўправа і ўлева, перарваў тонкую зялёную струнку спрадвечнага сівага шляху.

— Кук-куі—сіроткаю адзінокаю гукае зязюлька ўжо на другім канцы.

Серабрыстую песьню сваю разьліў высока ў сіня-сінім паветры жаўранак. Пахне тугою, набрынялаю зямлёю, бярозаю і леташнім разапрэлым іржышчам ды бульбянікам.

Як на дзіва на тое, на зямлі нікога. Ляжыць яна, галубанька, старая, агромністая пад вясновым сонцам і сірочая і маркотна чакае на свайго гаспадара-чалавека. Дзе-ні-дзе паўзорваны ўжо вузкія матузкі, можа і бульба нават пасеяна, але з большага ляжаць няпрыветна чорна-шэрыя палоскі ў сваім няпрыгожым леташнім убраньні. Вясна крыху спазьнілася і народ гамоніць, што мусіць за грахі людзкія кара гэта зьверху. Вось і так не стачыць канцы да новага хлеба. Але, кажуць, лёс заўсёды спагадвае з чалавека—месяцы тры ўжо як ідзе вайна. Распачынаюцца мобілізацыі і лішнія раты пакідаюць спарахнелыя хаткі, апранаюцца ў шэрыя шынялі і ідуць у нешта цьмянае, невядомае і страшнае адначасна, што разам называецца адным словам вайна. Можа і зямля сірачае таму, можа маркоціцца, таму, што яе гадавальнікі забралі з сабою свае пяшчоты да яе. Можа таму і ляжыць яна забытая людзьмі і, наліўшыся вясновым сокам і пахамі, тугая, жаданая, чакае сваіх каханкаў... Не, мусіць, няпраўда гэта, не забыта людзьмі яна, бо вунь пры шляху гостра паблісквае на сонцы разаком плуг. Толькі стаіць ён і чакае чагосьці. Падышлі ўжо дзяўчаты к таму месцу, як раптам плач пачуўся з-пад воза. Заблыталася пруткая дзявоцкая нага, згінуў роўны крок, прапалі шэрагі. Кучаю падбеглі яны к возу. На вільготнай вясновай зямлі ляжаў ніц хлапчук гадоў 13-14 і горка навзрыд усхліпваў. Гімназісткі абсталі воз і кожная напярэсьпехі пыталася ў хлапчука

чаго ён плача. Убачыўшы незнаёмых прыгожых гарадзкіх дзяўчат, хлапчук вылез ваўчанём з-пад воза і ўнурыўся. Плакаць ён перасьціх адразу, а на ўсе запытаньні адказваць не сьпяшаўся і камячыў у тонкіх, зусім дзіцячых пальцах крыску даматканае парыжэлае жакеткі.

— Дзяўчаткі, а які ён прыгожанькі,—зашчабятала адна і паказытала пад бараду хлапчука.

Той усьміхнуўся, апошнія сьлёзы ўпалі гімназістцы на руку і хлапчук выцер рукавом вочы.

— Вось так, вось. Ну, і маладзец! Глядзі кавалер які, а плача. За дзяўчатамі ўжо нябось бегаеш.

Хлапчук зноў усьміхнуўся, але маўчаў.

— Зірні, як поўна нас тут. Ну зірні-ж, зірні!.. Які ўпарты.

— Нясьмелы.—пачулася з дзявочага натоўпу.

— І харошанькі!—дадала другая.

— Сарамяжы!

І дзяўчаты сталі забаўляць хлапчука, казытаць і разьвясельваць. Першая, што загаманіла, выцерла яму беленькаю хусьцінкаю вочы.

— А цяпер зірні, любіш дзяўчат?—шчабятала яна, і галава з даўгою касою схілілася над хлапчуком.

Хлапчук павольна ўзьняў галаву і адразу сустрэўся з цэлым натоўпам усьмешлівых дзявочых зіркаў.

— Вось і маладзец! . Бачыш, колькі нас? А зірні, якія прыгожыя дзяўчаты! Каго-б ты выбраў? Вунь тая бялявенькая, глядзі,—і, абняўшы хлапчука за плечы, гімназістка бязупынку шчабятала з ім.

Рэшта дзяўчат стаялі паводдаль ад каня, які павольна згрызаў маладзенькую травіцу. Конь ухмульваўся на чужых і заварочваўся, адыходзіў у бок, цягнучы за сабою дзеравяненькі старэнькі плужок.

А хлапчуку гаварыла першая гімназістка:

— Ну, яшчэ зірні... Вось і добра! Чаго ты плакаў?

— Скажы чаго?—падхапілі запытаньне ўсе.

— Конь ня хоча слухаць,—прамармытаў хлапчук.

— Як ня хоча слухаць?

— Ды аручы. Ідзе куды хоча. Вось як ідзе, каб на яго ўпадкі.

Хлапчук паказаў на палоску,—два разы абышоў яе плужок і дзьве сьвежыя крывыя барозны ляглі па бакох.

— Агрэхаў колькі надаваў.

— А чаму ты сам арэш, дзе бацька?—адна перад аднэю пыталіся гімназісткі.

— Таму, што няма таты. На вайну забралі.

Хлапчук утопіў вочы. Ураз паціхлі дзявочыя галасы. Адчуваньне чужога гора закранула і іх. Зьнікла вясёласьць—

гора гэтага сялянскага хлапчука, яго сьлёзы сталі зразумелымі і журботнымі.

— А хто цябе выправіў араць? Матка ёсьць?

— Матка.

— А дзядзькі, сваякі?

— Ты едзь дадому ды скажы матцы, няхай яна папросіць каго памагчы.

— Няма каму памагаць, трэба самому,—і хлапчук матнуў рашуча галавою.

Дзяўчаты расступіліся, далі дарогу. Ён вышаў, улавіў за лейцы каня і пакіраваў зноў на палоску.

— Вось і гаспадар.

— А ты не сьпяшай!

— Памаленьку!

Уздагон яму паляцелі галасы-парады.

— Хадзем, дзяўчаткі!--гукнуў голас і дадаў:—гэтымі парадамі вы яму не пасобіце гараваць.

Гэта сказала Люба. Праз увесь час гутаркі з хлапчуком яна стаяла воддаля разам з дзяўчатамі, сярод якіх былі Сасноўская Вера і Ларыса Няслаўская. На голас яе сыпнулі ўсе ад воза на шлях.

Зноў ішлі. І вясёлыя, маладыя—маўчалі. Толькі-ж у гэтых гадох і весяліцца-б. Маўчалі. І ў нагу ня ішлося, згубіўся крок недзе, мусіць, там, каля хлапчука. Да самага лесу ішлі моўчкі, хіба толькі слова якое вырвецца і, спалохаўшыся свае адзіноты, растане ў паветры.

У лесе дзяўчат-гімназістак чакалі. Гурма моладзі, у якой былі і Ігнась з Аронам, жвава гутарылі на невялікім прагалку пад старым раскатым дубам. Хлапец, што стаяў на варце на шляху, прыбег сказаць, як толькі паказаліся з-за ўзгорку дзяўчаты.

Галасы тады на гале трохі паменшалі, а потым з новаю сілаю рассыпаліся па лесе. Арон устаў і перапыніў гамонку.

— Глядзі, хлопцы, пры дзяўчатах, каб ніякіх там славечак ані. Ніякае абразы, ніякіх сьмешак не павінна быць.

— Не, не!..

— А як-жа ўсё сур'ёзна?

— Яны-ж дзяўчаты, а мы хлапцы!..

— Таварышы... Людзей у іх бачыць трэба паперш за ўсё.

— Ды кінь, мы жартуем!

Сур'ёзныя галасы былі адказам Арону. І калі вартавы на шляху прывёў гімназістак, дык хлопцы паўставалі і сьціпла па-таварыску прывіталіся, а потым запрасілі садзіцца, дзе лепш. З такое цёплае сустрэчы павесялелі дзяўчаты і маўчанка іх пакінула, сталі жвава гутарыць і знаёміцца з хлапцамі

Потым само сабою ўсё пачалося. Казалі гарачыя прамовы. І пра 1 Мая, гэтае міжнароднае сьвята прыгнечаных, і пра вайну, і пра надта ўжо цяжкі ўціск свабоднае думкі ў Расіі. Гаварылі рабочыя з гораду, парабкі з бліжэйшых двароў і гімназісткі. Прыгожа гучалі маладыя галасы, а ўсе словы зьліваліся ў адзін струмень жаданьняў: жыць, змагацца.

На сярэдзіне маёўкі прыбег вартаўнік з шляху і сказаў, што ўперадзе відаць поўна сялянскіх фурманак. У маёўшчыкаў шпарка склалася думка зацягнуць сялян на маёўку. Зараз-жа вылучыліся чалавек дзесяць хлапцоў і на чале з Ігнасём пабегла на шлях.

— Гэй, куды едзеце?—запыталіся ў сялян.

І з уласьціваю сялянам пахмурнасьцю адказвалі тыя праз моцна сьціснутыя зубы:

— На здачу... у войска.

— Стойцё!..

— Чаго?

— Стойце, хлопцы! На вайну яшчэ прысьпееце, пасьпее знайсьці кожнага своя сьмерць, як таго хоча цар.

— Ды што вы гэта?! А хто вы?

— Мы рабочыя з гораду, у нас тут сходка...

— Ды злазьце, галовы, хутчэй да нас хадзем. Ня зла-ж, а дабра хочам.

Ківалі галовамі мужыкі, казалі:

— Нам патрэбна зьявіцца рана к воінскаму.

— Воінскі адзін, а вас поўна. Слухайце! Ня права—сіла, а сіла—права!

А сяляне пазіралі адзін на аднаго і ўжо хутчэй па інэрцыі вырывалася ў іх:

— Нам сказалі,—трэба рана-рана к воінскаму.

Тады дзесяць хлапцоў немаль сілаю пасьцягвалі іх з фурманак, фурманкі пазварочвалі ў лес, а самі з мужыкамі накіраваліся на маёўку.

Неймаверна спадылба пазіралі тыя (у косьці ўелася ім, што кожны ашуквае мужыка), але на маёўцы растаў халодны лядок і па вяснавому прыгрэла сонца. Маёўшчыкі паўскаквалі, кожны вітаўся за руку з мужыкамі; яшчэ больш нечарэчным было братаньне гімназістак.

Зараз-жа з работніцкіх пакункаў падаставалася піва: усё гэта рухавы Майзэль пастараўся. Сталі частавацца—жупіць. Жупка хутка запалілася нутраным агнём, пачалі гаварыць буйна, сілачку сваю паказвоючы.

— Каму вайна, а каму военка,—гаварылі здатчыкі.

— Плюньце на воінскага, хлопцы. Нашто вам зямлю чужую заваёўваць цару, у яго і свае досыць.

— Сабе заваёўвайце!—кідала ў твар зьбянтэжаным мужыком нечая гарачая галава.

— Эх, зямелькі б! І больш нічога.

— А ці мала зямлі,—казалі парабкі,—гэта-ж можна сказаць навокал нас двары ды двары. Паноў—хоць грэблі тахці імі. Вось і лясы таксама..

— Хат... Хат з гэтага лесу колькі вышла-б!

— Так. Ды лес і сам па сабе добрая хата. Яшчэ раз кажам, плюньце на воінскага!

— Добра плюнь, загінуць хіба.

— Сіла не загіне. За сахары, косы ды ў двары, да паноў. Зямлю бярыце! Зямлі ніхто ня дасьць самаахвотна. Браць трэба яе, за каўнер браць!

Сялян моцна абкручвалі пропагандаю. Але цьвярозыя мужыцкія галовы прадугледжвалі ўсё, яны спрачаліся. Царская агітацыя праз земскіх ды ураднікаў макам рассыпалася ўжо па сёлах: „цар хоча забраць манчжурскую зямлю для перасяленьня, каб мужыком добра жыць стала".

— Ня верце, хлопцы. У японца сваім зямлі не стае і рускаму цару ён ніколі не аддасьць яе.

— Ды ці чулі,—дадаў другі,—б'юць царскае войска. Як пракосы на сенажаці пад касою кладуцца, гэтак там кладуцца нашыя салдаты. Во, нашыя генэралы...

— Добра ўмеюць ваяваць па сталіцах у карты, ды з рэволюцыянэрамі, з рабочымі, мужыкамі.

— Ведаем апавядалі бацькі пра мяцеж ды Мураўёва, як ён паліў ды рэзаў калісьці.

— І ўсьмірыў, бо ня ўсе ўсталі, бо ня ведалі, як і за што біцца.

Нарэшце, да таго дайшло, што сяляне махнулі рукою, і заміж таго, каб ехаць у горад, павярнулі і кучаю пайшлі ў лес.

— Калі надта кепска будзе ці што там, прыходзьце ў горад да нас. За-адно мы!

І фурманкі, што везьлі на здачу к воінскаму, паехалі дадому з загадам перадаць на сяле апошні паклон ад здадзеных у войска.

А маёўшчыкі тымчасам паклапаціліся як сьлед: не адзін гаспадар дастане з саломаю з воза друкаваныя лісткі, якія яшчэ адносяць сьвежаю фарбаю сваіх літарак; панесьлі іх з сабою і зданыя ў войска.

Сярод таварышак маркоцілася Любе. Негаваркая была нешта і Ларыса. Абое пазіралі адна на адну і часам ківалі вокам на Ігнася. Той ня сьмеў падыйсьці да іх. Не ўважаючы на Аронаву параду, ён дасюль яшчэ ня зьмірыўся з Любаю

Цяжка было на сэрцы ад гэтага; а часам прыгожыя адчуваньні прамігаліся,—тады было хораша і лёгка; адале зноў рабілася ніякавата, калі прыпаміналіся восеньскія здарэньні. Аднайчасна чамусьці прыходзіла да думак—сустрэча ўвечары з Ларысаю і сварка з Любаю, і ніяк адарваць ня мог ён адно ад аднаго іх. І забыць тады жадалася пра ўсё, з галавою нырвуць у адчайную справу, каб у ёй пазбыцца гэтага сардэчнага цяжару. Ігнась набіваўся са сваімі паслугамі пры ўсякіх самых маленькіх выпадках, заўсёды выпрошваў у Арона даручэньні па організацыі. Вось цяпер толькі... Няма нічога адчайнага, за што можна-б учапіцца... Ён міжвольна азірнуўся на вінавайцаў свойго душэўнага разладзьдзя. Тыя ўжо жупілі і гэтак неяк ласкава, здаецца, што нельга сказаць было пра іх напятыя адносіны. Зьдзівіла Ігнася і—можа таму, што зьдзівіла—забыўся як доўга пазірае на іх і як ня толькі сябры побач, але і самі дзяўчаты заўважылі гэта.

— Ці не жаніцца адно ўздумаў, Ігнась,—цішком пажартаваў сусед і штурхнуў пад бок локцем.—Ыш ты яго.

Скончылася маёўка добра, без усякага здарэньня. Назад ішлі па кучках, і па два, і па адным. І гутаркі цягліся ўсё пра адно... Маёўка ня скончылася, яна разьбілася на дзесяткі струменчыкаў-гутарак, то буйна-бурлівых, як гром навальніцы, то ціха маркотных, як шум чаратоў.

Перад расходзінамі Ігнася паклікала да сябе Люба з Ларысаю. Пайшлі разам. Ідучы ўпікалі яго няўважнасьцю і варожасьцю да іх.

— А хітрун які ён, Люба,—казала Ларыса.—А ціхун—божа мой!..

Расказала пра Ігнасёвы адмовы ад свайго ўдзелу ў рэволюцыйнай рабоце, пра сход, паліцыю, аблаву.

— Ды ўжо скончу, бо ён зноў апраўдаецца, скажа, што я-ні я, хата не мая і не гаспадар я. Няхай ужо...

— Не ўракні, Ларыса, ён і без таго сапсаваўся апошнім часам. Бачыш-жа каб не паклікалі, дык і не падыйшоў-бы. Благі стаў Ігнась наш.

Няпрыкметным сумам падыхнула ад Любіных слоў, і сэрца здрыганулася ў Ігнася нямаведама чаму. Ён зірнуў у вочы Любе. Тая сустрэла зірк і адвярнулася; быццам туман рэдкі, роўны наплыў на дарогу і ня відаць зрабіласяісьці.

— Мне прыпамінаецца першая наша гутарка,—казала Ларыса.

Далейшага Ігнась ня чуў. Нейкі холад, жаль увабраў у сябе яго сэрца, але парывацца не парываўся, каб вырвацца ды набраць поўныя грудзі сонечнага паветра, каб

уцягнуць густых пахаў вясны. Збоку зацуркаў раўчучок, як у раньнюю вясну па каменчыках—Ларыса гаварыла. Сярэбраным звонам званіла яна ў вушах Ігнасёвых, чарамі жаданае прыгажосьці ахутвала думкі. І цяплела Ігнасёва сэрца, і павуцінкі-лятуценьні сткаліся ў вобраз стромкае прывабнае дзяўчыны. Адале раўчучок зазваніў з другога боку, і Ігнась крыху павярнуў галаву, каб лепш чуць.

— Ха-ха-ха! Дык здольны марыць,—зарагатала Ларыса.

Ігнась схапянуўся.

— Я ня спаў гэтае ночы зусім. Ня мару я, а спаць захацеў.

— Немагушчы які. Апраўдаўся, Ігнась?—запыталася Люба і не пачула адказу, а не пачуўшы, зьвярнулася да Ларысы і загаманіла пра выпуск гімназіі.

— Ты парашыла, Люба?—пыталася Ларыса.

— Напэўна, Лара... Навошта-ж бы я вучылася. Змалку, з першага-ж году вучэньня, я меруся стаць за настаўніцу.

— Дык умова, значыць... умова,—згодаю праказала Ларыса.

Здаецца, яны пацалаваліся і потым загаманілі пра нейкую дапамогу ад Няслаўскага.

Ігнась слухаў, не бяручы ўдзелу ў гутарцы, зусім абыякавы, быццам воўк перабег яму сёньня дарогу.

## *КАСА НА КАМЕНЬ НАСКОЧЫЛА*

УВАХОДЗЯЧЫ ў горад, Ігнась разьвітаўся з дзяўчатамі.
— Ты-ж бы хоць правёў нас трохі, Ігнась,—папрасіла Люба

— Вельмі-б рад быў, ды не магу. Я-ж казаў, што спаць захацеў.

— Які ты сонны зрабіўся,—зноў пакрыўдзілася Люба,—ну што-ж бывай...

І яны разышліся па розных вуліцах.

Сонца ўжо заходзіла. Касыя, доўгія цені ад прысадаў слаліся на брук. Гарадзкі шум гучэў больш выразна, набываючы пад вечар звонкі гул. На высокіх таполях яшчэ галганілі вароны, садзіліся, на седала. Белае малако далёкіх лёганкіх аблачынак пахварбавалася ў ружовы колер захаду.

Ігнась ішоў, зорка ўзіраючыся на бакі. Ён не сьпяшаўся

Па вуліцы гулялі, як і летась, калі Ігнась ішоў да Любы.

Цяпер адчуваньні былі зусім ня тыя. Пасьля разьвітаньня адляцеў настрой асабовых перажываньняў: зьнік серабрысты раўчучок Ларысінага голасу, зьнікла і Любіная халодная крыўда з яе смуткам. У сэрцы ня было ўжо месца ні любасьці, ні каханьню, ні няёмкасьці. Горад абудзіў быццам Ігнася, уліў бадзёрыя пруткія імкненьні і сілу.

З-за рогу Турэмнае вуліцы вылецелі сьпеўныя гукі. Гэта астрожнікі, у вокны пастаўшы, сьпявалі:

Сижу за решеткой в темнице сырой,
Вскормленный в неволе орел молодой...

Ці то крымінальныя сьпявалі, бо турма часта навучае і палітычнаму, ці мо' якія і палітычныя, накшталт аднаго вучня з павятовага вучылішча, які сказаў быў на царыцу вельмі няпрыемна і за гэта сеў у турму. Сьпевы ядналі астрожнікаў. Бывала часам, што аднаго сьпевака падхоплівалі галасы ўсяе турмы. Тады звычайна трымаўся напагатове каравул у сваім памяшканьні, а начальнік турмы выскакваў з свае кватэры пры турме і бег лаяць назіральных. Песьня ў турме прарывала спакой яго. Не дазваляецца ні шумець, ні сьпяваць. У афіцыйнай мове гэта завецца „парушэньнем турэмнага парадку і цішыні“, і для больш упартых вінавайцаў яго зараз-жа адчыняецца турэмны карцар—сьмярдзючая, цёмная і мокрая каморка, у якой ня выседзеў-бы і аднае ночы сабака. Але арыштант горш за сабаку. Начуе і днуе ён у карцары часта не адны суткі, а тыдні і цэлыя месяцы.

— Праз цэлы дзень горла дзяруць,—прамовіў ідучы насустрэч Ігнасю нейкі гнілы грыб-махавік — генэрал у адстаўцы.

Жартаўлівы настрой выбухнуў раптам у Ігнася, захапелася пашкіляваць са старога.

— Рабіць няма чаго ім, пане генэрал, дык яны і дзяруцца.

— Верна... Што верна, то верна, малады чалавек! Але ня раіў-бы я вам папасьці туды.

— Вы-ж мо' ня спыталі, дзядок, добра там ці не, што раіце.

— Нах-хал! Які нах-хал! Я з вамі не гаварыў, малады чалавек, а вы абражаць мяне!

Невядома, што абразіла больш генэрала ў адстаўцы, абраза турмою, ці зварот Ігнася на „дзядок“, пасьля пана генэрала.

Дурань стары,—больш сам сабе, чымся генэралу, сказаў Ігнась, і паскорыў крок, каб не ўвязацца часам у справы з гарадавым.

А генэрал стаяў, абапіраючыся на кіёк, і сіпеў усьлед:

— Вось пахал! Няма цьвёрдасьці ў паліцыі... Каб цар-бацюшка ведаў усё. Басяк, з якім я... гм-хмы... гаварыць ня ўздумаў-бы, абразіў... мяне... заслужанага царскага генэрала!.. мяне... героя турэцкае вайны!..

Каля генэрала пачала зьбірацца публіка. Азірнуўшыся другі раз, Ігнась загледзеў, што да генэрала ішоў цераз вуліцу гарадавы, і зьвярнуў у завулак.

Пацешыўшыся з генэрала, Ігнась ужо забыўся пра гэтае здарэньне. Хацелася пайсьці легчы. Паварочваючы на сваю вуліцу, ён найшоў раптам на Дуба.

— Ці гэта ты, Дуб?

— Я, браток, я,—абціраючы парасьнелы лоб, адказаў той і азірнуўся асьцярожна.

— Што ты баязлівы такі сёньня?

— Ды не, бач, глупства...

— Што такое?

— Ды дзьве гадзіны ўжо кручуся па вуліцах і ніяк справы не зрабіць,—і, раптам зазлаваўшы, даказаў:—сквалаціна нейкая аж дзьве гадзіны поўзае ў хваста!

— Шпік?

— Ага, такі вось... у чорненькай тужурачцы, на вучня падае.

— Ну-ну, знаю.

— Ды вось. А трэба атрымаць лістоўкі. Даўно плюнуў-бы на яго, ды баяўся, каб не навесьці. Цяпер ён недзе шукае мяне.

Дуб расказаў, як ён аб'ехаў шпіка, зайшоўшы ў нейкі двор, а адтуль агародамі выскачыўшы на другую вуліцу.

— І панесла-ж яго хвароба пайсьці якраз па вашай вуліцы, калі мне трэ' было зайсьці... Ды і вось ён!—моцна шапнуў Дуб.

Ігнась зірнуў, куды паказаў той, і ўбачыў... Ішоў Юркевіч, уважна пазіраючы на бакі, нібы думаючы, якою вуліцаю пайсьці.

— Я вазьму яго сабе.

— Бяры. Згарыць ён няхай. А ў тую нядзелю да мяне. Там сход і.., адным словам убачымся на рынку... Я прыеду.

Дуб шпарка пайшоў вуліцаю. А Ігнась, не раздумваючы доўга, вытыцнуўся з-за рогу і ўзяўся проста на Юркевіча.

— Гуляем, пане павятовец? Надвор'е добрае.

— Тааак... Прыгожы вясновы вечар... і рыжыя на вуліцы. Ігнась не зьвярнуў увагі на абразу.

— А Люба прывітаньне мною пераказвала. Толькі што разьвіталіся.

— І, абегшы ўвесь горад, зусім не з таго боку дадому?

— Бо ведаў, што толькі тут сустрэнемся. Прывітаньне-ж трэба пераказаць.

— Кватэры мае ня ведаеце. Так, так...—пакідаючы без адказу высьмешку, зласьліва загаманіў Юркевіч:

— Паверце, што так.

— Мая кватэра... Мая кватэра...

— Хіба ў вас дзьве іх?

— А вам зайздросна... Мая кватэра на Раманаўскай вуліцы, дом нумар дзесяць.

— А мая вось тут, вунь відаць, ды вы ведаеце, як я бачу.

— А мая на Раманаўскай. „В минуту жизни трудную" можаце заходзіць, хе-хе-хе!—зласьліва захіхікаў Юркевіч і завярнуўсяісьці.

„Трэба яго ўкалоць, укалоць", падумаў Ігнась, згубіўшы асьцярожнасьць і развагу ад гэтага сьмеху Юркевічавага, і кінуў таму:

— Вы, здаецца, шукаеце аднаго хлапчука, ростам як гэтая вось таполя, дык я бачыў яго. Ён пайшоў вунь туды,— Ігнась паказаў пальцам за плот на клёзэт.

— Сволач рыжая! Хутка пагамонім дзе сьлед,—прасіпеў раптам са злосьцю Юркевіч, зьвярнуўся і пайшоў прэч ад Ігнася.

— Ха-ха-ха-ха-ха! - зарагатаў Ігнась.—Стражніцкімі—селядцамі, ці што, страшыш?—крыкнуў уздагон.

Нічога не адказаў той. Шпарка-шпарка, н бы рогат Ігнасёў падганяў яго, шыбаваў ён у сярэдзіну гораду.

„Падазроны ён сёньня надта", прамільгнула ў Ігнася.

На вуліцы зьмеркла. Арон быў дома, ляжаў на ложку. У пакоі сьцямнела зусім. Увайшоўшы, Ігнась убачыў, што Арон ляжыць, і падумаў, што сьпіць ён, але, сеўшы з краю на ложку, убачыў яго чорныя шырока расплюшчаныя вочы і загаманіў.

— Дуба бачыў.

— Я яго застаў на кватэры, прышоўшы з лесу. А ты ўсё з дзяўчатамі, глядзі.

— Ды не, што ты, кінь. Ты вось паслухай лепш.

Ігнась расказаў па парадку, як ён сустрэўся з адстаўным генэралам, пра сваю гутарку, потым пра Дуба, і, нарэшце, пра сустрэчу з Юркевічам.

— Ведае ён поўна.

— Можа быць.

— Напэўна ведае. Не сказаў-бы: „Хутка пагамонім дзе сьлед".

— Не... калі шпік ведае што, дык ня будзе вытыкаць ім на вочы.

— А чаму ён дзьве гадзіны валачыўся за Дубамі! Дарэмна ты гаворыш, ведае шмат ён. І каб ты ведаў, Арон, што гэта за гадзюка!

— Можа што і ведае,—сказаў Арон.

— Арон... Уся адказнасьць на выпадак чаго якога на нас ляжа. Гэта вялікая адказнасьць, Арон.

— А ты што мяркуеш?

— Скончыць жартачкі. Досыць... Вось што я думаю.

— Загінуць хочаш? Як хоч, я не супярэчу,—нязвычайна абыякава, як ніколі, сказаў Арон.

Ігнась заўважыў гэта.

— Чаму ты гэтак кажаш? Ці ты мне ня сябар, не таварыш? Няўжо табе ўсё адно?

— Ня думай так, Ігнась, ты ведаеш, хто я табе.

— Дык ты згодзен. Даеш згоду?

Упацёмку знайшоў ён Аронаву руку. Яна была халодная.

— Што з табою, Арон?

— Нічога. Са здароўем нешта дрэнна. Я лепш засну.

— Сьпі, толькі дай мне... зброю. Вось так. А пакуль ты гэта праўду сказаў.

— Што?—утомным голасам запытаўся Арон.

— Ды не, глупства ўсё, нічога ня зробіцца... Але-ж, ну так толькі, нічога ня ведаеш наперад...

Ігнась абняў Арона, пацалаваў моцна, і ўжо ў парозе праказаў ціха, самотна:

— Спакойнае ночы. Бывай!

— Як толькі ён хляпануў за сабою дзьвярыма, Арон раптам усхапіўся.

— Не, гэта ня жартачкі,—прашаптаў ён.

Дастаўшы з трупкі запорнуты ў анучку рэвольвер, ён разгарнуў яго, узяў у кішэню і ціха вышаў на вуліцу.

Постаць Ігнасёва не растала яшчэ ў цэмры і глухія хлюпкія крокі яго чуваць былі выразна. Арон назіркам пайшоў за ім.

### *САВА НЕ ПРЫВЯДЗЕ САКАЛА, А ТАКОГА ЧОРТА ЯК І САМА*

БАЦЬКА сустрэў Ларысу на ганку. Быў ён пахмурны і ўсерджаны. Дачка быццам не заўважыла бацькавага настрою і пайшла адразу ў сваю спальню.

Прыемная змора адчувалася ў целе. Ларыса села пры акне, адсунула фіранку і пачала глядзець у сад.

Праз якое паўгадзіны, пастукаўшы ў дзьверы, зайшла пакаёўка і запыталася, ці ня прынесьці паненцы палуднаваць. Утомным голасам Ларыса адмовілася, і, як толькі пакаёўка вышла, прачыніла акно.

Вясновыя пахі ўварваліся з саду. Распукаліся ігрушы і яблыні, дыхалі пекнымі пахамі маладога абуджанага жыцьця. Белыя, ружовыя пялёсткі вылучалі ў вечаровае паветра кволы густы аромат. Угары было яшчэ віднавата. Позныя птушкі хаваліся ў гальлі дрэў. А ўнізе цені гусьцелі, ужо ды гусьцелі, зьліваючыся ў мяккую цемрадзь ночы.

Ларыса сядзела і глядзела. Потым устала, узаперлася на аконьнік. Але, мусіць, сьціскаў гарнітур, яна парасшпільвала гузікі на сукенцы. Вызваліўшыся напалову з нявolі крамніны, раскошнае стромкае цела адчула лёгкасьць і разам пяшчотнае датыркненьне кволага ветрыку. Свавольна песьціў ён голыя, нячэпаныя чужою рукою тугія дзявоцкія грудзі; цьвердаватыя хвалістыя пампушкі іх цягнуліся быццам насустрач жаданаму датыркненьню.

Як мара пекная, стаяла ў акне прыгожая Ларыса. На твары няпрыкметна ні хмурынкі, ні воблачка думак. Ні крыхі быццам сэнсу ў дзявоцім зірку шырока раскрытых воч, быццам ня тут яна, не ў акне сузірае вечаровую прыгажосьць маёвага саду і насалоджваецца ад усяго хараства вясны, а недзе далёка, у нязнаным краі жыве бяз клопату, як птушка, перапырхваючы весела з галінкі на галінку. Доўга яшчэ б можа сузірала яна вечаровую прыгажосьць, ня зрухнуўшыся з месца, каб праз якую часіну не паклікаў бацька, увайшоўшы нячутна ў спальню.

— Лара!

Голас яго быў, здалося, такі кволы, зусім бацькаўскі, і ад гэтага голасу ў Ларысы страцілася імгненна першае ўяўленьне. Ні пахмурнасьці, ні ўсерджанасьці ня чулася ў ім, і твар бацькаў напамянуў ёй даўнейшае, калі быў бацька добры-добры і гэтак шкадаваў свае дачушкі. Аднавіўшы ў памяці мінулае і разам адчуўшы ўсё хараство ў ім, захацелася раптам кінуцца на грудзі да бацькі і ціха-ціха паскардзіцца. Паскардзіцца, толькі на каго ці завошта, ня цяміла. Так вось, здаецца, нейкая вельмі вялікая і пільная патрэба выбухла раптам, міжвольна выклікаючы на вочы сьлязінкі, празрыстыя, лёгкія.

— Ты ня чуеш, Лара, ці слухаць ня хочаш?—пытаўся бацькаў голас, гняўлівы, строгі.

Умэнт зьнікла дзяцінае жаданьне ў Ларысы, ураз напружана азвалася:

— Калі ты гаворыш, дык я чую і слухаю.

— І абзываешся за трэцім разам, і вымушаеш бацьку ісьці да цябе, замест таго, каб самой прыйсьці!

— Не магла ведаць, што табе спатрэбілася гаварыць са мною. Ня маг я і не вядзьмарка, каб угадаць твае думкі з другога пакою.

— Я зусім ня мерыўся, Лара, слухаць недаччыныя словы і ня думаю задзірацца з табою.

— А як бацька, прышоў прачытаць нотацыю дачцы... Ну, што-ж, я слухаю.

Грузкаю паважнаю хадою прайшоў Няслаўскі разы два па пакоі і пачаў. Угадала Ларыса, ня будучы вядзьмаркаю, што бацька чытаць будзе ёй мораль.

— Я не разумею, Ларыса, чаго ты дамагаешся ў жыцьці? Вучыцца я цябе аддаў не на тое, каб ты не хадзіла ў гімназію, гэтак як і гадаваў, і гадую дасюль не таму, каб слухаць і бачыць тваю непаслухмянасьць.

— Ты можа пра сёнешняе,—перапяла яна,—дык проста запытаўся-б як сьледчы: „Дзе ты была сёньня?“ Магу адказаць: хадзіла ня ў гімназію, а на маёўку ў лес. А чаму ня сюды, а туды—справа густу. Густ у мяне такі.

— Сапсаваны густ, глядзі, каб не давялося лячыцца.

— Ці ня ты, тата, думаеш стаць у мяне за доктара?

— Без калючак, Ларыса. Як я бачу, дык ты паставіла сабе на мэце кожны раз атручваць мне спакой. Ты дачка мне, і я ні ў якім разе не магу прапусьціць бяз увагі тваіх сур'ёзных жартаў.

— Да прыкладу.

— Не перабівай. Чым далей, тым больш стала ты на шлях жартаў, жартаў сур'ёзных, якіх нельга апраўдаць. Сёнешні ўчынак ты, бязумоўна, лічыш правільным, а я не.

— Ну і лічы сабе. Навошта тады да мяне казаць гэта.

— Лара!

— Хочаш, каб маўчала? Маўчу, калі табе падабаецца толькі гук свайго ўласнага голасу.

Няслаўскі падступіўся бліжэй да дачкі.

— Ці для таго жывеш ты, Лара, каб ніколі ня меў я радасьці, як іншыя бацькі ад сваіх дзяцей, ці я ня ведаю.

— Я таксама ня ведаю, навошта жыву. Сажы мне.

— Ты ведаеш, чым пахнуць гэтыя твае маёўкі?—выкрыкнуў раптам Няслаўскі.—Ты ведаеш, чаго чакаць можна ад іх?

— Крыку твайго,—спакойна адказала Ларыса.

— Я не дазволю пацяшацца з мяне, я табе ня цацка!

— А хочаш, каб я паддаквала табе ва ўсім. Ды не, у мяне маюцца свае погляды на жыцьцё. Ці можа мне забаронена мець іх?

— Такія—забаронена!.. Я не дазволю!

— І ўваб'еш мне ў галаву сваё?

— Калі патрабуецца, ўваб'ю.

— Ну, гэта мы паглядзім,—варожа ўжо адказала Ларыса бацьку і, адышоўшыся, села на канапе.

— Ларачка,—жаласьліва раптам праказаў Няслаўскі,— Ларачка, ты-ж ня хочаш няславы мне, ты-ж не жадала сьмерці.

Такою бясьсілаю прагучэў яго голас у ночнай цемры, што ў сэрца Ларысе пракраўся няведамы жаль, толькі на кароценькую часінку, бо зараз-жа за ім і нейкая агіда прышла і зацямніла сабою яго. З дрыжучасьцю ў голасе Ларыса праказала, ня стрымалася:

— Тата, які-ж ты брыдкі, каб не сказаць, агідны!

— Нельга так, Лара, казаць на свайго бацьку... Я не дазволю... Я не дазволю... На свайго роднага бацьку.

Ларыса пагардна маўчала. А бацька не пакідаў:

— Твая неразумнасьць загубіць нас, Ларыса, загубіць. Не ўважаючы на тваю маладосьць, а на маю старасьць, не пасобіць нішто, як і наша дваранскасьць. Усім тады напляваць будзе на нас, калі наступіць рашучы час. Лара! Ты яшчэ маладая, ня ведаеш жыцьця. Кожны дрыжыць за сваю скуру, і вельмі мала справы будзе кожнаму да нейкага гласнага земскае ўправы.

— Хіба гэты час ужо прышоў, што ты заплакаў, тата?— абыякава запыталася Ларыса.

— Табе што, ты не клапоцішся, табе думаецца, што ўсё ў жыцьці звабіць можна з аднаго жаданьня. Эх, Лара, Лара!

Здалося Ларысе, што відаць у цемры, як бацька ківае з дакорам сваёю злыселаю галавою. Яна нічога не сказала. Няслаўскі загаманіў ужо цішэй, быццам перайшоўшы грань узрушэньня.

— Я ведаю. Ты скажаш, я збаяўся цяжкасьцяй, пачнеш абвінавачваць мяне ў здрадніцтве маім-жа ідэям і поглядам. Не рабі гэтага, Лара, не кажы, дачка, бо няпраўда будзе яно. Я не збаяўся, а, нагледзеўшыўя на людзей, стаў больш асьцярожным, бо часам ад самага маленькага слова, як плюнуць, гіне чалавек. А ты насьміхаешся, а ты контры строіш мне... Ты слухаеш, Лара?

— Слухаю.

— Хоць раз, паслухай, дачушка,—расчуліўся Няслаўскі,— ня зла-ж, а дабра жадаю табе. Падумай сама, што я павінен быў адчуць сёньня, калі мяне выклікала да тэлефону клясная дама і пытаецца, чаму няма цябе сёньня ў клясе. Што я павінен быў сказаць?

— Ты павінен быў сказаць, што ня ведаеш.

— Ня можна гэтак, Лара, я сказаў, што ты захварэла, што можа ня прыдзеш і заўтра.

— Схлусіў, значыцца.

— Дзеля цябе, дачка, жадаючы табе дабра.

— Гэта твае ідэі гэта?

— Ідэй не чапай, ідэі няўмірушчы, а мае—сьвятыя, непарушныя. Павер мне, свайму старому бацьку, што кожны, хто зьвязаны з політыкаю, той зьвязаны з хітрошчамі. Політыка без хітраваньня—гэта атака ў лоб, Лара, гэта дарэмная трата сілы, гэта, нарэшце, расійска-японская вайна для Расіі,—зусім ціха скончыў Няслаўскі.

— Ты, аднак, сваясаблівы філёзоф, я дагэтуль ня ведала.

— Кепска, трэба, каб ведала. Вось буду я дурань, Лара, успамянеш некалі мае словы, што ў Манчжурыі будзе ліцца кроў дарэмна. Па першай-жа вялікай няўдачы ўрад пакляпоціцца спагнаць злосьць абы на кім. Пад руку пападуцца, бязумоўна, рэволюцыянэры...

— І ты першы, тата.

— Твае сьмешкі не абвяргаюць існасьці, а яшчэ ўзмацняюць яе. Я не выключэньне з агульнага правіла. А тады ты вось засьмяешся, калі твой бацька, дзякуючы табе-ж, надзене на сівую галаву сваю астрожны каўпак.

— „О, мысли мрачные“,—продэклямавала гіронічна Ларыса.

— Маладосьць заўсёды сьмяецца і жартуе. Я табе дарую гэты раз.

— Даруеш? Ці ня гэтак, як даравала табе мама.

— Лара...—гнеў і злосьць пачуліся ў голасе Няслаўскага, і адразу рэзкаю і жорсткаю няпрыветнасьцю падзьмула з цемры на Ларысу.—Ня сьмей казаць мне пра яе, я ня знаю яе больш.

— Які ты харобры, тата, сам-на-сам, як дон-Кіхот у бойцы з нярухомым ветраком. Ты-ж сам прызнаўся нядаўна, што атака ў лоб—пагібель, а цяпер сам атакоўваеш гэтак.

— Сам атакоўваю, нічога не атакоўваю. Не чапай ты імя гэтае жанчыны, не ўспамінай пры мне хоць-бы...

— Ты яе баішся, тата?

— Яна зрабіла брыдка, зрабіла гнюсна, Лара, так як...

— Як, што?

— Не зрабіў-бы ніводзін чалавек.

— Даказвай, тата, я слухаю цябе ўважліва. І прытым не забывай, што я ўжо не дзяўчынка, як ты, можа, думаеш, а дарослая дзяўчына. Чаму яна ня жыве з намі. Ці праўда, што ты ня хочаш гэтага?

— Яна табе сказала гэтак—ня вер, Лара, ня слухай яе.

І ўжо цішэй і глуха, быццам душыла яго вялікае гора, Няслаўскі казаў:

— Твая мама сама пакінула нас. Ёй падабаўся адзін важны царскі чыноўнік, і каб бязлішняга шуму апраўдаць свае скандальныя паводзіны, яна прыстрашыла мне катаргаю за політыку і тым самым купіла сабе сужыцьцё з тым чалавекам.

— Дык, тата, наадварот, значыцца; ня мама даравала табе, а ты ёй. О, як гэта агідна і гнюсна.

— Ты ня ведаеш яшчэ ўсяго, дачка. Я ад цябе хаваў дасюль, але калі прышло да гутаркі, цяпер скажу. Яна ўзяла з мяне слова, што я ня буду ўходзіць надта ў політыку, бо ня хоча, каб ты асталася бяз догляду, а к сабе яна цябе не ўзяла-б ні за якія грошы. Дык вось яна мяне застрашыла і сочыць за мною праз поліцыю, каб на выпадак які...

— Будзе!.. Досыць!—вырвалася ў Ларысы.—Я не магу больш слухаць!

— Ты ня ведала, чаго варты людзі. Ты ня ведала, што яны такое, Ларыса... дачушка мая,—расчуліўся зноў Няслаўскі, і сьлёзы пачуліся ў голасе.

Жаль падышоў украдкі ў цёмнай спальні да Ларысы,—шкада зрабілася бацькі, і яна сарвалася з канапы і падбегла да яго. Няслаўскі стаяў цяпер у кутку, схаваўшы галаву ў рукі.

— Тата!.. даруй мне, тата, што я была гэткаю з табою! Я цябе лепш буду любіць за маму. Я... я ня люблю яе цяпер! Я... тата... Пакінь. Я ненавіджу яе і таго бязьлітаснага чалавека, якому захацелася разьбіць твой сямейны спакой.

Гаворачы гэтак, яна абняла бацьку і схавалася галавою ў яго на грудзёх. І на шчаку ёй упала нешта цёплае і мокрае. Яна дагадалася: гэта былі бацькавы сьлёзы.

— Пакінь, татачка. Я шкадую цябе, люблю,—як маленькае дзіцянё загаманіла яна, адчуваючы, што з кожным такім словам жаль прыбаўляцца ў сэрцы.

Паступова пад спагадным уплывам даччыных слоў і пяшчот яе тонкае ручкі пачаў супакойвацца Няслаўскі. Пачалі адплываць нахлынутыя з няпрыемнага мінулага ўспаміны,—мусіць добра было адчуваць, як шкадуе і песьціць дачка. Сардэчнае бясьсільле прамінула. Няслаўскі пагладзіў гарачую даччыну шчаку і ціха, але надаючы бадзёрасьці гаворцы, сказаў:

— Лара, скончана. Паміж нас нічога ня было. І калі можа я быў ня добры з табою, дык гэта ад шкадоўлі, таму што жадаў і жадаю дабра табе. І памятай таксама: я нічога не казаў табе пра маму.

— Я разумею, тата. А цяпер пойдзем спаць, я натамілася гэтак за дзень.

— Праўда, Лара, я дурны, затрымаў цябе позна. Кладзіся, дзіця, адпачывай.

Ён пацалаваў дачку ў лоб і пайшоў у дзьверы.

— Спакойнае ночы, тата!—гукнула ўздагон Ларыса.

Застаўшыся адна ў спальні і падышоўшы к акну, доўга яшчэ глядзела яна ў цёмную вясновую ноч, напоеную прыемнымі пахамі распукнутых дрэў ды ліпкаю тумановаю вільгацьцю. Адале, калі ўладная змора перамагла нарэшце, яна зачыніла акно, павольна распранулася і кінулася ў мяккія абдымкі спружыновага ложка.

Хутка сон, вялікі, магутны сон, нячутным датыркненьнем зачыніў ёй вочы.

Ходзіць сон уначы вялікі, магутны, нікому не падлеглы, усё жывое сабе падпачальвае, пра ўсё чуе, усё бачыць.

Ларыса ўжо спала, роўна і лёгка дышучы на пухкай падушцы, ня чула.

Цвыркун зацвыркаў нясьмела—ціха на дварэ недзе, а за ім дрымотна спакойную ноч успалошыў раптам на хвіліну гулкі стрэл. Далёка на канцы гораду папрачыналіся сабакі, забрахалі. Нехта праехаў з лёскатам конна па бруку, і потым аціхла зноў усё...

Ларыса не прачнулася. Сон моцна трымаў яе ў сваіх жаданых абдымках.

## *ЗАБОЙСТВА ЎНАЧЫ*

НЕСПАКОЙНА спалася Любе тае ночы. Розныя сны вярзьліся-то страшныя, жудасныя, то радасныя, прыгожыя. Сьніла Ларысу, Ігнася, Арона, Агапу, Няслаўскага, бацькоў Іваніцкага, Юркевіча. Недарэчнага шмат было ў іх. Няслаўскі жаніўся з Агапаю. Ларыса ўцякала ад яе з Ігнасём. Арон выскаляўся з Іваніцкім, а яна аставалася сам-на-сам з Юркевічам. Юркевіч прызнаваўся ў каханьні. Яна не адказвала нічога. Юркевіч нахабна лез цалавацца, вось бліжэй і бліжэй ужо яго галава, ужо адчуваецца палкае дыханьне... Люба зірнула і закрычала. Замест чалавечае галавы на плячох у Юркевіча галава вужакі з высунутым далёка ўперад джалам, гойдаецца, як былінка на ветры. Потым аднекуль чутна была музыка,—як-бы праз туман далятала, як-бы тут вось яна за тры крокі, а няма нідзе. Адале Арон скакаў з Ларысаю пад музыку невядомае капэлі, а Ігнась сядзеў доле з Вераю Сасноўскую і пазіраў на Ларысу. Тады да Любы падышоў Няслаўскі і прасіў пашкадаваць яго

І хутка Няслаўскі зрабіўся за вялікую асобу. Люба прасіла, каб ён пахадайнічаў прыняць вучыцца ў гімназію яе бацьку.

Шмат недарэчнага насьніла Люба за даўгую яшчэ, вясновую ноч. І калі ўстала, дык узрадавалася, што гэта было ўсё толькі ў сьне.

Не пасьпела яна адзецца, як у дзьверы пастукалі.

— Хвілінку пачакайце, я зараз.

Апранаючыся, яна зірнула ў акно. На дварэ быў туман, густы-густы вясновы туман, які рэдка калі бывае ўвесну такі.

— Гэта я, Люба,—абазваўся за дзьвярыма голас.

— Ах, Мар'я Пятроўна... зайдзеце, калі ласка.

Увайшла гаспадыня.

— Страх адзін, Любачка мая, што робіцца!

— Што? Што, Мар'я Пятроўна?

— І язык ня вернецца, чаго ніколі де даводзілася ні чуць, ні бачыць на сваім жыцьці.

— Вы напалохалі мяне, Мяр'я Пятроўна.

— Дый ёсьць чаго палохацца. Сёньня ўначы забілі Юркевіча.

— Як?.. Што?.. Хто?..—пыталася зьбянтэжная Люба, сама не ўяўляючы ўсяе трывогі запытаньняў.

— Што гэта робіцца, дарагая мая,—спусьціўшы сівую галаву на далонь, прыказвала гаспадыня.

— Мар'я Пятроўна, вы чулі ці бачылі? Раскажыце.

— Чула, Любка.

— Дык мо' яшчэ і няпраўда?

— Праўда, дарагая, праўда. Суседка бачыла, кажа, ляжыць у кватэры, а галава ўся ў крыві, прастрэлена. Толькі гарадавыя нікога блізка ня пушчаюць, каб паглядзець.

— Ну, і ведаюць хто?

· Не. Кажуць, сьледзтва вядуць. А хто ўжо там пападзецца, бог яго сьвяты ведае.

— А гаспадары хіба ня ведаюць?

— Можа і ведаюць, ды, бач ты, паліцыя забараніла ім гаварыць гэта, каб ня ўцёк забойца, каб ня мінуў кары людзкое.

— Загадкавае забойства.

— Што робіцца, што дзеецца на сьвеце,—паківала галавою старая і пайшла ў свае пакоі.

„Юркевіч забіты... Хто забіў, за што—ня ведаюць", прамільгнулася ў Любы, калі яна шпарка-шпарка заплятала косы. Вестка выбіла яе з нормальнае каляіны штодзённасьці.

— Чай піць будзеце, Люба?—запыталася з кухні гаспадыня.

— Ня хочацца, Мар'я Пятроўна.
— Ці дзіва,—прарыпела старая.
Люба надзела капялюшык, узяла пару кніжак і шпарка пабегла ў гімназію. Прышла мо' за паўгадзіны да заняткаў. З таварышак ня відаць было яшчэ нікога. Хвілін праз дзьвацаць ужо падышлі Сасноўская, а потым і Ларыса. Люба пасьпяшыла сказаць ім пра здарэньне.
— Ты жартуеш, Люба?!
— А можа ня выспалася добра пасьля ўчарашняга—сказала Ларыса.
— Сама ты ня выспалася, Лара.
— На ліха ён быў патрэбен каму.
— Вось і я гэтак думала.
— Не, гэта праўда?
— Ня буду-ж я бажыцца. Сама, вядома, ня бачыла, мне пераказала гаспадыня, а той казала суседка,—сама на свае вочы бачыла.
За дзень чутка расплылася на ўсю гімназію і забойства Юркевіча зрабілася сапраўды сэнсацыйным здарэньнем. На пераменках толькі і гутаркі было, што аб ім. Спрытнейшыя і рухавейшыя з дзяўчат знаходзілі нават забойцу а, знайшоўшы, прыдумвалі самую жорсткую кару. Шум і гоман, ціхі, прыціснуты, стаяў на даўгім калідоры праз увесь час заняткаў.
Пасьля заняткаў адразу Ларыса запрасіла Любу да сябе. Тая згадзілася і абедзьве пасьпешна пакінулі гімназію.
— Папалуднуеш сёньня ў нас,—сказала ідучы Ларыса.
— Чакаць толькі дарэмна будзе мая Мар'я Пятроўна.
— Няхай пачакае.
Няслаўскага дома ня было, ня прышоў яшчэ са службы. Дзяўчаты вышлі ў сад, паселі на тэй плеценай лаўцы, дзе некалі сядзелі летась увосені Ігнась з Ларысаю.
Навакол лаўкі зазелянеў ужо маладым лісьцейкам маліньнік, пачаў цьвісці. Аднекуль наляцелі пчолы, папрыляталі камары.
А неба-ж сіняе, сіняе. Бясконца хочацца глядзець, адкінуўшыся на сьпінку лаўкі ў яго недасяжна-далёкую вышыню. А заплюшчыўшы вочы, яшчэ лепш, прыгажэй і бадзёрай: плывеш, здаецца, па ружова-блакітных хвалях павольна, далёка, бяз клопату. І там, дзе павінна біцца без пярэстанку да самое сьмерці чалавечае сэрца, раптам ускрывае вялізнымі гнуткімі крыламі магутная сьветлая птушка і месца, здаецца, няма ўжо ёй там, не стае волі, прастору для размаху яе крылам, і хоча, быццам, яна вырвацца і паляцець-палысьці па вясновым моры паветра і сонца. Высока, высока ўгары, пераліваючыся пад сонцам серабром

белых, як сьнег, крылаў, праляцела кучка галубоў. Спрадвечныя жыхары гарадзкіх ускраін лёгка і сьмела шугалі па роднай стыхіі, вітаючы быццам вясну, як сваё вызваленьне. Адна за аднэю пізуюць чыстае неба лёгкакрылкі-ластаўкі. Ва ўсім здаволенасьць, на ўсім радасьць жыцьця.

Дзяўчаты сядзелі моўчкі і сузіралі. Ад сузіраньня моўчкі гэтак хораша на сэрцы, гэтак добра адчуваць суголосьсе яго рытму з рытмам прыроды, магутнае, бязьмежнае. Ніводная не асьмельвалася перарваць маўчанку, бо і патрэбы ў тым ня было зусім. Сядзелі, дыхалі яблынавым моцным пахам, сузіралі вясёлыя фарбы абуджанага вясною жыцьця.

Неўзабаве да дзяўчат прышоў і Няслаўскі.

— Ну, дзеці мае, вясна!.. Прырода абудзілася да новага жыцьця. Глядзіце, так і льлецца, аж праз верх, сакавітае, пышнае.

— Ніколі ня думала я, што ты, тата, поэта.

— Эх, дачка, ды гледзячы на вясновую раскошу і прыгажосьць, жывёліна будзе той чалавек, хто ня ўславіць яе.

— Ты наогул, тата, любіш філёзофнуць і адшукаць Амэрыку, там, дзе можа яе і няма.

— А ты ўжо і напала на мяне. Загаманіў я пра вясну і прыроду дарэчы, толькі вы ніводная не даўмеліся. Гледзячы на раскошу аднаўленьня жыцьця, на яе магутны рост, на яе моц, нельга, каб не запытацца, як пойдзе ваша жыцьцё.

— А мы і не зразумелі вас,—сказала Люба.

— Канчаючы вучэньне, вам трэба падумаць, на якую вопратку вы зьменіце вашы дзявоцкія гімназійныя сукенкі, вось што.

— Праўда, як яно сустрэне нас, маладых малавопытных,—праказала Люба.

— Менш, Люба, мінорнае музыкі, а больш сьмеласьці, тады не заўважым нават, як яно надыйдзе.

— Я згодна. Бяз рашучасьці дык лепш і ня ўступаць на жыцьцёвыя сьцежкі.

— Эх, вы, моладзь, моладзь, ды кіньце вы свае пахмурыя думкі! Весялей трэба глядзець у жыцьцё, вы-ж толькі жыць пачынаеце, і не павінны думаць пра гэта.

— Хто яго ведае,—сказала Люба.—Глядзіце, вось Юркевіч можа і ня думаў нічога, а прышла раптам, неспадзявана сьмерць.

— Ты ўжо ведаеш, тата?—запыталася Ларыса.

— Чуў. Гэта такое мудраваньне, бачыце: слабы, ня маючы моцы змагацца з дужым, моцным, адным, як плюнуць, абрывае жыцьцё яго. Тут такая лёгіка.

— Зноў філёзофія,—заўважыла Ларыса.

— Вы для кожнага выпадку знаходзіце сваё філёзофскае абгрунтаваньне,—сказала Люба.

— Праўда, кожнаму здарэньню павінна быць свае жыцьцёвае тлумачэньне.

— А мы, тата, ня будзем шукаць яго. Давай лепш знайсьці тлумачэньне нашаму будучаму.

— Вы павінны пасобіць нам, дзядзька Няслаўскі. Старасьць-мудрасьць, гаворыць спрадвечная народная прыказка.

— Ці ведаеш, тата, мы ўмовіліся з Любаю абавязкова пайсьці ў настаўніцы.

— Цяпер гэта самая ўдзячая работа, несьці сьвятло народу, разганяць цемру і невуцтва тысячаў і мільёнаў людзей,—сказала Люба.

— Мы спадзяемся, што ты нас уладуеш дзе. Сам падумай, што мы варты бяз чужое дапамогі,—пажартавала Ларыса.

— Зусім маленькія дзеткі,—зарагатаў Няслаўскі.

Зарагаталі весела і Люба з Ларысаю.

— Дык ладна, дзеткі, абяцаю, уладжу, пакуль маю хоць які грунт пад нагамі ў людзях. Толькі канчайце хутчэй ды лепш са сваёй гімназіяю, а я ўжо паклапачуся. Хадзем папалуднаваць.

Люба папалуднавала з Няслаўскімі і праз нейкі час разьвіталася.

Ідучы паўз гарадзкі сад, яна сустрэлася з Ігнасём.

Ішоў ён з работы, брудны, чорны ад куродыму, абшарпаны.

Люба першая загледзела Ігнася. Той быццам і не глядзеў у бок яе. Ідучы паўз сад, пазіраў ён праз шчыліны ў плоце, як публіка зьбіралася пад вечар на лавачкі, як гулялі па сьцежачках павольна пары. Ці мо' сапраўды ня бачыў ён Любы, ці мо' і не хацеў бачыць. Але Люба паклікала яго і радасная ад узбурэньня, якое выклікалася абяцанкаю Няслаўскага, падышла, прывіталася.

— Нечспадзявана мы ўсё сустракаемся,—сказаў Ігнась.

— Бо ты ж ня хочаш іначай.

— Бачыш, я толькі з работы, брудны які, а ты чыстая, маёвая такая.

— Ня сьмейся, Ігнась, няўжо табе гэтак карціць супярэчыць, калоць?

— Ды не, я без усялякае такое думкі, а проста, што думаю. Ну, як у вас пасьля маёўкі?—азірнуўшыся, запытаўся ён.

— Нічога, кінь ты, Ігнась, маёўку. Вось пра забойства чуў?

— Юркевіча? Казалі ў нас. Але тут ня варта гаварыць. Наогул пра такія справы на вуліцы не гамоняць.

— Чаму ты не заходзіш гуляць? Ты стаў зусім нейкі нядобры. Напэўна, каб ня гукнула сёньня, дык не пажадаў бы заўважыць. Хутка разьвітаемся надоўга, а мо' і зусім,— з крыхою суму сказала Люба.

— Чаму разьвітаемся?—зьдзівіўся Ігнась.

— Таму, што хутка скончу гімназію, а там... у сьвет пайду.

З гэтымі сумнымі словамі адзінота насунулася на Ігнася і ўсё вакол імгненна памізарнела; зрабілася чужым, незнаёмым.

— Дык нельга ж казаць, што разьвітаемся зусім. Ты-ж на тое і вучылася, каб у сьвет ісьці,—узбадзёрыўся Ігнась, намагаючы прагнаць гэты сум адзіноцтва.

— Хто яго ведае, яшчэ як трапіцца. Калі пашлюць настаўніцаю куды ў глуш, дык ня вельмі ўбачышся.

— Я прыеду да цябе, Люба. Не прагоніш?—павесялеўшы, пажартаваў Ігнась.

— Прагаію, конча праганю. Лепш ня прыходзь,—жартам адказала Люба.

## НАВАКОЛ ЗАБОЙСТВА «ШЭРЛОК ХОЛМС» І АКАЛОДАЧНЫ

ДЗІЎНАЕ нешта адбывалася на Раманаўскай вуліцы каля дому № 10. З самае раніцы найшло туды гарадывых, а за імі наплыло і публікі. Нейкі цывільны, што прышоў разам з акалодачным назірацелем, распарадзіўся акружыць гарадавымі дом.

У доме ляжаў забіты Юркевіч. Сьмерць наступіла імгненна, як сказаў паліцэйскі доктар. Забіты, як сядзеў на дубовым крэсьле, дык так і застаўся, толькі галава адкінулася назад і крэсла падплыло кроўю.

Тымчасам, як доктар з цывільным і акалодачным аглядалі забітага і пакой, публіка валам валіла на гарадавых. Каго ня цікавіць гэткае здарэньне.

Ужо адзін гарадавы прыбег да начальства.

— Гаспадзін акалодачны, ня ведаем што рабіць, хоць махалам махай на іх.

— Што за махаламі... махалам... махалам... Нажнамі! Нажнамі іх у пуза!

— Гаспадзін акалодачны, баба адна тут да гаспадароў прайсьці просіцца.

— Баба. Што ёй патрэбна?

— Дробязь, гаспадзін акалодачны, чай некалі пазычала, сыскаць хоча.

— Чай, гаворыш? Ага. Пусьці, чорт з ёю

— А ежалі, гаспадзін акалодачны, больш будуць за патрэбамі якімі—што загадзеце?

— Пускаць, толькі ў доме няхай застануцца да распараджэньня. Можаш ісьці.

— Слухаю, гаспадзін назірацель!

Не ўважаючы на ўсю грубіню свае комплекцыі, гарадавы лёгка павярнуўся і кінуўся пасабляць ланцугу гарадавых, якія і бяз рады акалодачнага ўжывалі ня толькі „нажнамі ў пуза", а і нажнамі ў зубы. Пасланец зараз-жа растлумачыў загад начальства і дзьве ці тры бабы былі ўпушчаны ў дом.

Гаспадыня сустрэла іх на кухні і пачала апавядаць пра ўсе дробязі хатняга няшчасьця. Дзе-ж вы бачылі, яшчэ гатовы на яе з чалавекам скласьці. Па пятаму ды па дзесятаму разу пераказвала яна—як лягла ўжо спаць, а кватаранец сядзеў—пісаў нешта. Потым у дзьверы пастукалі; сам Юркевіч адчыніў і ўпусьціў госьця. І пакуль заснула, дык чула, што ў кватаранца моцна гамонілі, бо аж цераз калідор чуваць была іхная гамонка. Нарэшце, прабудзіў нейкі грук, але, раздурбаўшыся і не пачуўшы нічога больш, яна зноў заснула. Толькі надосьвіткам—пачало гэта разьвідніваць—прачнулася. Ну, захацелася на двор выйсьці зірнуць, ведаеце; на дварэ заўважыла, што ў кватаранца адчынена акно і сьвятло гарыць.

— Дык, мае-ж вы любачкі, што я ўбачыла, падышоўшы к акну, што-б я так і жыла, ногі памлелі.

Апавядала ня спыняючыся гаспадыня, раз по-разу ўстаючы і на практыцы паказваючы, як гэта ўсё ўбачыла.

Акалодачны назірацель вышаў на калідор.

— Эге! Надта жвава на кухні гамоняць. Паглядзім, паглядзім...

Дзьверы на кухню прачыніліся, каб упусьціць невялічкае, але едкае начальства. Гаспадыня скончыла апавядаць сваім „любачкам".

— Гэт што такое?—зароўла начальства.—Гэт па чай прышлі? Гэт за патрэбаю? Гэроп-п-п!.. Каб і смуроду вашага не засталося.

Адна ня надта спрытная „любачка", не пасьпеўшы прабегчы наперад, дастала ў пульхны зад лякіраванага назірацелевага чобата. Покатам вылецелі бабы на двор і вэрхал узьнялі каля гарадавых. Назірацель вышаў зірнуць. У вочы яму кінулася сумятня на вуліцы.

Бабы грэйма напіралі на ланцуг гарадавых, каб выскачыць і ўцячы ад літасьці акалодачнага, а гарадавыя цьвёрда памяталі пра загад начальства і старанна тыцкалі „нажнамі ў пуза“ бабам. Тыя вісчэлі і візгатня іх мяшалася з трубнымі галасамі гарадавых.

— Што за непарадак!—крыкнула начальства, зьявіўшыся на ганку.

Шум і лемант сьціх.

— Лезуць, гаспадзін назірацель, а пушчаць не загадана. Ну і ня пушчаем.

Бабы падбеглі да акалодачнага і зараўлі:

— Гаспадзін акалодачны, хлусяць яны, кручкі.

— Кручкі... Вось я вам накручу!

Забыліся дурныя, што пры назірацелю так кажуць, распусьцілі языкі.

Канчук начальства са сьвістам разрэзаў паветра і разлупіў на бабе сінюю ў кропачкі спадніцу. З голасам кінулася баба назад да гарадавых. Там зноў сустрэлі нажнамі.

А акалодачнае начальства рызындавала на ганку:

— Я вам накручу, сьцервы!.. Я вас у барановы рог пакручу! Пусьціць к чортавай матары!—крыкнуў ён, нарэшце, гарадавым.

Бабы, як падмеценыя, паляцелі па вуліцы. Публіка, што напірала раней на гарадавых, убачыўшы ў гразе начальства і расправу з бабамі, адхлынула на бясьпечную адлегласьць ад дому.

Але гэтым ня скончылася. Грознае начальства паслала да спраўніка гарадавога і праз дзесяць хвілін перад коньмі стражнікаў, як боб, сыпала публіка. Канчукі падалі цяжка на плечы, на галавы, не глядзелі ні вока, ні бока.

Умэнт ачысьцела вуліца і за ланцугом гарадавых на абодвух канцох вуліцы пасталі дзьве жывыя сьцяны коняй-людзей.

— Так іх!.. Так іх, сьцервяцоў чаго паналазілі,—уздымаў і апускаў моцна руку з канчуком акалодачны.

А пасьля, як публіку загналі на сваё месца, на вуліцу вышаў з кватэры цывільны. Колькі часу пастаяўшы перад ганкам, ён зірнуў чамусьці на неба, потым пад ногі сабе, пацмокаў, стаў на каленцы ў пыл і папоўз паўз тротуар па вуліцы. Акалодачны назіркам ішоў за ім. Цывільны прыпыніўся, падняў нешта з долу, панюхаў. Акалодачны ўзрадавана запытаўся:

— Нашлі? Нашлі, Яўгень Пятровіч?

— Балван,—ціха адказаў той —Слухайце, гаспадзін назірацель, ня з вашаю галавою ўнікаць у гэтыя справы. Глядзіце лепш свайго акалодку.

З гэтымі словамі цывільны паглядзеў праз лупу на знахадку і, злосна кінуўшы, папоўз далей. Акалодачны падышоў, падняў кінутае.

— Фу, ты, госпадзі,—прашаптаў ён, і ў сваю чаргу кінуўшы, што кінуў перад тым цывільны, адвярнуўся, і неўзаметку, каб ня бачылі гарадавыя, выцер з задняе кішэні насоўку, папляваў на пальцы, абацёр рукі.

— Зьбірайце, зьбірайце, паважаны Яўгень Пятровіч, на гэтай вуліцы цэлы тыдзень трэба поўзаць, каб пазьбіраць усё, што не замялося за месяц. Сьвіньні добра напэцкалі, як ведалі, што вы будзеце поўзаць тут. Так, бяда з іхнымі сьвіньнямі,—думкі акалодачнага ўзялі новы ход:—увесь акалодак брыдзяць. А і вуліца-ж, Раманаўскаю называецца. Абраза адна...

Плыўка пацяклі назірацелевы думкі напрамкам навядзеньня парадку на Раманаўскай вуліцы. Мерка праходжваўся ён узад і ўперад перэд застыўшымі на вачох начальства гарадавымі. Прачнуўся з думак толькі тады, калі гарадавы, што без усялякага посьпеху стараўся ўзяць на сябе ўвагу начальства, ідучы ззаду, забег наперад і гаркнуў:

— Гаспадзін акалодачны!

— Ну, чаго горла дзярэш?

— Гаспадзін акалодачны,—цішэй ужо праказаў гарадавы, спужаўшыся.

— Што табе?

— Гаспадзін акалодачны!.. Так што ў сад клічуць гаспадзіна акалодачнага!

— Памятай, брацец, з аднаго разу трэба коратка і ясна выказвацца.

І, правёўшы строгім вокам па гарадавых, акалодачны зайшоў у сад.

Тутэйшы „Шэрлок Холмс", (бязумоўна гэта ён быў) стаяў пад акном кватэры забітага і трымаў у руцэ шматок сіняе крамніны.

— Гаспадзін акалодачны... Я ніколі не сумняваўся. Пастаўце двух вашых людзей вартаваць гаспадароў дому. Ды глядзіце ў мяне... што якое, галавою, сваёю ўласнаю галавою адкажаце. Нікуды ня пушчаць з дому і ў дом нікога.

— Яўгень Пятровіч, як-жа ня пушчаць з дому, а як ім да ветру захочацца.

— Да ветру,—перакрывіў „Шэрлок Холмс",—выказвацца па-благароднаму ня ўмееце, а яшчэ акалодачны назіращель. Пад шашкаю выводзіць.

— Слухаю,—адказаў нездаволена абражаны акалодачны і блінсуў на сонцы лякіраванымі ботамі.

Завылі ваўкамі на кухні гаспадары.

— Маўчок! Вы думалі забіць чалавека, дык гэта жартачкі! Паглядзім вось.

І акалодачны, даўшы жорсткі загад вартавым, пакінуў кухню і перастуціў у пакой забітага.

З рэчамі нябожчыка быў поўны непарадак. На стале, дзе ляжала парожная бутэлька ад гарэлкі, валялася асадка, лісток паперы напісаны зьверху папаў пад шклянку. Гэты лісток заўважыў акалодачны назірацель. У гэткай справе, як забойства магла згадзіцца ўсякая дробязь, ці мала забойстваў выкрыты проста выпадкам. Назірацель узяў лісток і прачытаў:

— Яго высокаблагародзію, гаспадзіну (не пастаўлена). Данясеньне.—„Эге“, падумаў ён, і высунуўшыся ў адчыненае акно, ядавіта гукнуў:

— Яўгень Пятровіч, ня там вы шукаеце. Зірніце вось... Лісток паперы паляцеў пад ногі „Шэрлоку Холмсу“.

— Гаспадзін акалодачны назірацель, за другім разам кажу вам: наглядайце, ці чыста на вуліцах вашага акалодку. Іншы раз яно можа і добра лезьці, дзе вас ня просяць, але толькі ня тут. Прашу вас, гаспадзін акалодачны назірацель, пакінуць пакой, а мне не мазоліць воч сваёю пэрсонаю. Іначай—хутка будзе прыстаў, каб скласьці протокол пра забойства і, будзьце спакойны, ваша імя належным парадкам умесьціцца ў протоколе. Папера, ведаеце, гэткая рэч, яна ўсё выцерпіць на сабе.

— Яўгень Пятровіч, ну што вы, вунь лепш зірніце, ззаду ў вас ляжыць другі сіні шматок.

Позіркам, які-б здаецца, чалавека загнаў пад зямлю, „Шэрлок Холмс“ зірнуў на акалодачнага, але той і ня зморшчыўся.

— Гаспадзін акалодачны, гаспадары пад вартаю?

— Ваш загад выкананы.

— Вы, мусіць, ня чулі, ці дазволілі сабе ня чуць, як я сказаў вам, што іх можна вызваліць, толькі ня пускаць нікуды з дому.

— „Шэрлок Холмс“,—выходзячы, мармытаў сабе пад нос акалодачны назірацель,—лепш-бы пакорпаўся тут у пакоі. Ыш, як кніжкі ды паперкі параскіданы. Напэўна нехта лазіў у іх, шукаў сабе нечага. А ён—сышчык, сышчык—разумным людзям галовы дурыць. Знаем вас, паважаны, ды паглядзім яшчэ.

Варта была зьнята з кухні. Гаспадары павесялялі і кінуліся дзякаваць акалодачнаму.

— То-та-ж, глядзіце вы ў мяне.

Неўзабаве прыехаў прыстаў. „Шэрлока Холмса“ паклікалі ў пакой.

— Ну, Яўгень Пятровіч, як вашы справы з забітым?

— Гаспадзін прыстаў у протокол набходна будзе ўключаць мае паказаньні аб папярэднім дасьледваньні. Я адшукаў.

— Шматок сіняе крамніны,—утавіў акалодачны назірацель.

— Гаспадзін прыстаў, у протоколе, каб не забыць упісаць: гаспадзін акалодачны назірацель увесь час перашкаджаў у маёй рабоце.

Акалодачны спалохана сьціснуўся.

— Вы пра само забойства, Яўгень Пятровіч,—перапыніў, скрывіўшыся прыстаў.

— Дык вось, каб гаспадзін назірацель патурбаваліся і своечасова ўжылі належныя меры ды не падпусьцілі зусім публікі, забойцы былі-б знойдзены.

— Значыць, няма іх?

— У садзе напаў на сьляды трох чалавек: два пералезьлі цераз плот, а трэці вышаў у варотцы на суседнюю вуліцу. А на вуліцы многа сьлядоў нарабілася, пазаціралі.

— Пішыце,—загадаў прыстаў.—Хто ж, па-вашаму, забойцы?—зьвярнуўся ён да „Шэрлока Холмса“.

— Няма забойцаў, іх пакуль што не знайсьці.

— Ваша кар'ера. Яўгень Пятровіч...—пачаў прыстаў, але „Шэрлок Холмс“ перапыніў яго:

— Паколькі гаспадары ня могуць ня ведаць, як адбылося забойства і хто мае дачыненьне да яго, прапаную іх арыштаваць і да сьледзтва засадзіць у астрог—пасобіць.

— Гэта ня надта будзе, слухайце?

— Найбольш радыкальны спосаб выкрыць загадкавасьць забойства.

— Пішыце,—загадаў зноў прыстаў.

Акалодачны назірацель сядзеў збоку і, моўчкі слухаючы, саркастычна ўкрадкаю ўсьміхаўся сабе ў рыжыя вусы.

Гаспадароў дому прывялі на допыт.

Мо адзінаццатым разам расказвала гаспадыня, як яна заснула, прачнулася, як ёй захацелася выйсьці зірнуць на двор і яна ўбачыла праз адчыненае акно забітага. Апавядаў і гаспадар, чалавек бязьдзетнае мяшчанкі, апавядаў пра ўсё тое, што перад ім сказала жонка.

— Досыць, ясна,—вывеў сваё рэзюмэ прыстаў.—Дык вы намагаецеся, Яўгень Пятровіч?

— Гаспадзін прыстаў, я выказаў сваю прапанову. Ваша права прыняць яе ці адхіліць.

— Ня будзем спрачацца, Яўгень Пятровіч, мяне дома чакаюць людзі. Ізвольце падпісаць. І вы, гаспадзін акало-

дачны. Так. А цяпер перадайце арыштаваных гарадавым і пры гэтай паперы накіруйце ў турму.

Гвалтстаў у доме, плач, енкі, голас арыштаваных гаспадароў. Не ўважаючы на ўсю шчырасьць іхнага гора, не зьлітаваліся паліцэйскія экспэрты па выкрыцьці забойстваў, арыштаваныя былі заведзены ў турму.

А акалодачны мармытаў, адсылаючы гарадавых:

— Дападзеш, галубок, наскочыш. Ыш, Шэрлок Холмс знайшоўся. Паглядзімо.

Праўда, мармытаў ён гэта ня з прычыны арышту гаспадароў, ён і сам арыштаваў-бы іх, не падабалася яму самаўпэўненасьць Яўгень Пятровіча і адсутнасьць людзкое павагі, да акалодачнага дарэчы.

У прывезеную труну паклалі труп і адправілі ў трупельню пры гарадзкой больніцы, а на дом прыстаў наляпіў пячатак, не прамінуўшы ніводнага акна. Ціха стала на Раманаўскай вуліцы.

Увечары ўжо толькі пазьбягаліся да дому № 10 усе суседзі: зьвярнуліся засаджаныя ў турму гаспадары. Вызвалілі іх,—чаму і як ня ведаюць, бо на іх месца па справе нікога не пасадзілі.

Так і асталося невядомым, хто-ж такі забіў Юркевіча.

## *ШТО Ў КАГО БАЛІЦЬ, ТОЙ АБ ТЫМ І ГАМАНІЦЬ*

ЮЗІК сваімі паводзінамі наклікаў падазрэньні. Узяць хоць-бы з таго, што на работу ў бляхарню стаў хадзіць заўсёды п'яны, а часта і пазьніцца. Ап'янеўшы, ён быў груба-вясёлы, надсьміхваўся з таварышоў, а работу рабіў абы. Заўважыў гэты непарадак Зусь і спрабаваў пагаманіць, як раней, па-гаспадарску, але той гэтак адказаў, што Зусь парашыў лепш не чапаць яго. Бывалі дні, Юзік прыходзіў цьвярозы. Тады праз увесь дзень старанна рабіў сваю работу, ня ўздымаючы ні на кога воч. У такія дні ад вясёлага жартаўніка і басяка, якім ён быў у нутрох, ніхто ня чуў ніводнага слова.

Аднаго разу пасьля такога маўклівага ціхага перапынку Юзік прышоў нашчэнт п'яны. Калі Зусь наважыўся сказаць яму, каб не станавіўся на работу, дык той раптам вызьверыўся. Зусь адскочыў у куток, бо ў руках у Юзіка апынуўся кавалак жалеза. Рабочыя паадскаквалі. А Юзіка як-бы штурхала што благое на рашучыя ўчынкі. Размахнуўшыся

з усёю сілаю, гакнуў ён кавалкам жалеза па калясе дрылявога варштата. Пасыпаўся па майстэрні звон жалеза і чыгуну. Не пасьпелі апамятацца хлопцы і гаспадар, як руйнавальная работа адбылася. Чыгуннае калясо зьляцела з свае воські пакалечанае, з пабітым кругам і пакрышанымі сьпіцамі.

— А гвалт, ратуйце!—загаласіў прыкра стары Зусь з-за плячэй рабочых.

Адказам на яго лемант адбылося ўжо другое. Зноў, перш чымся хто пасьпеў дагадацца і ня даць, Юзік ухапіў дзеравяны малаток і пачаў малаціць вокны. Тады на яго напалі ззаду, схапілі за рукі, вырвалі малаток.

— Чаго закрычалі?.. Зусь раве, няхай. Гэта яму шкода... А вам што? Што вам? І скончана!.. Калі вы хочаце, ня буду больш. Я думаў, што і вы за гэта. Аж не... добра... Ня буду... Я думаў, вы хочаце сьмерці крывапіўцам... аж не...

— Ай, хлопчыкі!... Дзеньце вы яго дзе,—прасіў ззаду Зусь.—Два гарцы гарэлкі будзе, зьвядзіце яго з маіх воч.

Юзіка пачалі прасіць, каб ён пайшоў дадому ды паспаў трохі.

— Вы ня хочаце... ага, вы ня хочаце!..—зазлаваў ён раптам зноў. А потым прыціх, загаманіў п'яным голасам цішэй:—І ня трэба... Спаць пайду, гуляць пайду, калі ня хочаце... Я думаў, што зраблю вам добра... а вышла не... Ніц не парадзіш... Бывайце, калі так...

На шум і гвалт прышоў у бляхарню гарадавы.

— Гэта што за парушэньне цішыні і парадку?—грозна вырачыўся ён на рабочых, якія хацелі хутчэй выпіхнуць Юзіка, каб той не зьвязаўся з гарадавым.

Зусь падбег спрытна і сунуў у руку „блюсьціцелю" парадку залатоўку. Адчуўшы, што на гэтай справе зарабіць можна, калі ўжыць патрэбныя меры, гарадавы схаваў „мзду" і, расштурхаўшы рабочых, дайшоў да Юзіка. Прывыклае вока вулічнага „кручка" адразу ўхапіла, што нарабілася ў бляхарні і хто таму вінаваты.

— Ой, гаспадзін гарадавы, забярыце яго з сабою... Забярыце з сабою, я жыць яшчэ хачу,—бегаў ззаду ў гарадавога Зусь.

Гаспадзіна гарадавога ня трэ' было больш прасіць. Залатоўка зрабіла сваю справу. Цьвёрдаю паліцэйскаю рукою, як і належыць, ен адапхнуў рабочых і ўзяў за каршэль Юзіка.

— А ну-тка, малойчык любезны, у часьць пайшлі.

Як гарачага прыску ўссыпаў хто на Юзіка. Хоць добра п'яны быў ён, але на нагах стаяў моцна. Упнуўшыся, ён гэтак тузануўся, што гарадавы, які не чакаў такога „фартэлю" ад п'янага, астаўся стаяць, як стаяў, з кавалкам пад-

ранае кашулі ў руцэ. Потым, ухапіўшы нейкую снасьціну, Юзік з усяе сілы так бухнуў гарадавому, што той выкаціўся покатам на двор. Юзік скочыў за ім, спатыкнуўся на гарадавога і таксама ўпаў.

Першы ўскочыў гарадавы, адбег на вуліцу і пасьвістаў у сьвісьцёлік. Праз хвіліну два гарадавых з двух канцоў падбеглі і пацяглі пад рукі Юзіка ў часьць.

Пабіты гарадавы ацерабіўся, паправіў на грудзёх бляшку-нумар і „ізрэк“:

— За парушэньне цішыні і парадку, ды за пабоі далжнасных асоб пры выкананьні сваіх службовых абавязкаў гаспадар адкажа штрапам.

Зусь падышоў сагнуўшыся, пакорлівы і жаласьлівы, і сунуў гарадавому яшчэ грыўню. Гарадавы схаваў руку ў кішэню і пайшоў сьледам за першымі двума.

Душэўны спакой сабе Зусь купіў за пяцьдзесятку.

На працягу двух наступных дзён нічога асаблівавага не адбылося ў горадзе пасьля разбойства Юзіка ў майстэрні. Разбойца не паказваўся, мусіць, халодная пры часьці прытуліла яго трохі на доўгі час.

Пра забойства Юркевіча таксама пакінулі гаманіць, дый якая цікавасьць; быў-бы забойца знойдзены—іншая справа.

Чуткі з вайны трохі-трохі даходзілі да гораду, надта далёка была яна адгэтуль. А ў газэтах, ну што напішуць у газэтах, вядомая рэч; капітан (імя „рэк“) за баявыя заслугі—адзін са сваёю ротаю разьбіў нашчэнт японскі полк—нагараджаецца ордэнам Георгія I ступені; вахмістр, якое казачае сотні за „ўдалую“ разьведку ў тылу, у японца, узнагараджаецца георгіеўскім мэдалем. Нашы б'юць, макакі ўцякаюць, (а на справе: стаімо на месцы, а як трохі горш, дык і адступаем). Цьмяныя чуткі даходзілі з вайны, быццам і ня было яе; абыралі трохі людзі; жыцьцё быццам ішло сваім парадкам, звычайным, будзённым. Але глыбока ў гэтай будзённасьці і спакоі варушыліся, насьпявалі зусім неспакойныя і нябудзённыя падзеі.

У нядзелю Ігнась шукаў на рынку Дуба і нідзе ня мог знайсьці. Вось жа абяцаў, што прыедзе, але—на табе, як у ваду ўпаў, няма. Разы два прайшоў ён з канца на канец і потым парашыў кінуць, яшчэ прыцягнеш за сабою якога хваста.

Счакаўшы з паўтары гадзіны на кватэры, ён зноў памкнуўся ісьці, калі Арон заўважыў, што нехта да іх ідзе. Ігнась сеў. Арон вышаў насустрач.

Прышоў селянін, апрануты ў шараватую сьвітку, у лапцёх і старым пакамечаным капялюшы. Паверху сьвіткі пад-

пяразаны саматканым паяском, ён паказваў зусім на якогавебудзь паляшука. Толькі ўгледзеўшыся добра, заўважыць можна было на яго немаладым, аброслым шорсткаю барадою, твары разумныя вёрткія вочы.

— Што скажапе?—запытаўся Арон.

— А мне, здаецца, да вас трэба.

— Чаму вы думаеце? Я вас першы раз бачу.

— І я вас першы, але, як бачыце, пазнаў. Вы Дуба шукалі сёньня,—запытаўся селянін, вока ў вока гледзячы Арону.

— Дык гэта вы можа ад яго?

— Но, во!—узрадаваўся той, што патрапіў добра.

— Зойдзем тады ў пакой.

У пакоі селянін азірнуся на бакі, і разьвязаўшы аборы з лапця, дастаў з-пад анучы лісток паперы.

— А як вас клікаць?—выспрабоўваючы ў апошні раз, запытўся ў Арона.

— Іцка,—пажартаваў Арон.

Лёкая аблачынка ўсплыла на твар селяніну, але потым ён весела зарагатаў.

— Пажартаваць можна.. можна... Я ўжо дарую, бо сам вінаваты, гэта трэ' было мне запытацца з самага пачатку.

— Праўда, я пажартаваў,—засьмяяўся Арон,—мяне клічуць людзі Аронам.

— А мяне Ігнась,—убачыўшы, што селянін павярнуўся да яго, сказаў Ігнась.

— Ну вось... Дуб расказаў добра, я ня зблудзіў. Дык вось-жа, вам паперка, за тое, што вы пажартавалі з мяне,—пажартаваў і ён, павязваючы аборкамі новую анучу.

Арон прачытаў у паперцы начарэпанае абыяк, што Дуб ня маецца быць сёньня ў горадзе, вельмі пільная патрэба выклікае яго паехаць вёрст за пятнаццаць ад мястэчка ў сяло, дзе ў яго „варыцца каша". Гэта трэ' было разумець па-свойму і сумнявацца ў праўдзе напісанага не даводзілася. Яшчэ пісаў ён, што калі Арон з Ігнасём не пабаяцца, дык могуць прыйсьці з падатчыкам паперкі, ён свой.

— Ня выгарыць гэтак,—сказаў Арон,—трэба напэўнае біць. Ты вось, дзядзька, скажы яму, няхай падрыхтуе усё, і тады па нас.

— Дый я казаў яму. Але гэта ён так паміж слова напісаў.

— Так... Ну, што на сёлах? Як зямелька абрабляецца?

— Як і цёгля. З потам ды сьлезьмі. Мужыку не пяршыня.

— Вайна як,—пра вайну гамоняць?

— Што-ж, гамоняць, ды азіраюцца, ці няма паблізу старасты альбо вурадніка. Бываюць іншы раз і большыя госьці.

— Значыць, спакойна.

— Дзе відана. Але ня зусім. Гамоняць цішком па цёмных кутках, што быццам хаваюцца ад мобілізацыі па суседніх сёлах. Ня верыцца нешта. Адважыцца зрабіць гэтак—адна страхата. Я дык ня веру.

— Чаму?

— Ды каб было яно, дык стражнікі бацькоў, пазабіралі-б за сыноў. А яго гэтага ня чуваць было.

— Можа і так.

— Дзе бачылі, няма навін яшчэ, ой няма. Тугавата нешта. А мне тымчасам думаць трэба ды ісьці, а то...

Дзядзька насунуў капялюш на лоб.

— Бывайце тымчасам!.. Можа трапіцца быць у нашых краёх, дык заходзьце і да Яські, гэта я, значыць. Я дык трохі далекавата ад Дуба, але мяне поўна хто ведае. Толькі запытайцеся, малое дзіця завядзе аж у самую хату... Загаманіўся трохі, ну, дык бывайце!

Як пайшоў селянін, Арон здаволены, загаманіў:

— Глядзі, Ігнась, якіх дзядзькоў барадатых вярбуе наш Дуб. Маладзец, дальбог, маладзец!

— Каб толькі ўсе яны гэткія, як Дуб, былі.

— Як Дуб, кажаш. Эх, шмат у нас па сёлах Дубоў, толькі вось адразу ня ўбачыш

— І ведаеш, Арон, такія людзі маюць пашану на сяле. Хоць можа і няпісьменныя і незаможныя, а вось кожны пры сустрэчы з такім першы вітаецца. Нейкая патаемная сіла прыцягвае масу да гэтакіх людзей. Породзьдзе, ведаеш, такое.

— Гэта, папярэднік, Ігнась, будучага чалавека, будаўніка новага жыцьця.

— Сасмагнеш, пакуль дачакаешся яго.

— Яго чакаць ня трэба, узяць у рукі і ня пушчаць, як казаў Дуб.

— Ты не зразумеў мяне, Арон, я-ж таксама думаю. Але і беручы яго, кажу, што сасмагнеш.

— Нялёгкая, праўда, штука і ня хутка можа прыдзе. Рэволюцыя—ня жаргачкі, рэволюцыя—народная вайна.

— А мы гэтак мала да яе падрыхтаваны.

— Ты нешта сумаваць стаў часта, Ігнась, асабліва апошняга часу. Можа гэта ад таго...

— Не кажы, Арон, агідна ўспамінаць... Забіць гэтак... Не... Не ўспамінай!

— Ігнась, мы-ж ня прычым тут, ён сам наклікаў сьмерць. Уся яго работа была падрыхтоўкаю да чужое сьмерці, аж вышла ня так.

— Будзе.

— Трэба ўзяць сябе ў кіпці. Жалю не павінна быць месца ў сэрцы рэвалюцыянэра да сваіх ворагаў. Бязьлітасная нянавісьць да спрадвечнага прыгнятацеля пацягне масы на бой. Яна-ж, гэтая нянавісьць, прагучыць па гарадох і сёлах у гуках першых стрэлаў і нафарбуецца ў чырвоны колер крыві ворагаў народу. Кроў ворагаў—свабода працоўным.

— Так, Арон, калі мы пральлем яе ў сумленным паядынку.

— Гэтак як рыцары старасьвецкія ваявалі? Ці на дуэль паклікаць, па-афіцэрску, шляхетна зрабіць: абраць места, палічыць крокі паміж супраціўнікаў, а сэкундантам пакомандаваць—раз! два! тры! За трэцім разам страляць. Тут справа інакшая. Справа ў тым, што толькі адзін мае зброю, а другі—з голымі рукамі. Дзе-ж тут сумленнасьць. Ігнась. Ці ня думаеш ты, што твой вораг са сваіх двух рэвольвэраў табе адзін аддасьць і скажа: „На, страляй у мяне, а я буду адстрэльвацца“.

— Я гэтак не казаў,—прамовіў ціха Ігнась.

— Дык гэтак, прынамсі, выходзіць. У рэволюцыю монархія ўжыве ўсе найлепшыя тэхнічныя сродкі супроць паўстанцаў, яна скарыстае ўсе ваенныя хітрашчы, усё, што толькі магчыма будзе. Гэта, калі вораг залезе з кулямётам на дом... Кулямёты ўжо зьявіліся, чуў? ужываюць ужо на манчжурскіх палёх,—крыкі мала ім... У адну хвіліну сотні куль і дзесяткі, а мо' і сотні людзей усё адно як і ня жылі... Дык вось, калі твой вораг з такое штучкі будзе сыпаць градам куль, вы пойдзеце ў лоб браць гэты дом, ці, яшчэ лепш,—будзеце ісьці ў шэрагах і сьпяваць рэволюцыйныя песьні? Пра такую сумленнасьць ты казаў?

Гостра блісьнуў чорнымі вачыма Арон на Ігнася.

— Не, я не пра тое казаў. Не патрэбны забойствы—з-за рогу, у цёмным кутку, калі чалавек зусім не чакае.

— Навошта такая жаласьлівасьць, Ігнась,—навошта, я кажу, яна табе.

— У кожнага чалавека ёсьць жаласьлівасьць да слабага, хоць ён і вораг твой.

— Няпраўда, Ігнась, бо каб было яно так, ня было-б соцыяльнага змаганьня, ня было-б рэволюцыі, гэта наогул, а ў прыватнасьці я падам табе адзін прыклад: далёка лезьці

ня трэба, возьмем таго самага бундаўскага Баргона, провокатара. Бачыш, якая гэта людзіна, якраз людзіна, а не чалавек. Як ён прыемна і з карысьцю ў сабе сумяшчаў рэволюцыйныя ідэі з політэйскімі абавязкамі. Ты бачыш, якая хітрая і подлая душа. Была-б у цябе, Ігнась, жаласьлівасьць да яго?

— Не, да такога, не.

— Значыць, ты пад уплывам хвіліны гаворыш аб сваёй жаласьлівасьці. Трэба даваць належны адпор гэтакім хвілінам і настроям слабасьці, яны псуюць сумленнага чалавека. Чакай, я свайго прыкладу яшчэ не даказаў... Вось такіх провокатараў рэволюцыянэры звычайна зьнішчаюць і зьнішчаюць нясумленным спосабам, як ты сказаў. Нічога ня кажучы пра справу, не даючы падазрэньняў, ідуць за горад, у лес, скажам. Па дарозе астаецца таварыш пазадзе і раптам стрэл—і скончана. Ты лічаш, што гэта нясумленна. Вядома, што не па евангельлі, там гэта танчэй тлумачыцца, але затое жыцьцёва. „Калі цябе толькі вытнуць у адну шчаку, падстаў і другую", вучыў хрыстос, калі толькі ён быў на сьвеце. А мы кажам: „калі цябе вытнуць, у адну шчаку, бухні так, каб у іх зьнікла ўсякае жаданьне біцца". Што ты адчуў сабе, калі пачуў летась на вуліцы: „Мужычыла!.. Вунь брук!"—Жаласьлівасьць?

— Не ўспамінай, Арон, балюча.

— Трэба, каб было балюча, тады жаласьлівасьць загіне.

— Праўда, Арон, ты праўду кажаш.

— І гаварыць ня будзем. Досыць. А калі табе сумнавата, схадзі да Любы, я ўпэўнены, што і яна сумуе. Схадзі, разгані яе сум, прападзе і твой і абаім будзе весела, радасна.

— Сапраўды схадзіць хіба.

— Конча схадзі, я табе даю сёньня такое заданьне. І ўмова: толькі ня лаяцца з Любаю.

— Ты добры і чулы таварыш Арон.

— Кінь, ідзі,—холадна сказаў Арон.

Твар яго зрабіўся абыякавы, сухі і нават жорсткі.

— Дык бывай!—гукнуў весела з парогу Ігнась. Аднак, на кватэры Любінай яго чакала няўдача: гаспадыня сказала, што па Любу яшчэ ўчора прыехаў бацька і забраў яе дадому.

— І больш ня будзе тут?

— А чаго ёй быць. Скончыла, дзякуй богу, вучэньне, дык чаго-ж сядзець тут. Цяпер хлеб зарабляць трэба.

Самотны вышаў на вуліцу Ігнась.

ДВУЧЫЛАСЯ Люба ў гімназіі. І радасна адначасна было ад гэтага і сумна. Радасна, бо прыемна адчуваць свае посьпехі, а сумна таму, што прамінулі марна нейк маладыя гады. Праўда, яна вучылася тымчасам, набывала патрэбныя веды, каб пасьля аддаць на карысьць і людзям, і сабе, але-ж адчувалася, што не, ня бачыла маладосьці яна.

Сумна было яшчэ і таму, што ня прышоў Ігнась. Абяцаў вось-жа, калі бачыліся апошні раз, а ня прышоў. Пакуль прыехаў бацька, яна чакала ўсё ад хвіліны да хвіліны, што вось-вось пачуюцца знаёмыя крокі і забраскаюць дзьверы. Прыдзе Ігнась, пасядуць яны, як некалі даўно-даўно, блізкія адно да аднаго... Няма. Ня прышоў.

Бацька складаў кніжкі і вопратку ў воз, а яна раз-по-раз выбягала на вуліцу і ўсё пазірала ў той канец, адкуль мог прысьці ён. І ня было. Няпрыветна ляжала знаёмая вуліца, сіроцкую самоту ўлівала ў дзявоцкае сэрца. Ня прышоў.

Бацька ўпарадчыў ужо воз і чакаў, калі Люба скажа, што можна ехаць. Не прычакаў, сам сказаў:

— То паехалі-б, калі ўсё гатова.

— Зараз, тата, разьвітацца-ж трэба з гаспадыняю.

Пакой, куды яна зайшла, каб яшчэ раз зірнуць на вуліцу праз акно, дарэмна зірнуць, быў такі галамозы, парожны. І не ўважаючы на тое, быў ён ёй такі блізкі і дарагі. У гэтым пакойчыку нямала пражыта радасьці і гора, бачыў ён і сьлёзы кволыя дзявоцкія, чуў і сьмех неўзабаве пасьля сьлёз, адзін беспадзельна суз раў праз колькі год дзявоцкую прыгажосьць ва ўсіх прыемных дробязях, схаваных часам ад чалавека. І пакой навеяў Любе ціхі сумна-прыгожы настрой. Прасьвятлелі ад гэтага больш чым калі шэра блакітныя вочы. Погляд упаў зноў на акно. Ня прышоў...

Бацька ўжо завярнуў каня, чакаў. Талы, прыдушыўшы ў сэрцы квола-балючыя парываньні, радасьць і сум росташ, Люба агледзела ўсё апошнім зіркам, кароткім, імгненным і пайшла разьвітаняся з гаспадыняю.

— Едзь здарова, Любка. Шчасьліва!

Павільгатнелі вочы ў старое. Звыклася з харошаю, сур'ёзнаю Любаю. А мо' ўспамянула і свайго мінулага гэткія самыя хвіліны.

— Калі будзеш у горадзе, Любка, заходзь,—дагналі на двары ўжо яе словы.

Паехалі. Гэтак і непабачылася з Ігнасём. І пакуль ехалі горадам, неадчэпна адстуквала Любіна сэрца гэта кволабалючае:

— Ня было... Ня было... Ня было.

За горадам конь сам зьвярнуў з шашы на ўбіты шырокі гасьцінец. Праз усю дарогу бацька з дачкою не агукнуліся ні словам. Бацька торкаў лейцамі каня, а Люба глядзела як сьцелецца па хваліста-жытнёвым моры густы пыл. Колькі ўспамінаў навейваюць гэтыя шырокія зялёныя хвалі! Які родны і даўно знаёмы густы дарожны пыл, што паволі-паволі адганяецца слабенькім ветрыкам на шырокія неабсяжныя прасторы жытоў.

Шамцяць жыты неяк ціха-звонка, так шамцяць хіба яшчэ толькі пруткія густыя чараты на рацэ. І сэрца прыцішае, слухаючы іх кволае шамценьне, і ў ціхіх шэптах казкі палёў патае яно. І няма ўжо быццам ягоі заміж сэрца ў грудзёх Любіных кубак па самыя берагі наліты прыгожым смуткам, жальбою мінуўшчыны. О, гэта здрадніцкае мінулае! О, зялёныя, чароўныя жыты! Не адно чалавечае сумленьне захлынулася ў ціхіх шэптах вашае задуменнае казкі, не адно сэрца аддало вам свае людзкія пачуцьці, не аднаго зачаравалі вы бязьмежжам свайго вясновага ўплыву. Спрадвеку шапаціць гэтая ўсясільная казка і не адна сіла заснула пад яе чароўна-прывабныя гукі, заснула спутаная другою магутнаю сілаю.

Успаміны думкі Любіны перапыняюцца, чуваць як пачынае ажываць і біцца сэрца. Вось могілкі са старымі пахіленымі крыжамі, а паміж іх вырас як з зямлі і адзін новы. Тут Люба адумваецца, што ні слова не сказала з бацькам за дарогу, і каб прагнаць няёмкасьць, пытаецца:

— Па кім гэта, тата, пастаўлены новы крыж?

Гэтак яна пачынае аб тым-сім гаманіць. Вось і бакавая дарожка, па якой выедуць пад сяло. Вунь і гумно бацькава з перакрытаю страхою відаць ужо. Вязы і вербы параскідалі пышна свае гальлё. І прыехалі.

На прыгуменьні стрэла маці. Люба саскочыла з воза, сказала колькі слоў і пайшла ў хату. Язык не вярнуўся неяк гаварыць да бацькоў, не знаходзілася чамусьці таго, аб чым можна-б пагаманіць. Ня было тэмы, ня было таму, што думкі яе блукалі дзесьці.

Таму і ў хаце яна не забавілася. З дарогі трохі абтрапалася, памылася і, прыняўшы матчыную пачостку, вышла з кніжкаю на пругмень.

На пругмені добра было. Дзівосныя фарбогы з сонца і засені слаліся на кучаравай траве пад яблынямі і ігрушамі. Нязладны хор птушыных галасоў ажыўляў ціхі сад. Быццам наважыўся конча ня даць чытаць Любе.

Лежачы ў халадку пад маладою вішанькаю, паспрабавала яна чытаць. І не магла, кінула. Упяла зрок у сонечна-

блакітныя дзірачкі паміж гальля і ляжала гэтак доўга-доўга. І добра было, і разам не ставала нечага. Да адчуваньняў прыгажосьці далучаўся боль па нечым утрачаным. І гэты ўтратак вырастаў на ўсю сваю агромністую велічыню побач з пекнымі адчуваньнямі, і думка зморана трыпятала ў лёгкай бяздумнай галаве.

— Няма...

Пудлівым зайчыкам выплюшчыўся з-за гальля гульлівянясьмелы сонечны праменчык, паказытаў Любіну шчаку. Зразумелася больш адзінота.

— Няма...

Падняўшы разгорнутую на сярэдзіне кніжку, устала, вышла з пругменю і павольна распацыравала па загуменьні. Дайшла да канца, павярнула ў сяло, каб знарок паглядзець у вокны Агапінае хаты, мо' прышоў.

— Няма...

І побач з усёю пяшчотнасьцю і прыгажосьцю, паміж раскошных радасных прысадаў, пад сьмяхотлівым ясным сонцам на сухой вуліцы было маркотна, самотна Любе.

— Няма...

Села на лавачцы перад сваёю хатаю. Ні ветрыку на вуліцы. Ня ўседзела.

— Няма...

Балюча доўга ня ішоў таго дня жаданы вечар. Дзень упарта не хацеў аддацца цьмяна-сіняй ночы. Але-ж змарыўся ў змаганьні, згас і змрокам павуцінным празрыстым накрыўся да заўтра.

Змарыліся і пачуцьці быццам Любіны і думкі ў гэтым змаганьні і, змогшыся, папрасілі адпачынку.

З вечара і да самага відна герамігрвалася таемна з нейкім далёкім вочкамі-зоркамі яснымі цёмна-сіняя ноч.

Моцна спала Люба, доўга. Узбудзіў гарласты звонкі пеўнік весянчук. На двары ясную радасьць рассыпала сонца, прынесла сьветлую надзею.

— Сёньня прыдзе.

На двары гулі мухі, мігацелі белыя матылі, задуменна стаялі кляны і вязы, плакалі быццам раскідзістым гальлём няўёмныя крохкія вербы. Усё было як і ўчора. Ці не абмылілася? Упарта не:

— Сёньня прыдзе.

Трыпятала сэрца—лёгка, жадана. За паўдня выправілася к Агапе.

— Чула, Любачка, што прыехала ўчора. Чаму-ж Ігнася майго не прыцягла.

— А ён казаў, што сёньня прыдзе,—схлусіла.

— Рэдка бывае. Можа і няма як хадзіць. Мо' часу няма, бо не павінен забыцца на матку. Пасабляе, дзякуй яму.

— Ды скардзіцца на такога сына няма што.

— Н'але, дзякуй богу. Як-жа ты цяпер, дзеткі?

— Адвучылася ўжо, цётухна.

— Вырасла, стала прыгожая, рослая дзяўчына,—палюбавалася на яе Агапа.

Пасаромелася Люба, стала апраўдвацца, жартаваць:

— Ды не, цётка, якая была, такая і засталася.

— Не кажы, Любка, ого не кажы. Ня трэба плюшчыць вочы. Што праўда, то праўда і саромецца яе не патрэбна. Прыгожая, рослая, здаровая стала.

— Вучэньне, кажуць, за вушы выцягвае.

— Але-ж. А як цяпер, Любка, не дарэмна хаця вучылася, каб бяз бацькавага хлеба пражыць?

— Думаю, цётка. Экзамэн здала добра. Абяцаюць паслаць за настаўніцу ў школу.

— Э-э-э,—дык гэта-ж добра, Любка,—схіліўшы галаву набок, здаволена сказала Агапа.—Вось каб у нашу назначылі, дык і зусім-бы добра пры доме.

— Ня хочу ў сваю. Ня добра пры доме, цётка. Ведаеце, як са сваімі людзьмі.

— Праўда, праўда, Любка.

— Лепш куды далей, у глушыню, дзе людзі цёмныя, як ноч.

— Папрацаваць хочацца... Бяз працы і жыцьцё ня смачна. Хвалю, дзеткі, хвалю за гэта.

Далейшая гутарка перарвалася сабачым брэхам у двары.

— Гэта-ж Кіяш,—зарадавалася Люба.

— Але, ён. Часта гэтак вось без Ігнася возьме прыбяжыць, пабудзе які дзень дый назад. Панадзіўся—расхаладзіла Любу Агапа.

Але чаго сэрца ўздрыгнула, закалацілася гэтак моцна ў грудзёх. Чаго яно, дурасьлівае?

Нехта мігнуўся паўз вокны і адчыніў сенцы. Вось-вось адчыніцца і хата...

Увайшоў, стаў...

— А я думала, сынок, што Кіяш адзін прыбег. Чую—брэша, а ня ідзе ніхто.

А Ігнась стаяў, быццам ад парога баючыся крануцца. Зьнячэўку сустрэў Любу.

— Праходзь, сынок, чаго ты стаў... Забылася зусім, што ты казаў Любе, што сёньня прыдзеш.

Ігнась дагадаўся, зірнуў на Любу, зарагатаў весела, падышоў, прывітаўся.

— А я ўзяў ды спраўдзіў. Прышоў, як бачыце.

— Ашукаўся,—жартуючы, але з дакорам сказала Люба.

— А як там, сынок, у горадзе, пра вайну чуваць што? Гэта-ж баюся, Любка, каб не забралі і яго, чаго добрага,— да Любы ўжо праказала Агапа.

— Не забяруць, мама, вось паглядзіш. Вайна доўга не працягнецца. А каб бралі, ты хацела-б аддаць?

— Ну, а як-жа сынок, як-бы ж я не дала.

— Я-б сам не пайшоў.

— Ігнаська, не гавары так,—азірнулася на вокны Агапа.

— Ніхто ня чуе, мама, але я-б не пайшоў дый усё.

— Сілком забралі-б, сынок.

— Я зьбег-бы,—рашуча сказаў Ігнась,—а там лаві мяне.

І паціхлі ўсе, ці пад уплывам гутаркі, ці ня было пра што больш гаманіць. Толькі ня зусім гэта праўда, бо вочы Ігнасёвы і Любіны ясьней яснага казалі, што ў іх ідзе свая маўклівая гутарка.

— То папалуднаваў-бы, сынок,—убачыўшы, што Ігнась устаў, пэўна намерыўшыся ісьці,—згаладаў можа.

— Я палуднаваў у горадзе, а дарога невялікая. Ня хочу, мама, і ня мерся нават даставаць. Душна ў хаце...

— То на аселіцу прайдзіце ці ў гай. Гай дык задалёка,— сама з сабою ўжо гаманіла Агапа.

— Я не забаўлюся, мама.

— Чаму, можаш і пагуляць трохі.

Як хацелася пабыць ёй удвох з сынам хоць колькі малюсенькіх часінак ды ціха шчыра пагаманіць, паўзірацца люба ў ягоны ўзмужнелы твар. Адчувала гэта Люба, але ёй мо' яшчэ больш хацелася пабыць бяз нікога з Ігнасём. І Агапа сьціснула ў сабе ўласьніцкія матчыныя жаданьні, аддала іх на ахвяру маладога каханьня.

— Ідзіце, ідзіце, дзеткі, пагуляйце. Ці-ж гэта дапраўды ўлетку ў хаце сядзець. Душна... На дварэ хоць сонца, але-ж і халадок. Дый мух гэтых няма, каб на іх упадкі, поўную хату панапазіла.

Яна адчыніла акно і ўціральнікам стала выганяць мухі. А як павыганяла, дык Ігнася з Любаю ня было ўжо ў хаце.

Навакол усюды бурлівіць жыцьцё. На вачох у Любы всаблівa парабілася ўсё рухавым, жывым і быццам з сэрцам разам праказвае ўголас:

— Прышоў... Сёньня прышоў...

Сьвятковыя, радыя не заўважалі яны, што, ідучы, топчуць кволыя летнія краскі на поплаве. Але чаго было глядзець у ногі, калі краскі былі ў іхным сэрцы, чырвоныя, пышныя ружы каханьня, калі песьцілі яны гэтыя ружы і палівалі

шчыра маладою ласкаю сустрэчы. І расьлі, распукаліся вышныя ружы, пялёсткамі крохкімі любымі імкнуліся зьвязацца.

— Змаркоціўся я, Люба, ня вытрымаў. Прышоў на кватэру—цябе няма ўжо. Ціха... Няма... Тады я проста дадому.

Такім няўёмным пачуцьцём самоты падыхнула ад слоў Ігнасёвых і гэтак ясна зразумела яго сваім сэрцам Люба і, зразумеўшы, перdesigned сваё.

А сонца смаліць, не шкадуючы. А поплаў шырокі і ў кветках увесь, як вытканы ў розныя колеры андарак стройніцы маладзіцы. Агромністы прыгожы, ляжыць ён пахучы, сакавіты паміж сяла і ракі. Гудуць старанна пчолкі, пералятаюць з кветкі на кветку. З-пад самых аж ног кулём выпырхнуў бакас. Няўнятныя чайкі кігікаюць пад самымі галовамі. На вялікія балоты праляцела хэўра дзікіх качак. Трава ў калена палягла, пакамлацілася з белаю канюшынкаю.

На беразе ракі Ігнась нечакана сеў і жартліва пацёг Любу за руку. Люба ўпала, адале папрaвілася і нагрзіла на яго пальцам. Ігнась спахмурнеў. Тады Люба зарагатала, як-быццам званок празьвінеў на беразе і ад таго пакалыхнуліся краскі і запярэсьціла роўная гладзіня рэчкі.

— А што-ж ты кепства робіш.

Зарагатаў і Ігнась: ён-жа так быў нахмурыўся толькі, на сьмешкі.

— Каб большага кепства ня было дзяўчатам.

— А хлапцом? Ты хлапцоў разьдзяляеш з дзяўчатамі?

— За ўсю голаў хлопцы.

— Дык-жэ ж, табе за ўсю голаў хлопцы, а толькі дзяўчаты. Нябось, ужо з капа ў сэрцы сядзіць. Аж пахудзеў, бедны, глядзі як высах увесь.

— Каханкі ня сушаць хлопца.

— А хлопец каханак?

— Але. Глядзі, як ты высахла, Люба.

— Няўжо? Каб ты не сказаў, дык і ня ведала-б.

— А што-ж, мо' і ты ў тэй самай капе.

— Наўрад ці. Ларыса дык мо' напэўна, сур'ёзам сказала Люба.

— Люба!

І мука і радасьць сказалі Ігнасёвым голасам.

Раўнівасьць прасунула сваё гострае джала паміж іх. Маўчанка запанавала на хвіліну.

— Люба! Дык чаго ты? Чаго?—убачыўшы, што яна заврнулася і стала шпарка абрываць пялёсткі з красак,— сказаў Ігнась.

Крохкая слабасьць напнулася ў ім, гатовая парвацца, вось-вось. Парвалася, ня вытрымаў Ігнась, расказаў пра ўсё-ўсё.

Шмат пра што пачула Люба, чаго не магла і падумаць нават, але што падказвала да таго раўнівае сэрца. Хлопцы і дзяўчаты перабл ыталіся ў гэтым пачутым, і крыўда была на Ігнася і каханьне да яго, каханьне, якога ня зьмераць ніякаю меркаю. Не атручваў яго і ўспамін аб Ларысе, ці-ж ня ведала яна, што Ларыса зачаравала Ігнася.

— Ведала я, Ігнась... Ведала, але цярпела. Вось тут толькі ў сэрцы!.. гарэла яно!

— Люба... Слаўная Люба!

Гэтае даўнае дарагое хлапецкае слова выпырхнула на вусны Ігнасю. Ня ён, сэрца сказала.

І адбылося тое, што наклікалі жужлівыя пчолкі, аб чым шапацелі саромліва-ціха чараты з плюшнікам, чаго чакалі, ківаючы пекнымі галоўкамі, прырэчныя краскі. Павярнулася к Ігнасю Люба; сустрэліся поўныя любасьці, поўныя ўнутранога хараства вочы; спляліся рукі. І пацалунак пачулі краскі, і пацалунак пачулі чараты, і пчолкі неяк вельмі выразна і зразумела загулі.

П'янее бераг ракі... Гарачае сонца лье п'яны агонь на кветкі, на траву і млеюць яны ў п'янай гарачыні. Заплюскалі здурнелыя рыбкі, і ў п'яныя кругі гуляць пайшла рака. Чарацінка адна пахіснулася стромка, расківалася потым і ціхую п'яную песьню каханьня засьпявала. За ёю другая, трэцяя...

А ўсё яны двое. Злучыліся цесна, так цесна, што не разьяднаць. Першы пацалунак.

П'яную песьню, гімн чыстаму каханьню засьпявалі званчэй чараты. Маладым раўчучком забруіла рака, захлюпала ў берагі. Нахілілі галоўкі свае гордыя краскі. Схілілася трава. Ветрык дзьмухнуў, гульлівы свавольнік, наляцеў раптам і сьціх, пасаромеўся свае спрытнасьці. То быў першы пацалунак дваіх, першы моцны голас каханьня.

Але спудзіў нібы хто яго—успырхнуў пацалунак, закруціў вецер і—цьвярозы стаў бераг.

Нагнуўшыся нізка-нізка, Люба краскі ірвала, пляла вяночак. Ігнась ляжаў побач дагары, падлажыўшы пад галаву рукі, утаропіўшы зрок у высокі сінец далёкага яснага неба.

Што раз то слабела і слабела сонца, плыло ў адпачынак на захад.

— Што ты сказала-б, Люба, пра таго чалавека, які забіў другога з-за вугла?—спытаўся раптам Ігнась, пакінуўшы глядзець у сіняе неба і павярнуўшыся на бок.

— Чаму ты пытаешся?

Пакінула Люба плясьці вянок, зірнула на Ігнася.

— А каб ведаць тваедумкі пра гэта. Бачыш. у нас была спрэчка. Адзін казаў, што такое забойства робіць чалавека нясумленным, а другі даводзіў, што яно сумленна і павінна быць у жыцьці.

— Ня ведаю.

— Ну, Юркевіча вось забілі. Як, па-твойму, апраўдаць трэба забойцу ці не?

— Мы ня судзьдзі, Ігнась.

— Мы—судзьдзі. Юркевіч быў паліцэйскі шпік і сачыў за намі. Таго вечара, як ішлі з маёўкі, я сустрэўся з ім на вуліцы. Ён паляваў на нашага хлопца... ды не ўпаляваў. На нашу сходку ў дуброўцы,—памятаеш, наслаў аблаву Юркевіч. Ён поўна чаго нарабіў. Дык вось і таго дня згразіў, што хутка пагамоніць са мною дзе сьлед. А назаўтра ўраніцы яго знайшлі забітага ў пакоі.

— Ігнась... Адкуль ты ведаеш усё?

— Дык як, па-твойму, трэба апраўдаць забойцу ці не?

— Ігнась... Гэта-ж ня ты?

— Можа і я,—ціха праказаў ён і зірк яго быў бяз жаднае кроплі сэнсу, ня выказваў зусім нічога.

— Не, гэта ня ты. Ну скажы, Ігнась, што ня ты.

— Люба...

— Я ня веру... Ня веру! Ня мог ты... забіць. Не павінен.

— Ня ўзбурайся Люба, ня я.

— Як ты напалохаў мяне.

— Супакойся, ня я.

— Дык кінем і зусім гаварыць пра гэта. Гэта-ж агідна. Жыў сабе чалавек і раптам няма яго.

— Значыцца, ты не апраўдаеш забойцу?

— Нічога я не скажу, кіньма.

— Хто-б сабе не забіў Юркевіча, а яму варт, Люба.

— Няхай сабе... А ты не кажы, я не магу слухаць пра гэта.

— Добра, я буду маўчаць.

— Паспрабуй.

— Ужо маўчу.

Люба кінулася к Ігнасю і стала казытаць яго. Ігнась зарагатаў шалёна, стаў вырывацца. Вырваўся і пабег. Люба за ім. Сіратліва пакінуўся на беразе недаплецены Любаю вяночак.

Жарты прагналі напята-трывожныя думкі і пахмурны настрой адляцеў і зьнік воддалек. Бегалі па беразе, лавілі адно аднаго, пакуль натаміліся. Тады зьмірыліся, і пабраўшыся за рукі, пайшлі дахаты.

— Вось яшчэ колькі дзён, і я ўжо ня хутка ўбачу зноў усё роднае, знаёмае. Ня будзе гэтае рачулкі, поплаву. Ня будзем гуляць, як сёньня вось,—маркотна праказала Люба.

— Чаму, Люба?—зьдзіўлена перапытаў Ігнась.

— За настаўніцу пайду. Будуць новыя людзі, новыя клопаты...

— Усюды людзі аднакія, Люба, і даўгія вёрсты палеткаў, лясоў ды балот не разлучаць нас. Люба!..—прыпыніўшыся, натхненна загаманіў Ігнась.—Адна вялікая сьветлая мэта ў жыцьці злучыць нас і не разарве да самае сьмерці. Скажы, ці-ж мала радасьці ў тым, што аддаеш сваю сілу і здароўе на вызваленьне зьнядоленых, тых самых парабкоў, гарапашных сялян, удоў і сірат, якіх неўзабаве наплодзіць гэтая заклятая царская вайна? Ці мала чалавеку здавоненьня ад таго, што недарма пражыў, што некалі свабодныя людзі ўспамянуць удзячным словам? Не на сябе жыць, а на людзі, на чалавецтва, рыхтаваць новым лепшае жыцьцё,—вось наша мэта, вось на што мы жывем.

— А сваё ўласнае жыцьцё, гора і радасьці, асабовае шчасьце, Ігнась?

— Адзін чалавек, Люба, нішто. Шчасьце ўсіх людзей, усяго прыгнечанага народу—вось што павінна быць і нашым асабовым шчасьцем. А бяз гэтага не. І да таго... Люба... Ня трэба быць эгоістам, ня трэба любіць толькі сябе самога, а на рэшту напляваць.

— Аднак і агульнае шчасьце выходзіць з людзкога адзіночнага шчасьця. Адзінка—першапачатак грамады.

— Мы не павінны казаць так, мы, якіх людзкое мора выбавіла трохі напаверх. Наш абавязак падцягваць іх да сябе, не стаючы на адным месцы, а бесьперастанку ідучы ўперад і ўперад.

— Як добра, Ігнась, спадзявацца на гэта.

— Ня толькі спадзявацца, Люба, а і верыць, моцна верыць трэба ў яго, без усялякага хістаньня. І тады паглядзіш, якім радасным стане жыцьцё.

— Я з усяе сілы хачу верыць у яго, Ігнась,—рашуча сказала, пажваве́ўшы, Люба.

Вочы ў яе заблішчэлі з радасьці, і яна выпрасталася прутка, выцяглася, здаецца, высока-высока, вырасла на поўна ад усьвядомленьня свайго жаданьня верыць і спадзявацца на Ігнасёву праўду.

— Вось добра... Люба... Дарагая, слаўная!

Ігнась моцна-моцна пацісьнуў яе тонкія дзявоцкія пальцы. А яна стаяла, ня чуючы гэтага, з утаропленымі ў далячынь бліскучымі яснымі вачыма. Адале адарвалася, зірнула Ігнасю ў твар і паволі, але цьвёрда сказала:

— Я буду з вамі. Я поўна думала з леташняга. Бывала, што не знаходзіла ратунку і блыталася без усялякае надзеі. Тады нават плакала. А цяпер я зразумела,—я буду з вамі, бо ў тых, дзе я была, няма справядлівасьці, цёмны нейкі пачатак, а канца дык і зусім ня відаць. Давайце мне самую цяжкую работу,—я буду рабіць, я зраблю.

— Слаўная, дарагая Люба! Цяпер нас нішто не разлучыць. Нас, зьвязаных цесна аднэю работаю, мэтаю і думкамі, разлучыць хіба толькі сілаю сьмерць, дый то нашы думкі астануцца і доўга яшчэ будуць жыць у людзях.

— Як шпарка бяжыць час,—у шкадаваньні сказала Люба.

— Так... не пасьпеў азірнуцца, а, глядзі, і вечар ужо. Ня нудзіцца гатак дваім.

Ігнась весела ўсьміхнуўся, а потым сьціх і сумная аблачынка ўсплыла на праясьнены твар.

— Пойдзем, Ігнась, ты-ж не палуднаваў яшчэ.

— Ат... Калі пабачымся яшчэ, Люба?

— Гэтым тыднем я буду ў горадзе, там пабачымся. Бывай!

Рабілася сьвежавата. Раньняя летняя раса ападаць стала на густую траву. А наўкола ціха, ні ветрыку, ні жаднага. Праваю рукою прыўзьняла Люба даўгую чорную спадніцу, каб не парасіць, і пайшла дадому. І пакуль схавалася, дык Ігнась стаяў усё ды глядзеў, як яна азіралася часта назад. У самым канцы ўжо апошні раз азірнулася, махнула рукою і—стромкая, высокая, як былінка,—зьнікла за зялёнымі вязамі.

— Слаўная... Дарагая...—шаптаў Ігнась.

## СЬЛЯДЫ ПАСЬЦІРАЛІ, ДЫ НЯ ЗУСІМ

УСЁ ішло ў сваім парадку. Ігнась нібыта набыў душэўны спакой, якога ня меў ужо за даўгі-даўгі час, страціўшы яго ў тую незабытную вясну, калі маладая веснавая дзяўчына стромка пахіснулася на вуліцы, сустрэўшыся вачыма з Ігнасём. Але ці не мана гэта? І дасюль ён не пакінуў адчуваць гэтае салодкае атруты ў сваім сэрцы, асабліва пасьля таго веснавога вечара ў садзе Няслаўскіх! Як гэта балюча, на яго страх: жадаць і не магчы.

„Ня тое, ня тое сказаць думаў",—успаміналася, як на зло, спакусьлівым зьмеем падкусваючы спакой.

Заўсёды вось гэтак, хай-бы калі прамінула, дык не—успамінаецца, трывожыць, падкусвае. І тады ўсёю сваёю

бліскучасьцю ўстае перад вочы вобраз вясновае Ларысы. І ніяк, здаецца, прагнаць ня можа яго апошняе замірэньне з Любаю, і сілы ня мае змагацца з гэтаю спакусьлівою атрутаю: не ўяўляецца Ігнасю ні п'янага сонца, ні гордых красак на беразе ракі, ні ціхага шамценьня-песьні звонкае каханьню рачных чаратоў, —не здавіць вухам ці вокам, ніяк не ўявіць. Як не жадалася тады, а забывалася шчырая сяброўская Люба, як-бы воддаль стаяла схаваная сьцяною з туману. Сілкаваў разарваць Ігнась чары прывабнае спакусы, а асабліва ўначы—замгнуць хутчэй, каб не паддацца. Ня мог: вярзьліся без папытаньня, лезьлі сьляпіцаю ў вочы адзін прыгажэйшы за другі, вобразы аднае і тае-ж самае Ларысы. А часам і пры рабоце парушалі яны спакой, але ў такія часіны Ігнась вышукваў вельмі добры сродак: пакідаючы свой паяльнік, ішоў да Арона і распачынаў сур'ёзную гутарку. У гутарцы, павольна запальваючыся Аронавым агнём, забываўся на варожую прывабнасьць Уначы вось горш. Гэтак хочацца, бывае, спаць, змарыўшыся за дзень і чуючы як смачна храпе Арон, і... у вясновай усьмешцы шчурацца дзявочыя вочы і праз-усяе паўночы глядзяць без адхланку вока ў вока на яго, пабліскваюць гэтак прыгожа і страшна дзізосным зеленаватым агеньчыкам. Варожым здаецца гэтае пабліскваньне агеньчыкаў Ігнасю. Працірае вочы, расплюшчвае шырока, узіраецца ў начную цемрадзь... Пара вугольчыкаў ня тухне. Страхоцьце ахапляе Ігнася, страхоцьце і нейкае салодкае трыпятаньне ў сэрцы. З цягам часу ясныя вугольчыкі губляюць сваё дзівоснае зеленаватае адценьне. Водблеск агеньчыкаў рассыпаецца, і яны тухнуць. Засынаючы ўжо, прымільгаецца Ігнасю сьнежнаясны твар Ларысін з праменістаю кволаю ўсьмешкаю.

Раніцы прачынаецца з пэўнасьцю, што ўбачыць Любу. Пэўнасьць застаецца дарэмная,—прыпамінаецца, як сустрэўся з Любаю ў горадзе і разьвітаўся на выезьдзе. Люба паехала з Ларысаю на тыдні два ў двор да Няслаўскіх пагасьцяваць.

З такою радасьцю сказала Люба, што за дапамогаю Няслаўскага даюць ёй школу недалёка пры маёнтку Няслаўскіх. І калі Ларыса запрасіла на госьці, дык яна з прыемнасьцю прыняла запрашэньне, думаючы адначасна аглядзець і сваю будучую школку.

Забываў Ігнась пра тое і, забыўшыся, выпраўляўся часам у горад пашвэндацца, думаючы пра сустрэчу з Любаю. Прайшоўшы гоняй колькі, траха не з паўдарогі варочаўся назад. Бо ня было-ж Любы тут.

А як ня было жаднае работы, ніякіх даручэньняў па арганізацыі, даўгія марудныя вечары змагаўся Ігнась сам з сабою. У такім змаганьні ні аднаго разу прыходзіла да галавы думка:

„Вялікае гарачае работы не стае, такое, каб забыцца на ўсё, каб згарэць у ёй“.

А работы было—непачынатыя канцы яе білі ў вока сваімі цяжкасьцямі. Нешта аднаго разу зайшоў на кватэру Яўхім. Малапісьменны, але разумны і настойны рабочы хутка рабіўся цьвёрдым прыхільнікам соцыял-дэмократаў.

— Прышоў сказаць навіну.

— Давай, гавары, Яўхім,—сказаў Арон.

— Юзіка вывезла поліцыя з гораду. Пазаўчора ўвечары пад моцнаю вартаю яго вывезьлі па чыгунцы.

— Ты пэўны, што гэта праўда?

— Чуў, але паверыць можна.

— Яно і мусіла зрабіцца гэтак.

Яўхім казаў праўду. Назаўтра ў бляхарню прыдыбаў стары дзядок, з першых-жа слоў у якім пазналі Юзікавага бацьку. Можа і ён дачуўся пра сына ці што, бо прышоў такі прыбіты горам.

— Хлопчыкі, тры тыдні ўжо няма. Пасобце знайсьці, дзетачкі. Што-ж я рабіцьму стары адзін.

На гэтай гамонцы ўвайшоў Зусь.

— Што за работа, хлопцы. Чаго тут стары?

Наперэсьцігі рабочыя кінуліся апавядаць яму,—кожны ў сваім рабочым загрубелым сэрцы быў уцяты адным выглядам абшарпанага бясьсільнага дзядка і ў жаласьлівасьці клапаціўся пасобіць перад гаспадаром.

— Гэта-ж Юзіка майго, гаспадар, як забралі, дык і няма... Што я рабіцьму стары?.. З чаго я жыць буду?..

— Што—Юзіка, я нічога ня ведаю,—перапыніў Зусь.

Рабочыя заварушыліся. З таго кутка, дзе рабіў Арон, выступіў Цімох і палышоў к Зусю.

— Слухай, гаспадар, у цёмную тут няма чаго гуляць. Мы ня можам дапусьціць, каб стары памёр з голаду.

— Праўда, бо сам вінаваты гаспадар,—пачуліся галасы ззаду.

— Ты просіш сабе прыбаўкі, Цімох?—не пачуўшы быццам галасоў, спытаўся Зусь.

— Ды ня прыбаўкі... Ты павінен пасобіць Юзікаваму бацьку

І зноў галасы падтрымалі Цімаха.

— Хлопчыкі!..—сказаў Зусь.—Ці-ж я магу плаціць таму, хто ў мяне ня робіць.

— Ад цябе забралі яго! А прычым стары!

— Гаспадар,—пахмурна сказаў Цімох,—гэтым не адка
вархаешся. Мы патрабуем, каб ты зараз жа са стары
і з двума ад нас схадзіў у паліцыю наконт Юзіка.

— Ну дык чаго крычаць. Я адзін схаджу са стары
няможна пакідаць работы. Ой,—божа мой, з гэтымі зара
боткамі.

— Гаспадар... мы ўсе патрабуем: ты пойдзеш са стары
і возьмеш яшчэ двух рабочых.

— А то хто яго ведае, куды ён пойдзе!—крыкнуў голас

— Ой, божа мой... Ну, няхай будзе так, як вы кажаце.
Пойдзеш ты, Цімох, з намі?

— Двух! двух!—закрычалі ззаду, але як-бы за каманда
пацiхлі...

— Будзе і аднаго няхай, — пачуўся з-за плячэй голас
Аронаў.

Зусь з падзякаю ў вачох зірнуў на яго. Але зараз-ж
яго чакала вялікае расчараваньне.

— Гэта ня ўсё яшчэ,—казаў Цімох,—мы згодны, няхай
адзін пойдзе, ну, хоць-бы я сабе.

— Ідзі, ідзі ты!.. Трохі-ж пасядзеў, дык ведаеш ход
і выхады,—пажартавалі з яго.

Цімох напусьціў бровы і ня гледзячы на Зуся, як агон
з краменя высек жорстка:

— А яшчэ патрабуем мы, гаспадар, каб ты памог гра
шыма старому. Не павінен паміраць ён з голаду. Мы патра
буем, каб ты зараз-жа даў яму дваццаць рублёў грошай.

— Няма чаго крывіцца! Табе і клопату мала?.. Дык-жа ж
што да таго, калі адным старым менш будзе на сьвеце!—
закрычалі рабочыя.

Убачыў Зусь, што нічога ня будзе, прыдзецца саступіць
з дарогі.

— Хлопчыкі...—лісьліва загаманіў ён,—хіба-ж мне н
шкода старога. Я і сам стары.

І павярнуўся Зусь, каб ісьці.

— Ды ты давай цяпер,—заступіўшы дарогу, сказаў Цімох

— Ой, зарэзалі! Дваццаць рублёў, што мне рабіць! Што
мне рабіць!—загаласіў Зусь.—Хлопчыкі, я дам пяць рублёў
і будзе—колькі старому трэба, па сабе ведаю.

— Ыш, чортава пародзьдзе!—прамармытаў Цімох.—Не
таргуйся, а грошы вымай.

— Хлопчыкі, ну дзесяць рублёў будзе з яго. Дзе мне
ўзяць іх... хлопчыкі!

— Пятнаццаць рублёў давай!..—закрычалі ззаду.

— Дзесяць. Я даю дзесяць. Зарэзалі, хлопчыкі!

— Пятнаццаць!—прасіпеў у твар Зусю Цімох.—Пятнаццаць, чуеш? І не гамані больш. Давай грошы, а то сам дастану.

Малапаслухмянымі ў дрыжыках рукамі дастаў Зусь партманэт і адлічыў пяць трохрублёвак.

— Цімох, на. а можа дванаццаць...

Цімох вырваў грошы і аддаў старому, што праз увесь час стаяў моўчкі.

— А цяпер пайшлі ў паліцыю.

Цімох узяў за руку старога і павёў з майстэрні. Зусь, як пабіты сабака, вышаў за імі. І ўтраіх пайшлі ў паліцыю. Перасьціх трохі гоман у бляхарні, узяліся хлопцы за работу.

Праз паўгадзіны зьвярнуліся з паліцыі. Стары ішоў з боку, згорбіўшыся, жаласьліва трасучы са старасьці сівою барадою. Можа і не такі ўжо стары быў ён, але жыцьцё пастаралася пасерабрыць даўгія зблытаныя валасы, засьпяшылася загадзя ў дугу сагнуць чалавека. Сьлёзы застылі на сівых расьніцах.

На роспыты хлапцоў Цімох толькі рукамі раскінуў, быццам слоў ня было ў яго выказаць таго, што ёсьць.

— Ды кажы... Рук не растапырвай, ня крыльлі,—не паляціш! Ці язык адабралі ў паліцыі?—крычалі галасы.

— Няма,—толькі і мог сказаць Цімох.

— Што няма?—падступіўшыся, запытаўся Арон.

— Ды сказалі, што няма яго ні ў паліцыі, ні ў астрозе, вось і ўсё тут.

— А хто пытаўся?

— Усе ўтраіх хадзілі. Няма, кажуць.

А Зусь паходжваў і мармытаў пад нос. Злаваў.

— Слухай, стары, ідзі дахаты. Прышоў, падняў мітрэнгу ў майстэрні і хоць-бы што. Я грошы плачу за гэта. Я плачу грошы, а яны стаяць!

Ня было ніякае патрэбы лаяцца з Зусем, і рабочыя моўчкі пасталі на работу.

Загрукацелі звонка тры новыя дрылявыя варштаты. Замест аднаго пасьля Юзікавага разбойства Зусь паставіў цэлых тры. У адзін дзень пашкліў нанаў вокны і наняў яшчэ пяцёх рабочых. У віднейшым кутку адчыніў сьлясарню; двох сьлесароў перацягнуў з самае лепшае Файбэлевае сьлясарні. Гэта ўжо была ня зусім бляхарня, а нейкае комбінаванае прадпрыемства. Чаму не пашырыць, калі работа добра спродваецца. Майстэрня з бляхарні перарабілася ўвачавідкі на мешанае прадпрыемства, дзе рабілі конаўкі і бляшаныя імбрычкі, таркі і друшлакі, засланкі і нажы, вілкі і ўсялякую трасцу. Не ставала яшчэ хіба толькі розных клямак ды зашчапак. Дык і гэта нідзе падзелася,

стала вырабляцца. А алнаго дня быў пачуў Зусь, што напладзілася злодзеяў—сталі абкрадаць аж цэлыя вёскі. Дні праз тры прывёз Зусь на рамізьніку скрынку са сьлесарскім інструмантам, а назаўтра адманіў ад Файбэля сьлесароў, і пачалі выраблять замкі. Ліха ведама, што стала вырабляцца ў Зусевай майстэрні; але ня цураўся ён і налады старога барахла, калі зарабіць можна было. „Хто гэта сам сабе вораг", думаў Зусь. Апошнім часам ён пачаў навет абыходзіць усе ўстановы ў горадзе—ці няма заказаў— і ўсюды хваліў сваю работу. І заказы плылі да Зуся, рабочыя ніколі ня гулялі, і кішэня ў яго не танчэла, а таўсьцела.

— Так і трэба,—мармытаў часта сам-на-сам Зусь,—бо навошта б жыць на сьвеце.

Таго разу, пасьля работы пабегшы на вокзал. Арон прышоў дадому з чыгуначнікам-комітэтчыкам. Неўзабаве зьявіўся і Майзэль. Перш, чымся ісьці на вокзал, Арон забег да яго. Каб яшчэ Дуб,—дык-бы і ўвесь комітэт.

Арон расказаў комітэту, як ён даў быў Ігнасю згоду забіць шпега Юркевіча і як гэта яму не ўдалося. На іх-жа вачох Юркевіча, забіў, пасварыўшыся Юзік, якога Юркевіч уцёг у провокатарства.

— Уся справа вось у чым: лішні раз трэба паказаць масам, якімі спосабамі змагаецца ўлада супроць рэволюцыянэраў і рабочае клясы.

— Вялікае работы не правядзеш,—заўважыў чыгуначнік.

— Чаму?

— Таму, бо дзе тыя ў нас вельмі рабочыя.

— Ты, брат, па лініі найменшага супраціўленьня шпарыш!—закрычаў Майзэль і ўскочыў.

— Ціха, сядзь,—сказаў Арон,—у нас пакой невялічкі, тут не прабяжыш.

Майзэль сеў паслухмяна.

— Наша задача ня меншая, чымся задача сталічны організацый. Калі там падрыхтоўваюць пролетарыят да непасрэдных боек з царызмам, дык мы тут рыхтуем яму кадры і моцны тыл. І гэтак гаварыць, як ты, няможна,—сказаў чыгуначніку Арон.

— А гэта вельмі важна ці што—мець конча чыстых, як шкло, рабочых?—зноў наскочыў Майзэль.—У нашым краі мала чыстых рабочых. Больш іх зьвязана з сялом, з беднай гаспадаркаю, або са сваёю хатаю ці гародам у горадзе. Але-ж гэта рабочыя, яны аддаюць сваю працу на эксплёататара. Значыцца, гэтую масу мы павінны організоўваць усякімі спосабамі!

— Ты, праўду гэта, Майзэль,—абазваўся Ігнась.—Калі далучыць да іх яшчэ масу парабкоў, гэтых сельскіх рабочых, дык мы будзем мець вялізную сілу.

— Правільна,—сказаў Арон,—трэба разьвіць самую энэргічную кампанію, бо ад асьвечанасьці рабочых і ад іх падрыхтаванасьці залежыць усё далейшае. Ня трэба выпускаць з галавы вось што: ня масы для нас існуюць, а мы для мас. Масы вылучылі нас у пярэднія шэрагі барацьбы, каб мы вялі іх па няпройдзеным нікім яшчэ шляху. Забываць гэтага ніколі ня трэба.

— Конкрэтна давай, што зрабіць думаем,—сказаў нецярплівы Майзэль.

— Не гарачыся, гарачка псуе ў справе. Трэба, дзе толькі можна, зрабіць лятучыя сходы, і як найлепш популярызаваць работу паліцыі,—пахмура ўсьміхнуўся Арон.

— Як-жа мы скарыстаем гэты выпадак?—запытаўся чыгуначнік.

— А ты як думаў?—замест адказу запытаўся той.

— Ды галава ты!—раззлаваў нэрвовы Майзэль.—Хіба ня ясна, што паліцыя забрала і запраторыла мо' на той сьвет свайго патайнога работніка, калі ён забунтаваўся і стаў шкодзіць. А што яго запраторылі, дык і даводзіць ня трэба.

Праз колькі хвілін комітэт разышоўся па горадзе.

А назаўтрае і праз усе наступныя дні чутка паўзла з вуліцы на вуліцу цішком, употайку. Асьцярожна пераказвалі людзі адзін аднаму апошнія навіны. І ажыло забойства Юркевіча, знайшоўся забойца, але знайшоўшыся, і загінуў.

Варожасьць абуджалася і расла да паліцэйскіх і чыноўніцкіх пагонаў нават у харобрага ў сваім доме абывателя.

На самую гарачку паведзенае соцыял-дэмократамі—кампаніі нахапіўся Дуб. Гэта было ў суботу пад вечар.

Арон з Ігнасём і Майзэлем абмяркоўвалі, як дасягнуць згоды пра сумесную работу з Бундам. Як і што разу Майзэль ускакваў і бегаў па пакоі (добра ўеліся яму ў косьці бундаўцы).

— Дзе вы бачылі!..—бегаючы праказваў Майзэль.—Гэта які народ, гэта такі народ..

Ні да якога рашэньня не дагаманіліся, калі цяжка ступаючы, прышлэпаў Дуб.

— Дзень добры, бяседзе!—гукнуў ён і грубою далоньню абцер на ілбу кроплі поту.

— Ці не паліцыя за табою бегла?—пажартаваў Ігнась.

— За малым не ўтаймавала,—жартам на жарт адказаў той.—Ух, замарыўся, ліха яго галаве. Прыедзеш у гэты

горад, дык беганіны аднае не атрапціся. А ў вас і сесьці дык хіба на падлозе толькі.

— Сядай і на ложку, плаціць ня будзеш.

І гэтак, не дагаманіўшыся нічога наконт Бунду, пакінулі Арон даручыў Майзэлю прадумаць добра і пасьля сабрацца.

— Што ты надумаеш?.. Што ты выдумаеш, калі яны самі выдумваюць такое, што... Ніякае згоды ня можа быць у нас з імі.

— А ты ўсё ня лечышся,—з дакорам сказаў яму Дуб.

— Згарыць няхай, лячэньне. Але немач ліхая на Бунд... Гэта-ж дадумваюцца ўжо дамагацца некаторыя сьвяткаваць суботу на прадпрыемствах. Дадумаліся!..

— А я—як сабе хочаце, хлопцы, перабіваю вашую нараду... Ты, Майзэль, можашісьці сабе дахаты. Ігнася з Аронам я забіраю з сабою, на сёлы паедзем. А можа і ты з намі?—запытаўся ў Майзэля.

— Я магу... Куды хоч.

— Не, і без цябе абыдзецца. Сядзі лепш ў горадзе,—пажартаваў сур'ёзна Арон.

— Ня хоч, ня трэба. Буду сядзець у горадзе. Бывайце!

— Ты-ж падрыхтаваў усё?—як пайшоў Майзэль, запыталіся хлопцы ў Дуба.

— Ня турбуйцеся. А хто-ж гэта зрабіў-бы за мяне?

— У цябе там дзядзькі добрыя ёсьць. Хоць-бы вось той, што з пісулькаю заходзіў. Корч дубовы!

— Гэта вы пра Яську? Добры мужык. У мяне ўсе гэтакія.

— Маладзец, Дуб!—палэпаў яго па плячы Арон.—Дык будзем хіба і зьбірацца.

— Вы ідзіце пеша з гораду, а на ўскраіне я вас ужо даганю. Ды захапіце з сабою чаго-кольвечы. Там дзядзькі нашы ой як згаладаваўшыся па добрым слове.

## ДВОР СЛАЎНАЕ

ДВОР Няслаўскіх быў ня надта вялікі, але і не малы. Меў ён сабе маргоў пад трыста ральлі ды з пяцьдзесят сенажаці. Сенажаці дык малавата і для малога двара, але ня трэба забываць, што сенажаць тая паўзрэчная, з травою ў калена. А калі падумаць, што касілася яна аж два разы, дык сена ў двары было хоць і продай. Аконам Няслаўскага гэтак і рабіў. Толькі продаў ён ня сенам, а сенажацьцю, вядома дзе горшая, бліжэйшым сёлам, і не саро-

меўся злупіць як больш, не ўважаючы на літасьць пана да мужыкоў. Здаралася, што пакрыўджаныя мужыкі ад аконама ішлі к пану, калі траплялася быць таму ў двары. Няслаўскі, ветла пагаманіўшы, часта адмяняў аконамава распараджэньне. Мужыкі ня крыўдзіліся на пана, можа таму, што ён рэдка наяжджаў у свой двор і то на дзень ці на два, зусім выпадкова—на які месяц.

На адным канцы дворнае зямлі вёрст на тры ўдаўжкі і ўшыркі рос добры лясок. Якіх толькі дрэў ня было ў тым лесе: і дуб, і бярэзіна, і хваіна, і алешына, і арабіна, і граб. Густымі кустамі рос арэшнік. Багаты быў лес, асабліва на грыбы ды ягады. Лахва-б блізкім сёлам, каб не вартавалі панскія людзі. А то: прыходзяць часамі бабы дадому з голымі рукамі ды падранымі спадніцамі, пайшоўшы ў лес з торбачкамі ці кошыкамі. Нарвецца часам, на яго страх, панскі стражнік з стрэльбаю ды сабакамі, ну і бяда. Хоць ты плач, хоць ты скач, а заграбіць, возьме што, вось і хадзі. Але на пана ня скардзіліся, казалі, што ня ведае ён пра тое.

З другога канца межаваў двор са скарбовымі сенажацямі, якія нейкім дзівам падпалі пад панскую апеку Няслаўскага. Гэтае скарбовае сенажаці добра перападала ад сельскіх хлапцоў—зухаў: добрую палавіну спасвалі начлегамі. Але-ж так ёмка спасвалі, што з году-ў-год дворныя ніяк не маглі ўлавіць вінаватых.

На мяжы дворнае і сельскае зямлі рос другі лясок, ня горшы за першы, а мо' і лепшы. Гэты лясок лічыўся сэрвітутным, але ніхто з сялян ня меў права высекчы ў ім ані дубчыка. І тут наклаў сваю лапу двор. Праўда, сялянам дазвалялася пасьвіць, зьбіраць грыбы (ягады тут не расьлі). А што да лесу, дык браў усё двор. Ці бура павыварочвае хвоі, ці сасхне алешына або дуб, дык прыяжджаюць на сваіх даўжэзных карах дворныя і забіраюць у двор. І ўсе неяк ўчалі, быццам і права гэткае павінна быць. Старэйшыя дзяды казалі нібыта, што гэты лес сумесны і нават больш сельскі, чымся дворны, але так яно ўжо пайшлося і пазвыкаліся людзі, махнулі рукою.

Самы двор з пакоямі і будынкамі месьціўся блізка ад ракі на высокім узгорку. Вялікія пакоі на два паверхі тварам сталі да ўезду ў двор, а задняю сьцяною схаваліся ў густой засені старога саду. Сад, парассаджваны, як парк, і парэзаны жоўтымі сьцежачкамі, цяг аж да ракі. З шыршае садовае дарожкі ў раку сходзілі к самай вадзе сходкі з парэнчамі.

Улетку тут вельмі прыгожа. Высокія таполі серабром свайго лісьця шалпатліва паблісківаюць на сонцы. Над ракою рыпацяць ціха-задуменна раскідзістыя вербы, купаючы спусь-

ціставе крохкае гальлё ў вечна-цянёвай вадзе. Сонцу не праплішчыцца скрозь гушчыню іх, вада пад тым берагам халодная, як лёд. У садзе ля сходкаў у раку стаяць прыгожыя лаўкі пад пахучымі кустамі бэзу. А перад лаўкамі клапатліваю садоўніцкаю рукою пароблены клюмбы, абкладзеныя залёным дзёрнам. Птушкам развольле тут: машкары хоць убаўляй: ды ягадных кустоў нямала—агрэст, маліна, парэчкі.

Пасярэдзіне саду густа аплеценая пахучым дурманлівым хмелем прытульна схавалася за валоскім арэхавым дрэвам прасторная альтанка. Страха ў ёй з грубога ў палец шкла. Прыгожа палятуцець тут у паўдня на адпачынку, ня чуючы чалавечых галасоў. У самой альтанцы лёгкі зялёны змрок, толькі зьверху дзе-ні-дзе прасочваюцца зблудзіўшыя струменчыкі яснага сонца, нібы ня месца ім тут.

Люба з Ларысаю прыехала ў двор з гораду на спружыністай невялічкай, як двайм сесьці, каламажцы. Ларыса зрабілася за фурмана. Седзячы ўпоруч з Любаю, паляскваля яна стусіноваю пугаю, а шэры рахманы конік шпарка імчаў іх па роўным, убітым шляху. І не аглядзеліся нават, калі конь зьвярнуў у няшырокія густыя прысады з ліп. Ліпы пааддцьвіталі ўжо, але пахучасьці свае дасюль ня страцілі. Насустрач трапляліся мужчыны з косамі, кабеты з граблямі і ўсе загадзе нізка кланяліся, а мужчыны і шапкі здымалі. У адказ ім Ларыса весела гаварыла ласкаю, каго ведала—аклікаючы на імя.

У самым двары сустрэў аконам.

— Дзень добры, Ларыса Вадзімаўна! Бяз бацюхны пажадалі прыехаць.

— Калі-ж бацьку ніяк часу ня выкраіць, вечна ўсё заняты ў сваёй управе. Затое я прывезла сваю добрую таварышку, Любу Дарошаўну. Знаёмцеся...

— Вельмі рад,—праказаў будзённа, думаючы, што гэта казённае „вельмі рад“ упадабае Любе.

— А ў доме ўсё ў парадку? Як нам пакоі?

— О, ня турбуйцеся, паважаная Ларыса Вадзімаўна, пакоі заўжды гатовы для вас. А калі што, дык Стася пад вашым распараджэньнем.

Кінуўшы пугу і лейцы аконаму, Ларыса ўхапіла за руку Любу і бежкам пабегла ў пакоі.

З параднага пад'езду дом трымаўся на чатырох каменных, выгладжаных, як люстэрка, бліскучых слупох. Мураваныя сьцены, грубыя каменныя, пафарбаваны былі ў сьветла-шэрую фарбу. Дубовыя рыпучыя дзьверы не прапушчалі праз сябе ані званьня відна і за імі ў калідоры панавалі няпрыемныя ўдзень поцемкі.

Дзяўчаты ўзьбеглі па сходках на другі паверх. Пасьля першага змрочнага паверху вочы няпрыемна засьляпіла ад вікна і сонца, што ўлівалася багата праз шырокія шкляныя дзьверы, якія выходзілі на бальконы па абодва канцы калідору. Пры самых сходках ля сьцяны стаяла вялікае медзьвядзёвае чучала. На сьценах—карціны. Пад нагамі няшырокая дарожка з мяккага дывана.

Ларыса завяла Любу ў пакой і, лёгка пагойдваючыся ў хадзе, вышла, пакінула адну.

У пакоі, які быў мусіць за спальню, адапяты шырмамі, стаяў ля сьцяны дубовы прыбраны чыста старасьвецкі ложак. Насупроць ложка ў кутку—туалетны столік, пара мяккіх крэслаў. Яшчэ ў пакоі была шафа з люстранымі дзьверцамі. А ў кутку над столікам вісеў портрэт пекнае, крыху паўнаватае маладое пані. Адным позіркам павёўшы па пакоі, заўважыла ўсё Люба.

Люба паспрабавала адчыніць шафу. Дзьверцы лёгка падаліся і адчыніліся. У шафе вісела некалькі дарагіх шаўковых адзеньняў, пара дарагіх капялюшоў, аздобленых густымі стравусовымі пёрамі. Адзеньне аддавала даўно забытымі пахамі жаноцкае пекнаты і парфумы. Люба паклала свой пакуначак і распранулася. Толькі пасьпела Люба прыбрацца, як увабегла Ларыса.

— Гатова? І добра! Хадзем палуднаваць.

Ларыса вёртка ўхапіла Любу пад руку і яны вышлі на калідор. Іх сустрэла маладая дзяўчына, падперазаная белым хвартухом.

— Падавай, Стася.

— Зараз, паненка.

Дзяўчына сышлася ў першы паверх.

— Ларыса, скажы, чый гэта портрэт у маім пакоі.

— Ён яшчэ там?

— А чаму яму там і ня быць?

— Ах, я і забылася зусім... Гэта портрэт мае мацеры.

— Якая прыгожая, велічная пані,—шчыра праказала Люба.

— Але мая маці... Толькі яго думалі вынесьці і я ня ведаю, чаму ён яшчэ там.

Любу зьдзівіў тон Ларысінага голасу, такі ён быў няпрыемны, без павагі, бяз жаднае любасьці ва ўспамінку. І відаць, Ларысе зусім не хацелася гаманіць на гэтую тэму.

„Ат, што мне такога да яе мацеры", падумала Люба і ўголас стала цікавіцца пакоямі.

Тымчасам Стася паставіла полудзень і дзяўчаты селі палуднаваць. Елі моўчкі, быццам-бы нядаўная гутарка адабрала мову. Люба паказала выгляд, што цікавіцца мясцовасьцю, якую добра відаць было, а Ларыса і зусім увагі не

зьвяртала ні навошта. Пасьля полудню толькі яна запрасі Любу агледзець увесь двор, з чым тая вельмі прыем згадзілася і абедзьве, ня бавячыся, сышлі на ніз...

Некалькі дзён прабыла гэтак Люба за госьцю ў Ларыс

На трэці дзень ураніцы Люба прачнулася ад тупа і бягні па калідоры. Вось зноў нехта прабег моцна. Ада зноў зрабілася ціха. Учора позна палеглі спаць і гэтак хацелася ўставаць яшчэ. Толькі гэта замгнула была зно як яе ўзбудзілі крыклівыя галасы.

Крычалі, мусіць, насупроць Ларысінае спальні, што бы трохі ззаду за Любінаю, але галасы ясна далятлі да Люб Яна шпарка накінула на сябе адзеньне, але не наважылас выйсьці і даведацца, у чым там справа. І як адзелася, ды гэтак і ўстыла, здаецца, за дзьвярыма.

Цяпер крычаў якраз жаночы пекны голас, але таму, шт крычаў і злаваў і пагражаў нават, быў ён няпрыемны. Мі вольна глянула Люба на портрэт велічнае пані і тая здалас ёй сухою і нават жорсткаю. Голас на калідоры гэтак зл чаўся з жорсткаю велічнасьцю портрэта.

— Брыдкая дзяўчынка!

— Дачка свае маткі,—адказаў другі, малады і такі сам жорсткі голас.

Люба здрыганулася: Ларысін голас.

— Бацькава дачка, а ня матчына,—злосна кальнуў незн ёмы голас.

— Ня сьмей заходзіць! Ня сьмей, бо я ня ведаю, шт зраблю! Мацеркі не зьяўляюцца гэтак да сваіх дзяце Мацеркі дзяцей выхоўваюць, а ты!..

— Ларыса!

— Вон! Каб твой і сьлед устыў! Стася!—клікнула моц Ларыса і на яе голас прыбегла дзяўчына.—Стася, пані хо ехаць у горад, скажы, каб запрэглі коні.

— Бацькаў вырадак!—прасіпеў панін голас.—Бацьк вырадак.

— Вон! Не гамані! Вон! А не—я прымушана буду людз паклікаць.

— Коні запрэжаны, паненка,—са сходкаў гукнула Ста

— Вось бачыце, як слухаюць майго распараджэньня ту А таму зараз-жа едзьце з маіх воч.

Галасы напружана паціхлі і крокі разышліся ў роз канцы.

Некалькі разоў у часе лаянкі парывалася Люба адчы дзьверы і нешта ня пушчала яе з месца. Нярухома даста яна канца і толькі, калі аціхлі крокі, тады падбегла к акн прачыніла і зірнула на двор.

З пакояў вышла высокая стромная жанчына. Гарнітур ле па фігуры, пашыты па нятутэйшай модзе, быў вельмі дарагі і гэтак ішоў да твару. Шаўковая накідка павісла пышнымі склалкамі па бакох. Шырокія палі шэрага крэпдэ-шынавага капялюша ў цьмяны цянёк увабралі прыгожы і пагардны твар.

Плыўкаю хадою падышла яна да экіпажу, азірнулася на пакоі і села.

— У горад!—прыемным гучным голасам сказала яна фурману.

Фурман напнуў лейцы. Коні ірвануліся. Прыгожая жанчына стромка зыбнулася на панскім сядзеньні, нядбайна закінула назад галаву, напалову лягла-схілілася да сьпінкі сядзеньня. Плыўка пагойдваючыся, стромкая, прывабная, яна хутка закрылася зялёнымі ліпавымі прысадамі.

## *ЧУЖУЮ БЯДУ ПАЛЬЦАМ РАЗЬВЯДУ, А СВАЁЙ УМА НЕ ДАБЯРУ*

БЯСКОНЦА зьбянтэжаны бегае па пакоі ў сваім гарадзкім доме Нясла́ўскі. У пальцах правае рукі зацістнуты лісток сьпісанае паперы.

— Зноў!.. Зноў!..—сам да сябе праказвае ён і, праказваючы, раз-по-раз кідае баязьлівыя зіркі на вокны.

Спакою... адхланку няма.

„Прыехала ненадоўга. Перш наведаю маёнтак, даведаюся, як растуць прыбыткі, а потым і да вас. Буду вельмі рада прынесьці з сабою задаваленьне змучанай душы, калі яно яшчэ не надышло. Доўга не забаўлюся, хвілін 10-15, час, які патрэбен, каб пераложыць 1000 руб. білетамі з аднае кішэні ў другую. Чакайце... Дора“.

Можа тысячны раз перабег ён вокам па гэтым бяскрыўдным лістку паперы паміж боязных воз́ркаў на вокны.

— Літасьці!.. Літасьці, о неба!..—сьмешна-трагічна ў высокім тоне ўсклікнуў Нясла́ўскі.—Мудра кажа народная прыказка: чужую бяду пальцам разьвяду, а сваёй ума не дабяру. І не дабраць, як быццам усе сілы неба і зямлі злучыліся ў адным саюзе і пабажыліся зрабіць канцы. Не! Яшчэ не! Пачакайце... змагацца будзем!

Па бруку праляскацелі звонка падковамі коні і шум гумаляставых колаў мякка аціх перад домам.

Няслаўскі ў роспачы сьціснуў рукамі галаву, пакінуў бегаць. Як бы шукаючы дапамогі, азірнуўся вакол і бяз сілы цяжка хлюпнуўся ў крэсла.

А не пасьпеў ён і трохі супакоіцца, як пакаёўка прынесла візытную картку. Картка аддавала гострымі пахамі жаноцкае парфумы. Няслаўскі нават ня зірнуў на яе, нават не патурбаваўся прачытаць імя, прыгожа выдрукаванае на паперы шоколяднага колеру, ён махнуў млява рукою і сказаў пакаёўцы:

— Прасі.

Цяпер толькі ён заўважыў, што дасюль ня пусьціў з рук лісьціка паперы і машынальна загарнуў у яго пахучую візытную картку. Выпусьціў. Пісулька з карткаю ўпалі на стол.

Скідаючы на хадзе пышную шаўковую накідку, увайшла велічная прыгожая пані, якую бачыла ў двары Няслаўскіх Люба.

— Добры дзень, Вадзім Пятровіч! Ды пасобце-ж мне, нярухомы.

Жанчыніны пальцы ніяк, здаецца, ня могуць управіцца з зашмаргамі шаўковых шнуркоў накідкі. Няслаўскі як-бы нехаць, але прыцягнуты вялікаю сілаю да жанчыны, узьняўся з крэсла.

— Павіннасьць і абавязак мужчын пасабляць жанчынам, Вадзім Пятровіч. Які вы неўвароткі. Дзякуй, я сама лепш. Ну, вось гатова... Гэтая накідка мне сэрца пераела ўжо са сваімі шнуркамі. Трэба замяніць яе, у адстаўку пасдаць.

Жанчына кінула нядбайна на рукі Няслаўскаму спрэс новую накідку і той асьцярожка аднёс і паклаў яе лёгенька на канапе.

— Вы сталі гэтак галантна, Вадзім Пятровіч, абыходзіцца з жаноцкімі рэчамі. Ці не працяла часам вашага найкволага сэрца амурава страла?—насьмешліва кінула яму ўсьлед жанчына.

— Кіньце вашы шпількі, Дора. Скажыце лепш, чым магу служыць?—халадна запытаўся Няслаўскі.

— Занудзілася па родных палястынах, ну і па вас, паважаны, Вадзім Пятровіч. Як ні добра ў вялікім горадзе, а нудна часам, асабліва, калі...

— Калі што?—пасьпешна запытаўся Няслаўскі і нейкая надзея прамігнулася ў яго запытаньні.

Жанчына злавіла яе і, злавіўшы, чароўна і пільна зірнула ў вочы Няслаўскаму з-пад шырокіх палёў сталічнага капялюша.

— Асабліва, калі... не стае грошай.

— Я гэтак і думаў,—ціха сказаў Няслаўскі.

— Вы не памыліліся,—утомна адказала жанчына. Няслаўскага ўкалола гэта.

— Грошай не стае. Та-а-ак... Асабліва, калі...

— Што?—нядбайна запыталася яна.

— Калі, не зважаючы на кроў, якая разьліваецца морам па манчжурскай зямлі, калі не зважаючы на ўсе цяжкасьці ў краіне...

— Я цярпліва слухаю вас, гаварыце, калі ласка.

— Вы і не шманаеце!—падвысіў голас Няслаўскі.—Вы ня дбаеце! У поўным разгары, як ніколі, усялякія пікнікі, перапоўнены бары... кафэ-шантаны!.. Цыганы!.. Вось што цікавіць вас. Дзіва што нудна часам, асабліва, калі няма грошай.

— Праўда,—холадна сказала жанчына.—І ўсё-ж такі грошы—тэма нашае сёнешняе размовы.

— Ведаю. Але і вы павінны тож ведаць, што не багаты я на грошы.

— Ня турбуйцеся, не сьпяшыце да часу выклікаць у мяне сьлёзы. Перш, чымся заехаць да вас, я пабыла ў маёнтку.

— Там Ларыса,—хваваравітым голасам сказаў Няслаўскі.

— Вы не памыліліся, там ваша дачка.

— І ваша, Дора!—палка выкрыкнуў Няслаўскі.

— Не гарачыцеся. Пра дачку пасьля. Я была ў маёнтку. Паглядзела, бязумоўна, як маецца. Паслужлівы аконам пазнаёміў мяне з усім прыбыткам за год, і я цяпер магу патрабаваць ад вас...

Ціхі енк вырваўся з грудзей у Няслаўскага. Жанчына зьдзіўлена зірнула на яго, адале быццам успамянула, што гэта не першыня, усьміхнулася і, прыўзьняўшы, паклала на вольнае крэсла прыгожую стромкую нагу, абутую ў дарагі чаравічак.

— Хутчэй, хутчэй гаварыце, лёс жыцьця майго, колькі?—пахмура безнадзейна выціснулася ў Няслаўскага.

— У пісульцы напісана. Але дзякуючы добрай сустрэчы ў маёнтку і тут у вас, напалову можна адбавіць.

Надзея быццам зьвярнулася да Няслаўскага. Але жанчына па-драпежніцку ўсьміхнулася—не злавіць—аднымі куточкамі вуснаў.

— Я патрабую паўтары тысячы!

— Дора!

— Што такое, Вадзім Пятровіч? Хоць, дарэчы, я перастала быць за Дору вам.

— Дора! Адумайцеся! Успамяніце наша мінулае, наша жыцьцё разам...

— Навошта? Я ня бачу ніякае патрэбы ў гэтым.

— Дора!—мучэньне адбілася ў голасе ў Няслаўскага.— Дора!.. Заклінаю вас усім, што асталося ў вас дарагога. Заклінаю вас першым днём нашае сустрэчы, днём нараджэньня нашае дачкі...

— Нудна... Потым пра гэта. Мінула пятнаццаць хвілін, якія я прызначала для нашых перамаўленьняў, а я яшчэ ня бачу, чаго мне трэба, Вадзім Пятровіч. Паўтары тысячы...

— Я ня маю такое сумы.

— Ня маеце?—злосьненька перапытала жанчына.

— Ня маю.

— Тады і я ня маю больш рацыі маўчаць і дасюль не аддаваць вас у паліцэйскія рукі.

— Дора!

— Спалохаліся. Можа перадумаеце?

— Ня маю я грошай.

— На рэволюцыйную пропаганду маеце, а жонцы няма?— крыкнула жанчына.—Насупроць цара ісьці ёсьць, а мне...

— Літасьці, Дора!.. Як шчасьця прашу я, успамяніце наша мінулае... Я забуду пра ўсё... Я кахаў і кахаць буду вас, як ніводзін мужчына не кахаў жанчыны!

— Вы маладзееце, а не старэеце, гэта прыемна бачыць на вас. Але да справы яно не належыць. Вы ня шчыры. Гаворыце пра бязьмернае каханьне, а ўпотайку наклікаеце сьмерць. Няўжо ўсе рэволюцыянэры такія? Гаротны цар! Колькі цярплівасьці патрэбна мець, каб кіраваць такімі падданымі.

— Маўчыце, Дора!

— Не падабаецца? Пра гэта маўчу. Вадзім Пятровіч, я ня маю часу бавіцца, мне трэба на поезд,—суха праказала яна.

— Дора, пабудзьце хоць сёньня... Паедзем у наша Слаўнае. Там Ларыса... Яна-ж скончыла ўжо гімназію... Мяркуе стаць настаўніцаю.

— Адвязьніце з вашай дачкою, яна мне за малым воч не павыдзірала сёньня.

— Што?

— Што чуеце. Мусіць кволы бацька ў хвіліне найкволых парываньняў палічыў доўгам ачарніць матку, каб самому пабялець. Давайце грошы, я ня маю ні хвіліны чакаць больш.

— Што паміж вас было, скажыце, Дора?

— Давайце грошы!—адрэзала яна.

Няслаўскі ўстаў, цяжка прайшоў па пакоі і, не праказаўшы больш ні слова, вышаў, не зачыніўшы за сабою дзьвярэй. Жанчына забарабаніла часта абсацам чаравічка

ў падлогу. Зірнула ў люстра, што стаяла ля сьцяны насупроць, папраўіла кокетлівым рухам капялюш і густым звонкім контральто засьпявала арыю:

> Куда, куда, куда вы удалились,
> Весны моей златые дни?..
> Что день грядущий мне готовит?..
> Его мой взор напрасно ловит...

Пакінула сьпяваць, уздыхнула лёгка, як уздыхаюць гуляшчыя жанчыны, зірнула зноў у люстэрка, абцягла наперадзе вуалевае адзеньне, аголіла высокія поўныя грудзі. І ўсьміхнулася аднымі вачмі: у люстэрку ўбачыла йшоўшага назад Няслаўскага.

— Дора, даруйце мне за навязнасьць. Наша дачка—малёваны портрэт мацеры... Дора, слухайце!—убачыўшы, як кісла скасабочыўся твар яе, усклікнуў Няслаўскі:—не перапыняйце. У яе і характар матчын. Няўжо вам ані не шкада яе? Раскрыйце, ваша сэрца для жаласьці і каханьня. Усю віну я вазьму на сябе. Забудзем пра цяперашняе. Калі вам не падабаецца тут—я спрадам усё—выедзем адсюль, куды толькі вы пажадаеце. Я стану на добрую службу. Вас акружыць каханьне і шчасьце ў ціхім сямейным прытулку. Дора!

— Вы—гумористычны поэта, Вадзім Пятровіч. Дасюль я не падазравала вас у гэтай здольнасьці.

— Кіньце вашы балючыя жарты. Прабудзіце ў сваім сэрцы чалавечы гонар,—усё ў тым-жа высокім тоне праказаў Няслаўскі і паставіў на стол прынесены куфэрачак.

— Я не жартую... То вы філёзоф, то політык, то безнадзейны трагік, то вясёлы поэта. Слухайце, сапраўды кіньце вы гэтую гульню ў лібэралізм, плюньце на вашу земскую ўправу, закладзіце ў банку маёнтак і пачніце пісаць вершыкі, ну поэмы, драмы, романы. (Жанчына ўстала з крэсла, падышла да стала, спынілася насупроць Няслаўскага, апякла яго гарачым поглядам). І я... Я стану жыць з вамі. Чуеце? Будзем жыць разам.

— Дора... Што за жарты?

— Гэта ня жарты, а тое, што я думаю,—скоса ўсьміхнулася яна і ўзяла куфэрачак.

Пакруціўшы ключыкам, што тырчэў у замочку, яна адкінула вечка. Каштоўная папера зашалпацела ў яе зграбных, тонкіх белых пальцах.

— Усё, што мог даць.

— Аднак тут няма да тысячы.

— Я аддаў усё, што было, і нават ня ведаю ці здолею выкраіць Ларысе...

— Зноў ты з Ларысаю!—не ўцярпела жанчына.

— Яна дачка твая, Дора.

— Вы правы, глупства зрабіла ў маладосьці.

— Перавярніце гнеў на літасьць у сваім сэрцы, Дора,— жаласьліва пачаў Няслаўскі.— Вы ўжо на жарты закранулі балючую струну ў маім сэрцы, вы жаргамі ўбілі надзею ў безнадзейныя думкі. Напраўду... Дора! Забудзем пра гэтыя барбарскія адносіны паміж нас. Паслухмяна я буду рабіць усё, што ты толькі загадаеш.

— Нават вершы, раманы возьмешся пісаць?

— На жарт і я магу пажартаваць: нават вершы і раманы пачну пісаць.

— Ня жарт, а праўда, я люблю мастакоў, поэтаў... Вы да гэтае ролі падыходзіце ўсё адно, як...

Няслаўскі праглынуў крыўднае слова, і горкасьць, як палын горкі, заліла надзейныя сумненьні, затапіла іх незваротна. Але вялізнаю сілаю зачароўваць людзей уладала жанчына, надта моцна прыкуты быў да яе прыгожаю жаноцкасьцю Няслаўскі. І ён перамог яшчэ раз сваю безнадзейнасьць і голасам, у якім злучыліся і горкае гора, і надзеі, і радасьць чаканьня, загаманіў:

— Усім сьвятым для вас на сьвеце заклінаю вас, Дора, зразумейце ўсю небясьпеку шляху, на які вы ўсталі. Яшчэ ня позна, дый позна лепш, чым ніколі, перадумаць і адмовіцца ад яго.

— Ні разу я дасюль ня бачыла вас у ролі страшнага вяшчуна.

Няслаўскі быццам не пачуў. Усё тым самым голасам роспачы і надзеі разам не пакідаў ён палка прасіць:

— Надыходзяць вялікія часы выпрабаваньняў нашай краіне, Дора!.. Сэрца ледзянее ад аднае думкі, што можа здарыцца. Трэба быць сьляпым ды глухім, каб ня бачыць і ня чуць усяго, што робіцца навакол. Розныя цёмныя рэволюцыянэры, паставіўшы сабе на мэце зруйнаваць, зрэшціць усё, чаго дасягнула чалавецтва, зьнішчыць усю культуру, набытую стагодзьдзямі, каб на вогнішчы збудаваць быццам сваё невядомае, новае жыцьцё, каламуцяць народ, падбухторваюць яго ўжо да нядобрых учынкаў. Жах ахапляе пры аднэй думцы, што можа распачацца ў адзін дзень і што наробіцца за які адзін тыдзень.

— Які спалох, якую трусьлівасьць, аднак, відаць з вашага драматычнага вяшчунства, Вадзім Пятровіч. Я сьмялейшая за вас, як сабе хочаце, і зусім нічога не баюся.

— Дора, падумайце. У вялікім горадзе, дзе рабочага люду хоць грэблю тахці... Ваенныя няўдачы яшчэ мацней падбухторваюць яго на ўсялякія благія ўчынкі. Просты народ цёмны, а для таго, каб лепшыць жыцьцё гэтага народу,

трэба яго адукаваць хоць крыху. Бо іначай стыхія раскілзаных нізкіх пачуцьцяў чорнага народу прынясе культуры непапраўную шкоду. Палкасьць людзей з нескладанаю псыхікаю, прыцягненых як дзеці малакаштоўнаю, але ў вока што коле, цацкаю, ня мецьме ніякіх межаў, аніякага ўяўленьня аб чалавечым гонары і шляхетнасьці. Я палохаюся за вас, Дора.

— А за сябе?—пагардна спыталася яна.—За сябе вы не палохаецеся часам? Ды як-жа вы кажаце, што калі-б я згадзілася жыць зноў разам, дык вы ў сваю чаргу пераехалі-б куды мне зажадаецца. Як вы абаранілі-б мяне, сваю каханую жонку, ад бруднае прагны гэтага чалавечага быдла? Хіба можа вы сталі-б у іх за народнага трыбуна, бо ў красамоўстве вам адмовіць нельга. Дык як, пытаюся я, зразумець вас?

— Дора... Дарагая!..

— Без кампліментаў,—строга пераняла яго прызнаньні жанчына.—Вам не дзевятнаццаць год і вы не гімназіст. Не забывайцеся на вялікую розьніцу ў гадох.

— Даруйце..—яму п'яніла галаву надзея, што можа адбыцца немажлівае і, губячы цьвярозую разважлівасьць і захліпаючыся ў слобах, ён ня цяміў пра што і што казаў.— Усімі сродкамі, усім, што будзе залежаць ад мяне і людзей я дам вам жыцьцё, якога вам толькі зажадаецца. Нарэшце, калі толькі патрабуецца, я аддам на ахвяру і сваё жыцьцё. Ці прымаеце вы ўсур'ёз мае словы?—бачачы, што яна зварахнулася, пасьпешна-баязьліва запытаўся Няслаўскі.

— Монолёг з вар'яцкага дому. Безгаловы чалавек вы, Вадзім Пятровіч. У вашай галаве, здаецца, усяго пакрысе: каханьня старога, спозьненага да маладое пекнае жанчыны, і філёзофіі, і палітыкі, і трагічна-гумарыстычнае поэзіі. Цяжкі брэд у вас, брэд чалавека з гарачкі. І вось зараз я падумала, што няма ў вас нічога ані і заміж галавы ў вас...

Другое вялікае крыўднае слова праглынуў Няслаўскі, і гэта яго выцьверазіла нібы.

— Вы гэтак думаеце?—пахмура кінуў ён.

— Дарэмна пытацца, так думаю.—праказала яна і замкнула куфэрачак.—Але-ж мае пятнаццаць хвілін расьцягліся на цэлую гадзіну. Заўсёды гэты ваш палітычны пустазвон забірае ў мяне дарагі час. Слухайце... пакуль што, як сябра ваш, я раю забыць пра гульню ў палітыку, бо дрэнна будзе. За вашым кожным крокам сочаць, не забывайце. Ня вызваліць вас ні дваранства, ні панства. Маёю задачаю сёньня зьяўляецца ўзяць у вас абяцаньне парваць з гэтымі юнац-

кімі дурошчамі. Не пакінеце, самі сябе вінавацьце пасьля. Я ад вас не бяру ніякае згоды, я прапаную вам—і кончана.

Аслупянелы слухаў Няслаўскі Ад апошніх слоў рысы твару яго ўстылі, закаваліся ў спалох і зьбянтэжанасьць. Але не сказаў ні слова. Жанчына сьціснула ў руцэ куфэрачак і падышла ўзяць з канапы сваю накідку. Няслаўскі быццам апамятаўся трохі, памкнуўся быў пасобіць ёй. Уладным, рашучым мігам рукі жанчына спыніла яго на месцы.

— Ня турбуйцеся... Абыйдзецца бяз вашае паслугі. Бывайце!..

Раптам зьбялеўшы, Няслаўскі бухнуў у крэсла, упусьціў галаву на рукі і заплакаў.

Жанчына шпарка вышла. У пярэдняй паклікала пакаёўку і загадала:

— Пану нядужыцца, дрэнна зрабілася. Падайце яму вады.

І, сказаўшы, плыўкаю велічнаю хадою, лёгкаю, быццам і падлогі не датыркаліся яе стромкія ногі, вышла на вуліцу, села ў экіпаж, і на быстрых дворных конях хутка зьнікла ў заломе вуліцы.

## ЗАЖЫНКІ

ЛЮБА не зачыніла акна і выбегла на калідор. На калідоры сустрэлася з Ларысаю. Даўшы будзённае „добры дзень", абедзьве адчулі, што хацелі сказаць штосьці адна аднэй, але нейкая нязручнасьць ня пушчала разгаварыцца. Не сказаўшы больш ні слова, разышліся і праз цэлы дзень ня бачыліся. Ларыса як-бы цуралася таварышкі.

Па поўдні Люба пайшла бадзяцца ў прысадах.

Смаліла бяз літасьці сонца. А ў прысадах быў сьвежы халадок. Як вокам сьцягнуць, уперадзе стаіць усё нярухома: задуменныя бярэзіны на шляху, ліпы ў прысадах, лес, жыты. Зрэдку калі прабарашчаць па сухой, цьвёрдай, як камень, дарозе калёсы. Закурыць, уздымецца ззаду бялюткі лёгкі пыл і растане. І зноў ціха і нярухома пад сонцам. Сінее на кругавідзе лес. Ня зыбаюцца сьпелыя залацістыя жыты. Усё адно як сьпіць недалёка на водкідзе сяло. Ляноты напалі на ўсё вакол, млявасьць ад сьпёкі.

З прысадаў Люба выбралася на шлях і бяз усякага сэнсу, бяз думкі жаднай у галаве паволі патупала ўперад. Быццам бы і на яе ляноты найшлі, гледзячы на млявую нярухомасьць паабапал, уперадзе і куды толькі ні глянь.

Валавянее галава; рукі зьвісаюць бясьсільна, цялёпкаюцца гэтак марудна; цяжэе поступ, а ўсё цела робіцца нейкім цягуткім і вадкім, як гразь.

Прайшоўшы з вярсту, Люба прыпынілася, стала. Хоць забі, ня хочацца ісьці—млявасьць, ляноты. Яна сышла ў бок і лягла ў бярозавай засені пад магутнаю сьцяною высокага жыта. Трава на гэтай бакавіцы шляху мяккая, бы шаўковая, гарачыя праменьні палкага сонца сілы ня маюць праплішчыцца скрозь густое гальлё бярэзьніку, ня здолеюць дастаць яе тут і пасушыць на порах. Ціха і задуменна-прыгожа, як у казцы.

Угару, дыхаючы сьвежаю засеньню, прыемна глядзець. Угары плывуць нехаць лёгкія, бы мары ў маладое дзяўчыны, бялюткія, як сьнег, аблачынкі. І высока-высока гэта. І адліпнуць нельга ад іх; гэтак хочацца глядзець Любе, і блакітныя зрэнкі яе воч большаюць, гледзячы ўгару, і каб паглядзеў хто з боку ў іх, дык убачыў-бы, як плывуць і ў іх гэткія-ж бялюткія лёгкія аблачынкі, як угары... Любіны вочы робяцца вялікія-вялікія ды глыбокія, быццам ахапіць хочуць за раз усё ці пазнаць нейкую вялікую таемнасьць...

А калі цені на шляху падаўжэлі, калі дыхнуў парыўчаты ветрык, нямаведама адкуль выбухнуўшы, ды калі зашамцелі перш ціха, адале званчэй ды званчэй жыты,—Люба ўстала. Залацянаю грываю каласоў хвалявала жыта; загулі старыя бярэзіны, пажвавелі-заціліўкалі птушкі; пабеглі шпарчэй, выпярэджваючы адна адну ў блакітнай вышыні дзявоцкія мары-аблачынкі. Як люба і прыгожа! Зусім як у казцы.

Атрапнула Люба ляноты, прагнала вадкую млявасьць і не завярнулася, а бадзёра пайшла па шляху ўперад. Вечар яшчэ далёка.

Сонца адапялася ад зямлі сьвіцюшчаю посьцілкаю, вытканаю дурасьлівым ветрам з цьмянаватых аблачынак-хмарак. Гудзе шлях. Звонка сьпяваюць буйныя сьпелыя жыты. Не пакідаючы, хочацца слухаць Любе патаемную задуменнасьць шапаценьня, прыгубіць хочацца і піць бяз меры ціхі звон жытнага сьпяваньня.

Можа тры, чатыры ці пяць вёрст прайшла гэтак Люба і вышла на ўзгорак. Вярсты за дзьве ў нізку зьляпілася сяло. Зводдаль з жытоў чуты жаноцкія галасы. Сьпявалі.

Люба паскорыла хаду. Сышла набок. Вось ужо і словы сьпеваў можна разьбіраць,—смутныя, журлівыя сьпявалі.

Ой у полі дымна-дымна, дый нічога ня відна.
Толькі, відна мігаецца, дзе Іванка ваюецца.
Дзе Іванка ваюецца, па ім матка журбуецца.

Ня журбуйся, мая матка, не адзін ды ваюю.
Не адзін я ды ваюю, сівы пад мною,
Сівы конік пада мною, а сам госпад нада мною...

Канчатак кожнага радка сьпяваўся па два разы, і невялічкая песьня цяглася гэтак доўга, здаецца, журліва.

Паводдаль убачыла Люба, як схінаюцца і ўстаюць белыя фігуры. Мільгане над жытняю раўнінаю каласістая жменя і зьнікне.

— Жнейкі,—падумала Люба.

Яна не памылялася. Падышоўшы бліжэй, Люба ўбачыла ў постаці жней. Нядаўна толькі зажалі. Чутно, як рэжуць сухапявуча сярпы, як шастаюць на іржышча цяжкія жмені. Спорна ўвіхаюцца жнейкі, кожная за сваім канцом. Але яшчэ і па снапу не нажалі.

— Памагай бог!—гукнула Люба.

— Дзякуем!

Паразгіналі сьпіны маладзіцы і кабеты, паўставалі ад постаці. Усе ў белых вышываных кашулях, старыя з намітками, маладзіцы з накругла пазавязванымі хусткамі, у новенькіх лапціках з белымі анучкамі. Самі ўрачыстыя такія і самотныя.

— Якое гэта сялцо, цётачкі?—запыталася Люба.

— Хорашава, залаценькая паненачка,—адказала пажылая рухавая кабета.—Ці патрэбна што там? Сядзь, адпачні, зажынкі адбудзь з намі.

— Часу няма, даражэнькія: зайсьці трэба дый назад, аж да Слаўнага.

— Хіба пан пасылае навошта ці па сваёй ахвоце, паненачка?

— Па сваёй, цётка. То-ж жыць у Хорашаве за настаўніцу буду ў школе.

— Ага, вось яно. Дык, калі ласка, паненачка, сапраўды пабудзьце, пажупім трохі.

— Пабудзьце... Пабудзьце, паненачка.

Сорам быў Любе слухаць, як яе клікаюць паненкаю, такая-ж самая мужычка, як і яны. І адмовілася ад запросін, падзякавала, пайшла ў сяло.

— Дык калі-ж пераедзеце, залатая паненачка?—уздагон ёй запыталіся.

— Хутка, цётухны, паглядзець трэба-ж перш.

— Ну, ідзі здаровенька! Каб усё ўпадобала.

— Дзякую.

— Гэткая маладзенькая і ўжо за настаўніцу.

— Гаваркая. Дый з наскіх, здаецца.

— Дзякаваць богу і бацьком,—вышла ў людзі.

Разважалі перш самі паміж сабою жанчыны, як пайшла Люба, а потым зноў засьпявалі і сьпевы даганялі Любу. Можа пра таго-ж самага Іванку сьпявалі, ці пра якога іншага, толькі галасы былі гэткія-ж задуменна-маркотныя, у сьпеве сумавала сястра па брату, якога нейчыя благія рукі адарвалі ад яе.

Ой, пайду я кругом луга, пашукаю свайго друга.
Няма ў лузе нікагенька толькі раньні салавейка.
Салавейка птушачка, ды ня пой-жа раненька.
Ня будзі майго ты госьця. госьця майго дарагога.
Госьця майго дарагога, браценьку май о раднога.
Ён учоранька прыехаў, а сягоньня ад'яжджае,
А, сягоньня ад'яжджае, мяне адну пакідае...

Ох вы, сьпевы мужыцкія, кабечыя! Колькі спрадвечнае журботы і клопатаў у вашых словах і гуках, колькі маркоты і жаласьлівасьці ў вашых сьпявальніц. Толькі адзін раз пачуўшы, ужо не забывацца вас ніколі. Чапаеце, турбуеце вы найкволыя струны чалавечага сэрца. І хараство ў вас і маркотная самота. І слухаў-бы вас, ніколі-б не перслухаў ніколі не задаволіўся-б, слухаючы.

Сялом беглі авечкі і сьвіньні, закурыўшы пылам вуліцу, калі прышла Люба. У старэнькае-старэнькае бабулькі, якая абапіраючыся на кіёк, пераймала авечкі, запыталася яна, дзе школка.

— Школка?—прысьлепаватымі вачмі зірнула тая на дзяўчыну.—Ды хто яе ведае? Ганулька!.. Ганулька! Завядзі, дзеткі, паненку да школы.

Падбегла босая, у зрэбнай кашулі дзяўчынка, саромліва збочылася.

— Ды ты-ж ня стой, а ідзі пакажы,—падапхнула сваім кійком дзяўчыну старая.

— Вам да Войтавых трэба?—запыталася дзяўчынка.

— А я ня ведаю да каго,—усьміхнулася Люба (неўзабаве будзе яна абсыпана кучаю гэткіх дзяцей). Весела стала ёй.—Я хачу паглядзець школу.

— Я пакажу—ціха праказала сарамяжая дзяўчынка.

Люба пагладзіла яе па ўскудлычанай, у пясок паробленай галаве, і ўзяла за руку.

— Гэта недалёка тут, пад той канец. Трэба прамінуць пяць калодзежаў. Там стаіць вялікая такая хата з новаю брамаю ў дварэ. Вось гэта і будзе школа.

Глытаючы густы пыл, Люба вышла з дзяўчынкаю на другі канец сяла, за якім пачыналася вялізнае балота, зыбкая дрыгва. Па сярэдзіне гэтае дрыгвы цякла гнілая рэчка.

Далёка на захад балота межавалася з лесам, высокім і густым. З балота несла ў сяло вільгаць і наганяла плоймы камароў і мошак.

На ганку Любу з дзяўчынай сустрэў сівенькі, як голуб, дзядок.

— Дзед!.. А, дзядуля! Паненка вось прышла пaглядзець школы.

— Га? Што?—схіліў галаву стары, аглух ад старасьці. Дзяўчынка падбегла спрытна і закрычала яму на вуха.

— Хадзіце! Хадзіце!—заварушыўся стары.—А мне даруйце, стары стаў, ня чую ўжо.

Школа была ў самай багатшай на сяле хаце. Перагаро джана яна была дошкамі на дзьве палавіны: большую займала кляса, а меншую—пакой настаўніцы. Сьцены былі атынкованы, пабелены. Апальвалася школа печчу і ляжанкаю. Ляжанка цягла ў пакой настаўніцы. Цяпер было тут няпрытульна—адны голыя сьцены. У клясе віселі ў багетавых рамках портрэты цара і царыцы. Люба адвярнулася і запыталася ў дзяўчынкі:

— Ты вучышся ўжо, Ганулья?

— Не, тата з мамаю ня пушчаюць, што няма за чым вучыцца.

— А ты папрасі іх хораша, пусьцяць.

— Я хочу вучыцца.

— Вось і добра. Забяжы ка мне, як прыеду.

Трэ' было сьпяшацца, каб пасьпець завідна ў Слаўнае. Разьвітаўшыся са старым і з дзяўчынкаю, Люба пашла з Хорашава.

Не адышлася яна яшчэ можа з вярсту, калі насустрач ёй вылезьлі з-за ўзгорачку сялянскія драбіны. У перадку стаяў на каленцах высокі, шырокі ў плячох здаравец і, но каючы і пасьвістваючы пужкаю, падганяў каня. У задку сядзелі два чалавекі.

Люба прамінула і пайшла-б сабе далей, каб яе раптам не паклікалі. Яна азірнулася. Драбіны спыніліся. З воза саскочыў і падбег Ігнась.

— Вязе нам, Люба... Як тапельнікам...

— Ну, вось... Скажы лепей, як гэта нечакана і добра. Яна рада была, што ўбачыла Ігнася.

— А мы з Аронам. Ты не пазнала яго? Арон, ды падыдзі-ж!

Арон ужо і сам вылазіў з растрыбушанае саломы.

— Мы едзем на сходку. За Хорашавым недалёка будзе.

— Жанчыны там будуць?

— Ці не дагаварваешся, каб і цябе ўзялі?

— Слухайце, я хочу пабыць там,—сур'ёзна папрасіла Люба, як падышоў Арон.

— Ігнась, вядома супроць. начай ня можа і быць... Калі вам дазваляе час, ну і ўсё іншае,—я, думаю, што можна.

— Сапраўды, вазьміце мяне. Ай, я яго і слухаць ня буду,—убачыўшы, што Ігнась зьбіраецца нешта сказаць, пасьпяшыла Люба.—Маўчы, маўчы!—замахала яна рукамі.

— Прысільваць я яшчэ нікога ня прысільваў рабіць, як каму ня хочацца, асабліва цябе,—сказаў Ігнась.

— Дзякуй. Вось і добра. Значыцца, бярыцё мяне.

— Пасьпяшым, бо наш фурман ня выцерпіць,—уставіў Арон.

Усе трое падышлі к драбінам,

— Эх, сядайце, панічы, а то спозьнімся!—сьмяхотліва крыкнуў Дуб (гэта ён сядзеў за фурмана).

— Ня дуры, Дуб,—сур'ёзна сказаў Арон.—Вы незнаёмы? Знаёмцеся.

— А ўсё-ж такі сядайце, госьцікі,—сказаў Дуб, папраўляючы салому ў задку.—Пакрышыце мне сёньня драбінкі,—кінуўся ў сьмешлівую знарок жаласьлівасьць ён.—Загрызе бацька.

— Зубы паломіць,—засьмяяўся Ігнась.—Ці можа і бацька гэтакі, як сын?

— Трохі не такі, дзякаваць яму. Дзе вы бачылі, зямля ня вытрымала-б двух такіх Дубоў.

З першага разу ўпадобаў ён Любе, гэтакі просты, адкрытны і дужы, без усялякіх хітрашчаў і мудраваньняў.

— Гэй, дарогу!—крычаў на голы шлях Дуб.—Панічоў на кірмаш вязу!

— Дуб...—зірнуў з дакорам на яго Арон і зарагатаў: той прыкінуўся такім вінаватым, што аж сьмешна зрабілася.

Зарагаталі і Ігнась з Любаю, наглядаючы за Дубам і Аронам, зарагатаў і Дуб, ды так, што бярэзіны на шляху здрыгануліся, здаецца.

— Сьмех сьмехам, а жарты вон,—згадзіўся Дуб.—Паедзем шпарчэй лепш.

Сказаў і лізгануў пугаю каня. Конь падкінуў азадкам, скочыў і пабег спорным трухам, ня спыняючыся, па цьвёрдай дарозе.

— Гэтак мы на край сьвету заедзем завідна,—пасьмяяўся Арон.

— Каб не спазьніцца. Уся мая праца тады, як тутуновы дым пойдзе.

— З табою ня спозьнімся.

Сапраўды ехалі добра. Прамінулі і пакінулі ззаду далёкавата трохі Хорашава, праехалі лес і, як ужо заходзіла сонца, пад‘ехалі к мястэчку.

— Трымайся, таварышы,—пракazaў Дуб і крута заламаў каня ў бок. Скокнулі калёсы, скаціліся ў роў, што цёг паўз шлях, і выскачылі на няшырокую дарожку-сьцежку, па якой больш хадзілі, чымся езьдзілі. Сьцежка агінала мястэчка.

— Хоць кругу дамо,—растлумачыў Дуб,—але сьмялей будзем.

Пакуль прыехалі, Ігнась кароценька расказаў Любе, куды і чаго яны едуць і на канцы ні то запытаўся, ні то ўпэўнена сказаў:

— Табе холадна... Зусім бяз вопраткі.

— Ды не, што ты. Зараз-жа прыедзем.

Хутка сапраўды спыніліся. На самай ускраіне мястэчка, на водкідзе нейк ад рэшты хат, стаяла чысьценькая новенькая хацінка, з двума драўлянымі пеўнікамі на лабку.

Хлопцы пасаскаквалі з воза.

— Хадзем у хату,—сказаў Дуб.—Я буду ўжо за вашага павадыра.

— Мы не сьляпыя пакуль што, і самі дзьверы знойдзем,—азваўся Ігнась.

— Усё адно ўжо, паслугую. Калі ласка,—адчыніў ён дзьверы.

У хаце ў парозе сустрэў іх Яська, той самы мужык, што прыносіў ад Дуба паперку.

— Стары знаёмы!—усклікнуў Арон.—Ну, добры вечар у хату!

Ён моцна патрос Ясеву руку. Пасьля яго прывітаўся і Ігнась.

— Ну, маладзец Дуб!.. А я ўжо пабойваўся, ці прыедзеце. Думаў самнецца і нічога ня выдзе.

— Гэ, выдзе!.. А ты вось тымчасам, пакуль я завяду каня, паглядзі чаго пачаставацца, ды дзяўчыны дагледзь,—адышоўшыся ў бок,—сказаў Ясю.

— Зробім, зробім, ня турбуйся. Ідзі.

Дуб паехаў дадому выпрагаць каня. Госьці паселі ў Яся. Неўзабаве прышла яго жонка з дваіма дзяцьмі: хлапчуком гадоў шасьці і дзяўчынкаю трох-чатырох. Яна ветліва дала „добры вечар“ чужым людзям.

Ясь пакінуў гасьцей і падышоў шапнуў нешта жонцы. Тая вышла ў сенцы.

А праз колькі хвілін стол уставіўся розным наедкам: была і страва, і сыр, і масла, і малако. Асабліва стараліся дасьціпныя гаспадары дагадзіць Любе. Толькі пасьпелі пава-

чэраць і запалілі сьвятло, а Люба ўзялася гуляць з дзяцьмі, як пачалі зьбірацца хлопцы і мужчыны. Не забавіўся і Дуб.

Расьсядваючыся на шырокіх ліпавых лавах, перш гаманілі аб тым-сім і з малога ды дробнага пераступалі на падаткі, страхоўку, на вайну і беднасьць. Гаварылі пра гора сялянскае.

— Заціснулі паны!..—гаманіў рэзка, што раз кашляючы, высокі сухотны мужчына.—Абступілі нашы матузкі ды балотцы з хмызьняком сваімі дварамі, лясамі, сенажацямі і хоць ты лопай! Ні дыхнуць. Так і глядзі, калі што лепшае ды пану ў вока ўспала, дык...

Размоўца безнадзейна паводзіў рукамі.

— Напэўна клапоцяцца, каб менш у мужыкоў работы было ды каб больш заробткаў у маёнтку,—казаў, сеўшы на ўслонку пасярэдзіне, Дуб.

— Вось гэта праўда.

— Дабра жадаюць,—кінуў вясёлы нізкі хлопец.—Хочуць, каб мужык на панскі хлеб перайшоў.

— Не жартуй. Дрэнныя жарты.

— Жартаваць няма чаго. Вось як саўсім зямля вылузаецца з рук, дык ні работы будзе і ні хлеба. Панамі будзем гуляць: рукі вольныя і жывот пусты, ха-ха-ха!

Але апроч хлопца не зарагатаў ніхто, усе разумелі горкую ісьціну ягоных слоў і сьмеху.

— Але, браткі!—ускочыў з лавы маленькі дзядзька і тоненькім галаском выкрыкнуў:—каб гэта яшчэ пан забраў жонку з дзецьмі, дыката, ды аўцу з матыліцамі, дык хоць ты ідзі ды сьвішчы па вуліцы.

— Сабак склікай, азваўся сусед ягоны па правым баку.

— Дзе відана!.. Дзе відана,—казаў сур'ёзны чорнабароды дзядзька.—Вось раты яшчэ ніхто ня думаў здаваць, а да мяне надоечы заблудзіў ураднік, ды пытаецца, як сёлета з хлебам—больш ці менш як летась, а пад канец проста і выпаліў:—„Чуў, што раты ня хочаш несьці. Глядзі ў мяне. Халодная ў нас не халодная, а гарачая". У сьпісак, кажа, запісаў ужо ў нейкі.

— А на кварту ён пальцам не паказаў?

— Ды што, калі ня было яе. Скарынкі на стале—пры душы, ня тое што кварты,—пачухаўшы віхрастую галаву, сказаў дзядзька і сплюнуў.

— Гэтак і ўсюды, як у вас, а вось у нас, дык мудрэй яшчэ,—абазваўся малады высокі прыгожы хлапец.

Дуб падышоў і шапнуў Арону:

— Парабак з Вайвіловічавага двара.

Парабак казаў:

— Наш пан меў з шамкоўцамі сэрвітутны лес, гэта, можна сказаць, у кожным двары. Дзьвесьце маргоў лесу. Ды лес які!.. Пасьвіліся там шамкоўцы, на мётлы дубцы рэзалі, грыбы зьбіралі,—усе як мае быць. Адале як нячысць падвінуў пану: каб і ня глянулі сяльчане туды. Паспрабавалі былі судзіцца, ды што: чорт за чортам цягне.

Арон уважна слухаў усё, пра што гаманілі мужчыны, але маўчаў да часу. Маўчаў і Ігнась. Пасаблялі толькі гаманіць Дуб з Ясем. Люба пра нешта ціха развважала ў кутку з Ясеваю жонкаю—пасябравалі.

Толькі як нагаманіліся ўсе, каб зрабілася, як сказаў адзін, на сэрцы лягчэй пасьля ўсяе крыўды, пачаў гаварыць Арон. Жару быццам уссыпаў ён сваімі словамі на дзядзькоў і хлопцаў. Пахмура і рашуча сталі паблісквацьу іх вочы

## «НА КІЕЎ—АФОН—ЕРУСАЛІМ»

АРОНА вельмі цікавілі навіны, адкрытыя м на сходцы. Ён ня вельмі што ведаў пра мужыка. Жыў змалку ў горадзе, з мужыком цыгарак не раскурваў, па душах не гаманіў. Кнігі, праўда, чытаў, але-ж кнігі не давалі ўсё тонкасьцяй уяўленьня мужыцкага жыцьця.

На сходцы ўдзельнічалі самыя лепшыя, самыя сьмялейшыя прадстаўнікі з навакольных вёсак, а гаварылі тое, што моцна набалела на сэрцы. Ад ураднікаў, старастаў і старшынь спакою няма, паны за горла цісонуць, а яны дзівіцца Арон. Хацелі-б вось неяк гэтак зрабіць, каб крыўды вялікае вельмі ня было нават тым-жа іхнім ворагам. Пра вайну казалі да прыкладу: „Лепш апошнюю зрэбную кашулю аддаць, а вайны каб ня было. За што нам ваяваць, калі аднэй трацінцы па чатыры—па пяць братоў і так схне, млее,—а ужо-ж не за гэтую трацінку!.. Дый ваяваць могуць нашыя афіцэры. Генэралы, баюць людзі, здраднічаюць. А салдату хіба ахвота за чужую зямлю да сваю галаву падстаўляць?"

У той час погаласкі пайшлі па сёлах, што цар муд... нешта зрабіць з зямлёю. У некаторых сялян нават пэў... надзея нарадзілася, што не павінны пакрыўдзіць мужы... Гаварылі нават, што быццам падбаўляць будуць зя... „Хоць-бы пакрысе якой і то-б", гаварылі на сходцы; „... зямля павінна быць разьдзелена", казалі іншыя ўдзель...

— Як-жа яна падзеліцца на роўныя, калі ў цябе будзе матузок з авечы хвосьцік, а ў пана і вокам ня сьцяць,— паказвалі на нягрунтоўнасьць гэтага сьцьвярджэньня іншыя.

— А ўрад можа выкупіць у паноў зямлю.

— Чакай, пакуль гэта асьвяціцца. У цара, кажуць, і свае зямлі ня ведае колькі. Дык гэта і цар табе аддасьць? Ці-ж ты сваю аддаў-бы каму?

— Ды гамоняць так.

— Гамоняць,—загуў Дуб.—Вось гамоняць яшчэ і гэтак: лепш, каб адабраць усю зямлю ды аддаць яе мужыком. Бяз грошай. Га!.. Добра? Вось бачыце, каб царя ня было, дык усе маглі можа-б раўнейшымі пастаць.

— Так то яно гэтак...—уздыхалі трэція.—Чуткі чуткамі, але вось, на яго ліха, што робіцца, дык ніяк не зьмяняецца. Зьбіраюць сходы, сельскія і валасныя, а навошта зьбіраюць? Навошта, каб папытаў? Мужыка каб настрашыць яшчэ больш. Бо што-ж гэта за сход, калі ты, што ні гавары, а табе начальства сыкне-грукне і не мажы, рабі так, як начальству заўгодна. Дык няхай-бы тады ня зьбіралі, калі страшыць, а то не—мусіць-жа маюцца якія-кольвечы законы аб правох.

— На дне мора-акіяну, пад белым каменем, у закованай у жалеза скрыні,—тоненькім галаском прапішчэў нізенькі цікавы дзядзька.

— Мусіць. Да прыкладу, як і з валаснымі судамі: падкупіў сьведку, дык за табою і суд. Умазаў суду, дык будзь пэўны, што за табою пацягне.

І дзівіцца Арон. Страхатлівае гэта сялянства. Моцы колькі захавана ў ім, а не адчуваюць-жа вось: адзін туды, другі сюды, трэці ні з месца. Не, трэба скарыстаць усе чуткі, што ходзяць, і зьліць іх у нешта адно—выразнае, яснае і такое, што-б сілком пацягло мужыка на пана, а там і...

„Бяда наша“, думае Арон. „З тымі сіламі нашымі і сродкамі куды тыцнешся. Ні літаратуры амаль, ні грошай, паперы няма завошта купіць, каб такую ясную і простую лістоўку выдрукаваць ды раскідаць па павеце. Эх!..“

І надумаў Арон склікаць комітэт. А як папрыходзілі хлопцы, сказаў:

— Сілы няма, хлопцы,

— Пра што ты гэта?—падазрона спытаўся Майзэль.—Ці ня думаеш пакінуць?

Арон гэтак зірнуў на яго, што Майзэль больш не сказаў пра тое ні слова. Потым павольна, разумеючы ўсю адказнасьць за пачатак і далейшае, сказаў:

— Пачынаць добра было і бяз сродкаў. Другі год вось праківаліся сяк-так. Але-ж гэта ня выйсьце са становішча. Вось сялянскі сход паказаў нам, што бяз грошай у нас

ніякае работы немагчыма зрабіць. Масы бродзяць як на дражджох. І дражджамі гэтымі зьяўляюцца нішто іншае, як розныя чуткі. Адзін пачуе, другі прыхлусіць, трэці перакажа далей. Ды гэтак, таварышы, кожны монархіст скарыстаецца з такога становішча. Маса сялянства ня тое, што рабочыя, а раскідана па сваіх сёлцах. Ня дзіва, што свой уплыў маюць там нават розныя палітыканы. Нішто так цяпер не асьвяціла-б сялянства, як друкаванае слова. А мы амаль-што ня маем яго. Пісьменны селянін паверыць гэтаму слову, бо нашыя лёзунгі найбольш адпавядаюць яго імкненьням, яны выцягваюць яго з таго скутку, у якім ён цяпер жыве.

— Грошы, значыцца,—прамармытаў чыгуначнік.—Дзе-ж іх узяць? Ня красьці-ж ісьці.

— Яшчэ што выдумай,—абурыўся Майзэль.

— Надумай ты,—агрызнуўся чыгуначнік.

— Я думаю, што абыдземся, таварышы, бяз гэтых спрэчак,—сказаў Ігнась.

— Трэба пазьбіраць рабочыя сходы. На сходах пагаварыць... Прост папрасіць рабочых, каб памаглі, хто колькі можа,—казаў Майзэль.

— Мала гэта выйдзецца, дый ня хутка будзе,–казаў Ігнась.

— Безадкладна, зараз-жа трэба арганізаваць дапамогу ад рабочых... Мы—партыя рабочае клясы і ў першую чаргу павінны арганізаваць рабочую клясу, нават па самых дробных пытаньнях, але якія рэволюцыянізуюць яе. Гэта аксыёма,—заявіў Арон.

— Рабочыя самі ня маюць з чаго жыць, бо зарабляюць ад сілы па дзесяць—пятнаццаць рублёў на месяц,—перапыніў яго чыгуначнік.

— Колькі-б ня даў рабочы, а гэта будзе дапамогаю рабочага,—натхненна праказаў Ігнась.—А грашовая дапамога ў рэволюцыйнай рабоце мацней прыкуе рабочых да рэволюцыі і праз тое самае мы мацней зьвяжамся з рабочымі масамі. І кожны рабочы пачне адчуваць сваю адказнасьць за работу і за падзеі, якія могуць выбухнуць, трэба сказаць, неўзабаве. Не адхіляць, а прыцягваць трэба рабочых. Я згодзен з Майзэлем і Аронам.

*„Таварыш-рабочы! Ахвяруй колькі можаш на нашу рабочую асьвету. Добрыя кніжкі ды газэты адчыняць табе дзьверы ў жыцьцё, навучаць жыць па-новаму. Ахвяруй колькі можаш“.*

Пад гэтымі словамі, напісанымі на вялікім аркушы паперы, раскаракамі падпісана было некалькі прозьвішчаў з паказаньнем ахвяравальных сум у 10, 15, 20 30 капеек. У самым

нізе аркуша стаяла: „Ініцыятыўная група „Рабочая асьвета“ пры комітэце Соцыял-дэмократычнае організацыі“.

Як не дарэчы зьявіўся перад шасьцьма рабочымі на чале з Цімахом гэты лісток. Заўтра будзе сьвята, а кожнае сьвята на тое і ёсьць сьвята, каб разагнуць ад работы сьпіну. А кожнае такое сьвята (гэта ўвайшло ўжо ў традыцыю ў Цімаховага хаўрусу) павінна было сустракацца адпаведнаю прамочкаю: кожны з хаўрусьнікаў па чарзе ставіў усёй хэўры гарнец гарэлкі. Сёньня была Цімохава чарга, але ну што калі не вязе. І трэба-ж гэта выпасьці якраз на яго, Цімаховай, чарзе. Усе спадзяваліся напэўна, што гаспадар выплаціць заработак. Усё нібыта шанцавала працягу традыцыі: і дзень прыгожы летні, і бясспрэчны настрой компаніі, і нават пэрспэктыва па прапанове аднаго з сяброў пайсьці ні куды іначай як у „Рэнскавы пограб“.

— А памятаеш. Цімох?..—намякнуў яму нехта пры гэтым.

— Не растраўляй... Бо паб'ю вазьму якога кручка, дык пасьля ўжо разам са мною і ты ўспамянеш,—бурчэў ён у адказ.

Пахмурны ўспамін пакінула ў яго няпомстлівай памяці здарэньне ў Пэйсаха. І не сказаў-бы ён больш нічога—за гэты напамін сябром, а моўчкі-б вышаў наперадзе свае капэлі і таксама моўчкі дайшоў-бы і сеў за стол у Пэйсаха, каб не адна прыкрая дробязь: замест поўнага выплатку заработку Зусь даў рабочым толькі па паўрубля.

— Няма, хлопчыкі, каб мне гэтак з праўдай быць, што няма больш. Тавары ляжаць, заказчыкі ня ідуць—кепска мне, кепска.

Але-ж нельга сапраўды з-за такое дробязі здрадзіць сваім прывычкам, сваім сьвяточным традыцыям. Моўчкі кожны распалавініў свой атрыманы капітал. Таксама моўчкі пазьбіраў гэтыя палавінкі Цімох. Справа вырашалася ня зусім як трэба, ламаўся цьвёрда ўстаноўлены парадак, але-ж здрадзе ў шэрагах хаўрусу даваўся належны адпор. І вось тымчасам, як ўсе адлічэньні па ня зусім традыцыйнаму прынцыпу сабраліся ў аднэй Цімохавай руцэ, у другой аднекуль зьявіўся гэты самы лісток, а пры боку, неўзаметку падышоўшы, стаяў Яўхім. Цімох зірнуў на лісток, узьняў вочы, сустрэўся з поглядам Яўхіма і павольна, амаль па складох прачытаў неспадзеўны лісток. З лагоднага—як у адчуваньні блізкае задаволенасьці—твар яго на момант зрабіўся нявыразным, потым па ім прабеглі цені зьбянтэжанасьці і раптам усё скончылася.

— Не, хлопцы... сёньня... нам зусім не выпадае ісьці.

Ён асьцярожна разаслаў аркуш паперы на варстаце, узяў у маўклівага Яўхіма захватаны бруднымі пальцамі аловак

і разьдзельнымі літарамі вывеў: „Ахвярую 25 капеек. Цімох Галагуцкі“.

— Пішыцеся, хлопцы... Дарма ўжо сёнешні дзень... Не важайце... Лепей перапетрыць, а зрабіць гэтак.

І высыпаў на руку Яўхіму сабраныя сябрамі адлічэньні.

— Дарма сёньня,—мармытаў сабе пад нос,—абыйдзецца. Бывайце, хлопцы,—падвысіў ён голас,—бывай, Яўхім... Ды добра, браце, зьбірай... з усіх, браце, з усіх, не абмінаючы. Тымчасам яшчэ ўбачымся мо‘.

Размашлівым грузным крокам ён вышаў з майстэрні і ніхто з сяброў не падаў голасу, каб сказаць яму што, каб вярнуць яго назад ці засупярэчыць.

Дарэмна чакаў сёньня „Рэнскавы пограб“ Пэйсаха сваіх гасьцей—ня прышлі яны. І толькі наступная раніца памагла знайсьці Цімаховы сьляды.

Ранёнька, толькі паадчыняліся акенцы ў дамох і абыва-таль прыбраўшыся сеў піць чай, Цімох цішком агародам выскачыў з кватэры на другую вуліцу. На нагах у яго былі лапці, на вяровачцы пры поясе з вераўчыны другія. На плечы быў начэплен клуначак, як робяць людзі, выпраўляючыся ў вялікую дарогу. У аднэй руцэ нёс ён кіёк, у другой кашэлку, узятую цішком у гаспадароў.

Кашэлка была не аднэй рэччу, якую скраў Цімох у гаспадарскай кватэры. Вышаўшы на голую бязьлюдную вуліцу, ён азірнуўся і выцег напаверх з-пад дзіравае сьвіткі вялікі медзяны крыжык на жоўтым мядзяным ланцужку. З кійком у руцэ і кашэлкаю ў другой, маючы на грудзёх крыжык з расьпятым хрыстом, ён адразу ўзяў сабе сьмірэнны, пакорны выгляд і пайшоў вуліцаю. Сапраўды Цімох выправіўся быццам у далёкую дарогу.

*

ЯГО высокаблагародзьдзе пан спраўнік патурбаваліся ўстаць сёньня з прычыны сьвята ў ружовым настроі.

— Мілачка!—гукнуў ён.—Ты ня сьпіш ужо?

З-за шырмы зьвялы голас, прыдушаны снальнаю цемраю і падушкамі, нехаць адказаў:

— Не, Сёрж. Ты ўстаеш?

— Уставаць трэба, мілачка. Чуеш к ютрані звоняць. Ты-ж ня хоч сказаць, што наша месца на самым перадзе, на чале, павінна быць занята кім. Спраўнік, мілачка, гэта першае начальства гораду, а таму канечна трэба выконваць усе правілы, а царкоўныя—у першую чаргу.

Праказаўшы гэтую доўгую тыраду, спраўнік прачыніў дзьверы. У цёмную спальню ўварвалася паласа ранішняга сьвятла. Сонечны прамень блiснуў у люстэрку і на столі здрыгануўся ясьненькі зайчык.

— Якаво з цяплом на дварэ, Сёрж?—тамліва запытаўся з-за шырмы голас „мілачкі"—спраўнічыхі.

Малінава-сярэбраны звон перашкодзіў спраўніку даць патрэбны адказ спраўнічысе.

— Ат, чэрці, званіць як налажыліся, хоць ты сядзі ды слухай замест музыкі якое. Майстры!

А ляны голас „мілаччын" неахвотна гаманіў у падушкі:

— Абнавіць прыдзецца сьвіцюшчае ўбраньне... Сёрж!

— Я, мілачка!..

— Модыстка ня зусім па-мойму зрабіла шлейф. Я не заплачу па яе рахунку.

— Твая справа, мілачка. Але ўставаць, душачка, час ужо. Пасьнедаць ды на ютраню.

Успамянуўшы пра сьнеданьне, спраўнік пачмыхаў, пацяг у нос паветра. На кухні браскацелі пасудкам; спраўніцкі нос улавіў смачныя пахі сьнеданьня. Прыбраўшыся, спраўнік—нізенькі, пузаценькі—пайшоў у свой габінэт.

Спраўнічыха закаташылася ў падушках, прыўстала, працягнула расьпешчаную гладкую руку па сярэбраны званочак, што стаяў на туалетным століку побач з ложкам. І тоненькі званочак празьвінеў у спальні,

— Маруся!..—нізкаватым грудным голасам паклікала яна.

— Іду, пані!—пачуўся за сьцяною тонкі малады голас.

Прачыніўшы бяз рыпу дзьверы, ціха ўвайшла пакаёўка.

— Маруся!.. Адзявацца,—з капрысам пачулася з падушак.

Праз гадзіну спраўнік з спраўнічыхаю сьнедалі. Чорненькія падабраныя вусікі ў спраўніка тырчэлі стрэлачкамі. Валасы над нізкім пукатым ілбом падстрыжаны былі вожычкам. Спраўнік меў ня больш за трыццаць год, а адпаведна з гэтым і ня дрэнны апэтыт. Мілачка-спраўнічыха—высокая, высшая за спраўніка мо' на цэлы паўаршын, сядзела насупроць. Была яна яшчэ ў шырокім капоце, сама шырокая і месца займала як на два чалавекі.

На калідоры празваніў званок адчыненых дзьвярэй. Нехта прышоў.

Спраўнік з жонкаю не ўзялі-б на ўвагу таго, каб у пярэдняй не загаманілі. Чуцен быў голас—гаварыла сярдзіта пакаёўка, а яе перарываў другі—ціхі настойны.

— Сёрж, выйдзі ўціхамір, я не магу так,—павяла брывою спраўнічыха.

— Зараз, мілачка...

Спраўнік абацёр салфэткаю блішчастыя губы і дробным птушыным крокам вышаў у пярэднюю.

Скінуўшы шапку на кіёк, у дзьвярах стаяў Цімох. З мятлою ў руках яму перагарадзіла дарогу пакаёўка.

— Што такое, Маруся?

Цімох ня даў адказаць тэй. Ціхім набожным голасам ён нараспеў праказаў:

— Мір дому сяму, шчасьце і радасьць яго вялікім гаспадаром.

— Што, брацец?—ужо да Цімаха зьвярнуўся спраўнік.

Пакаёўка мерылася сказаць нешта варожае, але Цімох пасьпяшыў зноў раней за яе:

— Ахвяруйцеся благачасьціваму падарожніку на Кіеў—Афон—Ерусалім.

Называючы гэтыя сьвятыя мясьціны, Цімох шырока перахрысьціўся ў той бок, дзе, па яго думцы, былі яны.

— Вось бачыш, Маруся, а ты шум уздымаеш. Нельга, нельга гэтак. На першы раз раблю табе заўвагу.

Ён быў сёньня ў ружовым настроі. Мусіць, што спаў добра, а ўстаў яшчэ лепш, а можа таму, што не перасьціхаючы прыгожа званілі ў царквах і звон малінава-сярэбраны падтрымаў Цімаха. Спраўнік выняў портманэт, выбраў з кучы білетаў зялёную трохрублёўку і падаў „благачасьціваму падарожніку“.

— Сьвятая Лаўра не забудзе пра ваша высокаблагародзьдзе,—нізка скланіўшыся, прамармытаў ён.

— Ладна, ладна, брацец.

— Да васкрэсьне бог і растачацца ўразі яго,—прабубніў Цімох, заціснуўшы ў руцэ грошы, і едка зірнуў на пакаёўку.

Ён яшчэ раз перахрысьціўся і, не надзяючы шапкі вышаў бокам з пярэдняе. Спраўнік вярнуўся дасьледваць.

На калідоры Цімох кінуў злосным вокам на пакаёўку, якая ўхваста ішла за ім.

— У бога ня веруеш, дзяўчынка.

— Пайшоў вон, п'яніца. Ты-ж, п'яніца, на гарэлку зьбіраеш грошы, а не на Лаўры.

— Бога пабойся, недаверак.

Перад спраўнікам ён быў у протоярэя, гарадзкога галавы, у маршалка і манастырскага настаяцеля. Задняга ён не застаў дома, але проскурніца, нестарая і ў добрых яшчэ „целесех“, з настаяцельскае казны не пашкадавала сярэбранага рубля. У кішэні ўжо адчувалася прыемнае шамаценьне хрусткіх паперак і звон серабра.

Выходзячы з генэральскага дому, таго адстаўнога генэрала, з якога пашкіляваў некалі на вуліцы Ігнась і які не пашкадаваў даць пяцёх рублёў, Цімох з радасьці не заўва-

жыў, як наскочыў на прыстаўскага памочніка. Як Цімо
таксама і памочнік прыстаўскі ведалі адзін аднаго з та
дня, як адбылася вядомая п'янка ў „Рэнскавым пограбе
ў Пэйсаха, пасьля чаго Цімох з Яўхімам адсядзелі ў паліцы

Прыстаўскі памочнік прыпыніўся. Цімох адразу пазна
яго. Каб ня даць выбухнуць начальніцкай гразе, ён зьня
шапку і, мармычучы лагодныя начальству словы, нізка
нізка скланіўся і з голаю галавою прайшоў паўз яго. Ал
ўцячы было ня гэтак лёгка, як думалася.

— Стой, стары!

Цімох спыніўся.

— Эге, стары знаёмы. Ну, ну... Чаго ходзіш?—строг
спытаў прыстаўскі памочнік.

— На ахвяру зьбіраю ў Кіева-пячэрскую лаўру, ваша
благародзьдзе... О-ох, грахі нашы цяжкія,—уздыхнуў ён.

Тытул „ваша благародзьдзе" і пачцівасьць Цімахова
як і яго сьмірэннасьць, зрабілі сваю справу. Гледзячы на
яго пакорлівасьць і поўнае падпарадкаваньне старшэйшым
начальства заўважыла:

— Грахі, кажаш,—то-та.

І, выняўшы пяцьдзесятку і падаючы Цімаху, дадало:

— Марш!.. Каб мне больш ні на вока.

Цімох ня прымусіў сябе чакаць: як толькі дазваляла
ягоная роля багамольца, шмыгнуў ён ад начальства, забыў-
ся нават падзякаваць. А што яшчэ дзякаваць—рознае
бывае начальства: аднаму дзякуеш, а яно горш у рызыку
ўпадае. Так і тут,—Цімох прызнаў за лепшае ўцячы, не
падзякаваўшы.

Але як зранку шанцавала, гэтак на паўдні пакінула.
Цімох падумаў ужо, ці ня кінуць яму сваё падарэцтва
і з набожнага багамольца ўвасобіцца ў звычайнага сьмерт-
нага Цімаха, а, падумаўшы ўжо машынальна завярнуў
і пайшоў цераз вуліцу у шынок, дзьверы ў які гэтак гась-
цінна былі расчынены насьцеж, быццам запрашалі яго на
сотку. Адзін крок толькі застаўся ступіць, каб увайсьці
і сесьці за даўжэзны мокры стол, калі нешта быццам шту-
рханула яго з вялікаю сілаю. Ён прыслухаўся.

Гугнівыя сьпевы плылі ад сабору, што вельмі добра-
суседне ўмясьціўся ня больш як за загон ад шынка.
У сьпевы ўпляталіся рыпучыя галасьлівыя гукі леры. Гэта
старцы нарасьпеў маліліся і прасілі добрых людзей нада-
рыць іх, чым маюць.

Цімох даў кроку назад ад шынка. У галаве як бачыш
насьпеў другі плян. І, ужо забыўшыся пра шынок і сотку,
забыўшыся, што ў жываце зараўло з голаду, як ня бегма
пасьпяшыў пад сабор. Прамінуўшы даўгі рад старцоў

і старчанак, ён яшчэ здалёк скінуў шапку і, хрысьцячыся раз-по-раз, падышоў і стаў ля самага цьвінтара, сьхіліўся на свой кіёк.

Мо' паўгадзіны, мо' больш прастаяў ён гэтак бяз шапкі. У сабор і з сабору шлэндаліся людзі. У шапку яму кідалі серабро і медзякі. Ютраня даўно скончылася. Ішла пад канец абедня.

Па абедні народ сыпануў на двор. А Цімох працягваў наперад шапку і ўсё прасіў на „Кіеў—Афон—Ерусалім". Раптам пад самым вухам у яго прагаласіла баба.

— Цімохна!..

Крык яе гэтак спалохаў Цімаха, што ён скамячыў у жменю шапку, шмыгануў у густы натоўп і бяз возірку, як падмецены, бегма пабег прэч да сабору.

На захадзе сонца ён зьявіўся к Арону. На грудзёх цяляпаўся крыжык. За плячыма, бы ўліп у сьпіну, клуначак. Пастукваючы кійком, ён увайшоў у пакой і завучаным за дзень голасам прасьпяваў.

— Ахвяруйцеся божыя людзі, на Кіеў—Афон—Ерусалім! Сьвятая Лаўра не забудзецца пра ваш набожны ўчынак.

Арон з Ігнасём няўцямна паглядзелі адзін на аднаго, потым на Цімаха. Але той, як-бы забыўшыся, што ён не пад саборам прагукнуў зноў:

— Ахвяруйцеся, божыя людзі... Эх грахі нашы цяжкія!...

— Кінь Цімох гавары барджэй, што гэта за сьвятыя Лаўры і што гэта ўсё значыць?

Цімох зарагатаў, скінуў клунак і сеў, падгібаўшы ногі, проста на падлозе.

— Ух, замарыўся, на яго страх, на яго. Ці паверыце, ужо быў з роспачы за малым у шынок ня рушыў сотку ўзяць. Але неяк пранесла міма.

Арон з нецярплівасьцю сказаў:

— Нічога не разумею. Ты што, выбраўся сапраўды ў вялікую дарогу?..

— Пасьля раскажаш, давай барджэй.

А Цімох нібы ня чуе. Змораным голасам павольна апавядае ён пра свае сёнешнія прыгоды.

— І ведаеце каб ня ўцёк з пад сабору, ну дальбог-жа ўлопаўся-б. Ну зусім-жа ня думала дурная галава мая, што гаспадыня можа якраз быць на абедні. Але дзякаваць мне, уцёк... У вялікую дарогу,—задумчыва праказаў ён.— Так, я сабраўся ў вялікую дарогу.

Ён падставіў шапку і вывернуў на яе кішэні. У шапку пасыпалася медзь, серабро, зашамрэлі паперкі. Ён устаў і высыпаў усё Арону на ложак. Гэта на нашу рабочую асьвету хай вучацца маладыя, як жыць трэба.

МІНАЛАСЯ восень. Палавое неба стала цьмянець, чарнець. А аднае раніцы папрачынаўшыся ўбачылі людзі, што зямля скулася марозам. Гарапашная, пакутая зямля, аплаканая сьлязамі, напоеная потам і крывёю людзкою, укулася добраахвотна ў кайданы зімовага адпачынку заснула ў цяжкім неспакойным сьне на цэлыя месяцы. У цяжкім, бо сьлёзы і гора народнае не даюць ёй спакою, трывож ць сваёй жаласьлівасьцю, гарачыя сьлёзы растопваюць халодныя кайданы.

Стала зіма.

Чуткамі поўніўся сьвет. Іголкамі калолі яны змучаную, прыгнечаную сьвядомасьць людзкую. Употайку зьбіраліся людзі адзін з адным, па трое, па пяцёра, па закутках глухіх ды цёмных, абгаварвалі ды раіліся, заклінальі, парашалі.

Нешта аднаго дня Ігнасю прышоў ліст. Ліст ад Любы. Пісала яна:

„Ня маючы магчымасьці прыехаць, таварышы, парашыла напісаць, бо думаю, што згодзіцца гэта вам. Нутром сваім, мусіць, і пад уплывам асабліва нашае пропаганды, адчувае селянін аб вялікіх падзеях. На спакойнае, нават флегматычнае сялянства як трасца напала—яно бродзіць, расьце, як на дражджох. Гэта быццам добрая адзнака, але ня трэба надта абнадзейвацца. Таксама і пудлівае яно, радкаватае яшчэ гэтае цеста. Праўда, ўжо сыходзяцца сусед з суседам, цераз плот гамоняць цішком, але гэтага мала, бо ня могуць яны праз гэты плот падаць руку адзін аднаму і цеснаю грамадою вырушыць за сваё сяло. Пудлівае яно. Абнадзейвацца вельмі ня трэба—узмацніце работу ў сялянстве. Сродкамі пасоблю і я. Сярод тутэйшай інтэлігенцыі я сабрала на культурныя патрэбы рублёў 50 за ўвесь час,—калі трапіцца, пагаманю яшчэ з Няслаўскім—ён дасьць, я ўпэўнена... Бывайце... Ваша Люба".

— Гэта праўда,—хмурны сказаў Арон.

Неспакойны быў Арон. Адчуваньне вялікай адказнасьці за здарэньні, якія павінны насунуцца хутка (ён ведаў гэта), адабралі спакой.

А аднаго разу прышоў другі ліст, на Арона і не ад Любы. Ліст запрашаў яго прыехаць у адно месца.

І Арон зноў прынёс пакунак літаратуры. У пакунку былі і газэты, некалькі штук першага нумару першае бальшавіцкае газэты „Вперед" пад рэдакцыяй Леніна. Гэты нумар газэты, перачытаны спачатку і да канца, поўна моцы падбавіў Арону з Ігнасём.

Нават Бунд пасьмялеў. Бяз малага праз год добраахвотнага сасланьня зьвярнуліся ў горад ягоныя лідэры. Ажывіліся і іншыя рэволюцыйныя організацыі. На гарадзкім кругавідзе вырасла групоўка анархістаў. Чынную дзейнасьць пачалі разьвіваць эсэры. (Вёрст з трыццатак ад гораду абрабавалі аднаго акцызьніка ды забілі на сьмерць паштара, які вёз да мястэчка ў сваёй торбачцы паміж лістоў і газэт сто рублёў грошай. Паштар абараняўся, відаць).

Нездарма ЦК партыі ў аднэй з проклямацый, выданай неўзабаве пасьля абавяшчэньня вайны, сказаў: „Хто сее вецер, той пажне буру!“ Усё, што адбылося пасьля, пацьвердзіла дыягноз, пастаўлены бальшавікамі. У ліпені забілі міністра па ўнутраных справах Плевэ. У жніўні з уздымам адбылася ўсеагульная забастоўка ў Маскве. У лістападзе пачаліся ўзбурэньні ў Чорнаморскім флёце.

А мінула яшчэ колькі часу, як увесь горад чытаў у „Русском слове“ пра здачу японцам Порт-Артура. Гэтая вестка падкасіла веру ўсамых нічкэмных малавераў, якія яшчэ спадзяваліся на перамогу над японцамі. Нібы вялізарнае сілы бомба разарвалася, такое ўражаньне пакінула вестка. Насельніцтва, асабліва гарадзкое, асабліва абыватэлі, палохалі быццам, прадчуваючы, што набліжаюцца нейкія канцы—вялікія страшныя.

Набожныя загаманілі пра паслабленьня веры ў бога, пра блізкі канец сьвету і прыход антыхрыста. Гэтая агітацыя палохала цёмны народ сваімі прароцтвамі, сваім жудасным, містычным маляваньнем будучыні.

Стаўшы на дзень за баязьлівага праваслаўнага, Ігнась дайшоўся крыніцы, з якое цякла гэтае сьмярдзючая гразь. Манастырскі настаяцель пра сваіх манахаў, а тыя праз старых сухамозгіх бабулек пусьцілі чуткі пра антыхрыста. Зараз-жа агітацыя соцыял-дэмократаў выкрыла, што манастыр рэлігійнай хлусьнёй хоча адцягнуць увагу народу ад тых вялікіх падзей, якія насьпяваюць і якія прывядуць да пагібелі монархіі. Распаўсюдзіліся па ўсім горадзе чуткі, што настаяцель жыве з проскурніцаю і перад сканчэньнем сьвету шчыра зьнішчае вінныя запасы з манастырскіх паграбкоў. „Антыхрыст“ зьнік.

А з гораду прыежджыя сяляне везьлі з сабою весткі на сёлы. Соцыял-дэмократы—адзінкі па мястэчках, дварох і сёлах—асьмельваліся гаманіць ужо і на сходах сялянскіх. Старасты спрабавалі ўлавіць, хто гэта выкрыквае бунтарскія словы, але дарэмна. Натоўп людзей, ня гледзячы ў вочы старасту, ці гамоніць як адзін чалавек, ці маўчыць таксама. Паспрабуй пазнаць, хто бунтарыць.

І ўсё-ж такі павольна паўзуць чуткі, як і павольн рухаюцца людзі. Што адбылося сёньня, дык дазнаюцц праз тры-чатыры дні, а то і праз тыдзень. Ня дзіва: по шта і тэлеграф у сетцы з шпегаў і сачкоў, вялікіх і малых у газэтах свае, выгодныя ўраду людзіны. Сьмецьцем пары ваюцца засыпаць выбухі сьвежае, здаровае думкі, разлу чыць імкнуцца чалавека з чалавекам. Але, не, не разлу чыць. І пошта, і тэлеграф маюць свой „злачынны элемэнт" І даведваюцца людзі:

— Цар пастраляў рабочых 9 студзеня ў Пецярбургу. Нібы гром з нячуванаю сілаю выцяў у зямлю. Падпольле забыла пра заўсёдышнюю сваю асьцярожнасьць.

К Арону прыбёг Майзэль.

— Гэта праўда ці провокацыя?—толькі пераступіўшы парог выкрыкнуў ён, і, пачуўшы ў адказ, што праўда, павярнуўся ўжо быў бегчы.

— Чакай!—спыніў Арон.

Ён таксама відаць хваляваўся.

— Ты куды хацеў бегчы?

— І больш нічога ня хочаш запытацца? Ну, дык часу няма, цяпер з рабочымі трэба быць. Наша месца там.

І ён другім разам памкнуўся выскачыць.

— Стой, шалёны, куды?.. Ні з месца адсюль!

Майзэль вярнуўся зноў і ўзьбегаўся па пакоі, як спружыновы.

Ігнась стаяў ля акна і з нецярплівасьці кусаў вусны. Арон, спыніўшы Майзэля, не сказаў больш нічога. Зірнуўшы на яго, здалося-б, што ён пра нешта моцна-моцна думае. Вусны сьціснуліся і сталі тонкімі, выразнымі. Вочы пагастрэлі, павужэлі.

Нарэшце, маўчанку пакінуў Арон. Ён зірнуў на Ігнася, на Майзэля, як той бегае нэрвова, вышаў на пакой і загаманіў.

— Парадак, парадак перш за ўсё захаваць. Ня будзе парадку, ня будзе організацыі, пагінем за рудыя мышы. Вось мы ўжо паказалі сваю організаванасьць.

Жорстка стаў выкрываць і ганьбіць зьбянтэжанасьць Майзэлеву, яго неабдуманыя парываньні.

— Трэба ведаць, што кожны нявымераны крок цяпер заплаціцца вядром крыві. Мы адказваем ня толькі за сябе, мы адказваем за масу, якую выводзім на вуліцу, можа на бойку. Я заклікаю да парадку!.. Кожнага, хто не паслухе, і як анархіст стане дзейнічаць па-свойму на шкоду справе, я...

Арон праглынуў наступнае слова, прыпыніўся, дыхнуў, быццам цяжка было яму вымавіць яго, аблізаў сасьмяглыя вусны, бліснуў рашуча чорнымі вачмі і адрэзаў хмурны

— Я буду ставіць пытаньне дамагацца выключэньня з організацыі.

І Арон рэзка павярнуўся.

Аронаў рух напрудзіў Ігнася, яму зрабілася гэтак лёгка і бадзёра, што ён выпрастаўся, здаецца, і вырас імгненна пад самую столь. І адчуўшы гэтую бадзёрасьць, прутка падышоў к Арону і стаў з ім упоравень.

Майзэль устыў на месцы. Недаўменьне напісалася на твары. А далей ня выцярпеў і, камечачы словы і пырскаючы сьлінаю крыкнуў:

— Дык ты як дыктатар?!

— Калі трэ' будзе, дык як дыктатар,—спакойна адказаў Арон, і махнуўшы рукою схаваў яе ў кішэню.

— Ах, ты гэтак? У соцыял-дэмократычнай партыі гэтак? Адзін хочаш загадваць!.. Адзін кіраваць!.. Не!..

Шапка сарвалася з Майзэлевае галавы і лёпнулася вобземлю.

— Не!..—пераказаў ён.

— Апамятайцеся,—строга сказаў Арон.

І ўжо спакойна, сьцішаным голасам загаманіў сур'ёзна і пераконваючы, што толькі сумеснымі, зьлітаванымі сіламі выступіўшы—можна перамагчы ўзброенага мацней ворага. Без ліхаманкі, бяз лішняга шуму, вымерана, цьвяроза ацэньваючы становішча, трэба выступаць на вуліцу.

— Вось чаму я сказаў, што калі хто не падначаліцца гэтаму, дык буду дамагацца ўсімі сіламі выключэньня.

Майзэль паспакайнеў, пакінуў калаціца, як хворы ў трасцы. Потым парыўчата ірвануўся, падышоў к Арону і моцна абняў яго.

— Будзе... я разумею... Прабач мне!

Адвярнуўся, падняў шапку.

— Прабач!

Утоўпіўся ў падлогу, а потым узьняў галаву, зірнуў на Арона.

— Глупства,—сказаў проста Арон.—Ня варта гаманіць. Давай лепш абмяркуем, што рабіць.

Усе трое пасталі наўкруга і пачалі раіцца.

Праз дзесяць хвілін згоды дасягнулі: ужыць усе захады, каб угаварыцца з Бундам і агульнымі сіламі выступіць. І, парашыўшы, разьмеркавалі абавязкі: Ігнась пайшоў к чыгуначніку, адкуль павінен быў заскочыць к Яўхіму і разам з апошнім к сьлесаром Файбэля; а Арон з Майзэлем пайшлі разьведваць пра кватэру бундаўскага комітэту.

Праз нейкі час з адным бундаўцам уперадзе за праваднікам адшукалі яны на ўскраіне трухлявую хібарку, якая даўно, мусіць, прасілася на дровы. У хаце гарэла сьвятло

Павадыр-бундавец пастукаў тры разы ўмоўленым стукам у шыбу. Пачулася вазьня ў хаце. Мо' праз хвіліну, не адчыняючы сянец, з-за дзьвярэй запыталіся нясьмела.

— Хто там?

— Адчыні... Шмуйла.

У сенцах стукнула жалезная засаўка, дзьверы рыпнулі і адчыніліся. Хлопцы ўпусьцілі з сабою ў хату зімовы холад, які на сэкунду схаваў тых, што сядзелі ў пакоі.

Праз хвіліну ўсе сядзелі разам і абгаварвалі пытаньне сумеснага протэсту супроць крывавых пецярбурскіх падзей.

— Мы страшэнна абураны гэтым... А што вы прапануеце?—зьвярнўўся бундаўскі лідэр да Арона з Майзэлем.

— Наш комітэт прапануе сумеснымі сіламі правесьці ўсеагульную забастоўку. На выпадак якіх падзей давядзецца выставіць рабочую варту.

— Ня ведаю... Наш комітэт яшчэ нічога не пастанавіў, мы не дагаварыліся.

— А тут яшчэ канечне дагаварвацца?—ня выцерпеў Майзэль.

Хадзем, Арон. Нам тут няма чаго рабіць.

— Гэта-ж ня жартачкі, сур'ёзная справа,—ціха сказаў бундавец.

— Вось іменна сур'ёзная,—сказаў Арон.—Мірна настроеныя рабочыя, пастрэленыя царскім войскам, пасьля таго, як яшчэ зранку верылі ў цара, пад вечар ужо зграмадзілі барыкаду на Васільлеўскім востраве. Каб скінуць з п'едэсталу волата самадзяржаўя і растаптаць нагамі рэволюцыйнага народу, трэба дзейнічаць агульнымі сіламі. А то кожны, як каму пажадаецца, будзе рабіць рэволюцыю.

— Мы не спрачаемся... Мы страшэнна абураны і прымем усе меры, каб яўрэйскі рабочы сваю абуранасьць супроць царызму вынес на вуліцу.

— Калі вы згодны на супольныя дзеі,—настойна сказаў Арон,—тады мая конкрэтная практычная прапанова: зараз-жа ўзяцца за організаваньне забастоўкі. Заўтра, а дзесятай гадзіне, організаваць колёны рабочых і з соцыял-дэмократамі і бундаўцамі ў шэрагах—без усялякага падзелу сыходзіцца на пляц. На пляцу мітынг. Кіруюць абодва комітэты.

Было ня рана, калі Арон з Майзэлем, скончыўшы гутарку ў Бундзе, шыбавалі назад.

Пад нагамі храбусьцеў сьнег, парыпваў гэтак тонка, прыемна. Мароз хапаў за нос, за вушы. Неба ўсеялася зоркамі. Але хлопцы не заўважалі ўсяе зімовае пекнаты.

Перад разьвітаньнем Арон сказаў ціха Майзэлю:

— Памятай-жа, заўтра да выступленьня прышлі чалавека. А цяпер ідзі паведамляй. Я забягу ў адно месца.

Разышліся.
Арон думаў зайсьці ў друкарню, але, не дайшоўшы, павярнуў у другі бок: друкарня была зачынена.
„Кепска!"—падумаў ён.
Наступны дзень пачаўся нечаканасьцю. Толькі гэта Арон з Ігнасём усталі, як адразу-ж даведаліся, што ў валасным праўленьні пад горадам забіты ўначы ураднік. Улада ўжо арыштавала двух забойцаў, нібто эсэраў, нібто анархістаў. На арышце цяжка паранены стражнік.
Вестка абурыла Арона.
— Вось табе і сумесныя дзеі. Рэвалюцыянэры...
— Кінь, Арон.
— Урадніка забілі... Падумаеш, вялікі рэволюцыйны ўчынак зрабілі... Я ўпэўнены, што сёньня ўся паліцыя будзе на нагах.
Ён апрануўся і, не сказаўшы нічога, пайшоў быў. Ігнась спыніў яго.
— Арон! Можа хутка ад Майзэля прыдзе хто. Табе цяпер ня можна нікуды ісьці. Калі хоч, я пайду.
— Добра. Схадзі ў друкарню. Заскоч там да Файбэля і па дарозе зірні, што ў нас робіцца. А друкарня каб не баставала... Адозвы трэба сёньня надрукаваць, а то могуць ня даць пасьля. Ды сьпяшайся.
— Іду.
Ігнась пасьпешна вышаў. Прайшло з паўгадзіны. Арон нецярпліва чакаў на далейшыя весткі. Яны не забавіліся.
Не зьвярнуўся яшчэ Ігнась, як прысьпеў прысланы Майзэлем Лейба. Арон сустрэў яго ў парозе.
— Хутчэй кажы, што?
— Бунд ашукаў... спадмануў. Рабочыя яўрэі, што зьвязаны з Бундам, зьбіраюцца асобна і неўзабаве выступаюць.
— Гадзюкі!..—Праз сьціснутыя зубы толькі і вырвалася ў яго.
— Што сказаць Майзэлю? Ён прасіў чым найхутчэй наказаць. Бяжы... Стой! Ня к Майзэлю... Бяжы ў бундаўскі комітэт і хто-б там ні быў, цягні сюды... Калі што,—настраш, што хоч зрабі, а прывядзі.
— Добра, а калі ня будзе нікога?
— Усё адно прыходзь.
Лейба завярнуўся, грукнуў дзьвярыма. Арон стаў хадзіць шырокімі крокамі па пакоі.
— Здраднікі!.. Здраднікі,—праказваў ён сам да сябе.
Прыпыніўся, пакінуў хадзіць. Ускінуў на галаву шапку і пайшоў сам, ня выцерпеў. За рогам вуліцы сустрэў Ігнася

і вярнуўся з ім назад. На кватэры Ігнась расказаў, што друкарня зачынена і рабочых няма.

— І тут няўдача!..

— Нашы зьбіраюцца, але на работу яшчэ не станавіліся. Затое ў Файбэля, Арон... Вось малайцы!.. Зброю куюць... жалезныя крывулькі, драцяныя гарапнікі робяць.

Але гэтая вестка ня ўзрадавала Арона—дзень пачаўся няўдала.

— Ты нездаволены гэтым?—спытаўся Ігнась.

— Ня тое... Бундаўскі комітэт. Учора абяцаў, а сёньня спадмануў. Зьбіраюць адных яўрэйскіх рабочых.

— Арон! Што-ж гэта такое? Значыць, прапала дэмонстрацыя?

— Разьбіваюць сілы, гадзюкі! Але нас гэта ня спыніць. Я паслаў у іхны комітэт Лейбу... Ды вось і ён нешта шпарка вяртаецца... Мо' зноў няўдача.

Арон не памыліўся: і тут была няўдача. На бундаўскай кватэры Лейба не застаў ніводнага чалавека.

— Арон, ратунак ёсьць!.. - крыкнуў Ігнась.

— Ты думаеш?

— Але. Яназіраў добра на вуліцах,—ані нідзе няпрыкметна поліцэйскіх, адны гарадавыя ля сваіх будак. Паціху, без вялікага шуму мы організуем нашу дэмонстрацыю.

— І пакажам сваю слабасьць,—дадаў Арон. Схамянуўся што ня сьлед сказаў; націскаючы на кожным слове, адсек быццам:

— Не, мы пакажам сваю сілу! Нас гэтымі штучкамі не ўкалупнеш, мы зробім, што меліся зрабіць! Лейба!.. Зараз-жа к Майзэлю! Ты, Ігнась, к Файбэлю! Пайшлі!

Усе трое пакінулі кватэру.

А дзень быў гэткі ясны, пагодлівы. Ні ветру, ні марозу. Белавата-блакітнае неба чыста, як улетку. Сьнег не рыпаціць пад нагамі, памякчэў, хоць станавіся ды ў сьнежкі гуляй, такі падатны, так спрыяе надвор'е. Але трывогаю глухою пахне на вуліцы. І людзі трапляюцца рэдка—засмучаныя.

Арон накіраваўся з Лейбам туды, дзе чакаў іх Майзэль з рабочымі. Але ля млыноў Майзэля яны не знайшлі, так сама як ня ўбачылі ніводнага і рабочага. Арон зьдзіўлены паглядзеў на Лейбу. Той ня ведаў, што падумаць пра гэта. Потым загаманіў:

Яны можа на бровары?

Арон кіўнуў галавою і моўчкі завярнуўся, пайшоў за Лейбам. Прадчуваньне цяжка сьціскала Арону сэрца. Пра

нешта благое думалася ўсё. На адным заломе з завулку вышлі два рабочых, потым яшчэ адзін, потым яшчэ тры. А калі Арон з Лейбам падышлі бліжэй, дык стыкнуліся з самым Майзэлем.

— Я іду на бровар... Злучыцца і разам выступаць!— шпарка праказаў ён.

— Не, чуеш, Майзэль не... ня трэба,—утомна і цераз сілу вымавіў Арон.

— Што з табою? Чаго ты зьбялеў гэтак?

— Можа зьмёрз,—глупства. Майзэль... Пусьцім хлопцаў дадому... Баюся я, нешта кепскае будзе.

Майзэль спалохана азірнуўся вакол і нічога страшнага ці падазронага ня ўбачыў. Рабочыя, што ішлі разам, прыпыніліся ўперадзе, сталі закурваць, відаць, чакалі іх.

Арон настойна зашаптаў, быццам для таго, каб ня мог пачуць Лейба:

— Сёньня цішыня гэткая жудасная... палохае яна мяне. Нібыта ў гэтых ціхіх вуліцах і завулачках паўтойваліся паліцэйскія і чакаюць напагатове, калі мы пойдзем дэманстраваць, каб... Што гэта?..

Майзэль сьціснуўся недарэчна. Лейба прыціснуўся да сьцяны. А рабочыя пакідалі цыгаркі, паразьбягаліся па дварох... У баку зусім недалёка ляснуў стрэл, за ім другі, трэці.—Ба-бах! Ба-бабах!—і пайшла страляніна.

— За мною, таварышы!—на ўсю вуліцу крыкнуў моцна Арон і, заціўшы ў руцэ ручку маўзэра, ірвануў насустрач стрэлам. Майзэль і Лейба кінуліся за ім. Не прабеглі мо і трыццаці крокаў, як аднекуль вынырнуў Ігнась. Наперадзе ў яго ляцеў, як шалёны, Кіяш.

— Арон!.. Стой, куды ты!

— Ты адтуль. Што там такое?

— Бундаўская дэманстрацыя папала на пляцы ў пастку... Паліцэйская засада... Глядзі! Вунь уцякаюць!..

— А ты кінь!—рашуча загаманіў Ігнась.—Кінь, ня ідзі туды. Я закамандаваў сваім разыйсьціся. Не падрыхтована...

Арон паслухаў, схаваў у кішэню маўзэр і завярнуўся к Майзэлю.

— Дахаты! Увечары ка мне, калі толькі можна будзе. Трэба працягнуць забастоўку.

Там, адтуль беглі два чалавекі, паказаўся гарадавы. Майзэль з Лейбам скочылі ў завулак, Арон з Ігнасём — у другі. Два чалавекі забеглі ў двор і зьніклі там.

*

ПОЦЕМКАМ у Майзэля ў хаце гаманілі цішком чатыры чалавекі, сам Майзэль пяты. І не ўважаючы, што ўпоцемку нязручна—ня бачыш адзін аднаго, не заўважаеш па твары ў суседа, якія думкі бегаюць у галаве,—лямпу паліць забаронена.

— Дык колькі чалавек збаёдавалі?—пытаўся жорсткі голас, прыдушваючы гострую злосьць, якая прыкметна праціскалася з-пад роўнага спакойнага тону.

— Мы, здаецца, ня лаяцца прышлі і гаварыць з намі гэтак не дазволім! Дый вам не баліць сэрца па пакутных яўрэйскіх рабочых, па яўрэйскай галоце! Вы думаеце дасягнуць соцыялізму з абстрактнымі, анацыянальнымі масамі рабочых.

— А вы думаеце, што організуючы толькі сваіх рабочых, што выступаючы паасобку на дэмонстрацыі ды бастуючы, вы зробіце рэволюцыю? Ды не, вы тым самым цягнеце яе назад. Зразумейце, што вы робіце.

На адказ маўчалі. Маўчаў і той, што гаварыў жорстка. І з боку дзіўнаю здалася-б, каб хто быў за сьведку, патаемная нарада ўпоцемку, рэзкая політычная размова, у якой адзін аднаго паелі-б, каб прымелі.

— Вашы спачуваньні яўрэйскаму рабочаму—словы адны. На справе вы нічога не зрабілі!—азваўся, нарэшце, голас.

— Быццам у соцыял-дэмократычнай партыі няма яўрэяў? Не забывайцеся: толькі соцыяльная пролетарская рэволюцыя вызваліць усе народнасьці з-пад уціску аднае вялікадзяржаўнае нацыі, да чаго мы і імкнемся ў процэсе ажыцьцяўленьня нашае програмы.

Зноў гаварылі тыя самыя два, а рэшты маўчалі. Нібыта ў рэзэрве былі яны і мацаваліся, зьбіралі сілы, каб пад канец прысьпець на помач і тым вырашыць, чый будзе верх. Але гэтак і не дапамаглі. Абодва хутка скончылі размову, перайшоўшы на відавочныя прапановы. Пачалі казаць пэўна і акрэсьлена.

— Мы прапануем наперад: самастойных політычных, выступленьняў як сёнешняе вось, не павінна быць—у рэволюцыі ўсе нацыянальнасьці роўныя.

— Мы патрабуем права яўрэйскаму рабочаму бараніць свае асаблівыя яўрэйскія інтарэсы і права баставаць, каб дамагчыся іх...

— Няма ў яўрэйскіх рабочых чыста нацыянальных інтарэсаў, ва ўсіх рабочых сучаснае Расіі адзін інтарэс: зьнішчыць царызм. А нацыянальныя інтарэсы—толькі частка агульных клясавых інтарэсаў пролетарыяту. Вам няма дачы-

неньня да нацыянальнага прыгнечаньня яўрэйскага рабочага і вы заўсёды па гэтым пытаньні хаваецеся за клясавыя ды інтэрнацыянальныя шырмы. Мы прапануем вам такую згоду!.. Першая—арганізацыя Бунд вядзе работу выключна сярод яўрэйскіх рабочых, а арганізацыя соцыял-дэмократычная—РСДРП—выключна сярод хрысьціянскіх рабочых... Другое—абедзьве арганізацыі не перашкаджаюць у гэтым адна аднэй і ня ўмешваюцца ў справы кожнае. Трэцяе—абедзьве арганізацыі паводле агалашоных пунктаў абавязваюцца дапамагаць адна аднэй.

— Вось сапраўдныя клясычныя ўзоры палітычнага мысьленьня. Ці не задумаецеся вы над тым, што дарога, па якой вы едзеце, заблытаная і дзікая, хоць і езьдзілі па ёй некалі, і ці ня думаеце вы, што ў такой дарозе вы можаце заснуць і прачнуцца раптам ў балоце... Так, на дарозе, балота... Цяжка гаварыць пасьля гэтага з вамі. Пакіньце сабе свае ўмовы... Пойдзем, таварышы,—смутны сказаў Арон.

Нібыта занежывавеў горад, быццам пакінулася ўсялякая палітычная работа. Гарадавыя былі разьмешчаны па адным чалавеку на прадпрыемствы,—паліцыя ўзяла—рабочых пад сваю апякунскую руку.

Пасьля размовы з бундаўскімі лідэрамі, Арон напісаў дзьве адозвы, адну да рабочых, а другую да сялян. У адозвах ён даводзіў нямінучую блізкасьць рэволюцыі, заклікаў сялян не плаціць падаткаў, рабочых арганізавана выступаць супроць самадзяржаўя. Надрукаваць адозвы ў друкарні Грынвальда не ўдалося з прычыны строгага паліцэйскага нагляду.

Нешта раз Арон паклікаў наборшчыка, добрага надзейнага хлопца, з друкарні Грынвальда, і з гадзіну горача тлумачыў яму нешта. Той ўсё ківаў галавою, а ўрэшце ўстаў і падаў руку Арону.

— Я гэта зраблю... Успамянеш мае слова, здохну, а зраблю.

Першага-ж вечару наборшчык Хведзька Чабор прыцёг на кватэру к Майзэлю фунты са тры шрыфту. На другі і трэці дзень паўтаралася тое-ж самае. А на чацьверты наборшчыка ледзьве не ўлавілі. Як толькі скончылі работу і рабочыя пачалі выходзіць, гарадавы ўзяўся аглядаць кожнага. Напэўна паліцыя, папярэджаная можа гаспадаром ці нават па сваіх меркаваньнях, учыніла рабочым самы строгі агляд. Як на тое ішло, Хведзька корпаючыся ля касы, папаў выходзіць па самым задзе. Зьмікіціўшы, чым можа кончыцца яго сёнешні крадзеж, пакуль выходзілі пярэднія, ён адхінуўся і шпарка павысыпаў з кішэні шрыфт. Калі дай-

шла да яго чарга, гарадавы добрасумленна абмацаў кішэні, запазуху, рукавы, садраў нават шапку, паглядзеў, скамячыў і аддаў.

Дні два прамінуў Хведзька, а потым, калі гарадавы пакінуў абмацваць, зноў пачаў красьці шрыфты і фарбу. А аднаго разу дахітрыўся вынесьці з друкарні фарбавальны валец. Неўзаметку накраў гэтак ён з паўпуда шрыфтаў. Рэшту прылад трэ' было дарабіць, як і варштацік для друкаваньня. Гэта заказалі зрабіць сьлесаром Файбэлевым, над якімі ня было чамусьці паліцэйскага догляду. Употайку сьлесары зьляпілі саматужны варштацік і друкарня была абсталявана. Майзэль сам зьбіў невялічкую касу. Хведзька параскідаў шрыфт па касе, і машына чакала работы. Без капейкі грошай, пры аднэй дапамозе наборшчыка і сьлесароў комітэт набыў сабе друкарню.

Нейкіх два тыдні апеквалася над рабочымі паліцыя. Аднае раніцы, папрыходзіўшы на работу, Арон і Ігнась з вялікай прыемнасьцю заўважылі, што чамусьці няма іх звычайных „гасьцей". Не зьявіліся яны і заўтра і пазаўтра. Уздыхнулася вальней. Закруцілася работа.

*

ВЫ мне гэтых лісткоў ня надта .. І бяз лісткоў пакрысе разьбіраемся. Кніжкі вось яшчэ туды-сюды, — сказаў Дуб.

— Ня сюды-туды, а бяры... Кожную, каб ня менш як дваццаць—трыццаць чалавек прачыталі,—адказаў Арон.

— Што вы мяне корміце гэтаю папераю. Паперы аднае мала цяпер, трэба нечага большага.

— Усё ў свой час.

— Тады, як непатрэбна будзе. Не!.. Зброі давайце намі Рэвальвэры, стрэльбы, няхай сабе паляўнічыя, паляўнічага начыньня... На ўсё грошы патрэбны, а мы такія багатыры, што хоць-бы лапці на нагах мець, вось.

— Ладна, я бяруся назычыць вас начыньнем: воловам, пістонамі і порахам. Вазьму на сябе,—сказаў Ігнась.

— А ўсё-ж такі, што мы зробім са сваімі пістаноўкамі. Бярданкі яшчэ сюды-туды. А з пістаноўкамі... Я вам скажу вось... Паспрабуйце вы набыць стрэльбу, калі ў цябе, як у воўка, будуць смаліць з вінтовак. Гэта ня жартачкі. Рэвольвэры патрэбны, вінтоўкі...

— Кулямёты не пашкодзілі-б, гарматы,—у тон яму загаманіў Арон.—Паслухай, Дуб, нічога мы яшчэ ня маем, а ці будзем мець, не скажу, бо ня ведаю. Ды ці-ж вы хочаце, каб з неба вам нападала, даставаць трэба неяк, шукаць.

Шукайце і знойдзеце—добра сказана ў евангельлі. Хоць у адным ды ня хлусіць. Не разарвацца-ж нам самім, ды парабіцца стрэльбамі і рэвольвэрамі. Сказаць лёгка, а вось паспрабуй дастаць. Думка комітэту: няхай дружына пакуль што палюе, на зайцох ды ваўкох набівае руку з пістаноўкамі, а мы тымчасам будзем шукаць лепшае зброі. Але на нас цалкам спадзявацца ня варта, бо бывае і ня выйдзецца можа, нічога не парадзіш. Вось пастанова комітэту. А пакуль што якое, дык самі на мак рассыпайцеся, а зброю набывайце, рыхтуйцеся.

— Братка ты мой, хораша ты гаворыш, але-ж каб яно зрабілася гэтак... Ну нічога, дзякуй і за тое, што далі, і за тое, чаго наабяцалі. Спадзяюся, што дасьцё, калі да справы дойдзе за грудкі ўзяцца з ворагам. Хлопцы ў мяне—малайцы!.. Стральцы добрыя... Лясы ведаюць мо' на пяцьдзесят вёрст вакол. Адным словам, кажу, будзе з чым парызыкаваць.

— Ну,ну, ня вельмі рызыкуй,—рады і самі, але хаваючы гэтую трывожную радасьць, паспрабаваў ахаладзіць Дуба Арон.

Але хіба можна было ўняць яго. Ён як удзяўбе сабе што ў голаву, дык шлягаю ня выб'еш—такі чалавек. Задумаецца аб вошта, ну і канцы, пакуль ня зробіць. А зрабіць, глядзіць, каб прычапіцца зноў да чаго.

*

ЦАРСКІ ўрад праз земскі аддзел міністэрства па ўнутраных справах з вышыні свае велічы абежнікам напамянуў сваім губарнатарам у лютым месяцы 1905 году—з мэтаю „падняцьця дысцыпліны народных мас і ўстанаўленьня на мясцох спакою, цішыні і правільнага цячэньня жыцьця насельніцтва“—закон 12 ліпеня 1889 году. Навошта варушыцца лішняе ды сілу, здароўе псаваць—па законе 1889 году. Прычакалі абежніка і губарнатары „Северо-Западнога края“ і, атрымаўшы, даручылі „сьмердам“ сваім—сірэч борзапісцам—і ад сябе, каб не завінавацінца міністру, сакрэтны абежнік паслаць земскім начальнікам.

Пры канцы гэты абежнік казаў:

„Калі-ж пры аб'ездах вучасткаў устаноўлена і даведзена будзе, што сярод сялян зьявіліся асобы, якія падтыкалі да якіх непарадкаў ці распаўсюджвалі проклямацыі, дык аб гэтым Земскія Начальнікі абавязваюцца зараз-жа паведаміць павятовым Іспраўнікам, указваючы разам з тым валасным старшыням і сельскім старастам, што яны самі абавязаны гэткіх асоб запыняць і перадаваць паліцыі“.

Земскім начальнікам, якія не асабліва любілі езьдзіць па сваіх вучастках, розныя падаткі накладваць было куды

ямчэй у ціхіх габінэтах з пахучым пад акном бэзам. Гэта ўвесну ды ўлетку. А нуднае восені ці ў зімовы мароз, хто дурны згодзіцца ў драбінках па лужах ці ў санках па ўхабах туляцца, ехаць ліха ведама куды ў сяло па такіх бясконца прозаічных справах. Ці-ж ня лепш ногі паўсаджваць у мяккія пантоплі ды з кніжкаю мэлянхолічных, сэнтымэнтальных вершыкаў палятуцець перад кафляным поэтычным камінком. Палятуцець аб бэзавай вясьне, аб бэзавай дзяўчыне-незнаёмцы; пра летнія маліны, лясныя маліны; пра пэнсіённыя аклады, пра сталіцу і паркетных паненак у шаўковым сьвіцюшчым рэдчыкавым адзеньні— інтымных, прытульных; пра дарагое іскрыстае шампанскае пры паненцы свайго сэрца; пра баль у яснавіднай залі; тэатры, ліхачы, шантаны, чорнавокія смуглявыя цыганкі!.. І не заважаючы на тое, што часам большае з усяго таго было недасяжна пану земскаму начальніку (у маладых-жа гадох і пагатоў), усё-ж хацелася лятуцець і ў лятуценьнях піць адчуваньне гэтае прыгажосьці; толькі ў лятуценьнях перад камінком увосень ды ўзімку нудна, бо іншы з іх часам ня бачыў сталіцы нават за дваццаць вёрст.

І сядзелі гэтак яны, як філіны, па лясох удзень, па мястэчках, заштатных гарадкох, з кніжачкамі сэнтымэнтальных вершыкаў, перад камінком, самі параджаючы салодкія мары, самі-ж спытаючы аслодасьці іх. Але атрымаўшы губарнатарскі сакрэтны абежнік, паразьяжджаліся.

Прыехаўшы ў сяло, трэба-ж сказаць селяніну, які конча пацікавіцца: „Чаго, панок, прыехалі? Сівер, мароз, ці горш сядзець у цяпле". Трэба сказаць па якой патрэбе. І вось адны аб'яжджалі вучастак—чыталі нібы лекцыі, другія аглядалі хлебазапасныя магазыны, а трэція—на рэвізію. А пазадзе за сяло ці два праяжджаў з званочкамі пад дугою станавы прыстаў, часьцей вураднік або валасны старшыня з шырознаю барадою—праверыць, ці не забыўся сельскі стараста як трэба частаваць вышэйшае начальства.

І пасьля аб'езду вучасткаў адказвалі земскія начальнікі па начальству, адзначаючы, што ў пахмурага і хітрага селяніна, які веры ня мае да начальства, цяжка даведацца пра што-небудзь. Але з большага на пытаньні абежніка можна даць адказы і гэтыя адказы ня надта прыемныя: „Усяму, што стаіць вышэй за яго, а асабліва таму, хто апрануты ў форменны чыноўніцкі мундзір, ня верыць сялянства ні на іржавы шэлег, а ў кожнай асобе ў чорным пінжаку бачыць „кручка", як кажуць".

Былі і такія земскія начальнікі, якія, цьвёрда „ўпаваючы на ўсявышняга" і не жадаючы турбаваць свае начальніцкае асобы аб'ездам вучастку, адпісваліся: „Сьмела магу зась-

ведчыць, Ваша Прэвасхадзіцельства, што ў маім вучастку ўве насяленьне шчыра і глыбока працята адданасьцю Гасудару і бачыць у Ім сьвяшчэнную асобу Памазаньніка Божыя"...

Земскія начальнікі пісалі, а пішучы да губарнатара аб становішчы сялянства аднэю рукою, другою павялічвалі падаткі, бо валасныя старшыні, судзьдзі і старасты скардзіліся на мізэрную пэнсію і на вялікую работу. Цяжкі экономічны капур штораз мацней і мацней біў па сялянству. З аднаго боку, паны са сваімі дварамі, з другога—усясільныя ўлады, начальніцкія асобы, аж да розных памочнікаў валасных пісароў, абдзіралі селяніна, як ліпку на лапці, нярэдка вымушаючы яго перакрыжоўваць сагнутую сьпіну паўразамі старэчых торбаў.

Невясёлае ты, жыцьцё людзкое! Глухая ты, радасьць, калі цябе клічуць і даклікацца ня могуць! Цяжкая ты, зямля цярплівая, бяз скаргі носіш на сабе вялікае нязьмернае гора, вялікую, незаслужаную людзьмі крыўду! Грымяць па дарозе разьбітыя сялянскія драбінкі—адгукаешся ты спачуваючы, зацягне жаласьлівую нудную песьню ў жніво кабета—падпяваеш ты, енчыць мужык у халоднай—ты стогнеш з ім разам. О, ты спагадніца! І ўсё-ж за цябе, зямля, за тваe нязьмераныя багацьці ў нетрах тваіх, крыўда вялікая робіцца, кпіны і гвалт чалавека над чалавекам!

ЧАСТКА ЧАЦЬВЕРТАЯ

# „АД ВЕКУ МЫ СПАЛІ...“

## ПРАЗ 18 ТЫДНЯЎ

БЫЛО Узьвіжаньне—гадавое сьвята Ўзьвіжанскае царквы ў суседнім двары Алескім. Штогод адбываўся там вялікі фэст. Прыяжджалі паны з гораду, хадзілі людзі наўкола царквы з пратэсамі і пеўчыя славілі бога. Увесь цьвінтар застанаўляўся хурманкамі, на сьвята ўвабраныя людзі вёрст за дваццаць ехалі на фэст.

Гэты год шанцавала фэсту: быў залацяны восеньскі дзень. Не апала яшчэ раса, як залемантавалі званы. Перш бухне грубы вялікі, адале срэбным, малінавым, як кажуць знаўцы, загалосяць малыя. Ї з старэнькае званіцы плыве ўрачысты звон па залацяным іржышчы, па голых, як бубен, гулкіх паплавох, па лясох у суседнія вёскі. А сонца сьвеціць ясна і гэтак нізка, што, здаецца, узяў-бы да рукамі дастаў, толькі на пальчыкі стаць.

Папрыяжджалі на фэст крамнікі са сваімі таварамі, параскладалі на вазох ды століках цукеркі, пернікі, абразкі, крыжыкі, яблыкі, ігрушы, семачкі, гарбузікі—ды чаго толькі не напрывозілі. Па вузкай вулачцы, што цягла на цьвінтар, пасталі яны ў два рады, выкрыкваючы ўголас пра свае тавары. Пазьбіралася на фэст і тутэйшая інтэлігенцыя, пачынаючы з паноў і канчаючы на памочніках валасных пісароў. Пеўчая падабралася з нізшае інтэлігенцыі, з гарадзкіх вучняў, з дзячкоў другіх цэркваў і іншых прэтэндэнтаў на званьне інтэлігенцыі.

Прышла і Люба на фэст. Вучыць яшчэ не пачыналі, але яна ўжо жыла ў Хорашаве. На фэст яе прымусіла іcьці вялікая патрэба—блізка сто проклямацый узяла яна ў Арона, а цяпер трэ' было раскідаць. Яна пахавала на сабе проклямацыі, акінулася вялікаю тараноўкаю і выправілася ў Алескае.

У двары Люба прайшла паволі туды-сюды, абышла з раз кругом царквы і прыпынілася. Дзеравяная цэркаўка была натоптана людзьмі, як зачыніць. Людзі плішчыліся туды і назад. Наўкола царквы, пабраўшыся за рукі, спацы-

равалі сельскія красуні. За імі ўхваста не аставаліся і хлопцы. Усё, што было лепшага ды навейшага з вопраткі ў кожнага, надзелася дзеля сёнешняга дня. Словы царкоўнага служэньня танулі ў людзкім гомане.

Люба праспацыравала яшчэ ад цэрквы на цьвінтар. Людзей было—не прабіцца. Уважна ўзіралася яна навакол, нібы шукаючы некага і ня бачыла... А шукала яна сапраўды і шукала Дуба, ён канечна павінен быў прыехаць на фэст і забраць ад яе трохі проклямацый. Дуба ня было, але Люба ня важылася даць лад ім усім сама і чакала.

Вакол бадзяліся старыя і маладыя, шнырылі дастатныя хлапчукі. Сьвятковы і як-быццам радасны настрой панаваў ня фэсьце. Яшчэ не даходзячы да цэрквы, бабулькі спаважна хрысьціліся, а бадзёрасьць і радасьць відна была ў іхных пагорбленых фігурах. Трапляліся мужчыны ў шэрых шынэлях і ваенных мундзірах. Але яны ўжо ня былі салдатамі, не адчувалі сябе імі, бо з тыдзень назад ужо скончылася вайна і ў далёкім і невядомым Портсмуце расійскі цар падпісаў з японскім замірэньне. Можа таму і сьвята сьвятлейшым нейкім было, можа таму і бадзёрасьці ды радасьці больш было ў людзей. Можа і ў царкве, дзе паўтара гады назад маліўся лысы попік „аб дараваньні расійскаму хрысталюбіваму воінству пабеды над супастатам“, цяпер маліліся і славілі замірэньне.

Люба намервалася абыйсьці другі раз увесь фэст, калі павярнулася і сустрэлася вокам увока з Дубам.

— Даруйце... Можа чакалі доўга,—ціха праказаў ён і ўголас дадаў:—Людзей тых, людзей, хоць грэблю тахці...

Дуб так сама, як і ўсе, апрануўся па-сьвятковаму і цяпер нагадваў невялічкага шляхціца. Ён заўважыў, што Люба аглядае яго вопратку і сказаў ціха:

— У ваўкох па-воўчаму.

Люба адказала:

— Я пайду ўперад.

І, азірнуўшыся, пайшла па цьвінтары ў той бок, дзе расьлі густыя кусты бэзу, акацыі, какалушы, бружмелю, арабіны, каліньніку. У гэтых кустох на правым баку хаваліся тутэйшыя паны, дзякі, адным словам, усе хто меў прывілеі на сваё пахаваньне тут.

Паблізу царквы праходжваліся з гарапнікамі ў руках стражнікі. Стражнікі-ж стаялі і ў вуліцы за цьвінтаром. Вураднік час ад-часу праходзіў, пакручваючы вусы. Уладкоўваючы сачылі парадак. Нямала шнырыла па цьвінтары нейкіх лісьлівенькіх падпанкаў, якія паслужліва адгукваліся на словы не да іх казаныя і ўступалі ў гутарку там, дзе не вельмі хацелі іх слухаць.

Люба бачыла іх. Праціскаючыся ў людзях, яна адчула, як яе штурхнуў нехта груба, але, азірнуўшыся, убачыла ветлівенькую чырвонашчокую морду, якая папярэдліва папрасіла прабачэньня.

— Ну і народу, ну і народу. Заціснуць могуць,—загаманіў ён.

Люба нічога не сказала назольнаму размоўцу і пастаралася чым далей адыйсьці ад яго.

Дуб бачыў гэтую сцэнку. Праходзячы паўз жуплівага малайца, ён намерыўся і шлёпнуў сваім цяжкім ботам на ягоны вылашчаны гамаш. Злосьць паказалася на твары ў таго, але тут-жа ён усьміхнуўся і жартліва сказаў:

— Ну і шмаравоз ты, дзядзька. Нагу адлушыў...

— Прабачце, панок, што вы хочаце з мужыцкага бота.

І, мацнуўшы поглядам па дапытлівым панку, Дуб падаўся за Любаю.

А Люба тымчасам выбралася з натоўпу і зайшла ў кусты. Наглядкам Дуб ішоў за ёю.

Аж пад самы цьвінтар з таго боку, куды яны ішлі. зацягала вузенькая, як матузок, рэчка. Сям-там на беразе сядзелі хлапцы з дзяўчатамі, дзе-ні-дзе бегалі дзеці. Люба адышлася трохі далей, дзе ня было нікога, і села. Павольна спацыруючы, падышоў Дуб.

Шпарка расшпіліўшы, як не павырываўшы гузікаў, адзеньне, Люба падаставала проклямацыі і аддала Дубу. Сораму ня было перад чужым расшпільвацца, паказваць сподняе плацьце ды голае цела.

— Я пакінула сабе трохі, параскідаю тут.

— Добра, добра—прагудзеў Дуб.

Ён узяў проклямацыі, цёплыя яшчэ ад Любінага цела, і пазасоўваў за пазуху. Потым пайшоў. А Люба павымала рэшту, заціснула ў руцэ і абапнулася тараноўкаю так, каб неўзаметку было.

Але пакідаць проклямацыі тут ёй гэтак і не ўдалося. Толькі гэта вышла яна на цьвінтар, як да яе падбегла дзяўчынка, што вадзіла некалі паказваць школу, як Люба была першы раз у Хорашаве.

— Што, Ганулька, скажаш?

— А я вас доўга шукала, гаспажа вучыцельніца.

— Не заві мяне гэтак... Заві—цётка Люба. Чаго-ж ты шукала мяне, Ганулька.

— Там скажу,—паказала яна рукою за вулачку, дзе было мала людзей. І, не чакаючы, што больш скажа Люба, зашылася ў натоўп і зьнікла з Любіных воч.

Калі Люба вышла на шырокую і пескавую дворную вуліцу, дык Ганулька была ўжо там. А як пайшлі вуліцаю, яна патаемна загаманіла, забягаючы словам за слова:

— Вас прасілі дадому ісьці... Я ішла к царкве, а мяне дзед ваш злавіў на вуліцы, дый наказаў, каб я канечна пераказала вам... Толькі, гаворыць, скажы, што прыехаў вураднік...

Неўпрашоны халадок прабег па плячох у Любы і сэрца сьцяло прадчуваньнем небясьпекі. Але прыняволіла сябе паказацца абыякаваю, спыталася так сабе, быццам яе і ня тычылася, што прыехаў вураднік:

— Навошта-ж я вураднiку?—і ўсьміхнулася.

Усьмешка вышла напрошаная, гэта, мабыць, угледзела і дзяўчынка, бо засьяпшалася за адзін раз, здаецца, пераказаць, што ведала.

— Яшчэ казаў дзед, каб прыходзілі хутчэй. Бо вураднік прыехаў.

— Дык я-ж ведаю, Ганулька, што прыехаў.

— Прыехаў вураднік і пытаўся вас... Адале, як сказалі яму, што на фэсьце, дык ён закомандаваў дзеду выправіць каго, каб пазвалі.

— Больш нічога не казаў дзед?

— Прасіў, каб не казалі вураднiку... Вураднік шукаў нечага ў школе і ў вашым пакоі...

А ў яе пад хусткаю проклямацыі... Вярнуцца пашукаць Дуба і аддаць яму ўсё? А ці знойдзеш цяпер таго Дуба. Можа яго і на фэсьце няма ўжо. „Здуравала... Цяпер не параскідаеш", мігнулася ў галаве і ўспамянуўся назольны размоўца на цьвінтары.

— І больш нічога не казаў дзед?—перапытала яна зноў у дзяўчыны.

— Не, толькі прасіў, каб слова ў слова і каб ніхто ня чуў. І вельмі прасіў, каб не казалі вураднiку, як прыдзеце.

— Добра Ганулька, я пайду... Дзякуй, што сказала.—Яна прытуліла к сабе дзяўчынку, зірнула ў вочы і ўбачыла ў іх такую адданасьць і любасьць, што ня вытрывала: схілілася і пацалавала ў лоб.

— Дзякуй, Ганулька. Ідзі, гуляй.

Не азіраючыся, але адчуваючы, што тая стаіць і глядзіць ёй усьлед, Люба хуценька пайшла вуліцаю Алескага. Быццам падганяў яе хто—ішла, ледзь ня бегла, а ў галаве роіліся розныя няпрошаныя няпрыемныя думкі...

У Хорашава вярнулася Люба зусім спакойнаю. За думкамі не заўважала, як прамігнулася дарога, гэтак шпарка і ня думаючы, што рабіць цяпер, ішла. Толькі калі угледзела сяло зьявілася асьцярожнасьць, згінулі думкі, пачала

дзейнічаць. Адкінуўшы тараноўку, прыпынілася і кінула на шлях проклямацыі. Лісткі паперы белымі галубамі запырхалі ў паветры і разьляцеліся па дарозе.

„Людзі ехаць будуць з фэсту, пазнаходзяць і прачытаюць“, падумалася Любе. „А цяпер пойдзем гаманіць з панам вураднікам“.

Яна гатова была на самае горшае.

Вураднік хадзіў са старым па садзе, калі прышла Люба. Дзед доўгім прутам спорваў сьпелыя яблыкі, а вураднік зьбіраў. Але гэты занятак не перашкодзіў вурадніку заўважыць, што прышла настаўніца. На далейшыя паслугі ён махнуў дзеду рукою, як-бы адганяў назольную муху і пакіраваў насустрач Любе. Дзед паставіў прут, падыбаў сьледам.

— Я бачу, здаецца, перад сабою тутэйшую настаўніцу. Вы Любоў Дарошаўна Аксюта? Другі год настаўнічаеце ў маёй воласьці, а мы яшчэ і не знаёмы.

— Чым магу служыць? —абыякава спыталася Люба.

— Даруйце, калі ўтруджаю вас,—зайдзём у пакой.

— Калі ласка. Дзедка, куды-ж ты? Зайдзі пасядзі, паслухай, што пан вураднік добрага скажа.

Вураднік запярэчыў.

— Выбачайце,—халодна праказала Люба,—у мяне ніякіх сакрэтаў няма ад дзеда. Ідзі, дзедка,—сказала яна і пацягла старога за рукаў у пакой.

Вурадніку, відаць, не па інструкцыі было гэта, але ён пакінуў больш супярэчыць Любе і пярэдні ўвайшоў у школу. Паслухмяны дзед, крэкчучы, зьняў шапку, збочыўся на вурадніка і адышоўся к печы.

— Чым магу служыць?—другім разам запыталася Люба.

Вураднік пахаваў яблыкі, паправіў рамушок пры шапцы, сеў на школьную лаўку, пакашляў набок і сказаў:

— Я ненадоўга адцягну ўвагу... гэта і мне лепш. Бачыце, у той час, як вы сьвяткуеце, я павінен выконваць свае службовыя абавязкі.

— Служба службе не раўня. Але-ж вас ніхто не прымушаў ісьці на такую службу, на якой сьвяткаваць не даводзіцца,—усьміхнулася Люба.

— Справа ў тым... Я служу свайму цару.

— Дык выконвайце вашы абавязкі, пане вураднік, а то і я не пасьвяткую. Дзякуючы вашым справам, я прымушана была пакінуць цэркаў і прыйсьці дахаты.

— Калі вы маліліся там і шчыра, дык я гатоў пашкадаваць, што перапыніў, а калі не...

— Я думаю, што гэта да справы не належыць.

— Што праўда—то праўда. Скажыце...

Вураднік дастаў ліст паперы і быццам задумаўся.

— Скажыце,—пераказаў ён другі раз,—вы ня ведаеце, чаго я прыехаў к вам?

— Дзіўнае запытаньне... Я не адгадчыца, ня ведаю, і прасіла б вас самога адказаць. Я слухаю вас.

Цьвёрдая рашучасьць апанавала Любаю. Сьмеласьць прышла, і Люба ўжо гатова была пасьмяяцца над сваімі нядаўнымі адчуваньнямі. Калі вураднік запытаўся, як звычайна пытаюцца, каб запісаць у протокол, хто яе бацька, адкуль яна родам, колькі ёй год, дзе жыве, дык яна адказала ня спыняючыся, лёгка і сьмяхотліва.

— Ваш бацька быў валасным старшынёю, а цяпер сельскі староста?—перапытаў вураднік.

— Але, цяпер сельскім старастам.

— Цяпер скажэце мне...

— Дазвольце перапыніць вас... Па якой справе вы задаеце мне гэтыя пытаньні?

— Зараз будзеце ведаць, а цяпер скажэце мне, што вы можаце расказаць пра Веру Сасноўскую?

— Пра Веру Сасноўскую?— зьдзівілася Люба.

— Так, пра Веру Сасноўскую. У гімназіі вучыліся разам.

— Вучыліся разам.

— Вы добра знаеце яе?

— Не, адмовілася Люба.—Я толькі ведаю, што яна была такая ціхая, спакойная дзяўчына.

— Больш?

— Больш нічога. Па сканчэньні гімназіі неўзабаве засталася ў школе вучыць дзяцей і пра яе нічога ня чула.

Вураднік запісаў на паперы.

— А ці ня знаеце часам нейкага Арона?

Люба ўстыла, здаецца раптам, але схапянулася і адказала:

— Арона. Не, ня знаю такога.

— Ня знаеце,— насторожна паглядзеў вураднік.—Добра... Яшчэ раз адкажыце. Гэта дык вы ўжо ня можаце ня знаць. Будучы з аднаго сяла, вы павінны сказаць мне...

— Пра каго?

— Пра сына бабылькі Агапы, пра Ігнася.

Любе кальнула ў сэрца. Усё вакол схавалася пад шэрую тумановую фарбу. Стала нудна і балюча.

— Што вы скажаце пра яго?

— А чаму вы пытаецеся ў мяне пра яго?—неспакойна запыталася Люба.

— Гэта да справы не належыць. Прашу вас адказваць. А можа ня знаеце такога?— іронічна запытаўся вураднік.

— Знаю. Але толькі і знаю, што ён, ня маючы з чаго жыць з маткаю, паступіў на работу ў горад.

— Далей.

— Далей нічога!—абурылася Люба, зірнуўшы на надта запытлівага вураднікa. У мяне нічога агульнага ня было з ім... Я вучылася ў гімназіі, а ён недзе працаваў. Прашу вас не задаваць мне больш запытаньняў, якія да мяне маюць тое-ж дачыненьне, як да гэтага дзядулі.

— Я думаю, наадварот.

— Разумееце, ня ведаю я ў чым справа і чаго вы намагаецеся сваім допытам.

— Шкада. Магу сказаць. У горадзе арыштавана за супроцьурадавую пропаганду і наогул за злачынную палітычную чыннасьць Вера Сасноўская.

— Вось яно што,—абясьсілена праказала Люба,—дык прычым-жа я тут?

— На допытах арыштаваныя паказвалі супроць вас...

— Хлусьня!—абурана крыкнула Люба.

— Вы так думаеце?

— Так думаю і пераконана ў тым. Хлусьня спачатку а канца.

— Не грашыце богу, пане вураднiку,—прашамацеў бяззубымі дзёснамі дзед.—Грашыць няма чаго на нашу паненку, каб ёй даў бог доўгі век.

— Цябе ня пытаюць, стары!.. Вашы паказаньні я запісаў у протокол. А цяпер павінен па доўгу службы пагледзець вашы рэчы.

Люба пакорна пайшла паказваць свае невялічкія манаткі.

Праз пятнаццаць хвілін вураднік аглядзеў і, нічога не знайшоўшы, запісаў ў протокол аб выніках агляду, даў расьпісацца Любе і пашоў. Праводзячы яго стары бубнеў сабе пад нос:

— Няма чаго грашыць на паненку... Калі вінаваціць такіх людзей, дык трэ' тады і ўсіх—і мяне старую пачу...

— Ну, ну,—абарваў яго вураднік, сеў на каня, хвоснуў гарапнікам і трухам выехаў на Хорашаўскую вуліцу.

Колькі часу сядзела Люба, як пайшоў вураднік. Сядзела, не крануўшыся з месца, не паварухнуўшы нават пальцам. Роспач закула яе ў свае халодныя ланцугі беспараднасьці. Гэтак сядзела яна, пакуль прышоў стары.

— Паненачка, не бядуйце. Грэх ім перад богам за гэтую дарэмсьціну,

— Не, дзядуля,—апамяталася Люба.

Кароткі крызіс прамінуў. Цяпер конча, трэ' было рабіць нешта, але што і з якога канца ўзяцца? Што рабіць, калі

яны сапраўды ўсе паарыштоўваны? К Дубу накіравацца, паведаміць яго? А можа Дуб і сам ведае, а справе гэта нічога не пасобіць...

Хістаньні перапыніліся і рашэньне асьвятліла стомлены твар Любін. Яна ўсхапілася і, як была, у тым-жа самым адзеньні, з тарэноўкаю на плячох вышла на двор. Дзед, крэкчучы, падлюбаў за ёю.

— Дзядуля!—сказала ў парозе.—Я ў горад пайду, толькі вы нікому, нікому не кажыце. Калі папытаецца хто, скажыце, што ня ведаеце дзе.

— Дык навошта-ж, дзеткі, пеша? Я запрагу каня ды падвязу.

— Ня трэба, дзядулька, я пеша.

— Ну і жытка,—патрос галавою стары, як Люба зайшла за пругмень.

А старому сказала праўду: яна парашыла безадкладнаісьці ў горад і з дапамогаю Няслаўскага даведацца пра ўсё.

Розныя меркаваньні зьяўляліся ў галаве, розныя пляны выратунку лезьлі назолаю.

Дзень канаў. Надыходзіў вечар—прыгожы восеньскі вечар. А Люба не заўважала пякнотаў навакол. Не заўважала, як павольна падаюць з бярэзін на шлях пажоўклыя лісты, якою прасьцінёю лёг доўгі шлях. Проці ночы—ціхім падвячоркам—гэтулькі пяшчотнасьці навейвала залацянае іржышча ды быццам пасталеўшы стары беразак наабапал. Прымятая сухая трава патроху засьцілаецца жоўта-жоўтым лісьцем. Неба празрыстае, як шкло. У восеньскай прыродзе сваясаблівая нявымоўная прыгажосьць, свая ціхая, самотная і ласкавая разам пяшчотнасьць. Ідзеш па шляху. Прысады з беразаку такія велічныя. Часам пераляціць шлях сявец. Кракне варона. А дарога пад нагамі гэтак звонка, працяжна стогне. Слухаеш, быццам хочучы пачуць нешта, узіраешся, быццам нязвычайнае нешта ўбачыць чакаеш. Цішыня на бакох, уперадзе і ззаду, цішыня празрыстая, звонкая. І паветра з кожнаю хвілінаю, здаецца, робіцца здаравейшым, разчэйшым і дыхаць хочацца ім, не пакідаючы.

Люба не заўважала ўсяго таго, ня бачылася ей усяе пекнаты, думкі сьвідравала адно жаданьне хутчэй зайсьці—разьведаць і зрабіць нейкія канцы сёнешняму пачатку. Крохкія надзеі блыталіся вакол гэтага жаданьня, крохкія надзеі вылучала сэрца. Водгульле сьпеву, гімну першаму пацалунку, сьпеву чаратоў зьяўлялася з гэтымі надзеямі, уваскрасаў у памяці поплаў у красках... І сэрца сьціскаў

боль, і крок паскараўся, і самотна рабілася вакол, цягло, клікалаісьці, як ня бегчы,

А на шляху—ні жывое душы. Мусіць з фэсту людзі пераехалі ўжо даўно. Дзень цяпер кароценькі, не пасьпееў азірнуцца, а ўжо і вечар.

У барвяным водблеску за далёкімі ружова-яснымі аблачынкамі заходзіла сонца. Сірочыя цені разасляліся па шляху. Недзе ў баку задзяўкалі сабакі—увосень гэтак далёка плывуць гукі.

Люба вышла на ўзгорак. Сабакі дзяўкалі гэта ў Слаўным. Да гораду было яшчэ вёрст з восем. Слаўнае, калі зірнула на яго Люба, ня ўзбудзіла ў ёй ніякіх адчуваньняў, ані нічога з мінулага. Яна захоплена была цалкам цяперашнім нярадасным, страшліва невядомым будучым. Засмучанае сэрца ўціхла ў Любіных грудзёх, анямела.

Ужо неяк ніводнае думкі ня было ў галаве, ані жаданьня. Пазадзе зьлілося ў пацьмянеўшым абрысе з зямлёю Слаўнае. Змрок густы восеньскі насоўваўся павольна, але няміну̀ча цьвёрда. У нізкіх лагчынах сьветлыя фарбы танулі ў шэрым змроку. Сьветлаблакітнае неба рабіцца пачало цёмнасінім. Сіняе адценьне з кожнаю хвілінаю гусьцела ды гусьцела. На доўгі бярозавы шлях апаў вечар.

Наперадзе застукацелі конскія падковы. Звонкі гул паплыў ад іх па шляху ў смуглявы вечар. Але не драбіны ляскацелі бярозавымі ляскамі, ехала панская каламажка.

Люба сышла набок, на цьвёрдую, як ток, сьцежачку пад бярэзінамі. Асьцярожнасьць прымусіла захутацца ў тараноўку. Вось яна сустрэлася з каламажкаю. Вось сытыя коні ірвануць зараз, і яны разьмінуцца. Люба зірнула, быццам цягло яе паглядзець, і радасным воклічам вырвалася:

— Лара! Ларыса...

— Люба?—задзіўлена азваліся з каламажкі. Ларыса выскачыла, падбегла к Любе.—Куды ты?

Словы захрасьлі ў горле ў Любы, бы колам сталі пасярод. Было горна, крыўдна і радасна неяк, што сустрэла трохі блізкага чалавека ў гэтай самотнай вечаровай цішыні.

— Хадзі сюды, Люба... Ты можа незнаёма з маім фурманам—рэкомэндую.

А фурман скочыў з перадка, падбег, і ўхапіў Любіны рукі.

— Ігнась!..

Засмучанае сэрца захлынулася ў радасьці.

ПА Тройцы пачалі выбухаць непарадкі на сёлах. У паліцыі праз шпега, якіх нямала было ў сялянстве, зарэгістравана было, што цёмныя асобы падкідаюць лісткі „возмуціцельнага зьместу“, падбухторваючы народ на зладзейскую чыннасьць. Зазначалася ў сабраных вестках, што сялянствам ніяк не паважаецца начальства, толькі ў прысутнасьці самых начальніцкіх асоб як-быццам пакорна трымаецца. На справе-ж гутаркі ходзяць у сялянстве, розныя гутаркі: і пра зямлю там, якая спрадвеку належыць сялянам і толькі часова пад панамі ды дзяржаваю і манастырамі, што надыйдзе такі час, калі сялянскія комітэты будуць бяз чужое ласкі дзяліць зямлю паміж мужыкоў. Мужык, які чытаў толькі псаўтыр, дый то па нябожчыку, ці чыслоў або евангельле, стаў набываць аднекуль з боку недазволеным парадкам падазроныя кніжкі, стаў чытаць іх употайку. І к таму часу, калі замірэньне з японцам ужо фактычна вырашылася на манчжурскай зямлі, і калі падрыхтоўвалася вонкавае замірэньне ў Портсмуце, сялянства ўжо пачало выказваць найвысшую непавагу і да ўлады і да паноў. У паліцыі ўсё гэта вядома было. І паліцыя рабіла захады. У аднэй воласьці была выкрыта нелегальная бібліотэка, з'арганізаваная невядома кім, якая з посьпехам раздавала самыя бунтарскія кніжкі. Бязумоўна, бібліотэчку з багаслаўеньнем паповым, выбраўшы колькі экзэмпляраў да справы, спалілі на месцы ў прысутнасьці прыставоў і спраўніка, каб паказаць народу, чым пахне справа. А ў адным панскім двары, дзе разводзіліся завадзкія каровы, невядома хто застрэліў на пашы ўдзень самага лепшага галяндзкага быка. Калі доктар-вэтэрынар агледзеў застрэленую жывёліну, дык знайшоў валавяную кулю, якімі набіваюць стрэльбу хіба толькі на мядзьведзяў. У другім двары, дзе быў вадзяны млын, уночы таксама нямаведама хто перакапаў грэблю, і вада хлынула па лагчыне на паўзрэчны паплавец, дзе сохла ў паразьбіватых пракосах атава—вазоў шэсьць ці сем. У тым самым двары нешта два дні найміты з сялян разьбівалі пад жыта гной. А ўраніцы на трэці дзень аконам агледзеў у сьвінушніку праколатага сахаром, выпісанага дванаццаць тыдняў назад з Ангельшчыны, кныра. Пан навёў самае строгае сьледзтва, але на вінавайцу патрапіць не ўдалося. Яшчэ ў адным двары таксама ўночы нехта залез у шопку, пад якою стаяў паравік ад малатарні, і папсаваў яго так, што свой дворны мэханік нічога рады ня мог даць. Памешчыкі ўзяліся набываць сабак, нанач спушчалі з ланцугоў, выстаўлялі варту з парабкоў, дарага плацячы за

кожны начны каравул. Нічога не пасабляла: каравул быў на адным канцы двара, а на другім невядомыя варожыя рукі чынілі шкоду. А часам находзіў пан сабак патручанымі перад сваім палацам. Было ясна, што рабіў гэтую работу не адзін і ня два чалавекі, і не адзін пан гатоў быў пабажыцца, што ў кожным, хоць-бы самым выпадковым няшчасьці, але ды замешана чалавечая рука. Паны наяжджалі да маршалка, да спраўніка, вялі доўгія гутаркі з земскімі начальнікамі і станавымі прыставамі, запрашаючы да сябе за гасьцей і, палохаючы позным надвор'ем, прымушалі начаваць, каб адну ноч хоць адчуць сябеспакайней. Не пасабляла нічога, ні земскі начальнік, ні прыставы з ураднікамі, ні, нарэшце, сам спраўнік павету з дваранскім маршалкам. Як і раней, паны цярпелі ўсялякія пакасьці: калі ня труцілі сабак, дык тапілі ў дворных студнях індыкоў, а калі атавы затапіць ня было як, дык сухую ўжо надпальвалі ў копах. Як ні кінь, дык усё не ад таго, ды к таму. Паны скардзіліся начальству, крыўдавалі, бо начальства нічога ня здолела выкрыць ва ўсіх гэтых патаемных злачынствах.

А начальству і самому ня солад быў. І пісала начальства, падавала панскія скаргі вышэй па начальству і ад сябе дадавала сваё. А дапамагчы дваром само нічым ня ў моцы было. Ну, чым пасобіш, не сваёю-ж галавою; гарадавых ды стражнікоў не хапала ўжо і ў горадзе, каб трымаць у руках парадак; валасныя-ж стражнікі па адным не асьмельваліся езьдзіць, а заўсёды ў кучцы, узяўшы ў кола ураднікавую асобу. Пад восень паны з лесавых урочышчаў пачалі скардзіцца на часты глум лесу мужыкамі Стражнікі са стрэльбамі апасваліся вылазіць са сваіх хатак, чуючы апоўначы як цяжка стогне зямля, як падаюць падпілаваныя дубы ды грабы. Пілкі ды сякеры часьцей стала чуць па лясох уначы. А ўдзень стражнікі знаходзілі сьляды калёс, якія, не хаваючыся нідзе, ясна ішлі на сёлы. Павятоваму начальству пасыпаліся пэтыцыі. Прасілі ўзброеныe надзейнае сілы, нудзіліся па чубатых казаках з чырвонымі лампасамі.

Але начальства, як на тое зрабілася гэтак, ня мела ні казакаў, ні салдат, нельга-ж лічыць за салдат конвойную каманду, якая таксама была ў расходзе заўсёды. Як на зло быццам паном быў абыйдзены вышэйшым начальствам павятовы гарадок. У той час, па ўсіх суседніх гарадох мелася салдацкая абарона, а тут на табе. Земскія начальнікі пісалі губарнатару, спраўнік пісаў губарнатару, губарнатар пісаў да міністра па ўнутраных справах. А салдаты ня прыходзілі, можа таму, што яны патрэбны былі ў іншых мясцовасьцях, яшчэ больш, чымся тут. Чуткі ішлі, што

забунтаваў Прыбальтыцкі край і генэрал Арлоў з цэлым корпусам пайшоў на ўсьмірэньне непакорлівых. Па іншых паветах „Северо-Западного края“, відаць, не спакойней было, чымся тут, бо тамтэйшыя гарнізоны не маглі вылучыць ніводнага салдата са сваіх шэрагаў. А наўкола гарнізоны былі досыць моцныя: у Бабруйску стаяла, мусіць, ня менш за полк, у Барысаве кватаравалі драгуны, у Менску гарнізон з розных відаў зброі, нават цяжкая артылерыя і казакі, у Несьвіжы—артылерыя, нават па некаторых асабліва неспакойных мястэчках стаялі пяхотныя паўроты.

Такім парадкам, калі на ўсе просьбы з павету губэрня не дала войска пакуль што, спраўнік наважыўся на свой страх і адказнасьць зрабіць штб-небудзь. Калі ў аднэй воласьці была выкрыта бібліотэка, а ў другой заарыштавалі культасьветны комітэт і зусім гэта, здаецца, бяз усякіх цяжкасьцяй, без супраціўленьня ад злачынных элемэнтаў, дык поліцыя пасьмялела і стала наводзіць парадак у горадзе. Спраўнік, хоць начальнік ня надта рашучы і сьмелы, усё-ж разумеў добра, што горад кіруе ўсімі бунтамі і падбухторваньнямі на павеце. І спраўнік пашырыў сетку патайных агентаў, што на хуткім часе дало свае вынікі.

Нешта за тыдзень перад Узьвіжаньнем на цагельні пад горадам поліцыя арыштавала Веру Сасноўскую. Пры арыштаванай знайшлі социял-дэмократычныя проклямацыі, якія яна, паводле заданьня, павінна была параскідаць. Апроч проклямацый, на кватэры ў Сасноўскай вобыскам адшукалі нелегальную літаратуру, выданую Расійскай социял-дэмократычнай рабочай партыяй. Праўда, паміж социял-дэмократычнае літаратуры папалася пара брошурак БСГ. Сьледчы ўзяўся апрацаваць дзяўчыну, і выявілася, што яна выконвала заданьні социял-дэмократаў, а можа нават была і адным з іхных кіраўнікоў.

Ігнась з Аронам даведаліся пра арышт таго-ж дня і ўжылі ўсе захады, якія ўжываюцца ў такім разе падпольнымі організацыямі. Паведамілі ўсіх таварышоў, у бясьпечнае месца запраторылі літаратуру і розныя дакуманты і пачалі сачыць за паводзінамі поліцыі, што ў невялікім гарадку ня надта цяжка зрабіць. Наведвалі друкарню з усёй асьцярожнасьцю, якая выклікаецца заўсёды арыштамі. Ужо ў Майзэля не рабілі сходак комітэцкіх, ні нарад, і сам Майзэль як-быццам парваў з социял-дэмократамі ўсякія зносіны. Пры наведваньні адзін да аднаго ўстанавілі сыстэму ўмоўнага стуку, запытаньняў і адказаў. Асьцярожнасьць, уласьцівая організацыі моцнай, масавай, была заведзена ў социял-дэмократычнай групе.

А знадворку ў горадзе быццам-бы і ўсё спакойна. Дымілі паравікі. Людзі хадзілі на рынак. Майстэрні грукацелі ранейшым грукатам. І нават рака павольна цягла сваю каламутную ваду праз горад. Быццам вонкавага гораду нічога ня тычылася.

Дзень зрабіўся кароткім. На работу станавіліся ў прадпрыемствах з васьмі гадзін, як толькі ўзыходзіла сонца, і канчалі ўжо пры лямпе. Восеньскі дзень.

Дні праз чатыры пасьля арышту Веры Сасноўскае, калі Арон з Ігнасём пачалі абнадзейвацца, што на тым і абыйдзецца, бо Вера зарэкомэндавала сябе цьвёрдаю і спакойнаю дзяўчынаю, крыху, праўда, даверліваю, здарылася якраз тое, чаго ўжо пакінулі чакаць. Таго вечара весялосьць панавала гарэзьлівая ў Зусевай майстэрні. Хлопцы сьпявалі бадзёрыя песьні. І лямпы гарэзьліва ўсьміхаліся, гледзячы на іхную весялосьць.

Ігнась увіхаўся прутка ля ножнага гаранка. Работа гарэла ў руках.

Весялосьць стала ўсенькаю. Засьпявалі агулам.

— У садзе ягада маліна
пад шрыкрыцьцем расла...

Неяк асабліва весела міргалі лямпы. Неяк асабліва празрыста блішчэла волава пад паяльнікам Ігнасёвым. Жухацеў радасна горан. Пілілі звонка напільнікі. Ляскацелі малаты.

Ванька-ключнік, злы разлучнік,
Разлучыў князя з жаной...

Дапявалі песьню і канчалі разам работу, калі дзьверы шпарка адчыніліся і зачыніліся. У парозе стаяла незнаёмая дзяўчына. Але дапявалі песьню і ніхто не хацеў угледзець яе. Абарвалася песьня ў Ігнася чамусьці; зірнуў на дзяўчыну—сустрэўся вокам у вока, падбег.

— Хто тут Ігнась?

— Я... што?

— Паперка тут.

Падала складзены ўдвое конвэрт, пырхнула за дзьверы, нырнула ў цемрадзь—зьнікла.

Ірвануў Ігнась конвэрт за ражок—разлупіў. Выцяг пісульку. Уставіў вочы. На хвіліну. Згінула весялосьць. Гострая сур'ёзнасьць закула ў сталь шчокі. Прутка, шпарка падышоў к Арону, падаў паперку.

Рабочыя не заўважылі рэзкае перамены ў Ігнасю. Увайшоў Зусь. Пакідалі хлопцы работу, апраналіся ўжо.

А Арон чытаў:

„Ігнась. З хвіліны на хвіліну чакайце аблавы. Не, не чакайце яе—ўцякайце. У горадзе ня знойдзецца ніякага прытулку. Раю Арону зьнікнуць на некаторы час—выехаць з гораду. Сёньня ўвесь горад аблазіць паліцыя, ведаю як тое, што вам здрадзілі, вас выказалі ў паліцыі. Пасьпяшайце. Ігнася чакаю ў садзе, дзе, два гады назад некалі... калі ў домё была сходка. Пасьпяшайце ці арыштуюць. Ваша..."

— Не провокацыя?

Зірнуў Ігнась на Арона.

— Не!.. Я веру.

Рукі ў рукавы. Дапытлівы возірк на вокны. Рашучы крок на вуліцу. Хутчэй дахаты.

Двое вылучылася з грамадкі рабочых. Упарта сьвідруючы паветра, пашыбавалі вуліцаю.

Па дарозе абмінулі пяцёх гарадавых з акалодачным і прыставам. Скочылі ў завулачак. Выбеглі на другую вуліцу. Сустрэліся з другім паліцэйскім атрадам. Забеглі ў двор. Цераз сад на суседні завулак.

Напружаная цішыня. Восеньскі халадок. Шалёна калоціцца ў грудзёх сэрца. Вочы, здаецца, усё ўсюды і адразу бачаць. Ногі лёгкія-лёгкія, як крылы ў птушкі. Падрыгваюць дробна пальцы на руках.

На сваю вулачку вышлі з другога канца. На вуліцы ні чалавека. Бязьлюдна, ціха. І небясьпечна, небясьпечна, таму што ціха.

У хаце цёмна. Як цені, бяз рыпу прасьлізнулі ў варотцы. Знаёмы постук у шыбу. Адказ. І ў пакоі.

Пераапрануцца—паўхвіліны. Патрэбныя рэчы ў клуначак. А рэшту што—маўклівай гаспадыні.

— Прыбярыце... Займайце зараз-жа пакой. Будзе паліцыя... Разумееце?

Спакойнае і баязьлівае разам:

— Добра.

У пакоі засталіся ўдвух.

— Ігнась, грошы...

— Не, Арон, не вазьму я. Табе яны.

— Кінь гаманіць. Бяры і кончана. Калі праўда гэта будзе, старайся дзе зброі.

— А вы?

А мы знойдзем, калі патрэбна будзе, а не і бяз грошай выкруцімся.

— Глядзі. Сувязь з Майзэлем... Як свайго вока сьцеражы друкарні. Усё.

На дварэ замармытаў Кіяш. Аскірэнуўся. Гаўкнуў два разы. Сьціх.

— Пайшлі.

— Так. Сувязь цераз Майзэля. Неўзабаве падам вестку.

З-за парога гаспадыня кінула:

— На дварэ неспакойна... Сабака чужога чуе.

— Чуем... Пайшлі... Гутэнтаг!

На дварэ ў ногі кінуўся Кіяш. Рады, мусіць, што вышлі, завішчэў. Адале пакінуў лашчыцца. Уціх і потым загыркаў зноў.

З канца вуліцы пачуўся тупат ног. Ціхая гамонка ўпаў-голас, па слову, па два перакідваюцца. Яны.

Моцны поціск рук. Абняліся, як браты. Пацалаваліся. Ціхае адзін аднаму:

— Бывай!

Адзін цераз адзін плот, другі цераз другі—і на суседніх агародах. Кіяш з Ігнасём.

Каля хаты, дзе хвіліну назад былі яны, застукацелі і загрукалі ў дзьверы і ў вокны. Уладны поліцэйскі голас патрабаваў, каб адчынілі.

Ігнась выскачыў на вуліцу.

Куды бегчы?

І ўспамянуў пра пісульку, пра якую забыўся быў у сумятні.

Тулячыся паўз платы і сьцены дамоў, абабег кругом небясьпечную вуліцу. Падбег пад даўно знаёмы сад.

На канцы гораду прагучэлі два стрэлы адзін за адным.

Паўз самога Ігнася шаргануўся чалавек. Не заўважыў яго. Зьнік за рогам.

Ігнась пхануў варотцы. Як злосьнік зубамі, рыпнулі яны, падаліся. Зайшоў у сад.

Раптам на плечы яму ляглі нейчыя рукі.

Ігнась зжахнуўся.

— Хто тут?

І схапіў за чужую руку, павярнуўся.

Прад ім стаяла жанчына. З рук не вырывалася тонкая, далікатная рука. Знаёмым пахам духоў пахнула на Ігнася, нагадала пазалеташнюю восень у гэтым самым садзе.

— Ларыса!?

— Шш-ш,—прашаптала жанчына і пацягла Ігнася ў глыб саду.

...У пакоі, куды прышлі яны праз заднія дзьверы, жанчына лёгка ўздыхнула і запыталася:

— Пісулька?

— Атрымаў... Ларыса, гэта вы?..

Яе галава схілілася дя яго галавы; жартлівым ды гарачым разам падыхнула ад яе слоў:

— Не, ня я.

І зарагатала—прыціснута, ушопат.

— Добра, а? Зусім як у прыгодніцкім романе. Няхай пашукаюць цяпер.

Кіяш скочнў ёй на грудзі і лізнуў мокрым шаршавым языком у твар. Ігнась адапхнуў.

Яна пазацягвала вокны цёмнымі фіранкамі і запаліла лямпу. Сьвятло ўдарыла ў твар Ігнасю, на момант засьляпіла вочы.

Перад ім стаяла Ларыса. Была яна ў цёмным восеньскім гарнітуры, прывабная і загадкавая.

Два дні хаваўся Ігнась у Няслаўскіх, першы дзень нават стары Няслаўскі ня ведаў. А як пацішэла ў горадзе, на Ўзьвіжаньне Ларыса сказала, што трэба перабрацца ў двор.

— Там бясьпечней будзе.

Пад вечар, калі змрок стаў насоўвацца з захада, пад ганак падалі каламажку, запрэжаную параю коняй. Ігнась сеў за фурмана, лізгануў па конях стусінаю, і яны без перашкоды выехалі за горад.

А праз паўгадзіны сумна-радасны вокліч Любін спыніў іх не даяжджаючы да Слаўнага.

### АДЗІН ПАМІЖ ДЗЬВЕХ

ЛАРЫСА ня пусьцілаЛюбы ў Хорашава. Адным словам сказала, што і слухаць ня хоча пра яе гаворку, але Люба адчувала, што кажа яна гэта толькі так, а думае зусім наадварот. Хіба-ж не заўважыла яна, як захліпаліся ў Ларысы словы, калі апавядала яна, як папярэдзіла арышт Ігнася. І ў гэтыя радыя хвіліны сустрэчы насупроць таму, чаго чакала, сум джаліў камарамі ў сэрца.

— Не, ты павінна пераначаваць у нас сёньня,—запярэчыла Ларыса і адвярнулася некуды з пакою.

Ігнась шапнуў:

— Пераначуй, Люба... Заўтра трэба нам пагаварыць.

Змагаючыся сама з сабою, засталася Люба.

На вячэры сякая-такая направілася гутарка. Узбуджапая ежаю, а мо' і прысутнасьцю Ігнася побач, Ларыса жвава апавядала:

— Люба!.. Ну, каб ты ўявіць магла сабе... Зусім як ў романах Ганны Рэдкліф ці Вальтэр Скота, з невялічкімі адхіленьнямі, праўда. Майстэрня, панурая, цьмяная, асьветленая лямпамі... Хлопцы-дужакі напаўняюць шумам майстэрню. Потым сьпяваюць, і сьпеў зьліваецца з шумам. Раптам дзьверы адчыняюцца і захутаная дзяўчына пытаецца Ігнася. Абрываецца сьпеў, Ігнась чытае паперку, і потым ужо, як у кінэматографе. Два хлопцы па дарозе абягаюць поліцыю, сьпяшаюцца на кватэру.

— Адкуль вы ўсё ведаеце?—зьдзівіўся Ігнась.

— Гэта я прыстасоўваю да роману Рэдкліф і Вальтэр Скота. А, нарэшце, чаму-б мне і ня ведаць. Але паслухайце далей. На кватэры нашы героі, бязумоўна, зьнішчаюць усе сьляды свайго пражываньня там, пераапранаюцца і ўзброеныя выходзяць на двор. Прабачце, трохі прамінула. Перад тым як увайсьці ў кватэру, у якой цёмна, як у пекле, хлопцы ціханька стукаюць у акно. Да іх падбягае, як леў, сабака, лашчыцца. Тымчасам быццам з няжылога дому адказваюць такім самым ціхім стукам, за дзьвярыма адсоўваецца засаўка і нашы героі ў няжылым доме. І вось, як браты-разбойнікі, на якіх палююць урадавыя салдаты, сябры ўмаўляюцца сустрэцца, а як і дзе, будуць ведаць пасьля. Уцякаюць у розныя бакі, бо чуцён ужо прыдушаны шум, сьцішаныя галасы і ненаўмыснае лязганьне зброі ўрадавых салдат.

— Аднак, гэтае набліжэньне да прыгодніцкіх романаў і ў жыцьці было, мусіць?—раўніва спыталася Люба.

— Даю права думаць,—азвалася Ларыса і працягвала сваю фантазію.

— Блытаючыся ў агародах, адзін з сабакам наперадзе—сабака за выведніка—накружыўшы па горадзе, упіраецца ў патаемны маўклівы сад. Перад героем заіржавелыя варотцы. Раптам на канцы гораду стрэлы, фігура чалавека, як здань, прасоўваецца паўз нашага героя. Горад не абяцае яму нічога добрага. І ён рашае. Штуршок рукою, і, рыпнуўшы, варотцы адчыніліся і зачыніліся самі па сабе. А не пасьпеў надумаць ён куды ісьці і што рабіць, як дзьве рукі падаюць яму на плечы...

— Урадавыя салдаты,—падказаў Ігнась.

Яму хацелася ўхіліць Ларысу ад праўды, каб ня даць пачуць Любе пра гэтую начную інтрыгу, дзе, бязумоўна, было ўмешана сэрца—яго ці Ларысіна, гэта справы не перайначвала. Але Ларыса, як на зло, упарта ня ўхілялася ад романтычнае сапраўднасьці і, быццам смакуючы перажытае, не пакідала фантазіраваць у сапраўднасьці:

— Не салдаты, а стромкая пекная дзяўчына, якая даўно ўжо... Што даўно—я не ведаю... ну, знала нашага героя, зацікавілася ім і не хацела, бязумоўна, каб яго злавілі ўрадавыя салдаты. Пазнаёміўшыся з урадавым афіцэрам, яна дазволіла пакахаць сябе і разьведала, што на яе героя рыхтуецца напад. Вось чаму здолела папярэдзіць яго і сустрэць у садзе.

— Казка з тысячы і аднае ночы, а ты Шэхэразада, Лярыса, пры тэй толькі розьніцы, што не засуджана ні кім ні на якую кару, а вымышляеш усё па сваім добрым жаданьні.

— Ня зусім,—адказала Любе Ларыса:—герой сядзіць перад намі. Ён-жа можа пацьвердзіць, як загадкавая дзяўчына, якую ён да таго разоў колькі бачыў, але цяпер не пазнаў, па сьцежачках, усыпаных восеньскім лісьцем, правяла за руку ў патаемны пакой у доме.

— І тут канцы пакуце нашага героя,—насьмешліва азвалася Люба.

Ларыса блiснула сваімі з зеленаватым блескам вачыма і адказала:

— Не, тут яны пачаліся. Два дні ні сьвятла, ні сонца— хаваўся наш герой...

— Пакуль яго вялікадушная збавіцельніца не запрапанавала стаць за фурмана ў яе,—уставіў Ігнась і гэта ўкалола Ларысу.

— Гэта таму, што ня было як вывезьці яго з гораду, у якім на кожным кроку з падазрэньнем узіраюцца варожыя вочы. Па дарозе яны сустрэлі другую дзяўчыну, якая ішла напроці ночы шукаць таксама свайго героя. Яна думала, што той ужо арыштаваны і засаджаны ва ўрадавы астрог,— скончыла Ларыса і напята ўсьміхнулася.

Усьмешка яе была напрошаная і яна больш абцяжарыла тое напружанае становішча ў застольлі, якое стварылася папярэднім апавяданьнем. Ніводная не заўважыла, як усе пакінулі есьці і падпалі пад уладу няпрыязнасьці, а мо' і варожасьці адно да аднаго.

— І вось мы ўсе тут пасьля гэтых страхотных прыгод,— сказаў Ігнась.

Але словы яго былі сказаны гэтак штучна, што ніводная з дзяўчат не абазвалася. Абедзьве ведалі, што ў галаве ў кожнае варожыя думкі і што прыхільнасьці ніяк ня выклікаць, ніякімі штучнымі ўсьмешкамі. А трэці, што сядзеў паміж іх насупроць, з усёй гастратой адчуваў няёмкасьць: ён быў вінаваўца гэтай няпрыхільнасьці. І датуль яна будзе цягнуцца, пакуль усе трое будуць разам, пакуль нейк не разлучацца ці не падарвуць гэтае варожае маўчанкі. Ігнась добра бачыў, як перакрыжоўваліся дзявочыя

зіркі на ім і памкнуўся быў ужо нешта запрапанаваць, каб вырвацца з цягуткае маўчанкі. Ён хацеў падзякаваць Ларысе і разьвітацца з дзяўчатамі і пайсьці... куды? ня ведаў—мо' куды вочы глядзяць. Але, як-бы згадаўшы пра яго думкі, Ларыса пасьпешна ўстала і праказала:

— Давайце пойдзем спаць. Ты Люба, і ня мерся нават пярэчыць.—убачыўшы, што тая гатова адмовіцца, зноў сказала Ларыса і мякка ўсьміхнулася.

З яе воч зьляцеў зеленаваты блеск і гастрата напружнасьці згладзілася трохі.

— Не, не, ня думай нават,—замахала яна рукою на Любу. Ня пойдзеш, вось і ўсё. Я ня пушчу цябе нікуды.

А Ігнася быццам і на ўвагу ня брала, быццам забыла пра яго. Бачачы гэта, ён не наважваўся напамянуць пра сябе і калі яго завялі ў пакой, дзе прыгатавана была пасьцеля, ён пакорна і бяз слова зачыніўся і пачаў разьдзявацца.

Ларыса клала спаць Любу ў сваім пакоі, праз адну сьцяну ад Ігнася. Падумаўшы, што і сапраўды ісьці нязручна, а мо' трохі ніякавата сярод ночы, Люба далася Ларысе ўмалёкаць сябе і не сказала нічога больш насупроць. Моўчкі разьдзяваліся абедзьве, украдкі пазіраючы адна на адну, вібыта параўноўваючы сваю дзявоцкасьць. У пакоі было два люстэркі, наўскасяк адно ад аднаго. Кожная як-бы абзадачвала сваю постаць, свае формы, усю сваю жаноцкасьць.

А прыгожыя былі абедзьве. І кожная мела свае перавагі перад другою. Ларыса—нявысокага росту, стромкая і крохкая, з неўлавёнаю пропорцыяю ў нагах і руках да постаці, уяўляла сабою перад люстэркам цяплічную расьліну, якая вырасла ў пяшчотах бяз клопату, не абвеяная горкасьцю жыцьцёвых бур. Проста пастаўленая галава паказвала на панскае выхаваньне ўсімі сваімі рыскамі, цьмянай бялюткасьцю шыі і шчок.

Заўважаючы яе перавагі, Люба забывала пра сваю дадатнасьць. Без шляхетнае тонкасьці ў стане, бяз дзіўных сугалосьсяў у вонкавым афармленьні фігуры, бяз вабных можа мастаку толькі гармонічных зьбяганьняў і разьбяганьняў рысак і ліній, яна больш была неад'емнаю часткаю жывое прыроды. Дзіця палеткаў і паплавоў, узгадаванае на фоне людзкое крыўды і сьлёз, уяўляла яна сабою пэўную процілегласьць Ларысе. Больш высокая за тую, грубейшая трохі, але што дзякуючы яе росту прыемна пасавала адно да аднаго, яна ўся дыхала і пырскацела сілаю не эфэктнаю, але затое пэўнаю ў сабе і рашучаю. Таго нельга было сказаць пра Ларысу. Сіла апошняе

і пекната месьцілася цалкам у прыгожым чароўным імкненьні, толькі пасьля, калі набой гэтага парыву сардэчнага згараў, яна мякчэла, меншала нават і рабілася гэткаю падобнаю да прыгожае лялькі. Жыла яна ў большасьці вось гэтымі адмысловымі фантазіямі, якія нарадзіліся ў яе ўпартай маладой галаве пад уплывам розных прыгодніцкіх раманаў. Люба—наадварот. Гора і радасьці жыцьця перакрыжоўваліся неўпрашоныя ў сэрцы яе і выклікалі пачуцьці вялікія і глыбокія на доўгі-доўгі час ці назаўсёды. Тады, калі Любіны пачуцьці былі моцнымі і непарушнымі, калі яны конча ўпляталіся ў думкі і там адшуквалі сабе поўнае абгрунтаваньне, Ларысіны былі толькі дзіўным прыгожым полымем, якое ўсхватвалася, каб бліснуць і асьвятліць усё навакол сваім дзіўным блескам і раптам зноў патухнуць. Вось чаму яна, павучыўшы зіму дзяцей у школе, на другую адмовілася: шэрыя клопаты, штодзеннае змаганьне з невуцтвам і цемраю людзкою, уніканьне дробнай крыўды—марудная работа.—былі не па ёй. У гэтым рэзкай процілегласьцю ёй была Люба, і гэта накладвала сваю адпячатку і на характар, і на фігуру ў Любы. Таму ў Любе было больш сталасьці ды сур'ёзнасьці, цярплівасьці і ўдумнасьці. На адну часіну, на хвіліну захапіла-б Ларыса, а на далёкім працягу часу, калі вельмі моцнае і напружанае парываньне конча павінна сарвацца ці перагарэць, перамагала Люба. Кожная з іх была сама па сабе. Вось чаму і згоды паміж іх часта ня было, а няпрыязнасьць заступала месца дзявоцкага таварышаваньня.

Пажадаўшы адна аднэй добрае ночы і спакойнага сну, палеглі яны. Ноч была сіняя, зорная і праз фіранку добра віднеліся ясныя мігучыя зоркі, а сон абедзьвюх дык не... Усё яшчэ пад уплывам апошніх перажываньняў ня спалася і думкі з сэрцам напераменку не давалі спакою—мо' толькі пад дзень тады пазасыналі яны моцна.

Гэтак сама і Ігнась. Нязвычайная абстаноўка, так поўна падзей на такім кароткім часе, сустрэча дзьвёх дзяўчыны, таварышак і няпрыяцелек разам, хвалявала яго думкі. Пакуль дзяўчаты разьдзяваліся, ён ужо ляжаў на мяккай пасьцелі і ніяк не заўважыў, што яна поўна лепшая за Аронаву жорсткую саламяную, у якой зьляжалася салома і зрабілася не мякчэй за дубовыя дошкі. Ён ляжаў і прыслухоўваўся, як шорхаюць за сьцяною адзеньнем дзяўчаты. Яго цікавілі абедзьве і роўна ў такой меры, наколькі ў кожнае ставала ўнутранае сілы і вонкавае прывабнасьці. На кароткім часе сам-на-сам ён цалкам быў пад уплывам у Ларысы (пазалеташняе восені яму не забыцца ніколі). А кахаў Любу, можа змалку яшчэ аўладала ім гэтае каха-

ньне, і ён прывык да Любы, як рэдка прывыкаюць людзі. Але, не ўважаючы на ўсю моц гэтага пачуцьця, Ларыса гэтак захапляла, што забываўся тады Ігнась пра Любу і пра сваё каханьне, і цягло яго к Ларысе і палохала адначасна. Таму і сёньня сам ня свой садзеў ён з дзяўчатамі і рад быў-бы зьбегчы куды.

За сьцяною перасьціхла шорхаць, чутно, як дзяўчаты палеглі спаць. А Ігнась не пакідаў слухаць, завярнуўшыся да сьцяны. Звонкая сьціш панавала ў пакоі, быццам паветра гойдалася размашыста і гойдаючыся, чапляла за язычкі нябачных крохкіх званочкаў, і яны званілі ціха і цягутка, кволы серабрысты звон ня сьціхаў у пакоі, і быццам там, дзе адзвоньвалі званочкі, успыхвалі і тухлі ясьнюткія зоркі.

—Ураніцы ўсё на дварэ пабялела было ў іскрасты мароз. Першы мароз.

Ларыса ўстала зараней і некуды пайшла. Ігнась з Любаю вышлі на балькон. Марозам аблепленыя, задуменна-прыгожыя ня рухаліся дрэвы ў садзе, бы паўстывалі ў сваёй урачыстай прыгажосьці. Трава, лопух пад плотам і крапіва— усё было аднакава прыгожым у марозе. На бальконе тоненькі марозавы ляжаў пласт і прыемна і бадзёра парыпваў пад нагамі. Было ня холадна, а толькі сьвежавата трохі. Зусім ня верылася, што гэта мароз: быццам на зеленавата пажоўклае лісьце, на траву і балькон панасыпаў нехта храбусткога крухмалу і таму гэтак парыпвае пад нагамі балькон.

Сонца ўзыходзіла, яснае, чыстае. Неба такое сіняе і крыху белаватае, нібы і там марозік стараўся, ды ня даў рады. Высока-высока вялізная хэўра нейкіх птушак ляцела ў вырай. Усё гэта ўпала ў вочы Ігнасю і Любе, як яны вышлі на балькон і прыемна дыхнулі марозавым паветрам.

Скарыстаўшыся, пакуль ня было Ларысы, Люба хутка пераказала ўсё, што адбылося з ёю ўчора. Ігнась слухаў, не перапыняў і рады думаў, як шпарка Люба ўцяглася ў нелегальную работу. Залатая Люба!.. Колькі перажыла яна, перахварэла за ўчора. Ігнась яе кахаў цяпер яшчэ больш, ці не, бо мяжы Ігнасёвага каханьня далей перасунуць ужо, здаецца, нельга было, а глыбей, мацней. А як скончыла Люба, спакойным тонам справы сказаў:

— Чым болей захаваем і зьбярэм мы сіл за гэты час, тым лягчэй даб'емся перамогі.

— Табе трэба хавацца, Ігнась,—сказала Люба.

— Не хавацца, а самому ня лезьці ў рукі паліцыі, вось што.

— Тут вонкавае геройства не патрэбна, каб яго конча ўсе бачылі. Гэтым не пераможаш,—просячы, праказала яна.

— Ты праўду кажаш. Я буду сьцерагчыся, Люба!..

На калідоры загрукацелі шагі. Прышла пакаёўка.

— Паненка просіць на сьнеданьне.

Ля стала сустрэла вясёлая і разам заклапочаная нечым Ларыса. Прывітаўшыся ўсьмешкамі, ранічнымі, бадзёрымі, і запытаўшыся адно ў аднаго як спалася, паселі сьнедаць. Можа затым, што марозік на дварэ ды раніца гэткая любая, і сьнедалася добра.

Пасьнедаўшы, Ларыса вадзіла паказваць асабліва памятныя мясьціны. Памятнымі засталіся яны таму, што зьвязаліся моцна з яе маленствам, з гульнямі і дзяціннымі крыўдамі і для кожнага ў Ларысы было сваё тлумачэньне.

Сонца грэла зусім не як увосень. Ранічнага марозіку і сьлед устыў. Ціўкалі дзе-ні-дзе птушкі, прадчуваючы загадзя зіму. „Бабінае лета" плыло даўжэзнымі пасмамі ў паветры, асядала на траву, чаплялася за дрэвы ды платы. За паўдня зайшло сонца, а Ігнасю і дзяўчатам прыелася, мабыць, сноўдацца разам. Першы адлучыўся Ігнась, заглядзіўшыся на палетак, дзе бабы капалі бульбу і сьпявалі нудныя восеньскія песьні. Потым паразыходзіліся і дзяўчаты. Ларысу паклікалі ў пакоі нечага; Люба пайшла адна хадзіць па двары.

Ігнась слухаў ня доўга. Хутка яго паклікала Ларыса і папрасіла прайсьці з ёю у сад. Ён згадзіўся. Любы ня відаць было паблізу. Ідучы, Ларыса схілялася к Ігнасю і ён адчуваў лёгкае датырканьне яе цёплае быццам аксамітнае рукі.

Пад нагамі шалпацела на непадмеценых дарожках жоўтае лісьце. Пахла восеньню і сьпелаю прыродаю. Пад лісьцём трапляліся сакаўныя яблыкі ды ігрушы; наступіўшы, яны мякка разлазіліся, прыліпалі да ног. Бэры яшчэ не паабіраліся; зьвісалі цяжка зімовыя яблыкі: шклянкоўкі, цыганы, зімовы апорт. Мухі быццам зьляцелі куды. Толькі дробная машкатня снавала пад дрэвамі.

Раптам Ларыса ўхапілася за вока і завойкала. Ігнась зірнуў, зарагатаў.

— А я думаў яблыка джвэгнула згары.

— Ды ня яблыка, а мошка заляцела ў вока. Дастаньце вось.

Ігнась узяў з Ларысінае рукі пахучую хусьцінку, а другою рукою расплюшчыў ёй вока і дастаў мошку. І пакуль вымаў ражочкам хустачкі, Ларыса ўсё войкала і хапалася за яго сваімі цёплымі белымі рукамі. У Ігнася ад гэтага тлуміла ў галаве. А дастаўшы, уздыхну лёгка.

— Чаго вы ўздыхнулі гэтак?

— Уздыхнуць захацелася,—адказаў ён, аддаючы хусьцінку.

Ларыса не заўважала, што ён аддае, ня брала. Хусьцінка засталася ў Ігнася.

— Хіба вам паветра не стае?

— Не ставала тады,—прызнаўся Ігнась.

Камечачы ў руках хусьцінку, ён няўпрыкметку самому сунуў яе ў кішэню.

Сьцежачка прывяла пад шкляную альтанку з пажоўклым ужо хмелем. Хмялёвыя шышкі, набраўшыся за лета з зямлі соку і перарабіўшы яго на моцны пах, цяпер рэзка, але і прыемна пахлі.

— Мне трэба з вамі сур'ёзна пагаманіць,—сказала Ларыса.

Ігнась паглядзеў на яе і бачыў на твары, як і ўраніцы, заклапочанасьць. Было відаць, што яна кажа праўду.

— Я буду слухаць.

— Толькі? Ды не, і гаварыць прыдзецца.

— Ну, што-ж...

— Нічога,—пераняла яго жартам Ларыса.—А ў нагах праўды няма.

— Мана.

— Я ні разу яшчэ ня схлусіла.

— Вам ведаць.

— Ясна. Але-ж я другі раз кажу,—у нагах няма праўды. Зойдзем у альтанку... Там гэтак добра...

Яна гэтак люба зірнула ў Ігнасёвы вочы, што той адвярнуўся і ў думках махнуў рукою. А Ларыса здаволена і зразумела ўсьміхнулася.

— Зойдзем,—панура згадзіўся Ігнась.

— Ня бойцеся, там паветра досыць,—пасьмяялася Ларыса.

— Мне не патрэбна паветра.

— Ну можна і без яго, калі не патрэбна,—зноў пажартавала яна.

А Ігнася гэтыя жарты калолі колкімі іголкамі, але там, куды калолі яны, было гэтак люба.

Не чакаючы, пакуль ён зойдзе, Ларыса схапіла яго за рукаў і сілаю ўцягла ў альтанку, пасадзіла на сплеценую з дубцоў мяккую лаўку, села сама побач і зрабілася раптам сур'ёзнаю і хмурнаю. Колькі часу маўчала. Маўчаў і Ігнась. Падумалася, што Ларыса закрыўдавала на яго завошта, але зараз-жа адкінуў гэтую думку. Ларыса павярнулася к Ігнасю і загаманіла:

— Цэлых два дні, а сёньня трэці я думала, як вас застрахаваць ад паліцыі.

— Навошта?—зусім ня думаючы што гаворыць, сказаў Ігнась.

— Як навошта,—зьдзівілася Ларыса.—Вось дзівак. Навошта-ж было ўцякаць тады ад поліцыі?

— Ах вы пра гэта... Я не пра тое думаў.

— Ну, вось... Можа марыў. Нічога, я прабачаю. Дык вось я надумала, што вы павінны застацца конча тут, у нас.

— Я вельмі дзякую вам, Ларыса Вадзімаўна.

— Паехаў, дзякую, Ларыса Вадзімаўна. Дадайце яшчэ—Няслаўская,—перакрывіла яна Ігнася.—Ня прымаю я падзякі. Згадзіцеся на маёй прапанове, а потым будзеце дзякаваць.

І яна стала даводзіць, што яму патрэбна аседзецца цяпер тут: гаварыла, што і работу, якую ён вядзе, лягчэй будзе накіроўваць адгэтуль і бясьпечна будзе. А, нарэшце, нават прапанавала і свае паслугі, калі трэба выканаць якое заданьне.

— Хіба-ж я ня здатна да гэтага? Вазьміце апошняе, ды я-ж адна ўсё зрабіла. Калі трэба, я магу быць карыснаю вам.

Ігнась раней маўчаў, а потым узяўся ўгаварваць. Ларыса-ж слухаць не хацела пра яго доказы і рашуча стаяла на сваім. Тады Ігнась кінуўся на апошнія хітрыкі.

— Каб змагацца разам з намі, трэба быць соцыял-дэмократам, Ларыса...

— Ша, толькі Ларыса, ня больш. Завіце мяне толькі Ларысаю. Дык чаму гэта трэба быць соцыял-дэмократам конча?

— Таму, што вы ня будзеце ведаць як і што? За што ці за каго змагацца, а з гэтага карысьці мала.

— Тады вы раскажыце мне пра соцыял-дэмократаў, зрабіце мяне соцыял-дэмократкаю. Я адраблю ня менш каго за гэта.

Ігнась спрачаўся. Ён даводзіў усю няўгрунтаванасьць гэтага Ларысінага жаданьня, усю небясьпечнасьць кроку, які яна мерыцца зрабіць, адале сказаў пра бацьку. Ларыса ўхапілася за апошняе і разьбіла ўсе яго доводы.

— Што мне бацька. Мне дваццаць гадоў і я ўжо сама сабе бацька. Пакінем гэта, давайце спачатку. Я настойваю, каб вы засталіся ў нас. Згодны?

— Згодзен,—трывожна і радасна вырвалася ў Ігнася.—Толькі давайце мне работу, без работы я ня буду.

— Работы,—усьміхнулася куточкамі вуснаў Ларыса,—калі ласка... Будзеце канцылярыю весьці ў аконама.

— Ды я зусім ня ведаю ніякае канцыляры,—з адчаем сказаў Ігнась.

— Будзеце ведаць, я вас навучу. Згодны?

— Нічога ня зробіш.

— Добра. А цяпер раскажыце пра социял-дэмократаў, чаго яны дамагаюцца і якімі шляхамі ідуць да мэты.

Ігнась гаварыў, гаварыў доўга і з захапленьнем. Ларыса ўважліва слухала. Сонца зьвярнула на захад, стала большаць і чырванець. Люба недзе, відаць, чакала ўжо. А Ігнась гаварыў і Ларыса, прытуліўшыся к яму, слухала, не перабіваючы. Толькі, калі дайшоў да тэрору і абганіў эсэраў, Ларыса спыніла яго і запыталася—ці социял-дэмократы супроць індывідуальнага тэрору. А пачуўшы станоўчы адказ праказала:

— Шкада.

— Вось бачыце, мы ня сыходзімся. Вам, можа, цікавей узброіць чалавек пяць-шэсьць ды падстрэліць пару царскіх чыноўнікаў, ну, генэралаў якіх, а мы кажам, што трэба ўзброіць увесь працоўны народ і зьнішчыць увесь лад.

— Праўда, мне ня зусім падабаецца, але гэта нішто. Я аддам сябе ўсю на рэволюцыйную работу.

Гарачая хваля крыві прабегла ў яе па жылах і выцела ў галаву. Яе гарачыні перадалося Ігнасю, бо Ларыса прысунулася блізенька і ўзяла яго за руку.

— Ігнась!.. Скажы (яна зьвярнулася на „ты“ і ў Ігнася салодка заныла сэрца), а дзе твой сябар, той Арон?

— Ня ведаю...

— Ён разам з табою ўцёк?

— Разам, але я ня ведаю, дзе ён цяпер,—паспрабаваў ён вырваць руку, але гэта не ўдалося.

У альтанку поўз змрок—лёгкі, сьвіцюшчы. І ад гэтага змроку быццам паветра менш рабілася ў ёй. Моцна пах хмель, аж кружыў галаву. Ігнась падпадаў пад уплыў гэтага паху. Цягло к Ларысе, неадчэпна, спакусьліва. Але сьвядомасьць ня страцілася яшчэ, ён адвёў вочы ад яе спакусьлівага пахучага адзеньня, ад грудзей, што значны былі праз тонкую тканіну.

За альтанкаю зашамацела і сьціхла. Ларыса, мабыць, не пачула. Ігнась зірнуў.

Якраз насупроць яго за ігрушу хаваўся той самы літві што быў два гады назад на сходцы ў дуброўцы. Ён паказваў нейкія знакі Ігнасю, але той ня мог зразумець іх. А далей дагадаўся, што той выклікае яго. Нейк адразу палягчэла на сэрцы, перастала кружыць галаву.

Ларыса заўважыла, што Ігнась забыўся быццам пра яе. Яна пасачыла за ім і зірнула на двор. Літвін ёмка схаваўся за грубую ігрушу. Ігнась устаў, за ім і Ларыса і абое вышлі з альтанкі.

Каля палацаў напаткалі садоўніка. Ларыса загаманіла з ім. А Ігнась азірнуўся, заглядзеў літвіна і пашоў сьледам за ім у глыб саду, туды, дзе сыходзілі сходкі ў раку.

Загаманіўшы з старым садоўнікам, Ларыса не заўважыла, як увінуў Ігнась і калі скончыла гутарку, дык ня ўбачыла таго нідзе.

## ЛІНЧАЎ СУД

СЫШОЎШЫ з Ларысіных воч, Ігнась зноў стаў самім сабою. Адышоўшыся так, што Ларыса не магла ўбачыць іх, літвін прыпыніўся. Ігнась падышоў і запытаўся, чаго той паклікаў яго.

— Зараз убачыш сам,—сказаў літвін і шамялякнуў у густыя кусты, што расьлі на краі саду. Ігнась ступіў за ім. Насустрач вынырнула высокая моцная фігура.

— Дуб!

— Я... Я, Здароў, перш за ўсё!.. Ледзьве знайшоў.

— Гэта яшчэ добра, а то мог не знайсьці.

— Так-так, добры прытулак абраў. Але-ж я не пра тое... Справа ёсьць важная.

Літвін шмаргануў у кусты, выскачыў пад грубезную таполю і стаў на варту.

— За мною там, за мястэчкам, у Вайніловічавым лесе памешчык застрэліў аднаго шамкоўца. Памятаеш, парабак гаварыў пра гэты сэрвітутны лес на сходцы ў Яся. Дык вось, секчы пачалі лес. Толькі ноч прыйдзе, дык пошчак так і плыве з-пад сякер.

— Гэтым самым ужо сялянства ўступае ў барацьбу з монархіяй,—сказаў Ігнась.

Дуб не пачуў быццам.

— Панскія стражнікі баяліся хадзіць поначы. А вось учора сам пан, зазлаваўшы, узяў сваю дубальтоўку, набіў, кажуць, кулямі на мядзьведзя і выправіўся ў лес. Напярэдадні падцікаваў, нарэшце, пад дубам двух мужыкоў і застрэліў аднаго насьмерць. Другога параніў толькі і той ўцёк, расказаў у сяле пра пана.

— О, гадзюка!..

— Вось што. Ты не забывай, можа выйсьці ліха ведама што, калі мы не скарыстаем гэтага выпадку і не падымем сялян на бунт. Гэта самы зручны момант, каб накіраваць народнае азлабленьне супроць улады і яе падтрыманцаў памешчыкаў прыгоньнікаў.

— Ясна,—сказаў Ігнась.—Але пры гэтым патрэбна выказаць усю асьцярожнасьць, і папярэдзіць новыя паліцэйскія аблавы на організацыю. Ты-ж ведаеш ужо,—запытаўся Ігнась і, не пачуўшы адказу, скончыў:—мы з Аронам уцяклі з-пад самага носа ў паліцыі і цяпер павінны хавацца.

— Ведаю. А дзе Арон?

— Не скажу, бо ня маю ніякае весткі ад яго.

— Трэба рушыць. Няма часу.

— Добра. Пачакай тут, а я праз часіну зьвярнуся.—І не пасьпеў Дуб запытацца, куды ён і чаго, Ігнась ужо быў за кустамі.

Дуб сеў на густую някошаную траву, выцягнуўшы цыбатыя ногі. Наперадзе струменілася ціха рака. Загагокалі ўгары дзікія гусі, зьніжаліся нанач, каб адпачыць і заўтра зноў ляцець у вырай. Па суседніх сёлах брахалі сабакі, і праз гулкую цішыню гукі ляцелі к Дубу. Густыя сьцені ад таполяў хаваць пачалі раку ў цьмяную вопратку вечара. Ад берагу моцна пахла багавіньнем, ракушкамі і балотнаю іржою. Гострыя пахі ўдыхаліся смачна і жадана, давалі целу вялікую бадзёрасьць і сілу. У пажоўклым плюшніку боўтнуў шчупак, мусіць ловячы маленькіх рыбак. Шырозныя кругі разышліся на ўсю раку і зноў зрабілася ціха. Нізкія купчастыя лозы пазьвісалі на ваду і задрамалі быццам. Дубу здалося ўжо, што прайшла не адна, а дваццацьтых часінак, пра якую казаў Ігнась, гэтак сьцяглося, калі ззаду зашамацела і Дуб нязграбна ўскочыў. Прышоў Ігнась.

Берагам выбраліся яны на тое месца, дзе чакаў запрэжаны конь. На возе ляжаў нехта, завярнуўшыся ў другі бок. Пачуўшы, што ідуць, ён павярнуўся і Ігнась пазнаў Яся.

— Ну, вось і добра, а то я замгнуў ужо быў, Сядайце.

Ён заліменіў пугі каню. Выехалі на шлях. Ясь усё паганяў. Конь папырхваў і спорна бег па роўнай дарозе.

Ужо ўзялося зьмяркацца, калі прыехалі яны ў мястэчка. Параіўшыся трохі, парашылі, што каня трэба выпрагчы і адсюль ісьці пеша. Ясь так і зрабіў. Праз хвіліну яны ішлі ў дарогу.

Восеньскім вечарам было холадна, вільготна. Яшчэ едучы, па-летнему апрануты, Ігнась адубянеў і цяпер, каб нагрэцца, размахваў рукамі і ішоў шпарка. Дуб сігаў шырока, аж зямля, здаецца, стагнала пад нагамі. Ясь-жа перш ішоў ціха, а потым загаманіў, але ніхто яму не адгукнуўся і ён змоўк.

Прамінулі мястэчка, сышлі на бок і цераз поле пашамацелі па густым іржышчы. Уздымаўся густы туман. Навакола было ціха-ціха.

У баку заблішчэў агеньчык.

— Вайніловічаў двор,—сказаў Дуб, і яму ніхто нічога не сказаў на гэта, як і Ясю нядаўна.

Неўзабаве дарогу перасек лес. Пазадзе пачулася моцная бяга. І быццам не чалавек і ня конь бег. Прыслухаліся.

Але зараз-жа забрахаў сабака і Ігнась засьмяяўся. Падбег і пачаў лашчыцца Кіяш.

— Каб на цябе немач! Бачыш, гад ты, дзе знайшоў. Гэта мой сабака. Тры дні яго і ў вочы ня бачыў, а ён мяне вось дзе знайшоў.

Лес затоенна маўчаў. Толькі восеньскае сухое лісьце шамацела пад нагамі ды патрэсквала павысыхаўшае, паабломванае гальлё.

Колькі часу блыталіся хлопцы, то ўправа, то ўлева падаваліся і ўжо як лес парадчэў, тады напалі на сьцежку. Чапляючыся за хваёвыя поземкі-карэньні і раз-по-разу спатыкаючыся, вышлі яны на край лесу. У баку пачуліся галасы—глухія, далёкія і паціхлі. Лесавая дарога ўзьвяла хлапцоў на палявую сьцежку, па якой яны і пашыбавалі далей.

Праз нейкі час уперадзе забрахаў Кіяш. На брэх адгукнуўся, задзяўкаў другі сабака, трэці, цэлая капэля сабачых галасоў загарадзіла дарогу. Праз туман замрэялі цьмяныя і малюпасенькія агеньчыкі, адале цэлы канец сяла вынырнуў з туману.

— Прышлі,—сказаў Дуб.

— Але ціха нешта,—заўважыў Ігнась.

— Нічога, вось зараз папытаем, як і што,—з сялянскаю флегматычнасьцю і цягуткім спакоем адказаў Ясь і завярнуў у двор.

У хаце было ні відно, ні цёмна, ат сабе, поцемкі: быццам сонца заходзіла і пачынала зьмяркацца. Ясь пастукаў кіпцём у шыбу і на акно зараз-жа ўпаў густы цень. У акно ўбілася камлатая мужчынская галава і грубы голас праказаў:

— То заходзьце ў хату ці што.

Ясь адарваўся ад акна і пайшоў пад сенцы. Каля дзьвярэй ён пакорпаўся які час, пакуль абмацаў закрутку і адшукаў сакрэт адчыніць дзьверы. У сенцах нязвыкламу чалавеку нос зьбіць-бы можна, такія ямы былі ў земляной падлозе ды гургуны, але хлопцы ведалі сельскае жыцьцёбыцьцё.

У хаце было ня лепш, чымся ў сенцах,—быццам утоптанаю ральлёю была тая земляная падлога. У лучніку куро-

дымела смаловая лучына. Стары ў сподняй кашулі і нагавіцах плюскаў, згорбіўшыся каля лучыны, падсьлепаватыя вочы, падплятаў лыкам лапці. На прымурку старая выводзіла зрэбную нітку. А з-за коміна зірнулі дзьве пары дзіцячых воч.

— А я ўжо ня думаў...

Гэта сказаў мужчына, што зірнуў у акно, калі Ясь пабраскацеў у шыбу. Ростам ён быў сярэдні, карчакаваты. Белая кужэльная кашуля была ўвабрана ў зрэбныя ў дарожкі нагавіцы. Каўнер кашулі не зашпілены. Русавая маладая бародка пакучаравілася, пазблытвалася ў колцы. Валасы на галаве не зачэсаны, а пакамлычаны, як той стог сена бураю,—відаць часта мужык сядзіць за сталом, схіліўшы галаву на рукі і ўпусьціўшы пальцы абедзьвюх рук у густыя валасы, думае сваю невясёлую думку.

— Ну то праходзьце сядайце тут на лаву,—не чакаючы, пакуль абзавуцца тыя, сказаў ён зноў і шырокаю далоньню змахнуў з лавы пласт кастрыцы, якая пападала, калі ён віў вяроўкі.

— Як пажываеце?—запытаўся Дуб. Ён добра бачыў, як жывуць у хаце, але ўжо гэтак заведзена ў мужыкоў.

Стары дзед узьняў галаву з-за лучніка, уздыхнуў цяжка і яшчэ ніжэй апусьціў яе над лапцем, в касьцяная сьпіца быццам убілася ў подплетку і вылазіць ня думае. Старая закашляла на прасьніцы. Запішчэла лучына, і дым густы вялікі клубочкамі сівымі паваліў угору. Мужчына, кінуўшы вокам па хаце, сказаў:

— От жывом.

Дым лез у вочы, выклікаў міжвольныя сьлёзы, прымушаў плюшчыцца і кашляць.

— Рату падалі?—запытаўся спакойна і не сьпяшаючы Ясь.

— Садралі,—адказаў таксама гаспадар.

Ігнася аж за жывое ўшчыкнуў гэты іхны спакой—быццам яны пытацца прышлі, як жывуць і ці падалі рату. Але неўзабаве гутарка перайшла на сёнешняе. Узьняў тады галаву і стары, заўздыхаў,—паклаў на прыпечак лапаць і сьпіцаю абабіў нагар з лучыны. Дзіцячы голас з-за коміна з печы празьвінеў:

— Я бачыў забітага Васіля!

— Ты ў мяне дастатны вельмі стаў. Глядзі адно,—адказаў бацька.

— Ды усе-ж там, татка, былі, нават і ты хадзіў!

— Каб што і ўкраў, дык не схаваешся ад яго.

— Ох сьвет, сьвет,—прастагнаў стары і ўзяўся зноў за свой лапаць.

Тады гутарка зрабілася цікаваю і патрэбнаю Ігнасю.

— Дурны хлопец, не ратаваўся,—казаў гаспадар.— А цепер вось пакінуў матку з кучаю дробных дзяцей.

— Пахавалі?—запытаўся Ігнась, і голас у яго нехаць дрыгануўся.

— А гэта ці доўга зрабіць: пара дашчок, ды дваццатак гваздоў—вось табе і дамавіна. Пасіраціў пан дзяцей. За гаспадара быў хлопец у сям'і. Падаткнулі нячыстыя ні лучыны ня было ў хаце. Заманулася ўкрадкі хваіну сьпілаваць, думаў абыйдзецца так сабе. Аж як на тое ішло.

— А я чуў, што дуба ён пілаваў?

— Няпраўда. Гэта пан пусьціў пагалоску, каб лепш апраўдацца.

— Бачыў ты,—зьдзівіўся Дуб.—Ну, а што на сяле цяпер робіцца?

— Неймаверная злаба да пана. А тут яшчэ...

— Там нейкі дзядзька чужы ўсё крычаў, што трэба ісьці біць пана і паліць двор!—зноў празьвінеў голас з-за коміна.

— Маўчы, брахун!—закрычаў бацька.—Маці, верацяном там у горла так і сунь, калі яшчэ абзавецца.

Дзеці ўраз пахаваліся. А гаспадар, перадумаўшы, мусіць, сказаў на печ:

— Гэта я, каб ня лазілі дзе ня сьлед. А ты чуў хіба?..

— Вось дзіва, сам чуў і бачыў. Нейкі чорны такі, страшны і ўсё цёг мужчын у двор да пана. Казаў, каб бралі сахары, косы, ды сякеры. Адале заглядзеў нас, ды як кінецца, дык мы і паўцякалі.

— Глядзі ты, сынок,—па-бацькаўску сказаў гаспадар.— У мяне не ўцячэш, брат. Дубцом як зрэжу, дык ты ў мяне і дваццатаму закажаш не хадзіць, куды ня трэба.

— Упілнуеш іх,—прарыпацела старая, і верацяно загуло зусім як у маладое—дапрала, відаць, ручайкі і запрала новае верацяно.

— А ты даглядай, маці, работы з цябе ніхто не патрабуе. Няма на чым вельмі рабіць, управімся і бяз вас, назірай за імі лепш. Паверце,—зьвярнуўся ён да гасьцей,—дзе якія сады ці агароды, ну бяз шкоды конча не абыйдзецца. Дзе якія бучы ці венцяры (тут у нас рэчка няглыбокая) сьцянуць усю раку—падастаюць рыбу. І б'еш і грозіш як ступаю ў азадак: сёньня набіў, а назаўтра пайшоў свае права правіць. Яшчэ добра, што не ўлавіў ніхто, патапілі-бы, як тых кацянят.

— Як не пасі, дык не ўпасеш. Як тыя зброднныя каровы: тут ёсьць, а адвярнуўся і ўжо ў шкодзе. Дзе ты іх упасеш,— праказала старая.

— Хоць ты прывязвай вазьмі іх за перасолку і з хат ня пусьці ані за парог.

Дзеці моўчкі сядзелі за комінам, цярпліва слухаючь якую напасьць ускладаюць на іх.

— Жыцьця няма за імі,—даказаў гаспадар.

— Не грашы, сынок,—азваўся стары.—За чым, за чым а за дзецьмі будзеш жыць. Вось ты скажы, каб ім было за чым жыць. Не грашы на дзяцей, бо і сам гэткі быў.

— Ай, маўчы, бацька, не барані.—Вось вечна, тольк я вазьмуся за іх, дык ён ужо бароніць.

Гутарка пра дзеці паграажала зацягнуцца на невядома які час. Ігнась колькі разоў ужо памывася перапыніць ушчуваньне дзяцей, павярнуць гаворку ў другі бок. І кожны раз абрываўся, ня мог гэтага зрабіць. Калі ўжо быццам ён адчайваўся, ці дазнаецца пра сёнешняе здарэньне, на дварэ затупацеў нехта і бразнуў у сенцах дзьвярыма.

— Ну, вось, мабыць, і жонка ідзе. Зараз папытаем, што там,—сказаў гаспадар.

Прышла нізкаватая, рухавая маладзіца. Даўшы добры вечар, яна распранула шэрую сьвітачку і ўскінула на перасолку, на якой віселі сьвіткі, кажухі, халаты, настольнікі, хусткі і ўціральнікі.

— Што, гаспадынька, чуваць там на сяле?—запытаўся Дуб.

— Э-э-э, мужчынкі мае, што чуваць... Гора скрозь, гора, як той туман густы.

— Раскажы, цётка, што там,—падтрымаў Ігнась.

— Родненькія мае, нікому ня раю я такога шчасьця, каб яму нечага праваліцца наскрозь зямлі.

— Дык кажы-ж, што бачыла,—ня выцерпеў гаспадар.

— Нябось, сам цэлы дзень там гібеў, ведаеш ня менш за мяне. А-ж страх, што робіцца, Гэты чужы падбухторыў людзей ісьці ў двор біць пана. Божа, божа што робіцца, што робіцца! Перш на памінках падбухторваў усіх... А яшчэ гэтыя малыя дзеці, адзін страх глядзець на іх... Адале падабраў колегаў, ды ў Войтавых яшчэ выпівалі. І там такое гаварылі, што аж вушы вянуць. Той падбухторшчык угаварваў усё мужчын ды хлапцоў, паіў іх, казаў, што калі пойдуць на пана, дык і хлеба здабудуць, і лесу, і чаго толькі захочуць.

— Хто ён такі?—спытаўся Ігнась.

— А хто яго, даражэнькія, ведае. Толькі гаворыць, кажуць, ну дык што шоўкам шые, так гэта складна.

— Мусіць яго язык і корміць, як бягучага воўка ногі. Глядзіце, ці не падасланы адно знарок,—сказаў гаспадар і спахмурнеў, аціх.

Паглядзелі адзін на аднаго Дуб з Ясем.

— І кажуць, угаварываў поўна каго. Ужо некаторыя пайшлі ў двор праведваць. А рэшта зьбіраецца каля Войтавых і рыхтуюцца зараз рушыць.

— Ня раіў-бы я, дзеткі, вам мяшацца туды,—сказаў стары.

Ён скончыў падплятаць лапаць і цяпер уважна слухаў, пра што казалі ў хаце.

— Ня раіў-бы. Ох, пражыў я, дзеткі, жыцьцё, зьвекаваў свой век і рознага пабачыў. Ня раю я вам лезьці туды.

— Што-ж было-б, дзедка, каб ніхто не мяшаўся. Хто-б нас абстаяў тады?

— Бог... На бога спадзявацца трэба. Бяз бога ні да парога.

— Яшчэ і другое, дзед, кажуць людзі,—уставіў Дуб.— З богам то з богам, дый сам будзь ня ўпромах.

— Поўна чаго кажуць, але ня раіў-бы я вам лезьці туды.

Бачачы, што гутарка са старым можа расьцягнуцца вельмі на доўгі час, хлопцы паўставалі і нарыхтаваліся ісьці. Гаспадар сьцёг з перасолкі сьвітку, апрануў у рукавы, насунуў на камлатую галаву зашмальцаваную летнюю шапку.

— Ты, Кузьма, ня ідзі нідзе далёка, ды хутка прыходзь,—баючыся, сказала яму жонка.

— Прыду, нідзе падзенуся,—адмахнуўся той рукой, як ад мухі, і вышаў сьледам за хлопцамі.

— Чуе маё сэрца благое нешта,—дагналі яго словы старога бацькі.

Але гаспадар рашуча зачыніў за сабою дзьверы, не вярнуўся.

У Войтавых, куды прышлі хлопцы з Кузьмом наперадзе, была поўная хата мужчын. Былі там і хлопцы, і дзяды з сівымі барoдамі. Толькі баб гола было. Затое па падвоканьні шалястала іх хоць адбаўляй.

У хаце дым ад люлек і цыгарак за шызы туман схаваў столь. Пшыкала і пішчэла па самай сярэдзіне лучына; сінімі парасткамі адскаквалі ад яе шыпучыя агеньчыкі-язычкі, чорнае, хрусткае вугальле ўсьцілала падлогу. Сам гаспадар у жылетцы з даматканага сукна стаяў ля лучніка і раз-пораз адломваў нагарэлае вугальле, крышыў у пальцах на дробныя кавалкі і, не заўважаючы таго, кідаў далоў.

Як увайшлі хлопцы, з печы закрычаў жончын голас:

— От прыплянтаўся к лучыне, усю хату ўчарніць вугальлем!

— А табе баліць ці што,—далёкі ў думках адказаў мужык, але-ж ад лучыны адчапіўся.

Людзі сядзелі на лаўках, на палу і ўслонках. Чалаве колькі бяз шапак пазалазілі ў застольле ці мо' яны там яшчэ і да сходу былі. Каля стала, упіраючыся ў яго аднэк рукою, а другою размахваючы, стаяў тварам на хату чар нявы высокі хлапец у брудным гарадзкім пакамечаным адзеньні і гаварыў нешта.

Хлопцы праплішчыліся крыху наперад.

— Пакуль бог у вароты, дык чорт цераз плот! Вось такая справа,—гаварыў чарнявы.—Нехта казаў, судзіцца з панам, вы, мабыць, яшчэ ня ведаеце, як гэта з панам судзіцца. Вось лес, я ведаю, ёсьць у вас з імі сэрвітутны, а хто ім уладае? Хто? Пан падгібаў сабе. Напэўна ў паперы сабе мае, што яго толькі, а ня ваш. Дык як-жа гэта так, каб цэлай грамадзе працавітых людзей ды цярпець ад аднаго пана. Ды каб, нарэшце, ён яшчэ як на зайцоў, паляваць ішоў на мужыкоў!..

У хаце зашумелі, загаманілі, у кутках пачуліся гнеўныя выгукі.

— За сякеры ды сахары і ў пыл разьнесьці панскія пакоі, каб і сьледу іх не знайшоў ніхто назаўтра! І лес, калі лічыць яго пан сваім, няхай будзе ягоным, няхай расьце, толькі мы зробім так, як у тэй казцы кажацца, пану каранькі, а нам вяршкі. Пакінем яму корчыкі, няхай любуецца.

У гэты самы момант вырваўся наперад Ігнась. Як ён выскачыў, ён і сам не памятаў пасьля. Як-бы пугай хвоснуў хто, гэтак выцялі яго словы чарнявага. Не магучы саўладаць са сваім абурэньнем, выкрыкнуў ён на ўсю хату і за першым словам яго паціхлі ўсе. Сьціх і чарнявы, з цікавасьцю зірнуўшы на Ігнася.

— Браты, дзядзькі, дзяды! Прыгожа гаварыў тут гэты чалавек, але-ж ня зусім так, як трэба.

— А адкуль ты сам?—недаверліва зараўлі на яго збоку, а чарнявы пачырванеў з нечаканасьці.

— Справа ня ў тым, дзядзькі... Ведаюць мяне тут людзі і, калі патрэбна будзе, дык скажуць пра тое, але вось паслухайце мяне.

Не даючы перапыніць сябе, бо ведаў, што калі ўсчнуцца спрэчкі, дык у шуме і гомане ніхто ня будзе слухаць яго і тады нічога нікому не давядзеш, Ігнась загаварыў далей.

— Мусіць цэлы вечар стаіць тут гэты хлопец і падбухторвае вас на тое, каб пасьля можа пасьмяяцца,—бывае і так. Скажыце, што было-б пасьля таго, каб вы спалілі пакоі ды пасеклі лес. Думаеце, пан даравыў-бы? Мыляецеся, ня так проста ўсё робіцца, зусім ня так, як гаворыцца. Ну добра, спалілі, скажам, пакоі, сьсеклі лес. Але-ж вы толькі адно сяло, а што далей вы зробіце? Папрывозіце лес дадому,

ды на дровы пачнеце паліць. А ў гэты час пан навядзе з гораду стражнікаў ды гарадавых—тады што?

— Скажы, што!—Чаго пытаеш?—выкрыкнуў з боку адзін голас, але рэшта маўчалі і ўжо слухалі ўважна Ігнася.

— А тады пачнецца бойня, пачнуць браць у астрог. Вось што будзе.

— Дык што-ж, па-твойму, цярпець пану?—віскліва неяк закрычаў ззаду ў яго чарнявы.

— Хто сказаў цярпець! Ня трэба цярпець!

Ігнася ўжо не перабівалі,у жо галовы павыцягваўшы, слухалі, што скажа ён далей.

— Пан дабром нічога не аддасьць,—сілаю трэба ўзяць. А пайдзіце вазьміце адным сялом, калі пана бароніць дваццаць конных стражнікаў. А вы з голымі рукамі насупроць стрэльбаў і шашак. Дзеці вы, а ня мужчыны! Але калі рабіць, дык рабіць. Выберыце лепшых сваіх людзей за старшых, каб кіравалі ўсім. Пашліце пасланцоў на суседнія сёлы ды і рушыце. Ня з голымі рукамі! Сякера добрая рэч дровы калоць, а галавы свайго ворага яна часам і не дастане. Стрэльбы набывайце. І калі бунтаваць, дык бунтаваць усім, ды злучыцца з рабочымі ў горадзе.

— Што нам да гораду, мужчыны!—крыкнуў зноў чарнявы.—Глядзіце куды ён гне. Горад горадам, мужчыны! Ці наша зямля ў горадзе? Тут яна, тут і лясы, і паплавы нашы.

— Дзе ўся ўлада сядзіць?—паправіўся Ігнась.—У горадзе. Так? А пан ваш з уладамі за панібрата. Дык ня думайце, што начальства папусьціць у крыўду свайго сябра. Зноў мыляецеся. Вось чаму трэба злучыцца з рабочымі ў горадзе і разам ісьці на пана ды супроць улады, каб тады, калі вы забярыцё ўсё панскае сабе, каб ня прышлі з гарапнікамі стражнікі ды не пазасаджвалі ў астрог. Яшчэ скажу вам, што ёсьць у горадзе такія людзі, якія рыхтуюцца, і калі вы ім пасобіце, горад зробіць сваю ўладу, народную. Завуцца гэтыя людзі соцыял-дэмократы і змагаюцца яны за рабочых і сялян.

— Мужчыны! Ён гэтак кажа, што пану, выходзіць дараваць трэба, ня трэба чапаць пана,—зноў гукнуў чарнявы.—А я кажу, што наша і ваша-ж партыя соцыялістаў-рэвалюцыянэраў кажа: „Пан цябе б'е, бі і ты пана, дзе не пападзеш, дзе не засьпееш". Наша партыя за вас, за зьнядоленых мужыкоў, якіх у Расіі пад сто мільёнаў, і стражнікі супроць вас—сьліна. Вось як я цяпер: плюнуў—цьфу!..—расьцёр нагою і няма. Нікога ня слухайце больш! Вы сіла і гэтае сілы ня зломіць пан са стражнікамі. Рушым у двор! Запалім пакоі! Няхай пан пагрэецца, а мы паглядзімо!

Мітрэнга цэлая ўзьнялася пасьля слоў чарнявага. Гаварыў ён хутка і запаліў натоўп рэзкімі, кароткімі сказамі. Усе паўставалі, хто сядзеў. Ігнась паспрабаваў загаманіць, але яго ня слухалі. Гаварылі ўсе: сусед з суседам, па два і па тры кучкамі, ад голасу аж стагнала, здаецца, хата. Чарнявы ўсьміхнуўся Ігнасю і пацягнуў за рукавы двух, што сядзелі паблізу ў яго, памочнікаў відаць, і яны ўсталі.

Ігнась азірнуўся на сваіх хлопцаў. Тыя паадціраліся адзін ад аднаго, і крычалі разам з усімі ў кучках сялян. Ігнась знайшоў Дуба і адцёг яго ад бойкага дзядзькі.

У гэты момант хлёпнулі дзьверы і адчыніліся. Яшчэ горш зашумела, загойдалася на хаце мора галоў. К сталу падышоў упацелы, запэцканы, бяз шапкі на галаве, малады хлапец і сказаў нешта чарнявому эсэру. Чарнявы махнуў перад сабою шапкаю, а яго два памочнікі закрычалі ня цішэй за яго на ўсю хату:

— Ціха!.. Слухайце!..

— Я сказаў вам, мужчыны! Пан даведаўся ўжо. Пакуль мы тут слухаем розных социял-дэмакратаў...

— Нягоднік!—вырвалася ў Ігнася, і ён ірвануўся, але Дуб ухапіў яго за руку.

— Пан зьбіраецца ўцякаць. Ён ужо адправіў сваю жонку, але добра, што мы паслалі людзей і паню злавілі на дарозе, запынілі і вязуць назад. У двор пайшлі! У двор, мужчыны!

І чарнявы, размахваючы шапкай, кінуўся ў натоўп да дзьвярэй, а за ім пасыпаў і ўвесь народ. Праз хвіліну ў хаце засталіся адны—Ігнась, Дуб, ды Ясь з Кузьмом. Гаспадар хаты апрануўся і падпяразваўся шырокім паясом з махрамі, зьбіраючыся даганяць усіх.

— Хадзем вось разам лепш, чым гаманіць.

У хаце пахла тутуновым дымам, смалою, картоплямі і буракамі, што насыпаны былі пад палом. Ігнась неахвотна кінуў вокам па хаце, але сказаў цьвёрда:

— Праўда. Мы там павінны быць.

І ўсе ўчацьвярых пашыбавалі сьледам за гаспадаром хаты, які вышаў з двара і бегма пабег у канец сяла.

— Згубяць сяло бяз ніц нічога,—спакойна сказаў Ясь.

— Гэта будзе лепшым падмацаваньнем нашай прапагандзе супроць улады,—азваўся Дуб.

— Але ўсё гэта ня так, ня так зрабіць трэ' было!—палка сказаў Ігнась.

— Дзівак,—адказаў Дуб,—яны цяпер не паслухаюць цябе.

З горкасьцю для сябе прызнаўся Ігнась, што Дуб, кажа праўду, не паслухаюць іх сяляне, дый нікога цяпер не паслухаюць. Гэты сход распаліў у іх сэрцы прыгнечаныя

пачуцьці векавечнае крыўды і помсты. А дзе пачуцьці бушуюць, там адсутнічае розум і халодная разважлівасьць слугуе тым самым пачуцьцям.

Адзінотныя фігуры сялян, як здані, праміґаліся паўз іх, абміналі і беглі ўперад. Там, за лесам, мусіць, зробіцца сёньня нешта страшнае, што наклікалі самі яны сваёю работаю, страшнае, але патрэбнае як хлеб, як вада, як паветра. Ігнась падбавіў кроку.

Лес напружана маўчаў, ахутаны па краёх белаю воўнаю пахучага вільготнага туману. Маўчаў і хаваў за сваёй сьцяною тое нешта, што павінна было кінуцца ў вочы соцыял-дэмократам.

Чапляючыся за гальлё і карчы, абдзіраючы рукі аб сухія гострыя патырчакі, хлопцы нацянькі садзілі ў Вайніловічаў двор. Сэрца Ігнасёва білася часта-часта ў грудзёх, быццам сэрца спалоханае птушкі. На ўскраі лесу звонка забрахаў Кіяш, а за брэхам зараз-жа крыкнуў нехта.

— Гэй, хто тут ідзе?

Па голасе Ігнась пазнаў чарнявага і злосьць на яго выбухла ў сярэдзіне.

— А табе што?

— Ах, гэта соцыял-дэмократы... А я думаў, што панскія людзі.

Ён стаяў, падпёршы плячыма таўстую высокую хвою, а навакол яго круціліся два ці тры хлапцы-памочнікі.

— Правадыр,—гіранічна праказаў Ігнась і адчуў, як бязьмежная злосьць пачала прападаць у яго да чарнявага эсэра, пагарда і насьмешка заступілі іхнае месца.

— Нікчэмны рэволюцыянэр, — праказаў ён.—У двор, хлопцы, хутчэй!

З Кузьмом наперадзе яны зрушылі на поле, і хутка белы туман схаваў іх у сваёй гушчыні, шэраю пушыстаю мятлою пазамятаў за імі сьляды.

У двор прышлі можа праз поўгадзіны, каліісьці трэ было ўсяго якіх дзесяць хвілін. У тумане яны зблудзілі з дарогі і доўга круціліся ў аднэй лагчыне, пакуль Кіяш не вывёў іх на агонь, што ўсё больш і больш разгараўся, раскідаючы ўгары ясныя іскрачкі. Агонь раскладвалі ў двары перад самымі панскімі пакоямі.

Людзкі натоўп гудзеў ціха неяк, але пахмурна і грозна. Хлопцам адразу кінулася ў вочы, што ў пакоях нібы згалела людзей. Дзьверы былі пазачыньваны: акяніцы таксама. Толькі ў адным акне другога паверху праз шчылінку прыкметна было сьвятло. Нехта ўскінуў на агонь бярэмя мятае саломы, і полымя ўсхапілася па-над людзьмі, асьвятліла жудасныя, злавесныя твары, а ля самага агню—апранутую

ў дарогу жанчыну. Два дужыя мужчыны трымалі яе за рукі а на твары ў тае хоць-бы кропелька краскі. Трохі паводдал ззаду стаяў панскі фаэтон, запрэжаны параю коняй. Фурма устыў з пугаю ў руцэ, гатовы вось-вось, здаецца, сесьц і шлёгнуць па конях.

Калі падышоў Ігнась з таварышамі, натоўп, які нібыта дасюль маўчаў, раптам зарухаўся, як разварушаны мурашнік засноўдалі навакола агню людзі, загаманілі, закрычалі.

Пасьля два дужакі-мужчыны выступілі з натоўпу і накіраваліся ў пакоі. Але дзьверы былі моцна зачынены. Тады, як па командзе, абодва павыхватвалі з-за пояса сякеры. З сілаю ўзьняліся яны ў мускулістых руках і гахнулі ў дзьверы. І гострая сталь пачала прагна жэрці цьвёрдыя дубовыя дошкі, моцна паўкоўватыя ў жалеза. Часам пападалі сякеры на гвазды, тады сыпаўся скрыготны звон і іскры. Упартасьць дзьвярэй наганяла злосьці і сякеры глыбей ды глыбей уядаліся ў дзеравянае мяса; драбнюткія трэскі ляцелі цераз галовы і ўсьцілалі парадны ганак.

Праразьлівым голасам ускрыкнула жанчына ля агню, тузанулася, памкнулася вырвацца і падбегчы адарваць мужыкоў ад іхнае руйнавальнае работы. Але яна толькі памкнулася, бо моцныя, бы жалезныя, рукі ня далі ступіць ёй ні кроку. Тады моцна і працягла застагнала. Якраз у гэты момант у тым акне, дзе праз шчылінку відаць было сьвятло, адкінуліся акяніцы і ў прачыненае акно высунулася лысая галава пана Вайніловіча.

Агонь раптам пацьмянеў, адале зноў выбухнуў вялізным ясным полымем і асьвятліў адначасна ўсіх: і страшны людзкі натоўп з сякерамі ды сахарамі ў руках, і жанчыну, што ўтомна ўпусьціла галаву на грудзі, і фаэтон, гатовы ехаць, і двух дрываколаў пад дзьвярыма пакояў, і зірнуўшага ў акно пана. Якраз у тую хвіліну дзьверы трэснулі і падаліся. З рагавога акна пану добра відаць было, што робіцца на ганку і ў двары. Як затрашчэлі пад сякерамі дзьверы, ён матлянуўся ў пакой і хутка зьявіўся зноў. Мужчыны пад дзьвярыма кінулі сякеры і налеглі плячом. Вось-вось рухнуць пашчапаныя дзьверы і разгарачаныя шпаркаю работаю і нянавісьцю мсьціўцы рынуць у пакоі.

Але тут адбылося тое, чаго ніхто мабыць не чакаў. У акно, у якім стаяў пан, высунулася дубальтоўка. Налажыўся пан, нацэліўся і два стрэлы адзін за адным разадралі напал цішыню начную, нязвычайную. Дзьве фігуры завылі нечалавечымі галасамі на ганку, пакаціліся ад дзьвярэй і сталі курчыцца і пацягвацца з болю.

Натоўп шугануў ад агню к пакоям. Хвіліна—і разьнясе іх разьюшаная маса, разварушыць, як капу сена віхор. Але

забылі азьвярэлыя людзі пра адно—ці можа разважлівасьці ня было ні на кіпець: з акна праrрымелі яшчэ два стрэлы і чалавек чатыры ўпалі на зямлю са стогнамі і енчаньнем. Трапна цэліў пан і шрот на воўка дзейнічаў ня горш на людзях.

Усё гэта рабілася бяз слоў, моўчкі. Толькі калі стрэлы зрабілі сваю справу, і застагналі і заенчылі параненыя людзі, тады пан крыкнуў:

— Прэч, пся крэў! Прэч, а то пастраляю ўсіх, як шалёных сабак!

— Сьмерць яму! Сьмерць пану! Сьмерць гаду! На агонь!—зароў роўма разьюшаны натоўп. Ці ў аднаго наліліся кроўю вочы, ці адзін ужо мысьленна бачыў, як хапае за горла пана і душыць, і душыць, аж пакуль у горле ў таго не пакідае сіпець.

Напёр на дзьверы натоўп. Грукнулі яны. Людзкая бурлівая рака ўлілася ў пакоі. На двары застаўся толькі адзін што трымаў жанчыну, якая вось-вось самлець гатова была. Другі вартаўнік пабег у пакоі разам з усімі. Ды нярухома, па-ранейшаму, стаяў ля коняй фурман. Чарнявага эсэра і яго хаўрусьнікаў і сьлед устыў. Пакоі гудзелі, як пчаліны вулей.

Адале адбылося неймавернае, дзіўнае і рашучае. Як толькі двор згалеў ад людзей, з акна паляцеў далоў з другога паверху чалавек. Гэта пан. Натоўп яшчэ не ўварваўся ў пакоі і ён адважыўся: сьмерць страшней была за скок з другога паверху. Пакуль вартаўнік ля жанчыны ўдзёўб сабе ў галаву, што нарабілася, пан з фурманам сьціснулі яго за горла, а жанчына пабегла да фаэтона. Пан ірвануўся з мужычых рук, пакінуўшы ў іх ўсю грудзіну накрухмаленай кашулі і з жанчынаю ўскочыў у экіпаж. Як шалёныя ірванулі коні і ўмэнт вылецелі на дарогу і зьніклі ў тумане. Толькі глухі шпаркі тупат конскіх падкоў адгукаўся здалёку, ды стагнала пасьпешна зямля.

Вось тады толькі апамятаўся панін вартаўнік, счапіўшыся з фурманом, які ніяк ня мог вырвацца ў сваім фурманскім халаце з варожых абдымкаў; ён крыкнуў так, што чутна стала мо' на вярсту кругом двара. З другога паверху ў акно зірнулі разьюшаныя людзі. Момант і сыпнулі назад. А яшчэ момант—і куча людзей павалілася на фурмана.

Зрабілася гэта шпарка і моўчкі, бяз жаднага слова, бяз выгукаў. Толькі цяжка парыўчата дыхаў натоўп. Ды яшчэ ў чалавечага клубка, у якім трыпятала бясьсільнае цела фурмана, у тахту народнага азлабленьня вырвалася, як у кавалёў пры каваньні жалеза:—Гах! Гах! Гах! Гах!

Ігнась з Дубам кінуліся бараніць няшчаснага, але ім ніяк не ўдавалася далезьці туды. І калі, нарэшце, яны ўсё-ж такі ўбіліся ў гэту жывую гушчу, дык натоўп парадзеў ужо. На зямлі ляжаў нярухома акрываўлены панскі фурман.

— Агню!.. Агню!..—пачўўся нейчы дзікі голас.

І ў адну хвіліну чалавек дзесяць бярэмямі саломы пааб-кладалі пакоі і адразу з усіх канцоў падпалілі. Сухое бярвеньне лізнулі здаволеныя языкі крыважэрнага полымя. Праз якую часіну пакоі захлынуліся ў моры агню, і водблеск пажару асьвятляў фантастычна жудасныя постаці ашалелых людзей.

Тае ночы далёка відаць было зарава пажару. Слупы іскраў уздымаліся па-над туманам і там, высока ўгары, рассыпаліся на мак і паволі тухлі. І тае-ж ночы, кажуць людзі, ваўкамі вылі сабакі па суседніх сёлах, а жанкі мужыкоў у Шамкох наўзрыд плакалі, суцяшаючы малых дзяцей.

## *ЦАРСКІ МАНІФЭСТ*

ДОЎГА бадзяўся Арон. Блудзіў ён па лясох, мераў гразкія балоты і пескавыя дарогі, пераходзіў з сяла ў сяло, каб толькі пераначаваць хіба ды перакусіць чаго. Выходзячы з гораду пасьля раптоўнае ростані з Ігнасём, ён за малым не папаў у рукі стражніцкаму патрулю. Але дзякуючы маўзэру ды цёмнай ночы, удалося ўцячы. Ён то бег, то ішоў, прыпыняючыся на хвілінку, або толькі паслухаць, ці няма пагоні.

Тае ночы ён не замгнуў ні на волас, бо была гострае жаданьне ўцячы, ня дацца паліцэйскім, як ён гэта рабіў ня раз ужо за сваю рэволюцыйную практыку. Не адчувалася ані зморы ці голаду, хаця ад полудню ў роце ня было ні расінкі. І думаць ня думаў куды ідзе, хацелася толькі чым далей пакінуць за плячыма горад. Але тут-жа сэрца сьціскаў нявыразны боль, быццам пакідаў ён ззаду ў сябе нешта надзвычайна дарагое, ня выказаць якое блізкае. І з болем адначасна сьвятлелі думкі і прачыналася жаданае і сумна радаснае разам.

Даражэй няма ў яго нічога болей. Там засталіся перапробленыя на справу ягоныя палкія думкі і погляды. Там яго блізкія і гэткія дарагія, зразумелыя яму таварышы, з якімі абставіны вымусілі разлучыцца. Не разьвітаўшыся нават, ня даўшы адзін аднаму рукі, не сказаўшы і пары

таварыскіх бадзёрых слоў... Там засталася яго душа, а тут ідзе толькі цела, крохкая абалонь, у якой туляцца гэткія моцныя, усясільныя думкі.

Быццам нітка цяглася за яго нагамі з гораду, што крок тужэй і тужэй напінаючыся, прыпыняючы яго на дарогах, вымушаючы азірацца на ўзгорках. Не адзін раз выбухала ў ім моцнае жаданьне завярнуць і пайсьці назад. У горад можна будзе ўвайсьці нішком, неўзаметку, а там схавацца ў аднаго з сяброў і з глыбокага патайнога падпольля накіроўваць рэвалюцыйную чыннасьць. Ах! як радасна зрабілася ад гэтае думкі. Ах! як гострым і патрэбным стала жаданьне. Нітка з гораду спутала яму ногі, напялася як ня лопнуць. Вось-вось. Калі-ж прайсьці паціху ў горад ня ўдасца, дык пры маўзэры маецца два зарады патронаў і ён увап'ецца радасьцю бойкі з ворагамі, сілаю праб'ецца. І лёс, выдуманы людзьмі, ня будзе яго лёсам-панам, а ён стане панам лёсу, ён зробіць з ім што захоча.

Успырхнула збоку сонная птушка, перыпыніла Аронавы палкія разважаньні. Па чорным небе праляцела ясьнюткая зорка, як-бы нябачная рука правяла грыфэлем па чорнай грыфэльнай дошцы белую лінію і ўраз сьцерла. Гэта зьявішча павярнула Аронавы думкі ў другі бок, на цьвярозую і такую простаю пуцінку: Які-ж ён дзівак! Каб трохі—глупства ўчыніў-бы. Усюды, дзе ні пайдзі, аднакія людзі і ўсюды знойдуцца сябры і таварышы. Але не, гэтых цяжка пакінуць цяжка забыць іх. Там-жа частка яго мяцежнае душы і ён датуль ня будзе спакойны, пакуль зноў не далучыцца да яе, пакуль ня зьліе абедзьве палавінкі ў адно цэлае. Але пакуль-што трэба скарыстаць і з таго, што ён уцёк, скарыстаць яго на агульную справу. Так, неўзабаве трэба вярнуцца, організацыя-ж яшчэ надта маладая і мала практычная... Эх, колькі радасьці ў змаганьні за жыцьцё, колькі пакуты ды гора, але-ж і радасьці.

Ахутаны новымі думкамі і жаданьнямі, бадзёрымі, сьветлымі, ён крануўся і пайшоў. Ішоў тае ўсяе доўгае восеньскае ночы і толькі ўраніцы, як пачало ўзыходзіць халоднае познае сонца, узбрыў на шырокае балота. На балоце чарнелі нявысокія стажкі сена. А Арон гэтак замарыўся. Не, не замарыўся, бо хіба можна назваць зморою, што ногі быццам валавяныя пасталі—думкі-ж у галаве лёгкія, плыўкія.

У балоце была вада, гразка. Часам дрыгва траплялася. А часам ногі ступалі на такое месца, дзе хоць гойдайся, падскакваючы, як на дзіцячай гушкалцы.

Арон прамінуў стагі са два і ля трэцяга на цьвёрдым сухаватым грудку спыніўся. Утоптанае сена ўжо пасьпела

зьляжацца і Арон трохі доўга выскубваў і растрыбушва-
яго, пакуль выграб сабе няглыбокую ямку.

А сонца гэтак неахвотна ўздымалася па-над зямлёю, чы-
вона-мядзянае, з кожнаю хвілінаю губляючы сваю чырвону-
афарбоўку, нагадваючы летняе сонца. Нават грэць пачынал-
патроху, асыпаючы праменямі ціхае, спакойнае балота. Арон
нырнуў у стог, закапаўся з галавою ў сена і хутка заснуў
квола і гасьцінна прылашчаны спагадным пяшчотным пра-
меньнем...

Дзён праз колькі, распытваючы дарогу, Арон прыбры-
на невялічкую станцыю. У дарозе ён склаў сабе пэўны пля-
дзейнасьці, а раней за ўсё трохі зьмяніў сваю вопратку,
набыў у кабеты ў сяле зрэбны мяшок і пахаваў туды ўсе
свае рэчы. Паводле гэтага пляну яму патрэбна было сесьці
ў поезд і па чыгунцы даехаць да Менску. А там ён меў на
ўвазе зьвязацца цесна з „Северо-западным комитетом".

Па поўдні таго дня, калі думаў Арон разьвітацца са сваім
бадзяньнем па сёлах ды палетках, здалёк яшчэ ўбачыў ён
верх вадакачкі. Запытаўшыся ў сустрэчнага хлапчука—ці
блізка да чыгункі і, запэўніўшыся, што яшчэ можа з вярсту
з гакам засталося прайсьці, ён паскорыў крок. Праўда, вярста
з гакам расьцягнулася ня менш як на тры вярсты, але
толькі гэтая розьніца ні на макава зерня не адбавіла ў яго
бадзёрасьці і лёгкага ды радаснага адчуваньня, што скон-
чыцца зараз утомны паход яго аднаго, сам-на-сам, толькі
са сваімі хвалюючымі думкамі і меркаваньнямі. Скончыцца,
сядзе ён у вагон, прыліпне ў куточку плячыма да сьцяны
і ўвесь радасны падпадзе пад уплыў жалезнага пастукваньня
калёс на рэйках, адчуе ўсё задаваленьне ад гонкае бягі
поезда, і адпачне; слухаючы чыгунна-рэйкавую музыку. На-
жаль, то былі мары, спадманныя мары ў чалавека, які ўжо
замарыўся ад доўгае хады, а да таго-ж яшчэ прымушаны
туляцца і падазрона абыходзіць ненадзейныя мясьціны, каб
ня ўспасьці на вока выпадковым вартоўнікам парадку.

Каб прайсьці шпарчэй „вярсту з гакам", ён напружыў усю
сваю энэргію і сілу абцяжэлых ног, думаючы, што там, на
станцыі, яму не патрэбна можа будзе гэтая энэргія. І як-жа ён
глыбока памыліўся, і як ён расчараваўся, стыкнуўшыся
з невясёлаю і нечаканаю сапраўднасьцю...

На станцыі—на пэроне, па дэбаркадэры і паміж рэек па-
хаджвалі чыгуначныя жандары, гарадавыя. Сьпешаныя страж-
нікі стаялі ў кучках перад уваходам у станцыю. Арон кінуў
вокам па ўзброеных людзях, паліцыі і налічыў іх ня менш
за трынаццаць чалавек. Была-б вар'яцтвам сьмеласьць яго
рашыцца сесьці тут у поезд. Але яго зьдзівілі разам з тым,
гэткія надзвычайныя меры аховы станцыі і ён парашыў

даведацца—чаму-ж гэта так. Магчыма, за тыя дні, што ён ішоў, хаваючыся ад людзей, у краі адбылося тое, чаго гэтак чакаў ён, чаго чакаў зьнядолены, прыгнечаны народ. Цяпер замест пасадкі ў поезд Арон падумаў, якім-бы яму парадкам распытаць у каго, што тут дзеецца.

Якраз у канцы станцыі пад тупікі было назганьвана штук з дваццатак вагонаў-пляцовак з бярвеньнем, дошкамі і шпаламі і якраз у тым баку ня відаць было ўзброенае паліцэйскае варты. Спадзяючыся напаткаць якога чыгунач-ніка і распытаць яго, Арон даў добрага круга і неўзаметку перайшоў цераз рэйкі і ўтуліўся за аднэю пляцформаю. Ужо тым, што ўпотайку прышоў на станцыю, ён рызыкаваў сьмела ня вырабіцца з паліцэйскіх кіпцюроў, каб толькі папаў у іх. Таму ён зараней парашыў сьцішыцца за бяр-веньнем і выглядзець ды паслухаць, што робіцца. Асьця-рожнасьць, з якою ён прывык рабіць усякую справу, была тут зусім ня лішняю. Але-ж выведваньне з-за вагонаў так-сама нічога яму не дало. Тады ён перамахнуў яшчэ цераз дзьве пары рэек і наблізіўся крыху да станцыйных будын-каў. Зноў стаў—паслухаў. Нічога і нікога, акром галасоў чыгуначных жандараў ды стражнікаў з гарадавымі. Арон гатоў быў ужо расчаравацца ў сваёй надзеі даведацца аб прычыне ўзмоцненае аховы станцыі і павярнуўся ісьці назад, калі да вуха даляцеў шум крокаў. Апошняе прымусіла на-старажыцца рызыкоўнага ўцекача. Там, адкуль чутны былі крокі, ляснуў па буксе малаток аглядчыка вагонаў. Арон устрыпянуўся, паслухаў з хвіліну і парабег на тую лінію, дзе праходзіў аглядчык. Але як-жа ён зьдзівіўся і зарадаваўся калі ў чыгуначніку пазнаў знаёмага сацыял-дэмакрата, які дапамагаў яму некалі ўцякаць на дрызіне ад шпега, калі езьдзіў па літаратуру на суседнюю станцыю.

— Вось дык сустрэча! Не чакаў, зусім не чакаў, брат,—зарадаваўся і чыгуначнік.—Ну, раней, здароў!

— Вязе мне... Здароў!..—прывітаўся Арон, ня даўшы таварышу абцерці запэцканае ў мазут рукі аб крысу пінжака.

— А якім-жа гэта парадкам апынуўся тут?—ужо ціха і асьцярожна спытаўся той.—Што гэта значыць: з мяшком за плячыма—зусім у дарогу.

— Давялося...

Арон у дзесяцёх словах сказаў, як ён павінен быў уцячы і бадзяцца, пакуль ня прышоў сюды з мэтаю сесьці ў поезд, каб даехаць да Менску. Чыгуначнік паківаў галавою.

— Дарэмна ты спадзяваўся.

— Чаго-ж іх халера нагнала сюды?

— А ліха іх ведае. Я мяркую, ці не дазналіся яны пра забастоўку, што неўзабаве мае выбухнуць на чыгунцы.

А можа і так чаго. Адным словам, строгі агляд. Сёньня ўжо адзін поезд агледзелі як мае быць. Мышы і тэй не праехаць-бы неўзаметку.

— Вось табе і на. Слухай, няўжо ніякае магчымасьці няма?

— Няма. Праўда, з вялікаю рызыкаю, дый то да бліжэйшага паўстанку можна-б дабрацца на дрызіне, уладзіць ня вельмі ўжо і цяжка, але ня сёньня і ня заўтра. А табе трэба-ж хавацца. Потым-жа, немач яго ведае, што можа сустрэць на другой станцыі. Я ня раю.

— Няўжо-ж пеша махаць?—запытаўся Арон.

— Няйначай. Будзе пэўна... Хоць ня так хутка, але сьмялей затое. А я табе ліст дам,—згодзіцца.

— Так, мусіць, так,—задумаўшыся, праказаў Арон.

*

ТЫДНІ два ўжо як Арон у Менску. З сяброўскім лістом таварыша чыгуначніка ён прытуліўся ў стрэлачніка Аляксея. Той увёў Арона ў кола менскіх соцыял-дэмакратаў, а там наш уцякач пазнаёміўся і з „Северо-западным комитетом". Узбадзёрыла Арона менскае жыцьцё, і ад гэтага ён сам перайначаў: адкуль узялася лёгкая рухавасьць і бясспрэчная ўпэўненасьць у сабе і ў свае сілы. Захацелася рынуцца з галавою ў бурлівую небясьпечную работу, усёю істотаю адчуць небясьпеку і разам з тым здаволіцца, што ведаеш, чаму жывеш, навошта займаеш месца на зямлі.

Неяк раз Арон патрапіў са сваім новым сябрам Аляксеем на адну кватэру. Наўкруга стала чалавек пяць вяло ажыўленую гутарку. Аляксей даў добры вечар, парэкомэндаваў Арона, і абодва селі на пару вольных крэсел. Гутарка, якая была перарвалася, калі прышлі хлопцы, аднавілася зноў з яшчэ большаю жвавасьцю. Гутарылі адзін з адным і разам усе, а калі хто зьвяртаўся да ўсіх, дык рэшта сьціхалі і слухалі аднаго. Блізшы сусед уцёг у гутарку Арона.

Поруч з імі два таварышы па-сяброўску хапалі адзін аднаго за грудзі і мерыліся кожны давесьці сваё. Арон запытаўся, аб чым яны гэтак гостра спрачаюцца.

— Гэ, спрачаюцца... Гэта што... Тут, брат, часам як сходзяцца, дык кіпнем не разьліць. Вунь таго, бачыш, з завязаным вокам, што сіпіць так, голасу ня мае гаварыць. Ну, вось, учора спрачаўся з бундаўцам і асіп. А пасьля ўжо, ідучы да хаты, надало яму зайсьці ў чайную, чайная ў нас для сходак служыць. Чаго там толькі не наглядзішся. Дыскусуюць усе, кожны сваю праўду даводзіць. І іскраўцы там, і меншавікі, і эсэры, і бундаўцы, і сыёністы. Поўная

чайная накурана—спрэчкі, гоман, гвалт. Вось заходзіць гэта ён туды, а там нанесла на яго заядлага сыёніста, надта гарачы, з тэмпэрамантам. Слова за слова, а там колкая шпілька-насьмешка па адрасу арганізацыі опонэнта, затым асабовая абраза і—кулак пад нос. Дык наш ваяка, вось—бачыш—прышоў з завязаным вокам.

— На дваццаць пяць франтоў змагацца выпадае,—пасьмяяўся Арон.—Пра што-ж галоўным чынам спрачаюцца?

— Пра ўсё. Тут табе і забастоўкі, і сумесныя рэволюцыйныя выступленьні, і нацыянальна-культурная аўтономія (бундаўская, бязумоўна), і пытаньне аб часовым рэволюцыйным урадзе. Нярэдка пачуць можна і спрэчкі пра тое, хто павінен лічыцца членам партыі. Звычайна спрэчкі пасьля чайное аднаўляюцца назаўтра на фабрыцы, у майстэрні, на заводзе. У такіх выпадках сам гаспадар вымушан умешвацца і мірыць спрэчнікаў. Гаспадару мала толку ад такіх спрэчак і ён падымае крык: „Я не павінен цярпець страту з-за вашага Мартава ці Леніна“.

— Гэта ненормальна,—пасьмяяўся Арон.

— Ясна,—згадзіўся ягоны размоўца.—Але ўся бяда ў тым, што вось унікнуць яго нельга, літаратуры патрэбнае—задушыся—няма. А патрэбна вялікая. І спрэчкі наогул так заблытваюцца і такога туману напускаюць часам, што хоць ты махалам махай, каб разьвеяць. А ў вас як, раскажы, нам цікава паслухаць пра вопыт іншагародняе організацыі. Таварышы,—зьвярнуўся ён да сяброў:—давайце паслухаем таварыша, што прыехаў. Пачынай,—ткнуў ён пад бок Арона,—а то яны зноў захопяцца сваімі спрэчкамі.

У пакоі было накурана, мусіць, ня горш, як у тэй чайной. Курылі ўсе, за выключэньнем аднаго Арона, недакуркі ляцелі далоў,—куды папала. Трохі паводдаль ад стала сядзела маладая чарнявая дзяўчына. Цяпер толькі, калі пачаў гаварыць, заўважыў яё Арон. Пагляд воч у яе быў нейкі сумнаваты і ласкавы. Чорныя валасы, насьпех закручаныя ў куклу, павіваліся густымі пасмамі, утулілі, бы ў махры пышныя, твар яе. Недарагі турэцкі шаль зьехаў на адно плячо, і дзяўчына не папраўляла яго. Абапёршыся праваю рукою на сьпінку крэсла, яна сядзела бокам неяк, схіліўшы наперад галаву, і моўчкі і прагна слухала, пра што апавядаў Арон.

— А з Бундам як у вас?—перапынілі яго.

Арон пад канец расказаў, як бундаўцы сарвалі іхнай групе дэмонстрацыю, а як скончыў, усе загаманілі шумліва.

— Што не кажы, а Пецярбурскія здарэньні і водгук на іх, здарэньні амаль па ўсіх гарадох, ускалыхнулі грамадзкую

думку ад глыбокага сну. Нават тыя, што ніколі і ня сьнілі пра політыку, цяпер так ці іначай, а ўцягваюцца ў яе.

— І чакаюць царскага маніфэсту, гэта мы ведаем.

— Справа ў тым, што наша задача і абавязак пакіраваць гэтыя настрої ў патрэбны бок.

— Паспрабуй. Наадварот, вось якраз цяпер разрывацца непатрэбна на шматкі, а біць цьвёрда і ўпэўнена ў адно месца, сьмялей трэба ўбіваць у галаву рабочым думку аб канечнай патрэбнасьці ўзброенага паўстаньня і стварэньня рэволюцыйнага ўраду. Трэба павесьці шырока агітацыю і пропаганду ў войску, каб забясьпечыць сябе пры паўстаньні адзаду, каб дзейнічаць тады з разьвязанымі рукамі. А няньчыцца і гуляць у міжнародны карагод сэнсу няма.

— У цябе такая простая лінія, што можна падумаць, быццам ніяк крывулінак няма ў ёй. Жартуеш, а заваяваць свае сымпатыі ў шырокіх масах так званага народу, гэта, па-твойму, так сабе, бяз гэтага можна абыйсьціся? Чаму-б не. Забыўся пра францускую рэволюцыю... Я не адмуўляю, трэба як .найшпарчэй рыхтаваць рабочых, гэтак сама як конча патрэбна пашыраць работу ў войску.

— На войска асабліва спадзявацца няма чаго. Хіба вам мала пецярбурскае навукі? Дык бяз уласных баявых дружын вы і кроку не дасьце, ні ў водным квартале вы не астаўбуецеся. Вось калі скласьці баявыя дружыны з добрых навучаных сьмяльцоў ды ўзброіць іх маўзэрамі, гранатамі, тады гэта ўражаньне і на войску пакіне, магчыма, куды большае за вашу агітацыю і пропаганду.

Сіняваты дым хмараю навіс над сталом, пахаваў за сабою столь і куты. І мусіць ад дыму сьлязьліва паморгвала лямпа. А Арон глядзеў цераз стол на чарнявую дзяўчыну, у яе сумнавата-ласкавыя вочы і думаў пра Любу... пра Ігнася і пра ўсіх таварышоў, ад якіх ён быў гэтак далёка цяпер, вымушаны сядзець і меркаваць, якім спосабам вярнуцца назад.

Прысутныя тымчасам спрачаліся. Гаварылі аб тым, што ў Менску цяпер рыхтуецца тое ж самае, што рыхтавалася ўзімку ў Пецярбурзе, што склізкія настроі працінаюць глыбей народныя масы—чакаюць на рэформы, спадзяюцца, што цар, напалоханы ўжо добра студзеньскімі здарэньнямі, пойдзе насустрач народу і выдасьць шэраг законаў. Упартыя чуткі плылі з Пецярбургу, што рыхтуецца царскі маніфэст. Людзі, якія мелі добры дастатак, паслалі нават сваіх прадстаўнікоў у Пецярбург сачыць як-бы за ўрадам і на выпадак чаго якога паведаміць сябром праз тэлеграф.

Доўга гаварылі пра ўсе тыя пытаньні сямёра чалавек у невялічкім накураным пакойчыку. У лямпе выгарала газа,

сьвятло стала меншаць, а ў пакоі цьмянець. Тады нарада разышлася. Арон разьвітаўся з таварышамі і з асабліва прыемным адчуваньнем пацісnуў тонкую руку чарнявай сумнай дзяўчыне.

На Саборным пляцы, куды, ён вышаў з Аляксеем, гадзіньнік на вежы вызваніў адзінаццаць. З пляцу па Губарнатарскай вуліцы яны накіраваліся на Захараўскую—з паўгадзіны хады было да Аляксеевае кватэры.

На рагу Губарнатарскае і Захараўскае гарадавы, мармытнуўшы нешта на рамізьніка, пазяхнуў шырока і крыкнуў хлопцам:

— Гэй, „Іскра“, дамоў час!—і прамармытаў ужо сам сабе:—Бунд даўно пайшоў спаць.

Аляксей засьмяяўся сабе пад нос і, прамінуўшы гарадавога, растлумачыў няцямліваму Арону:

— Мы ішлі якраз па левым баку вуліцы, а тут ужо павялося гэтак: на правым баку месьяцца бундаўцы, а на левым социял-дэмократы іскраўцы.

Арон весела зарагатаў:

— А угадаў, чорт на яго.

На вуліцах было ціха. Дзе-ні-дзе прабяжыць спозьненая фігурка. Гойдаючыся ўперадку, праедзе дадому рамізьнік. Пройдзе п‘янаю хадою з размалёваным тварам жанчына і, сустрэўшыся, асіплым голасам прасьпявае нецэнзурную песеньку. А на рогах, ля сваіх паласатых будак ці ў сярэдзіне дрэмлюць гарадавыя.

Праз два кварталы хлопцы перайшлі на Падгорную і ўпоцёмку глуха чутны былі іх крокі на цёмнай вуліцы.

## *КРЫВАВЫМІ ЛІТАРАМІ*

ЦЯЖКІМІ крокамі ступае цьвёрда неўпрашонае жыцьцё, што момант ці дзень мінаючы прыносіць з сабою новыя весткі, новыя спробы, надзеі і спалох, барацьбу і напружанасьць. Людзі растуць у сваім духоўным росьце, як расьліны, перасаджаныя з тумановага захаду на палкі поўдзень, на кволы ветравей пад палючым сонцам; быццам наўкола рассунуліся ў бясконцасьць недасяжную, празрыста-сіняватыя далі, так далёка, што вокам ня сьцяць ягоных прасьцягаў прынадных. Дзівутка перараджаюцца людзі.

Арон апынуўся ў віры жыцьця. Кожная хвіліна, кожнае імгненьне прыносіла з сабою што-небудзь ды новае. Хвалі

руханьня заўладалі ўсім жывым. То тут, то сюд вынікалі выбухі на барацьбу, на паўстаньне. Пасьля верасьнёвага расстрэлу семнаццаці рэволюцыйных матросаў у Свэаборзе вышаў неўзабаве першы нумар бальшавіцкае газэты „Соцыял-дэмократ“ і сьледам за тым выбухла ў Маскве забастоўка рабочых друкарань.

І пачалося.

У аўторак стрэлачнік Аляксей, пайшоўшы на службу, праз паўгадзіны вярнуўся назад.

І відаць, што сьпяшаўся. Пасьпешна адчыніў сенцы, уварваўся ў пакой. Шапка на патыліцы. Твар урачысты, радасны.

— Што?—адным словам запытаўся Арон.

— Пачалося.

— Дзе? Як?—напярэсьпехі пытаўся Арон, а ў грудзёх сэрца гэтак і загрукацела, і закалацілася.

— Забаставала чыгунка—Масква-Бярэсьце...

Арон глыбока і прагна дыхнуў, быццам у душны-душны пакой шаснула сьвежае халадковае паветра і зрабілася бадзёра раптам і моц нячуваньня пачулася ў руках.

— Сур'ёзна, праўда?—перапытаўся ён, ня верачы нібы, што пачуў.

— Вось дзівак,—праказаў Аляксей і зарагатаў весела,—ня верыць. Хадзем.

Запрашаць таго ня трэ' было. Ён шпарка апрануўся і за Аляксеем пашыбаваў на вокзал.

Вокзал заняжывеў. Не сьпявалі сваю чыгунную песьню рэйкі пад калёсамі, ня сьвісталі сьвісткі счэпшчыкаў, ня гулі працяжна за сэмафорам гудкі паравозаў. Паўстывала ўсё на вокзале: рэйкі бліскучыя, гладкія, з пазапэцкваным у мазут шпаламі; у беспарадку параскідаліся на пуцях паасобныя вагоны і цэлыя шнуры іх,—толькі паравоз прычапіць і пайшоў у дарогу; пазасынаілі чорныя замурзаныя паравозы; маўчала дэпо. Абодва сэмафоры пазакручваліся на пуці, як-быццам вартуючы гэтую сьціішу на станцыі. Але што кінулася вельмі ў вочы Арону, дык гэта людзі на вокзале. Іх мо' ня менш было, чымся ў звычайны дзень, але зьдзіўляла іхная заклапочанасьць у тварах і нейкая павольная ўрачыстасьць. Пасажыры яшчэ ня ўсе ведалі пра забастоўку і вокзальнае памяшканьне і першае, і трэцяе клясы, як і раней, напаўнялася поўным. Дзе-ні-дзе матлянецца форменная шапка чыгуначніка; дзе-ні-дзе празвоніць шпорамі жандар; а публіка то расходзіцца, то сходзіцца ў кучкі і пашкутку гамоніць.

Арон з Аляксеем абышлі гэтак увесь вокзал і пайшлі назад. За вокзалам стаялі ў рад рамізьнікі, але і іх паменшыла, быццам-бы чыгуначная забастоўка даткнулася і іх.

І раптам спахмурнеў Арон. Чыгуначнік заўважыў гэта ды жартамі запытаўся:

— Ці ня люба табе глядзець? Ня рады, што пабачыў? Мо' шкадуеш, што ціха зрабілася гэтак на вокзале?

— Не,—сілкуючы вызваліцца быццам з-пад нейкага цяжару, адказаў Арон.—Не, ведаеш, цяжка робіцца на сэрцы, як успамянеш, што і ў нас можа быць гэтае самае, а я ня з хлопцамі.

— Эг-г-г-ге-е...—працёг чыгуначнік,—а я табе скажу, што няма чаго ўспамінаць.

І ён махнуў наўкруга рукою і схаваў яе ў кішэню.

— Дрэнная натура ў мяне,—казаў Арон.

— Трэба сябе ў руках трымаць лепш,—адказаў чыгуначнік, і сам быццам падпаў пад уплыў Аронавых адчуваньняў, уціх.

Больш праз усю дарогу яны не абазваліся ні словам. Маўчанка ўхваста цяглася і адчапіцца ніяк не магла. Псуюць людзям гэтыя дрэнныя адчуваньні і настроі.

А горад варушыўся, як мурашнік. Грукацела конка. Шалясталі рамізьнікі, сьпяшаліся пешаходы. І нават Віленскі рынак, як яго і ня тычылася нішто, быў повен сялянскіх фурманак і пакупцоў. Па вуліцы пырхалі вераб'і, ціўкалі жалобна, надзімаліся і пералятал з месца на месца, каб пажывіцца. Над самым рынкам узьвілася парачка галубоў. Лёгка і плыўка пізавалі яны роўную белаватую гладзіню чыстага неба, як-бы вызваліўшыся з чорнае нядолі і цяпер радуючыся свайму вызваленьню, спрабуючы ці не пацяжэлі іх гордыя крылы.

На працягу наступных пяці дзён Віленскі вокзал быў месцам для сходак рабочых і служачых, галоўным чынам чыгункі. Па ўсіх сходках старшыняваў Павал Жаба—служачы аддзелу матэрыяльнае часткі ўправы Лібава-Роменскай чыгункі. Усе сходкі праходзілі пад знакам палітычных патрабаваньняў ад ураду, больш мелі на ўвазе дамагацца палітычных зьмен у дзяржаўным ладзе, але пэўнае рашучае варожасьці да ўраду яны ня выказвалі. Праўда, не ўважаючы на адсутнасьць ряшучых дзеяньняў, сходкі прыцягвалі да сябе рабочых амаль з ўсяго гораду, а асабліва з бліжэйшых майстэрань ды з Ляхаўкі.

Усё адно, як-бы нічога асаблівага і не адбывалася ў горадзе. Як і звычайна, хадзілі ўраніцы з песьнямі па вуліцах салдаты. Праяжджалі казачыя веставыя. І афіцэры няўважна прымалі салдацкае пад казырок.

Арона чамусьці трывожыла гэта на першы погляд нормальнае жыцьцё гораду, яму чамусьці ўдзяўблося ў галаву, што такі зацішак бывае заўсёды перад страшнымі, жудаснымі падзеямі. А каб ён ведаў, якія захады рабіла ўлада для захаваньня парадку, дык жудасьць яго вырасла-б у шмат разоў, але ён ня ведаў пра тое, бо адбывалася яно ў вялікім сакрэце.

Ужо на другі дзень чыгуначнае забастоўкі губарнатар Курлоў склікаў у сваім палацы нараду вайсковых начальнікаў. На нарадзе разьмеркаваў паміж паасобных вайсковых часьцей раёны гораду, якія патрэбна было кожнай часьці абараняць, не дапушчаючы ніякіх выступленьняў натоўпу і дзейнічаючы зброяю. Большы лік войска прыпаў на абодва вокзалы. Паліцэйскія часьці пабралі для аховы губарнатарскага палацу. Пасьля ўсяго губарнатар паназначаў адказных паліцэйскіх чыноўнікаў, якія на выпадак непарадкаў у пэўным раёне ад імя губарнатара маглі загадаць камандзіру любое часьці расстраляць бунтаўшчыкоў. На гэта яны мелі ўсе патрэбныя паперы ад губарнатара. Вось што рыхтаваў царскі апрычнік народу, які чакаў на царскі маніфэст і жаданую свабоду.

Роўна праз тыдзень пасьля пачатку забастоўкі на чыгунцы, у аўторак, Арон прачнуўся рана-раненька. На двары было цёмна, а ў горадзе ціха і нішто не разрывала гэтае сьцішы, але, як на зло Арону, сон уцякаў ад яго. Некалькі разоў перавярнуўся ён на сваёй цьвёрдай пасьцелі, пасланай на падлозе, і ўжо да самага відна ня мог заснуць і на волас. Вярзьліся розныя думкі, успаміналіся назольна Ігнась з Любаю, Дуб, Ларыса, Майзэль. І можа ад таго сьціскала сэрца туга і ў думках ён абарачваўся ў птушку і лёгка і шпарка ляцеў туды, дзе ято чакалі.

А як стала разьвідневаць, устаў і, стараючыся не грукаць, адзеўся і памыўся. Аляксей яшчэ спаў і Арону не хацелася яго будзіць. Памыўшыся, ён зірнуў у акно.

Сонца выблісьнула з-за туману і паслала свае першыя чырвоныя праменьні насустрач клапатліваму дню. Па падвоканьні прабег чалавек. Заглядзеўшы Арона, ён ўсьміхнуўся радасна і закрычаў нешта. Адалей махнуў ракою і зноў пабег уперад.

„Нешта нейкае", падумалася Арону, і ён выбег на вуліцу. Незнаёмы зьнік за рог вуліцы. Арон паглядзеў у другі канец. Адзін за адным і кучкамі беглі людзі, на бягу зашпільваючы гузікі і размаўляючы абрыўчата і радасна.

Арон спыніў першага сустрэчнага і запытаўся, куды яны бягуць усе.

— Ці ня чуў яшчэ? Гэй, хлоцпы, ён ня чуў яшчэ. Ну і дзівак, ты! Ад купца Вендрава з Пецярбургу тэлеграму атрымалі, што цар маніфэст падпісаў! Свабода дана ўсім!

І, праказаўшы гэта, чалавек пабег даганяць задніх.

„Вось яно што",—прамільгнула ў Аронавых думках і ён шпарка вярнуўся, каб пабудзіць Аляксея.

Стрэлачнік тымчасам прачнуўся і ўжо абуваўся. Арон застаў яго на падлозе. Аляксей накручваў на кожнаю нагу па дзьве анучы і крактаў , насоўваючы бот.

— Шпарчэй абувайся!—гукнуў яму Арон, — па аднэй анучы, менш завінаў-бы, а то глядзі, аж у пот кінула. Цар маніфэст выдаў, народ надарыў свабодамі.

— Ня можа быць!—ускочыў Аляксей з аднэю нагою боце.

— Людзі бегма бягуць вуліцаю, як ня можа быць.

— Хоць ты ня сьнедаючы ідзі з выпадку такое радасьці,— іронічна праказаў ён.

— Пойдзем,—сказаў Арон.

дучы на Віленскі вокзал, стрэлачнік казаў:

— Напэўна туды яны ўсе пабеглі. Наша забастоўка зрабілася цэнтрам, куды імкнуцца ўсе нездаволеныя царом. Павал Жаба, гэты дастатны эсэрык, на другой-жа сходцы заўважыў гэта. Ну, але сам вось паглядзіш сёньня, калі...

Ён так і не даказаў калі што, а Арон і не папытаўся. З-за выгіну Вокзальнае вуліцы подых ветру прынёс галасы і шум натоўпу. Арон з Аляксеем услухаліся. Так, уперадзе, гудзеў натоўп, а праз якую хвіліну на вочы выплыў і прывокзальны пляц.

Некалькі сот чалавек мужчын і жанчын высыпала якраз гэты момант з вокзальнае залі і астаўбаваліся на пляцы. З усіх вуліц пасьпяшалі людзі, уліваліся ў кучу і натоўп хутка шырыўся, заліваў шырокі пляц. Калі Арон з Аляксеем падышлі, з вокзалу два чыгуначнікі вынесьлі стол і паставілі пасярэдзіне пляцу. Трыбуна была гатова.

Арон узіраўся ў твары абстаўшых яго людзей. Узіраючыся, пераконваўся, што ў большасьці тут былі чыгуначнікі і рабочыя з майстэрань у пазапэцкаванай рабочай вопратцы. Раптам ён сустрэўся з параю вельмі знаёмых воч, сьмяхотлівых і падазрона жулікаватых.

Арон расштурхнуў людзей і кінуўся туды, каб пераканацца, што гэта быў якраз той, на каго ён падумаў. Але натоўп захваляваўся нечага, загойдаўся і Арону так і не давялося знайсьці, каго шукаў. Затое суседзі, з якімі ён абышоўся без цырымоніі, кінулі яму навучальна:

— Можна крыху далікатней, грамадзянін.

— Бач, гамоняць, паслухаць трэба, калі сабраліся.

А ў Арона з галавы ня вылазіла пара жулікаватых воч і ён думаў і ня верыў сам сабе:

— Юзік... Адкуль ён мог апынуцца тут. Трэба праверыць,—парашыў ён і пачуў, як яго зачапілі ззаду і папрасілі ня штурхацца.

Арон ня ўстояў на месцы, яго цягнула даведацца, хто гэта быў у натоўпе, сапраўды Юзік ці хто вельмі падобны да яго. І тупаючы сабе, штурхаючыся, ён выбраўся гэтак на край і нечакана сустрэў тую чарнявую сумнаватую дзяўчыну ў турэцкім шалі, з якою бачыўся на падпольнай нарадзе.

Дзяўчына прывіталася і нават твар яе паясьнеў, а Арону палягчэла, парадасьнела на сэрцы. Але тут-жа дзяўчына ўшопат заўважыла яму:

— Давайце разыйдземся, няможна ў адно месца зьбірацца. У натоўпе маюцца непажаданыя для нас вочы. Бывайце!

І, раней чымся ён пасьпеў сказаць што, дзяўчына адышла і схавалася ў людзі.

Арон падаўся ўправа і стаў якраз насупроць вакзальнага пад'езду. І тут толькі заўважыў, што пад'езд ахоўваецца ўзброенымі салдатамі. Ён азірнуўся наўкола. Па мосьце, які цягне над вокзалам, таксама пахаджвалі ўзброеныя салдаты. У адным канцы пляцу, дзе не маглі заўважыць Арон з Аляксеем, сьпяшаючыся да вокзалу, у камандзе „вольна" стаяла блізка разьдзелу ці двох пехацінцаў бяз вінтовак.

Апаў ураз лёгкі настрой, узьняты ў Арона чарнявою дзяўчынаю, і няпрыемна настарожанае адчуваньне зьявілася. Арон пацёг за рукаў пажылага вусатага дзядзьку ў чыстым пінжаку і запытаўся:

— Вы ня ведаеце, чаму гэта загадана салдатам стаяць тут пад вокзалам?

— Астаўце, малады чалавек, глупства пароць. Хіба вы ня бачыце, што салдат спакайнейшых і ня трэба. Мусіць, ня ведаеце, што сход дазволены самім губарнатарам. Свабоды свабодамі, а парадак-жа павінен быць.

І дзядзька перарваў гутарку, адышоўся ў сярэдзіну ад назольнага маладога чалавека. Адышоўшыся, ён стаў, выцягнуў галаву, зноў пачаў слухаць прамоўцаў.

Пасьля размовы з дзядзькам у пінжаку Арон паглядзеў на салдатаў і сапраўды ўбачыў іх спакойнымі, ціхімі, бяскрыўднымі. Афіцэр, што стаяў наперадзе, выцёг з кішэні рукою ў белай пальчатцы сярэбраны партабак і закурыў папяроску. Сіняваты дымок паплыў ад яго ва ўсе бакі.

Але ўжо праз паўгадзіны салдаты ўвачавідкі з ціхіх і бяскрыўдных ўявіліся Арону жорсткімі, азьвярэлымі, запырсканымі чырвонаю сьвежаю крывёю. Ён сьціснуў зубы і адвярнуўся.

„Цяпер разумею",—падумаў зноў ён.—„Гэта, калі глядзець вачыма таго дзядзькі, дык салдаты зусім бяскрыўдныя і так сабе на вокзале,—быццам пагуляць прышлі. А калі зірнуць сваімі ўласнымі. Ну яго",—парашыў ён, нарэшце, і нават рукою махнуў, адвярнуўся.

За той час, што Арон валаводзіўся са сваімі нагляданьнямі, адчуваньнямі і сустрэчамі, сказала з трыбуны свае слова некалькі прамоўцаў. Нейкі Янкель Окунь з вялікаю прыхільнасьцю да царскага маніфэсту сказаў, што народу даецца свабода. „Але не забывайце, грамадзяне, паліцыя пастараецца ня даць свабоды, абвешчанае царом". Выступалі і соцыял-дэмократы, і бундаўцы. Першыя былі жорсткімі, непадкупнымі, кідалі ў масу ваяўнічыя словы, заклікаючы народ ня верыць у царскі маніфэст: „Мана гэта ўсё, цар падпісаў яго пад націскам рэволюцыйнага руху, бо спалохаўся і, як толькі міне спалох, маніфэст скасуецца, і той, хто як сьляпы верыў у яго, сплаціць за сваю даверлівасьць уласнаю „крывёю". Але посьпеху тыя словы ня мелі ў натоўпе, не знаходзілі сабе спачуваньня ў задураных галовах.

Пасьля на трыбуну ўзьлез непавароткі, нярухавы, няпрыгожы з твару, але які захапляў усіх сваёю цьвёрдаю халоднаю энэргіяю, Гамзагурдзі. Ён першы абвясьціў тэлеграмаю аб забастоўцы ў Менск і пасьля праз усе дні разьяжджаў па чыгунцы, як тэхнік Гомельскае падстанцыі. Дзякуючы яго ўпартасьці ад пачатку забастоўкі ніводзін поезд не ўвайшоў у Менск і ня вышаў з Менску. Палітычных пераконаньняў быў ён ні-то меншавіком, ні-то эсэрам. З Паўлам Жаба, дзелаводам матэрыяльнае службы, яны трымалі ў руках кіраўніцтва забастоўкаю на Менскім вузьле. І вось пасьля некалькіх соцыял-дэмократычных прамоўцаў выступіў ён для таго, каб абясьсіліць і без таго слабы ўплыў соцыял-дэмократычных слоў. Кажучы, што часта ўрад ня выконваў сваіх абяцаньняў і для таго, каб пераканацца, што маніфэст ня мае за сабою ніякае схаванае злоснае думкі, прапанаваў ён пайсьці да губарнатара і згодна з маніфэстам прасіць вызваліць усіх арыштаваных. „Па маніфэсьце губарнатар павінен гэта зрабіць, то-ж маніфэст даны ўрадам і падпісаны царом".

Натоўп загудзеў ухвалаю на яго прамову. А тымчасам на трыбуне ўжо стаяў Павал Жаба. Ен цалкам падтрымліваў прапанову Гамзагурдзі, але толькі сказаў, што ісь

ўсім нельга, лепш будзе выбраць дэпутацыю. І зноў усхваляваны натоўп згадзіўся.

У дэпутацыю ўвайшла вялікая частка народу з мітынгу, так што ўяўляла яна з сябе не дэпутацыю, а невялічкую групку маніфэстантаў. У натоўпе знайшлося поўна каго, хто захацеў прысутнічаць сваёю ўласнаю асобаю пры вялікім гістарычным факце вызваленьня арыштаваных па царскім маніфэсьце. І дэпутацыя, узмоцненая добраахвотнікамі з мітынгу, адкалолася ад натоўпу і пад правадырствам Паўла Жабы пайшла да гарадзкога галавы Стэфановіча. Такім чынам мітынг на пляцы раскалоўся на дзьве часткі. Большая засталася на месцы, а меншая пайшла вызваляць арыштаваных. За Паўла Жабу мітынгам кіраваць застаўся Гамзагурдзі.

Калі дэпутацыя вылучылася з натоўпу, Арон загледзеў свайго сябра стрэлачніка і аклікнуў яго. Той таксама шукаў Арона. Па маўклівай згодзе абодва адлучыліся ад мітынгу і павольна пайшлі проста да кватэры, як-быццам у іх ужо ўмоўлена было куды і чагоісьці.

Стрэлачнік шыбчэй засьпяшаўся да кватэры.

Было нядоўга да вечара, калі яны, падпалуднаваўшы, зноў вярнуліся на мітынг.

Горад выглядаў, як на сьвята. Пажвавеўшыя людзі, вясёла-радасныя гулялі па вуліцах, пераказвалі адно аднаму радасныя весткі. Натоўп на пляцы перад вокзалам павялічваўся мо' з кожнаю хвілінаю, бо народ прыбываў і прыбываў, кожнаму хацелася ведаць, што робіцца па Расіі.

Дэпутацыя, што хадзіла вызваляць арыштаваных, вярнулася амаль бяз вынікаў (губарнатар вызваліў толькі чалавек некалькі адміністрацыйных, якіх і так ужо час быў выпусьціць), але радасна ўзбураная з двума чырвонымі сьцягамі, начэпленымі на шашкі. У часе сваіх бадзяньняў ад гарадзкога галавы да пракурора, ад пракурора да турмы і адтуль да губарнатара дэпутацкая грамада напаткала двух афіцэраў. Ураз былі спынены афіцэры, абяззброены, а на іхныя шашкі дэпутаты паўзьдзявалі чырвоныя сьцягі, якія мелі пры сабе запасьлівыя людзі, і ад губарнатара з ягоным дазволам на вызваленьне адміністрацыйных, пайшлі сустракаць іх. Ад турмы ўжо разам з вызваленымі накіраваліся ўсе назад пад вокзал. Надзеі ў людзей узрасьлі, памацнелі. Цьвёрда верылася, што цар выдаў сапраўдны маніфэст, калі губарнатар выпусьціў некаторых арыштаваных. Што ня ўсіх—гэта ня важна, бо нельга-ж, сапраўды, не разьбіраўшы справы кожнага, сказаць: вось цар даў свабоду, а таму вінаваты ці не, а, калі ласка, асла-

бані турму". І дэпутацыя згадзілася з губарнатарам і пракурорам і бяз усякіх эксцэсаў у парадку вярнулася на мітынг.

Як толькі Арон з чыгуначнікам ступілі на пляц, народ замітусіўся і ў той-жа час адбылося нешта недарэчнае. Салдаты, якіх за адсутнасьць Арона з Аляксеем яшчэ прыбыло, раптам па камандзе афіцэраў пасталі ў баявы парадак і грукат стрэлаў заглушыў сабою мітынговы гоман.

Так гэта неспадзявана і недарэчна пачалося, што ў першую-ж хвіліну хлопцы ня ведалі, куды кінуцца і што рабіць, як і ўся вялізарная грамада людзей на мітынгу. Але стрэлы ўрэзаліся ў жывое цёла натоўпу. Упала некалькі чалавек, і ўвесь пляц, здаецца, сарваўся з месца і ад таго людзі не ўстаялі на месцы, шарахнулі ў розныя бакі, пачалі падаць. Большая частка рынула ўлева, з намерам, мусіць, ці і зусім бяз усякага намеру, прарвацца на вокзал кругом, быццам спадзяючыся там выратавацца ад салдат, якія за першым стрэлам зрабілі другі і трэці. І адначасова з стрэламі падалі людзі, як падаюць сьпелыя яблыкі ўвосень з яблыні. У гэты самы момант з вокзалу, куды напірала грамада, загрымелі стрэлы другіх салдат. Звонкі вінтовачны ляскат узбудзіў мірны, што датуль баставаў, вокзал.

Крыкі, стогны, стрэлы, ляскат куль, тупат сотак, а мо' і тысяч людзей памяшаўся ў аднэй пякельнай музыцы. Арона з Аляксеем густая хваля цел ураз зьбіла з дарогі, падхапіла і панесла, сама ня ведаючы куды. Было інстынктыўнае жаданьне вылецець з-пад гэтых жудасных, сьмяртэльных стрэлаў. Каб вырасьлі раптам крылы ў натоўпу, узьляцеў-бы ён, здаецца, і зьнік-бы за белаватымі аблачынкамі, што наплылі з захаду. Але-ж кулі былі шыбчэйшымі за чалавечыя ногі: шлях, па якім уцякаў народ, засьцілаўся забітымі і паранеными.

Арон паспрабаваў вырвацца з моцных абцугоў, у якія сьціснулі яго на сьмерць запалоханыя ўцекачы, і ніяк ня мог. З чыгуначнікам іх, відаць, разлучылі з самага пачатку, бо таго ня было паблізу.

Натоўп дарваўся, нарэшце, да вуліцы. Тут пачаўся сапраўдны гармідар. Слабшыя, ня маючы моцы прабіцца, падалі пад ногі, і па іх беглі, спатыкаліся, падалі і зноў уставалі ды беглі соткі дужэйшых. Арона неяк адцісвулі на бок да сьцяны дому. Ці гэта людзі перабеглі ўжо ўсе, ці гэта ён якім чынам патрапіў на другую вуліцу.

Стрэлы не перасьціхалі яшчэ, народ бег, толькі ўсё радзей,—гэтак ашаломіла Арона неспадзяваная страляніна, сьмерць на вачох і перапуд сотак людзей. Цяпер ён аддыхнуўся. Тумановая плеўка спаўзла з воч і ён убачыў проста перад сабою...

...Юзіка. У гарадзкім палітоне, у шэрай кепцы на патыліцы. Адкуль ён вынырнуў.

— Стой!..—крыкнуў, здаецца, Арон на ўсю вуліцу.

Юзік азірнуўся і залп з-пад вокзалу замёў вуліцу. Юзік як бег, так недарэчна заараў носам у брук. Арон памкнуўся падбегчы к яму, наткнуўся на нейчае цела, упаў. Патрывожаная Аронам ахвяра расстрэлу застагнала працяжна. Арон зірнуў. Уся ў крыві на бруку ляжала тая чарнявая, з сумным поглядам воч, дзяўчына.

— О, каты!..—праз сьціснутыя зубы вырвалася ў Арона. І ўраз ён ухапіў дзяўчыну, моўчкі падняў, як малое дзіцянё, ледзь ня бегма падаўся да кватэры.

*

ЖАЛОБА і гнеў, вялізнымі нявіднымі птушкамі прыляцелі за царскім маніфэстам, чорныя крылы свае распострылі над горадам.

Праз цэлыя дні хмурылася, надзімалася палавое восеньскае неба. Зморшчвалася жаласьліва—наплывалі густыя з заходу цёмныя хмары. І калі згусалі яны над горадам і зьніжаліся нізка-нізка над дахі дамоў, тады плакала яно, як плача пакрыўджанае часам дзіця. Сьлёзы лілі ручаямі праз вадасьцёкавыя трубы на тротуар. Было мокра, сіроча і няпрытульна на вуліцах. Дажджавы пыл-імга павіс у прахонах пасярод прынураватых камяніц.

У такі дзень пахавалі соцыял-дэмакраты чарнявую дзяўчыну з сумным поглядам воч. Акрываўлены турэцкі шаль застаўся ў Арона, бо ніхто пра яго ня пытаўся, ня было у дзяўчыны ні бацькоў, ні братоў з сёстрамі, каму быў-бы ён дарагім успамінкам. Як адзінотная былінка на шырокай мяжы ў полі, расла яна, пакуль злосны восеньскі вятруга не намогся зламаць яе. Пахавалі.

На траіх могільніках Менску прыбавілася блізка пад сотку новых магілак. А колькі сот чалавек, параненых пры расстрэле, змагалася са сьмерцю ў больніцах ды ў цёмных катухох-кватэрах, сьціскаючы зубы, шлючы праклёны тым, каму яшчэ зусім нядаўна гатовы былі дараваць за ўсе зьдзекі і няшчасьці, калі пачулі пра даныя свабоды. Палавое неба плакала на хаўтурах. На вуліцах імжыў шэры туман. Цьвёрды брук ня прымаў ужо дажджавых сьлёз, і пакрыўджаныя ручаі цяклі па схонах і рыштакох у каламутную Сьвіслач.

Ціхі і самотны ішоў Арон з пахаваньня. Едкая імга серабрыніла паношаны пінжак, густыя чорныя бровы і халадам дрыготкім, сьцёпкім працінала ўсяго. Арон пахаваў

рукі ў кішэні. Пальцы даткнуліся да тронка маўзэра і сэрца падплыло гневам і жорсткасьцю.

Прышоўшы да кватэры, Арон доўга гаманіў нешта з Аляксеем. Гаманілі яны ўшопат, быццам зычнасьць галасоў паадбірала жалобнае восеньскае надвор'е. Але ў абодвух пахмурна паблісквалі вочы і блеск іх казаў аб цьвёрдай пастанове.

Праз колькі дзён Арон напісаў два лісты і Аляксей узяў іх і занёс на вокзал. Таго-ж дня вагон, што разьяжджаў па справах чыгуначнае забастоўкі, забраў лісты. Забастоўка цяпер ахапіла ўсе чыгункі ўсяе Расійскае імпэрыі. А да яе далучыліся пошта і тэлеграф. Нэрвы краіны затрымцелі ў руках забастоўшчыкаў перад вялікімі гістарычнымі падзеямі. Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў у Пецярбургу— адзіны ўладар па тым часе жыцьця,—быў як магутны волат перад імпэратарскім пігмеем—арлом.

Праз тыдзень стрэлачнік Аляксей прынёс Арону з вокзалу адказ на яго лісты. Ня маючы сілы саўладаць са сваім узбурэньнем, разарваў той конвэрт і прачытаў:

> „Група абясьсілена. Майзэль у турме, друкарня забрана. Ігнась пакуль што хаваецца. Люба на падазрэньні ў поліцыі. Толькі я трымаюся.
>
> Прыяжджай хутчэй. Зброі... зброі прывозь.
>
> *Дуб*".

Здрыгануліся рукі Аронавы. Ліст выпаў і паляцеў, куляючыся на падлогу.

## *ПАСЬЛЯ ЛІНЧАВАГА СУДУ*

ЯШЧЭ не спапялеў Вайніловічаў двор, яшчэ галавенькі курэлі на пажарышчы, благія думкі навейваючы выпадковаму прахожаму, калі стражніцкі атрад з пятнаццацёх чалавек, з панам Вайніловічам пазадзе, наляцеў на Шамкі.

Было гэта ўраніцы. Белы восеньскі марозік іскрыўся ў чырвоным праменьні. Гразь на дарозе падшорхла і пад нагамі цяпер храбусьцела мякка і прыемна. З поўначы ветрык пагойдваў лагодна ўрачыстыя і лятуценныя разам верхавіны пасярэбраных бяроз на ўскраі лесу, што паміж Вайніловічавага двара і Шамкоў выгадна расьцягнуўся на колькі вёрст. Паводдаль, у сярэдзіне лесу, раньні дзяцел голасна дзёўб кару на высокай хвоі, і звонкі лёскат плыў

неяк асабліва выразна і ясна па гулкім марозавым лесе. Дакуль-бы ён дзёўб высокую стромкую красуню-хвою, каб ня енк зямлі пад конскімі падковамі, што пачуўся раптам здалёк. Дзяцел змоўк, перапыніў сваю работу. Падковы ляскацелі ўсё бліжэй ды бліжэй. Тады дзяцел успыхнуў і пераляцеў на ўскрай лесу. Тут сеў на маладую хваінку, пачысьціў дзюбу і зноў застукацеў—раз... два... тры... Але лясная дарога зноў застагнала, заенчыла непадалёку і гул з-пад капытоў конскіх вырваўся з-за павароткі і шырокаю хваляю паплыў па лесе. Спалоханаму дзятлу некалі ўжо было зірнуць і даведацца, якая там небясьпека набліжаецца. Тонкімі пруткімі лапкамі шпарка ён адапхнуўся ад маладое хваінкі і зьнік у глыбіні лесу. На ўскрай выехаў стражніцкі атрад. Журботна зашамцелі вецьцейкам голым у мароз пасярэбраным малачава-бялюткія бярозкі.

Кожная хата ў Шамкох што-небудзь ды ўварвала з панскага двара: ці то збожжа, ці сена, ці дровы з блізкага лесу. А вось ці думалі спажыць усё пазабіранае—наўрад. Пасьля п'янага, бурнага вечара, калі народ, у злосьць уведзены, ня мог раздумваць пра далейшае, з двара хапалася ўсё, што толькі можна было зарваць. На сьметніках ляжалі нядаўна паскіданыя з вазоў сьвежа сьпілаваныя бярозы, грабы, хваі, дубы. У падпавецях стаялі вазы з сенам ці з мяшкамі ўсякага дабра—прыбіраць не сьпяшаліся. Праз усю ноч ішла шпарка работа, толькі напярэдадні паўсыналі людзі, а мо' так крыху замгнулі. І ня спалася, чула сэрца—грубое, мужыцкае, мусіць, блізка бяду-гора.

Вось вылезла за вароты, з двара аднаго барановая шапка, зірнула асьцярожка на бакі і застыла на вуліцы пры плоце. Праз хвіліну недалёка выплішчыўся аблезлы кажушок, падпяразаны конскім путам. Кажушок угледзеў бараеновую шапку, падумаў і накіраваўся да яе. Даўшы адзін аднаму „дзень добры“, пахавалі рукі ў рукавы (мароз узяўся) і больш не азваліся ні словам, памоўклі. Тады з трэцяга двара вылезла сівая барада і, пакрэктваючы, прыдыбала да двух. І ва ўсіх дварох зарыпацелі адны за аднымі вароты, на вуліцу выходзілі мужыкі, зьбіраліся па два, па тры і ці гаманілі скупа, ці зусім маўчалі. Хоць і грубое мужыцкае сэрца, а чуецца, на яго страх, недарэмна-ж ноч была неспакойная такая, дзень-жа—толькі працяг ночы.

Яшчэ ўчора ўвечары вільготны на вуліцы пыл і пясок за ноч у марозе ацьвярдзелі, пазьмярзаліся. Вуліца ляжала гладкая і стыжкая, пахарашэла з марозу, ды быццам званчэй адгуквалася на крокі.

— Зіма прыбіраецца,—сказаў у першай кучцы кажушок.

— Ды чаму-ж... Можна сказаць і пара ўжо,—агукнулася шапка.

І зноў пацiхлі. Якраз пра тое, аб чым хацелася кожнаму ўсчаць гутарку, не маглі загаманіць, бы языкі ўмэнт браліся на прывязь, і таму не маглі выцiснуць слова патрэбнага.

Дзьмухнуў слабенькі ветрык і ціха зазьвiнела мёрзлае вецьце на дрэвах паўз вуліцу. Яснае, але халоднае сонца з-за дрэва праплішчылася і расьсеяла на вуліцы жмені заспаных праменьняў. А кучкі людзей паўнурваліся пры платох і ці не заўважалі ўсяго гэтага, бо маўчалі, ці не хацелі заўважыць. Стыжкая цішыня панавала на вуліцы. Да часу толькі. Навальніцу зьмяняе цішыня, а цішыню навальніца. яна раптам загрымела над Шамкамі так, як ніколі ня было.

У асьветлены чырвоным сонцам канец сяла ўскочыў стражніцкі атрад. Гулкі лёскат паплыў па вуліцы, устрыпянуў паўнурваныя кучкі людзей і прыняў на сябе іхную ўвагу. І як толькі стала відна хто едзе, як другі гул, гул чалавечых галасоў нясьмела прабег паўз платы.

— Сьледзтва едзе...

— Каб яно не даехала!

— Дык-жэ ж...

Каля пярэдніх прыпыніўся стражніцкі атрад, старшы паперадзе загаманіў нешта. Людзі было, відаць, ня вельмі гаваркімі і станавы прыстаў, што прыехаў з атрадам, ужыў стары выспрабаваны мэтод пацягнуць за язык. Сьвіснуў угары гарапнік з дзяржаньнем з казінае ножкі і крык ці мо' толькі ўсяго голас пачуўся адтуль. І тады-ж пачалося. Стражніцкія коні прабралі ў кола мужыкоў—і пачалося, і пачалося.

Дальшыя кучкі пры платох заварушыліся патрывожана.

— Вось табе і сьледзтва,—сказала барановая шапка.

— Сьледзтва,—праз зубы працадзіў кажушок.

— Гора наша.

— Гора—ня сьледзтва.

І заварушыліся, зарыпалі вароты. Як бачыш згалела на вуліцы, усе пахаваліся па прытулках, якога не пасьмее парушыць стражніцкі гарапнік. Ужо зусім няпрыкметна было ўчарашняга ваяўнічага настрою, мо' гэта зорная восеньская ноч нагнала была яго, а з першым чырвоным праменьнем сонца спужаўся ён і зьнік усьлед за ноччу.

А ў сяле сілы было, сілы. Адны бабы з качэргамі маглі-б ня выпусьціць з сяла жывым ніводнага стражніка, а што казаць ужо пра мужчын! На аднаго стражніка прыпала-б

па дзесяць сахароў, а :.а прыстава з панам мо' і па трыццаць. Але-ж пакуль што, не... Усе пахаваліся,—бліжэй да прыпечку—сьмялей.

Прыстаў з панам рызындавалі па вуліцы, дагары нагамі перавярнулі ўсё сяло: гвалтам і сьлязьмі пападплывалі хаты, кроўю пачырваніліся сходцы і сьметнікі.

— А гэта за дровы!

— А гэта за пакоі!

— А гэта за збожжа!

Прыказваў пан пад удары стражніцкіх гарапнікаў. Азьвярыўся прыстаў, пазьвярэлі стражнікі, і было адно крываве жаданьне замест сэрца, жаданьне пасячы на кавалкі разбойцаў і рабаўнікоў панскага дабра, жаданьне пазлупваць на палосы грубую скуру з мужыцкіх плеч, жаданьне ўпіцца крыві тых, што пераступілі за межы закону і панскае ўласнасьці. У сваёй рабоце асьлепленыя—ні стражнікі, ні прыстаў, ні пан Вайніловіч ня ўбачылі, як агародамі, голымі, самотнымі, выладзіўся чалавек. Ішоў ён, туляючыся паўз платы да гумны, пакуль не дайшоў да лагчыны, якою лёгка было прайсьці ў лес ужо незаўважаным з сяла. Пакінуўшы агароды, чалавек дайшоў, азіраючыся, да лагчыны і там бегма пабег к лесу.

Цэлы дзень цяглося сьледзтва ў Шамкох. Ужо стражніцкія гарапнікі быццам натаміліся і прыстаў ім даў адпачынак. Напалоханыя ўзброенаю сілаю, людзі згаджаліся везьці пану ў двор усё пазабіранае ўночы. Хітрымі даліманамі прыстаў хутка дазнаўся ад сялян, хто былі падбухторшчыкамі ў падпале пакояў і рабунку. Для таго ў прыстава быў стары, але выспрабаваны за доўгую практыку паліцэйскае дзейнасьці мэтод.

— А ты нашто падбухторваў?

— Паночку, не, каб мне так да сівога воласу дажыць, што не, няпраўда.

— У астрозе дажывеш да сівога воласу; а цяпер кажы, каго ты ўцёг у падпал!

— Каб мне заўтрашняга дня не дабыць, паночку, калі я гэта рабіў.

— Гэй, ты, ня хлусі мне, бунтар! Ураднік! Прывесьці сюды тых, хто паказвалі на яго, як на падбухторшчыка.

— Паночку, зьлітуйся з няпраўдаю гэтаю! Ды ніколі я ня думаў такі грэх на сваю душу браць.

— Грэх. Я вам задам граху! Ураднік, забраць яго!

— Паночку, зьлітуйся, бяз віны вінаваты я. Паночку, я вось скажу хто быў, і хто дзьверы сек, хто і падпальваў, можа гэта яны падбухторвалі... А я не. Пра мяне ніхто благога слова ня скажа.

Праз такія хітрашчы прыстаў за дзень павылаўляў самых актыўных бунтароў і пад вечар павязаных на хурманках павёз у горад.

Роўма зараўлі бабы і дзеці, заенчыла, застагнала сяло.

Кароткі восеньскі дзень саступаў дарогу ночы. Цьмяны вечар насоўваўся на жалобныя саламяныя стрэхі, на нізкія, трухлявыя загарады, на голыя вулічныя прысады...

Поцемкамі сельскаю вуліцаю ішлі чатыры чалавекі. Рэдка дзе ў хатах гарэлі лучыны, а большасьць акутаны былі яны змрокам і вокны зьліваліся з чорнымі сьценамі. Мужчыны ішлі моўчкі, туляючыся паўз платы. Дайшоўшы да Кузьмовае хаты, яны зьвярнулі ў двор. Пад сенцамі адзін загаманіў:

— Дык заходзьце ў хату, а я пабягу тымчасам.

— Толькі глядзі, каб не абы каго.

— Вядома. Ня турбуйся, каго трэба паклічу. Нябось, ведаю, як сябе, усіх.

— Глядзі адно.

Утрох зайшліся ў хату, а чацьверты зьнік за варотамі на цёмнай вуліцы.

Пад стропам закаташыліся сонныя вераб'і; загаўкаў на канцы недзе сабака і сьціх. У хляве забекала авечка; на яе голас азвалася ў суседа карова, зараўла працяжна, відаць, гаспадар забыўся напаіць, ці мо' гаспадара і дома ня было, а ехаў ён пад вялікаю стражніцкаю вартаю.

Зарыпацеў неўзабаве варотамі і ў хату да Кузьмы прышоў адзін чалавек, потым другі, трэці... Адзін за адным сышліся чалавек дзесяць пацїху—бяз бразку і грукату...

У хаце закурыдымела смаловая лучына. Цьмянае сьвятло зайчыкам прабегла па прысутных, што паселі і пасталі за стол і каля лаваў.

Пазадзе ўсіх прышоў сам гаспадар. Ён завярнуўся каля лучніка, абламаў нагар. Агонь пыхкануў на ўсю хату і асьвятліў у застольлі. Ігнася, Яся і Дуба. Поцемкам гэта іх прывёў з мястэчка Кузьма. Акром іх і хатніх, у хату напрыходзіла чалавек дзесяць Кузьмовых аднасельцаў.

На печы застагнаў стары.

— Цяжка, бацька?—гукнуў да яго Дуб.

— Гэ, дзеткі, просіш часам сьмерці, ды ня ідзе яна, паганая.

— Ну, яшчэ пажыць трэба. І сьмерць, бачыце, спагадвае.

— Ня дай бог, дзеткі, такое спогадзі. Гэта вось, казаўжа я ўчора...

Стары зноў застагнаў, павярнуўся на хату.

— І мы-ж, бацька, казалі, ды не паслухаў народ.

— Дык-жэ ж... Ліхога скарэй паслухае, як добраг
Што чалавек, то і розум.

— Яно мо' і гэтак трохі. Ня верыць чалавек у сілу, во
дзе бяда.

— Эх-ха-хо... маладым казаць можна,—працяг стар
і змоўк.

— На розум пойдзецца, няпраўда,—адгукнуўся адз
з дзядзькоў.

— Дай бог,—пажартаваў Дуб.

— Кепскі розум,—уступіў у гутарку стары з печы.-
Вось, кажуць, забралі сёньня пяцёх, дый ня знайся. Гара
нікам як прыгналі, то пазавозілі ўсё назад пану.

— За дурною галавою ды нагам неспакой.

Гутарка пашырылася, адзін за адным пачыналі гаманіц
і дзядзькі.

— Каб ведаў хто гэтую напасьць.

— Ня трэба слухаць таго, хто частуецца разам гарэлкаю
і за гарэлкаю падбухторвае на дурны бунт,—сказаў з печ
стары.

Дуб устаў з застольля. У нізенькай хатцы ён ледзьве
не дастаў галавою столі. Устаўшы, пасьмяяўся.

— А мо' гэта гарэлка і падбухторыла, што вы думаеце..

— Колькі сілы, і як няма сілы,—адазваўся нехта.

— Чаму няма? Каб пад маю апеку толькі пайшла, уга
што за сіла была-б.

— Трэба ўважаць на тое, што дзеецца ў горадзе,—гаварыў Ігнась.—Вось вам на вока... Пакоі спалілі. Панабіралі дабра, пасеклі лес... А што вышла? Наляцела стражніцкае вараньнё і як плюнуць на ўсё. Ды яшчэ сваімі плячыма заплацілі, а хто мо' і галовамі,—яшчэ невядома. Ня ў тым штука, кажу. Трэба-ж удумацца, што не ў адным пане бяда. Чорт за чортам цягне. Калі пану стала горача, дык, як бачыце, на падмогу прыстаў са стражнікамі. А ўсё чыноўніцтва... Усё адно за аднаго. Пазалетась па нашай губэрні чыноўнікамі на разьезды адны было патрачана столькі грошай, што на іх па цяперашніх цэнах можна-б купіць больш за чатыры тысячы дзесяцін зямлі. А чые гэта грошы?

— Што, мо'-ж казённыя ці панскія.

— Але, калі не забыць, што даў іх казьне ці пану селянін, што з яго лупяць скуру. А гэтае лупенства абараняецца і стражнікамі, і войскам. Вось цяпер бунты пайшлі па ўсёй Расіі. Рабочыя ў гарадох на бой ідуць з паліцыяй і войскам. Вось дзе помач патрэбна! Ня так гэта, як у нас, падпалы рабіць. Часам яно ня вельмі спрыяе. Трэба злучацца адзін з адным, куча з кучаю, сяло з сялом і далей,

каб устаць і рушыць, сапраўды сілаю. І ўжо, калі браць панскае дабро, дык браць і трымаць!.. Вось наехалі стражнікі, а мы ў хату пахаваліся,—ня знойдуць, можа...

Доўга гаварыў Ігнась, потым Дуб і Кузьма з Ясем і ўсе прысутныя. Гутарка цяглася да поўначы.

Пшыкала, дым распусьціла па хаце лучына... Старыя на печы паснулі. А кучка сьмелых людзей вяла бунтарскую размову, за якую кожнаму ўляцела-б калі ня сьмерць, дык глухі халодны Сібір.

## *ПАТАЙНАЯ НАРАДА І РАЗБУРЭНЬНЕ*

ТЫМЧАСАМ як у Шамкох адбываліся грозныя падзеі і расьлі новыя, у горадзе на самай галоўнай вуліцы, пад носам у паліцыі, адбывалася патайная нарада. На нараду сабралася чалавек сем, і невялічкі пакойчык з двума дзьвярыма ледзьве мог зьмясьціць усіх. Шасьцёра сядзела наўкруг стала, а сёмы стаяў ля акна і праз фіранку з фарботаў пазіраў на вуліцу.

Ціхая гутарка ішла ў застольлі, але гутарка ня мела ніякага дачынэньня да таго, навошта пазьбіраліся ўсе сюды. Толькі, калі чуваць быў шолах за сьцяною, усе раптам паварочваліся на дзьверы.

— Аднак-жа яе доўга няма. Каб не засыпалася часам.

— Ня можа быць.

Сіняваты дым кружочкамі ішоў угару ад цыгарак, зьбіраўся ў шызыя хвалі і стаяў над галовамі. На стале попельніца была напоўнена ўжо папяроснымі недакуркамі. Пачак папярос і запалкі ляжалі пры попельніцы. Ужо ня было месца ў ёй, і недакуркі ляцелі далоў і ўсьцілалі падлогу.

— Нарэшце, так ня можна,—азваўся чорны, барадаты, з чорнымі, як вугальлё, вачыма на бледным твары.

— Напэўна засыпалася дзе,—сказаў другі.

— Глупства,—азваўся трэці, што стаяў ля акна,—няма ніякіх прычын,—каб засыпацца.

І паціхлі. Адзін забарабаніў пальцамі па стале, выбіваючы барабанны марш. Барадаты зацягнуўся глыбока і выпусьціў на стол густую хмару папяроснага дыму. Той, што стаяў пры акне, закрыў фіранку і стаў хадзіць па пакоі.

У гэты час на дварэ ляснулі варотцамі брамы і пачуліся лёгкія кароткія крокі. Той, што хадзіў па пакоі, выскачыў за дзьверы. Нехта ўвайшоў знадворку, і тыя самыя лёгкія

крокі падышлі да дзьвярэй у пакой. Усе прысутныя павярнуліся. Вось узяліся за клямку, вось адчыніліся дзьверы і ў пакой увайшла закутаная ў чорны шоўкавы шаль стромкая жанчына.

— Са спазьненьнем, Ларыса...

— Няслаўская... Магу рэкомэндаваць сябе.

Гаворачы, яна адкінула шаль і стала распранаць аксамітавую чорную жакетку, што гэтак ішла ёй да твару.

— Якія навіны?

— Пра тое-ж можам запытацца і ў вас.

— О, я ўпэўнены, што ў мяне іх болей.

— Кажыце.

— Не сьпяшайцеся. Паперад справы, а навіны самі сабою выкрыюцца.

У чорнай аксамітавай сукні, з высокім каўнерыкам, зашпіленым пад барадою, яна была пекнаю і строгаю разам, што гэтак пасавала з пакоем, асобамі і ўсёю нарадаю.

— Тады да справы,—праказаў прыемным грудным голасам чорны барадаты і леваю рукою ўскамлычыў густыя даўно нястрыжаныя валасы.

— Вам крэсла, Ларыса Вадзімаўна.

Ларыса нічога не адказала на паслужлівы рух таго, што сядзеў паблізу, і села да стала. Чарнявы барадач казаў тымчасам:

— У час вялікіх бунтаў на нас ускладаецца чалавецтвам вялікі абавязак і вялікія задачы. Прадстаўнікі монархічнага ладу організуюць крывавыя лазьні бунтарскаму духу. Далоў монархію!—павінцы крыкнуць мы.

— Вам-бы, Шлёнзак, за агітатара згадзіцца ў соцыялдэмократаў,—заўважыў, насупроць што сядзеў, малады хлапец у студэнцкай шапцы.

— Мы і ёсьць агітатары,—за соцыялізм.

— Толькі ня пустымі словамі, а дзеяю.

— Ня трэба замазаць сутнасьці гэтае дзеі, мы проста завем яе тэрорам. Тэрор уладзе! Няхай жыве анархія!

— Шлёнзак, вы не на трыбуне пакуль што,—холадна кінула Ларыса.—Ніхто з вамі асабліва не спрачаецца супроць анархіі і тэрору. Давайма разважаць разумна і практычна.

— Пад кулі прадстаўнікоў монархіі!

— Непапраўны агітатар, вы, Шлёнзак. Зразумейце, што нас агітаваць непатрэбна, і пахавайце вашыя лёзунгі ў кішэню, пакуль ідзе гутарка пра справу.

— Прэч дэспотызм! І вы, Ларыса Вадзімаўна, са сваім характарам таксама ці далёка адышлі ад дэспотызму.

— Закуры лепш,—падсунуў пад яго пачак з цыгаркамі сусед.

Дым густымі хмарамі плаваў над сталом. Пачынала змрочыць. Куты ў пакоі патаналі ў цемры, і людзі, што сядзелі наўкола стала, цьмянелі і зьліваліся ў адну чорную суцэльную гушчу. Толькі ясна паблісквалі агеньчыкі цыгарак.

— Сябры!—неяк дзіўна прагучэла гэтае слова з Ларысіных вуснаў у такой строгай абстаноўцы.

— Браты тэрору!—папраўіў Шлёзнак.

Ларыса нічога не адказала яму, а гаварыла далей:

— Трэба напалохаць, трэба тэрорызаваць і напалохаць апарат прыгнечаньня. Вы пыталіся пра навіны, вось вам навіны. Пазаўчора сяляне ў Шамкох спалілі і разбурылі маёнтак памешчыка Вайніловіча, а сёньня прыстаў трэцяга стану Буракоў на чале стражніцкага атраду ўчыніў гвалт над сялянамі. Вінаватыя і невінаватыя пазрэзваны стражніцкімі гарапнікамі на горкае яблыка. Гэта ня ўсё. Пяцёра галоўных падбухторшчыкаў павязанымі прывезены ў горад і кінуты ў астрог.

— Сьмерць приставу Буракову! Вось наш прысуд.

Ларыса быццам не заўважыла гэтых слоў, яна гаварыла:

— А колькі часу таму назад, дзякуючы шырока разгорнутай сетцы шпіёнажу і провокатарства абясьсілена амаль у горадзе дзейнасьць Бунду і соцыял-дэмократаў, соцыял-дэмократы на падтэрорыстычным становішчы.

— Што гэта за спачуваньне соцыял-дэмократам?—пачуўся голас з цемры.

— Вас яно цікавіць? Калі ласка. Соцыял-дэмократы ня менш за вас змагаюцца за разбурэньне монархічнае дзяржавы і таму нам з імі па шляху і адзін аднаго трэба падтрымліваць.

— Вы часам не прапануеце рэволюцыйнага блёку з соцыял-дэмократамі?—насьмешліва выгукнуў нехта другі пад бокам ужо ў Ларысы.

— Мы змагаемся супроць аднаго і таго-самага ворага, а таму сяброўская дапамога паміж абодвума павінна быць і ў справе...

— Гэта будзе здрадаю чорнаму штандару!

— Гэта будзе здрадаю сваім асабістым і вузка-сэктанскім пераконаньням у імя соцыяльнага вызваленьня чалавецтва.

— Орыгінальна.

— Натуральна—трэ' было сказаць. Бо яно-ж патрабуецца ўсім разьвіцьцём чалавецтва. Хто прыяцель, дык той ня вораг, і з прыяцелем разам трэба рушыць на ворага. Але

бадай гэта ясна і без таго. Усе факты я падала на тое, каб вынесьці наш прысуд катам рэволюцыі.

— Толькі ня ў імя солідарнасьці з соцыял-дэмократамі, гэтымі доктрынёрамі, што прапаведуюць новы прыгнёт на месца старога. Мы прынцыпова ставімся супроць гвалту, супроць усялякіх апаратаў прыгнечаньня чалавека над чалавекам. Прэч уціск!

— Мы сышліся не спрачацца, а вырашаць практычныя задачы, у гэтым мне з вамі па дарозе,—сказала Ларыса.— За свае-ж асабістыя думкі і некаторыя пераконаньні я буду змагацца. Іначай, калі хочаце, мы можам разыйсьціся па розных сьцежках. А цяпер я прапаную даручыць: каму і над кім выканаць наш прысуд.

— Я бяру на сябе прыстава Буракова,—пачуўся з цемры мэталічны голас.

*

ТЭРОРЫСТЫЧНЫЯ замахі ня зусім удаліся: прыстаў трэцяга стану Буракоў, цяжка паранены, быў адратаваны наскочыўшымі стражнікамі, а сам тэрорыст арыштаваны; спраўніку-ж і зусім нічога не зрабілася. Як на зло, рэвольвэр у студэнта два разы ня выстрэліў і студэнт прымушан быў уцячы, каб не папасьці ў рукі гарадавым, што на трывожны голас прысьпелі на дапамогу.

Зараз-жа пасьля гэтых замахаў спраўнік накрэмзаў шыфраваную тэлеграму:

„Жыцьцё чыноў поліцыі, асабліва вышэйшых, у вялікай небясьпецы. Непарадкі ўзмацняюцца і шырацца. Сялянамі сяла Шамкі ледзьве не забіт памешчык Вайніловіч; маёнтак спален, маемасьць расьцягана; лес пасечаны. Узмацняюцца варожыя выступленьні розных рэволюцыйных партый. Пагалоўнага вобыску не магу зрабіць з прычыны малых сіл. Па дагаворнасьці з Воінскім Начальнікам конвойную команду пераводзім на патрульную службу. Пры першай магчымасьці правяду частковыя вобыскі і арышты. Патрабуецца прысылка ўзброенае воінскае сілы“.

Паслаўшы тэлеграму, спраўнік аддаў загад па поліцэйскай варце і ўвечары ўзмоцненыя патрулі пайшлі абыходзіць горад.

А раніцою ўжо ураднік з аднаго патруля рапартаваў спраўніку, што ў раёне яго абходу выкрыта і забрана падпольная друкарня і арыштаваны гаспадар хаты, дзе друкарня месьцілася, рабочы Майзэль.

РОЗНЫЯ трывожныя думкі блудзяць па сьвеце. Чутка, як тая птушка пералётная, сёньня тут, а назаўтра няма ведама дзе. Не прамінулі чуткі і сяла Любінага бацькі. Да чутак далучыліся розныя завугольныя плёткі, прыплётвалі Ігнася і Любу, зноў уводзілі ў вушы Дарошу, як колькі год таму, што „Агапін байструк сыходзіцца з Любаю".

Пачуўшы пра ўсё гэта, Дарош укінуў каня ў аглоблі ды паехаў у Хорашава. Гэта было вёрст з дваццатак ад дому—і Дарош сярдзіта хвастаў канянё, каб шпарчэй бегла. Праз усю дарогу вярзьліся думкі благія, ніяк адчапіцца не хацелі. А перад вачыма стаялі наперамежку то Люба, то Ігнась. Злосьці было ў Дароша ад гэтага, каб прымеў ды ўгібаў у рукі, жыць ужо ня пусьціў-бы.

„Хіба не дажджэ ён. Прыбяруся... Закукуеш там, дзе зязюлі ня кукуюць".

Сырцовую пугаю ўсё сьцёбаў каня, здавалася, лянуецца бегчы ён і пацялепваецца так сабе павольным трухам, як назаўтра трэба. З нецярплівасьці Дарош выцег з-пад пасьцілкі, якою засланы быў зад, саломіну, ухапіў у зубы, пажаваў.

„Закукуеш..."—зноў падумалася і ўсьміхнулася ад таго зласьліваю атрутнаю ўсьмешкаю. Прыпамянуўся наказ ураднікa, што надоечы прыяжджаў з воласьці.

„Бачыш ты, брыда, і ў рэвалюцыянэры дарогу патрапіў. Буза... Як у тым семі,—чысьціш, чысьціш, а яна ўсё адно на другі год тая самая, а то яшчэ і больш. Жывучая, на яе немач".

Ну проста не сядзіцца на возе Дарошу—злосьці поўныя косьці; каб мог, дык за хвіліну стаў-бы ў Хорашаве.

Падрогвалі калёсы новымі шынамі на каменьні, скрыгіталі, як злосьнік, зубамі, западалі ў глыбокія каляіны і выскаквалі напаверх. Ляскацеў пад драбінамі жалезны падгерац, яму ўтурвалі сухія бярозавыя ляскі. Але Дарош ня ўслухоўваўся. Дзьмухнуў халаднаваты вецер і расхлябесьціў апрануты ў рукавы і не зашпілены на гузікі новы даматканы халат з чорнага, як жучок, сукна. Расхлябесьціў, убачыў на грудзёх ясна начышчаны старастаў мэдаль і, збаяўшыся свае сьмеласьці, паімчаў па дарозе. Дарош закінуў крысы халата, паставіў каўнер і завярнуўся ад ветру. Конь бег лёгка па вузкай касой дарозе.

Прыехаўшы, Дарош паставіў у падпавець каня і не апераб іўся з дарогі, з саломінкамі на халаце, зайшоў у школу.

Гэта ўжо ішло на вечар. Люба адвучыла сёньня дзяцей і сама выправілася некуды. Стары, што сустрэў Дароша, папрасіў заходзіць у хату, а хлапчуку загадаў пашукаць настаўніцы.

— А бяжы, ногі маладыя маеш. Распытайся, пашукай... Яшчэ нідзе далёка не магла зайсьці, бо толькі-ж нядаўна дзяцей пусьціла.

Толькі пасьпеў гэта Дарош разгаварыцца са старым, як прышла і Люба.

— А мы ўжо, прабачце, хлапчука паслалі былі шукаць вас. Ну, як-жа, госьць прыехаў, бацька родны.

І стары неўзаметку вылез за дзьверы.

Люба ня ведала, пра што загаманіць з бацькам. Бачыла, што ён не ў сабе нешта і прыехаў не абы толькі прыехаць. Папыталася:

— Як мама?

— Добра... А што ёй зробіцца. Здарова.

Памаўчалі трохі.

— І пачаставаць няма чым, я ўжо папалуднавала.

— За ўсю голаў з пачосткаю,—я ненадоўга, паеду зараз.

Люба нічога не папыталася ў бацькі, і той, паглядзеўшы на дачку, даказаў:

— Сьвет такі настаў... Усё плешчуць бабы языкамі, як палатно тымі пранікамі. Ці то з сябе выхітроўваюць ды вымудроўваюць, ці мо' і праўда ўсё таму.

— Што, тата?

— Ну, ты можа і ня ведаеш. Хто цябе знае... Ня вельмі шчырая ды прыворотная была да бацькоў.

Голас бацькаў прагучэў дакорам Любе. І сказала, каб сапраўды бацька ня думаў пра яе гэтак:

— А можа і не, можа здавалася вам гэтак.

— Дурной авечцы здаецца, а ня мне! Скажы... Дзе гэты... Агапін... Ігнась, байструк гэты?—спатыкаючыся на кожным слове, запытаўся Дарош.

— Чаму гэта цябе цікавасьць узяла пра яго? Я-ж мо' не павінна ведаць дзе ён?

— А што-ж я?... Ня думай сабе таго, хоць ты і не ў мяне жывеш, гэта ўсё адно... ня думай сабе таго, бо ты яшчэ дачка мне пакуль што. І я ў цябе за бацьку і пытаюся.

— А я ня ведаю, і гэтак сама магу папытацца ў вас. Нашто ён вам і ў чым тут я?

— Няма чаго кепікаў строіць з мяне,—скажу я проста... Мне праходу сялом не даюць з табою і з гэтым...

Дарош не даказаў. Быццам вельмі цяжка было яму вымавіць гэтае імя.

— Як і даўней. Дык добра тады была малая і думалася—ат, пазьвягаюць, пазьвягаюць дый пакінуць. Так яно і было. А гэта зноў... А ты-ж не дзяўчынка, дзякаваць богу.

— К чаму ты ўсё горнеш, тата, не разумею я.

— Вядома, ты не разумееш! От добра было-б, каб не разумела. Скажы мне, ты бачыш яго калі?

— Тата, чаго ты прыстаў ка мне з ім гэтак? Ну, а каб і бачылася, дык што тады?

— Што? Поўна што. На сяле і старое, і малое з языка ня спушчае, што ты жывеш з гэтым галапупам!—выгукнуў Дарош, і грудзі ходарам захадзілі пад мэдалем.—Каб да такое ганьбы, да такое няславы дабыць, — яшчэ чаго ня было,—раздумаўшыся нібы, даказаў ціха ён.

— Што-ж я вінавата, калі людзі плявузгаюць абы-што. Навошта-ж ты мяне абіраеш за каго?

— Ня хітруй. Каб ня было нічога, дык нічога і не гаварылі-б. Скажы мне, як праўду, дзе ён? Тут дзе? Скажы... Ты мо' ўсяго і ня ведаеш—пра ўсе справы. Ён-жа там, у горадзе, паступіў у нейкія рыволюцыянэры ці ў дэмократы. Яго шукаюць цяпер. Вось чаму і крыўда ў мяне на цябе. Падумай толькі сама, якаво мне ад усяго гэтага. Старастава дачка зачапілася з нейкім, шануючы царскія портрэты, з самасейкаю, з галузам, чорт ведама з кім.

— Не спавядай мяне, тата. Я яшчэ не зачапілася з ім, як ты кажаш. Але давайма памяркуем па-людзку. Хіба я не магу з кім захачу сябраваць? Хіба мне павінен хто ўказваць? Я-ж сама сабе жыву і наракаць на мяне няма што. А ты вось прыехаў знарок, каб бяз дай прычыны маракаваць.

— Я табе бацька і патрабую, каб ты дала адказ, дзе ён.

— А я кажу, што ня ведаю.

— Відаць. Калі ты гэтакая, то я цябе і знаць ня хочу, і за дачку не прызнаю!—устаў раптам з лаўкі Дарош і надзеў шапку.

— Тата...

— І знаць ня хочу.

Колкі камяк падышоў к горлу ў Любы, але ўраз ацьвярдзела сэрца, запяклося, і яна, ня цямячы, што гаворыць, крыкнула ўдагон бацьку:

— Дык і я ня хочу знаць такога бацькі. І вось знарок на зло табе кажу; ведаю дзе Ігнась і што нават робіць, але-ж не скажу. Не скажу!.. Ты ўжо мо' з ураднікамі зьлізаўся там, дык не, ня будзе таго!

Дарош ня чуў апошніх дачкіных слоў. Унурыўшы галаву, а рукою трымаючы за мэдаль, вышаў ён са школы. Хутка

загрукацела ў двары калясьмі і Дарош паехаў яшчэ сярдзіцейшы, чым прыехаў.

А той, за каго пасварыліся бацька з дачкою, на той час сядзеў у Слаўным у конторы і пісаў аконамскія кнігі. Аконам недзе ў гумне назіраў за малацьбітамі. Пана Няслаўскага няма. Няма і Ларысы. Нудна Ігнасю. Няведамы смутак падкрадаецца пад яго і атручвае кароценькія спакойныя хвілінкі. А што, а чаго гэта так,—ня ведае Ігнась, вось так сабе неяк смутна і неспакойна. Ці гэта падзеі ў Шамкох паўплывалі на яго—гора і сьлёзы сялянскія, ці гэта проста сваё што асабістае. Марудна здагадка паўзе ў зморанай галаве, спрабуе пашукаць гэтае прычыны. І няма яе. Ён адсоўвае ад сябе тоўстыя кнігі, схіляе галаву на рукі і на поўныя вочы глядзіць перад сабою.

На дварэ чуць ціхі ход панскае каламажкі,—нехта прыехаў. Але Ігнась не аддае таму ўвагі. Бяздумнай галаве спакойна, глядзіцца ня думаючы ў адну месьцінку і зірк гэткі дзіўны і зусім нічога ня выказвае. Якая часіна праходзіць, а Ігнась сядзіць і глядзіць у адно, і перамяніцца ня можа яго зірк. Толькі, калі нехта бразнуў клямкаю і адчыніў дзьверы, ён адурбаўся. Прышоў сам Няслаўскі. Ігнась устаў і прывітаўся.

— Нічога, нічога—сядзіце.

Няслаўскі быў узбураны і радасны. На твары ані ценю, ані знаку аб заклапочанасьці. Ён быццам памаладзеў, падрос.

— Кіньце работу, Ігнась, няўжо яшчэ не надакучыла?

— Каб есьці, дык трэба працаваць.

— Філёзофія мудрая, але-ж... Пакіньце работу. Са мною прыехала і Ларыса. Яна напэўна навезла сьвежых навін... А мне аконама трэба пабачыць.

— Я зараз пайду клікну.

— Не, не, ня трэба. Я сам. Ён, відаць, у адрыне... Добра, я сам. А ўжо недалёка і вечар... Кіньце работу, бог з ёю. Сёньня даволі ўжо.

Няслаўскі бадзёраю хадою пайшоў да адрыны. Ігнась паглядзеў яму ўсьлед і паспацыраваў па двары.

„Ларыса прыехала таксама“, падумаў Ігнась. „Апошнімі днямі яе рэдка калі відаць у дварэ. Прыехала... Ну, што-ж такога, няхай сабе прыехала. А можа сапраўды ўгледзець, распытаць, што чутно. Ён-жа гэтак аддаліўся ад жыцьця пасьля ростані з Аронам, асабліва ад гарадзкога. Як там цяпер Майзэль, чыгуначнік? Што параблюць хлопцы ў Зусевай майстэрні?“ І гатовы ўжо зайсьці ў пакой—шукаць Ларысы—ён завярнуўся назад і пайшоў ад пакояў. Але ня даў мо, і пяці крокаў, як убачыў Ларысу.

Яна віхорам выскачыла з пакояў і шпарка-шпарка пайшла да адрыны, насупроць якое стаяў Няслаўскі і гутарыў пра нешта з аконамам. Ігнась стаў, ды так і не крануўся нейкія мо' пяць хвілін,—адбылося нешта ня зусім зразумелае яму.

У горадзе на земскую ўправу Няслаўскаму прышоў ліст па пошце. Ад слоў гэтага ліста знаёмым і любым патыхнула на Няслаўскага, такім любым (даўно прамінулым), што Няслаўскі не саўладаў з радаснаю дрыгодкасьцю, якая раптам запанавала ў ім і прынесла з сабою такое салодкае і маладое адчуваньне. І трохі запяты ўжо часам мінуўшчыны, і трохі забыты ў шпаркай бязе жыцьця, устаў перад вочы жончын вобраз, вобраз пекнае далікатнае жанчыны з далёкага вялікага гораду. Прыпамянулася і апошняя гутарка, калі яна прыяжджала па грошы, каб зноў паехаць ад яго і каб там са сродкамі кінуцца зноў у вір жыцьця, каламутны, агідны. Прыпамянулася, як гаварыла яна, каб ён зрабіўся поэтам, і тады яны сыйдуцца нанаў і пачнуць жыць, як жылі. Усё гэта прыпамянулася Няслаўскаму, чытаючы жончын ліст, і надзеі крохкія і гэткія жаданыя, любыя забралі яго да сябе ў няволю. Ён пакінуў усю работу і з лістом ў руцэ і лятуценнымі думкамі—ружовымі аблачынкамі ў галаве—паволі-паволі пайшоў дадому.

Ларысы ня было. Колькі клопатаў з ёю. Вось ужо колькі дзён ня стыкаецца яна дома. Дзе яна бывае і што робіць—узводзіла Няслаўскага на непажаданую раздуму. Але сёньня, як-бы нават рады быў Няслаўскі, што няма яе, як-бы зусім не хацелася бачыць дачку ў гэткую радасную часіну, поўную самых сьветлых і лёгкіх сардэчных парываньняў пад старасьць год. Распрануўшыся павольна, ён зайшоў у гасьцінную і стаў пахаджваць узад і ўпярод. Далёкія лёгкія думкі Няслаўскага блукалі дзесьці, дзесьці паблізу ад стромкае, прывабнае жанчыны ў шаўковай накідцы, паблізу ад яе.

Доўга хадзіў Няслаўскі па пакоі, то прыціскаючы ліст да сэрца, то перачытваючы, то цалуючы яго і прытым забываючы пра ўсю тую крыўду, што зрабіла яму гэтая прывабная жанчына. Не пачуў ён, як па калідоры прайшоў нехта. Не пачуў, як прачыніліся дзьверы. Толькі, калі ўвайшла Ларыса, ён працьверазеў і перад дачкою засароме́ўся раптам і барджэй схаваў ліст у кішэню. Ларыса моўчкі прайшла паўз яго і села на канапе. Была яна невясёлая, задуменная. Пахмуры цянёк бегаў і хаваўся па твары, бы ў хаванкі гуляў з некім.

— Ларыса. Паедзем, дачушка, у Слаўнае. (Ён даўно ўжо ласкава гэтак, як некалі з маленькай, гаварыў з ёю). Мне гэтак захацелася ў сваё роднае Слаўнае.

— Напраўду?—ня ўдумваючыся ў бацькавы словы, папталася яна.

— Цэлую-ж зіму давядзецца прападаць у горадзе. А зімы хочацца зьезьдзіць. Давай паедзем. Я загадаю...

— Пачакай... Ці... няхай сабе, загадвай.

Даччын настрой і думкі былі ня тымі, што ў бацькі былі яны нейкімі самотнымі, тужлівымі — можа яны гэ ў хаванкі гулялі на твары Ларысіным.

— Я скажу, каб запрэглі коні,—ня ўважыўшы на Ларыс і тое, як яна гаворыць, сказаў, завярнуўшыся Няслаўс і той-жа час вышаў.

Ларыса ўпусьціла галаву на рукі. І ня відаць был думае яна што ці не. ці мо' перажывае якую вяліку жыцьцёвую трагедыю. Яна нядоўга гэтак сядзела. Пакул прышоў бацька, яна рашуча ўзьняла галаву, устала. І воч бліснулі гэткім знаёмым у ёй зеленаватым агеньчыкам—х лодным, варожым. Але калі прышоў назад бацька, ды ск заў апранацца і ўхутвацца цёпла, паказала сябе зусім звы чайнаю, як-быццам нічога і не адбылася ў яе на сэрц Жыцьцёвыя буры пахаваліся недзе ў душэўнай глыбіні, д маланкі-бліскавіцы ў вачох пазьнікалі, і цень ад капялюшык які надзявала яна, пасобіў таму, каб ня прыкмеціў Няслаўск

Прыехаўшы ў Слаўнае, Няслаўскі, як малады, зусі малады хлопец, узьбег на другі паверх. У сваёй спальн ён зачыніў дзьверы, падышоў да ложка і спыніўся, раптам задумаўшыся. Адале выняў той самы ліст, пацалаваў, і дру гою рукою пацягнуў за вяровачку, што зьвісала ад цьмяна залацістае драпіроўкі з сьцяны. Драпіроўка пазьбіралас ў пышныя складачкі—на сьцяне адкрыўся портрэт, мабыц той самы, што некалі бачыла Люба ў Ларысінай спальні.

Воч адарваць ня мог, здаецца, ад яго Няслаўскі. Ён упойваў свой зірк у пекны, бялюткі твар, у гордыя бровы у капрысна пастаўленыя вусны. Узбунтавалася кроў старая ў жылах. Стаў ён на калены перад портрэтам. Працёг да яго рукі, бы просячы чагосьці. Зірк запаліўся агнём маладосьці—і стух. Няслаўскі перажываў сардэчную драму.

Устаў-такі потым і, ня скідаючы паліта, бадзёрым крокам вышаў з пакояў, пагаманіў з Ігнасём у конторы і накіраваўся да аконама.

Тымчасам Ларыса аглядала пакоі. Задуменная, можа нават маркотная, абыходзіла яна іх адзін па адным і трапіла ў бацькаву спальню. І адразу ўгледзела ліст на падлозе, а пасьля і адапяты портрэт і зразумела. Падняла ліст. Пачала чытаць. Сьціснуліся вусны. Адале жорсткая ўсьмешка расчапіла іх. Не дачытала. Пабегла сьледам за бацькам.

Тады на дварэ ўбачыў Ларысу Ігнась. Убачыў, як яна падбегла да бацькі, як Няслаўскі завярнуўся плячыма да аконама і той адступіўся ад іх. Бачыў, што сярдзітая гутарка ўсчалася ў бацькі з дачкою.

— Ты ня зробіш гэтага. Чуеш? Ты не дазволіш ёй прыехаць!

— Ларыса... Я бацька табе і гаспадар гэтага двара. Я маю права распарадкавацца, як сам захачу ўсім. І ты мне не дакучай.

— Пасьля таго, як яна круцілася з кім хацела... Тата! Пасьля, таго, як яна брыдзіла сьветам, ты ёй дазволіш—не! Я не дазволю!

— Ня крычы, Ларыса... Я... Я... Калі ты будзеш гаварыць мне так... Я цябе праганю адгэтуль! Ідзі ў сьвет, ідзі куды хоч, адно ня бунтуй ты мяне, дай мне спакойна дабыць старасьці.

— Якія малюпасеньскія, якія нявінныя жаданьні. За соцыяліста яшчэ лічыцца. Крычаць буду!.. Назнарок буду крычаць, каб чулі ўсе, што ты за бацька, каб ведалі, што ты за адзін. А прагнаць мяне... Глядзі!..

Ліст, што трымала яна ў руках, паляцеў на дробныя-драбнюсенькія шматочкі. Няслаўскі нібы адзеравянеў і ня мог крануць з месца.

— Глядзі... Вось гэтак будзе ёй і табе, калі ты толькі наможашся прывесьці яе сюды.

Няслаўскі ня зрушыў, каб адабраць ліст, дарагі ліст ад дарагое жанчыны, што цалаваў нядаўна яшчэ яго з такою палкасьцю. Быццам зачараваны даччынымі словамі, ці мо' больш яе рашучасьцю, стаяў і глядзеў, як ляцяць пад ногі Ларысе белыя шматочкі паперы і як яна топча іх нагамі і прыказвае:

— Вось гэтак будзе! Вось гэтак!

## «АД ВЕКУ МЫ СПАЛІ»

За якіх два дні ўся соцыял-дэмократычная група ў павеце ведала пра падзеі ў горадзе, пра правал друкарні, пра тое, як засыпаўся Майзэль. Першым вястуном, што паведаміў пра ўсё, была Ларыса Няслаўская. Яна таго-ж дня, прыехаўшы з гораду, паклікала Ігнася і расказала яму, што адбылося. Толькі ні слова не ўспамянула пра тыя прычыны, што падштурхнулі гэтыя падзеі. Ігнасю-ж на першым часе было не да роспытаў.

У Дуба сабраліся рэшткі комітэту: сам Дуб ды Ігнась, стрэлачніка ня было як прызваць. Комітэтам вырашылі сабраць усе сілы і рынуць на горад, увечары, калі сон прыходзіць да змораных за дзень воч ці надасьветкам, калі асабліва моцна сьпіцца. Ці рана ці ўвечары зрабіць напад—пакажа надалей. А тымчасам напісалі ліст, Дуб падпісаў і з пэўным чалавекам паслалі на вокзал. На трэці дзень чытаў яго ўжо Арон.

Усе гэтыя дні было пахмурнае восеньскае надвор'е. Першыя марозікі пазьядаліся едкімі восеньскімі туманамі. Ляжалі самотна гразкія дарогі. Глыбокія каляіны чарнелі калдобінамі. А самотныя шэрыя і цьмяныя палі наабапал гэткія ціхія і няпрыветлыя. І куды толькі ня зірні, усюды шыр бяскрайняя і далячынь пустая—вокам ня сьцяць, не ахапіць позіркам. І такое нуды наганяюць гэтыя бяскрайныя шырокія палі і самота такая находзіць. Ні гуку, ні шолпату. Не шамаціць паўбіватае з большага ў зямлю і размочанае дажджамі іржышча. Так ціха, ані жывога голасу, быццам з гэтага гаротнага краю пассылалі куды ўсё жывое і адных палеткаў не зачапілі, і ляжаць цяпер яны забытыя, ціхія, няжывыя быццам. Хмары плаваюць нізка-нізка, пазьліваліся з серабрыстаю густою імгою, і не адгадаць—дзе імга, а дзе хмары.

Па сьлізкай дарозе ішоў шпарка Дуб. Ён размахваў шырока рукамі, унурыўшы галаву, раз-по-разу пасьлізаўся. Каб ня ўпасьці, шырока ўзмахваў рукамі, адзержваўся і зноў ішоў, ішоў датуль, пакуль з-за ўзгорку ня вылезла Слаўнае. Тады ён стаў, пастаяў крыху, памацаў па кішэнях і ў запазусе, падумаў і збочыў у двор. У двары ён, не раздумваючы, проста ўзяў на контору.

У конторы было са тры парабкі. Як толькі Дуб увайшоў, яны паціхлі і глянулі на Ігнася. Той не падаў знаку, што ён у гэтым што якое разумее. Дуб схапіў усё ўраз адным зіркам, быстрым, нядоўгім і разжаліўся раптам:

— Зрабеце ласку, браточкі... Дзе я магу пабачыць пана?

— Сябруеш хіба з ім?—кпліва азваўся адзін парабак.

— Бог крый. Хіба-ж пану такіх, як сам, няма. Мы што... мы толькі тутэйшыя, іхныя нібы. Ну і дзела тут ад сяла, тымчасам. З дзелам прышоў—да пана. То дзе я пабачыць магу яго?

— Хадзем. Я завяду,—сказаў Ігнась.

Зайшоўшы за будыніну, Дуб ураз сагнаў з сабе вымушаную прыніжанасьць і хутка праказаў.

— Ліст ад Арона... Сёньня прыяжджае.... з прыпасамі.

І, сказаўшы, напрудзіўся ўвесь; жылы на руках павыступалі, здаецца, як вяроўкі. Ён быў сапраўды, як той дуб.

— Добра. Ты ідзі. Я цябе за дваром даганю,—адказаў Ігнась і вярнуўся ў контору.

Там не забавіўся. Пакуль Дуб, выходзячы ў прысады адганяўся ад дворных сабак, Ігнась зьбегаў у пакоі і на тым-жа часе пайшоў сьледам за Дубам.

Дуб шлэпаў цяжкімі ботамі, пырскі гразі ляцелі з-пад ботаў на бакі. Быў ён вялікі і нязграбны на сьлізкай чорнай дарозе. За прысадамі Ігнась дагнаў яго.

— Ясь прывядзе трыццаць чалавек.

— Назначыў дзе спыніцца?

— За старым валам, насупроць вокзалу.

Галасы іх глыталіся шэраю імгою, танулі ў ёй, а ногі хлюпацелі па гразі неяк зусім глуха, невыразна.

— Ты пойдзеш на вокзал... А я забягу ў Зусеву майстэрню, калі ўдасца. Ды каб не спазьніліся яны.

— Ня спозьняцца. Недзе ідуць ужо.

Сказаўшы гэтых колькі скупых слоў, Ігнась задумаўся. Няпрыветлая, глухая наўкола бяскрайная шыр. Едкая, сіверкая восеньская імга ліпне да твару.

Пад паўдня стаў відаць горад. Замурзаны, запырсканы, ляжаў ён у сярэдзіне невясёлых мокрых палеткаў ды паплавоў. Чорным дахам нахмурваліся нявысокія домікі і ад таго былі яшчэ, здаецца, меншымі.

У Ігнася затрыпятала сэрца з нейкае цьмянае радасьці. Адно па адным успаміналася даўнейшае. І раптам туга падкралася і гострае джала ўсадзіла ў кволае цела радасьці. Арон...

„Арон... Арон...“—трыпяталася бяз сілы думка, разрываючы на шматкі крохкую радасьць.

— Дык я пайду.

„Хто гэта гаворыць?“—падумаў Ігнась.

— Дык я пайду,—зноў перараказаў той самы голас, і Ігнась толькі тады ўцяміў, што гэта сказаў Дуб.

— Ідзі. Я бавіцца ня буду. Моцi выйдзе што,—прашаптаў сам сабе.

Але Дуб ня чуў. Цяжкімі ботамі ён хлюпацеў па глыбокіх лужах на выгане, каб паадмываць гразь, што напрыліпала за дарогу.

Ігнась зайшоўся з крывенькага гразкага завулку. Нічога не зьмянілася быццам за гэтыя часы, што ён ня быў тут. Глухімі завулкамі дабраўся ён да Школьнага пляцу. З пяць фурманак сялянскіх стаялі ў гразі па калодкі. Павыпрэганыя коні паўтыкалі морды ў пiхцяры з шорсткім сенам.

Ігнась збочыў на Калясьніцкую вуліцу. Упёрадзе ішоў хлопец, вельмі падобны хадою да Арона. Такі самы манэр ступаць, таксама трымае галаву, крыху сагнуўшыся

адна рука ў кішэні. Захацелася крыкнуць Ігнасю, чамусьці падумалася, што гэта Арон. Але той-жа час хлапец азірнуўся, і Ігнась убачыў, што гэта не Арон. Заламаўшы на Цагельную вуліцу, на якой была Зусева майстэрня, Ігнась ледзьве стрымаў радасны голас, што гатовы быў вылецець з грудзей. Яму насустрач ішоў Майзэль.

— Вось дык не чакаў... Здароў, Майзэль, здароў!

— І я таксама. Бачыш... З турмы толькі што.

— Выпусьцілі?—радасна гледзячы ў твар Мазэлю, пытаўся Ігнась. На сэрцы ў яго палегчала ўраз, туга-задума адляцела і не зьвярнулася.

— Як я рад, Майзэль!..

Ідучы ўпоравень з Майзэлем, Ігнась пачаў расказваць яму пра свае сёньняшнія пляны. Той слухаў і нэрваваў, як і заўсёды.

— Толькі, каб Арон прыехаў. Эх, і нарабілі-ж бы работы!

— Ша... Наробім!.. Наробім!.. — нэрваваўся Майзэль. — Я зараз пайду на бровар. У паравікі пашлю хлопцаў. Я ўзьніму масы... Паглядзіш!

Бадзёры і радасны разышоўся Ігнась з Майзэлем.

„Узьняць масы“, успамянуў Майзэлевы словы Ігнась. „Калі яны гэта зробяць, тады посьпех будзе пэўны. Вось толькі Арона-б сюды... Арона“.

Забыўшы пра ўсе перасьцярогі, Ігнась ішоў, не хаваючыся, проста ў Зусеву майстэрню.

Не зважаючы на хмурнае надвор'е, горад ажываў, сьмялеў. Сюд-туд на вуліцах зьбіраліся ў кучкі людзі, моладзь большаю часткаю. Зьбіраліся, гаманілі пра нешта. Калі праходзіў Ігнась, яны змаўкалі на хвіліну. Трапляліся дзе-ні-дзе рабочыя, вучні. Побач з зашмальцаванаю сьлясарскаю тужуркаю—сівое гімназійнае паліто ці чорныя гузікі павятоўца. Горад рыхтаваўся нешта рабіць.

Радаснымі воклічамі сустрэлі Ігнася ў мастэрні. Усе пакідалі работу (Зуся ня было якраз) і акружылі Ігнася. Гэтак рады былі яму. Паперад за ўсіх падышлі Цімох з Яўхімам.

— Зусім хацеў пакінуць нас, хлапец,—казаў з дакорам Цімох.—Ну, але як прышоў, дык хоць даруй вазьмі табе.

Радасна-напружаны настрой запанаваў у майстэрні.

— Нудна было без цябе з Аронам,—сказаў тымчасам Яўхім.—Ведаеш-жа, як у нас.

Калі прамінула першая частка сустрэчы і Ігнась пасьпеў сказаць кожнаму па слову, рабочыя пасталі зноў на работу. Цімаху з Яўхімам Ігнась ушопат загадаў нешта, ад чаго твары ў іх пасьвятлелі і самі яны парабіліся гэткімі бадзёрымі, як і Ігнась.

— Дык глядзіце-ж...—сказаў ім ящчэ Ігнась.—Я пайду на вокзал.

Жуханьне гараноў ды скрыгат напільнікаў і лёскат малатkoў праводзіў яго з майстэрні.

Быццам не заўважаў ніхто Ігнася, усё адно як-бы справы нікому ня было да яго. Па адным, па два на рагох вуліц стаяць гарадавыя. Аднекуль здалёк, відаць, трухам праехалі тры стражнікі. Коні ўсе ў белым шумавіньні, даўгія крысы стражніцкіх шынэляў пазапырскваліся рэдкаю гразёю. Прамаршыраваў вайсковы патруль з салдатаў конвойнае каманды. Салдацікі нейкія шэранькія, як і іхныя шынэлі, шапкі-бесказыркі пассоўваны на адно вуха ва ўсіх, як у аднаго, нешта цьмяна-зухаватае спрабуючы надаць бязвусым сухарлявым тварам.

За кароценькі час, што пабыў у горадзе, Ігнась ужо абыраў і зусім забыўся немаль пра свой небясьпечны прыход сюды. Быццам гэта ён некалі даўно-даўно і ідзе гуляць к Любе. Не агледзеў, калі прышоў на вокзал.

У цесным пакойчыку трэцяй клясы з флегматычнай сялянскай спакойнасьцю сядзелі на лаўцы Дуб з Ясем. Маўчалі, зрэдку толькі выцэджваючы пару скупых слоў. Ігнась не падышоў пад іх. Прайшоўшы разы са два ўзад і ўперад ён вышаў на двор.

На пэроне, як і ў вокзале, было зусім мала людзей. Маладзенькая дзяўчынка са старым-сівым бацькам ці дзедам, падобным да чыноўніцкае сям'і, назіраюць нецярпліва ў той канец, адкуль маецца прыехаць поезд. Сям-там праходзяць чыгуначнікі, неахвотна, павольна. Патайныя супярэчныя думкі вычытаць можна на тварах з панасупванымі брывамі. Па рэйках перайшоў з сьцяжкамі ў руцэ камітэтчык соцыялдэмократ Стрэлка. Ігнась падаўся пад яго, але Стрэлка не заглядзеў ці не хацеў бачыць Ігнася і прамінуў. З дзьвярэй тэлеграфу вытыцнуўся чыгуначны жандар, пастаяў, паглядзеў і зноў схаваўся за дзьверы. Дзьве бабы-мяшчанкі з абаранкамі і пернікамі ў кошыках прыцягліся з суседніх хатак, паселі пад плотам на лавачцы. Паіржавелыя рэйкі, як дзьве прасьценкія вузенькія каляіны, беглі далёка ў абодва канцы і там хаваліся ў шэраватых заломах.

Мо' чвэртку, мо' паўгадзіны чакаў Ігнась. Зашумелі прывокзальныя клясы—шугануў нямоцны вецер. Дзяжурны па станцыі вышаў на пэрон, паглядзеў удаль, прамармытаў:

— Дваццаць хвілін, як вышаў, з Абочыны, а і дасюль няма. Мо' зноў забастоўка.

— Што вы мусілі сказаць,—як з зямлі выскачыўшы, закруцілася каля начальніка несамавітага колеру паліто з насунутаю на вочы кепкаю.

— Ды вось, кажу, што вы колькі часу траціце бяз толку, чакаючы на гэты поезд, а ён ня ідзе нешта.

— Колькі ў вас клопату аб нас.

— Мы павінны клапаціцца аб сваіх пасажырах.

— Вы думаеце?—скрывілася паліто і нездаволенае адышлося ад дзяжурнага.

— Архангел...—прашаптаў той і энэргічна сплюнуў набок.

Недзе далёка прагула цягніковая сырэна. Потым пачулася роўнае ляскацень не колаў па рэйках, а сталёвыя звонкія рэйкі адгукнуліся ім, загулі-засьпявалі сваю сталёвую песьню.

Ігнасю захацелася раптам ірвануцца і пабегчы, колькі сілы ёсьць, насустарч поезду. Паўз яго прайшоў Ясь, пагля дзеў асабліва выразна і, сьмешна пераступаючы нагамі па рэйках, выбраўся насупроць і зьнік за будынінаю. Ігнась азірнуўся. Дуб стаяў пазадзе ў яго і таксама пазіраў туды, куды і ўсе. А паіржавелыя рэйкі гучна вялі сваю звонкую сталёвую песьню. Занудзіліся былі ўжо па ёй за колькі дзён, што баставалі чыгуначнікі, дык цяпер на ўвесь голас сьпяваюць-гудуць і быццам здаволіцца насьпявацца ня могуць.

Нарэшце, з-за повараткі вынырнуў замурзаны чорны цягнік і кароткі ланцуг вагонаў вылецеў за ім. Цяжка адсопваючыся, ён падышоў павольна і спыніўся якраз насупроць вокзальнае будыніны. Ігнась з надзеяю абягаў вачыма вокны зялёных вагонаў. Вылазілі пасажыры, а таго, каго чакаў ён, ня было. І загарэўшаяся была надзея пачала патухаць і расплывацца ў няпрыемным расчараваньні. Але потым імгненна вялізнаю іскраю выбухла яна і разгарэлася радасьцю сустрэчы. І не патухла. Ігнась ірвануўся і як ня бегма кінуўся пад выйсьце з вагону. Па дарозе ён штурхнуў якогась чалавека ў паліце і той кінуў усьлед яму лаянку; але Ігнась не пачуў. На пэрон вылез з чамаданам у руцэ Арон.

Абняліся, пацалаваліся моцна, як два добрых браты. Паціснулі моцна адзін-аднаму рукі. Мо' з радасьці не маглі на першым часе вымавіць слова. Адале Арон абазваўся.

— Ну, вось зноў разам.

— Як здароў?

— Здароў, што мне зробіцца.

Ён узяў свой чамадан. Чамадан, відаць, быў цяжкі, бо Арон пахіліўся на другі бок. Раптам ззаду зласьлівы шалпаткі голас:

— Цяжкаваты чамаданчык? Дазвольце пасобіць.

Хлопцы азірнуліся. І ўваччу ў іх замітусілася, закруцілася. Усьлед за шалпаткім прагрымеў другі цьвёрды голас:

— А гэта бачыў гнюс!..

Цяжкі кулак ахнуў па галаве яму. Той самы ў паліце і ў кепцы, што гутарыў з дзяжурным па станцыі, недарэчна

ўзмахнуў рукамі і рухнуў на пэрон. Дуб (гэта яго быў другі голас) ухапіў Аронаў чамадан, махнуў на сябе рукою і кінуўся ў аббег поезда. Арон з Ігнасём сьледам за ім. Перабегшы за рэйкі, усе трое зьніклі ў тым баку, дзе цяг стары гарадзкі вал, былая старасьвецкая крэпасная сьцяна.

А на вокзале закрычалі галасы, узьбегліся жандары. Станцыйнага дзяжурнага, што зьбіраўся даць тры званкі, адціснулі ад званка, затрымалі поезд. У жандарскі пакой, сплёўваючы са сьлінаю кроў, прасунуўся той у паліце з кепкаю.

*

ЗАХОДНІ вецер разганяў валавяныя хмары, разрываў на кавалкі, расьсейваў па імжавым цьмяным кругавідзе. Серабрыстая імга перастала цярусіць. Абветрывалі мокрыя дахі дамоў. Пабліскваў шчарбаты брук—вада ад ранішняга дажджу пасьцякала ў шчэрбіны і не пасьпела ўвайсьці ўзямлю.

Па вуліцы прайшло некалькі чалавек рабочых. Твары заклапочаныя, імкненьне ў кроках, у руханьні. Перад кравецкаю майстэрняю з гучнаю назваю на шыльдзе „Варшаўская" яны прыпыніліся. Зайшлі.

— Дзе гаспадар?

— Я—пашыць хацелі што?

— Комітэт соцыял-дэмократычнае організацыі загадаў зачыніць усе майстэрні і крамы. Забастоўка і дэмонстрацыя. Разумееш? Зачыняй.

— Зараз зачыню.

— Зараз-жа.

І два рабочых крануліся зноў у абход па сваім раёне, зачыняючы майстэрні, крамы, апавяшчаючы народ аб дэмонстрацыі. Нагэтулькі дысцыплінаваны ўжо стаў гарадзкі мяшканец, што ўсьлед двум рабочым ніякага не пасылалася протэсту, а прадпрыемствы той-жа час пакідалі работу і замыкаліся на замкі. На вуліцах зьбіраліся кучы народу, і ці то стаялі, уважна прыслухоўваючыся да нечага, ці павольна пахаджвалі ўзад і ўперад па гразкіх дзеравяных тротуарах. Нечага чакалі ці на нешта спадзяваліся. У самай сярэдзіне гораду, дзе асабліва густа назьбіралася людзей, гарадавы, не адыходзячы ад свае будкі, узяў у рот сьвісьцельнік і даў два рэзкіх абрыўчатых сьвісткі. Суседні гарадавы адклікнуўся. Таго падтрымаў трэці, і гэтак па ўсім горадзе прагучэлі трывожныя сьвісткі. А народ зьбіраўся. Гоман і бурчэньне людзкіх галасоў зьлівалася ў жывыя шумлівыя патокі.

У двух ці трох розных мясьцінах гораду на ўскраінах пачуліся рэволюцыйныя песьні. Час за часам усё бліжэй

ды бліжэй. Наперадзе па галоўнай вуліцы сьпявалі марсэльезу. Адважнаю рашучасьцю, сьмеласьцю, моцаю і жаданьнем змагацца, біцца да канца, гучэлі словы песьні:

...Мы пошлём всем злодеям проклятье...
...На борьбу мы его позовём...

Управа недзе некалькі маладых моцных галасоў засьпявалі „Варшавянку".

У другім паверсе аднаго дому, на гукі мусіць, прачынілася акно і высунулася кучаравая галава маладое дзяўчыны. З-за яе паказаліся дзьве хлапечыя галавы. І тады гэта самае акно адклікнулася на сьпевы па горадзе бунтарскім маршам анархістаў...

Гарадавы зноў даў трывожныя сьвісткі. То сюд, то туд на яго адказвалі, але ўстрывожанасьць іхняя гублялася пад напорыстымі ваяўнічымі гукамі ад сьпеваў, што з усіх канцоў ішлі к сярэдзіне. Гарадавыя ўжо ўсім сваім выглядам паказвалі на трывогу, якая зьбіраецца густою цёмнаю хмараю над горадам, над іхнымі паласатымі будкамі.

Нехта недзе выстраліў. За ім пратрашчэлі яшчэ стрэлы два—і перасьціхла. Ад старога валу выбухлі раптам невядомыя рэволюцыйным масам дасюль гукі,—сумнае і ўпартае ў той-жа самы час па сваіх рашучых і бязьлітасных намерах песьні:

Ад веку мы спалі і нас разбудзілі,
Сказалі, што трэба рабіць...
Што трэба свабоды, зямлі чалавеку,
Што трэба зладзеяў пабіць...

Нязьмернае гора спакутаванага прыгнечанага сялянства, што скутку дасюль ня бачыла нідзе для сябе, шырокаю ракою помсты і барацьбы вылівалася ў простых бяз хітрасьці словах. Доўгавечны сялянскі флегматызм і пакора разарваліся праблескам рэволюцыйнага змаганьня. Ніхто ня ведаў, хто і дзе склаў гэтую песьню, ніхто ня ведаў, хто першы прасьпяваў яе. Організавана-ж ідучы стройным натоўпам ад старога валу, засьпявалі яе хлопцы з атраду Дуба.

І страх, і тугу несьлі бязьлітасныя галасы са сьпевамі тым, пра каго гаварылася ў іх, каго на бой, крывавы і сьмяротны выклікалі, пачуўшы сваю сілу.

На бой! На бой!.. На бой!
Уставай, народ-тытан!

Бегма прабег галоўнаю вуліцаю атрад гарадавых. Трывожныя сьвісткі не пакідалі спалохана перамаўляцца адзін з адным.

Гарадзкі абыватаць, сьмелы хіба толькі ў сваім уласным доме, дый то з зачыненымі акяніцамі, пачынаў хваляваца і абывацельскіх нэрваў дакранулася напружанасьць абста-

ноўкі, і яго ўкалола ў жывое рашучасьць таго, што адбываецца перад яго ўласным носам. Тротуары і брук усыпаліся людзьмі. Гэтыя людзі стаялі, глядзелі, слухалі, хадзілі, гаварылі палахліва ці з надзеяй пра нешта адзін аднаму, нечага апасваліся, чагосьці баяліся, і часам сэрца хавалася ў такі, ім адным вядомы, патайны куток.

Тыя-ж два рабочыя, што загадвалі ад імя комітэту соцыял-дэмократаў зачыняць майстэрні і крамы, хадзілі па сваім раёне ўпрутна, не абмінаючы ніводнага, зачынялі ўсе прадпрыемствы і гандлёвыя ўстановы. На дарозе ім стаяла клясычная мужчынская гімназія. Свабодамысьліва настроеныя гімназісты якраз былі патрэбны цяпер на вуліцы. Рабочыя ткнуліся ў парадны ўваход, але дарогу ім загарадзілі некалькі гострых, славаю пакрытых на палёх вулічных боек, слаўных рускіх штыхоў.

— Назад! За пяць крокаў не падыходзь! Калоць будзем!

Рабочыя адступіліся.

Тымчасам у канец вуліцы вышла група дэмонстрантаў. Сьпяваючы песьні, яна шпарка падыходзіла пад гімназію. Трохі не падпусьціўшы да гімназіі, два рабочых спаткалі дэмонстрацыю, нешта сказалі пярэднім дэмонстрантам. Пярэднія шпарка пераказалі заднім і праз дзьве хвіліны ўся група ведала, што гімназійнае начальства ня пушчае на вуліцу гімназістаў, што іх пазамыкалі ў сярэдзіне, а знадворку пры ўсіх дзьвярах пасталі ўзброеныя салдаты з каравульнае команды. Тады нехта з дэмонстрацыі крыкнуў маладым звонкім голасам „ура!". Усьлед за ім дэмонстранты пачалі падкідаць угору шапкі і крычаць.

— Далоў монархісцкае начальства!

— Далоў самадзяржаўе!

— Грамадзяне-гімназісты!..—закрычаў зноў той самы звонкі голас.—Біце вокны! Зрывайце дзьверы! Увесь народ вышаў сёньня на вуліцу. Народ вышаў на барацьбу! Мы чакаем вас. Ура!

Дзесяткі галасоў падхапілі, і моцнае „ура" сваім маладым энтузыязмам, мусіць, дайшло праз тоўстыя гімназійныя сьцены да тых, хто там сядзеў. У першым паверсе прачынілася крыху фортка, і ў яе прасунулася галава з рыжымі вусамі.

— Раю разыйсьціся. Іначай я загадаю салдатам і гарадавым страляць.

Фортка зачынілася, і форменная шапка з паліцэйскаю цэшкаю схавалася зноў.

— Страляйце!—закрычалі з натоўпу.—А мы ўсё адно ня пойдзем!

Чалавек дзесяць ці пятнаццаць адчайных сьмяльцоў разам з двума рабочымі паразьбягаліся па суседніх дварох

і адтуль папралазілі ў гімназійны двор. Пасыпаўся звон разьбітых шыб. Шум і грукатня пачуліся з гімназіі. Натоўп з вуліцы прыступіўся к параднаму ўваходу. Але раптам, як-бы па чыёй камандзе, салдаты падвялі да плячэй вінтоўкі і далі ўгору залп. Натоўп адступіўся. У гэты час пачалі зьбягацца тыя дэманстранты, што пралезьлі ў гімназійны двор. Чалавек пятнаццаць ці дваццаць гімназістаў—хто ў шапцы, а хто бяз шынэлі—папрыбягалі разам з імі. Зьбегляцоў віталі радаснымі крыкамі „ура!“, зноў кідалі ўгору шапкі, а потым усе натоўпам накіраваліся далей.

Тое-ж самае адбылося каля гарадзкога вучылішча. І там вайсковы патруль ахоўваў уваходы і выхады з вучылішча, але частцы вучняў удалося ўцячы і далучыцца да дэманстрантаў.

Па адным і густымі дэманстрацыямі сыходзіліся людзі на Рыначны пляц, дзе ўжо з даліжану зрабілі трыбуну, павыпрагаўшы, як бачыш, коні і павысаджваўшы пасажыраў. Паўсюды чутны былі рэвалюцыйныя крыкі:

— Далоў самадзяржаўе!

— Далоў рускую канстытуцыю!

— Няхай жыве дэмократычная рэспубліка!

Толькі гэта загаварыў з трыбуны першы прамоўца, як раптам зазванілі на званіцы ў саборы. Пасьля да натоўпу падышоў протоярэй Ферапонтаў.

— Брація! І ўвесь чэсны народ! Гэта бясоўскае наваджэньне. Антыхрыст ублытвае вас у бунт. Устрымайцеся, у імя ўнікненьня інапляменных раздораў. І бяз гэтага спрэчкі паміж хрысьціянскім і яўрэйскім насяленьнем распальваюцца, што больш няма куды. Розныя хуліцелі царскага дому і сквернасловы толькі набліжаюць час крывавых сутычак...

— Прэч, прадажны поп!

— Папы ды жандары—адна немач!—закрычалі бліжэйшыя з натоўпу. Дальшыя ня чулі. Ужо другі прамоўца зьлез з даліжану.

— Чуеце, веруючыя. Чуеце, праваслаўныя,—паспрабаваў быў загаманіць протоярэй.—Божая цэркаў заклікае на малітву...

— Вон адгэтуль, Юда народу рускага!—крыкнуў нехта. Кулакі з пагрозаю падняліся, кіямі замахнуліся...

— Хрыстапрадаўцы,—прабубніў пад нос протоярэй.—Хрыста з божым памазаньнікам на зямлі жыдом прадаеце. Пакаецеся. Мор, глад, плач і сьцянанія нашле гасподзь бог у вобразе верных слуг сваіх. Пакаецеся.

Гэтых слоў яго ня чуў ніхто, ён казаў іх сам сабе, бо дзьве ці тры тысячы натоўпу слухалі Арона.

Два чырвоныя сьцягі ўзьвіліся па-над мітынгам каля самае трыбуны. Ярка-чырвоныя палотнішчы падхапіў вецер, распрастаў, пачаў паласкаць у паветры.

— Цар са сваімі дармаедамі страляе народ за тое, што ён хоча жыцьця і свабоды. Гэтак пастрэлены нядаўна мірны народ у Менску. Ня верце ў царовы маніфэсты, якімі ўрад хоча ўмалёкаць рэволюцыйны народ. Монархія добраахвотна не саступіць з свайго месца для народу. Разам з маніфэстамі-абяцанкамі ў народ пасылаюцца кулі. Сьмерць цараты! Далоў констытуцыю! Няхай жыве народная дэмократычная рэспубліка!

Потым ужо натоўп пачаў разыходзіцца ў свае дэманстрацыйныя колёны, калі з двух розных канцоў вышла і выехала па атраду гарадавых і стражнікаў. У стражнікаў паблісквалі голыя шашкі. Гарадавыя трымалі рукі на кабурах рэвольвэраў.

Перад стражніцкі атрад выехаў трушком памочнік спраўніка. Конь ткнуўся мордаю ў жывыя шэрагі. Нейк дзіўна дрыготкім голасам, мо' гэта ад спалоху, памочнік загадаў натоўпу разыйсьціся. Гладкі конь скакаў пад ім, лез на людзі. Ужо пярэднія шэрагі адступілі і націснулі на заднія. Яшчэ хвіліна—і можа нарабіцца паніка. Тады пачуўся на ўвесь пляц грамавы Дубаў голас:

— Ня сходзьце! Стойце на месцы!

Пасьля гэтых слоў дружыньнікі з яго атраду папраціскаліся на край.

Натоўп стаяў моўчкі. Памочнік спраўніка яшчэ раз загадаў разыйсьціся і, калі яго не паслухалі, рукою ў белай пальчатцы махнуў стражнікам. Разгорнутым фронтам пачалі наяжджаць яны, падганяючы коні на трух.

— Назад!—прагрымеў зноў Дубаў голас так моцна, што стражніцкі конь, што быў ад яго ў адным кроку, спалохаўся, кінуўся ў бок. Дружыньнікі стаялі з рэвольвэрамі напагатоў. Праляскацела некалькі стрэлаў. Пара коняй упудзілася і паімчала сваіх ездакоў узад. Рэшта стражнікаў стараліся паўкладваць шашкі ў ножны і ўзяцца за вінтоўкі.

Страшная крывавая справа мусіла адбыцца праз якую хвіліну ці дзьве. Узбадзёраны першаю няўдачаю ў стражнікаў, натоўп пасьмялеў. Усе, што мелі пры сабе хоць якую зброю, цiснуліся наперад і станавіліся ў баявыя шэрагі дружыньнікаў.

І ў гэты момант адбылося зусім неспадзяванае для дэманстрантаў. На другім канцы пляцу зазьвінелі шыбы, загрукалі каменьнямі і сякерамі ў дзьверы нейкія падазроныя людзі. Неўзабаве загаласілі жанчыны і дзеці ў яўрэйскіх дамох.

— Пагром!—пракацілася па натоўпе з тысячы галасоў густое рэха.

Шум, гвалт, крыкі ўспырхнулі над нядаўным мітынгам, і ўсе, хто куды, адзін цераз аднаго, сыпнулі бараніцца ад здрадніцкага ворага ў адзіночку, каля свайго дому, каля свае сям'і. Дружыньнікі далі расстроены залп па стражніках і рассыпаліся ў розныя бакі. Пахіснуліся чырвоныя сьцягі, схіліліся, зьніклі ў зьбянтэжаным натоўпе.

Але ліха, што раптам наляцела на дэманстрантаў, ня ўсё яшчэ было. Вялікія выспрабаваньні давалі гэтыя цяжкія хвіліны зьняволенаму народу.

З галоўнае вуліцы шпаркім маршам выбегла паўрота салдат. Яна толькі сёньня прысьпела ў горад, вось толькі што, яшчэ мусіць ня ведалі ні стражнікі, ні гарадавыя. Гэта была тая самая вайсковая падмога, якое прасіў у начальства павятовы спраўнік. І яна прысьпела ўчас.

На хаду пярэднія шэрагі далі адзін залп угору, другі пусьцілі паверху, а трэці ў самую масу людзей, у жывую масу людзей, якія ўцякалі па хатах, дзе, можа, маглі знайсьці сабе ратунак. Некалькі чалавек упала адразу.

Стражнікі пусьцілі чвалам коні даганяць уцекачоў. У руках у іх былі гострыя шашкі і цяжкія сырычаныя канчукі з валавянымі лапаткамі.

## *МІР І ВАЙНА Ў НЯСЛАЎСКІХ*

ПАСЬЛЯ жончынага ліста ў Няслаўскага з дачкою нямала было сутычак і замірэньняў. І калі сам Няслаўскі, часта адчуваючы сябе нібы паміж кавадлам і молатам, прыпамінаў свае палітычныя прынцыпы, тады цьмяная аблачынка наплывала на асабістыя сардэчныя пачуцьці, і тады ён падпадаў неяк пад даччын уплыў—і рабілася замірэньне. Гэта часьцей было тады, калі Ларыса была на воку праз цэлыя дні, калі аднэй прысутнасьцю сваёю наводзіла Няслаўскага на ўспаміны зусім пра іншае, чымся яго сардэчныя парываньні пад старасьць. А як толькі зьнікала яна, не сказаўшы ні слова бацьку—куды і чаго ідзе, што вельмі часта рабіла, і як толькі замятаўся сьлед яе ног у доме, Няслаўскага спакусьліва і неадчэпна цягло да сваіх супярэчных жаданьняў, да зьдзяйсьненьня намераў, што вабілі да сябе цені з мінулага. Ад нажа хацелася Няслаўскаму ў такія хвіліны апынуцца дзе на незалюдненай высьпе сучасным Робінзонам

разам з павабнаю падарожніцаю яго жыцьця, з далёкаю цяпер Дораю. Ах, колькі ціхага шчасьця нарабілася-б у яго перасьпелым жыцьці, колькі бязутрымнае радасьці выпіў-бы ён з палюбоўных келіхаў гэтага шчасьця! Чужая нага ня ступала-б у яе сьляды, чужое вока зайдзросна ня зрывала-б найтонкіх узораў з адданага яму цела. Ён стаў-бы раманістам, не—поэтам, лірыкам, каб уславіць цудоўнае злучэньне цудоўных формаў жанчыны з раскошнай прыродай дзікае выспы. Ці—не. Ён радаваўся-б вызваленьню свайму разам з каханай з няволі разбэшчанай людзкой умоўнасьці, ён у думках складаў-бы высока-ўрачыстыя оды велічнай пекнаце жанчыны, ці—яшчэ лепш—на струнах свайго сэрца браў-бы мінорныя акорды і маліўся-б да яе, ёй і да яе. Намеры яго ў такія хвіліны цьвярдзелі і ўмацоўваліся, сілы ня было адарвацца ці прагнаць спакусьлівы жаночы вобраз, атулены ў тропічную расьліннасьць, на фоне сакаўное лапушыстае прыроды пад гарачым тропічным сонцам. Трацілася ўся разважлівасьць, недзе далёка блукалі пасірочаныя жыцьцёвыя прынцыпы. Сэрца... У грудзёх непамерна ад неаб'ёмнага пачуцьця выростала трыпяткая радасьць. І ўжо не пакідалася месца і часу на супярэчныя думкі, халодна-варожага голасу сумленьня ня чуваць рабілася. Ён падаваўся на волю стыхіі, плыў па сонечна-ясных ласкавых хвалях сардэчнага мора. Такое хвіліны аднойчы, неўзабаве па першай сварцы з дачкою, напісаў ён ліст-адказ, ліст—палкую просьбу, маленьне. І чакаць стаў.

А грозныя падзеі выбухалі то сюд, то туд. Няўдалаю сутычкаю дэмонстрантаў з паліцыяй і войскам у горадзе не абышлося. Па ўсім краі, як і па ўсёй Расіі, бушавалі хвалі рэволюцыі. Політычная забастоўка, абвешчаная Пецярбургскім саветам рабочых дэпутатаў, забастоўка пошты і тэлеграфу ў Фінляндыі, ваенны бунт у Кіеве, паўстаньне ў Чорнаморскім флёце ішлі адно за адным. Усё гэта вымушала Няслаўскага хваравіта гостра сачыць за рэволюцыйнымі падзеямі, і балюча сьціскалася ў яго сэрца, калі новыя і новыя выбухі там ці тут дарэшты намагаліся зьнішчыць яго трывожны спакой. Неакуратна пачала хадзіць пошта. Няслаўскі напераменку жыў то ў горадзе, то ў Слаўным.

Надоечы (Ларысы ня было дома) на шляху невядома хто ў чатырох мясьцінах пасьпільваў уночы тэлеграфныя слупы. Гэтае-ж самае ночы экспропрыятары зрабілі напад на гарадзкую пошту, а недалёка пры мястэчку абрабавалі акцызьніка. У двух ці трох дварох рэволюцыйнымі сялянамі пазабірана са стагоў сена. Няслаўскаму ўжо дакладваў аконам, што пачынаюць секчы лес, але ён адмахнуўся, як ад нечага зусім староньняга і непатрэбнага, што гэтак не

пасуе яго думкам-жаданьням, яго марам, надзеям. Але тымчасам аконамава паведамленьне такі раздурбала яго трохі. Спакой парушаўся дарэшты, пахмурыя думкі пачыналі апаноўваць. І не заўважыў Няслаўскі, што апынуўся на няпэўным і сьлізкім раздарожжы.

Па справе з акцызьнікам і аб сьпілаваных слупох на шляху выяжджаў прыстаў з ураднікам і пяцьма стражнікамі. Ці можа таму, што Слаўнае пры самым шляху, ці таму, што Няслаўскаму пагаманіць захацелася раптам з жывым чалавекам, ён убачыў у двары прыстава. А там, пэўная рэч, як госьця, які карыстаецца вялікаю пашанаю ў паноў, запрасіў у пакоі. Там доўга гаманілі пра сучасныя падзеі, пра моц дзяржавы, пра другое ліхалецьце для вялікае магутнае Расіі. Прыстаў пачаставаўся на дарогу і сабраўся ехаць на суседнія сёлы. Няслаўскі правёў яго з пакояў аж на двор. Гутарка з прыставам яшчэ больш узмацніла яго трывогу. Ці дойдзе ліст яго па адрасе, ці не загіне дзе ў дарозе? А калі і дойдзе, ці здолее прыехаць яна—жывою, здаровую—па варожа настроенай чыгунцы, сутыкаючыся з людзьмі другога, варожага лягеру? Сумненьні расьлі і шырыліся. Надзеі патаналі ў бязьлітаснай сапраўднасьці.

У гэты час, як прыстаў разьвітаўся і садзіўся на каня, з конторы вышаў Ігнась. Мо' яму трэ' было па якой справе ў пакоі ці ён проста так вышаў, толькі, убачыўшы ўзброеных паліцэйскіх, ледзь не перадумаў і не вярнуўся назад у контору. Але гэта магло-б навесьці на падазроныя думкі недаверлівых паліцэйскіх, і ён прайшоў паўз іх і зьнік у пакоях.

— Пане Няслаўскі, гэта ваш работнік? — запытаўся прыстаў.

— Мой дзелавод і бухгальтар.

— Глядзіце за ім. Напэўна, атручаны гэтаю рэвалюцыйнаю атрутаю. Паўз самых прайшоў і не аддаў доўгу далікатнасьці. Не паважае далжнасных асоб. Назірайце за ім. Я калі-небудзь заеду, каб бліжэй пазнаёміцца з ім, а цяпер няма часу. Назірайце... раю, у вашых-жа інтарэсах,—падкрэсьліў апошнія словы прыстаў і сьцебануў гарапнікам каня.

Паліцэйскі атрад зьнік на шляху ў лагчыне.

Дзень за днём міналіся, адыходзіла да мінуўшчыны, а небыт Няслаўскаму як прышоў, дык так і ня мінаўся. Ён зрабіўся недаверлівым да работнікаў. З Ігнасём не гаварыў ласкава, як раней, не вяшчаў добрае будучыні. Словы прыстава пра Ігнася гучэлі перасьцярогаю Няслаўскаму. Але часамі не пакідаў ён яшчэ змагацца з самім сабою.

На такую хвіліну прысьпеў раз з гораду Іваніцкі. Прывезла яго з сабою Ларыса. Прыездам Іваніцкага Нясла̄ўскі ня зьдзівіўся, ужо поўна часу прайшло, як яны бачыліся і гутарылі пра свае палітычныя справы. Доўга яны былі ня зьвязаны адзін з адным, нібыта пагневаўшыся за вошта. А ўсю работу, відаць, цягнуў Іваніцкі са сваімі хлапцамі, бо Няслаўскі больш дбаў аб тым, каб адвесьці вочы паліцыі ад свае прыкметнае асобы. Цяпер Іваніцкаму, мусіць, спатрэбілася параіцца з Няслаўскім, з ласкі на пацеху ня было-б чаго марнаваць дарэмна час, а мо' і яшчэ што.

Няслаўскі нібыта зарадаваўся, як убачыў Іваніцкага. Твар яго праясьнеў крыху, загладзіліся зморшчкі, і радасная ўсьмешка паспрабавала спагадаць з Іваніцкага. Потым на тым-жа часе супярэчныя адчуваньні завалодалі ім, і Няслаўскі памыкаўся ўжо, каб не паказаць свае няветласьці Іваніцкаму. Той, бадай, і не заўважыў.

— Забыліся пра нас, дзядзька Няслаўскі.

— Прабачайце... Садзіцеся, калі ласка, седзячы лепш гаварыць.

— Важныя справы, бачыце, і я прыехаў зусім на мала. Ці ведаеце, бунты пагражаюць зацягнуцца на поўна часу. Пашыраюць сваю дзейнасьць соцыял-дэмократы і Бунд, узбуджаюць нацыянальную сьвядомасьць сваіх груповак. А мы вось... Што мы пасьпелі зрабіць у сваёй старонцы, сярод свайго паняволенага народу? Мы мала што зрабілі, пра нас мала ведаюць. За нас робяць сваю работу розныя соцыял-дэмократы, анархісты, тэрорысты. Усе яны за гаспадароў у нас, а мы—як тыя госьці, і гэта ў сваёй уласнай хаце.

— У вас дарэмна ўсё гэтак пахмурна малюецца. Цяпер часіна такая, другое ліхалецьце, як сказаў адзін чалавек.

— Але-ж гэтае ліхалецьце нам да рукі павінна быць, а выходзіць іначай.

— Я не сказаў-бы.

— Дзядзька Няслаўскі! Я разумею, вы ня хочаце прызнаць нашае слабасьці і скідаеце віну на нейкія вонкавыя прычыны. Дык ці варта? Калі так, дык мы-ж павінны перамагчы яе, з новымі сіламі ўзяўшыся засяваць сваім насеньнем родную беларускую ніўку. Я разумею, вам ня хочацца чуць балючыя горныя словы сапраўднасьці і ўзбадзёрыць хочаце мяне і ўвесь наш гурток.

Няслаўскі думаў тымчасам: няўжо ён сапраўды такое глупства сказаў, што абнадзеіў Іваніцкага,—ён гэтага зусім ня меўся рабіць. Паказаць, што на яго ня вельмі павінны пакладацца ў рабоце гуртка, вось чаго дамагаўся ён, кажучы Іваніцкаму пра пахмурнасьць і часы ліхалецьця.

А той узяў ды перакруціў на свой манэр і зразумеў на карысьць палітычнае рэпутацыі Няслаўскага, як грамадаўца. Надсьміхаецца лёс. Гаворыш супроць, а становіцца якраз на тым самым, супроць чаго гаварыў.

— Даруйце мне, я цяпер зусім няздольны рабіць хоць абы-што. Нядужыцца нешта. А апошнім часам за мною ўважна наглядае паліцыя. Вось тымі днямі заяжджаў прыстаў з стражнікамі. Нібыта так сабе заехаў, але-ж я добра ведаю чаго. Цікавяцца, вынюхваюць. Дык я і кажу, не спадзявайцеся на мяне. І без мяне, старога, ня горш управіцеся. А калі толькі будзе можна, дык я накажу. Мы яшчэ папрацуем тады.

Пасьля гутаркі Іваніцкі праверыў, як выканаў сваю задачу, прыехаўшы да Няслаўскага і, праверыўшы, змушаны быў прызнацца сабе, што лепш-бы і не прыяжджаць. Няслаўскі, відавочна, хацеў адрэкціся ад усіх спраў па арганізацыі. Гэты вывад быў надта сьмелы, каб сказаць так пра Няслаўскага. Іваніцкі перадумаў і, перадумаўшы, адкінуў. Колькі сілы аддаў Няслаўскі ўжо на арганізаваньне і наладжваньне работы, а колькі грошай утахціў—не!—гэты вывад не пасуе з Няслаўскім. Іваніцкі тут-жа забыўся пра свае сумненьні і паехаў з Слаўнага на панскіх конях ужо з лёгкім сэрцам і бяз тых чорных думак, з якімі ехаў сюды.

Ларыса чула ўсю размову Іваніцкага з бацькам. Як гаварыў бацька, яе карціла падыйсьці і сказаць едкае якое слова, але заміж таго стаяла моўчкі ў акне і глядзела на двор, на сумны восеньскі пэйзаж. Толькі, як паехаў Іваніцкі і бацька вярнуўся і сеў на тое самае крэсла, сядзеў на якім размаўляючы з госьцем, яна адступілася ад вакна, загаманіла:

— Канцы вашым утопіям, тата?

Пагардаю здаліся Няслаўскаму даччыны словы, і ў ваччу ў яе ён убачыў той зеленаваты блеск, што заўсёды зьяўляецца ў іх, калі Ларыса ледзь-ледзь не дае вырвацца на двор сваім абурлівым думкам і абразе.

— Ты зноў пра сваё, Ларыса,—утомна сказаў Няслаўскі.— Колькі разоў я прасіў цябе не парушаць майго спакою.

— Праўда, я і забылася зусім... Дайце спакой соцыялісту, дайце яму ўтуліцца, схавацца ў сваю асабістую шалупайку, ня трывожце яго.

— Твае колкасьці, Лара, мяне ня ўзбураюць.

— Соцыялістаў у бэгемотавай скуры нашыя словы ня ўколюць, пра тое мы ведаем.

— Лара, дарэмна ты ганіш мяне. Я павінен зазначыць толькі, што і той лад, які быў у нашым доме дасюль, што і той лад загінуў.

— Ї зусім непатрэбен. Жыцьцё не стаіць на адным месцы ўнурыўшыся, а бурлівіць і шпарка бяжыць наперад. Праўда, ня кожны бачыць гэта, а можа і ня кожнаму патрэбна бачыць.

— Дарэмна, Лара... Я зусім нядужы. Ня кідайся асою ў вочы... дай мне спачынак.

— Не чапайце рэвалюцыянэраў—рэвалюцыянэры адпачываюць,—гіроніяй і пагардаю разам прагучэлі яе словы Няслаўскаму.—Добра, тата, я буду паслушнаю дачкою. Паглядзімо, што з таго выдзе.

Паставіўшыся горда, з пачуцьцём веры ў сябе, у свае маладыя сілы, Ларыса пакінула бацьку аднаго ў пакоі.

Няслаўскі ўпусьціў галаву на грудзі.

*

БРАЛАСЯ добра на зіму.

Мароз ужо не адпушчаў праз цэлыя дні. Зьлёталіся на сёлы бяздомныя птушкі. Нанач мацнеў мароз, высыпалі на цёмнасіняе неба ясьнюткія зоркі. Сіверыла. Зьбіраліся палавыя хмары, засьцілалі зыркае высокае неба, адпіналася пудлівае сонца.

І вось як нападаў першы сьнег, дык і зіма стала як сьлед. Усё навокал паўбіралася ў белыя зімовыя кашулі. І аднастайнасьцю пазірала ўсё, і слухаць хацелася роўнае і тонкае парыпваньне пад нагамі сьнегу. Гэтыя рыпы ўсё адно, як тая музыка. Ішоў-бы нямаведама ў якую далячынь і слухаў-бы, не пакідаў, як рыпаціць сухі сьнег.

З прыходам зімы нібы аціхла на павеце. Уздыхнулася лёгка на нейкі час паном. Праўда, поцемкам таксама рыпацелі палазы пры лясох, як увосень браскацелі калёсы, дычуць быў, як і раней, танклявы звон пілак. Лёскат сякер утураваў ім.

Паспакайнела быццам на сэрцы і ў Няслаўскага. Цішэй зрабілася ў пакоях, аціхла наўкола. Але гэта здавалася толькі так. Ня можа супакоіцца жыцьцё, калі квасьнуць у ім ды бродзяць патайныя ўнутраныя сілы. І неўзабаве ў Няслаўскіх закруцілася жыцьцё калаўроткам, і падзеі паставілі дубана ўсю яго спадманную цішыню і спакой. Гэтыя падзеі сьпелі здаўна і цяпер час быў ім ужо дасьпець.

З гораду прывезьлі аднойчы тэлеграму Няслаўскаму. Здрыгануліся ў яго рукі, ледзьве дачытаў. Непаслухмянымі пальцамі ўзяў свае зімовае хутра, апрануўся, зашпільваючы праз пяты ў дзесяты гузікі. Надзеў смушкавую шапку і, не сказаўшы ні слова Ларысе, паехаў у горад. І радасьць і спалох адначасна былі на твары ў яго.

Ларыса нудзілася адна. Паспрабавала была ўзяцца за кніжку—ня чыталася. Кінула. Паклікала пакаёўку.

— Стасечка, пайдзі ў контору і пакліч Ігнася.

— Добра, паненка.

Паслухмяная Стася завярнулася і паваротка вышла. Але неўзабаве прышла назад і адказала, што Ігнась вельмі заняты з работаю, мо' праз паўгадзіну якую зьявіцца.

Нездавальненьне на твары ў Ларысы прамільгнулася. Правяла грабушком па бліскучых валасох, паправіла куклу і падступілася к акну. Глядзела моўчкі, бяздумна на двор, на сьнег, сьнег і сьнег, што апрануў у сябе зямлю, куды ні зірнуць.

Пачынала зьмяркацца. Міргливыя поцемкі з кутоў выступалі на пакой, заваёўвалі слабую рэштку цьмянага сьвятла. Вось зараз скарыцца адно, а другое пераможцам стане сьвяткаваць прыход свае ўлады.

Ларыса пакінула глядзець на двор. Паклікала зноў Стасю і сказала запаліць лямпу. Парожна і адзінотна было ў старых старасьвецкіх пакоях. Нуда апавівала сэрца Ларысе туга па нечым сьветлым, прыгожым.

Ігнась прышоў.

— Вы гукалі мяне, Ларыса Вадзімаўна?

— Кіньце сваю офіцыйнасьць, Ігнась, яна не патрэбна.

— Пры маім становішчы ўсё патрэбна і ўсё дазваляецца.

— Вось як?

— Але. Наймiт з гаспадаром павінен трымацца, як наймiт.

— Ігнась... Навошта гэтыя колкія балючыя словы. Я не гаспадар і вы ня... ня наймiт мне. Я сама...

— Што?

— Нічога. Я сама ня ведаю, што і да чаго гавару.

Спачуваньне заварушылася ў Ігнасёвым сэрцы.

— Даруйце, калі можа пакрыўдзіў.

— Ды не... Няма завошта дараваць. Мяне ня ўбыло ад вашых слоў, Ігнась!.. Я ўзьбілася цяпер на нейкае раздарожжа, блукаю-блукаю і ніяк патрапіць не магу на сваю сьцежку... хоць-бы на сьцежку.

— З жыцьцём трэба больш быць, з народам. Зразумейце яго, увайдзіце ў народныя масы і вы... патрапіце тады на сваю сьцежку.

— Бяз сьмеху? Вы гэта сур'ёзна сказалі?

— Прыгнечаны ня мае правоў, каб сьмяяцца... або плакаць, або сумаваць. Яшчэ марыць можна ўпотайку, так, каб вушы ня чулі, пра што шэпчуць вусны. Дык вось тады вы знойдзеце сваю сьцежку. Толькі не сваю асабістую, а агульную для ўсіх тых, пра якіх я баяў вам.

Падапёршы галаву далоняю рукі, Ларыса слухала яго, і думкі—матылькі лятуценныя—мільгацелі на гладкім, простым ілбе яе.

— Праўда, трэба знайсьці сваю сьцежку, бо без яе як бяз ног, як у паветры... Няма куды падацца, куды ні кінься, усюды адно і тое самае.

— Вось я раю вам, калі мае парады можна прыняць вам.

— А вы як мысьліце?

— Ня ведаю... Не. Думаю, што можаце, але потым самі будзеце бачыць.

— Праўда. Я ня ведаю, што са мною робіцца. Расклеілася ўшчэнт і сама ня цямлю, пра што кажу. Дзякую. Раскажыце, Ігнась... Мне хочацца ведаць ад вас, што адбылося ў горадзе тады, на дэманстрацыі.

Спахмурнеў Ігнась, утоіўся ў думкі.

— Раскажыце, мне гэтак трэба ведаць. А то я толькі адным вухам чула, дый то ня ўсё.

Разабраўся Ігнась са сваімі думкамі, адказаў:

— Добра, я раскажу.

У самы гэты час з калідору пачулася вазяніна, тупат, моцныя галасы. Ларыса раптам зьбялела, адале пачырванела, і потым краска зноў зьбегла з твару. У вачох адблясквалі зеленаватыя агеньчыкі. Яна ўстала.

— Прабачце... Нам ужо перашкодзілі.

Ігнась зьдзівіўся раптоўнай перамене, якая адбылася з Ларысаю. Ён даў „дабранач" і зьвярнуўся пайсьці, калі галасы падышлі да дзьвярэй. Ручка ў дзьвярах павярнулася—адчынілі. Увайшоў Няслаўскі з тэю паняю, што некалі раз бачыў Ігнась на вуліцы з Ларысаю, калі ішоў да Любы. Даўшы ход ім, Ігнась адступіўся за дзьверы і пасьпяшыў барджджэй пакінуць пакоі і замкнуцца ў сваёй конторы.

Але хоць і хутка ўцёк ён, а пані з Няслаўскім убачылі яго. Пані правяла яго высокамерным позіркам і падышла да Ларысы. Як шалёнае, калацілася сэрца ў Няслаўскага, вось-вось гатовае выскачыць з грудзей і разарвацца на кавалачкі.

— Ну, пацалуй мяне, дачка мая,—сказала прыемным грудным голасам прыгожая пані ў дарагім хутры. Яна яшчэ не распранулася з дарогі і разам з тонкім араматам духоў і дарагое парфумы ўнесла з сабою ў пакой сьвежасьць марозу і подыхі сіверу.

— У мяне няма маткі!—рэзка адказала Ларыса і зьняважліва павярнулася бокам да яе.

Слабы енк з грудзей у Няслаўскага вырваўся, толькі яго не пачулі ні маці, ні дачка.

— Ларыса!—такім кволым і такім хваравітым голасам усклікнуў ён.

Маці-ж аглелзела дачку з галавы да ног, і зірк яе быў халодны і чужы, такі зірк бывае ў людзей, калі паміж іх паўстае ўладная варожасьць, і сказала:

— Ну, што-ж, Вадзім Пятровіч?..

Няслаўскі не крануўся з месца, вочы яго выказалі поўную зьбянтэжанасьць і неразьбярыху.

— Я ўтраціла сваю дачку.

— Добра... Ня трэба так. Ня трэба...

— Забаяліся праўды?! Праўда ў вочы коле? Праўды палохацца ня трэба, Вадзім Пятровіч.

Ларыса не варухнулася, як устыла.

— Вадзім Пятровіч, з якога гэта часу да вашае дачкі пачалі цягацца розныя людзі з вуліцы? Хто ён?

— Вы ня маеце ніякага моральнага права гаварыць пра яго так!—крыкнула раптам Ларыса і нэрвоваю хадою падышла да акна, прытулілася ілбом к халоднай шыбе.

— Гэта што яшчэ значыць?—пыталася жанчына, і дэспатычны жорсткі тон голасу калоў іголкамі ў сэрца Няслаўскаму.—Хто ён такі, Вадзім Пятровіч?

— Гэта мой конторскі рахункавод.

— Ага-а-а! Ларыса Вадзімаўна заводзіць знаёмства з людзкім атрэп'ем. Хадзем, Вадзім Пятровіч,—і памятайце, каб я больш ня бачыла яго ў Слаўным.

— Дора...—праказаў Няслаўскі (яе загад патрапіў на самыя патайныя яго пачуцьці і хваравітыя жаданьні, сказаў якраз пра тое, аб чым ён думаў усе гэтыя дні). „Спакою... Спакою... Адхланку",—прамільгала ў зьбянтэжаных думках яго. „Спакою".

— Пасобце мне распрануцца,—закамандавала жанчына.—Я пайду ў свой пакой, мне трэба адпачыць пасьля дарогі. Лепш памерці, чымся ехаць цяперашнім часам. Няшчасная Расія!..

— Гэта вы... Вы самі няшчасныя!—кінула, адварочваючыся ад акна, Ларыса.—У сваёй сьлепаце вы ня хочаце бачыць, што жыцьцё вырасла, ня хочаце бачыць, што яно паломіць і пакрышыць ушчэнт тыя рамкі, у якія ўставілі яго і хочуць трымаць дасюль. Гэты час настане. І вы, што зьбіваеце гэтыя спарахнелыя рамкі цьвічкамі свае сьлепаты, і вы загінеце разам з імі, калі не паразумнееце. Вам, відаць, мала яшчэ, як прыкладаў, французскіх рэвалюцый. Памятайце! Рэвалюцыя ня ведае літасьці. Гільётына заплаціць за шыбеніцу!

— Дачушка, дзіцяці не да твару разважаць пра такія рэчы пры старэйшых,––насьмешліва праказала маці і вышла.

Няслаўскі сам не ў сабе пайшоў сьледам за ёю.

Ларыса засталася адна. Пальцы правае рукі яе шпаркашпарка камячылі рукаў на левай руцэ, а зірк патануў у ёй аднэй толькі вядомай бяскрайнай далячыні. Вочы ўтаропіліся бяз сэнсу кудысьці, куды—ім мо' і самім невядома

## У БЕЛЫ СЬВЕТ, ЯК У КАПЕЙКУ

ІГНАСЬ сядзеў у конторы і старанна ўпісваў грубыя кнігі, літаркі і лічбіны. Трывожнае жыцьцё, няўдачы за апошні час свой знак пакінулі на яго твары. Ён неяк пасталеў, узмужнеў, нават вырас, мо' таму, што худзейшы зрабіўся. Патанчэў, і ад таго шырокія плечы здаваліся яшчэ шыршымі. Вочы быццам паўпадвалі, а бровы трохі пачарнелі і ніжэй пазьвісалі на вочы.

Надакучае Ігнасю сядзець за нізенькім столікам і пэцкаць сабе пальцы ў атрамант. Ня прывык ён да конторскае работы—не яго работа. З цэпам ці з сякераю на што ўжо цяжка, а куды лепш было-б за гэтае пэцканьне чыстых конторскіх кніг. Але-ж ён найміт і працуе, каб есьці кавалак хлеба.

Адну за аднэю перакладаў ён кнігі, перагортваў старонкі і ўпісваў, дзе трэба было, цэлыя слупкі лічбін. Часам вось сядзіць-сядзіць гэтак, піша-піша, аж увач чу пачынаюць скакаць адна цераз адну ўсе гэтыя лічбінкі. Тады Ігнась пакідае асадку, прыслоньваецца к сьцяне, заплюшчыць вочы і сядзіць гэтак хвілін колькі. Потым, устрывожаны грукам ці голасам якім на двары, хапае асадку і зноў піша.

І сёньня таксама. То думкі ўсё вязнуць да галавы розныя, або рукою паварухнуць ня можа, каб перагарнуць аркуш. Ня лезла ў галаву пісаніна, такая далёкая і чужая. І гэтага разу стан душэўнае і фізычнае няўладзіцы перабіла, неспадзявана ўвайшоўшы, пакаёўка Стася.

— Ігнась, пан кліча вас да сябе ў пакоі.

— А чаго—ня ведаеце? Можа кніжкі з сабою пабраць?

— Я ня ведаю, нічога не казаў. Мабыць, так.

— Добра, я зараз прыду.

Ён зашпіліў на аплікі жакетку-даматканку і пайшоў да Няслаўскага.

Той сядзеў у сваім габінэце і перагортваў паперы. Быў ён натомлены і ўсхвалёваны чымсьці. Як прышоў Ігнась, ён, ня гледзячы ў вочы, запрасіў сесьці, а сам устаў з-за стала, пачаў хадзіць па пакоі. Хадзіў ён ціха, няпэўна ступаючы нагамі па гладкай блішчастай падлозе. І маўчаў. А Ігнась сядзеў ды чакаў, што скажа Няслаўскі. Нарэшце, той парваў цяжкія кайданы, у якія быццам закуло было яму мову, сказаў:

— Мне гэтага ня хочацца рабіць, Ігнась, але я нічога не магу парадзіць.

Ігнась слухаў і не разумеў, у чым справа. Але няпрыемны горкі камячок падступіўся аднекуль к сэрцу. Ён угадаў, што гутарка будзе пра яго.

— Мы павінны разьвітацца. Ня думайце, што вы тут у нечым правінаваціліся, не. Я з жонкаю парашылі прадаць двор. Тым больш, цяпер трохі аціхла з усімі гэтымі непарадкамі і ахвочыя купіць знойдуцца. Я ўжо пачаў перамаўленьні з двума пакупцамі і думаю—сыдуся на цане. Як, бачыце, тут цэлы пук важных прычын, што ад мяне ніяк не залежыць. Я вельмі рад быў даць вам работу, калі гэта можна было. А цяпер нічога не магу зрабіць.

— Дык навошта вам турбавацца, Вадзім Пятровіч, пра чужога чалавека,—устаўшы, сказаў Ігнась.

— Ня ў тым справа, Ігнась.

— Ды не, навошта. Ня трэба і турбавацца.

Няслаўскі пачуў у Ігнасёвых словах, як яму здалося, кплівыя ноткі, але, зірнуўшы скоса, ня ўбачыў нічога такога на твары ў таго.

— Я з вялікаю ахвотаю пасобіў-бы, каб мог. Пасьля мо' я распытаюся па знаёмых.

— Вельмі дзякую вам, Вадзім Пятровіч... Як праўду сказаць, я і без таго ўжо клопату нарабіў вам.

— Не, які клопат, зусім ніякага клопату.

— Вадзім Пятровіч!—пачуўся жаночы голас з суседняга пакою.

Няслаўскі пасьпешна вышаў. Ігнась застаўся адзін.

Вось тое і надышло, пра што ён ня думаў, здаецца, ні разу ад таго часу, як наняўся ў майстэрню к Зусю. Наступіла. Без работы, бяз ніц-нічога. Рукі, ногі здаровыя, ды спраўны страўнік—вось і ўсё, што мае ён, усе яго пэрспэктывы на далейшае. Гол, як сакол, як той вецер сіберны ў асьнежаным полі. Але ці-ж варта тужыць, або наракаць на каго. Зьверху і да нізоў жыцьця ўвесь лад збудаваны гэтак. Тут аднаго нараканьня мала. Варушыцца трэба, дбаць, дзейнічаць.

— Дбаць, — прашаптаў Ігнась і ўсьміхнуўся горна.— Дбаць...—Зьвярнуўся Няслаўскі.

— Дык дазвольце вам падзякаваць, дзядзька Няслаўскі, за ўсё, што вы зрабілі для мяне, а больш за той прытулак, што далі мне тут.

— Чакайце, Ігнась, мы яшчэ ня скончылі справы. Вы-ж працавалі ў мяне доўга, а кожны, хто працуе, тым самым набывае права патрабаваць ад гаспадара пэўную суму грошай. Заработак...

— Я з вамі не ўмаўляўся на грошы. Я толькі прытуліўся быў у вас у падсуседзі, а за гэта грошай не бяруць.

— Даруйце мне... Вы разважаеце зусім як тыя ідэальныя евангельскія людзі. Вы-ж не абстрактна жывяце, ня ў думках толькі, а рэальна існуеце на зямлі. А з гэтага і ўсе вынікі. Я ня пытаюся, колькі вы захочаце, бо сьціпласьць, а можа і гонар,—выбачайце, гэта ня дрэнная азнака ў чалавеку,—перашкодзіць вам. Я вам даю столькі, колькі вы зарабілі ў сярэднім за ўвесь час ў Слаўным. А зарабілі, па-маім прыблізным меркаваньні, пяцьдзесят рублёў.

— Я не зарабіў гэтулькі.

— Мы з вамі спрачацца ня будзем. Я кажу, што зарабілі, і годзі.

Ігнась раптам падумаў: „А якое сапраўды моральнае права я маю адмаўляцца ад свайго заработку? Я-ж працаваў, значыцца, нешта запрацаваў. І цяпер, калі адмоўлюся ад гэтага запрацованага, дык тым самым злачынства ўчыню да самога сябе. Шляхетнічаць няма чаго. Тут гэтым самым ставіцца пытаньне—жыць ці не. Жыць! А каб жыць на што, трэба мець грошы. Бо без работы ці бяз грошай ніхто скарынкі хлеба не пакажа нават. Старца і таго дораць за яго малітвы. А то чалавек, як граб, дужы, малады—ды кожны з хаты прагоніць. Жыцьцё—гэта такая штука. Каб жыць, трэба змагацца, змагацца за жыцьцё, рашуча, не адступаючыся ні на волас“.

— І не маракуйце на мяне,—сказаў Няслаўскі, падаючы грошы,—я раблю ўсё, што мог зрабіць.

— Дзякую. А каму аддаць кнігі?

— А вы толькі скажыце аконаму. Ён разьбярэцца і сам.

— Бывайце здаровы!

„Гол, як сакол, і вольны, як вецер“,—зноў назольна вярзецца неадчэпная думка. „Ну, што-ж, мы панамі ніколі і ня былі“.

Ён аддаў аконаму кніжкі, пазьбіраў у мяшочак рэчы, якія былі ў яго, усю сваю маемасьць, клікнуў Кіяша на двары і пайшоў куды вочы глядзяць.

— Ігнась!

Насустрач яму ішла Ларыса.

— Куды гэта вы сабраліся?

— У белы сьвет, як у капейку.

— Што гэта значыць?—палахліва спыталася яна.—Куды вы ідзіцё?—скажыце праўду.

— Куды вочы глядзяць, я ўжо сказаў вам. Службе маёй у вас, а праўдзівей—прытулку, тэрмін сышоў ужо. Ну, а я акуратны, як бачыце. Ї асабліва доўга зьбірацца няма чаго: лахі пад пахі, дый бывайце здаровы.

— Гэта дрэнныя жарты, Ігнась.

— Ня жарты, а сапраўды я разьлічыўся з вашым бацькам і вось іду. А куды, ня ведаю пакуль што.

„Дарэчы, куды-ж я іду?" Запытаўся ён цяпер сам у сябе і нічога ня мог адказаць на гэта.

— Слухайце,—загаманіла зноў Ларыса,—калі маеце пэўную дарогу, дык я зараз загадаю запрэгчы санкі, і падвязем вас.

— Не, Ларыса... (Вадзімаўна—гэтак і ня вымавіў). Ня трэба, мне ехаць няможна, ды яшчэ на панскіх конях.

— Які вы ўпарты.

— Ня ўпарты, а гэта—звычайная перасьцярога, вось і ўсё па ўсім.

— Ігнась... У мяне адна невялічкая просьба. Абяцайце, што вы зробіце... дзеля мяне. Абяцайце... Я буду гэтак рада.

— Кажыце:

— Паведамляйце мяне, дзе спыніцеся і наогул дзе будзеце. Абяцайце,—з маленьнем у голасе прасіла яна.

— Добра. Бывайце! Не ўспамінайце ліхам!

— Бывай! Бывай!—шапталі ўсьлед яму непаслухмяныя Ларысіны вусны.

— Бывай! Бывай!—казалі вялікія, вільготным туманом заслаўшыся, журботныя дзяўчыніны вочы.

— Бывай! Бывай!—казала, здаецца, уся яна сваёю постацьцю, сваім імкненьнем.

— Бывай! Бывай!—памахала рукою ўжо тады, калі Ігнась выбраўся з прысадаў на шырокі раздольны шлях і азірнуўся.

— Бывай!—адна сьлязінка выкацілася, як роска брыльлянцістая, на шчаку—і Ларыса павольна, марудна пайшла ў пакоі.

— Ці-ж гэта ёсьць тое, што ты казаў ісьці ў жыцьцё? Ці-ж гэта ёсьць вывучэньнем народу? Ці-ж гэта?—шаптала яна.

І ў зірку памяшалася з журботай строгасьць, і ў думах сьпела-насьпявала рашэньне.

А Ігнась ішоў і пытаўся сам ў сябе:

— Сапраўды, куды-ж я гэта іду?

Яго вока заўважыла на дарозе вузенькі дзявочы сьлед, сьлед Ларысінае нагі. Паглядзеў на горку, на якой узвышаліся пакоі Слаўнага. На парадным ганку стаяла яна і высока над галавою памахвала белаю хусьцінкаю. Ігнась зьняў з галавы шапку, памахаў у адказ.

Вось зноў сьлед. Яна далёка недзе хадзіла. Азірнуўся.

Ларысы ня было ўжо на ганку. Будоўля Слаўнага пачала хавацца патроху ў цьмянай далячыні.

І вузенькі сьлед дзявочае нагі зьвярнуў раптам на бакавую дарогу да суседняга сяла. Ігнась азірнуўся яшчэ, быццам думаў, што сьлед яе паверне з дарогі на шлях і пойдзе па яго сьледу. Не.

— Куды-ж, аднак, ісьці?—зноў папытаўся ён.

Кіяш варочаўся сьпераду, кідаўся лашчыцца і зноў бег наперад.

гнась абмацаў слабка напханы мяшочак... І перад вочы паўстаў вобраз маткі. І жаль нязьмерны раптам ахапіў яго. І думка цьвёрдая выкрышталізавалася і ўвабралася ў намер. К ёй... Дарога цягне цяпер толькі к ёй, гарапашнай.

Шляху яшчэ не працерлі добра і ня ўезьдзілі, дык няглыбокі сьнег перасыпаўся пад нагамі, як пясок. Абсіверaныя, пасыпаныя сьнегам, белым, як цукровы пясок, стаялі і думалі думку старадаўную маўклівыя бярозы. Ды наўкола, куды вокам ні ўскінь, ляжаць бялюткія асьнежаныя палеткі. Дзе-ні-дзе чарнелі на белым паснуўшыя ляскі. Заходжваўся вецер. Сіверам несла з далёкае поўначы. Усчыналі шчэбет сініцы, сьнягуры, парушаючы звонкую цішыню на даўжэзным маўклівым шляху.

Ігнась разагрэўся, мяшаючы сухі сьнег-пясок. Мляўкая ўтома пачынала адчувацца ва ўсім целе. Ногі больш па інэрцыі ступалі і коўзаліся ў сыпкім сухім сьнезе.

Зімовы дзень неўзаметку канаў. З далячыні насоўваліся цягуткія ліпкія поцемкі. А Ігнась усё ішоў ды ішоў, пакуль далёка ад права ня выблiснулі агеньчыкі, не замігцелі раптам і не пачалі пераміргвацца. Адчуваньне нечага ўтрачанага, дарагога, а цяпер блізкага працяло яго ўсяго.

Вось зараз паверне са шляху вузкая „Надзейская“ дарога. Зараз і палеткі такія знаёмыя і блізкія даўней. Цяпер ляжаць яны ціхія, сонныя, пахаваўшыся пад халодную сьнегавую коўдру.

Кіяш падскакваць стаў, круціцца пад нагамі з радасьці.

Натомлены, бяз думкі ў галаве, авеяны нахлынутымі раптам пачуцьцямі, прышоў у сяло. Звонкім лемантам сустрэлі. ў канцы сабакі. З прасьніцамі ў руках выбягалі з двароў дзяўчаты, зьбіраліся на вячоркі.

У матчынай хаце было цёмна. Паломаныя вароты адчынены ў двор і прымерзьлі гэтак, пахіліўшыся набок. Прызба не абсыпана, паразрывана чужымі сьвіньнямі. Каўцякі саломы са страхі павыцягваны і матляюцца над галовамі. Беднасьць і разбурэньне сьціснулі сэрца Ігнасю, з большаю сілаю ўзбудзілі жаль да маткі.

Ігнась прыпыніўся на хвіліну пад сенцамі, каб саўладаць трохі з пачуцьцямі. Але яны не ўсталяваліся і Ігнась мацней захваляваўся. Ціха-ціха, квола неяк заскігітаў Кіяш, як-бы зразумеўшы Ігнасёву нерашучасьць і сам падпадаючы пад яе. Ігнась папхнуў дзьверы. Яны былі на засаўцы. Зацяўшы дыханьне, костачкамі пальцаў пастукаў ціха і стаў. У акно папытаўся матчын голас:

— Хто там?

— Я, мама.

— Ігнаська...

Ён чуў, як забожкала з радасьці маці і барждж
эй пашла адчыняць сенцы.

Кіяш забрахаў залівіста і кінуўся за парог.

— Мама!..

— Ігнаська! Сыночак мой... А я-ж не чакала, а я-ж ня думала. Нават агню не паліла сёньня. А, сынок ты мой. Ты-ж натаміўся, мусіць, зьмёрз. Вось я запалю сьвятло.

У ямцы на прыпечку тлела некалькі вугалёў, прысыпаных попелам. Дрыжкімі рукамі Агапа выцягла з пасьцелі жматок саломы і пачала разьдзьмуваць агонь. Салома доўга не загаралася.

— Дай я, мама,—сказаў Ігнась.

— Я сама, сынок. Вось зараз.

Неўзабаве ўкурэўшая салома загарэлася і асьвятліла сухі і пажоўклы твар Агапін.

— Гэта-ж ня купіла сернікаў, дык вось дзьмуцца трэба з гэткімі вугольлямі, няхай яны спустуюць... Ох, дастань хіба, сынок, газьніцу там—на паліцу заставіла. Усё газы

неяк не набрацца. Ня поўна што робіш, здаецца, а выпякаецца ліха ведама колькі.

Запалілі газьніцу. Агапа паставіла на стол. І тады ўбачыла, што Ігнась яшчэ не распрануўся.

— Распранайся, сынок, ды грэйся. Згаладаваў можа. А ў мяне, на яго страх, дык і пачаставаць няма чым.

— Я ня хочу, мама, есьці, я не галодны.

— Як гэта „ня хочу", Ігнаська, што гэта за „ня хочу". Адубянеў у аднэй жакетачцы.

Яна завіхалася то каля мыцельніку, то выходзіла ў сенцы і вярталася з салам і яйцамі, якія, мусіць, і прыдбала знарок сыну на пачостку. Потым распаліла на прыпечку агонь з трэсак і ўзялася смажыць яечню.

— Вось і падвячэраеш трохі, сынок. А я заходзіла гэта нешта аднаго разу ў бляхарню, дык сказалі, што ты пакінуў у іх рабіць. Вось, сынок,—хоць-бы ж зайшоў ды сказаў, а то я думала ўжо нямаведама што.

— Я цяпер на другой рабоце, мамка,—схлусіў Ігнась і адвярнуўся, каб не заўважыла маці хлусьні, павёў вокам па хаце.

І хата старэла, як старэла маці. Сьцены пачалі буцець. Пад вокнамі ад частых пацёкаў павыгнівалі дзіркі і з іх сыпалася на лавы парахня. Уся хата, здаецца, апала ці гэта Ігнась так вырас, што вокны і столь парабіліся ніжэйшымі, чым раней былі.

Кіяш круціўся каля Агапы, пачуўшы пахі смажаніны.

— І ты выгаладаў? Пацярпі трохі. Дык ты не сказаў мне, сынок, дзе цяпер. Ці ў горадзе хаця?

— Не, мама, у двары служыў у адным, як пакінуў тут.

— Мо' ня варта было кідаць—ці то не па сваёй волі зрабілася?

Ігнась не адразу сказаў. Прызнацца ва ўсім мацеры? А можа яно ня лепш, а горш будзе, вунь яна мізэрная зрабілася, зблажэла як. І ня прызнаўся, зноў схлусіў.

— Няхай яна там не дажджэ гэтая работа. Вельмі-ж цяжка.

— Але-ж заработак, сынок, ня той. Дый выўчыўшыся, рукі можна было-б за што зацяць. А то-ж не.

— А пражывецца наш век і гэтак.

— Дык-жа. То сядай за стол, Ігнаська, укусі трохі.

— А ты?

— Я нядаўна вячэрала, еж.

— Я адзін ня хочу, удваіх давай есьці.

— Дзеля цябе хіба толькі.

Яна села насупроць. Ігнась дык згаладаваў добра, але-ж ня мог есьці адзін бяз маткі, ведаў, як яна выядае. Агапа ўзіралася на свайго Ігнася, на свайго сыночка любага. Мо' ад таго, што жылі разлучна, і зьмізарнела гэтак, мо' ад таго і старасьць гэтак да часу насунулася. Вось яна сядзіць і то ўкусіць хлеба і доўга пераждоўвае яго бяззубымі дзяснамі, то скажа што і, чакаючы адказу, усё прыганяе сына есьці, каб ня быў галодны ў маткі.

— Ты не глядзі на мяне, я-ж дома была,—ня бойся, не галодная.

А як нагаварыліся ў ахвоту, яна паслала сыну спаць.

— А я пасяджу яшчэ, усё адно ня скора засну.

І для вока толькі ўзялася за работу. Разьвязала Ігнасёў мяшочак і павымала на лаву ўсе рэчы. Нічога там асаблівага ня было: нейкая пара ці дзьве бялізны, анучы ў чобаты, верхняя кашуля ды са тры кніжкі. Павымала і сьцішылася.

Ігнась заснуў, натомлены дарогаю, а яна сядзела насупроць і пазірала на дарагога сына. Узіралася, а крыўда перамешвалася з радасьцю, і ад самога сэрца, здаецца, прыплывалі сьлёзы і, адна адну паганяючы, неўзаметку для Агапы капалі на Ігнасёў мяшок, што ляжаў у яе на каленах.

Ужо выгарвала газа ў газьніцы і агеньчык паволі-паволі канаў. І патух зусім, пусьціўшы з нагарэлага кноту сьмярдзючы дым, а Агапа не кранулася з лавы, вартавала Ігнасёвага сну...

Назаўтра ўраніцы Ігнась папрасіў у маткі, каб яна нікому не казала, што ён быў дома.

— А чаму, сынок?

— Так сабе, мама, ня хочу, каб языкамі мяньцілі што ня сьлед.

— Ды не, сынок, я-ж ні з кім вельмі не гавару, не скажу. Думаеш, мне хочацца слухаць абы-што.

— Добра, мама.

— А гаварыць гавораць, плявузгаюць, што толькі ў галаву ня ўзбрыдзе. Гэта-ж я чула, Ігнаська,—прыцішыла яна голас, быццам хто чужы мог пачуць,—пра Любу... Ой, ды чаго толькі неназводзяць... Баюць, езьдзіў да яе Дарош і там яны пасварыліся.

— Я ня чуў, мама, нічога.

— Люба сказала яму, плятуць, што з кім захоча, з тым будзе хаўрусаваць, а бацька ёй у тым ня ўказьнік. Ну, дык Дарош зазлаваў дый паехаў бяз нічога. Кажуць нават, што

спураўся яе і выракся, як дачкі. А ты, сынок, прызнайся мацеры... ты бачышся з ёю калі ці не?—запыталася яна нясьмела.

Ігнась дагадаўся, да чаго ўся гэтая гутарка і весела ды хітра ўсьміхнуўся на матчыны словы.

— Ужо трохі даўнавата бачыліся. Чаму—ці ня жэняць нас часам у сяле?

— Я вельмі рада, сынок, што ты не пакідаеш з ёю хаўрусу, так рада, што выказаць не магу. Я-ж гэтак люблю яе,—ухілілася ад простага адказу Ігнасю маці.

— І я, мама, люблю яе, і яна мяне таксама,—яшчэ весялей сказаў Ігнась і зарагатаў раптам.

Твар у Агапы зрабіўся гэткім дзяціна-нявінным, быццам яна не разумела, пра што гэта сказаў сын.

— Ня сьмейся з мацеры, блазан,—жартамі зазлавала яна.

— Напраўду, мама, я зусім ня хлушу. Толькі, бачыш, яна—настаўніца ў школе, а я... ну, а я—малацьбіт ці грабар, або касец—як калі можна наймацца ў заработкі. Дык ты можаш і не палохацца нават: гэтак жывучы, мы ніколі не пажэнімся.

Спахмурнела Агапа, пачуўшы гэтыя словы. Сумная хмарка ўсплыла і зьнікла ў глыбіні-бяздоньні ласкавых матчыных воч.

— Кпіш ты з мяне, старое, Ігнась, як сам хочаш... Добра добра. Я больш нічога не скажу пра гэта, і ты не кажы.

Яна так люба, з такім шчырым пачуцьцём матчынага каханьня зірнула на сына, што ён ускочыў з лавы, дзе сядзеў, падбег к мацеры і расцалаваў яе. Але той-жа час зьдзівіўся і спалохаўся, калі маці ашчаперыла яго за шыю рукамі і заплакала.

— Мама!.. Мамка... Чаго ты плачаш? Ня плач. Скажы... Скажы чаго?

Гэтак, як будучы малым яшчэ, калі ня было ў іх нештa раз хлеба, цешыў ён матку і дапытваўся, чаго яна плача.

— Не палохайся, Ігнаська, я ня плачу... гэта я... з радасьці.

З бураю найкволых маладых пачуцьцяў у хлапецкім і сыноўнім сэрцы Ігнась шкадаваў матку і думкамі ляцеў туды, к Любе.

Як ні ціснулася ад сына, як ні хавалася, каб ня ведаў ён, што вельмі кепска жывецца, а даведаўся Ігнась, выпытаў рознымі данімамі. Агапа не хацела паказаць гэтага, каб ня тужыў лішняга сын, бо клопату ў яго цяпер і свайго адбавіць можна. І на адыходзе перад вечарам ён падаў матцы грошы, узятыя ў Няслаўскага, і сказаў:

— Узімку не хадзі ў заработкі, засьцерагай сябе трохі. На гэтыя грошы можна пракідацца сяк-так.

— Як-жа ты, мой сынок, бяз грошай пойдзеш?

— Ня тужы пра мне вельмі. У мяне яшчэ вядуцца грошы, у бляхарні зробленыя. І сьвет не бяз добрых людзей, абы рукі ды ногі здаровыя. Зараблю, мама, неяк жыць буду.

— Куды-ж ты пойдзеш, сынок, проці зімы лютае? Дзе заробіш што цяпер? Гэтак неспакойна ўсюды, бунты, забойствы...

Агапа пахіліла на далонь галаву, зажурылася.

— Нічога мама. Каб ты ведала, якія ў мяне добрыя таварышы. Яны ні завошта не папусьцяць свайго сябра ў крыўду. Я табе іх калі-небудзь пакажу.

— Хаця-ж, сынок, толькі з добрымі калягуй, ня зьвязвайся з благімі.

— Я раблю так, як ты мяне вучыла некалі.

— Хвалю, Ігнаська, і цёнгля памятай пра мае словы. Я сярод людзей набачылася ўсяго ўсякага і добрага, і благога, і спрактыкавалася, як трэба жыць у людзях. Благога абягай, сынок, бо ён можа ўцягнуць у такую прорву, з якое ня вышкрабаешся. Дык ідзі-ж здароў, сынок, няхай табе дарога ляжа шчасьлівым шляхам.

Яны моцна пацалаваліся.

— Заставайся здарова. Засьцерагайся з работаю,—апошнія словы праказаў Ігнась.

— Ідзі здаровенькі!

Гэтак зашчымела сэрца ў гнася і гэтак нейкае прадчуваньне голасна загаманіла ў ім, што ён, яшчэ ня вышаўшы за вароты, гатоў быў вярнуцца. Але не вярнуўся, перасіліў сябе, толькі глянуў поўным любасьці і ўстрывожаных думак зіркам.

Агапа стаяла на ганку. У аднэй руцэ заціснутыя ў пальцы Ігнасёвыя грошы, а другая грубым палатняным фартухом выцірае дробныя частыя сьлёзы. Яшчэ вышла за вароты і глядзела датуль, пакуль поцемкі ды сьлёзы вуліцу паміж ёю і сынам не заслалі.

А ў Ігнася супярэчныя думкі ваявалі з прадчуваньнямі сэрца, пачуцьці паўставалі на абарону прадчуваньняў. Але ён ішоў шпарка, не азіраючыся, з боязкасьці, што ня сутрымае і завернецца, пойдзе назад. Вышаў за канец сяла.

У полі пасьвістваў халодны паўночны вецер. Пашчыквала твар. Праціналіся марозныя іголачкі праз нагавіцы, калолі ў калены,—тады халодныя дрыжыкі беглі па целе. Ігнась

памкнуўся шпарчэй ісьці, каб нагрэцца. Шырока і з сілаю размахваў рукамі, крок за крокам усё больш адыходзіў ад сяла, ад маткі.

У белы сьвет, як у капейку.

Сіберны вецер пасьвістваў у быльніку на непазасыпваных яшчэ сьнегам межах, замятаў без мятлы чыста дарогу перад Ігнасём, спраўляў начны свой разгульны баль,—адзін, без гасьцей.

У белы сьвет, як у капейку, ішоў Ігнась. А вецер сіберны засыпаў наперадзе і пазадзе драбнюткім сыпкім сьнегам дарогу.

ЧАСТКА ПЯТАЯ

# К Р О Ў

## З ПАНСКАЕ ЛАСКІ

ЯШЧЭ раз прышла вясна. Яшчэ раз з сіняе вышыні залівісты жаўранак паслаў да зямлі сваю звонкую песьню:

— Чалавек-дураны!.. Чалавек-дураны!.. Пакідай сані ды бяры калёсы. Чалавек-дураны!.. Чалавек-дураны!..

Яшчэ раз яснае сонца прылашчыла хмурую спакутаваную зямлю. Яшчэ раз весела загурчэлі рэкі. Яшчэ раз абуджаныя ад доўгага сну памкнуліся да сонца дрэвы. Яшчэ раз ажыло Слаўнае.

Чалавек пакінуў сані і вывалак з падпавеці старыя калёсы. Заляскацеў у кузьні каваль. Ладзілі плугі, бароны, перацягваліся на калёсах шыны, пераменьваліся аглоблі, правіліся хамуты, аброці, кульбачкі, лейцы. Сустракалі людзі чаканую доўга вясну.

Заварушылася і Слаўнае. Праз цэлыя дні ў двары галганілі індыкі, іржалі ды падбрыквалі коні, раўлі каровы, захацеўшы на пашу. Парабкі разыходзяцца на работу.

Сам Няслаўскі вылез з пакою, і яму зажадалася сонца, цяплыні і бадзёрага паветра. Няпраўду сказаў Няслаўскі Ігнасю, як расплачваўся ўзімку і адмовіў ад службы—ня думаў прадаць Слаўнага. Забыўся тады і на сваю панскую шляхетнасьць, на гонар і сумленьне, схлусіў. Да таго былі прычыны. А да рэчы сказаць, хіба мог прадаць ён Слаўнае. Двор быў спадчынаю продкаў, радасьцю спрадвечнага, якая перадавалася дзядом і бацьком Няслаўскага. А ён, узяўшы ад бацькі гэты фамільны прытулак, ён хіба меў права пазбавіць цені продкаў месца іх векавечнага супакою. Прытым-жа Слаўнае лепш за якое лецішча. Раскінутае на ўзгорку, з вялікім старым садам, парэзаным на сьцежачкі і алейкі, густымі, роўна пасаджанымі ліпавымі прысадамі, з рэчкаю побач—яно давала найлепшы адпачынак, якога толькі зажадаць можна было.

Усьпіраючыся на крывульку, ходзіць Няслаўскі па ўсім двары. І ня то, каб парадкі сачыў, а проста вось ходзіць

сабе і, ходзячы, адчувае ўсю дабрыню вясновага надворку. Зіму жылося спакойна. Быццам адразу пасьля таго, як абвясьцілі ваеннае становішча ў губэрні, аціхлі забойствы, рабункі, пажары ў дварох і ўсялякае мужыцкае свавольства. Няслаўскі патроху аддальваўся ад ранейшае свае палітыкі і пры боку ў дэспотычнае прыгожае жонкі стаў успрымаць зусім на новы лад жыцьцё. Колькі дзікунства здалося яму ў тым, што было навакола, што мінулася, як думаў ён, і адышло ў нябыт. Быццам нанаў пачалося жыць. Яшчэ часам атручвалася яно сутычкамі паміж жонкаю і дачкою, але паступова і, не заўважаючы сам як, бараніў ен жонку і вінавацiў заўсёды дачку. І, спакойна правёўшы зіму, весела сустракалася вясна, вясна новага жыцьця, новых надзей і радасьці бяз клопатаў, бяз трывог і душэўнае буры.

Яшчэ рана, але ўжо сонца кволаю цяплынёю палівае зямлю, казыча Няслаўскага весела-весела сваёю ласкаю. Як командзіра свайго салдаты, сустракаюць яго ранічным прывітаньнем індыкі. Няслаўскі праганяе іх крывулькаю і абыходзіць гразь, што дзе-ні-дзе яшчэ не пасьпела павысыхаць.

Цяпер Няслаўскі астаўбоўваецца ў Слаўным і ў горад хіба толькі наведваецца пагаманіць са знаёмымі ды ўпэўніцца ў спраўніка (са спраўнічыхаю пасябравала Няслаўская), што мяцежным непарадкам канцы ўжо і, жыцьцё цьвёрда крочыць наперад, не саступаючы ні на ёту перад „крамолаю". Можа, дзякуючы таму, і аконам на воку ў пана стаў рухавейшым. Вось сёньня яшчэ туман густы стаяў нал рэчкаю і толькі пачыналі шчабятаць раньнія птушкі, як ужо выехаў ён на сёлы па работнікаў гной разьбіваць. Пра сяўбу ўжо дбае, чаго ніводнага году не прыкмячалася ў ім гэтак рана.

— Пара, пане, на ўсё свая пара. І сяўба, пане, мае сваю пару.

Адказваў ён усе тыя гады, калі Няслаўскі спрабаваў пакантроляваць аконамаўскую ўпраўку. А сёлета зусім ня тое. Сёньня вось першы выезд у палетак, першая сустрэча з землёю-маткаю.

„А вясна паказвае на спадзеўку, лагодная, мяккая. Спрыяе сяўбе. Значыцца, ураджай будзе добры".

Думае—і ня думае, а так сабе прамігаецца ў галаве лёгкая прыемная думка,—жыцьцё раптам лагодна павярнулася да Няслаўскага. Цяпер толькі і пажыць.

„Слаўнае, Слаўнае... Мілае Слаўнае".

Аконам прывёў работнікаў. Тады Няслаўскі пайшоў сьнедаць, праходка па Слаўным гэтак прыемна хвалявала яго. Пад уплывам яе на тым часе, здаецца, прыбылі сілы, і ён

парашыў па сьнеданьні напэўна прайсьціся ў палетак, паказаць свой гаспадарскі нагляд.

„Аконам-аконамам. Часам і на аконама пастух патрэбен", думае Няслаўскі.

Але гэта ня было тое, што людзі звыклі называць неймавераю ці яшчэ там як іначай, не. Няслаўскаму проста хацелася мець цяпер усё на сваім воку, нічога не выпускаць з поля вядомасьці, ахапіць усё. Гэта вынікла ў яго як дзіцячы нявінны капрыс; можа і не патрэбна, але-ж конча хочацца мець яго. Ну, няхай ужо гэтак і будзе—і Няслаўскі дазваляе сабе яго, як дзіцяці што лішняе бацька або маці.

І пацякло ціха цягутка жыцьцё ў Слаўным і цякло яно гэтак спакойна датуль, пакуль прычыны звонку не ўмяшаліся ў яго павольную цягуткасьць.

Ужо павысыхалі дарогі. Белы пыл пачынаў слацца за калясьмі, асядаць на квола-зялёным лісьці бяроз на шляху.

Аднаго такога дня Няслаўскі прыехаў з гораду ўстрывожаны, з адзнакаю нэрвовае задумы на вечна спакойным твары. Як і заўсёды, паехаўшы ў горад, ён зайшоў да спраўніка пагаманіць аб справах, і той ушопат расказаў пра новыя выбухі „крамолы" ў павеце. Няслаўскі тады асунуўся раптам; добрадушна-вясёлыя стрэлачкі каля воч пахаваліся, шчокі паўпадалі неяк разам у адну хвіліну, і чыста паголеная барада затрымцела нібы ад раптоўнага дрогкага холаду. Не даседзеў тады ён у гасьціннага спраўніка са спраўнічыхаю і загадаў фурману шпарка весьці назад у Слаўнае. Па дарозе вынік нязначны казус, але Няслаўскі надаў яму вельмі вялікую значнасьць.

Насупроць ехала ўлегца некалькі сялянскіх фурманак. На фурманоў голас, каб тыя зьвярнулі, фурманкі ехалі проста дарогаю, і фурман, сам зварочваючы на-бок, каб трохі, дык учапіў-бы ў пярэдні воз.

— Трасца цябе ня возьме, зьвярнуць можаш.

— Едзе адным на зырках, як зьмеі, конях ды яшчэ вярні яму,—агрызнуліся з другога воза.

Фурман уступіў-бы ў спрэчку ўжо, каб Няслаўскі не сказаў паганяць. Прытуліўшыся цесна да сьпінкі сядзеньня, не зварухнуўся ён да самага Слаўнага.

Пад стадолаю ў двары стаяла адкрытая бяз будкі каламажка. Прыехаў нехта. Няслаўскі пасьпяшыў у пакоі, у пакаёўкі папытаў.

— А паніч малады нейкі. З паняю выправіліся на праходку.

„Паніч малады... Вось як..."—думаў Няслаўскі. І яшчэ хацеў пра нешта запытацца, але перадумаў, махнуў рукою і палез на другі паверх.

„Паніч малады“, прамігалася ў думках і прыпаміналася: пакаёўка, здаецца, хітра-хітра заскаліла вока, быццам да таго, што сказала, яшчэ дагадвацца трэ' было пра нешта. „Ага“... „Паніч малады“...

Ларыса загібала недзе. Апошнімі днямі яна зусім ня стыкаецца дома. А яшчэ вясна спрыяе—і зранку як пойдзе, не азваўшыся, дык праз цэлы дзень, каб гарэла тут, ня ўбачыш яе і ня знойдзеш. Калі хоча, ідзе, калі хоча, прыходзіць. Ні ласкі, ні добрага слова таго да бацькоў. Як уракнуў хто,—падумаў-бы, каб верыў у гэта.

І як прыехаў Няслаўскі, таксама ня было Ларысы. Пакоі адзінотныя, бязмоўныя, вялізныя. Фіранкі на дзьверы пазьвісалі, гэткія сур'ёзныя, строгія.

Няслаўскі прайшоў па ўсіх пакоях. І нідзе ні ў водным ня бачыў сабе прытулку, не знаходзіў супакою. Сёнешнія сустрэчы абязьвечылі вясновы ўплыў, з сёнешняга дня грунт пад нагамі ў Няслаўскага пачынаў вагацца і высьлізаць. І ўзбунтаваная думка, поўная трывогі, палахлівымі здагадкамі і адчуваньнямі імкнулася ўхапіцца абы за што аберуч, каб не пасьлізнуцца на хісткім грунце і не паляцець у бяздонную страшную прорву.

А пакуль Няслаўскі мысьленна змагаўся гэтак сам з сабою, пакаёўка Стася шукала яго па ўсіх пакоях і знайшла якраз у жончынай спальні. Ён стаяў плячыма да дзьвярэй і бяздумным зіркам глядзеў на двор, на вясну, на новую вясну, якая гэтак поўна абяцала даць яму, а сёньня ўжо гэтак ясна і няпрыхільна наківала пра здраду. На Стасін голас ён завярнуўся і ці ўбачыў, ці гэта здалося яму: пакаёўка зноў хітра заскальвае вока. Але ўвартаваўшы спакойную хвіліну ад свайго настрою, угледзеўся добра ў вочы ёй і нічога ніякага ня ўбачыў. Здалося.

— Мужыкі прышлі к пану з Заямнага. Просяць, каб вышлі пагаварыць да іх.

— А што ім патрэбна?

— Гаварылі, што толькі пану скажуць.

— Поўна іх? Старыя? Маладыя?

— І старыя і маладыя, паночку. Ды, мусіць, чалавек аж сем.

— Добра. Скажы—прыду.

Пакаёўка пайшла. Няслаўскі памацаў рукою бліскучую лысіну, павадзіў перад вачыма, як-бы зрываючы сетчатую павуціну, што апляла яму павекі і не дае глядзець на сьвет так, як гэта трэба. І, як быў бяз шапкі, вышаў на двор.

Перад ганкам сталі бяз шапак сем мужчын—старых, сівізна серабрыць у валасох і на барадзе, і маладых—віхра-

ватых, чорныя і палавыя валасы не пазачосаны старанна, тырчаць ва ўсе бакі, упарта атуляюць панурыя твары,

— Дзень добры, паночку!—далі Няслаўскаму і скланіліся пану старыя ніжэй за маладых.

— Дзень добры, мужчынкі! Што добрае скажаце? З Заямнага?

— З Заямнага, паночку. Вунь і відаць адгэтуль. У добрым месцы, на ўзгорку Слаўнае. Куды ні зірні—усё відаць.

— А што-ж за дабрыня з таго?

— А як-жа не дабрыня, паночку, усё на воку. Куды ні зірні—як на далоні,—казаў самы старэйшы, сівенькі дзядок.—На што я ўжо стары, а адгэтуль добра бачу, як пад носам яно ўсё. Ці патрава якая, ці што якое, у акно зірнуў ці з ганку, і відно. Вунь як відно. Паглядзіце вось, паночку—даруйце ўжо мне старому, што паказваю вашамосьці—паглядзіце ды ў той канец.

— Ну, што-ж, бачу поле.

— Эге-ж, поле, паночку. Панскае поле... Нашто я ўжо стары, а бачаць і мае вочы: вялікім клінам заходзіць панскае поле ды ў сельскае, у мужыцкае. Заямінскі палетак крыху ніжэй, лагчынаю пацёг, а панскі з узгорачку клінам заходзіць. Яшчэ бачу трохі, стары.

— Дык што-ж, старэнькі, з таго. Відно адгэтуль, значыць, двор на добрым месцы пастаўлен.

— Вось-жа і яно-ж, паночку, і я таксама пра гэта казаў. Што праўда—то праўда, а што добра—то ня кепска. Старыя ведаюць.

З уласьцівай яму сялянскай раскіданасьцю ў словах, але і ўпартасьцю, стары хваліў раз-по-разу панскі двор, узгорак, дзе ён стаяў, і як добра відно з яго на ўсе панскія абшары.

— Ня тое, што ў сельскага мужыка, ой, зусім ня тое. Ня вузенькі гэты матузок няшчасны, а шырачэзныя загоны, толькі стань ды любуйся,—гаварыў стары, навошта—не даразумецца было, Няслаўскі ня ведаў тымчасам.

— На тое, бачыш, стары, двор—гэта двор, а сяло—сяло. Што бык, то ня індык.

— Гал-гал-гал-гал!—пачуўшы панскі голас, залемантавалі індыкі на ўвесь двор.

Малодшы з мужчын пазаду ўсьміхнуўся, але Няслаўскі ня прыкмеціў. Тады ён кашлянуў і сказаў:

— І індыкі кажуць, што праўда.

— Маўчы,—азваўся стары,—думаеш індыкі—неразумнае стварэньне. Уга... Бо пан такі праўду кажа. Можа гэта і прыказка з таго павялася: „Памяняў быка на індыка". Гэта я так, паночку, жартую—даруйце ўжо.

— Жарты жартамі, а цяпер-жа вясна,—работы і ў вас ня менш як у двары. Прышлі чаго?

Стары крактануў, усе заварушыліся, пераступілі з нагі на нагу і паўстывалі.

— Дык-жэ ж, паночку. Калі на тое ваша воля будзе. Ласкі прышлі прасіць.

— Ня ласкі, а перагледзець старыя пляны.

Стары ўвагнуўся пры гэтых словах. А за першым загаманілі ўжо ўсе разам, ня слухаючы адзін аднаго, а толькі пахопваючыся найбарджэй выказаць тое, што яго мучыць, што душыць, з чым і прышлі яны да пана ў двор.

Няслаўскі цяпер даразумеўся. Ды такі-ж уцякае грунт з-пад ног і ўхапіцца няма за што.

— А гэта вы пра якія пляны, не разумею?—строга сказаў.—Ну, кажы, стары, ды ўсё, па парадку. А то як гэтыя індыкі, разам усе ў адно месца.

— Што, паночку, казаць доўга, я-ж вам паказваў ужо. Глядзіце, як панскае поле ды клінам уклюнулася ў Заямінскі палетак. Ну, і як памятаюць старыя...

— І ты,—падказаў ззаду голас.

— Ды што там казаць, і я памятаю...

У Няслаўскага затрымцела барада, і ён уціснуў галаву ў плечы, а бараду схаваў у чысты гарнітур, каб не заўважылі, як калоціцца, каб не сказалі мужыкі, што пан збаяўся іх.

Цераз двор ішоў літвін—парабак. Няслаўскі паклікаў яго.

— Ідзі, Вітольд, пашукай пані... Стой! Ды скажы, пан кліча.

— Добра.

Другі стары ўздыхнуў, сказаў некуды сабе пад ногі:

— Памятаем... І я памятаю.

— Кажыце,—гаварыў, направіўшыся трохі, Няслаўскі.— Як цябе зваць, стары?

— Амелькам, паночку, Гарбузовых Амелька.

— Ну, кажы, Амелька, якое ласкі вам трэба ці што.

— Мы ня старцы, ласкі ня просім,—азваўся з-за плячэй той самы малады голас.

Няслаўскі кінуў туды адным вокам і прыпамянуў фурманкі на шляху і задзіракаватых мужыкоў. І яму зрабілася ўраз гэтак няпрыемна, пачуў сябе адзінокім, бясьсільным перад гэтымі панурымі мужыкамі. Хоць-бы жонка, хоць-бы Ларыса ці з парабкоў хто падвінуўся. Няма нікога. Вось зараз агледзяць мужыкі, што ён трымціць увесь у нутрох, агледзяць і тады ня ўстояць будзе на хісткім грунце, уцячэ ён з-пад ног, і Няслаўскі паляціць уніз пад ногі гэтым

пахмурым зіркам і растопчацца, як гнілая картопля. Хоць абы-хто-б падвінуўся, каб было на кім зачапіцца зіркам і ўтрымацца.

З-за пакояў пачуліся галасы і неяк радасна пазнаў Няслаўскі ў адным жончын голас. Другі мужчынскі расказваў нешта сьмешнае, але жанчыне ня было сьмешна, дык ён рагатаў за дваіх. Няслаўскі пасьмялеў. Першы раз на ўсёй гутарцы акінуў панскім вокам сямёх мужыкоў перад ганкам і сказаў несьмялецкаму дзеду:

— Кажы барджэй, стары, бо я часу ня маю.

Падышла Няслаўская са сваім госьцем, тым самым маладым шалаплудам, якому некалі ўперад гнась шлэпнуў на нагу ў горадзе.

— Не забавіліся, Вадзім Пятровіч. Добры дзень!—прывітаўся панок.

— Што гэта за людзі?—сказала Няслаўская.—Адкуль вы? Чаго вы просіце?—строга пыталася ўжо яна ў самых гэтых людзей.

Стары затупаў на месцы, пагладзіў бараду, што закрывала кужэльную сарочку. Памiргаў вачыма, скланіўся пані і скамячыў старую, як і сам, напацелую летнюю шапку з аблупленым казырком.

— Ды мы, панічка, прышлі... Вунь, як відно адгэтуль добра на панскія абшары... Вось і прышлі сказаць, папрасіць ласкі панскае—паглядзець, мо' скажа пан, што і ня так яно. Вунь, панічка заямінскі палетак цягне лагчынаю,—паказаў стары кіем,—а ў тую лагчыну ды клінам зайшло панскае поле...

— Ты, дзед Амелька, будзеш да поўначы паказваць, — загаманіў той самы малады голас ззаду.

І ўсьлед за ім мужыкі расступіліся і наперад вышаў гадоў дваццаць пяць чарнявы рослы мужчына.

— Вось паны, гэтыя самыя пляны. Стары вам нічога ня скажа. Гэта ня толькі пра той клін. Тут і сэрвітуты з лесам і сенажаць.

— Што та-а-а-кое?—перапытала Няслаўская, пачынаючы дагадвацца, чаго прышлі ў двор гэтыя людзі.

— Я вось і кажу, толькі слухайце мяне пані, дык будзеце ведаць. Яшчэ нябожчык стары пан ззамаладу загабаў, узяў у заямінцаў вось той самы клін, што ўбіўся ў наш палетак. Што скарбовая сенажаць за ракою—гэта наша сенажаць. Там яшчэ—сэрвітутны лясок...

— Які лясок?—сярдзіта папытала Няслаўская; вочы ў яе расстрэльвалі мужыкоў шротам варожасьці, злосьці.

— Знаем, пані, які—Рачкаўшчына—вось які. Сэрвітут—сэрвітутам, а пан як насеў, дык ні ты кароў не папасеш, ні грыба табе вырваць, ні ягады...

— Ні арэшка...

— Ні ламачынкі вывезьці. Увесь лес стаў панскім.

— А дзе-ж наш?—выгукнуў голас ззаду ў чарнявага.

— А наш наскрозь зямлі прайшоў, а на тым самым месцы вырас ужо панскі, вось дзе,—варожа кінуў малады мужык, сьмела глелзячы ў вочы Няслаўскім.

— Ого,—сказала Няслаўская.—Ці ведаеце? Людцы, чым гэта завецца, вось тое, што вы гаворыце? Ці ведае? Гэта закон заве бунтам, рабункам, разбойствам!

— Вы можаце сказаць, як вам у галаву ўзбрыдзе, а мы нічога гэтага ня ведаем і ведаць ня хочам,—адказаў ёй той самы мужык.—На ўжо што—што ў пляны не паверыце, а іх-жа пісаў нехта,—патыкаў ён пальцам у паперы, што трымаў у левай руцэ.—Пісалі людзі, па закону, значыцца, было, відно, дзе і капцы паказаны, а капцы гэтыя на панскім цяпер стаяць, вось што. Але-ж плян што, плян—папера, голасам не гаворыць. Дык вос вам самыя старэйшыя дзяды раскажуць, яны ўсьведчаць тое, пра што напісана ў плянах.

— Вадзім Пятровіч, што гэта ў вас такое? Папрыходзілі нямаведама адкуль без папытаньня і хочуць нейкія там свае парадкі ўстанавіць. Што гэта такое ў вашым Слаўным?

— Мужчыны,—сказаў падагнаны жонкаю Няслаўскі.—Мужчыны, ня слухайце, хто вам байкі якія бае.

— Паночку, праўда гэта,—прарыпацеў стары.

— Мы за съведкі пастаць можам,—сказаў другі.

— То-ж за нашу памяць было, як дурнымі парабілі заямінцаў.

— Падумай пані—крыкнуў малады дэпутат, што казаў нядаўна,—цяпер сьвет такі настаў, што трэба падумаць, ды адрабіць назад зробленае кябожчыкам бацькам.

— Мужчыны, ня слухайце падбухторшчыкаў. У астрог пасядзеце за гэта!

— У астрог?!

— За сваё?!

— За праўду!!!

— Ды дзе-ж праўда?

— Самі ведаем, паночку... За нашу памяць зрабілася, але-ж цяпер адрабіць трэба... Гора наша... Беднасьць,—казаў першы стары.

— Ня тое гаворыш, стары Амелька,—малады падступіўся да дзеда.—Не на беднасьць прасіць трэба, а свайго дамагацца, па праву, закону патрабаваць.

— Ого, вы якія! Вы—бунт усчынаць! Прышлі ў чужую хату, дый распарадкуецеся... Гаспадаром загадваць,—закрычала на мужчын Няслаўская.—Вадзім Пятровіч!.,

— Хадзем, мужчыны!—гукнуў малады мужык на сваіх колегаў.—Паны нават і вухам не вядуць на нашы дамаганьні. Пасьля можа абгледзяцца, ды позна будзе. Хадзем... Часу няма стаяць тут, у сяле чакаюць.

Ён завярнуўся, сьціснуў у кулаку папяровы скрутак і, не азіраючыся, ідзе хто за ім ці не, моцным крокам пайшоў ад пакояў. Але яго словы мелі вялікі ўплыў на сваіх сяльчан і тыя кучкаю пасунуліся сьледам.

— Хам'ё,—пагардна кінуў ўздагон ім прыежджы панок.

— Вадзім Пятровіч! Што-ж гэта за парадкі ў вас, дазвольце запытацца?—настаўвала Няслаўская.

— Пакінь, Дора!—толькі і мог адказаць ён жонцы.

## НІ СЁЕ—НІ ТОЕ

Я ПРАШУ ў вас рукі вашае дачкі Ларысы Вадзімаўны,—сказаў прыежджы панок у пакоі, куды ўсе прышлі з ганку.

— Рукі Ларысы?! Я, прызнацца, яшчэ зусім ня думаў пра гэта,—адказаў зьбянтэжаны Няслаўскі.

— Трэба падумаць, Вадзім Пятровіч,—сказала Няслаўская.—Я ўжо думала і прызнала прапанову Віктара Вікенцевіча і выбар, які ён робіць, вельмі ўдалым.

— Я не пра тое,—утомна праказаў Няслаўскі:—ці маем права мы распараджацца Ларысіным сэрцам? Баюся даваць сваю згоду без яе.

— Вадзім Пятровіч, зноў вольнадумнасьць.

— О, ня турбуйцеся, паважаны Вадзім Пятровіч,—высокаўрачыстым голасам праказаў прыежджы панок.—Заваяваць сэрца Ларысы Вадзімаўны ёсьць справаю маладога чалавека.

У сэрцы ў Няслаўскага змагаліся дзьве сілы. Адна паказвала трывогу, не давала згадзіцца аддаць дачку замуж за гэтага панка, а другая—спакусьліва малявала перад ім той спакой і ўтульнасьць, якія ўвойдуць у яго жыцьцё, калі Ларыса ня будзе ўжо атручваць яго сваімі паводзінамі. Дзьве сілы змагаліся і адна аднэй не хацелі саступіць. Толькі пачуцьці асабістыя пераважылі, нарэшце,

першая ўжо гатова была перамагчы. Няслаўскі раскрыў рот, каб адказаць згодаю, калі прышла сама Ларыса.

Госьць падышоў і далікатна прывітаўся. Ларыса холадна адказала і, нібы абмінаючы на дарозе гразкую лужыну, абышла яго і стала перад Няслаўскім.

— Ну, Вадзім Пятровіч,—сказала Няслаўская.

Але Вадзім Пятровіч ня мог даць адказу, яго пераняла Ларыса. Яна сказала, падкрэсьліваючы сваё ігнараваньне маткі і госьця:

— Мне трэба пагаварыць з табою ўдваіх, тата. Па вельмі неадкладнай справе—і зараз-жа, вось цяпер.

Такая сіла была ў даччыным голасе і ў зірку,—загадвала яна, а не прасіла,—што Няслаўскі машынальна ўстаў.

— Вадзім Пятровіч!—клікнула Няслаўская.

— Добра!—адказаў ён жонцы, ня зірнуўшы ў вочы, і вышаў сьледам за дачкою.

Ларыса завяла яго ў габінэт, зачыніла дзьверы і падышла да бацькі.

— Тата... Рэволюцыя абуджаецца зноў. Ад цяжкага параненьня сёньня ўночы сканаў прыстаў другога стану Буракоў, які ўчыніў экзэкуцыю сялянам за Вайніловічаў двор. Сячэцца ўпавал лес. Захопам бярэцца зямля па дварох і засейваецца сялянамі.

— Ты хлусіш!—выгукнуў Няслаўскі, ні-то напалоханы, ні-то зазлаваўшы раптам на Ларысу.

— Ня хлушу, дый ты сам ведаеш, што гэта ня хлусьня. Я была надоечы ў сяле. Ідучы назад сустрэла...

— Ах, вось што...

— Але... вось што. Сялянская дэпутацыя, што прыходзіла к табе, каб зрабіць ладом справу, цяпер пойдзе дадому і падыме ў сяле бунт.

— Бунт... Дык ты за бунт!

— Я нічога не кажу табе. Толькі адно... Я бачыла ўсе каморніцкія пляны і паперы—сяляне дамагаюцца праўды. Тое, што ім належыць, трэба аддаць.

— Аддаць?! Ты разам з мужыкамі бунтаваць супроць мяне? Мяцеж уздымаць!—чужым голасам крыкнуў Няслаўскі.

— Гэта ня бунт, а дамаганьне праўды. І калі ты не прызнаеш яе, дык я прызнаю, я—твая дачка. Мужыкі—ня быдла, а людзі. Ім жыць хочацца, таксама як і табе. Прыпамяні свае палітычныя размовы, тата... Куды яны падзеліся цяпер...

— Вось яно што,—ціха казаў Няслаўскі.—Вось яно што...

Быццам уся энэргія, колькі яе было, вылецела з цел разам з крыкам на Ларысу і цяпер ён сьцішыўся, асунуўся аслаб.

— Але, тата, рэволюцыя ўздымаецца зноў. Пакорпайся ў сваёй душы, перагледзь усе свае прынцыпы і перакананьні. Абдумай, ці добра паставіўся ты да яе. Ня ўводзь у злосьць яе лішне, ня ўлівай лішняе кроплі горкасьці,— і без таго па самыя берагі горам наліта сялянскае жыцьцё. Зірні навакол, падумай. Аднае гэткае кроплі досыць будзе, каб разьліць кубак гора і пасьляпіць затуманеныя са сьлёз вочы ў людзей. І паўтарыцца француская Жакерыя, больш грозная, больш страшная для вас. Так, для вас.

— Вось яно што... Вось яно што,—праказваў сам сабе Няслаўскі, выходзячы з пакою.

Ларыса стаяла і глядзела ўсьлед яму, велічная, прыгожая, уся авеяная спачуваньнямі да тых, каго сустрэла, ідучы з сяла ў Слаўнае, да тых, што разгіналі пагорбленыя нядоляю плечы і станавіліся на ўсю сваю высачыню, гатовыя рушыць на руйнаваньне.

А Няслаўскі вышаў павольнаю, гэткаю, што адразу стала як у старога, хадою, сышоў на першы паверх. Насустрач трапілася Стася. Ён загадаў паклікаць аконама. Ня сыходзячы з месца, чакаў, пакуль прыдзе той. Пакаёўка не забавілася. Яна зьвярнулася на аднэй назе, як кажуць. Прышоў аконам і зьбялеў адразу, убачыўшы пана.

— Пашліце парабка... Ці не... Паедзьце конна самі і вярніце сялян з Заямнага. Не дапусьціце да сяла... Дагоніце, прывядзіце сюды... ка мне.

— Добра, пане,—пасьпешна адказаў аконам, вельмі ўстрывожыўшыся. Неспакойнае адчуваньне і спалох перайшлі і на яго ад Няслаўскага; грузкаю хадою ён пацялёпкаўся да стадолы.

Няслаўскі пацёр лоб. Пастаяў яшчэ крыху. Потым, цяжка ступаючы са сходкі на сходку, стаў узыходзіць наверх.

У габінэце, куды зайшоў, Ларысы ўжо ня было. Няслаўскі сеў за стол, упусьціў галаву на далоні і сядзеў гэтак доўга-доўга, здалося яму. Пустэльны пакой надаў думкам, калі толькі былі яны ў Няслаўскага, ціхую плыўкую цягуткасьць. Праз гальлё з саду ў вакно пырснула яснае праменьне сонца і абліло сваімі пырскамі стол. Сьвятло і цяплыня ажывілі Няслаўскага. Ён устаў і патупаў у пакой, дзе мусілі сядзець пакінутыя ім госьць і жонка.

Там голасна гаманілі. Няслаўскі ня зьдзівіўся быццам, калі застаў у пакоі не дваіх, а траіх. Варожа збочыўшыся, ля акна стаяла Ларыса. Цені пагарды да прысутных і ўпэўненасьці ў сабе бегалі па твары ў яе, мяняліся адзін з адным і надавалі нейкае перавагі перад маткаю і госьцем.

— Я распарадзіўся,—сказаў Няслаўскі, сеўшы насупроць гасьця.

— Пра што?—запыталася жонка, не разумеючы, чым мог распарадзіцца ён, калі не патрэбны былі пакуль ніякія распараджэньні на тэму іхняе гутаркі аб Ларысе.

— Вярнуць тых людзей назад, тата? Ты добра зрабіў,— сказала Ларыса.

— Вадзім Пятровіч...—сказала жонка, зірнуўшы на дачку.

— Так, я зрабіў гэта, бо нельга было ўжыць ніякіх іншых захадаў. А цяпер трэба вярнуцца да нашае гутаркі. Вось, дачка мая,—голас Няслаўскага здаўся Ларысе кволым, бацькаўскім.—Віктар Вікенцевіч прасіў у нас твае рукі. Мы супроць нічога ня кажам, але апошняе слова даем табе. Ад цябе залежыць твае далейшае жыцьцё.

— Ларыса Вадзімаўна,—выгінаючыся перад ёю пеўнікам, затупаў Віктар Вікенцевіч.

Ларыса не дала даказаць, чаго ён хацеў. Далікатна, але ледзяным голасам яна адрэзала быццам:

— Ніхто мною камандаваць не знайшоў яшчэ такога права. Мяне радуе гэта. А пра замуж я пакуль што ня думала. Можа пайду, можа не. Калі-ж пайду, дык не пасьля такіх раптоўных сватоў.

— Мы-ж змалку знаем адно аднаго, Ларыса Вадзімаўна.

— Тут няма ніякае раптоўнасьці,—раздражнёная, сказала маці.

— Дазвольце мне мець свае думкі,—адказала Ларыса.— Мне ўжо гады вышлі і я, здаецца, магу спадзявацца на некаторую частку поўнапраўнасьці ў сям'і і некаторае самастойнасьці.

— Ці ня ў гэтых рэвалюцыйных мяцежнікаў пераняла ты свае думкі пра роўнапраўнасьць і самастойнасьць?— пагарджальна сказала Няслаўская.

— А хоць-бы сабе і ў іх. Я ведаю, што ў вас усё нутро пераварочваецца дагары нагамі пры гэтай думцы. Ну, а хоць-бы сабе і ў іх. Ці-ж рэвалюцыянэры не заслугоўваюць таго, каб у іх вучыліся і пераймалі. Але, нарэшце, гэта справа нашага з вамі густу. У вас густ такі, а ў мяне іншакшы. Вось і ўсё.

Яна зірнула ў акно і сказала:

— Аднак-жа твой аконам, тата, не ўважаючы на ўсю сваю непаваротнасьць, трохі рухавейшы, як я думала. Трое сялян вярнуліся і ідуць з ім у Слаўнае.

За гэтымі словамі яна вышла з пакою, ня гледзячы ні на каго. Няслаўскі ўстаў і таксама пайшоў, зноў пакінуўшы госьця на жончыну апеку.

З сямі сялянскіх дэпутатаў прышлі толькі тры старых дзяды, з тым самым паперапу, што ўсё гаварыў пану пра клін і ніяк адважыцца ня мог даказаць думкі сялян, з якою выправілі пасланцаў з Заямнага. Рэштка ўчатырох не захацелі вярнуцца,—ня хочуць слухаць дарэмна панскага крыку,—як сказалі аконаму. Няслаўскі закамандаваў прывесьці старых у сталовую, дзе пакаёўка Стася тымчасам расстанаўляла на стале пітво ды розныя закускі.

— Вось, мужчынкі, ня добра вы зрабілі,—пачаў Няслаўскі, як сяляне нясьмела паселі ў застольле.—Старыя вы, зьвекавалі век свой, а паддаліся ўгаварыць сябе блазьнюку, які і сотае часткі ня выспытаў на сьвеце, таго, што вы.

— Мы-ж ня вінны, паночку.

— Я разумею, вы хацелі-б сказаць, што вам нагаварылі перад тым слухаць гэтага хлопца мяцежніка. Яно то крычаць усякі патрапіць, хто горла шырокае мае, але-ж падумайце самі: што можна зрабіць з крыкам. Па даброшчах трэба пагаварыць, паглядзець і так, і гэтак. А крык заўжды толькі крыкам будзе.

Пакуль цяглася гэта ўступная гутарка, прышоў дваровы бацюшка, айцец Паісі.

— Мір дому сяму!—багаславіў ён усіх прысутных.

Старыя паўставалі і нізка пасхіляліся перад ім.

— Дзень добры, бацюшка. Даўно мы бачыліся, добра зрабілі, што даведаліся. У нас тымчасам і справа якраз ёсьць. Сядайце, бацюшка, да бяседы,—запрасіў Няслаўскі.

Айцец Паісі надта не здаваўся на просьбы: поп, дык поп у царкве на служэньні, а ў людзях трэба чалавекам быць. І ён трымаўся ў жыцьці гэтага, адзіна правільнага, на яго думку, пагляду.

— Добра зрабілі, што прышлі, бацюшка, пасобіце нам гора гараваць,—трохі весела казаў Няслаўскі.

Старыя з няпрывычкі, мо' ніколі ня быўшы ў панскіх пакоях, цiснуліся адзін да аднаго. Яны пазіралі на пана, на бацюшку, ды намагаліся рабіць тое самае, што рабілі тыя.

— У нас рахуба вось з заямінцамі. Старасьвецкія пляны нейкія, кажуць, каморніцкія пазнаходзілі, а па гэтых плянах ды мяжа ня так цягне, як трэба.

— Дагаварыцца трэба, дагаварыцца,—адказаў айцец Паісі.

— Ня добра адно толькі, што ў заямінцаў свае падбухторшчыкі. Ужо пачалі круціць-муціць сьветам, старыя дык ці то слухаюць іх, ці баяцца казаць што.

— Лягчэй вярблюду пралезьці праз вушка іголньнае, чымся грэшніку ўступіць у царства нябеснае,—сказаў і строга паглядзеў на старых поп.

Няслаўскі наліў чарку гарэлкі і пачаў прыганяць старых і айца Паісія. Пасьля дзьвёх-трох чарак дзяды пасьмялелі і загаманілі больш падатна.

— Дык я-ж казаў, паночку... Але-ж гора наша ды беднасьць...

— О то вы-б адразу так і казалі,—будзьце за сьведку, бацюшка. Хіба я не пасабляў суседнім сёлам. Нашто ўжо што: аконам, бывала—нашто хавацца—пакрыўдзіць людзей, а прыдуць з крыўдаю і я пасабляў. І выгаварваў ня раз аконаму, што трэба ў ладу жыць з людзьмі. А гэта неспадзеўкі, проста як бунт.

— Беднасьць наша, паночку, ну, не паварухнуцца, ня дыхнуць дый годзе. Дайце рады...

— Глядзіце, старыя, не пасарамаціце свае сівыя бароды на старасьці. На бунтаўшчыкоў, на розных мяцежнікаў у нас, дзякаваць богу, ёсьць яшчэ урадпік са стражнікамі, прыставы. Гэ-гэ, астрогі моцна стаяць яшчэ, няхай ня бунтуюць людзі,—казань казаў бацюшка.

— Адпусьціцеся, паночку,—гаварылі старыя.—Не папусьціце ў крыўду ды ў лішняе гора. Ня дай бог, мяцежу... Расказвалі бацькі, дый самі памятаем, ведаем, што за бунты. Але-ж гора грызе, недаедзь—ці далёка да бунту. Падумай, паночку, ды зрабі якую ласку... Нідзе ня ўзяць зямлі мужыку, за пяць пальцаў ня купіш,—а дзесяцінка, глядзіце, пад сто рублёў падбіраецца. Кожная пядзя тае зямлі, як расінка травіцы, патрэбна мужыку.

— Вось я і зазваў вас, старэнькія, каб па даброшчах ды пасобіць вам. Каб ніхто не казаў, што Слаўнаўскі пан народу не спагадвае.

— Дзякуй, паночку, дзякуй за спогадзь, ды за добрыя словы. Нашы ўнучкі богу памоляцца за вас, успамянуць неблагім словам.

— Пачакайце, вось зараз паклічам аконама. Стася, пагукай сюды аконама.

— Зараз будзе.

— Вось добра. Паглядзіце, што і ў пана сэрца ёсьць, дарэмна ваша маладзёж задзіралася са мною. Ня зла, а дабра жадаю вам.

— Даўно сказана ў сьвяшчэнным пісаньні: „Калі цябе вытнуць у левую шчаку, падстаў і правую...“

— Гэта, бацюшка, пастарэла трохі і да цяперашняга часу ніяк не стасуе,—усьміхнуўся гіронічна Няслаўскі.

— Не забі, не аграбі, не пажадай жонкі бліжняго свайго, дабра яго, ні вала яго, ні...—пераказаў адну за аднэй дзесяць запаведзяй бацюшка.

— Пан клікаў мяне?—запытаўся, прышоўшы, аконам.

— Але, аконам. Вось што я надумаўся. Слухай добра, што я скажу... Слухайце, старэнькія... А потым пойдзеш ды ўпішаш усё гэта ў паперу, а мы падпішам.

— То я слухаю, пан, можна казаць.

— Дык слухай-жа добра, ды не забывай. Я даю Заямнаму той клін, што зацягвае ў іхны палетак, даю скарбовую сенажаць...

— Дармаўшчына, пан?—задзівіўся аконам і падумаў: „А ці ўсе шрубкі пазашрубоўваны ў яго добра, ці не паасслабвалі".

— Маўчы, аконам, ды слухай, што табе кажуць, то потым вып'еш чарку гарэлкі. І не забараняй заямінцам пасьвіцца ў Рачкаўшчыне і грыбы зьбіраць, і ягады рваць, і арэхі. Пра ламачча ды буралом з сухастоем таксама... Ідзі ўпішы ўсё гэта ў паперу.

— Калі панская воля на тое, я ўпішу.

— Ідзі.

Аконам, нездаволены панскім загадам, пайшоў у контору.

— Вось як, старэнькія, каб не казалі, што Няслаўскі пан ня любіць народу.

— Паночку, дарагі!..

— То-ж ласка вялікая!..

— За такую ласку і падзякі мала,—прагудзеў поп.

— Дзякуем, паночку!..

— Што-што, а гэта век не забудзецца!

— Узрадаваў нас, старых, перад сьмерцю.

— Вось гэтак, старэнькія, а то пагражалі мне.

— Даруйце ім гэта, паночку, што молада, то ня трывала. Загарэлася сэрца, ну і сказалі мо' што. Пасталее, ды абрасьце гадамі, дык уся гарачка пройдзе. Як і ў нас вось.

— Дык глядзіце-ж там, пазірайце, каб народу ніхто з ладу ня зьбіваў, бо час цяпер гэтакі. Толькі што якое, дык да халоднае, а мо' адразу да астрогу недалёка.

— Дзякуем за ласку ды за парады бацькаўскія.

— Па-божаму жыць трэба,—настаўляў бацюшка.—Ёсьць гэты сьвет, а ёсьць тымчасам і той. Заслужыць яго трэба.

Аконам прынёс паперу.

— То можаш выпіць, аконам, сваю чарку, што зарабіў сумленнаю працаю.

Няслаўскі зусім павесялеў, кінуўшы вокам на паперу. Падпісаў і падсунуў да старых.

— Мы-ж, паночку, бяз граматы. Ня добра, а можа яно добра, што без яе. От няяк-жа вякуем.

— Ну, то бацюшка падпіша за вас, а вы прозьвішчы кажыце.

— Памаладзіў мяне, паночку,—казаў стары Амелька, нясьвёрда стоячы на нагах ад выпітае гарэлкі.

— Старэнькія! Гэта папера пойдзе да нотарыуса. Ён пасьведчыць, а потым, калі захоча сяло, можна зьняць будзе копію.

— Дык яшчэ раз дзякуем пану і бацюшку. Ды выбачайце на нашае недалікацтва.

Доўга яшчэ дзякавалі Няслаўскаму старыя па сто разоў ў адно месца, пакуль такі пайшлі. На двары іх спыніла Ларыса, распытала, што пан паабяцаў.

— Дай божа здароўя яму, паненачка... Ды зрабіў, чаго прасілі, спагадаў з нашага мужыцкага няшчасьця.

Але адным роспытам не здаволілася Ларыса. У пакоях яна знайшла бацьку і патрабавала, каб той паказаў ёй контракт. Няслаўскі не надаў асаблівае ўвагі таму. Ларыса прачытала паперу і спахмурнела. Потым лёгкаю хадою прайшла па калідоры і зачынілася ў сваёй спальні.

Праз гадзіну ці дзьве, схаваўшы пад гарнітурам ад чужых воч напісаны ліст, адшукала парабка-літвіна і неўзаметку аддала яму залеплены конвэрт.

— Падай, Вітольд... Толькі яму самому ў рукі.

— Добра, пененка.

— Не заві мяне гэтак, Вітольд. Я ня люблю.

— Зраблю, толькі каб аконам пусьціў.

— Я скажу аконаму. Сьпяшайся, Вітольд.

Перад вачыма мігцеўся Ігнасёў сьветлы вобраз, такі любы і блізкі.

## *ЛЯСНЫЯ ГОМАНЫ*

ДАЛЁКА туды, пад вялікія балоты дрыгвяныя ды лясы гушчэразныя, непралазныя, воляю жыцьця кінута невялічкае сялцо. Быццам волат-сейбіт павысяваў з жмені будынкі: як упала хатка на зямлю плячыма к вуліцы, дык так і засталася; як сеў хлеў поплеч з хатаю, так і сядзіць; а то яшчэ стала хатка бокам к вуліцы, а хлеў схаваўся ззаду; гумны парассыпаліся як катораму папала—двор ад-

разу за хлевам, другое ў мізэрным садку трохі паводдаль, а трэцяе—далёка, на водкідзе за агародамі. На адным канцы сяла старэнькая абымшэлая пакасілася каплічка; высокі дубовы крыж, паўвязваны палойкамі льну ды рушнічкамі, чорнымі пазгніваўшымі, пахіліўся на капліцу. На другім канцы, адкуль вузкія дарожкі разыходзяцца ў два бакі, урасла ў зямлю старэнькая, як і капліца, карчомка. Вуліца ў сялцы вузенькая, крывая, вытахчаная ламаччам, як грэбля ў балоце, гразкая, дрогкая пад калясьмі. Па дварох сьметнікі падплыўныя—ня высыхаюць цэлае лета. Вось гэтак і ўрасло сялцо ў балотную твань, зелянiстую, сытую, абырала, паабрастала пляцянікамі, загарадамі паадгароджвалася хата ад хаты і жыве вось гэтак, пнее. Заміж прысадаў у сялцы дзе-ні-дзе зелянеецца смаловая хваіна—і то добра, а не—крушына, жывучая вярба ці алешына. Вось і ўсе прысады. Вось і ўсё сялцо, якое празвалі Балотнікамі.

Гэтае вясны на вуліцы крыху пратапталіся, папрысыхалі сьцежкі, з гора ды з бяды прайсьці можна пасуху. У сялцы сьвята, сельскае сьвята Юрай. Пад поўдня маецца прыехаць поп тутэйшага прыходу і адслужыць службу ў старэнькай каплічцы, дзе як дзесяці чалавекам толькі стаяць.

З жытніх галаў, што дзе-ні-дзе пазагубваліся паміж балота і лесу, сыходзяцца ў сяло расавальнікі. З кайстрамі за плячыма паперадзе ідуць старэйшыя. За імі малодшыя вядуцца з хлапчукамі. І вуліца ў Балотніках пачынае ажываць. Ад карчомкі чуецца п'яны голас песьні.

Дзе Юрай ходзіць,
Там жыта родзіць.
Дзе ня бывае,
Там занывае.

Голас паволі ўходзіць у сяло. На вуліцы ўжо зьбіраюцца ў кучкі і старыя мужчыны, і хлоццы гуляюць у біткі. Чалавек, што засьпяваў „Юрая“, падыходзіць да першае кучкі, дае „добры дзень“. Яму адказваюць разам некалькі галасоў і запрашаюць гуляць у біткі. Чалавек вымае з кішэні варанае ў цыбуліных шалупках яйцо і гаворыць так ціха, але як чуваць усім:

— „Ад веку мы спалі...“

Ніхто не адказвае яму на гэтыя словы. Усе наперабой падсоўваюць рукі з яйкамі. Чалавек стукае ў яйцо, што бліжэй да яго падсунулася, прабівае бітку, аддае і ідзе далей. Ніхто яго ня знае, але і ня пытаюцца, адкуль і што. Каля другое кучкі зноў тое-ж самае. Зьдзіўленьне і неймавера становіцца ўвагу ў чалавека, і ўсё п'яненьне, з якім

ён сьпяваў „Юрая,“ на хвіліну ўтрачваецца. Але ён праганяе ад сябе сумненьне і, падыходзячы да новае кучкі бітцоў ціха гаворыць:

— „Ад веку мы спалі...“

З паўсялца ўжо прайшоў гэты чалавек. Але не супыняецца,—з нейкім цьвёрдым намерам падыходзіць упарта ад кучкі да кучкі і ў кожнай, раней чымся згуляць у біткі, ціха шэпча:

— „Ад веку мы спалі“...

На асяродку сялца адзін жартаўлівы стары ўзьняў сьмех, калі пачуў гэта.

— Глядзіце. Чалавек сьпіць цэлы век, ха-ха!

Усе зарагаталі. А той засьмяяўся таксама і пайшоў, далей.

Тымчасам з другога канца, дзе капліца, у сялцо ступіў другі чалавек. Апрануты ў парабчаную сьвітку, у старых ботах, ён прайшоў, відаць, вялікую дарогу. Ногі марудна ступалі па ламаччы, а сам ён усьпіраўся на сукаваты дубовы кій. На асяродку яны сустрэліся. Першы, не даходзячы да другога, праказаў:

— „Ад веку мы спалі...“

І другі на адказ:

— „і нас разбудзілі...“ Дуб?!

— Але... Гэтак мяне людзі клічуць. Навіны якія?

— Паперка Ігнасю.

— Выйдзем за гумны, а то я прымігаўся ўжо кожнаму тут.

Яны зьвярнулі ў гразкі двор, якім вышлі на прыгумень, а там і за гумны, дзе поплавам вілася вузенькая сьцежачка. Гэтаю сьцежачкаю выладзіліся яны ў той канец пад карчомку і ўзышлі на разгружаную дарогу, што цягла ў лес.

Лес, як сьцяць вокам, цяг на поўдзень цёмнаю высокаю сьцяною. На ўскраі парос высока крохкі крушыньнік, алешнік, ды парасьсядаліся шырока густыя лазовыя кусты. А трохі паводдаль зеленеюць простыя, як сьвечкі, смаловыя яліны, дзе-ні-дзе хвойнік, а то пракінецца часам асіна, граб, ясень ці дуб. Густы мох усьцілае дол, бярэцца на камлі дрэў, лезе па іх высока ўгару і там хаваецца ў гальлі. Пахне гнілым дрэвам, мокрым мохам і смалою.

— Хадзіць тут дрэнна, горш як па балоце,—сказаў Дуб.— Сьлізіць нагу на гэтым мокрым карэньні.

— Н‘ але,—адказаў толькі яго спадарожнік.

Неўзабаве яны збочылі з дарожкі і падаліся па цаліне, па якой рэдка калі ступала мо‘ нага чалавечая. Чым далей у лес, чым глыбей убіраліся яны ў паблытаны гушчар, тым усё горш, цяжэй было ісьці. Наперадзе трапляліся паабра-

станыя мохам гнілыя калоды. Часам грубезныя дрэвы, ад старасьці пападаўшы далоў, загароджвалі дарогу і трэ' было абыходзіць іх. Нізкае гальлё ад хвой ды ялін параспострывалася ва ўсе бакі, павыстаўляла на варту гострыя іглінкі і хвастала па твары. Звонка засакатала ўгары нейкая птушка. З-пад самых ног выскачыў ліс і, як зглѐдзець, дзерпануў туды, на ўскрай лесу.

— Цьфу, каб ты прапаў нечага, — сказаў Дуб.

— Траха ня спужаў.

— А тварыны, тварыны тут, відаць,—азваўся яго спадарожнік.

— Уга, брат... Паляўнічаму за маё-маё пражывіцца можна.

Яны зноў памоўклі. Быццам-бы лес веліччу сваёю душыў усякія чалавечыя імкненьні і вялізны ды высозны толькі пасьмейваўся сабе ў старую імшаную бараду. Доўга яшчэ ішлі яны. Лес не радчаў, а яшчэ гусьцейшы станавіўся. Малады парасьнік уплятаўся ў пазьвісалае гальлё старых ялін, дубоў. Часам хоць бяры сякеру ды прасякай дарогу. Яны моцна натаміліся, калі, нарэшце, паміж дрэў пасьвятлела трохі і стаў відзен невялічкі прагалак. Там забрахаў сярдзіта сабака. На яго азваўся чалавечы голас. І нашы вандроўнікі выбіліся на гала ўсё ў карчох.

Па сярэдзіне, крыху ўправа, стаяла гонтамі накрытая дашчаная будыніна. Ці то мо' ад старасьці, ці ад таго, што людзі пакінулі яе, будыніна асела, рассунулася. Гонты сям-там пагнілі і пабіліся на дзіркі. Сваёю апушчанасьцю нагадвала яна стары хлеў у разбураным фальварку зьбяднелага якога шляхціча.

У выйсьце без дзьвярэй высадзілася перш галава, а потым і сам чалавек вышаў на двор. За ім выбег сабака і, забрахаўшы зноў, кінуўся насустрач тым, што прышлі.

— Пайшоў вон, Кіяш!—крыкнуў чалавек і здалёк яшчэ запытаўся ў Дуба:—Што-ж нешта скоранька зьвярнуўся?

— А бачыш, госьця прывёў, Ігнась. Пазнай, каго?

— Ды гэта-ж Вітольд!—радасна клікнуў той, калі Дубаў госьць вышаў наперад.—Хутчэй-жа вы ідзіце,—казаў Ігнась —Ну, здароў, здароў, Вітольд! Што-ж ты новага прынёс нам?.. Мы, як ваўкі, вось, у лес пазалазілі—бачыш. Са старое разбуранае смалярні хату сабе змайстравалі і сядзімо, як у бярлозе ў тэй.

У смалярні былі людзі, гаманілі. Гул галасоў ішоў да выйсьця, расплываўся і тануў на дварэ.

— А я з даручэньнем прышоў,—сказаў літвін Ігнасю. Ліст прынёс табе.

Сэрца ў Ігнася скокнула раптам і потым шпарка-шпарка закалацілася ў грудзёх.

— Давай... Давай... Калі-ж з дому?.. Схаваў далёка. Давай.

Ён ухапіў пакамечаны перагнуты надпісам у сярэдзіну конвэрт. Не сьпяшаючы разадраць, Ігнась узіраўся быццам у надпіс на ім, пераварочваў па некалькі разоў і, нарэшце, зьвярнуўся да літвіна:

— Заходзь, Вітольд, адпачывай. Натаміўся-ж, нябось.

— Вельмі, па лесе ідучы.

— Дзіва што. Цяпер ня добра хадзіць па гэтых балотах ды лясох. Дык ідзі... Ці мо' сказаць яшчэ хоч што. Не? Ну, пасьля пагамонім, ідзі адпачні трохі.

Літвін не надаражаўся надта, каб яго прасілі, і зайшоў у смалярню, дзе ўжо быў і Дуб.

З васьмёра мужчын—хто ў парыжэлых ботах, а хто ў лапцях—сядзелі або ляжалі па ўсланым яловымі лапкамі доле. У каго каля рукі дубальтоўка, у каго паядынка-цэнтралка, а то і бярданка.

Цераз плечы зьвісаюць паляўнічыя скvраныя торбачкі з начыньнем паляўніцкім. Адзін пачапіў сетачку на зайцоў. У аднаго добры паляўніцкі патранташ-пас абкруціўся вужакаю па брудным, зашмальцованым кажушку. Дымілі люлькамі, грубымі цыгаркамі. Нібы паляўнічая аблава на ваўкоў прыпынілася пасьля цяжэразнае работы—пераходаў адпачыць у бывалешняй, цяпер забытай людзьмі, смалярні. Гэтак кінулася ў вочы літвіну Вітольду.

Як увайшоў новы чалавек, усе моўчкі паглядзелі на яго, і потым зноў кожны аддаўся свайму занятку. Літвін сеў недалёка ад Дуба, узапёрся на локаць і з адчуваньнем прыемнага адпачынку працягнуў ногі.

— Нашы далёка пайшлі на паляваньне?—папытаў Дуб у таго, што быў з патранташам.

— Пад бірулінскія балоты, казалі.

— Хлеба вось няма, дасталі-б.

— А тут і не дастанеш нідзе, бедна народ жыве. Балота ды лес... Грыбоў або мёду барджэй знойдзеш, як хлеба.

— Праўда, галота адна тут... Да паноў, мусіць, стукацца трэба.

На дварэ забрахаў радасна Кіяш. Загаманілі два ці тры галасы.

Барадаты рыжы дзядзька пацісную на галаве паношаную зімовую шапку з маладога баранчыка, падсунуў да сябе дубальтоўку і выцадзіў праз вусы:

— Дакуль сядзець вось тут? Халады па начах, вільготна .. Каб гэта работу якую рабіць, а то—дакуль гэтак сядзець?

— Будзе работы, яшчэ наробімся,—адказау Дуб і ўстаў і пайшоў на двор. Там чмелем загудзеў яго голас, перапыніўся радасным зьдзіўленьнем:

— А я думаў загінуў ты дзе! Э-э-э, добра, што прышоў.

— Згарыць яно няхай... Вас знайсьці, дык трэба ногі адхадзіць.

Потым у смалярню ўвайшоў Арон.

— Хто сходзіць паляўнічых пашукае, бо можа забавяцца, а яны патрэбны тут.

— Я пайду,—устаў рыжабароды дзядзька.

— Ну, добра. Толькі, каб хутчэй гэта.

— На аднэй назе зьвярнуся. Бірулінскія-ж балоты тут пад бокам,—адказаў дзядзька і, узяўшы дубальтоўку, вышаў сьледам за Аронам.

Арона чакалі за смалярняю Дуб, Ігнась ды Майзэль. Нэрвовы змаганец з Бундам, не ўважаючы на вялікую дарогу, што зрабіў сёньня, і дрыматкую цягуткую змору, якою налівалася ўсё цела, не пакінуў свае нэрвовасьці. Ён стаяў як на спружынах, увесь час размахваючы рукамі, хваравіта выгукваючы словы, злосны на жыцьцё, на сваіх ідэйных супрацоўнікаў, цьвёрды ў сваіх прынцыповых перакананьнях.

— Хадзем, хадзем...—падганяў ён, як толькі Арон падышоў і падумаў пра нешта сказаць.

— Сеў-бы ды адпачыў трохі. На нагах толькі-толькі стаіш,—жартам праказваў той да Майзэля.

— Халера мяне ня возьме. Але чаго стаяць? Гаманіць дык гаманіць, а справа—справаю.

— Не перайначаў ані, Майзэль,—паківаў галавою Дуб.

— Такі самы застаўся, які і быў. Чаму гэта кепска, мо' скажаш?

— Ды каб горшага кепства ня было. А памятаеш, як я раіў табе лячыцца. Ну, вось-жа. Ты ўсё адно не паслухаў.

— Ліха мяне ня возьме—няма ўжо чаго браць.

Ён нэрвова расшпіліў зімовы пінжачок і расхлябесьціў сухую, упалую, зусім як у малога дзіцяці, вузкую грудзіну. І сказаў:

— Ат, добра, калі год ці два парыпаю яшчэ, а мо' і таго ня выцягну.

— Глупства не гавары, Майзэль. Хадзем.

Усе чацьвера перайшлі прагалкам і ўступілі ў лес. Крокаў з дваццатак прайшоўшы, спатыкаючыся на паземнае карэньне, яны напаткалі ляжачую грубую асіну і паселі на камлі.

— Увесь комітэт, выключаючы аднаго Стрэлкі.

— Дай сказаць,—усхапіўся Майзэль.

— Сядзі-сядзі, не ўставай, калі ласка. Будзь трохі спакайнейшы,—перапыніў яго Арон.

— Трэба надумаць, што рабіць нам,—азваўся Дуб.—Паляўнічым маім абрыдзее зараз жыць гэтак. Калі рабіць, дык трэба рабіць нешта.

— Яшчэ памяркуйма наогул, ці варта ўсчынаць якую баталю. Можа з таго выдзе, як з пораху: пшык і няма.

— Ня трэба мысьліць, як здрадніку. Прэч усякую хісткасьць. Сьмела руш наперад—і кончана. А то яшчэ можа таргавацца пачніцё са сваім сумленьнем.

— На аднэй гарачцы ня выедзеш, Майзэль,—сказаў Ігнась.—Часам ня шкодзіць і параіцца.

— Дык вось я кажу,—абазваўся зноў Дуб,—гультаяваць людзям няма чаго.

— Ты хоч сказаць: або мы пакажам сваю палітычную няўстойлівасьць, або на „ура“.

— Дайце сказаць,—парываўся Майзэль.

— Кажы.

— Дарэмна вы залезьлі сюды. З ваўкамі ўначы хіба весялей.

— Ага...

— Ды давайма-ж па-людзку гаманіць,—сказаў Ігнась,—спрачацца карысьці мала.

— У спрэчках нараджаецца ісьціна, Ігнась, — адказаў Арон,—але ня ў тым справа. І сапраўды можа ня варта спрачацца.

— Дык я прапаную... Сялянства, прыціхшы было за зіму, з надыходам вясны зноў заварушылася. Сюд-туд выбухае змаганьне з памешчыкамі. Паны ня вельмі задавольваюць сялян. І вось тут пачынаецца бражэньне, пра якое думалі, што яно ўжо ўціхла і апала ўканец. Там, дзе непарадкі вызначаюцца хоць трохі, трэба распаліць агонь нянавісьці да паноў, падштурхнуць сялянства на рэволюцыйныя ўчынкі. А там... організаваць баявыя дружыны, адбіраць зямлю ў паноў і дзяліць паміж сялян. Вось як думаю я. А вось і ліст у мяне, прынёс сёньня з Слаўнага наш літвін...

— Я прызнаю гэта няправільным. Мы, соцыял-дэмократы, у першай чарзе мусім клапаціцца пра лёс рабочых,—не ўцярпеў Майзэль. Я настойваю, каб сёньня з дружынаю выступіць на горад, а то заселі ў глушыні—і хоць ваўкамі вый.

— Пакінь, мы з пэўным намерам прышлі сюды і ні на кіпець не вінаваты, калі нічога такога вельмі не зрабілі. Кажу, што не зрабілі, але-ж гэта таму, што не насьпела яшчэ тут,—сказаў Дуб.

— Нічога вы ня зробіце тут, апроч памылкі.

— У гэтых словах можа частка праўды і ёсьць,—загаманіў Арон.—Можа мы памылку ўжо зрабілі, што залезьлі сапраўды ў такую глушыню. Тут гэткі цёмны народ, гэткі прыгнечаны, што яго вельмі цяжка запаліць рэволюцыйнаю іскраю. Патрэбна было-б мо' вялікае полымя, каб зварухнуць яго на гэтых балотах ды ў лясох.

— І я так думаю, што без вялікае агітацыі тут нічога не паскураеш,—сказаў Дуб.

— Трэба пасоўвацца наперад, учыніць напад, нагнаць спалоху на паліцыю, разварушыць рабочых, узьняць сьцяг паўстаньня, сьцяг рэволюцыі над горадам, і да нас пацячэ тады, як да сьвятога месца, народ.

— Апрануты ў шынэлі, з вінтоўкамі ў руках, каб перастраляць нас, як варон. Ведаем, Майзэль, ня нова гэта ўжо. Чулі мы пра паўстаньні з барыкадамі ў Маскве, пра захопы гарадоў у Царстве Польскім. А што вышла? Паўстанцы не дасталі сабе дапамогі ад самых шырокіх пластоў насельніцтва, не—і здаліся. Нашто ўжо куды далёка залазіць. Бачылі, што было з нашымі дэмонстрацыямі.

— Вы ня верыце ў моц пролетарыяту...

— Яго ў нас тут і няма, як гэткага.

— Вы ня верыце... Як той чыгуначнік. А яшчэ прыпаручылі яму быць у комітэце, давяралі пропаганду весьці ў рабочых. Цяпер ён гаворыць, што іскраўцы-бальшавікі ў Маскве на бойню вывелі рабочых, што ня трэ' было выступаць са зброяю ў руках.

— Зразумець трэба, Майзэль, што мы не падрыхтаваліся яшчэ, каб рабіць паўстаньне ў горадзе. Рабочых у нас ня гэтулькі поўна, каб аднэю іхняю сілаю пачынаць бой.

У лесе прагрукацеў стрэл. Застагналі векавечныя дубы ды асіны. Пошчак паплыў далёка лесам.

— Ну, вось, і паляўнічыя нашы вяртаюцца, трэба дагаварыцца,—сказаў Дуб.

— Я-ж казаў,—зноў загаманіў—Ігнась,—што трэба ісьці туды, дзе сялянства хвалюецца, дзе пачынаецца бунт супроць паноў. Мне пішуць у лісьце, як паны спрабуюць абдурыць сялян, даючы ім, як падарунак на кавалак хлеба, каб пасьля скуру злупіць за гэта. Мы не павінны дапусьціць да таго. Наша агітацыя, а часам дзе і ўзброеная сіла, павінны паставіцца супроць панскага залагоджваньня і ўціхаміраньня сялянства. Мы не павінны даваць паном магчымасьць адцягваць сялянства ад рэволюцыі...

— Такім парадкам мы злучым у адно рэволюцыйнае імкненьне рабочых і сялян, не пакідаючы намагаць сярод рабочых на паўстаньне, будзем падштурхваць дзьве вялікія

сілы да сумеснае барацьбы, каб супроцьставіць агулам паліцыі і яшчэ цёмнаму і вернаму царовай прысязе войску.

— Новую тэорыю ты расказаў, Арон,—задумаўшыся раптам сказаў Майзэль і можа раз за ўсё сваё жыцьцё не сказаў нічога насупроць, не занэрваваў.—Паглядзімо.

Тымчасам да старое смалярні падыходзілі паляўнічыя. Дзень міргаў вечару, каб ня бавіўся, каб ішоў хутчэй. Цень ад шчыльнае сьцяны высокага лесу, як коўдраю цьмянаю накрыў прагалак у лесе, гнілыя карчы на ім і паўразбураную смалярню. Дуб устаў.

— Хадзем пагаворым з хлапцамі.

— Пойдзем, раскажам.

— І параімся ўсе разам.

Калі прышлі ў смалярню, усе людзі былі ў зборы. Некаторыя адпачывалі, лежачы, некаторыя скублі застрэленых птушак, а рэшта сядзелі, пакурвалі ды перакідаліся рэдка словамі.

— Мо распалім агонь, хлопцы, халаднець нешта пачынае. Вось колькі таго сонца, здаецца, а няма—дык і ня тое ўжо.

Па Дубавай прапанове ўраз пананосілі сухога ламачча, падпалілі. Зьверху панакладалі смаловага сырога гальля і праз якіх тры хвіліны ўжо гарэў добры агонь. Усе паадступаліся, пасталі наўкруга, адварочваючыся ад едкага дыму, што неахвотна цёг угару праз вузкія дзіркі ў гонтах.

Майзэль сеў доле, падсунуўся блізенька к самаму агню грэцца. Мусіць зьмёрз, бо выстаўленыя рукі трымцелі і хапалі агнёвыя языкі.

Тады Арон пачаў гаварыць.

## СУТЫЧКІ

ЦЁМНАЕ ночы баявая дружына соцыял-дэмакратаў пакідала лес. Па адным, па два ішлі моўчкі дружыньнікі, кожны думаючы сваю думу. Паперадзе, цяжка ступаючы, ішоў Дуб. Яго высозная постаць, як з тае казкі пра асілкаў, выступалася з цёмнае гушчыні ночы, і здаваўся ён вялізным, магутным.

Ігнась ішоў пасярэдзіне і яму трохі відаць было Дуба. На грэблі за Балотнікамі яшчэ не павысахла і калясьмі павыбіваліся глыбокія гразкія ямы. Хлюпацела пад нагамі, спатыкалася на ламаччы, якім вытахцілі балотнікаўцы грэблю. Адзін з пярэдніх дружыньнікаў паляцеў потыч. Заднія абмі-

чулі, а ён устаў, вылаяў грэблю, тых, хто рабіў яе, плюнуў па прывычцы і пайшоў сьледам за ўсімі.

Па самым задзе ішлі Майзэль з Аронам. Таксама моўчкі. Ішлі, спатыкаліся, уставалі і падалі. І ў кожнага было сваіх думак, навеяных гэтым паходам, і ў кожнага яны чапляліся боязна за далейшае, за будучае. Ня было флегматыкаў: „што было, то бачылі, што будзе, то ўбачым". Мінулае цесна зьвязалася з гэтым цяперашнім, так што кроку ня ступіць без яго, ня цягнучы за сабою.

А цёмная ноч гэтак спрыяе думкам. Адна за аднэю выплываюць яны з глыбокага падсьвядомага, завіваюцца ў клубок, і гэты клубок коціцца па грэблі, пакуль не канчаецца яна і ня выводзіць на гладкую, роўную дарогу ў поле. Тады кожны чуе пад нагамі цьвёрды грунт, неяк лёгка і радасна ўдыхае на поўныя грудзі начнога вільготнага паветра.

— А няхай ты запустуй, такая грэбля. Галаву скруціць можна,—абазваўся нехта.

Ніхто не адклікнууся на голас. Усе згодны з ім, але цяжка гаманіць неяк, маўчаць і думаюць, бы язык некім магутным узяты на прывязь, а вусны на замок. Хочацца думаць, маўчаць ды ісьці, пакуль ногі не падгібаюцца і падкажуць, што трэба спыніцца адпачыць.

Дружына ішла, пакуль начныя птушкі не ўгаманіліся і не паселі на разорах, натаміўшыся за доўгую ноч. Узброеных маўклівых людзей пры сёлах ды фальварках сустракалі сонным нездаволеным лемантам сабакі. З-пад самых ног у Дуба ўзьляталі жаўранкі і спалоханым крыкам сваім абуджалі на хвіліну няжывую цішыню гэтых палеткаў.

Дуб ня пускаў нікому свайго месца наперадзе, быццам і зморы ня было на яго. Як выліты з трывалюшчага жалеза, ішоў паперадзе цьвёрда, бы зачараваны чымсьці вабным у прыгожай далячыні.

І як пачало брацца на дзень, дружына прыпынілася ў густым маладым ляску.

— Да сонца пабудзем,—сказаў Арон.

Майзэль як сеў, дык і прыкіпеў. Гэтак цяжка паварухнуць рукою ці нагою,—як валавяныя парабіліся. Ён скурчыўся, падгібаў ногі і, паставіўшы каўнер, праз якую часіну стаў засынаць. Каму як лепш, пакладаліся ўсе. Але зямля была вільготная і халодная. Да спатнелых і ўтомных дружыньнікаў падкраўся ранічны веснавы холад. Тады адзін па адным сталі прачынацца, зьбіраць ламачча і класьці агонь. Прачнууся і Майзэль. Зуб на зуб не пападаючы і каб пагрэцца, ён пабег зьбіраць ламачча. Назьбіраўшы і ўскінуўшы на агонь, чакаў, пакуль разгарыцца, і моцна

размахваў—біў сябе рукамі, разганяў кроў ды набіраў цяпла. А калі ўспалыхнуў агонь і іскры паляцелі ясныя ўгору, схіліўся бокам ля другіх і пад звонкае патрэскваньне агню задрамаў. Адзін за адным пазасыналі напярэдадні дружыньнікі, прыемна адчуваючы як грэе ласкавае прытульнае цяпло. Асьветлены фантастычна мірглівым агнём, які то ўспалыхне раптам, то возьме заціхне і пацьмянее, лес зноў занурыўся ў спакойны свой сон. І ніхто, і нішто ня трывожыла ўжо яго да самага сонца.

Першы прачнуўся сабака Кіяш. У сяле за ляском трубіў пастух, выганяючы жывёлу на пашу. Кіяш адклікнуўся моцным прыхільным брэхам і ўзбудзіў людзей. Агонь патух, толькі галавешкі яшчэ тлеліся, засыпаныя белым мяккім попелам.

Шчабяталі птушкі, шукаючы пажывы. Кракалі на полі гракі. Жаўранкі серабрыстым раўчучком лілі з вышыні сваю звонкую песьню раніцы і вясьне.

Дружына выправілася ў паход. Абмінаючы вялікія дарогі і мястэчкі, паўз сёлы і фальваркі, спынілася яна з поўдня вёрст сём ад Слаўнага і вёрст дзьве ад Хорашава.

Комітэт стаў раіцца, як і ўчора. Параіўшыся, вырашылі дружыну па два, тры чалавекі пусьціць на суседнія сёлы. Прызначылі гэта добрым таму, што бліжэй да гораду было больш чымся дзе панскіх двароў, і сялянства тут было асабліва прыгнечаным. Трэ' было штурхнуць яго, распрапагандаваць і выправіць у бой на пана.

Перад тым, як разыйсьціся, Арон сказаў колькі слоў да дружыны. І калі разьвітваўся з кожным, моцна цiснучы жорсткія, на мазалёх усе рукі, дык адчуваў, як кроўна зьвязаны з імі, і сэрца то сьціскалася, то поўнілася яно кволым братэрскім пачуцьцём да гэтых дужых барадачоў. Гэтак не хацелася разыходзіцца. Але-ж пайшлі яны, абраўшы за зборны пункт дружыны лясок Няслаўскага.

— Прывітаньне Любе перакажы, Ігнась,—сказаў толькі.

Адзінота тады невясёлая насунулася на Арона і ён з Майзэлем накіраваліся ў горад, як умоўлена было ўчора за Балотнікамі.

Засталіся толькі з усяе дружыны Ігнась, Дуб з Ясем ды літвін Вітольд. Апошняга Ігнась адвёў набок і нешта сказаў, пасьля чаго той таксама разьвітаўся. Потым Ігнась утрох з Дубам і Ясем павярнуліся і ўтомнаю цяжкаю хадою ўзяліся на Хорашава.

У Хорашава як прышлі, дык Люба была дома. Толькі зьбіралася палуднаваць. Убачыўшы Ігнася, радасна ўстала насустрач.

— Ігнась...—праказала квола гэтак.

Але за ім паказаліся і ўвайшлі ў школу Дуб з Ясем і словы каханьня і любасьці вярнуліся ў сэрца, што радасна і лёгка так застукацела раптам.

— Дзень добры ў хату!—сьмяхотліва прывітаўся Дуб. І зірнуў на Ігнася так, быццам сказаць хацеў: „Ведаем мы, галубок, што цябе прыцягло сюды“.

— Вось-жа якія вы нядобрыя,—казала Люба.—Хоць-бы-ж наказалі, дык ведала-б як, з чым сустрэць. А то і пачаставаць няма чым.

— Такія ўжо вельмі госьці,—сказаў Дуб.

— Не кажыце, самыя дарагія госьці.

Дуб зноў сьмяхотліва паглядзеў на Ігнася. А той злавіў яго зірк і жартліва перапытаў у Любы:

— Няўжо?

— Вось табе і няўжо.

Згледзела і яна Дубава жартаваньне з Ігнасём.

— Дык сядайце хіба, чаго-ж стаяць. Дарога, відаць, не малая была, вунь як паапырскваліся. Можаце памыцца. А я пайду ўжо прыстараюся, чым магу для дарагіх гасьцей.

— І за тое дзякуем,—прагудзеў Дуб.

У Хорашаве прабылі ўвесь дзень. Папалуднаваўшы, Дуб з Ясем далікатна адгаварыліся, быццам нейкая справа ёсьць ім у Хорашаве, і пайшлі. Ігнась застаўся з Любаю.

— У мяне, Ігнась, нешта ёсьць для вас.

— Мо' цацка якая?—пажартаваў Ігнась.—Памятаеш, як ты некалі, прыехаўшы на каляды з гімназіі да дому... як ты ўзрадавалася, калі я сказаў, што ў мяне нешта ёсьць.

— Памятаю. Не, Ігнаська,—сур'ёзна, поўным любасьці голасам, адказала Люба.

Успаміны з дзяціннага нахлынулі пры гэтых словах і нейкі жаль стаў ад таго і хараство неперажытае навеялася ім. Як-бы добра было пастаць зноў дзецьмі, радавацца сваімі радасьцямі, жыць сваімі клопатамі. Ах, колькі прыгажосьці ў дзяцінным мінулым. Ах, колькі сонечнага шчасьця пастарэўшаму здаецца там, калі зірне ён узад, разьвясельваючы сваё будзённае цяжкае жыцьцё, спрабуючы прагнаць ад сябе няўдачы і гора.

Абое падпалі гэтаму ціхаму настрою, паддаўшыся магутнай, але кволай сіле крохкіх успамінаў. Люба прынесла кніжачку ды гатак села з ёю, не падаўшы Ігнасю. З расслабленых пальцаў выпала кніжка і, упаўшы далоў, вярнула Ігнася з Любаю ў сёнешняе.

— Што гэта за кніжка, Люба?—папытаўся ён.

— Вазьмі, прачытай. Нeяк надоечы я дастала яе ў Заямным. А цяпер дык і ў Хорашаве ўжо ёсьць.

Ігнась падняў і прачытаў.

— „Аб чым у нас цяпер гаманяць“.—Назва дык вельмі цікавая.

— А пачытай з сярэдзіны

Люба ўзяла, адгарнула колькі старонак і паказала пальцам, адкуль чытаць.

— Што такое?—прачытаўшы колькі старонак, сказаў Ігнась.—Кім і да каго гэта пісана? „Падумаем цяпер, чаго стоянь усякія намовы рубіць чужы лес, забіраць чужую зямлю, а нават паліць і рабаваць двары; нічога ня варты гэтыя намовы і многа могуць прынесьці шкоды таму, хто іх слухае... і будуць плаціць цэлыя вёскі за тое. што два, тры дурні слухалі злых людзей-бунтаўшчыкоў“...—Што такое?—перапытаў Ігнась другім разам.

— Кніжка, Ігнась,—кніжка, напісаная на нашай роднай мове. І загэтым чытаецца яна сялянствам, ходзіць па руках ад аднаго к аднаму, па ўсіх сёлах. Вось, што гэта такое, Ігнась.

— Гэта провокацыя, Люба. Нельга і падумаць нават, што гэта пісалася з прыпаручэньня політычнае партыі.

— Хто яго ведае,—ухіліўся з адказам Люба.—Я табе пакажу яшчэ толькі дзьве мясьцінкі. Вось, тут во адсюль і дагэтуль. Чытай уголас.

Ігнась паслухаў і вычытаў:

„Ёсьць людзі, што кажуць, быццам тады будзе на сьвеце справядлівасьць, як мужыкі ўсе землі казённыя і панскія разьдзеляць паміж сябе. Не ня будзе гэта справядліва. Ці-ж было-б справядліва, каб мужык у вёсцы, што мае паўвалокі зямлі, напаў на свайго суседа і адабраў у яго зямлю, дзеля таго толькі, што той мае цэлую валоку; або каб мужык, што ня мае каня, пайшоў к свайму суседу і самавольна забраў-бы яго каня і стаў ім рабіць на сваёй зямлі. Каб усё гэта пайшло, ня было-б канца заборам, заўсёды найшоўся-б такі, што мае меней за другога, і адбіраў-бы ў суседа яго зямлю і дабро. Але няхай прышоў такі час, што ўсякі дастаў пароўну зямлі, лесу, сенакосу і дабра; ці быў-бы тады рай на зямлі? Нядоўга-б народ цешыўся гэтым раем: адзін пачаў-бы працаваць, зьберагаць, ня глуміў-бы свайго лесу, не пражываў-бы грошы, і зямля-б яго добра радзіла; другі гультаіў-бы, ляжаў на печы, запусьціў-бы зямлю, лес прадаў жыдом, грошы б прапіў і згалеў-бы, як бізун—вось зноў была-б няроўнасьць; гэты гультай, змарнаваўшы ўсё, што меў, пайшоў-бы адбіраць зямлю і дабро ў працавітага суседа. Ці-ж гэта была-б справядлівасьць? Тады-б гультаі і п'яніцы заўсёды лепей выходзілі-б ад працавітых і цьвярозых людзей, і нікому-б не хацелася зьберагаць і праца-

ваць. Ня дай бог такой справядлівасьці; але, на шчасьце, такога парадку нідзе на сьвеце няма, ня было і ня будзе"

— Вось якая гэта кніжка, Ігнась.

— Адкуль яны бяруцца на сёлах, хто іх раздае?

— Той, каму патрэбна.

— Дык хто-ж? Хто? - нецярпліва ўжо пытаўся Ігнась.

Люба падумала, быццам, наважвалася— сказаць ці не. Адказала:

— Няслаускі. Чуў-жа мо'што ў яго нарабілася з заямінцамі.

— Чуў,—сказаў, успамянуўшы пра ліст, Ігнась.

— Што табе казалі, дзе?

— А ідучы дарогаю нейкі дзядзька расказаў,—пахапіўся, схлусіў Ігнась. — Што-ж пры цяперашнім змаганьні, калі кожны пан ды так зробіць, дык пра рэволюцыю мусіць і думаць ня варта.

— Не гавары пра гэта, Ігнась,—убачыўшы, што благія весткі хвалююць яго і яму балюча, папрасіла Люба.

— А што-ж, маўчаць можа? Не, крычаць трэба, на ўвесь толас крычаць, дзе толькі можна, каб пачуў народ і ўразумеў, што паны робяць з ім. Праз год ці два, калі—не пайдзі на ліха—усе двары ўмалёкаюць гэтак нездаволеных, з мужыка злупіцца дзесяць скур, ды ў дадатак усё, што дасца, адбяраецца назад. Няўжо не дагадваюцца людзі, што рыхтуюць яму, у якую хітрую пастку заманьваюць. А кніжачкамі, дык Няслаўскі пропаганду разводзіць... Дык гэта ён са сваёю Грамадою дайшоў да такіх кніжачак...

— Ігнась! Ігнась, няўжо мы сустрэліся, што бывае гады ўрады, каб гаварыць з абурэньнем пра розных Няслаўскіх. Ці-ж у нас ням чаго сказаць адно аднаму? Ігнась...

— І тое, што ёсьць у нас, моцна ўплецена ў тое, што дзеецца навакола, што робіцца ў жыцьці, ад якога мы ня можам стаць у баку.

— Вось, які ты, Ігнаська... А сэрца... А наша каханьне!.. Няўжо-ж яны ня частка ўсяго жыцьця. Няўжо-ж гэта чужое, ня людзкае? Ігнась! Успамяні поплаў... раку летась... сонца... кветкі...

— Люба... Ты мучыш дарэмна сябе Я памятаю... усё памятаю добра, слаўная мая, дарагая Люба!..

Любіныя рукі ўпалі Ігнасю на плечы і галава схілілася яму на грудзі.

Чорныя бліскучыя валасы раскруціліся з куклы і кучарава-шаўковымі хвалямі пабеглі Ігнасю на калены, на рукі.

— Дарагая... Слаўная... Любка мая,—праказаў ён, квола-квола гладзячы чорны шоўк валасоў, стройныя плечы, белыя рукі...

I так шкада было выпусьціць іх пасьля, гэтак шкада было пакінуць дакранацца да яе, маладое, каханае. Але неўзабаве вярнуліся Дуб з Ясем. Як загрукалі сенцамі, Люба саромліва ўсхапілася і пабегла ў спальню прыбірацца...

А надышоў смуглявы вечар—і разьвіталіся з болем у сэрцы абое. Разьвіталіся з нявыказанымі да канца прыгожа-сардэчнымі пачуцьцямі. Развіталіся, ня выпіўшы да дна кубка трыпяткое радасьці. Разьвіталіся, ня ведаючы, ці сустрэнуцца зноў дзе, ня ведаючы, ці дадуць зноў калі шчасьце каханьню. Разышліся з гострым болем у зірку, неабнадзееныя—сыйдуцца зноў, каб не разыходзіцца больш ніколі, ці не, ці ашукае іх, можа, спамданнае шчасьце каханьня. Гэтак і разьвіталіся.

Пасьля таго доўга сядзела Люба пры акне, бяздумнымі вачыма ўтаропіўшыся туды, дзе апошні раз відзён быў Ігнась, пакуль не схавала яго за сваёю завілінаю крывая сельская вуліца. Сядзела, хоць-бы раз кранулася. Не. Бяздумнымі вачыма была там, дзе і ён, птушкаю лёгкаю ляцела сьледам за ім.

З цяжкім, тупым адчуваньнем ні-то небясьпекі якое, ні-то вялікага ўтратку дарагога, чаго ня вернеш больш ніколі, пайшоў Ігнась ад Любы. Ідучы побач з таварышамі, натужваўся алгадаць, што-б гэта такое было. І не знаходзіў прычыны. Вось нешта зусім нявыразнае, у тумане невядомасьці схаванае ад гострага розуму, ці то можа ад сутычкі асабістых пачуцьцяў з пачуцьцямі адданасьці вялікай справе, з якою кроўна зьвязала яго жыцьцё, ці можа затым, што сіла і энэргія, якія трацяцца праз колькі часу бязьлітасна на рэволюцыю, яшчэ дасюль ні далі такое відочнае карысьці, можа ад таго. Вось і з апошнімі захадамі, з арганізаваньнем баявой дружыны—таксама: моцна хочацца верыць Ігнасю, што яна распаліць агонь у людзкіх сэрцах, і што гэты агонь запалае полымем і пажарам паўстаньня, ахопіць усіх паняволеных ад малога да старога. Хацелася верыць і ўпарта ня верылася. Гнаў прэч ад сябе гэтыя варожыя дзікія думкі Ігнась. Намагаўся ступаць у нагу з Дубам і Ясем. Памыкаўся быў узяць удзел у гутарцы—і ня мог.

Дуб з Ясем далікатна не заўважалі яго такога душэўнага стану. Яны тлумачылі сабе яго апошняю ростаньню з маладою дзяўчынаю.

— Эх, моцнае жыцьцё, вёрткае, сьлізкае. Але-ж неяк трэба браць у рукі,—сказаў Дуб. Ён думаў сваёю філёзофіяю вывесьці Ігнася з тых думак і адчуваньняў, што, нахлынуўшы ў бязьмерным ліку і сіле, вядуць чалавека да псоты, робяць з яго мяккую, дзіравую, ні на што ня вартую анучу.

— Жыцьцё, як той млын,—адгукнуўся Ясь.—Падзьме добры вецер надоўга, вось і шчасьце прыплыло млынару. А няма ветру—пустуе, ня шугае крыламі млын, і млынару хоць ты вешайся на сваім млыне.

— Калі-б толькі млынар з аднаго млыну жывіўся,—сказаў Дуб.

— Н'нале,—згадзіўся Ясь.

— Скажы, Дуб,—запытаўся раптам Ігнась,—цябе дома ніхто дапытвацца ня будзе, дзе ты і што?

— А каму што да мяне,—у сьвет пайшоў...

— Вураднік, ну вось, пачне дапытвацца ў жонкі, што яна адкажа?

— Гэта ў мяне абмайстравана. Скажа, што я ў заработкі пайшоў, а куды ды што, і сама ня ведае. Бо я і сам ня ведаў, выходзячы, дзе прыпынюся.

— Ага.

— Мы з Ясем абмеркавалі, брат, што само ліха не падкапаецца.

— А ніхто не падкусіць?

— Чаму ты гэтак, Ігнась, пытаешся?—трывожная нотка прабегла ў голасе,—мо' даведаўся пра што. Не? Ну дык кінь, хлопча,—жартліва ўжо даказаў Дуб,—ніхто нічога ня ведае. Не падкусяць. Раз калі я кажу, дык ведаю. Не дарма язык целяпаецца ў роце.

— Глядзіце... Сем'і каб пад глум ды зьдзекі не папаліся.

— Усё можа нарабіцца,—сказаў Ясь.

— Ці ліха,—перапыніў яго Дуб.

— Адно слова, пра гэта нават гаманіць ня варта. Лепш вось пра што. Тут сяло блізка ўжо наперадзе, заначуем у ім ці пойдзем куды далей? Я думаю заначаваць прыйдзецца.

— Лепш пераначуем,—адказаў Ігнась.

— А заўтра?

— Перабярэм вёрст на пятнаццаць усе сёлы, а потым пабачым, куды кінуцца. Бадай назад вернемся, каб не нарабілася там чаго. Усё-ж такі хлопцы параспырхваліся па два, па тры, куды хто. Напэўна, вернемся назад.

Ідэя змаганьня брала яго ў свае рукі. Рэшта адчуваньняў нядаўніх гінула ў барацьбе з ёю. Душэўная роўнавага зноў набывалася, цьвёрдасьць і бадзёрасьць моцнымі струменямі ўліваліся ў цела.

— Пераначуем тут,—сказаў ён, і Дуб прыемна заўважыў бадзёрасьць у Ігнасёвым голасе.

— Няйначай,—адгукнуўся для адказу.

Па сходзе месяца вечар быў цёмны і бязьлюдны, але тым часам яны падыходзілі ўжо к сялу. З лагчыны, на якой густа зьляпілася яно, заблішчэла адразу некалькі агеньчыкаў.

Праз часіну хлопцы зайшлі ў першую з канца хату і папрасіліся начаваць. Гаспадара ў хаце ня было, а гаспадыня зірнула скоса і адмовіла:

— Самім цесна, людзі добрыя, няма дзе.

Трэба было дагадвацца, што яна думае. „А хто ведае, што вы за адны. Розныя людзі шалаюць цяпер. Ня вельмі давай веры кожнаму“.

— Насупроць зайдзіце, у іх і хата вялікая, і сям'і мала. А ў нас няма дзе.

Сьляпіцаю ў вочы не палезеш. Хлопцы далі дабранач і пайшлі стукацца ў другія хаты. У дзьвёх ці трох іх таксама ня пусьцілі. Нарэшце, у аднэй беднай хатцы прынялі, але паперад распыталіся, адкуль, хто такія, куды ідуць і чаго.

Гора і беднасьць кідалася ў вочы на кожным кроку іхнага вандраваньня. Людзі гаварылі недаверліва, ухіляючыся ад простых адказаў, падазрона азіраючы кожнага. А калі дзе адкрываліся і гаварылі, хто яны за такія, спалох станавіўся паміж іх і сялян Гэтак было і ў хаце, дзе начавалі тае ночы. Распытваючы чалавека пра жыцьцё-быцьцё, запыталіся, што чуваць з надзелам зямлі.

— Нічога ў нас ня чуваць, браткі. Няўжо даюць дзе? Ня можа быць.

— А вось адкуль мы ідзем, дык паны самі надзяляюць сялян зямлёю. Каля вас тут паны дык пра тое зусім нічога ня думаюць. Трэба зьбірацца і натоўпам ісьці да пана, патрабаваць.

— А што калі няпраўда?—недаверліва наіўна ўскінуў вокам селянін.

— Тады скажаце, што вам гэта казалі соцыял-дэмократы.

— Дэмократы... Людзі добрыя!.. Я вас прытуліў нанач, як вы прасіліся. Дык ідзіце цяпер, ня бунтуйце. Ні я вас ня бачыў, ні вы мяне... Ідзіце, куды ідзіцё.

Нічога не выставалася рабіць. Гэтак і пайшлі, супакоіўшы гасьцінна-добрадушнага дзядзьку, каб не баяўся,—нікому нідзе пра яго ня скажуць.

Пакінуўшы далёка пазадзе негасьцінную вёску з напалоханым селянінам, тры агітатары-дружыньнікі выйшлі на сухі пескавы гасьцінец Яснае сонца прыветна глядзелася ў вочы, грэла, пясьціла. Каб ня сурова-жорсткае жыцьцё ды небясьпечнае бадзяньне перад невядомым будучым,—шчурыліся-б вочы, усьміхаліся-б добраму сонцу. А так не; ясныя

дзіпячыя думкі-гарэзы ярклі і тухлі, не пасьпеўшы ра^пукнуцца і закрасаваць пышнаю краскаю вясновых адчуваньняў.

— Хлопцы,—сказаў раптам Ігнась,—сходзім да мае маткі. Я-ж узімку, яшчэ некалі выходзячы з хаты, абяцаў ёй паказаць, з кім колегую. Ах, як будзе яна рада, каб вы ведалі, якая ў мяне добрая матка. Сходзім.

— Чаму-ж не,—азваўся Ясь.

— Сходзім,—адказаў Дуб

— Дык тут нам і не далёка ўжо, міля якая ці засталася.

— Хадзем, хадзем—добрадушна праказаў Дуб.

Ігнасю захацелася раптам такое ласкі, такога каханьня—сьветлых, прыгожых, каб узяць у каго ці даць Сонца было гэткае прыветнае, мяккія цёплыя прамені ясным дажджом лілі на гасьцінец, на палеткі. Ігнась зірнуў на яго, сашчурыліся вочы і радаснаю сьветлаю ўсьмешкаю насустрач яму ўсьміхнуўся. Як на чырвонцы новым, зайграла ў рыжых валасох на скронях сонца.

— Дык завернем вось на гэтую дарогу,—сказаў Ігнась.

Зьвярнулі. Ясная ўсьмешка не пакідала твару. Сонечныя крылы выраслалі за плячыма, хацелася ляцець у сьветлую прыгожую далячынь.

Наперадзе згрудзіўся невялічкі лясок. Ігнась яго ведаў. Матка ня раз хадзіла ў грыбы сюды. Вёрст чатыры яшчэ засталося да дому. Але гэттака сьціплы аб выглядзе лясок сустрэў дружыньнікаў неспадзяваным здарэньнем. Толькі гэта ступілі яны ў ціхую засень, як на паваротцы ўперадзе вынырнуў з-за дрэваў узброены коньнік, за ім трое мужчын пеша, і па самым задзе яшчэ два ўзброеных коньнікі. Узброеныя былі стражніцкім канвоем, а пешыя—арыштаванымі сялянамі.

— Гэй там, вярні на бокі—крыкнуў здалёк на дружыньнікаў пярэдні стражнік.

— Каб табе зеркачы на патыліцу завярнула!.. Вызваліць трэба іх,—прагудзеў Дуб і сышоўся з дарогі.

Як дрыготкасьці накінуў хто на Ігнася, і з Ясем яны зьвярнулі на другі бок.

— Я пачну,—кінуў ім ціха Дуб і шырокім цяжкім крокам выступіў насустрач.

Ігнась глядзеў на Дуба. Той ішоў трохі ўперадзе за іх. Вось-вось параўнаецца з пярэднім стражнікам. Ігнась спатыкнуўся на нейкі гнілы корч і каб трохі, дык упаў-бы. Але астояўся. І калі зноў зірнуў на дарогу, дык убачыў...

Дуб скочыў на пярэдняга стражніка і аднэю рукою ўлавіў за повад каня. Стражнік пахіснуўся на сядле, ухапіўся за рамух вінтоўкі, сьціснуў шпорамі бакі каня. Конь ірвануў так моцна, што Дуб выпусьціў повад, але ў той-жа час

другою рукою спрытна ўхапіў стражніка, і той паляцеў з каня. Але ня ўпау. Зачапіліся ногі ў страмёнах, павіс галавою ўніз. Упуджаны конь паімчаў яго па дарозе... Потым усё адбылося надзвычайна шпарка. Адзін з двух другіх коньнікаў—вураднік—схапіўся за рэвольвэр, але куля, пацалецку пушчаная з Ігнасёвага маўзэра, прыгнула яго к канёвай грыве. Упудзіўшыся стрэлаў і мятусеньня, коні чвалам панесьлі абодвух к лесу.

— Адкуль вы і завошта забралі вас?—пытаўся ў сялян Ігнась.

Адзін выступіў наперад. Камлюкаваты, нявысокага росту ў гарадзкім пінжаку.

— За мяне іх забралі. А я прыехаў з Севастопалю, гадоў пяць у заработках быў. Ну тут мяне за бунт супроць пана і ўхапілі. А вы хто?

— Мы—соцыял-дэмократы. Чулі? Наша баявая дружына зьбіраецца вось тут у гэтай мясьціне. Калі ня думаеце, што стражнікі ўпусьцяць вам, ідзіце ў двор Слаўнае і запытайцеся парабка Вітольда, скажыце яму такія словы: „Ад веку мы спалі". Вось і ўсё. Хутчэй уцякайце, а то стражнікі могуць не забавіцца...

Зьбянтэжаны ад нечаканасьці выгляд твару згінуў у сялян. І Дуб прагудзеў ім:

— Бывайма! Калі дык сустрэнемся скора.

## ЖАЛОБА

ЗА барацьбою не заўважылі ні стражнікі, ні дружыньнікі з сялянамі, што быў яшчэ нехта, хто бачыў ад пачатку да канца ўсё, што адбылося ў лесе. Гэты нехта ўтуліўся за грубезнаю хваінаю і не прапусьціў паўз вочы аніводнага руху, аніводнага слова паўз вушы з усяе лясное баталіі. Калі Ігнась спатыкнуўся на корч, а Дуб насілу сутрымаў стражніцкага каня, чалавек раптам стаў мяняцца ў твары. Боязкасьць раптоўна саступала месца надзеі, а надзея спалоху. У самы небясьпечны момант, калі пярэдні стражнік ухапіўся за вінтоўку, а вураднік выцяг з кабуры рэвольвэр, сэрца здаецца, упала глыбока-глыбока ў чалавека за хваінаю. Забыўшы пра ўсю перасьцярогу, ён нагнуўся, пры гэтым рыжая барада яго высунулася за хваіну. Прамень сонца працерабіў сабе дарожку праз гушчэрнае гальлё, працерабіў і ўпаў якраз у бараду. Ясным золатам заблішчэлі ў прамяньні

рыжыя жорсткія валасы, заіскрaніліся залацянымі вясёлкамі,— нібы пажар залаты загарэўся ў барадзе. Чалавек устаў, выпастаўся. У руцэ ён трымаў моцную гострую сякеру. Ногі яс спружыновыя, прутка ўпёрліся ў мяккую траву. Грубая шыя пад касмылявагымі рэдкімі валасамі напрудла і ўвабралася ў густую сетку жыл. Быў ён якраз нібы той дзікі зьвер, гатовы скочыць і падабраць пад сябе слабую бязьвінную ахвяру-здабычу. Але-ж прагрымелі стрэлы. Ігнасёў маўзэр прыгнуў к сядлу вураднiка, і ўзброеную стражніцкую варту згалела на дарозе. Тады чалавек расслабіў руку. Сякера выпала і ўбілася носам у зямлю. Члавек зноў стаў за хваіну і з вялікаю цікавасьцю сачыў, шго рабілася перад ім. Дружыньнікі і сяляне распытваліся адны адных. Чалавек слухаў і, слухаючы, чакаў на нешта большае. Але вось загаманіў Ігнась. Невядомы за хваінаю ўлажыў вушы. Не сапнуў, у той час ня дыхнуў, гэткія цікавыя былі яму Ігнасёвы словы.

„Скажыце яму такія словы: „Ад веку мы спалі"... пачуў чалавек, і рыжая барада схавалася за хваіну.—„Ад веку мы спалі",—прашаптаў сам сабе.

На дарозе разышліся ў розныя канцы. Чалавек стаяў яшчэ колькі часу за хваінаю і ўслухоўваўся, ці не пачуюцца зноў галасы. Упэўніўшыся, што адышліся трохі далёка, чалавек узяў сякеру і засунуў акуратна за сырцовую папружку, якою падпяразаны быў па сьвітцы, падняў на плячо зьвязак тонкага пруцьця, высечанага ў лесе, і павольна падаўся сьледам за дружыньнікамі.

— „Ад веку мы спалі",—шаптаў ён час-ад-часу.

На дарозе за вярсту ад лесу ішлі шпарка дружыньнікі; чалавек наглядкам ішоў іхным сьледам, узіраючыся зоркімі вачыма ўперад.

— „Ад веку мы спалі..." Здаецца, гэтак сказаў ён,—пракавзаў чалавек з рыжаю барадою ўголас і нявыказныя імглівыя пачуцьці мяняліся на твары яго.

Адале зрабілася вельмі цяжкаісьці ці што, кінуў пруцьце далоў, выцяг самы танчэйшы і адсек з канца на кіёк. З кійком палягчэла, здаецца, быццам ён ўзяў на сябе лішні непатрэбны цяжар.

На паўдарозе, узышоўшы ўжо на сельскі палетак, ён прыпыніўся, агледзеў наабапал дарогі вузкія матузкі-палі. Направа падымаецца нявысокі ўзгорачак, загонаў за пяць пасьвяцца каровы.

— Ігнаська... сынок мой...—чуецца яму адчайны кабечы голас...

Ён сьцепаецца як ад золкага сіверу і чула ўслухоўваецца. Глухая цішыня пануе на палетку. Чалавек замяшаўся,

намогся быў усьміхнуцца той-жа час, але ўсьмешка не ўдалася. Ухапіўшы за дубца кіёк і падганяючы каровы (выбачце, трэба было сказаць: зьбіваючы па дарозе коцікавыя галоўкі), пайшоў сам-ня сам у сяло.

Ігнась з Дубам і Ясем ужо падышлі к канцу. Сялом яны ісьці не наважваліся, а зьвярнулі на аселіцу, па выхаджанай сьцежцы паўз гумны пайшлі к Ігнасю да хаты.

Ад самага лесу ўсю дарогу маўчаў Ігнась. Знаёмыя гэтак палеткі і ўсё вакол, убачанае яшчэ раз, навеяла гэтую ціхую маўчанку. Уявіць сабе намагаўся, як сустрэне маці яго з таварышамі, і ня мог чамусьці выклікаць перад вочы гэтага спатканьня. Быццам даўно-даўно ўжо быў тут, і таму ў тумановыя фарбы ўбіраецца хата і ня відно выразна заўсёды такое жвавае клапатлівае маткі, не ўявіць. І ад таго, што не ўявіць сабе ўсяго, робіцца Ігнасю ніякавата і напружаная маўчанка спавівае сэрца ў глухую тугу.

Поглаў у зялёнай траве ўвесь. Раньнія краскі пачынаюць распукацца,—любыя ўспаміны ціснуцца ў галаве Ігнасёвай. Але не прагнаць ім з сэрца тугі, ціхая маўчанка за варту ў яе стаіць.

„Што гэта такое?“ бяз сілы выцінаецца хваравітая думка ў Ігнася. Адказу няма.

Ногі самі зварочваюць насупроць свае хаты. Моўчкі ідуць за ім і Ясь з Дубам, быццам і іх дакранаўся Ігнасёў настрой, дакрануўся і папсаваў ураз усе сьветлыя адчуваньні.

„Што гэта такое?“ недарэчная думка-запытаньне блудзіць у Ігнася ў галаве, і нібы адказ прыходзіць раптам на яе. Наперадзе завыў жаласьліва і страшна сабака. Здрыгануўся Ігнась, гэта Кіяш выў перад хатаю.

„Якім чынам ён патрапіў, я-ж яго згубіў дарогаю?“ недарэчна спрабуе думаць Ігнась. Ён прынявольвае сябе павесялець, надаць бадзёрага, радаснага выгляду, кволае сыноўнае ўсьмешкі.

У дзьверэ Ігнась сярдзіта крыкнуў на Кіяша, але сабака і ў вуха ня ўзяў крыку, а завыў яшчэ галасьней. І хатка стаіць гэтакая сірочая. І ні гуку ў ёй. Цішыня.

— Нешта нядобрае,—азваўся ціха Дуб.

Сэрца ўпала ў Ігнася.

Адчынілі сенцы. Кіяш ня бег, як звычайна, калі толькі прачыніш дзьверы, ён стаяў наўпроці акна і нема выў, задзіраючы ўгору галаву. Здрыгануўшаю рукою ўзяўся Ігнась за клямку хатніх дзьвярэй.

З сонца ўвайшоўшы, у хаце было цёмна і вочы ўсіх трох не адразу азвычаіліся з хатнім цямном.

— Мама, ціха паклікаў Ігнась.

Голас самотна прайшоў па хаце. Цішыня была адказам на яго. Дуб з Ясем не маглі крануцца ад мышельніку. Ігнасёвы вочы разглядаліся патроху ў хатнім цямне, ён азіраў вакол усю хату.

Слабы стогн пачуўся, ці то мо' здалося Ігнасю, ці мо' сам ён дыхнуў гэтак, і ўздых вышаў з грудзей стогнам. Не, вось зноў ён. Ігнась бегма агледзеў усю хату, абмацаў вачыма кожны куточак, пасьцелю на палку, запечак. За трэцім лёгкім стогнам заварушыліся ледзь-ледзь на печы ў кучу паскіданыя посьцілкі.

Ігнась ускочыў на палок, з палка на прымурак, і сьлёзы сударгава сьціснулі горла, і дрыготная рука адкінула посьцілку. Гэткая сухая ды маленькая ляжала на печы зусім бяз памяці Агапа.

— Мама...—кволым голасам любоўна паклікаў яе Ігнась:— мама!.. мама!..

Вочы Агапіны на хвіліну расплюшчыліся і дзіўна—гэтак дзіўна глядзяць толькі перад сьмерцю—зірнулі на Ігнася. Пазналі ці не? Відаць—не. Вусны шапанулі нешта. Ігнась нахіліўся нізка-нізка, не пачуў. Дзіўныя прадсьмяротныя вочы стухлі ў Агапы.

— Мама... мама!.. памятаеш?—загаманіў Ігнась з колкімі салёнымі сьлязьмі ў голасе—памятаеш, як казаў я табе, што прыду некалі са сваімі сябрамі, і ты паглядзіш, якія ў мяне добрыя таварышы... Ты-ж усё хацела ведаць, з кім я колегую... Ты хацела, каб сын твой рабіў толькі так, як вучыла ты змалку Мама!.. Зірні... Са мною прышлі таварышы... Чаму-ж ты не адгукаешся? Няўжо не пазнала мяне, свайго сына Ігнася? Мама... Мама!.. ці ня рада ты мне, ці я цябе ўгневаў чым.

Яшчэ раз павекі адкрыліся, і дзіўныя Агапіны вочы паглядзелі на сына. Жывое, яснае ня значылася ў іх, былі яны празрыстыя, і халодныя, як шкло. Ігнась узяў яе рукі, прытуліў да свайго твару. А вусны Агапіны нешта нявыразнае, бясслоўнае шапталі—варушыліся...

— Вось табе і госьці. Дзе коратка, там ірвецца, на яго страх,—праказаў Дуб, выступіўшы на хату.

— Мала гора ды беднасьці, на табе яшчэ,—ціха адказаў Ясь.

Яны павола селі на лаву, і кожны балюча адчуваў сваю прысутнасьць пры гэтай надзвычайнай сустрэчы сына з маткаю.

А Ігнась гаманіў з маткаю жалобна, тужліва, і тая ні слова не адказвала яму. Ці ведаў, ці знаў ён, што паскорыла матчыну хваробу, ці дагадваўся хоць, што кінула яе на халодную няпаленую праз колькі дзён печ пад дзіравыя паношаныя лахманы. Каб даведаўся, што вураднік з старастам, Любіным бацькам, прыходзілі і мучылі яе допытамі ды пагрозамі, хочучы вымучыць ідазнацца пра сына Ад таго яе ўзяў за сэрца боль, як агнём запаліў грудзі. Лягла і не ўставала. Але ігнась ня ведаў усяго таго і, ня ведаючы, пытаўся жаласьліві, гладзіў матчыны сухія рукі, туліўся да зморшчаных жоўтых шчок, над якімі матляўся ўжо цень сьмерці, і прыслухоўваўся баязьліва к жыцьцю ўпалых грудзей, ня чуючы адказу, пытаўся, адчуваючы, як чорная роспач апаноўвае ўсяго, як спакою няма без надзей, такіх родных мо' спадманных, але гэтак патрэбных чалавеку.

У грудзёх у Агапы захрыпацела, страшна заклёкала ў горле.

— Мама... зірні сюды... Я тут каля цябе,—дарэмна прасіў, маліў Ігнась.

Але вось зашапацелі зноў вусны. Сухія шалёсткія словы пачуў Ігнась, схіліўшыся вухам да матчынага твару, апошнія словы:

— ... грамнічную... сьвечку... за абразамі.

Хрыпаценьне памацнела, нават чутно было добра Ясю з Дубам, і паганулі ў ім словы захлынуліся, каб больш не зьляцець з гэтых выстраданых вуснаў Кроў выплыла з рота і тоненькім чырвоным струменчыкам пацякла па зморшчанай шчацэ.

— Сьвечку!.. Браткі!.. за абразамі. Запаліце скарэй!— крыкнуў Ігнась, а сам ухапіў, прыўзьняў трохі матчыну галаву.

Кроў яшчэ больш цякла, разьлівалася па барадзе, пэцкала на шыі каўнер сарочкі.

Дуб падаў запаленую сьвечку. Ігнась прыняў, уставіў у схаладнелыя рукі, сашчапіў іх пальцамі на грудзёх. Апошні дых вылецеў у цьмянае паветра. Агапа уся скаланулася раптам, выпруцілася—і пакутнаму кабечаму жыцьцю канцы былі.

Праз сьлёзы ня бачыў Ігнась, як абставіў наўкруга посьцілкамі сьвечку, каб ня ўпалі, і з зацятымі ўзрыдамі ў голасе вышаў паволі на двор.

Дуб з Ясем, бяс шапак, з голымі галавамі пайшлі сьледам за ім.

На двары нема выў Кіяш.

СЬЛЁЗЫ душылі Ігнася, сударгамі сьціскалі горла. Ду з Ясем доўга па-таварыску ўпрашвалі яго. Але-ж сэрц ня камень. І чым больш і настойлівей прасілі, тым гор рабілася яму. Тады хлопцы пакінулі яго і пайшлі раіцца што рабіць.

Ігнась упаў на лаўку пад вішняю, якую яшчэ саджал маці. Яна думала ўсё засадзіць невялічкі агародчык яблынямі і ігрушамі, дый не засадзіла. Тры вішні толькі расьлі ў сярэдзіне паміж чужых густых садоў. Нядаўна пакопаныя градкі не патасованы яшчэ, толькі разоры павысыпаны ды паапплескваны трохі. А садзіць так і не пасадзіла нічога. Кусты агрэсту напярэмешку з парэчкамі гусьцелі паўз плот.

На сьвежым паветры Ігнась адчуў неяк жыцьцё і бязуважна яшчэ пакуль заўважыў усё ў агародчыку. Сэрцу не пачыналася лягчэй, але бязьмежнае гора высыхала са сьлязьмі разам на вачох і дзесьці глыбока хавалася ў сярэдзіне.

З раптоўнага гора, з бязьмернае роспачы закамянела сэрца, падплыло палынова-горкім каламутам,—памяшчалася ў месца сум і нуда, каханьне і самота, журба з агульнаю таварыскаю справаю. Але пад уплывам жывадзейнае прыроды навакол, дзе варушыцца і гамоніць аб сабе на розныя галасы жыцьцё, абудзіліся магутныя пачуцьці. Сіла да жыцьця, да руханьня і дзеяньня брала яго ў свае рукі. Усе ўражаньні і адчуваньні пачалі блытацца тымчасам. Розум сустрэўся з сэрцам, пачуцьці з разважаньнямі. Камень пачынаў ажываць зноў—сэрца датыркнулася жыцьцё. І разам з тым востры боль дарагога ўтратку працяў і думкі і пачуцьці.

Быў ён спакойны і ціхі звонку, жалобны і бунтоўны ў душэўнай глыбіні. Пачуцьці, нахлынуўшы з розных канцоў, ціснуліся ў ім, шукалі сабе выйсьця. Сьлёзы ўжо ня ішлі, выплакаліся можа, ці ад палыновай гарчэчы болю павысыхалі.

А жыцьцё вакол патрабавала спагады, неадчэпна наступала адсюль з адным жаданьнем, з аднэю патрэбаю раскрыць душу і сэрца, выліць усё гора і радасьці, зьліцца з ёю ў жывой размове. З дна сардэчнае глыбіні прасіліся для гукаў адным за аднымі словы журботы і думак, словы горкае праўды. Пераказаць у гутарцы,—ня было жывое душы—Дуб з Ясем, пайшоўшы, яшчэ ня прышлі. І Ігнась ціха засьпяваў. Ня ведаў ды не раздумваў, чуў ён гэтыя

словы, ці былі яны жывымі кавалкамі гора і жалобы, выліліся ў сьпеву суладнымі і горнымі гукамі.

Думы думанькі.
Дзе мне з вамі быць?
Ці ў далёкім краі
Свайго гора дажыць?
Думы-думанькі,
Думы чорныя.

Няма ў сыночка
Маткі роднае.
Згарав́ала век,
Сьлёз- наплакала...
А ці радасьць ці сьмех
У жыцьці бачыла?

Гэтак сьпяваў ён сваю бясконцую песьню, песьню гора і жалобы. І выліваючы ў гуках пачуцьці і супярэчныя адчуваньні, памалу супакойваўся. Душэўная роўнавага станавілася на ногі. Разуменьне няўхільнае патрэбнасьці ўсяго што адбываецца ў жыцьці, авеяла тады яго. І новая бадзёрасьць і моцная цьвёрдасьць апаноўвалі і целам, і душою. Так трэба, так, мусіць, быць у жыцьці. Чым больш гора цяпер, дык тым больш будзе радасьці ў будучым.

Раптам яго сьпеў перапынілі словы.

— „Ад веку мы спалі..."

— „І нас разбудзілі",—адказаў ён і ўстаў з лаўкі, зірнуў наўпроці сябе.

За суседавым плотам стаяў той самы чалавек з рыжаю барадою, усьпіраючыся на высечаны з прута кіёк.

— Дзядзька Андрэй! І вы... вы з намі,—з няясным пачуцьцём радасьці ці мо' і яшчэ нечага большага ўсклікнуў Ігнась.

— Але. Не... Я і сам ня ведаю,—заблытаўся ў словах чамусьці рыжабароды Андрэй. І кінуўшы раптам кіёк і высунуўшы праз плот рукі, загаманіў горача: Ігнась! Ігнаська. Мой... Любы сынок!.. Ты—сын мой, Ігнась. Падыйдзі, дай абняць цябе, паглядзець з блізку, які ты вырас, якім ты стаў хлопцам.

— Ты жартуеш, дзядзька Андрэй... Мне цяпер не да жартаў.

— Не, я сур'ёзна... Я кажу шчырую праўду... Сын мой, мой Ігнась. Я гэтак доўга трываў, мучыўся, але сёньня вось бачыш, ня вытрываў. Я бацька табе, а не сусед.

— Ага... Вось яно як,—цягуча праказаў Ігнась і ўзяўся рукамі за галаву.—Вось яно...

— Ігнаська!.. Пакінь бадзяцца... стачем жыць разам. Я абараню цябе ад усякае бяды і напасьці. Падыйдзі сюды.

Ігнась апусьціў рукі і горда ўзьняў галаву.

— Не! Ты ня бацька мне. Ты—спадманшчык і ашуканец! Як той злодзей, ты ўкраў чужое шчасьце і праз ўсё жыцьцё ўпотайкі надсьміхаўся з ашуканае. Я—ня сын табе! Я—сын свае маткі, якой ужо больш не патрэбна нічога на зямлі.

— Памерла?!

— Памерла і пра бацьку мне не сказала нічога, нават перад сьмерцю. Дык няма ў мяне бацькі!

— Царства ёй нябеснае,—скінуў шапку Андрэй і перахрысьціўся размашлівым рухам рукі.—Царства ёй нябеснае на тым сьвеце, няхай ня крыўдзіцца на нас грэшных.

— Ты, калі гэта праўда, ня сьмей гэта казаць пра яе так, калі ты гэта пасляў яе на пакуту ў людзі. Ня сьмей. Сыйдзі з маіх воч, каб я цябе ня бачыў больш, такога агіднага, такога зьвера, а не чалавека!

— Ага, дык ты вунь як!.. Я да цябе прышоў, як бацька, я браў цябе пад сваё апякунства, а ты вунь як? Ага... Дык ты гэтак? Добра... То і ведай-жа, матчын шчанюк, што я бачыў усё ў лесе, я знаю цяпер, што ты за адзін! Зараз прыдзе з дзесяцкімі стараста і цябе, як міленькага, аддадуць стражнікам.

— Вон! Сыйдзі з маіх воч, нягодны чалавек, і не находзь, пакуль я яшчэ тут, бо... бо рука ў мяне можа падняцца на такога бацьку і я загадзя складаю з сябе за тое ўсю віну. Не прыпушчайся, ня дай мне пераўбраць меры. Рукі ў мяне пакуль што чыстыя і я ня хочу пэцкаць іх аб цябе.

— Валацуга!.. Арыштант!.. Дэмократ!..—прасіпеў у плот той і, прасіпеўшы, ухапіў з долу кіёк і порсткім крокам пайшоў з саду.

Ігнась правёў рукою па твары, па валасох. Ці ня ў сьне адбылося ўсё? Дух супярэчнасьці аўладаў ім і ад таго яшчэ мацней працяла гартаваная цьвёрдасьць. Не, усё было і ёсьць гэтак. Жыцьцё такое. У жыцьці, мусіць, робіцца так, пакуль новыя людзі, людзі змаганьня і бунту за новае не разбураць, ня зьнішчаць яго, а на тым месцы паставяць новае.

— Нічога не паробіш, мусіць быць так,—праказаў далёкаму некаму Ігнась.

З аселіцы вярталіся Дуб з Ясем. Выгляд, што апанаваў сабою Ігнась, пакінуў на іх прыемнае ўражаньне, і яны адразу пачалі гаварыць да справы.

— Я майстра на ўсе рукі, як ведаеш. Трэба пашукаць дашчок ды сньсьціны якое, я зраблю дамавіну. Яшчэ трэба прывесьці каго выкапаць яму, бо Ясь адзін ня справіцца скора. Сам ведаеш, што быць нам тут ня зусім выпадае.

— Няма каго, братка. Матка жыла такою сіроцінаю, што лепш не ўспамінаць. Кожны як мог стараўся толькі насьмяяцца, ды пакпіць. Не, няма каго клікаць.

— Тады ня трэба бавіцца.

— Праўда. А капаць пойдзем мы ўдвух. Ты возьмеш рабіць дамавіну. Бедная... Гаротная маці!. Праз колькі год хавала ўсё сабе на вышках над сенцамі пяць дашчок, усё казала: „Глядзі, Ігнаська, як памру, каб з гэтых дашчок зьбілі мне дамавіну". Ні на вошта яны не патраціліся, прычыкалі яе сьмерці.

— Дык-жэ,—азваўся Ясь.

— То хадзем, пакуль управімся, дык і ноч нас агорне. Хадзем, Ігнась. Паказвай, дзе дошкі, ды давай сякую-такую снасьціну. Жытка, каб яна нечага наскрозь зямлі прайшла. Жывеш, жывеш чалавек, а каб табе што, як у добрых людзей. Не Жыў—ня жыў, а так плялося неяк, гібелася... Як мокрае гарыць, на яго страх. Ну, што-б яшчэ хоць трохі пажыць, не.

— Што зробіш. Доля, братка Дуб, такая. Такое ўжо цяперашняе людзкое шчасьце. Хадзем.

— Хадзем. Няхай ня крыўдуе нябожчыца, каб ёй добра было там, што мы ўжо так сьпяшаемся.

Прышлі ў сенцы.

На бэльках ляжала пяць гладкіх габлёваных дошчак.

— Трохаршыновыя,—ну і хопіць. Цяпер яшчэ снасьціну ды палатна паглядзі абабіць з сярэдзіны.

Ігнась вынес з клеці сякеру, пілку-папярочку і гвазды. У запасьлівае Агапы было напрыдбана рознае дробязі.

— Палатна я зараз у кубле пагляджу.

Пастукаўшыся які час у клеці, Ігнась дастаў з небагатае матчынае схованкі сувой зрэбнага палатна.

— Ну, то і за работу,—сказаў Дуб.

Ніхто не пачуў, што ў сенцах пацягло ледзь-ледзь чутным пахам гарэліны. Нікому не ўвайшло ў галаву прачыніць дзьверы і зайсьці ў хату. Ігнась дык ня мог, разбалеліся-б зноў сардэчныя раны, а часу было гэтак мала.

Толькі гэта ўжо пабралі Ігнась з Ясем рыдлёўкі, а Дуб зьняў адну дошку, як з лемантам уляцеў з вуліцы Кіяш. За ім прыплыў тупат і бегатня поўна людзей.

— Туті.. Тут яны!—крычаў нечы голас дзікі.

Пачуўся крык, Ігнась ураз скеміў, што гэта такое. І закамандваў:

— Кідай работу, хлопцы! За мною!

Ён кінуўся бегма з сянец на двор. Кіяш падбіўся пад ногі, уцякаючы ад пяцёх-шасьцёх чалавек дзесяцкіх, якіх павёў Андрэй. Ясь з Дубам выскачылі таксама, адзін з рыдлёўкаю, як трымаў у руцэ, а другі з сякераю. Дзесяцкія з чачоткавымі кіямі, з дубовымі каламі ішлі на двор.

— Стой!—крыкнуў Ігнась,—што вам патрэбна тут?

— Хадзем з намі; а потым будзеш ведаць.

— Бачыш ты, ня ведае! арыштант!—немым голасам крыкнуў на ўсю вуліцу Андрэй,—ня ведае! А хто стражнікаў пабіў у лесе? Хто страляў у вурудніка, га? Дэмократы! Арыштанты! Лавіце іх!

— У-у-у, погань ты няшчасная!—кінуў яму адказ Ігнась. Ураз у руцэ мільгнуўся чорны маўзэр, і не пасьпеў ніхто апамятацца, як стрэл гукнуў на ўсю вуліцу. Матлянуўшы рукамі, Андрэй як стаяў, так і грымкнуўся далоў.

— Гвалт!—зароў адзін з дзесяцкіх і ўсе сыпанулі назад на вуліцу.

— Слухайце!—крыкнуў ім Ігнась,—мы вас ня будзем чапаць. Не чапайце і вы нас. Мы-ж ня ворагі ніякія, нічога вам не зрабілі благога. У мяне памёрла маці.

— Сюды! сюды!..—закрычаў той самы голас, махаючы на сябе рукою.

Усьлед за яго крыкам лёскат палкоў праляцеў з канца і пяцёра стражнікаў асадзілі перад дваром коні.

— Вось яны! вось яны! дэмократы!—крычаў і тыкаў пальцам, засопшыся ад шпаркае бягні, стараста Дарош— Любін бацька.

— Сьпешыцца!—закамандаваў вураднік.

— Пракляцьце-ж вам, калі так! страляйце, хлопцы!—крыкнуў Ігнась, адбягаючы з таварышамі на агарод.

Там прыхаваўшыся, далі нязладны залп у натоўп на вуліцы. Ім адказалі стрэлы стражнікаў. Але тут якраз паспрыяла дружыньнікам зусім непрадбачная нікім акалічнасьць. Над Агапінаю хатаю ўзьняўся агонь і густы чорны дым паваліў на сяло.

— Пажар! пажар!—залемантавалі ў двары і на вуліцы. Стражнікі на хвіліну зьбянтэжана адступіліся назад. Натоўп замітусіўся, забегаў па вуліцы.

Ігнась цяпер толькі прыпамянуў, што забыўся патушыць сьвечку, выходзячы з хаты, і яна, дагарэўшы, упякла посьцілкі і сяньнік, на якім ляжала нябожчыца маці.

— Эх,—прашаптаў ён,—няхай сабе Усёроўна адна слава і адзін гонар. Даруй, мама, даруй свайму сыну, што цураецца цябе ў самы апошні час.

І моцна сказаў таварышом:

— Глядзіце, яны падурнелі і забыліся пра нас. Бяжымо за гумны, а там паглядзімо, куды кінуцца.

Не азіраючыся, пераскакваючы цераз грады, яны выбеглі на аселіцу і зьніклі за гумнамі.

А натоўп на вуліцы бегаў, як пашалелы. Хто цяг вядро вады, хто насіўся з мокраю посьцілкаю, хто бег з „кошкаю", якою дастаюць з калодзежаў утопленыя вёдры.

Хата гарэла ўся ўжо. Страха насохшы за колькі дзён сонца, як перац, хапілася агнём уся адразу; густымі плоймамі ляцелі на суседнія хаты ясныя іскры і цэлыя камякі гаручае саломы. Загарэліся дзьве суседнія хаты, ніхто асабліва не ратаваў, кожны глядзеў, каб абараніць сваю. Мужчыны паўзлазілі на свае стрэхі, кабеты падавалі ваду. Мачылі вялікія посьцілкі і ўсьцілалі імі стрэхі, тушылі іскры.

Гэтак пахавала няшчасную нябожчыцу Агапу нязьміроная сельская злосьць і варожасьць.

### ЗДРАДА

ЯСНАЕ летняе раніцы ў двор Слаўнае прыдлубаў стары Амелька з Заямнага.

З таго часу, як пан Няслаўскі даў Заямнаму засяваць клін поля па старасьвецкія капцы і скарбовую сенажаць касіць напалавіну, стары, дзе толькі не пападалася, хваліў Слаўнаўскага пана і прасіў яму ў бога здароўя на доўгія гады. Пры хаце ён ужо нічога не рабіў, ат колькі тае работы з старога. А не чапае ніхто, дык ён за крывульку ды ідзе сабе бадзяцца па сяле. Часам выдзе ў палетак, паглядзіць, як рунеюць ячмяні на Слаўнаўскім кліне, як зелянеецца канюшына, і адчувае, што радасьці і ціхаміру дачакаў пад старасьць, гэтак весела і здаволена глядзець на вынік свае стараннасьці. Хіба-ж не. Каб ня ён, хіба-ж сваім вахабствам ды выскурылі-б чаго сельскія крыкуны!

— Блазьнюкі! Мы, мы, а ня ведаюць, як да пана падыйсьці... А скруціў-жа такі, псяюха. На гарэлцы дык казаў, што і сенажаць цалкам, без ані нічога аддае. Аж потым глядзі паддурыў трохі, напалавіну выпусьціў. Што ты зробіш на тое такі яна панская галава, а ня мужыцкая.

Гэтак і заспакоіўся стары Амелька і, заспакоіўшыся, сумленна і шчыра, калі трэба было, бараніў пана ад розных нараканьняў і падбухторваньняў.

— Блазьнюкі! Блазьнюкі!..—казаў ён кожнага разу, калі хто памыкаўся выказаць што супроць Слаўнаўскага пана. Дажывяце да сівога воласу, тады будзеце ведаць, як да паноў ставіцца. Вунь і ў кніжках што пішуць... Пішуць, аб чым у нас гамоняць гэткія падбухторшчыкі, як вы.

— Клікун Слаўнаўскі!—ня вытрпеў нехта, калі стары вельмі ўжо заўзята бараніў панскія інтарэсы. І мянюшка Слаўнаўскага клікуна прышчапілася Амельку ў родным ся-

ле, і дзе-б ён ня ішоў, што-б не казаў, мянюшка заўсёды сустракала яго і праводзіла.

— Клікун Слаўнаўскі! Панскі клікун.

Але ж стары і ня дбаў пра гэта. Ат, блазнота, што з імі гаварыць. І яшчэ больш сумленна ставіўся да пана.

Сёньня яму прысьпічыла схадзіць у Слаўнае, прысьпічыла вось што.

Тыдні чатыры назад у сяло напрывалакаліся нейкія чужыя людзі, са стрэльбамі за плячыма. Ніхто іх ня знаў і яны нікога, але ж, як бачыш, паўзнаваліся з сельскімі падбухторшчыкамі, што хадзілі разам з Амелькам да пана ў Слаўнае. Яно-б яшчэ то і нічога іхнае гэта знаёмства, ды ўся бяда тая, што каламуціць пайшлі сьветам. Удзень ліха ведама дзе ходзяць, бадзяюцца са стрэльбамі, а прыдзе той вечар, зьбіраюць у кучкі народ, баламуцяць, падбіваюць супроць пана. Рады няма, дый годзі. Стары Амелька ўжо што-што не рабіў: і ўгаварваў, і прасіў, і гразіў, і кляўся, дык з яго толькі пасьмейваюцца ды гавораць:

— Ня тыч свайго носа, панскі клікун!

— Арыштанты! Дэмократы!—адказаў Амелька, пастукваючы са злосьці кіем перад сваімі супраціўнікамі. І больш нічога. Ніяк вось ня мог перагаварыць іх: ён—слова, а тыя—пяць, ён—тры, а яны—дзесяць. Ня той сьвет пайшоў, псавацца пачалі людзі. Кожнага разу дадумваецца да таго стары Амелька і ня імкнецца ўжо больш супярэчыць і сварыцца з падбухторшчыкамі—сваімі і чужымі. Ен перапыняе на самым пачатку размову-сварку і, пакрыўджаны вельмі ў глыбіні свайго сэрца, якім ён моцна любіць усіх людзей і жадае ўсім дабра, падае знак, што яго не разумеюць, і заварочваецца ды ідзе сьледам за сваім кіёчкам.

— Блазнота, блазнота!.. Адна дурная галава, ды куды можа ўцягці ўсіх. Паглядзімо...

Глядзеў-глядзеў стары Амелька, але раз надта ўжо прыпяклі яму, ну што гэтак прыпяклі, ня вытрываў. Пасварыўся нашчэнт са сваімі спрэчнікамі, аблаяў тых, як толькі вушы яго маглі сутрымаць брыдкія словы, прышоў дахаты і ня ўзяў нават вячэраць. І спаць лёг на галодны жывот, а перад сном яшчэ за нейкую прычэпку пакрычаў і на нявестку.

— Людцы добрыя!.. Што гэта з табою сёньня, бацька? Здаецца, ніколі такі ня быў.

— Здаецца... Авечцы дурной здаецца.

— А ўжо-ж не.

— Няхай сабе. А вы ось рады былі-б, каб чым скарэй галавою налажыў. Не дачакаце! Назнарок вось гібецьму, а буду жыць.

— Кінь, бацька, ніхто так ня думае. Але от возьме сабе што ў галаву, дык хоць ты што яму, а ён сваё права правіць. Але-ж чаго ня было ніколі. Ці гэта ўсё так на старасьць зьнялюбваюць людзей ці хто яго ведае. Бяз дай рады— ні з таго, ні з сяго—усё адно як той, што абы за якую лучынку, дык знойдзе прычынку. Так і гэта. Ой, пакінь ужо, бацька, не гавары лепш! Рабіць—ня робіш, ніхто з цябе не патрабуе, сядзі сябе і не скулузуй. Крыўда яму вельмі, ня дай бог, якая, каб горшае і ня было хіба.

— Дык-жэ,—абазваўся пасьля гэтае доўгае нявесчынае прамовы Амелька, ні-то згадзіўшыся з ёю, ні-то думаючы пракагоці пра што іншае. І сьціх, пакінуў горніцца і маракаваць на нявестку. А не павячэраў жа такі—упарты стары, горш за малога, таго хоць змануць можна. Лёг галодны, праз усю ноч нешта цяжка пакрэктваў ды ўздыхаў, варушыўся на печы. Толькі пярэдаднію, калі з усходу трохі-трохі пацягло відном, супакоіўся, замгнуў.

Рана моўчкі пасьнедаў нейкае калатушы. Каб учора гэта, дык конча папытаўся-б у нявесткі, чаму чорная такая, як з сажаю, калатуша, хоць і ведаў чаму: мука няўдалая з няўдалага зерня, з гірусам і ўсялякаю трасцаю. Сёньня не папытаўся. Напугаўся моўчкі, ушчапіў на сухія плечы сьвітку і з неразлучным кійком сваім падаўся ў Слаўнае.

„Вось мы гэта яшчэ паглядзім, на покуці ці ў лужу сядзем. Вы—ці мы. Папрывалакаліся сьцегачы розныя і сьветам бунтуюць...“

Ён наважыўся пагутарыць конча з панам і супакоіцца, выказаўшы ўсё сваё абурэньне на гэтых мяцежнікаў-арыштантаў. Але Няслаўскага ня было ў Слаўным, ён раненька паехаў у горад. Стары Амелька пачухаў патыліцу, ня ведаючы, што зрабіць, аддале папытаўся ў пакаёўкі:

— То пані мо' дома?

— Дома то дома, сьпіць яшчэ пані.

— Ох, галубка, дык я ўжо пачакаю, пакуль яна ўстане, а ты скажы ёй, што прышоў стары Амелька з Заямнага. Ды гукнеш тады мяне.

— Сядзеў-бы дома лепш, стары, чымся па панох хадзіць. Чакаць вось, мусіць, нямала давядзецца.

— А няхай сабе, мая ты красуня. Дома ў мяне ў ладу ўсё, дзякаваць богу, і сьпяшацца вельмі няма чаго. Ты-ж мяне гукні пасьля.

— Ці захоча яна гаварыць яшчэ з табою,—пайшоўшы, сказала пакаёўка.

Стары не пачуў, адышоў ад ганку, сеў на травіцы, паставіў калены, а бараду сівую спусьціў на іх і ўзяўся чакаць. Чакаў ня мала.

Пакаёўка, мабыць, не забылася пра яго, бо выйшла на ганак і сказала, што пані ўстала.

— Ідзі за мною, стары, я правяду цябе.

Пані Няслаўская толькі-толькі памылася і канчала зачэсваць валасы перад вялікім на ўвесь яе рост люстэркам. Была яна ў лёгкім мяккім капоце, з шырокімі рукавамі, якія гэтак прыемна і ласкава апраналі гладкія, выпешчаныя паніны рукі. У спальні пахла прыгожымі пахамі рознае парфумы, што гэтак патрэбна была ў вялікім горадзе і без якое Няслаўская жыць не магла нават тут, у Слаўным.

Пакаёўка ўвайшла і сказала, што прывяла старога ў панскі габінэт.

— Добра, Стася. Прыгатуй мне бежавы гарнітур, я пайду пасьля на праходку. Дзе паненка?

— Ня ведаю, пані, казала яшчэ ўчора зранку, што пойдзе да свае нейкае таварышкі.

— Жах!.. Жах адзін, што за дзяўчына. А які гэта стары, Стася, прышоў? Ці ня той часам, што з гэтымі падбухторшчыкамі-баламутамі быў калісь?

— Той самы, пані, Амелька з Заямнага.

— Панадзіліся... Уведалі, вельмі дарогу,—ціха, але няпрыемна праказала Няслаўская. І гукнула на пакаёўку:—Ідзі прыгатуй гарнітур, ты мне не патрэбна цяпер.

Паправіла апошнія пасмачкі густых гладкіх валасоў і зайшлася ў габінэт, дзе сядзеў стары.

— Да пана прышоў? Чаго? Пана няма дома. Табе сказалі пра гэта? Ну вось, дык кажы, чаго прышоў?—засыпала яго, як горахам, запытаньнямі пані.

— Няхай вам бог даўгую жытку дасьць, добрага здароўя і шчасьця, панечка мая. Ня з радасьцю прышоў я. Думаў, вось, убачу пана, перакажу яму ўсё, а не застаў, дык скажу вам—паслухайце толькі мяне, старога ды дурнога.

— А можа вельмі сакрэтнае, што аж да пана прывяло? Тады пачакай, ён да вечара прыедзе.

— Ды не, панечка добрая, сакрэт то не вялікі. Думаю ў дурной сваёй галаве, што і вы дасьцё рады.

— Ну добра, кажы, бо мне часу няма слухаць.

— Ой, панечка, ня з добрым прышоў я. Благое думаюць людзі.

Пані нецярпліва насупіла брыву. Амелька ўбачыў і ўжо без далейшых размоў, якімі ў характары ў яго было перасыпаць тое, што ён думае выказаць, сказаў адразу:

— Грэх вялікі рыхтуюць людзі. У Заямнае папрыцягаліся нейкія нядобрыя людзі, валацугі нейкія, панечка мая, і ўсё падбухторваюць народ супроць паноў. Аж страх робіцца, слухаючы. Толькі прыйдзе той вечар ці сьвята якое,

дык проста праходу няма за імі. Арыштанты, панечка, мяцежнікі нейкія, ня пры вас казана.

— Аггааа... А як зваць іх? Адкуль яны папрыходзілі? З кім хэўру вядуць?

— Ды з кім, панечка, вядома з кім, хто вока вялікае мае на паноў, а сам рабіць лянуецца—думае, каб яму само гэта прышлося. А гэтыя самыя мяцежнікі—хто іх ведае адкуль, толькі нібыта паляўнічыя, са стрэльбамі... У дзень па палетках топчуцца, па сенажацях, а ўвечары сыходзяцца ды мяцежнічаюць. Баюся я, панечка, што наробіцца з таго работы... Страх адзін, дый годзі.

— То было як на ліха, а гэта—як на пуста... Добра, старэнькі, а гэта ўсё праўда?

— А як-жа ж ня праўда, панечка,—ня прышоў-бы я дарэмна пану галаву дурыць.

— Ты іх з твару ведаеш?

— Чаму-ж мне ня ведаць, ведаю, панечка, агорклі яны ўжо мне, як горкая рэдзька.

— То вось што, старэнькі... Ідзі дамоў, ды нікому ні слова—дзе быў і што.

— Каму мне што вельмі казаць, дарагая панечка,—запэўніў яе стары Амелька, скамячыўшы ў руцэ старую прапацелую шапку.

— Я перакажу ўсё пану, як прыедзе.

Сказаўшы гэта, яна прачыніла дзьверы і паклікала пакаёўку. Як прышла тая, спакойным голасам спыталася:

— Гарнітур мне?

— Гатоў, пані, ўсё гатова.

— Пан надоўга паехаў, не казаў?

— Не магу ведаць, пані. Толькі казаў, што прывязе гасьцей і каб падрыхтавалі да іх пакоі і стол.

— Не забавяцца, відаць. Вось што, Стася, выберы гэтаму старому адну з панавых шапак.

— Слухаю.

— Дзякаваць вам, панечка, гэта мне на сьмерць будзе,—азваўся Амелька.

— Добрым людзям ня трэба ўміраць. Дык ідзі-ж, стары, ды памятай, што я казала.

— А ўжо-ж, памятаць буду, панечка. Дзякаваць за ласку.

Няслаўская не пайшла ўбірацца ў бежавы гарнітур, а села за пісьмовы стол і пачала пісаць ліст. Падзякаваўшы яшчэ і нізка скланіўшыся ёй, стары Амелька з Заямнага пайшоў за пакаёўкаю. Стася выканала панін загад і дала яму ношаную, але яшчэ зусім добрую панскую шапку з пруткім верхам, за якую стары падзякаваў і пакаёўцы і схаваў асьцярожна пад сьвітку.

На сэрцы яму палягчэла. Ён адчуваў, што выканаў вельм вялікі абавязак,—нават шапку на сьмерць пані дала, дзяку ёй. У нагах маладая зьявілася порсткасьць. Ён ішоў і бур катаў сабе пад нос старасьвецкую песеньку, якую сьпява калісьці маладым з дзяўчатамі.

Выбраўшыся за прысады, на шлях, ён дастаў шапку зьняў з галавы сваю старую, памераў. Шапка трохі ціснула галаве і пруткім верхам упірала ў лысіну, але-ж нічога добрая шапка на сьмерць, панская шапка, насіла яе разум ная панская галава... Памераўшы, зноў схаваў пад сьвіту і лёгка пайшоў па гладкім пылістым шляху.

— Цяпер вось паглядзімо, блазьнюкі, мяцежнікі. Малако маміна на губах не павысыхала, а яны—бунтаваць, сьветам брыдзіць!..

Поўны імкненьняў і ўпэўненасьці, стары Амелька ішоў у Заямнае. Ён пакажа сябе там, ён жыцьцё ведае, ён паспытаў і прыгону яшчэ, ня то што іншы хто. Загоны з чатыры аставалася ўжо да поваратқі ў Заямнае, калі насустрач яму з-за ўгорачку вытыцнуліся чатыры чалавекі. Зоркае яшчэ вока Амелькава згледзела ў аднаго за плячыма стрэльбу. Тры ішлі так, бяз нічога. Яшчэ не пасьпеў Амелька адвесьці вочы ад іх, як чулае вуха ўлавіла конскі тупат і чатырох чалавек дагнала прасторная каламажка, запрэжаная параю коньмі. У каламажцы сядзелі два мужчыны і жанчына.

„Напэўна Слаўнаўскі пан вяртаецца дамоў“, падумаў Амелька і яшчэ заўважыў, што каламажку дагналі два конных і паехалі ззаду ступою.

На самой поваратцы, да якое ён не дайшоў на два якіх загоны, каламажка з коньнікамі прыпынілася—дагналі пешых. Не пасьпеў стары Амелька ўявіць сабе, схапіць вокам усяго, як адбылося зусім нечаканае і страхотнае разам. Чатыры мужчыны павярнуліся да каламажкі. Два падскочылі да коняй і схапілі іх за аброць. Два кінуліся на коньнікаў. Ці з таго, ці з таго боку, стары спуду ня мог ухапіць стрэлілі два ці тры разы. Пешыя пазвалакалі коньнікаў з коняй, паадбіралі вінтоўкі. Яшчэ потым выцяглі з каламажкі аднаго мужчыну, закрычалі на яго моцна, пачалі біць... Потым вывелі коні і пазганялі са шляху. Коні, пазалупваўшы хвасты, упуджаным чвалам паімчалі па шляху назад.

Стары Амелька выпусьціў спуду панскую шапку і, колькі спрыту было, цераз поле пацялёпкаўся ў Заямнае. Прабегшы трохі, азірнуўся. Каламажка стаяла на шляху, а каля яе ляжаў чалавек і над ім схілілася трое з жанчынаю; фурман з пугаўём у руцэ дробным трухам бег у Слаўнае. Чацьвёра-ж першых з вінтоўкамі ў руках, што паадбіралі ў коньнікаў, шпаркім крокам накіроўваліся ў блізшы слаўнаўскі лясок,

З МЕЦЯЖОМ і паўстаньнем у горадзе ў социял-дэмократаў нічога не ўдалося. Рота салдат, якую выпатрабаваў спраўнік і якая гэтак трапна прысьпела на бойку баявое дружыны социял-дэмократаў з паліцыяй, была разлучана на паўроты, адна засталася ў горадзе, а другая адправілася ў Дубава мястэчка і там закватаравала. Але тутэйшаму начальству аднае роты, відаць, замала здавалася—і тымі днямі, калі Арон і Майзэль разьвіталіся з дружынаю пад Хорашавам і вярнуліся ў горад, слых гарадзкіх абываталяў і няпрыемна і прыемна адначасна зьдзівілі гукі фанфар драгунскага экскадрону, прысланага начальнікам каральнае экспэдыцыі дзьвёх сумежных губэрняў для ўсьмірэньня рэволюцыйных мяцежнікаў.

Усё гэта аднак-жа яшчэ не пашкодзіла-б Арону на доўгі можа час астаўбавацца ў горадзе. Памеркаваўшы як сьлед, ён парашыў пакуль бяз лішняга шуму і гоману пасядзець цішком, а тымчасам паспрабаваць папытаць якое работы, толькі такое, каб не ўспадаць вельмі нікому на вока і тым забясьпечыць магчымасьць інтэнсыўнае работы. З свайго застрахаванага такім парадкам прытулку ён ускалыхне напалову разьядданыя рэволюцыйныя масы, напалову прыціснутыя ўжо абсолютам ваеннае сілы, злучыць іх у адно, удыхне ім агонь жорсткага змаганьня, зьліе іх цэмантам клясавае нянавісьці і на ўсім павеце загарацца агні рэволюцыйнага паўстаньня.

Пакуль што Арон прыпыніўся ў Яўхіма з Зусевае майстэрні. Хатка Яўхімавых бацькоў, стоячы на водкідзе пры выгане, была самым бясьпечным, самым надзейным да часу прытулкам. Сюды ня надта наведваліся гарадавыя, акалодачныя ды квартальныя, сюды-ж таксама ня тыкалі носа ўсялякія пераапранутыя добраахвотныя паліцэйскія. Ні бацькі Яўхімавы і ніхто з суседзяў ня зналі Арона. Яўхім сказаў, што яго добры знаёмы прышоў шукаць работы ў горадзе і пакуль знойдзе—папрасіўся прытуліцца. Старыя бацькі любілі сына і не пярэчылі яму ні ў чым; Арону клапаціліся дагадзіць, у чым маглі, як сынаваму сябру. Малодшы брат толькі Яўхімаў дагадаўся адразу, як убачыў Арона: яму прыпамянулася колішняя патайная сходка ў хаце, калі ён разам з братам стаялі за вартаўнікоў на дварэ, каб на які выпадак папярэдзіць тых у хаце. Варта была першаю рэволюцыйнаю навукаю маладому тады хлапчуку. Цяпер-жа быстрым наглядаеньнем, што набылося ў падпольнай рабоце разам з братам, ён адразу, без памылкі, адгадаў у Ароне

аднаго з тых рэволюцыянэраў, якому, мусіць, з прычыны важнае патрэбы, сталася неабходным прыпыніцца ў іх.

Праз Яўхіма і Лейбу Арон наладзіў сувязь з Майзэлем і ўстанавіў строгую консьпіратыўнасьць. Перапыненая ўжо была работа зноў аднавілася: пачалі вызначацца невялічкія лікам гурткі і групачкі пры прадпрыемствах, заўважалася пэўная тэндэнцыя да пашырэньня і афармленьня організацыі. Пэрспэктывы надавалі надзеі Арону, а Майзэль зноў пачаў нэрваваць і дражніць сваімі меркаваньнямі асьцярожнага цьвёрдага Арона. Новыя акалічнасьці пасталі нібы ў абарону-падтрыманьне Майзэлевае нэрвовасьці.

Дні праз тры нешта прышоў з работы Яўхім напружаны і радасна ўсхвалёваны. Адчуваючы, што той прынёс радасную нейкую вестку, Арон забыўся, што яны не адны ў хаце і пасьпешна спытаўся:

— Новае што?

— Заработак табе знайшоўся,—адказаў той.—Выйдзем вось паходзім па надворку—сёньня вечар такі добры,—пагаворым.

Арон схапянуўся, што ня сьлед быў запытаўся, вышаў з Яўхімам на двор.

— Якія навіны?

— Знаёмага гарадавога бачыў сёньня і ён выказаў мне, што міль у дзьве ад гораду, кажа, на двух стражнікаў з вураднікам напалі тры бунтаўшчыкі. Стражнікі вялі ў воласьць арыштаваных сялян. Ну, вось, іх і вызвалілі. Вураднік і адзін стражнік паранены ў бойцы.

— Эге-е-е! Ну-ну, што далей?

— Ты адгадаў, гэта яшчэ ня ўсё. Таго-ж дня, пад вечар, другія стражнікі нахапіліся на іх у вёсцы, паблізу ад першага месца. Дык тут ужо сапраўдная бойка адбылася: забіты адзін мужык, што падказаў стражнікам, дзе прыпыніліся соцыял-дэмократы...

— Соцыял-дэмократы?

— Казаў, соцыял-дэмократы, узброеныя рэвальвэрамі. Ды паранілі яшчэ аднаго стражніка. Невядома, кажа, чым-бы скончылася, каб не раптоўны пажар у тым двары, дзе ўсё рабілася.

— А чым-жа скончылася?

— Уцяклі соцыял-дэмократы—і ўсё. Трое ўцяклі ад пяцярых стражнікаў.

— Малайцы!—ня вытрываў Арон, каб не пахваліць.— Гэта напэўна нашы. Малайцы!

— Але як прыехалі драгуны, дык спраўнік выправіў туды рэшту стражніцкага рэзэрву і нават трохі гарадавых пасадзіў на коні, паслаў на павет.

— Нам яно добра, няхай пасылаюць. Вось што, Яўхім, заўтра скажы Лейбу, каб ён наказаў Майзэлю, што я буду чакаць яго на выгане, вось гэтак пасьля работы. Трэба параіцца пра ўсе гэтыя справы. Малайцы!—ня вытрываў ён, яшчэ раз пахваліў дружыньнікаў.

— Добра, Арон, я накажу Майзэлю.

Агонь змаганьня, агонь сталёвае ўпартасьці разгарваўся ў Аронавым сэрцы. Надзеі набіралі выразнага зьместу і формы. Пэрспэктывы ясьней вызначаліся наперадзе, вабілі да сябе, хвалявана цяглі сваёю, здавалася, блізкасьцю і магчымасьцю перамогі.

— Дык накажы Майзэлю... Заўтра пасьля работы,—праказаў ён.

Спалася гэтае ночы бадзёра і чула. І назаўтра цэлы дзень чаканьне бадзёра хвалявала яго і раз-по-разу пазіраў ён у акно. А пасьля ня вытрымаў, пайшоў прайсьціся па выгане.

Было па поўдні. Белыя аблачынкі плылі ўгары гэтак ціха і стройна. Адна з аднэю, не абмінаючы, не перасьцігаючы, плынна імкнуліся яны з далёкае поўначы на поўдзень. І наплыве гэтак аблачынка, як сьнег бялюткая, на яснае сонца, схаваецца яно на дзьве-тры хвіліны і мяккі халадок прабягае ласкавым ценем па выгане. Так дагоджвала гэта Аронаваму настрою: то бадзёрасьць і жаданьні нясутрымным агнём адказвалі палкаму сонцу, то халадок сумненьня і няўпэўненасьці працінаўся раптам здалёк аднекуль, а можа то бялютка-дзівосная аблачынка, запяўшы сонца, сваім мяккім ценем наганяла на сэрца халадок.

Не заўважаючы сам, Арон ішоў кружнаю дарогаю, па якой абыходзіў некалі з Ігнасём горад пасьля першае камітэцкае сходкі ў Яўхімавай хаце. Як лёгкія шпаркія самакаткі, прамігнуліся перад ім мінулыя гады. Колькі стараннае і ўпартае дзейнасьці. Колькі сілы і сродкаў патрачана. І раптам такі перарыў, такая шчыліна ў рабоце... „Ой, не... не! Сваімі думкамі, сваім жыцьцём мы затохцім гэтую шчыліну і правядзем па ёй прыгожы слаўны шлях у далёкаблізкае, у сьветлую і жаданую будучыню“.

Выган спаў, унурыўшыся пад ясным палючым сонцам, адпачываў. На самым краі пры шашы гулялі дзеці з прыгарадных хатак; далёка, на другім канцы, пад сельскія палеткі пасьвілася чарада гарадзкіх кароў. Ціха было наўкола, як паўмірала ўсё: нішто не шавілілася, нішто ня рухалася; нішто не гаманіла. Толькі Арон і парушаў гэтую дзенную сьціш павольнымі няпэўнымі крокамі. Ён прайшоў ужо з паўвярсты, захоплены ў сваіх думках, якімі абмяркоўва-

лася назначаная з Майзэлем гутарка. Ішоў-бы і яшчэ з вярсту, дзьве, тры можа гэтак, каб не раптоўны вокліч пазадзе.

Арон павярнуўся. Шпаркім крокам яго даганялі чацьвёра людзей з Яўхімам наперадзе.

— Бяда!.. Усё прапала,—падыходзячы, загаманіў той.— Мы ледзьве ўцяклі...

Цімох як упалёваны зьвер, працінаў гарачым зіркам выган. Лейба з Бросілевага бровару азіраўся на бакі. Жалоба і маркота прыляцелі за імі, пасталі за плячыма і зьмітусілі Арону ўсе думкі і намеры, пакрышылі адным сваім зьяўленьнем гэткія блізкія, здавалася, і вырашоныя пляны.

— Як?.. Што?

— Майзэля арыштавалі сёньня ўраніцы. У Файбэля забралі двух хлопцаў... У млынох таксама... Па ўсім горадзе арышты і арышты. Каб ня Лейба, дык уклёпаліся-б і мы.

— Зноў няўдача,—прашаптаў Арон, але так ціха, што не пачуў ніхто яго, растрывожаны астатнімі падзеямі.

— Арыштоўваюць усіх, хто толькі дзе сказаў неасьцярожна слова супроць улады... Арыштоўваюць і бундаўцаў,— сказаў Лейба.

— Адзін страх, што робіцца,—азваўся за ім трэці.

„Няўжо гэта канцы? Гэткія канцы?“ прамігнулася ў думках Аронавых. „Ня веру... Ня можа быць?“ І голасна сказаў:—Хто хоча, за мною?

Не азіраючыся ні на кога, рушыў ён і шпарка, шпарка пайшоў па выгане туды, дзе пачыналіся доўгія, шырокія палеткі жытоў, аўсоў, ячмянёў. І ўсе чацьвёра адданых прыхільнікаў пайшлі за ім, не астаючыся ні кроку...

Сонца схілялася на захад. Даўгі цень пачынаў класьціся ад чалавечых постацяй. Перад вечарам ажывала навакольнае жыцьцё. Пяцёра маўклівых, хмурных людзей сігалі проста нацянькі па палетках.

На другі дзень, ноч перасядзеўшы пад старэнькім ветраком, сустрэліся ў ляску Няслаўскага з Ігнасём, Ясем і Дубам. Ігнась быў невясёлы, самотны. Але ўбачыўшы, які хмурны Арон, і загледзеўшы хлопцаў у кучы з дружыньнікамі, зьдзівіўся:

— Чаму гэта Яўхім з табою? І Цімох, і Лейба?

— Ня пытайся лепш... Майзэль у турме... Увесь горад у арыштах, бяруць за што пападзе, або і зусім бяз ніякае прычыны. У горад прыгнала эскадрон драгуноў... Мы разьбіты,—вымавіў цераз сілу Арон.

— Не! Мы не разьбіты! Нас ня гэтак лёгка зламаць. Чалавек сорак—пяцьдзесят узброеных...

— Паляўнічымі стрэльбамі,—з горкасьцю сказаў Арон.

— ...Ты памыляешся, Арон. Не паляўнічымі стрэльбамі, а нянавісьцю да ворагаў рэволюцыі, а жаданьнем біцца да апошняе хвіліны,—гняўліва праказаў Ігнась,—зморшчкі, зусім як у старога, папрарэзваліся раптам на твары.

І каб ня чулі ўсе іхнае трагічнае размовы, каб не датыркнулася іх горкасьць і расчараваньне мо', адышліся на паўзагона ў лес. Ігнась быў гэтак натаміўшыся, гэтак зморany ўсім апошнім, што адбылося з ім, але не паказваў і знаку.

— Ты... Любу... бачыў?—цяжка вымавіў Арон і ўнурыўся. Толькі потым, калі Ігнась адказаў, узьняў вочы і глядзеў ужо проста перад сабою. Нібы нешта ясна-сьветлае бачыў наперадзе і зьміргнуць ня мог, гэтак любым было тое, што стаяла перад вачыма.

Ігнась расказаў Арону ў парадку пра ўсё, што адбылося з ім, калі разьвіталіся яны, прышоўшы з дружынаю з-за Балотнікаў. Казаў пра Любу, пра сутычкі са стражнікамі, пра бойку ў сяле, нарэшце, спыніўся, дыхнуў моцна-моцна на поўныя грудзі, быццам цяжар вялікі прыгняў быў іх.

Арон маўчаў. Ігнасёва гора прыціснула і яго, зрабілася і яго горам, да агульных няўдач падсуседзілася яно і ад таго гарчэй рабілася на сэрцы. Шкадаваў ён Ігнася, як свайго брата, як найлепшага сябра і таварыша. Але словы суцяшэньня чамусьці ня ішлі з вуснаў, ці мо' разумеў Арон, што суцяшальныя словы не для іх, не для рэволюцыянэраў, няўдачамі засуджаных на зьніштажэньне.

— Тры дні блукалі мы, каб пахаваць усе сьляды і заблытаць стражнікаў. Ад конных ня вельмі лёгка ўцячы пешаком... Тры дні бадзяліся, пакуль упэўніліся, што стражнікі згубілі нас. Учора за паўдня выбіліся зноў сюды і на шляху сустрэліся... з кім-бы ты думаеш?.. З самім спраўнікам. У госьці ехаў з спраўнічыхаю да Няслаўскага, пры варце з двух стражнікаў. Халера яго чапала-б, каб ня ён сам, бо гэта нам ня вельмі з рукі было—сам Няслаўскі ехаў разам з імі. Але спраўніку ўздумалася паказаць свой спрыт. На нас крыкнулі, каб сталі і паказалі свой жыхарскі від... Дык мы паказалі... стражніцкія вінтоўкі там у дружыньнікаў.

— А з імі што зрабілі?

— Павыпрагалі коні ды пусьцілі гуляць па палетку.

— А дарогу!.. вы-ж ім паказалі, куды пайшлі!

— Дарога вялікая. Чаму гэта яны будуць думаць, што мы прыпыніліся ў гэтым ляску, пад носам у пана Няслаўскага.

— Небясьпечна... Спраўнік выслаў на павет стражніцк запас і я баюся, што яны не забавяцца. Дружына ўся тут?

— Чалавек дзесяці яшчэ няма.

— Паслаць зараз-жа двух-трох чалавек на сёлы, пазьбіраць. А то мы можам апынуцца, седзячы тут, як у пастцы.

— Я скажу Дубу... Потым... Ты дазволіш ці не?.. Наказаць Ларысе Няслаўскай, дзе мы стаімо, каб зрабіла ўсе захады, што толькі можна зрабіць там...

Арон зірнуў на Ігнася—вока ў вока, адказаў:

— Пасылай, наказвай...

Прасьвятлеў твар у Ігнася. Хмары чорныя пазьбягалі з твару. На хвіліну якую радасная ўсьмешка—ня ўсьмешка радасьць з глыбіні сардэчнае выплыла на адно імгненьне і потым схавалася, зьнікла ў сваім ранейшым прытулку.

— Дык хадзем да ўсіх. Я распарадкую людзей.

— Любе таксама накажы.

## X ПЕРАД РАЗЬВЯЗКАЮ

ПРЫБІТЫ на шляху дружыньнікамі і заняжывелы спраўнік быў перавезен барджджэй у Слаўнае і пачаў адыходзіць патроху. Лежачы на мяккай пасьцелі ў пакоі з расчыненымі вокнамі, пад наглядам папярэдлівых жанчын, на другі дзень ён ужо ачуньваў. А ўліпла такі яму трохі нямала: чорныя гузы паўсхопваліся на галаве, пад вачыма як-бы дзёгцем было павымазана, а нос дык распух на нелапы агурок.

Адчуваючы вялікую дзель віны на сабе, Няслаўскі клапаціўся як лепш ня трэба ўжо, каб акружыць хворага прытульнасьцю свайго Слаўнага. На другі дзень, калі спраўнік пачуў сябе гэтакім здаровым, што мог устаць з ложка і сядзець сам, Няслаўскі загадаў пакаёўцы прынесьці з дзядоўскае і бацькоўскае яшчэ схованi розных гатункаў віна. У спальні перад хворым паставілі стол і ўстанавілі наедкам і пітвом. Пан Няслаўскі гэтак клапаціўся загладзіць сваю віну перад панам спраўнікам. Заміж гасьцей набраўся Няслаўскі клопату.

Затое Няслаўская была крыху іншых думак і меркаваньняў пра ўсе апошнія падзеі. Яна па-гаспадынінаму ўхаджвалася ля хворага спраўніка, лячыла ад панскае істэрыкі мілачку-спраўнічыху і камандавала, адным словам, усім. Усе ў пакоях і ў двары былі ў яе распараджэньні і пад яе наглядам. І калі на другі дзень спраўнік, падтрыманы пяшчоткім

доглядам і добрым віном, адчуў у сабе гульлівы настрой, зусім неадпаведны яго пашкумачанаму віду, дык Няслаўская папрасіла ўсіх выйсьці з пакою, каб пагутарыць сам-на-сам з ім. Прымосьціўшыся на нізкім мяккім пуфчыку-гузырыку побач і палам жаданьня і нянавісьці дышучы ў твар спраўніку, сказала:

— Пане спраўніку, я з вамі хачу пагаварыць. З нецярплівасьцю чакала таго часу, калі вам пачне ісьці на папраўку... Цяпер вы сябе адчуваеце добра?..—бліснула яна іскрыстымі абяцальнымі вачыма.—Добра-ж такі? Глядзіце, у вас і вусікі самі па сабе стрэлачкамі паўставалі ўгору...

— Пані Няслаўская... Дора!.. Дора...

— Васільлеўна.

— Дора Васільлеўна, толькі дзякуючы вашаму пяшчоткаму догляду я здолеў сёньня ўстаць.

— І добра. Але трэба ўжыць усе захады да пакараньня гэтых мяцежнікаў. Пане спраўнік, я меруся зрабіць усё гэта ў сакрэце, каб забясьпечыць поўны посьпех.

Няслаўская расказала пра сваю ўчарашнюю гутарку са старым Амелькам і пра тое, што яна намервалася зрабіць ужо, калі выпадковае здарэньне сапсавала ёй ўсю рахубу.

— Мяркуючы па ўсім, што я чула і аб чым казаў наш фурман са стражнікамі, гэтыя бунтаўшчыкі мусяць быць не далей, як у нашым лесе. Калі-ж яны і пасьпелі выбрацца куды далей, дык мы іх усё адно паловім. Бравы камандзір драгуноў ня дасьць промаху... Пане спраўніку! Спадзяюся, што вы дасьцё такое распараджэньне.

— Пані Няслаўская!.. У вас начальніцкі розум.

— А вы думалі, пане спраўнік, што жанчыны горш за мужчын разьбіраюцца ў пытаньнях палітыкі. Усясьветная гісторыя ў найбольш выдатных яе зьявах зроблена жанчынамі... Жанна д'Арк, княгіня Монтэспан, каралева Елізабэт ангельская, каралева Ізабэла гішпанская, царыца Кацярына руская. Ці мала, ці мала, дарагі пане спраўніку, жанчын, якія тварылі гісторыю?.. Ці мала іх упісана ў запыленых фоліантах гісторыі сьвету. Я скажу нават больш, яны накіроўвалі ходам гісторыі. Жанчына, прыдушаная царскімі і каралеўскімі апачывальнямі, сваім дасьціпным розумам ня раз вызваляла царскія фаміліі і цэлыя дзяржавы ад пагібелі. Вам гісторыя можа не патрэбна, пане спраўніку, але, калі прыпала так да размовы, скажу вам, што ўся гісторыя дзяржаўнасьці— гэта гісторыя жаноцкае пекнаты і дасьціпнасьці розуму.

— А я зусім і ня ведаў гэтага пекная пані Няслаўская,— сказаў спраўнік, гульліва стрэліўшы вокам у пекны выгіб паніных вуснаў, і схіліўся, пацалаваў яе гладкія арыстакратычныя пальцы.

— Дык вось, ведайце.

— Цяпер буду ведаць.

— Як бачыце, жанчыны ў ролі дараднiц i настаўнiц не астаюцца пазадзе i ў наш век,—сьмяхотлiва праказала Няслаўская.

Спраўнiк даў на ўсё сваю згоду. А калi Няслаўская напiсала паперку камандзiру драгунскага эскадрона, ён расчыркнуўся дробным адмысловым росчыркам i зноў пацалаваў гладкiя выпешчаныя пальцы, якiя адносiлi iнтымнымi пахамi жаноцкае парфумы, уласьцiвае толькi аднэй панi Няслаўскай.

Быў паклiканы ў пакоi адзiн са стражнiкаў уласнага спраўнiцкага конвою. Няслаўская падала яму конвэрт, залеплены сургучоваю пячаткаю Слаўнага, ды прыказала:

— Вязi зараз-жа i дай у рукi самому камандзiру,—разумееш?

— Паўтары!—загадаў спраўнiк.

— Зараз-жа везьцi i аддаць у рукi самому камандзiру.

— Скажы там, на стайнi, каб засядлалi каня i з богам.

У стражнiка паказаўся цень зьбянтэжанасьцi i спалоху.

— Ваша высокародзьдзе!.. Прашу як лiтасьцi, звольнiце, пашлiце другога каго!

— Што-о-о так-к-ое, брацец?!

— Ды... ваша высокародзьдзе!.. А ежлi ды гэтыя самыя мяцежнiкi зноў трапяцца на дарозе...

— Не разважаць! Грудзьдзю прабiцца павiнен!

— А ежлi, вашаскародзьдзе, яны нападуць, а ў мяне нi шашкi, нi вiнтоўкi... I адбяруць пакет.

— А гэта ты праўду, брацец... Баiшся?

— Ды небясьпечна, вашаскародзьдзе!

— Айда, брацец, айда, едзь.

— Дазвольце, вашаскародзьдзе, сказаць!

— Кажы, брацец, чаго яшчэ там?

— Дазвольце, вашаскародзьдзе, перамянiць форму на вольную.

— Гэта што за iдэя?

— А каб не пазналi бунтаўшчыкi, каб пэўна завезьцi пакет i аддаць у рукi самому камандзiру!

— Бадай ён праўду кажа, панi Няслаўская.

— Кiньце дробязь, пане спраўнiку.

— Праўда, праўда... Айда, брацец! Мяняй сабе форму, толькi пакет каб аддаў няпрыменна. Нiначай, а не, жывы не вяртайся.

— Слухаю, васкародзь! Пакет аддаць цi жывым не вяртацца.

Праз паўгадзіны ўжо, пераапрануўшыся ў вольную вопратку, пудлівы стражнік выяжджаў конна з Слаўнага.

У Слаўнаўскім лесе тымчасам Ігнась з Дубам ставілі вартавых. Шасьцёра дружыньнікаў узялі самы строгі наказ вартаваць сваіх таварышоў і разышліся па вызначаных Ігнасём пунктах. Самую важную і небясьпечную варту насупроць галоўнае дарогі, што вяла ў лес, прыпаручылі Ясю.

Гэтая дарога абступілася з аднаго боку нявысокімі ўзгоркамі, а з другога—нізкімі лагчынамі. Па правым баку пацяглі балацяныя лагчыны, выраўноўваючыся к рацэ ў гладкую густую сенажаць. З боку ад балота, пры дарозе, ішоў глыбокі сухі ўлетку роў. Наабапал парасьлі густыя хмызьнякі, цягнучы па дарозе на нейкіх загонаў чатыры. Пры полі камлаціўся колкі шыпшыньнік, а з балота наступаў на дарогу густы малады алешнік, дзе-ні-дзе крушына, дзе-ні-дзе раскатая няпрыдатная лаза.

Паставіўшы Яся на краі лесу пры дарозе, Ігнась абвёў рукою наперадзе сябе, паказаў на ўзгоркі і лагчыны, на дарогу і сказаў:

— Глядзі-ж... Гэта самая важная варта.

— Як свайго носа глядзі,—сур'ёзна дадаў Дуб.

— Калі толькі што, дасі сыгнал.

— Добра... А калі трапіцца затрымаць каго?—запытаўся Ясь.—Як-жа тады?

— Вось гэта ты праўду сказаў. Добра, мы прышлем табе яшчэ аднаго чалавека,—адказаў Ігнась і пайшоў з Дубам краем лесу паглядзець, як пасталі вартаўнікі.

Абышоўшы ўвесь лес, на што загібалася часу ня менш як гадзіна, абое завярнуліся, нарэшце, ісьці да месца супынку дружыны. Вартаўнікі стаялі на сваёй варце добра. Пастаўленыя адзін ад аднаго на адлегласьці якіх пяцёх загонаў, яны азіралі як сьлед усю мясцовасьць наперадзе, і ніводная жывая душа ня здолела-б пралезьці ў лес, не паказаўшыся таму ці таму з вартаўнікоў. Самыя лепшыя дружыньнікі вартавалі таварыскі спакой і ім можна было прыпаручыць гэтую вельмі адказную і важную задачу.

А спакой у лесе пакуль што не парушаўся нічым. Лясныя птушкі ўгаманіліся на нейкую часіну. Было поўдня—найцішэйшы час у прыродзе за дзень. Вецер—і той прыпыніўся дзесьці на ўскраі ў халадку ад раскошыстых дрэў.

Адышоўшыся трохі ў лес, Ігнась папрасіў Дуба спыніцца і пачакаць яго. А сам тымчасам выняў з кішэні лісток чыстае паперы і аловак, стаў на каленцы перад пнём сьпілаванага некалі гладка дуба і напісаў нешта. Напісаў і задумаўся. Лёгшы ніц пад высокаю і тонкаю бярэзінаю, Дуб глядзеў на Ігнася. Ён таксама думаў, пра што — невядома.

Думаў датуль, пакуль Ігнась пісаў. А як скончыў ды загарнуў лісток, як загортваюць парашкі ў аптэцы, Дуб устаў і падышоў да Ігнася.

— Вось што, братка Дуб... Хто ў нас ня вельмі быў тут каля Слаўнага — распытай, каб не пазналі, і хто ведае на твар парабка Вітольда. Трэба пераслаць гэтую паперку яму, з наказам зараз-жа аддаць з рук у рукі паненцы?.. Ларысе Няслаўскай.

— Ня варта-б нам, Ігнась, з паненкамі знацца, — сказаў Дуб, утаропіўшы зірк далёка паміж дрэў.

— Ня тое ты думаеш...

— Ня варта, Ігнась. Люба — вось гэта твая дзяўчына. Але цяпер ня трэба думаць ні пра якія дзяўчаты.

— Не, Дуб, дзяўчаты ні прычым тут. Ларыса робіць тую-ж справу, што і Люба, што і мы з табою. Целам яна сярод паноў, а душою з намі.

— І сэрцам?

— Можа і сэрцам... Бо да чаго маеш прыхільнасьць, да таго і сэрца горнецца.

— Мабыць. Глядзі, Ігнась, не памыліся.

— Ведаеш, браце, мне здаецца часта, асабліва вось гэтымі днямі, што калі я і памыляюся ці памыляўся ў чымнебудзь, то больш таго ня будзе. Чамусьці не дае спакою неадвязная думка і ня думка, а быццам сядзіць нехта ў сярэдзіне і ўсё тлумачыць гэта: астатнія дні сыходзяць, памяркуй, як пражыць іх, каб сьмерць нечакана не засьпела ў дарозе.

— Глупства, браток!.. Нас сьмерць ня возьме. Ог-го-о, няхай паспрабуе адно, — зубы сабе павыкрышвае. Пакінь пра гэта, не дарэчы маладому ды дужаму вярзьці, што ня сьлед. Паслухай, кінь!

— А вельмі ўжо і радавацца таксама, браток Дуб, няма чаго. Майзэль вось — рыпацеў, рыпацеў, гарачыўся, гарачыўся, усё аб тэй прывабнай часіне, калі зробіцца людзям жыць, як захочуць. А цяпер у астрозе колькі ён папнее?

— Усё яно праўда, Ігнась, але-ж нядобра гэта. Чуеш? Нядобра! Ня трэба галаву сабе муціць такімі жалобнымі думкамі. Ня трэба. І больш я табе нічога не скажу.

Усерджаным голасам, але па-таварыску казаў Дуб.

— Я пакіну, Дуб, толькі-ж ты не кажы, што з дзяўчатамі ня трэба знацца. Я ня вельмі і думаю.

— Калі праўда, добра робіш. А хоць і думаў-бы, табе, гэтакаму маладому, ня прыстане, — ліха не даждала.

— Дык ты ўжо пра паперку ні слова? — павесялеўшым голасам сказаў Ігнась. Ураз быццам з гэтымі словамі ўся

пахмурная гутарка наскрозь зямлі прайшла, нават і знаку яе не засталося.—Пашлеш?

— Ат, што з табою зробіш. Давай, ды тымчасам трэба варушыцца, нябось, чакаюць нас.

— Хто як хто, а Арон напэўна. Ён-жа казаў на нашым адыходзе, што трэба абмеркаваць справу.

— Няйначай.

— Я таксама думаю. Трэба нешта зрабіць гэткае сьмелае, гэткае рашучае, Дуб, каб увесь сьвет загаманіў пра нас, каб сказалі тыя пасьля, за каго ўсё гэта вядзецца: „Вось жылі людзі, якім шчасьце зьнядоленых было даражэй за сваё жыцьцё“. Эх, Дуб! Колькі шчасьця ў гэтым, як падумаць.

— Вось бачыш, а то заныў быў, чудзіла. Ладна, хадзем. Аднымі словамі нічога, брат, ня зробіш. Варушыцца трэба.

— Твая праўда... Ты нейкі жалезны ў нас, як той з ракі мочаны дуб.

— Эге, брат, ці толькі цяпер уведаў? Я ўжо даўно такі.

— Маладзец ты ў нас, Дуб.

— Дый ты не які-небудзь уломачак,—глянуўшы ў твар Ігнасю, які ўвесь гарэў захапленьнем, весела сказаў Дуб.— Дый усе мы адзін пад адзін. Гэта таму, Ігнась, што мы ня самыя апошнія з народу, што мы не пазадак абы-які.

— Слабыя ніколі ня робяць вялікіх спраў.

— Але... Хадзем, Ігнась.

*

ПА поўдні ў Слаўнае вярнулася Ларыса. Гэтыя два дні была яна ў Любы за госьцю, за нязвычайную госьцю. Усё, што мучыла абедзьвюх, што глыбокую ды шырокую прорву праклaдала паміж іх, выкрылася ў гэтыя дні. Шчырая гутарка паказала, што яны не няпрыяцелькі, зусім не, а дзьве таварышкі, якія намагаюцца ісьці разам па новай вялікай дарозе жыцьця. Як ні дзіўна, а Ігнась быў об'ектам іхнае гутаркі, як быў ён і прычынаю ранейшае аддаленасьці іх аднае ад аднэй. Вонкава дагэтуль не парывалі яны свайго колегаваньня, вонкава былі самымі найлепшымі таварышкамі. У душы-ж лёдам халадосьці паабмёрзьлі іхныя адносіны іхная таварыскасьць. І кожная адчувала гэта, і кожная добра ведала, што робіцца ў сэрцы і думках кожнае, і добра ведалі абое пра прычыны ўсяму таму, але вонкава не падавалі знаку, вонкава ашуквалі адна адну і самую сябе. Гэтымі днямі ўсё выкрылася. І ў тае, і ў тае вырвалася неспадзявана па слове, за ім па другім, па трэцім, сустрэліся, зьвіліся—і пайшла гутарка. Нязручнасьць пакінула абедзьвюх, прызналіся адна аднэй у сваіх старанна хаваных

дасюль думках. І расчыніўшы кожная сваё сэрца і паказаўшы ўсё, што хвалявала яго, не знайшлі больш у ім няпрыязнасьці паміж сябе, прызналася кожная што ніводная таму не вінавата. Раней кожная баялася ў думках, што надыйдзе гэты момант, цяжкая часіна, калі павінна ўсчацца такая гутарка—баяліся і ўнікалі яе. Цяпер-жа, калі пачалася і разгаварыліся, абое адчулі ў сябе павагу адна да аднэй—за шчырасьць, сьмеласьць і адкрытнасьць. Але да канца не дагаварыліся, ня вырашылі, дый сьмешна было-б вырашаць такое пытаньне, зразумелася, што час пакажа сваё:—або-або. Ні ўпічышчаў, ні нараканьняў ад тае ці ад тае на таварышку, нічога, што можа зноў загнала-б у сярэдзіну шчырасьць і таварыскасьць. Разышліся ня надта каб таварышкамі, але і не няпрыяцелькамі, а як двое поўных чалавечага гонару людзей.

Прышла дамоў Ларыса вясёлая і смутная, з сэрцам поўным каханьня. Цяпер, пасьля размовы з Любаю, яшчэ больш зразумелы, блізкі і дарагі зрабіўся ёй Ігнась, і таму сэрца забілася ў трывозе. Яна чула пра бойкі са стражнікамі і дагадвалася, што там не бяз удзелу Ігнасёвага было, што не без яго рук адбыліся небясьпечныя сутычкі. Трывожнае жаданьне вырывалася з сэрца, жаданьне пайсьці да яго, разам сустракаць небясьпеку, упоравень ісьці з ім праз буры-навальніцы жыцьця і, змагаючыся поплеч, адхіліць небясьпеку, каб самой выйсьці пераможцаю да шчасьця, да свайго асабістага шчасьця.

У Слаўным яе сустрэлі супярэчныя нечаканасьці. Толькі гэта яна ступіла ў двор, як убачыла літвіна Вітольда. Парабак стаяў пад стадолаю і падаваў ёй знак падыйсьці. Ня чуючы ног пад сабою (то магла быць толькі вестка ад яго!) падышла Ларыса. Літвін скланіўся ёй нізка, зьняўшы шапку і неўзаметку падаў пісульку...

— Што за асьцярожнасьць такая, Вітольд?

Ён скасіў вочы ўправа, а сам уголас сказаў:

— Дзякуй за ласку паненка, вельмі дзякую.

Паглядзеўшы направа, Ларыса ўбачыла стражніка, які павольна пахаджваў паўз сад у халадку ад густога, далёка на двор пазьвешванага гальля дрэў. І адказала:

— Няма за што, Вітольд...—ціха запыталася:—Сёньня?

— Сёньня... Нядаўна прынесьлі.

— Добра... Ідзі рабі сваю работу, Вітольд.

Зацяўшы моцна ў руцэ пісульку, Ларыса перайшла двор і бегма ўзьбегла на ганак, а адтуль па сходках на другі паверх. Была ўжо накіравалася ў свой пакой, калі дзьверы з другога пакою адчыніліся і вышаў бацька, пад руку вядучы спраўнічыху.

— А вось і Ларыса... Ты ня ведаеш, што ў нас госьці...

Ларыса прывіталася і сказала, каб абы сказаць што:

— Я і сама вось толькі з гасьцей.

— Спадзяемся, што вашы госьці, Ларыса Вадзімаўна, больш удалыя за нашы.

— Я гэтак замарылася...

Няслаўскі спужаўся за далейшую размову і, сказаўшы, што Ларыса даведаецца пасьля пра ўсё, запрапанаваў спраўнічысе павесьці паказаць свой сад. Ларыса вельмі рада была такой справе. Яна ступіла ўжо крок, намерваючыся адчыніць дзьверы ў сталовую і там нішкам прачытаць пісульку, калі, як на зло, адтуль пачуліся крокі і вышла маці, нясучы на талерцы спраўніку леташнія зімовыя яблыкі.

— Зьявілася, паважаная дачка... са свае рэволюцыйнае экскурсіі. Два дні загібаць... Два дні загібаць недзе аднэй, маладой дзяўчыне.

— Я ня ваша слуга, а, па-другое, роўнапраўная з вамі і, па-трэцяе—прашу не вязацца.

— Гэта рэволюцыянэры навучылі цябе так гаварыць: перш за ўсё, па-другое, па-трэцяе? Памешчыцкая дачка, дваранка, — пайшла да разбойцаў з вялікае дарогі, якія калечаць, б'юць нямаведама за што людзей.

— Цябе яшчэ ня білі.

— Хоч, каб мяне, жанчыну!..

— Шкада, што не... Хацела-б, прызнаюся...

— Нягодная!.. Можа і ты ўдзел бярэш у гэтым?

— У чым?

— Крымінальнікі!.. Спраўніка, галаву аховы парадку ва ўсім павеце, гэта-ж трэба даўмецца! Нягоднікі!

— Мне няма часу спрачацца бяз толку і я хачу адпачыць.

— Пасьля сваіх рэволюцыйных гадасьцяй. Адпачнеш... Адпачнеце хутка! Не забавіцца гэта...

Ларыса ня слухала больш. Пагардліва злажыўшы вусны ў іронічную ўсьмешку, яна зайшла ў сталовую, села ў мяккае крэсла і разгарнула пісульку.

„Дарагая, Ларыса Вадзімаўна!..“ пісаў Ігнась. „Я-б можа сам наведаўся, каб ня гэтая недарэчная стрэча з спраўнікам, які ехаў у Слаўнае з вашым бацькам...“

З цягам чытаньня Ларыса мянялася ў твары: з ярка пунсовага і радаснага на пачатку (але чаму-ж ён піша—Ларыса... Вадзімаўна), ён рабіўся халодным і рэзка выразным. Радасьць ад першых слоў змагалася з нованаплыўшым адценьнем, было яно перш здагадкаю, а потым жорсткасьцю ледзяною, неўпрашонаю.

„Дык вось што адбылося. Вось на што вы, паважаная маман, заўважвалі мне з вялікім абурэньнем. Я разумею

вашае адчуваньне“, падумала.—Цяпер разумею,—прашаптала яна і на хвіліну задумалася зноў, упусьціўшы пісульку сабе на калены.

Потым узяла, дачытала. Ігнась прасіў, каб яна разьведала пра поліцэйскія захады супроць дружыньнікаў і рэвалюцыйнага сялянства, а таксама пра становішча ў горадзе, калі можна, пра колькасьць вайсковае сілы і барждж эй паведаміла б яму праз Вітольда.

„Прывітаньне вам гарачае ад лясных людзей. Ваш Ігнась...“ канчалася такім лёгка-жартлівым прывітаньнем пісулька.

Колькі часу задуменная сядзела Ларыса. Можа яна думала пра тое, як-бы выканаць задачу, даную Ігнасём, а можа перад вачыма стаяла яго рашучая мужная постаць, такая романтычная і самабытная, што сілы няма адарвацца ад сузіраньня яе, прывабнае, прыгожае ў сваёй романтычнай загадкавасьці.

„Тымчасам нешта трэба-ж рабіць“, падумалася ёй... Вось... Вось што... Падлагодзіцца да спраўніка, калі толькі ў Слаўным ён, і ўведаць усё.

Яна ўстала і сышлася ўніз, каб запытацца ў пакаёўкі пра спраўніка. Стася любіла паненку за яе прастату з людзьмі, за яе нянавісьць да маткі і за спрэчкі вечна з тэю. Падабалася ёй Ларыса. Яна ўсё, да дробнае крышачкі расказала ўсё. У галаве ў Ларысы імгненна насьпела дзея. Сказаўшы колькі ласкавых слоў пакаёўцы, яна ўзьбегла наверх і пайшла ў спальню пераадзявацца ў чыстае адзеньне.

Дзень павольна канаў. Летняя гарачыня паціху ападала на шырокія палеткі, на шлях, на вузкія пылістыя дарогі. Набягаў прадвячорны мяккі халадок, астуджваў разгарачэлую зямлю. Неўзаметку падкрадаўся цёплы ціхі вечар. Лагодней і гастрэй пачынала пахнуць зеляніна, кветкі, балоты. Празрыстая цішыня станавілася па даўжэзных палявых прасьцягах, цішыня звонкая, чульлівая.

Толькі гэта ўвабралася Ларыса і яшчэ стаяла і, захопленая прадвячорным настроем глядзела бяздумнымі глыбокімі вачыма на двор, як звонкую цішыню ўстрывожылі варожыя гукі. Чулае вуха Ларысіна адразу ўхапіла іх і адрозьніла ад звычайных і бяскрыўдных гукаў прыроды: тупат поўна конскіх падкоў глуха лапацеў па дарозе, з кожнаю хвілінаю, з кожнаю сэкундаю набліжаючыся, бунтуючы роўную гладзіню ціхага падвячорку. Ня цямячы яшчэ, што-б гэта такое было, ня ў змозе разлучыцца з лагодным настроем, навеяным з надворку недалёкім вечарам, Ларыса тымчасам, бы падштурхнутая вялізнаю сілаю, выбегла з спальні ў сталовую, вокны адкуль былі на двор, глянула і холад не

па-летняму апавіў сэрца, і небясьпека гострымі іголкамі закалола раптам з усіх канцоў.

У Слаўнае прыехаў і, ня спыняючыся, на ходу сьпешыўся паўэскадрон драгуноў. Высокі белабрысы афіцэр падаў нейкую каманду, кінуў павады веставому, а сам накіраваўся ў пакоі. У пакоях узьбегаліся, заляскацелі дзьвярыма, затупацелі на калідоры...

## *АПОШНЯЯ БОЙКА*

СОНЦА на захадзе. Чырвонае, як кроў, велічнае, як прыгожая жанчына ў росквіце свае пекнаты. З-за крыху пацьмянелых воблакаў наўкол аго выплішчваюцца косыя промені. Чырвонымі палосамі сьцелюцца яны па дарозе, асьвятляюць хмызьняк па правым баку яе, змагаюцца бяз сілы з наплыўным змрокам. Але змаганьне дарэмнае, гэта змаганьне слабога, кволага з дужым. Ніз сонца закрыўся ўжо далёкім узгорачкам. Вось-вось... Яшчэ толькі невялічкая частачка агнёва-чырвоным сярпом завісла на вяршку бязьлітасна ўпартага ўзгорку. Глыбокія лагчыны, роў з дарогаю і нягусты альховы хмызьняк бяз змогі аддаліся пад уладу ліпучаму змроку. Вось-вось... Хутка невялічкі чырвоны сярпок зьнікне ў бяздоннай глыбіні за ўзгоркам і змрок урачыста сьвяткаваць будзе сваю перамогу. Вось-вось... Але сонца не паддаецца. З магутнаю сілаю разадраўшы вадкае клочча наплыўнага туману і, раней чым схавацца зусім за далёкім краявідам, здаволена пырснула яно снопам сваіх халодных чырвоных променяў на дарогу. На адну хвіліну. Але і таго было досыць, каб пераможна заліць густою крывёю далёкага цяпла ўсю дарогу ў хмызьняку, асьвятліць раскудлычаную, напалоханую страшнаю небясьпекаю жанчыну, што ўтомна спыніла бягу пасярод дарогі, і бліснуць на сіняватай сталі браўнінга ў руцэ ў жанчыны.

Сонца няма ўжо. Белыя туманы ўзяліся гусьцець на лагчынах. Хмызьняк апрануўся ў самотную цішыню ўсясільнага змроку.

Вечар. Змрок. Цішыня, туманы....

Нешта ўтулілася за хмызьнякамі ў лагчыне пад аховаю туману і змроку. Утулілася і быццам чакае...

Жанчына павярнула галаву і ўсёю сілаю волі і фізычнага напружаньня, на кароценькі мэнт спыніўшы частае дыханьне, ад якога грудзі ходарам хадзілі пад чыстаю тка-

нінаю прыгожага дарагога ўбраньня,—паслухала трывожна... Адразу ёй здалося, што пазадзе ляскацяць конскія падковы. Яна ўжо спалохана ступіла адзін крок і зірнула на браўнінг. Але паслухаўшы больш, не пачула нічога. Гэта сэрца ў грудзёх, як тыя конскія падковы, шалёна калацілася, гатовае вырвацца. вось-вось з няволі цела і пакаціцца па дарозе. Гэта здалося ёй стукатам конскіх падкоў... Яна ўпусьціла руку з браўнінгам. Аслабленая рука павісла бяз сілы, як пляцёнка канчука. Левая парыўчата прыціснулася да грудзей, быццам паменшыць хацела іхныя ўздымы, быццам уцішыць хацела хваравітую калатню сэрца.

Усё гэта адбылося на якой-небудзь аднэй толькі хвіліне. Заспакоіўшыся ўжо, здаецца, жанчына той-жа час затрывожылася зноў. Уся гэтая цішыня навакол, гэты мяккі ліпучы змрок, гэтыя цягуткія густыя туманы, што на воку, як бачыш, гусьцеюць ды гусьцеюць, прыплываючы з ракі, гэты насарожаны хмызьняк пры дарозе, а трохі далей—унураны задумлівы лес—усё раптам дало адчуць яшчэ мацней небясьпеку. І адчуўшы яе і зразумеўшы больш сэрцам, чым розумам, жанчына настойліва скалатнула галавою. Жмут валасоў раскруціўся і ўпаў на плечы. Жанчына не ўзяла на іх увагу. Яна ўся была пад уладаю чагосьці поўна большага, чагосьці поўна важнейшага за свой туалет, да якога, відаць, прызвычаілася моцна.

Жанчына прутка ірванулася і шыбка-шыбка пайшла дарогаю. Задуменна-загадкава лес плыў насустрач ёй, большаў у бакі і ўгары хаваў за сабою далёкі небасхіл. Пры самым лесе хмызьняк быў вышэйшы, гусьцейшы і паміж яго ўжо пракідаліся стромкія маладыя дрэўкі. Зблізку яшчэ адрозьніць можна куст ад куста, дрэва ад дрэва, а ў асяродку сваім лес зьліваўся з поцемкамі ў адну суцэльную цьмяную гушчу.

— Стой!..—з-за хмызьнякоў сьпераду загрымеў голас.

Жанчына ўся здрыганулася: тут небясьпекі яна зусім не чакала, небясьпека засталася пазадзе. Не, тут яе ня можа быць. Але тымчасам рука мацней сьціснула ручку браўнінга...

На дарогу вышаў селянін у сьвітцы і ў лапцях, падпяразаны вераўчынаю, у лёгкім летнім капялюшы на галаве. Ахапіўшы ўсяго вокам, жанчына, аднак, не загледзела ў руках у яго вінтоўкі і толькі, калі падышоў бліжэй, убачыла, што ён гатоў быў-бы стрэліць кожнае сэкунды, калі-б таго патрабавала справа. Але, не зважаючы на тое, увесь спалох у жанчыны мінуў і яна даверліва і спакойна стала. Голас ад сэрца падказаў, што тут ёй не пагражае нічым.

— Хто вы і чаго ідзяцё ў лес нанач?—строга, сухім голасам запытаў селянін.

Жанчына адказала запытаньнем на запытаньне:

— Скажыце вы ня дружыньнік, часам?

І, ня даўшы яму слова сказаць, праказала:

— Я з Слаўнага... Двор тут недалёка,—ведаеце? Нясу важную вестку Ігнасю з Аронам.

— А які знак вы маеце, што гэта праўда?

— Знак... Няма ў мяне ніякага знаку... Дзеля ратунку ўсяе дружыны ад сьмерці—прапусьціце мяне туды зараз-жа.

— Дайце від, што вы тая, якою сябе выдаеце.

— Ды непатрэбна ніякіх відаў... Слухайце!.. Слухайце!—убачыўшы непадатнасьць вартаўніка, шпарка праказала Ларыса.—У Слаўным драгуны... Праз паўгадзіны, а можа і раней яны будуць тут—і вы наробіце бяды. Ага... вось яшчэ. Па поўдні я мела пісульку ад Ігнася, ён падаў мне яе праз пасланца з дружыны.

Пры апошніх яе словах на дарогу вышаў другі вартаўнік. Тады першы, Ясь, закамандаваў другому:

— Кузьма... чым хутчэй вядзі паненку да Ігнася з Аронам. Чым хутчэй.

Апошнія словы яго патанулі ў пустэчы на дарозе. Ларыса са сваім правадніком шыбавалі ўжо на поўны крок у сярэдзіну лесу.

Пад вялізным старым дубам зграмадзілася кучка людзей, чалавек пад трыццаць. Пад другім, трохі паводдаль—меншая, чалавекі чатыры. Да іх і падвёў Ларысу Кузьма.

Як толькі падышла яна, з кучкі пачуўся голас зьдзіўленьня. Сьледам за тым усе чацьвёра ўсхапіліся з долу і акружылі Ларысу.

— Ларыса, хіба здарылася якое, што вы сама прышлі адна перад ноччу,—пытаўся трывожна, не ўсьведамляючы сабе небясьпекі, якая ўжо навісла над дружынаю, Ігнась.

— У Слаўным драгуны, цэлы паўэскадрон... Праз паўгадзіны яны будуць тут.

— Вось табе і на...—азваўся Дуб.

— Я чула, як начальнік раіўся са сваімі афіцэрамі... Яны парашылі завідна акружыць і перабраць увесь лес. Два разьезды пойдуць па бакох, а галоўны атрад дарогаю, па самай сярэдзіне лесу.

Кіяш заскігітаў, пачаў лашчыцца да Ларысы.

А Ігнась глядзеў на яе, глядзеў і мілаваўся, не зважаючы на блізкую ўжо небясьпеку, а мо' хто ведае, мо' і канцы. Яе геройскі, самаахвярны ўчынак захапляў яго, вобраз бунтарскае прыгожае Ларысы цёг да сябе, вабіў сваёю магутнаю прыгажосьцю.

— З сёл ужо папрыходзілі?—запытаўся Арон.

— Няма ніводнага яшчэ,—адказаў Дуб.

— А пасланец ад Любы зьвярнуўся?

— Зьвярнуўся, сядзіць там у кучы.

— Ні к ліху ня варта!..—зазлаваў раптам Арон, што рэдка калі было з ім,—зусім не арганізавалі збору, цяпер у нас самае большае трыццаць чалавек.

У яго ў галаве прамігцеўся плян, які ўпіраўся сваім выкананьнем, відаць, у колькасьць людзей дружыны.

— Гэта нічога,—заўважыў Дуб,—рэшта павінны прысьпець з хвіліны на хвіліну.

— І ня знойдуць нас тут. Але справа ня ў тым...

— А гэтая, на добрую палову сваю дапатопная зброя,—уступіў у гутарку Ігнась.

— Таварышы!—палка загаманіла Ларыса,—і гэтае слова, першае з яе вуснаў за ўвесь час яе знаёмства з соцыял-дэмократамі, урачыста прагучэла ў кучцы людзей,—у нас перавага хоць-бы тая, што мы ведаем добра ворага, а ён нас не...

Тымчасам дружыньнікі ўлавілі трывожны настрой сярод сваіх правадыроў і, адзін па адным падыходзячы, акружылі іх і моўчкі пачалі слухаць.

— Сьпяшайцеся,—гаварыла Ларыса,—бо хвілін праз пяць—дзесяць будзе ўжо позна.

Тады Арон узяў на сябе агульную ўвагу. Цішыня глухая запанавала ў лесе, усе дружыньнікі пазьбіраліся і глядзелі на Арона.

Ён сказаў:

— Перш чым надумацца, што рабіць, я мушу сказаць вам, таварышы, калі баіцца хто, ці можа каго кліча да сябе сям'я, дзеці, жонка... з нашае таварыскае згоды, той можа пакінуць зараз-жа лес і, пакуль ня позна, ісьці дахаты.

Аронавы словы нарабілі ў дружыне непарадку. Натоўп зашумеў, зарухаўся. Сям-там у каго вырвалася па слову:

— Не!

— Усё адно загінуць!

Але два дружыньнікі праціснуліся к Арону. Таварышы іх прапусьцілі наперад. Адзін сказаў:

— Вось у яго трое малых, як боб, дзяцей. Сам удавец. Пры дзецях і гаспадарцы адзін стары бацька.

Другі сказаў яму:

— А ў цябе жонка сухотная перад сьмерцю, ды пяцёра дзяцей... а малы брат яшчэ змогі ня мае кіраваць гаспадаркаю.

— Таварышы,—сказаў Арон,—дазволім ім пакінуць дружыну і ісьці даглядаць сваіх дзяцей. Бо дзеці—гэта нашая будучыня.

Агульная маўчанка была згодаю на Аронавы словы. Тут-жа зараз дружыньнікі паздымалі з сябе ўзброеньне, аддалі яго тым, у каго не ставала, і разьвіталіся з дружынаю.

Потым Арон каротка расказаў свой плян. Дружыну раз-

лучыць на тры атрады: адзін—самы меншы—з Ігнасём на чале, выйдзе на край лесу, паўз балота, і возьме на сябе ўсю ўвагу драгуноў, другі—трохі большы—пад камандаю ў Дуба, пазабірае сабе вартаўнікоў і, адышоўшы загоны на чатыры правей Ігнася—будзе чакаць сыгналу. Трэці атрад—Аронаў, самы большы—адыйдзе так, каб астацца ў тылу ў драгуноў. І вось тады, калі драгуны сашчэпяцца з Ігнасёвым атрадам, Арон нападзе на іх з тылу, а Дуб ударыць з боку. Такім чынам драгуны пападалі ў пастку, у якой мусілі ці загінуць, ці перабіць усе атрады па адным, калі толькі дагадаюцца гэта зрабіць. Ігнасёў атрад павінен быў адцягнуць іх на балота, разьбегчыся па адным і даць сыгнал дзейнічаць двум другім атрадам. Драгуны, прыпёртыя к рацэ з трох бакоў трыма атрадамі дружыньнікаў, ад імгненнага націску прымушаны будуць даць перабіць сябе, а часткаю паразьбегчыся ці пакласьці перад пераможцамі зброю.

— Калі толькі ўдасца ды калі мы перасілім ворага, ягонаю зброяю мы ўзброім атрад... атрад, проці якога нічога ня значыцьме пудлівая паліцыя. Мы возьмем горад, мы ўстановім свае парадкі.—Але пахапіўшыся, што далёка заляцеў у сваіх марах перад такім сур'ёзным момантам, на ваччу ў цьвярозых людзей, Арон запытаўся ў Ігнася:

— Твой сыгнал які будзе?

— Два рэзкіх сьвісткі, вось гэтакія...

Ён сьвіснуў два разы так прарэзьліва, што птушкі, пахаваўшыся нанач у гальлі дуба, спалохана запырхалі крыламі і з сонным пудлівым крыкам паляцелі далёка ад страшнага месца.

— А вы, Ларыса, куды?

— Я пайду з першым атрадам.

Сэрца ў Ігнася падплыло гарачаю хваляю, але ён зараз-жа ўладаў сабою і сказаў.

— Я ня раю вам. Ідзеце лепш з Аронам, а там кругом абыйдзеце і вернецеся ў Слаўнае.

Холадам ад яго слоў падыхнула на дзяўчыну, якога яна ніколі не заўважвала ў Ігнася. Ларыса пакорліва, але ўпарта адказала.

— Вы памыляецеся, мне дарога толькі з першым атрадам. Для Слаўнага—я палітычная і крымінальная злачыньніца. Ці там, ці там, мяне чакае сьмерць або зьдзекі. Дык лепш я прыму іх тут.

Усе замоўклі. Нешта недаказанае было ў Ларысіных словах, нешта такое важнае, што бяз слоў прымусіла моўчкі згадзіцца правадыроў дружыны, а Ігнасёва сэрца закалацілася ў супярэчных адчуваньнях.

Перад лесам раптам грымнуў стрэл. Звонкі пошчак прайшоў па лесе, на стрэл адказаў цэлы залп... Здрыганулася ў кожнага сэрца. Здрыганулася і напружана сьціхла.

— Чатыры чалавекі з Ігнасём!.. Сем да Дуба!.. А рэшта— за мною! Хутчэй...—закамандаваў Арон.

Тры атрады дружыньнікаў разьбегліся ў розныя бакі. На Ларысу ніхто не глядзеў, ніхто не заўважыў, і яна ціха пайшла ззаду ў Ігнасёвага атраду.

Пад нагамі шамацеў мох ды леташні сухі ліст. Патрэсквала ламачча.

Ігнась нічога не казаў на гэта таварышом: яны былі атрадам сьмертнікаў, якому засьцерагацца зусім непатрэбна і сьмешна, то было-б гульнёю ў хаванкі на роўным галее і нічым большым. І ўсе маўчалі. Толькі цьвёрдыя загрубелыя рукі сьціскалі сударгава зброю. Вось-вось... Чакаў кожны. І хвіліны хваравітага чаканьня непамерна расьцягваліся і здаваліся кожнаму часінамі. Вось-вось...

Вышлі на край. Адразу павіднела.

З-за лесу выплываў маладзічок-месяц. Ігнась перш зьдзівіўся, яму здавалася чамусьці, што тут будзе яшчэ цямней, чым у лесе, такія-бо недарэчныя гэтыя думкі. Зірнуў наабапал, нібы каб дагадацца, чаму-ж так.

Белы туман быў там трохі радзейшы, і сьвятло месячыка працінала яго і патроху разганяла вільготную ліпучую цемру.

Вось-вось... Іскрачкамі яснымі прабягалі ў кожнага дрыготкія думкі. Вось-вось...

— Стой! Ні з месца!

Крокаў за дваццаць наперадзе як з зямлі вырасьлі раптам і перагарадзілі дружыньнікам дарогу тры драгуны. Вінтоўкі, як па камандзе „рыхтуйся да бою", тонкімі крыважэрнымі рулямі на ўзроўні грудзей. Белае Ларысінае адзеньне першае кінулася ім у вочы.

— Стой,—ціха сказаў дружыньнікам Ігнась, яму прышла да галавы добрая думка,—ні слова. І, зьвяртаючыся да драгуноў, узяў сябе ў рукі ды спакойным маленным голасам праказаў:—Што вы маеце да нас, людзі добрыя. Мы да самага цямна працавалі ў пана. Дахаты ідзем.

— Ага, гаворыце з работы ідзіцё ад пана... Ну-ну, паглядзім,—адказам былі Ігнасю словы аднаго драгуна, відаць, старэйшага, і той-жа час ён узяў да нагі вінтоўку і накіраваўся да дружыньнікаў.

Вось ён ужо пасярэдзіне паміж сваімі і дружыньнікамі. Ігнась раптам працягнуў уперад руку з маўзэрам. . Сьмерць паляцела насустрач ворагу...

Ларыса апынулася поруч Ігнася.

— Бягом за мною!—крыкнуў ён і адбег крокаў на дваццаць у балота, накрыўшы адлегласьць паміж сабою і ворагам пруткасьцю ног і белавата-брудным туманом. Дзьве кулі прасьвісталі паўз вуха і ляснулі недалёка ззаду ў хлюпкае балота.

— Два са стрэльбамі,—ціха закамандаваў Ігнась,—стрэльце вунь туды.

Два дружыньнікі з дубальтоўкамі паглядзелі зорка, куды паказваў Ігнась пальцам і, нацэліўшыся добра. стрэлілі адзін за адным. Дзесьці ў тумане закрычалі і зараўлі па-зьвярынаму ад болю. Адна фігура зацямцелася наперадзе і зьнікла.

— За мною,—зноў ціха сказаў Ігнась,—а то яны будуць страляць туды, дзе бачаць агонь ад нашых стрэльбаў.

Але перабягаць ад месца да месца ні ўзад, ні ўперад ня цікава было дружыньнікам і ня спрыяла якраз агульнаму пляну бойкі, бо відавочна наперадзе былі толькі тры драгуны. Баючыся, каб галоўныя сілы ворага пайшлі ня туды, куды трэба дружыньнікам, Ігнась падаўся цішком уперад.

Наўкола ні гуку. Параненых ці забітых драгуноў пазабіралі, мусіць, і цяпер недзе рыхтуюцца вылезьці зноў.

Але што гэта?.. Здаецца, хмызьнякоў такіх ня было наперадзе... ці можа, перабягаючы ад месца да месца, ён са сваім атрадам абмінуў ворага і цяпер трапіў на край пад дарогу, такім парадкам апынуўся пазадзе? Калі так, дык увесь плян пайшоў на ўзьвей-вецер, і драгуны могуць захапіць неспадзявана два другіх атрады дружыньнікаў. Але чаму гэта кусты быццам заварушыліся, і з кожнага пачало рабіцца па два, па тры?.. Можа ад напружанага ўзіраньня ў дружыньнікаў і ў Ігнася мігціцца гэтак перад вачыма, ці можа балотны туман гайдае гэтак прадметы.

Ігнась устаў, і крык спалоху захрас у горле... Балотныя хмызьнякі крокаў на трыццаць з аднаго і з другога боку сыходзіліся абодвума канцамі ў шчыльнае кола.

„Кончана... Загінулі... Дружыны, як быць ня было“, прамігцела назольна, няпрошана. „Але ворагі іх яшчэ ня зусім абышлі, ды мабыць ня бачаць нават... Прарвацца... Кінуцца ў прарыў... Страляць яны ня будуць, каб не падстрэліць самі сваіх... Яшчэ ня позна“...

Як тыя маланкі-бліскавіцы асьвятлілі і прабеглі хутка паўз Ігнася здагадкі-меркаваньні. Ен зрабіў атраду знак рукою, махнуў на сябе і, прыгінаючыся долу, цішком рушыў у адтуліну, якое яшчэ чамусьці не запоўнілі ворагі. Восьвось... Надзея-звадыяшка спакусвала Ігнася. Вось-вось... відаць, тут галоўны драгунскі атрад, і яны пасьпеюць выканаць сваю справу і зацягнуць ворага к рацэ. Разрыў паміж двума канцамі жывых кустоў крокаў на дваццаць. Каб хоць

туман пагусьцеў... Каб хоць месяц на адну-аднюсенькую хвілінку схаваўся за хмарку, тады яны—шчасьлівыя людзі. А можа і так удасца. Можа вораг ня ўбачыць, калі нічым ня выказаць сябе. Вось-вось...

Няжывую сьціш раптам разадралі напаўпрыглушаныя адлегласьцю і туманом стрэлы. Адзін... два... тры... залпы... Зноў адзінотныя... Зноў залп... Ня зьлічыць. А да прарыву засталося крокаў пяць.

Заныла ад вялікага болю і гора Ігнасёва сэрца. Ня маючы сілы сустрываць, крыкнуў ён раптам:

— За мною!.. Дуб у бядзе!..

І ўскочыў. І пабег. Пяцёра за ім сьледам. Ці добра пападзяваліся на сваю спрытнасьць і пруткія лёгкія ногі? Ці не абмыліліся?

Як вялізныя мячыкі ці як цацкі на спружыновых нагах, паўскакалі ворагі, кінуліся на прарыў... Закруцілася ўсё, замітусілася... Ці ня туман з месяцам гэтак вельмі спадманваюць зрок.

Вырваліся дружыньнікі з кола, ды толькі запозна. Ворагі пазадзе, ворагі бачаць іх, бягуць за імі, чутно нават, як сапуць цяжка.

Ігнась на-бягу павярнуўся, стрэліў раз, другі, трэці... Яго таварышы разрадзілі дубальтоўкі, якія былі цяпер прыдатны хіба толькі як халодная зброя. Ларыса дастрэльвала апошнія патроны... Яна ня ведала, ня цяміла, колькі іх яшчэ засталося ў абойме. А ворагі не аставаліся. Забітых абміналі, ці перабягалі і ўсё тупацелі пазадзе, не зьмяншаючыся, ня ўціхаючы, новыя і новыя.

І невядома, што-б сталася з гэтае пагоні, каб з лесу, зусім недалёка, не заляскацелі новыя стрэлы... Са стрэламі памяшаліся крыкі, стогны, словы каманды.

— Агонь!—зароў пазадзе зьвярыны голас. Ад шпаркае бягі ў галаве ў Ігнася грукацела, званіла, шумела. Ён ня цяміў ужо больш нічога ані. Было толькі адно жаданьне, жаданьне ўпалёванага зьвера—уцячы.

Словы каманды „Агонь!" не засталіся толькі словамі. Некалькі стрэлаў трохі ня ў плечы ўцекачом павалілі двух чалавек.

„Канцы. Цяпер ужо канцы".

Ігнась прыпыніўся. Ларыса, як белая здань, з ім побач. Два рэвальвэрныя стрэлы ў адказ бязьлітасным, крыважадным ворагам... І адтуль адзін, толькі адзін... і белая стромкая здань падае да Ігнасёвых ног, як пераломленае зьнячэўку малым свавольнікам маладзенькае і поўнае жыцьця

і надзей дрэўца-саджанец. Моўчкі, ярасна стрэліў Ігнась, апошні раз. Нскалькі злучаных у адно громаў аглушылі яго і вялікая гарачыня разьлілася па ўсім целе?..

— Няхай жыве!..—крыкнуў ён моцна і ціха, ціха, ня маючы сілы, немаль шэптам даказаў:—рэволюцыя.

І пахіснуўся, упаў каля Ларысы. Адна рука як·бы знарок лягла ля яе рукі. Злучыліся. Жыцьцё разлучала, а сьмерць злучыла. У сьмерці літасьці больш, чым у жыцьця.

Шасьцёра мужных, лятуценных, як дзеці, але гордых і сумленных, свае апошнія думкі аддалі балоту. Шасьцёра... А ці толькі шасьцёра?..

Туман, як сказаў яму хто, пагусьцеў, пачарнеў. Жалобна заплакаў наўзрыды ў хмызьняку пры дарозе драч. Ясны месяц схаваўся за хмарку, спахмурнеў тварам. Увабралася ў цёмныя хварбы жалобы зямля.

# ЭПІЛЁГ

## ПРАЗ ДВА ГАДЫ

У РАНІЦЫ хмарылася неба. Дробныя і частыя кроплі дажджу падалі ціха на зялёную летнюю зямлю. Марудна адна за аднэю за акном паўзьлі шэра-валяваныя хмары. Зялёнага гальля дрэў не шаваліў вецер. У прыродзе ціха і сонна і гэтак нудна-нудна, а на думках зусім абыякава. Сэрцу чамусьці робіцца балюча-горна, гледзячы на нудную не па-летняму восеньскую прыроду. Міжволі да настрою прылучаюцца мінулыя нягоды, бязрадасьць і гора. Хочацца ні аб чым ня думаць. Хочацца сядзець пры акне, глядзець бяз сэнсу на хмарнае неба, на чыстыя, як праз сіта працэджаныя, кроплі дажджу. Цягне глядзець і нічога ня бачыць, слухаць і нічога ня чуць. І гэтак да болю ня хочацца быць самім сабою. Прамігаюцца цьмяныя мары аб нечым нячувана прыгожым, тады імкнуцца жаданьні ў далёкую сонечную вышыню, вытканую на хвілёвых кроснах з фантастычных думак. Але ўжо праз хвіліну тухнуць яркія іскрачкі імклівасьці. Быцьцё і небыт фантасмагорычна пераплятаюцца ў нудным настроі. Ці то хочацца будзеншчыны гэтае шэрае, ці то хочацца ляцець куды лёгкаю птушкаю за сьвет. Сэрцу жадаецца чагосьці сьветлага, сэрца вабіць невядомае нешта, што—не пазнаць. Хочацца быць і ня быць у брудна шэрай будзеншчыне, забыцца хочацца на самога сябе. Быць ці не... Жыцьцё або сьмерць... Прыкрая цягуткая нуда наўкола.

Туга і сум...

Перад нядзелькаю да Любы ў Хорашава пазьбіраліся яе былыя таварышкі па гімназіі. Прышла Алеська, прышла Вера Сасноўская. Алеська ўжо блізка году служыць за настаўніцу дзецям у нейкіх зьбяднелых паноў. А Вера, тая з горам ды бядою напал уладзілася на пасаду канцылярысткі-перапісчыцы ў гарадзкую ўправу. Цяжка было дайсьці чаго, перш чым узялі на яе якую-кольчевы ўвагу. Прычынаю таму быў арышт яе за рэволюцыйныя лістоўкі, за што яна і адсядзела месяцы са тры ў астрозе. Дзякуючы

стараннасьці бацькі-фэльчара, які лічыўся за добрага практыка ў горадзе і за політычна-надзейнага чалавека, дачку вызвалілі. Пасьля распачаліся шырока арышты, пагромы... Рэволюцыйныя настроі пачалі ападаць. І Вера адышлася і стала зусім у баку ад рэволюцыянэраў, ад социялістычнае пропаганды.

Былым добрым таварышкам, сабраўшымся праз колькі год у месца, ня было пра што гаманіць у гэтую нудную сьвятковую раніцу. Успамінаць мінулае—такая няўдзячная рэч, думаць пра будучае—такая чорная безнадзейнасьць уперадзе. Навошта марыць, калі пасьля яшчэ горш адчуваецца бязрадасьць жыцьця, навошта ашукваць саміх сябе, і спакушаць дарэмнымі надзеямі.

Гэтак прасядзелі, яны цэлую раніцу, не магучы гамонкі ўсчаць ня ў мозе зрабіць нешта такое, пасьля чаго ўжо не засталося-б нявыказаным нічога, што мучыць кожную, у чым зьліліся-б дзявоцкія душы з сэрцамі, і штосьці зрабілася-б гэткім зразумелым. Адале Алеська засьпявала сумную-сумную песьню, можа, каб выліць у ёй пачуцьці ўсіх траіх, пачуцьці, якія цяжкім камнем пазьлягаліся на дне сэрца і выціскаюць з яго бяспрычынныя горныя сьлёзы. Вера сядзела ля стала, перагортвала марудна і бяз сэнсу кніжку поэзіі. А Люба ўтулілася ў акно. Сьлёзы, гатовыя прарвацца вось-вось, сьціскалі нявыказным болем сэрца. Па чымсьці вялізным і дарагім утрачаным былі-б тыя сьлёзы, па нечым, чаго ніколі не вярнуць назад, што было і засталося ў далёкім мінулым, схаваным ад зірку цьмянымі туманамі гора, нуды, тугі і журботы. Так патрэбна была-б цяпер моцная сяброўская рука, каб на яе абапёрціся, чуючы ў ёй сілу вялікую, моц і энэргію і, абапёршыся, выйсьці з гэтае чарноты на роўны гладкі шлях, асьветлены ясным сонцам, і ісьці, і ісьці па ім, ня спыняючыся, пакуль сілы ня скажуць „годзі". Вось тады-б адпачыць—у моры сонца, ціхіх пяшчотаў і любага каханьня.

Неўзабаве загрукалі ў сенцах. Ніводная з дзяўчат не патурбавалася слова сказаць, запытацца—хто ідзе. Як сонныя сядзяць, як загіпнотызаваныя нябачным гіпнотызёрам. Толькі, калі прачыніліся дзьверы ў школу і ўпусьцілі двух чалавек, адурбаліся трохі. Алеська першая павяла вокам і гукнула ціха Любу.

Прышлі два суседнія настаўнікі, знаёмыя з Любаю. Надоечы неяк бачыліся з ёю і набіліся пагуляць прыйсьці калі. Напрасіліся—і прышлі. Адзін прынёс скрыпку ў футарале. Ад яго несла яшчэ пахам сэмінарскае парты і вучнёўскае маладосьці. Другі быў ужо з жыцьцёваю практы-

каю і настаўніцкім стажам. Не ўважаючы на розьніцу ва ўзросьце, яны вельмі хутка сколегавалі.

Прывітаўшыся і пазнаёміўшыся з Алеськаю і Вераю, настаўнікі паселі і пачалі гаманіць пра тое, пра сёе. Дзяўчаты імкнуліся падтрымаць гутарку. Але што калі за кожнае слова цягнуць іх за язык трэба, гаварылі—от абы ня думалі госьці, што з імі размаўляць ня хочуць.

Першая пахапілася Вера, сказала:

— Як нудна... Ці не ад надвор'я гэта?

Старэйшы настаўнік заўважыў:

— Што надвор'е... Надвор'е ні прычым тут. Жыцьцё... жыцьцё, ведаеце, такое, каб яно запуставала нечага.

— А гэта вы праўду гаворыце,—сказала Алеська.—Ад жыцьця гэта ўсё.

— Дзе бачылі... Дзе вы бачылі! Жыцьцё зашло ў нейкі глухі тупік бяз выхаду, упёрла ў сьцяну і топчацца на месцы.

Люба раптам устрыпянулася, паглядзела неяк дзіўна настаўніку ў вочы і ні слова не сказала.

— Жыцьцё ідзе ня ўперад, а назад,—сказала Вера Сасноўская.

— Памыляецеся на трохі... Яно стаіць на месцы, а то і не стаіць нават, а круціцца, як вада ў віры. І вось варта толькі чалавеку ўпасьці туды, як закруціць яно заклятае сваю здабычу і пацягне на самае дно.

— Пра якія вы сумныя рэчы гаворыце,—спалохана праказала Алеська.

— Што проста страх апаноўвае,—азвалася Вера.—Лепш вось паслухайце, я пачытаю вам поэзіі.

— Прачытай, Вера,—смутна сказала, завярнуўшыся ад акна, Люба.

— Прачытайце, прачытайце,—папрасіў маладзейшы настаўнік.

Вера ўзяла кніжку, якую паклала была, толькі ўсчалася гутарка, адгарнула колькі старонак і ўзялася чытаць:

Жизнь утомила меня,
Смерть, наклонись надо мной.
В небе—предчувствие дня,
Сумрак бледнеет ночной...
Смерть, убаюкай меня.

Ранней душистой весной,
В утренней девственной мгле
Дуб залепечет с сосной,
Грустно поникнет к земле
Ласковый ландыш лесной.

Вестник бессмертного дня,
Где то зашепчет родник,
Где то проснется, звеня...
В этот таинственный миг.
Смерть, убаюкай меня.

Старэйшы настаўнік уздыхнуў цяжка. Алеська камячыла махры чорнага шаўковага шалю, канцы якога паспадвалі з плячэй на калены.

Сьлёзы-сьлязінкі, чыстыя, празрыстыя, у Веры на вочы выступілі. Адна Люба сядзела ціхая, маўклівая. Але ў маўклівасьці тэй хавалася вялікае гора. Можа і разумеў яе кожны прысутны, можа ведалі і аб прычыне, бо самі закрануты былі ёю, бо ў кожнага на сэрцы ляжаў цяжэразны камень тугі і суму, бязьмернае нуды і прыкрага адчуваньня жыцьця. Жыцьцё або сьмерць...

— Пайграць хіба,—азваўся маладзейшы настаўнік, бяз скрыпкі ён ня мог кроку ступіць.

— Пайграйце!.. Сапраўды пайграйце,—ажывела раптам Люба, папрасіла музыку.

Настаўнік настроіў скрыпку і правёў смычком па струнах. Раз... Другі... Журботныя гукі выплылі з грудзей скрыпкі ды мякка прарэзалі цішыню пакою—і ціхім надломам адгукнуліся ім сэрцы. Хвілін дзесяць граў ён, а мо' цэлы век, мо' тысячагодзьдзе. Цьмяныя фарбы, туга і роспач, боль параненага сэрца ў безнадзейнасьці, мары аб нечым такім сьветлым, незямным. Чорныя крылы вялізнае чорнае птушкі распастрыліся ў пакоі над імі. Дзьве галавы ў яе. Двое ясных воч-вугалёў. Але вось птушка зьніжаецца... Каршакаватыя гострыя дзюбы птушыныя моцна ўклююцца ў халоднае сэрца. Драпежныя кіпцюры разьдзіраюць на кавалкі... Халодная чорная кроў загуслымі кавалкамі падае з сэрца далоў.

Нехта застагнаў. Ці мо' то прадсьмяротныя ўсхліпы сэрца?.. У некага вочы заплюшчыліся—і душа лунае ў чорнай глыбіні. Нехта сударгава хапаецца скурчанымі пальцамі за паветра. Нехта бяз сілы закінуў назад галаву, чакае самаахвярна канцоў...

— Будзе!.. Будзе!..—хрыплы крык вырваўся з набалелых грудзей у кагосьці.

Ціхім плачам, жаласьлівым, балючым, заўздрыдвала скрыпка, адале зарумзіла, як малое дзіцё—і сьціхла.

— Замучыў,—азваўся старэйшы настаўнік.—Доўга граў. А як вам падабаецца?—зьвярнуўся да дзяўчат.

— Пякельная музыка,—ціха сказала Алеська.

Люба сядзела маўклівая, бязгучная. Жалобныя цені гулялі на схуднелым твары ў даганяшкі... Сіла ўся, здаецца, разам

з духам вылецелі з яе, пакінуўшы сядзець тут бяз крывінкі ў твары адно крохкае цела, адну слабую абалонь.

— Ён граў нам увэртуру, што сам напісаў... Музыка яму—усё,—казаў тымчасам старэйшы настаўнік. І паказаў пальцам на сябра, дадаў:—не чапайце яго. Ён вечна вось гэтак... Доўга сядзіць, пакуль вернецца да жыцьця. Не перашкаджайце яму.

Але ніхто і ня думаў чапаць музыку. Усе, як і ён, сядзелі пад уладаю настрою, навеянага чароўнаю скрыпкаю. Адзін стары настаўнік гаварыў, зьвяртаючыся невядома да каго, і голас яго гучэў голасам зблуджанага з сьцежак жыцьця.

Алеська, сказаўшы першае слова, замоўкла зноў.

Потым разам ачнуліся ўсе, сам музыка першы.

— Што гэта вы гралі?—запыталася Вера, падымаючы кніжку поэзіі, якая ўпала была далоў у часе гэтага жудаснага граньня.

– Ня ведаю, як назваць. Я назвы яшчэ не надумаў. Фантазію, фантазію замучанага сэрца.

— Горш за ўсякае пекла,—азвалася Алеся.

— Слухайце, вы акомпанаваць можаце?—пыталася Вера ў настаўніка.

— Магу, а што вы хочаце? Прасьпяваеце можа?

— Не, я прачытаю адзін верш...

— Падыграць вам, значыць? Добра магу. Чытайце...

Вера знайшла верш і пачала чытаць, а музыка—падыгрываць ёй на скрыпцы. Але і тое, і тое было само па сабе, і адно дапаўнялася адным. Вера з моцным пачуцьцём чытала:

Осень. Мертвый простор. Углубленные грустные дали.
Завершительный ропот шуршащих листвою ветров.
Для чего не со мной ты, о, друг мой, в ночах, в их печали?
Сколько звезд в них сияет, в предчувствии зимних снегов!
Я сижу у окна. Чуть дрожат беспокойные ставни.
И в трубе, без конца, без конца, звуки чьей-то мольбы.
На лице у меня поцелуй—о, вчерашний, недавний!
По лесам и полям протянулась дорога Судьбы.
Далеко. далеко, по давнишней прибитой дороге,
Заливаясь, поет колокольчик. и тройка бежит.
Старый дом опустел. Кто-то бледный стоит на пороге.
Этот плачущий—кто он? Ах, лист пожелтелый шуршит.
Этот лист. этот лист... Он сорвался, летит, упадает...
Бьются ветки в окно. Снова ночь. Снова день. Снова ночь.
Не могу я терпеть. Кто же там так безумно рыдает?
Замолчи. О молю! Не могу, не могу я помочь.
Это ты говоришь. Сам с собой—и себя отвергая.
Колокольчик, вернись, с привиденьями страшно мне быть.
О, глубокая ночь! О, холодная осень! Немая.
Непостижность Судьбы:—расставаться, страдать и любить.

Люба ня вытрымала, ускочыла з лаўкі і, заплакаўшы, выбегла з пакою.

Праз нейкую часіну вярнулася. Ад сьлёз не засталося і сьледу. Сказала,—быццам-бы нічога і ня было з ёю:

— Глядзіце, распагоджваецца зусім. Ветрык зараз паразганяе ўсе хмары... Бачыце, і сонца засьвяціла.

— На праходку хадзем,—запрапанавала Алеська.

— Хадзем. Толькі куды пойдзем, тут няма вельмі куды?—згадзіўся старэйшы настаўнік.

— Хадзем пад Слаўнае... На шляху гэтак добра. зьвернем у Слаўнаўскі лес...—папрасіла Люба.

Усе згадзіліся. Люба адчыніла школьную шафу з кніжкамі, і ўзяла пажоўклы ад доўгага часу тоненькі сшытачак; акінулася тараноўкаю і сказала да маладзейшага настаўніка:

— Пакіньце тут скрыпку.

— Ого, не. Я з скрыпкаю ні за што не разлучуся.

— То хадзем.

Перад ганкам іх сустрэў, накульгваючы на пярэднюю нагу, Кіяш. Сабака пастарэў і, мусіць, ад старасьці сьлязілі ў яго вочы, заплывалі жаўтаватым гноем.

— Кіяш!.. Кіяш!.. Добры, разумны, стары Кіяш,—палашчыла яго Люба.—Хадзем з намі. Ну, хадзем-жа, хадзем

## *НЕЗНАЁМЫ*

Таго-ж самага дня поездам прыехаў у горад незнаёмы чарнявы чалавек. Яшчэ ў вагоне седзячы, на працягу ўсяе дарогі незнаёмы ўхіляўся ад усялякіх гутарак, якія, відаць, былі залішне назольнымі. Ды ў поезьдзе гэта ўжо як-бы па нейкаму завядзенству, як загадам устаноўленаму на чыгунцы: загоніць лёс двух людзей з розных канцоў сьвету ў адно купэ, ну і хоч—ня хоч, а мусіш гаманіць, каб не адурнець з нуды, слухаючы роўнае, аднастайнае ляскаценьне калёс пад вагонам. Гэта ўжо так усюды. Незнаёмы-ж чарнявы ў капялюшы, часам рэзка, а часам сьцярожка ўхіляўся ад гутарак, з якімі спрабавалі гаваркія пасажыры навязацца яму. Праз усю дарогу пазіраў ён у акно на бедны і хмураваты ляндшафт беларускага краю, засланы ў далячыні дажджавою густою імгою. А калі адрываўся ад вакна, дык спаважна думаў, ці то мо' ўважліва пазіраў у якую кропку на сьцяне вагона. І гутаркі ня цікавілі, ня цікавіла іназіраньне ў акно.

Толькі пры самым горадзе захваляваўся незнаёмы. Поезд праходзіў якраз паўз бярозавую дуброўку. Незнаёмы пры-

ліп да акна, не адарваць-бы здаецца. Нібы ўспаміны з дал
кага мінулага нагадалі яму тутэйшыя мясьціны, ці нібы
нарадзіўся і ўзгадаваўся тут, і цяпер цьмяныя ўспаміны
маладосьці нагналі балючыя адчуваньні смутнае радасьі
А мо' гора вялікае бачыў тут незнаёмы,—чаму-б та
балюча гэтак мяняцца ў твары яму і адарвацца не магч
ад акна. Зрокам невядомасьці схаваны ад староньніх бы
ў незнаёмага думкі і пачуцьці. Што думаў і што адчува
вядома было толькі яму аднаму.

Як спыніўся поезд, ён узяў свой невялічкі чамада
з якімі людзі езьдзяць па чыгунцы, звычайна, цясьней н
сунуў на лоб капялюш і, не сьпяшаючыся, разам з рэшта
пасажыраў вышаў на пэрон. На дварэ ледзь-ледзь цярус
драбнюткі дождж-імга, чаго, відаць, ня любіў незнаёмы, б
пазашпільваў на гузікі паліто і нават наставіў каўнер. Н
прыпыняючыся нідзе і не заходзячы на вокзал, вышаў ё
пад рамізьніцкую стойку, не таргуючыся, сунуў бліжэйшам
да сябе рамізьніку саквояжык, лёгка ўскочыў на падножку
закомандаваў везьці ў горад.

— На якую вам, пане, вуліцу?—запытаўся з пашана
рамізьнік.

— А я, вось, і сам ня ведаю на якую,—сам да сяб
ціха сказаў ён і дадаў мацней—рамізьніку ўжо:—Вязі та
да якое гасьцініцы. Да самае першае, што трапіцца.

— Добра, пане.

Недалёка за астрогам рамізьнік узяў ад свайго ездак
шчодрую плату і высадзіў яго пры ганку мэбляваны
пакояў. Незнаёмы наняў на дзень пакой, што адным акно
глядзеў у двор, зачыніўся і пачаў распранацца, каб з дарог
памыцца ды пачысьціцца трохі.

Распрануўшыся, ён зусім не паказваў на ганаровага
і шчодрага пана, якім здаўся бедняку-рамізьніку. Шчуплы
нават трохі хударлявы, ён выглядаў яшчэ худзейшым, н
галіўшы доўгі час чорнае, як шчотка, барады. Лоб наўска
сяк перарэзваўся доўгім чырвоным рубцом. Ці не нацягваў
незнаёмы капялюша так, каб ня відаць было таго рубца
Чорныя вочы, глыбокія, спачувальныя, з-пад густых бро
ваў пазіралі трохі маркотліва, а трохі радасна; позірк і
быў сьмелы і рашучы. Адным словам, распрануўшыс
ў пакоі, ён вельмі мала падобны астаўся да таго пана
які адгарадзіўся высознаю сьцяною маўчанкі ад падарож
нікаў у вагоне, і які гэтак шчодра заплаціў рамізьніку
Тут ён неяк папрасьцеў, больш зрабіўся самім сабою.

Незнаёмы ўжо памыўся і апрануўся зноў, калі па калідоры
прайшлі цяжкія крокі і спыніліся якраз насупроць яго нума
ру. Потым рэзка і ўладна, здалося яму, пастукалі ў дзьверы

Незнаёмы здрыгануўся, чырвоны рубец на ілбу яшчэ ярчэй вызначыўся. Не спалох, не, а бліжэй, што адчуваньне неспадзеўку зьявілася ў чорных вачох, якія бліснулі раптам нядобрым аганьком. Незнаёмы абмацаў у кішэні браўнінг і на тэй-жа хвіліне гукнуў, адыходзячы крыху ў бок:

— Калі ласка.

Прышоў гаспадар мэбляваных пакояў. Ні-то злосьць на самаго сябе, ні-то самаіронія бліснулі ўваччу незнаёмага і патухлі.

— Можа хочаце заказаць полудзень або чай?—спытаўся гаспадар.

— Не, дзякую. Паперад я думаю прайсьціся паглядзець гораду.

— Будзьце ласкавы... Нашага гораду варта паглядзець, варта... Дык вы ўжо і пойдзеце? То дайце ваш пашпарт для прыпіскі.

— Гэта можна...

Незнаёмы выняў шырокі портманэт, пакорпаўся ў ім і падаў гаспадару складзеную ўчацьвёра паперу. Той разгарнуў яе. У дакуманце стаяла:

„Аляксей Іванавіч Пятроў. Памочнік дырэктара Паўднёва-рускага цырку Лазарэўскага".

Гаспадар папрасіў прабачэньня, што патурбаваў, скланіўся нізка і мякка зачыніў за сабою дзьверы.

— Скаціна!—злосна вылаяўся незнаёмы,—яму зусім ня цікава ведаць—галодны я ці пад'еўшы. Пашпарт, вось што... Калі ласка, вазьмі.

Пайшоўшы пагуляць па горадзе, незнаёмы заблудзіў на Цагельную вуліцу. На рагу яму кінулася ў вочы шырокая шыльда Зусевае майстэрні. Цень усхваляванасьці ці то мо'няўцямнасьці прабег па твары, быццам незнаёмаму падумалася, гледзячы на шыльду:

— Вось якія дзіўныя майстэрні бываюць у гэтых правінцыяльных гарадох. Што ні крок, то дзіўныя нечаканасьці.

Бязуважна ўжо агледзеўшы майстэрню, незнаёмы заварнуўся і пайшоў назад. Вузкім і гразкім завулкам вышаў на рынак, устаноўлены ўвесь сялянскімі фурманкамі.

Ля запрэжанага воза стаяў бедна апрануты селянін. Незнаёмы запытаўся:

— Ці здалёк, дзядзька?

— А ня вельмі... Што хацелі, паночку?

— Ня гукай мяне панам, бо я такі самы, як і ты,—ціха адказаў ён.—З Амэрыкі я прыехаў, бацькоў старых пагледзець, як маюцца.

— О-о-о, браток ты мой... Мусіць-жа добра жыць там, у гэтай Амэрыцы.

— Ня так, каб ужо вельмі добра, ды ня горш, чым тут
— Эге, не гавары, брат, відаць пана па халяўках. Гэта-ты знасіў, корпаючыся тут у гнаі, вечна ў тым поце ді ў гразі?
— Вядома, што Амэрыка не раўня нам.
— То гэта хочаш, каб падвезьці цябе. А дакуль-жа далёка?
— Ды там пад Хорашава,—ведаеш?
— Дзіва што ведаю, я сам з-за Хорашава. Вось тольк кулёк хацеў прадаць... Бяда з гэтымі грашыма, на газу і на тую няма.
— Кулёк не замінацьме ў возе, а я табе заплачу, шт падвязеш.
— То можам і ехаць, вось толькі падаб'ю трохі салому. Во... можна садзіцца.
Незнаёмы сеў і сказаў пад'ехаць к гасьцініцы, куды забег узяць саквояжык і дакумант. На зьдзіўленае гаспадарова запытаньне, чаму ён так хутка зьяжджае, адказаў, заплаціўшы ўдвая:
— Праеду ў суседняе мястэчка. Праз два дні вярнуся назад.
Кладучы саквояжык у воз, фурман заўважыў, ня бачачы больш ніякіх чамаданаў, што звычайна спадарожнічаюць з амэрыканцамі пры іхных пераездах на бацькаўшчыну:
— Гэта і ўсяго рэчаў?
— Не, дзядзька... Багаж яшчэ ня прышоў.
Пры выезьдзе з гораду незнаёмага зацікавіла старая хатка на выгане. Стаяла яна апушчаная, напалову разбураная непагодамі, з пазабіванымі вокнамі і дзьвярыма.
— Ці не ў Амэрыку зьехаў чалавек?—паказваючы пальцам на хатку, ці то сабе сказаў, ці то запытаўся ў фурмана незнаёмы.
— Хто яго ведае. Поўна едуць цяпер у Амэрыку. А вельмі-ж пасьля гэтых бунтаў. Каб ты толькі ведаў, брат, што тут рабілася ў нас. Страх адзін... А гэтыя, дык наўрад ці ў Амэрыку павыяжджалі. Хаты-ж бы не пакінулі гніць, прадалі-б. Паўміралі, мусіць.
— Усё магло быць,—сказаў незнаёмы.
— Ці гэта было. Калі паміраюць людзі сваёю сьмерцю, дык гэта што, так ужо і закон гаворыць, аджыў сваё чалавек; прышоў час, ну і выбірайся на той сьвет. У Амэрыцы, мусіць, ня было таго, што ў нас...
— Ня ведаю, мусіць, не. А што ў вас гэткага нарабілася? Мне вось нічога вельмі ня відаць.

— Эх, што казаць, нарабілася яго чалавеча ты мой, і вельмі поўна, нават залішне, але-ж вось толку таго, дык хоць-бы на парушынку, ні на макава зерня няма. Нездарма кажаш, што ня відаць.

Зьвярнуўшы з шашы на шлях, селянін пачаў:

— Вось туды, пад Хорашава, ёсьць двор Слаўнае, павінен ведаць. Ну, дык вось... А там, у баку, яшчэ стаіць Алескае, а там за Хорашавам, у баку ад мястэчка, Вайніловічаў двор. Там самыя бунты гэтыя былі.

— Чые бунты, хто бунтаваў?—зацікавіўся незнаёмы.

— Мяцежнікі, кажуць, а часьцей дык іх звалі дэмократамі—і цяпер завуць. Калі чалавек такі зухаваты ды разбойны, дык і завуць яго людзі дэмократам... Вось дэмократы сама і гулялі паміж тых трох двароў: Вайніловічавага, Алескага і Слаўнага. Эх, каб ведаў чалавеча, колькі яны псоты нарабілі паном. Доўга будуць чухаць патыліцы. Вайніловічаў двор зусім спалілі, Алескае толькі дыхаць пусьцілі, а Слаўнае драгуны ўратавалі, каб не драгуны, з дымам па ветру пайшло-б і яно.

— Хіба-ж у вас падпальшчыкаў дэмократамі звалі?

— Ды не. Бач, дэмократы падбухторвалі народ супроць паноў, казалі, калі панішчыць паноў і ўсіх багатых, дык народ сам возьме кіравацца, тады наступіць зямны рай. Баялі пра жытку добра, кніжачкі розныя давалі—чыталі пісьменныя. Жудасна ўспамінаць цяпер, якая завіруха была.

— Значыць, дэмократы—добрыя людзі, для народу стараліся

— Хто іх ведае, ухіліўся ад яснага адказу фурман,— толькі ня доўга пабылі яны. А хадзілі дружынаю цэлаю па сёлах, усё народ бунтавалі і запрашалі да іх прылучацца. Паны гвалт ужо паднялі, ні дыхнуць, да ветру ўвечары выйсьці баяліся, каб часам які дэмократ не ўпаляваў. Страх, што рабілася.

Конь паціху ішоў, ня чуючы гаспадаровае пугі. Не браскацелі калёсы, дожджык прыбіў густы летні пыл на шляху,— нішто не перапыняла гутаркі, нішто не перашкаджала аднаму расказваць, а другому з вялікаю цікавасьцю слухаць. А незнаёмы дужа цікавіўся, толькі, апавядаючы, селянін ня вельмі пазіраў на яго і ня бачыў, як мяняецца ў твары амэрыканец, якія балючыя ўспаміны цісн уцца ў яго галаве. Селянін апавядаў аднастайна, цягучым голасам, нібы казку якую:

— А далей нахапіліся драгуны на тое месца, дзе зьбіраліся дэмократы. Ці ня ведалі тыя, ці ўцячы не пасьпелі,— хто іх ведае. А можа думалі, што зваююць салдатаў, як зваявалі стражнікаў, нямала пабілі стражнікаў, дык салдаты-ж—ня стражнікі, ой, не раўня імі І вось нешта такога

цёплага вечару і пачалася гэтая бойка, вярсты тры ад Слаў нага, у панскім лесе. Ну і кажуць, што загінулі там дэмок раты ўсе, бо ўжо вось праз цэлых два гады не ачуваюцц нідзе.

— Усе да аднаго?

— Хто іх ведае, чалавеча, кажуць такі людзі. Але я н ўсё расказаў. Нібы тады з дэмакратамі дый дачка Слаўнаў скага пана загінула—застрэлілі ў бойцы салдаты. А салдата тых ды навяла, кажуць, матка яе—пані, прыгожая такая але-ж вельмі благая, з людзьмі як азіят які. Яны з дачкою цёнгля сварыліся за тых дэмакратаў, ушчувала ўсё дачку пані. Стары пан неяк і ня ўмешваўся ў іхныя сваркі, ал сюд-тут ды за жонкаю цягне... Чаго толькі ня робіцца н сьвеце. Гэта-ж, каб панская дачка ды супроць паноў пайшла падумаць нават боязна. Вось паненка, як даведалася, што драгуноў ды навяла пані-матка, дык адразу з рэвальвэра дый стрэліла ў яе...

— Забіла?

— І цяпер чорт ня бярэ, такая зьмяя, кажуць, што не давядзі госпад... толькі параніла. Пан з паўдвара, мусіць, спрадаў, а яе вылечыў. Дачка-ж уцякла ў лес, каб наказаць дэмократам, што прыехалі іх лавіць драгуны, ды з імі і засталася. Кажуць, кахалася вельмі з адным старэйшым там у іх. Разам і загінулі, за рукі пабраўшыся, ляжалі няжывыя, як агледзелі іх раненька парабкі з Слаўнага, выпраўленыя драгунамі. Ну, пан з паняю сцураліся такое дачкі, і яе разам з дэмократамі загрэблі ў адну яму... Завуць людзі гэтую магілу Дэмакрацкім курганом. Вунь там, пад лесам, калі прыгледзецца добра нізам, адсюль едучы, дык і відаць яго. Вунь, паглядзі туды, калі вочы добрыя маеш,— паказаў пугаўём селянін.

Ня бачыў ён, што незнаёмы сьціскае з вялізнага болю зубы, каб сустрываць, каб не закрычаць немым голасам. Ня бачыў, як наплылі на вочы празрыстыя сьлёзы, і як пахапіўся той, цішком выцер іх белаю хусьцінкаю. Ня бачыў гэтага селянін. А калі азірнуўся, незнаёмы сказаў:

— А цікавы быў у вас бунт.

— У Амэрыцы ня было такога?

— Дзе ты бачыў,—не.

— Вось як. Такі нашая страна мудрэйшая.

Яны пад'яжджалі якраз наўпроці жытняга палетку, за якім пры лесе стаяў славуты курган.

— То спыніся хіба, дзядзька, я зьлезу.

— Дык завёз-бы ўжо—сядзі.

— Нязручна табе будзе. Тут у бок трэба вёрст пяць ехаць. Потым—нядобра варочацца. Я ўжо пеша дайду.

— Ну, як сабе хоч. Я то мог і падвезьці.

— Дзякую... Бачыш, тваё апавяданьне гэтак зацікавіла мяне, што хочацца паглядзець на гэты самы Дэмакрацкі курган.

— Калі так, ды мы-ж трохі пераехалі. Адступіўшы назад крокаў дваццаць сьцежачка будзе ў жыце. Па ёй якраз і выйдзеш пад курган.

Незнаёмы даў селяніну паўрубля, за якога той шчыра падзякаваў, і пайшоў шукаць сьцежкі. А селянін засьпяваў пад нос нудную цягуткую песьню, ціха паехаў далей.

Слабенькі ветрык мяккімі пяшчотнымі хвалямі бег па жыце і там, дзе каціліся гэтыя хвалі, стройна і прыхожа нагіналася жыта каласкамі ды ціха-ціхутка па нечым сумавала. За небасхіл плылі рэдкія хмарынкі, і ўсьцяж усё неба фарбавалася ў сьветлую, гладкую сінь. Праменьне яснага сонца лілося на шлях, на жыты, на шалпоткія бярозавыя прысады. І дождж, нібы спужаўшыся магутнасьці цяпла і яснаты, уцёк некуды далёка-далёка. Сонца перамагала. З кволым ветрыкам у хаўрусе сушылі мокрую зямлю, высушвалі сьлёзы людзкія.

### *НА МАГІЛЕ*

ВЫШАЎШЫ на даўгі роўны шлях, павесялелі дзяўчаты-Патроху пачалі жартаваць настаўнікі, а дзяўчаты адказваць ім жартамі. Колькі таго сонца, здаецца, малюпа сенькае, сьмешнае, а як пашкіляваць можа з чалавека, як балюча здольна пакпіць. Выплішчылася вось, цяплом прыгарнулася да зямлі і як бачыш—цэлая рэволюцыя ў дзявоцкім сэрцы. Любы вось толькі ня тычылася яно. Ня краталі яе ні цяплыня, ні сонечная пяшчотнасьць, як таварышак, сэрца ў яе пад гарачымі променямі летняга сонца было халоднае, як лёд. Яе туга не залежала ад сонца, такую бязьмерную тугу і гора ў сонца сілы мала, каб прагнаць і зрабіць з жалобнае і маўклівае дзяўчыны бывалешнюю бадзёрую, жыцьцярадасную Любу.

Ішла яна ў боку ад таварышак і настаўнікаў, не бяручы ані ўдзелу ў іхняй гутарцы. На яе быццам і забыліся: можа яна тут, а можа і не. Вусны ў яе замкнуліся строгімі, суровымі лініямі.

Жывая дзявоцкая краска зьнікла з іх і ад таго суровасьць яшчэ большая атуляе твар. Вось ідзе павольнаю кабечаю

хадою—дзе падзеўся той спрыт дзявоцкі, дзе тая гарэзасьць і любыя мары бывалешняга. Ня лунаюць яны ў сьветлаясных далях, ня трыпечацца сэрца, адказваючы любым марам. Ці вернуцца ціха-радасныя лятуценьні? Ці ўбачыць сваю маладосьць яшчэ, якая гэтак недарэчна скамячылася бязьлітасным жорсткім жыцьцём, сажматалася, як непатрэбная анучка? Як вялікая самаахвярная пакутніца, забраўшы сабе ўсё гора і сьлёзы людзкія, халодная, гордая ў халоднасьці сваёй, глядзела яна бяздумна перад сабою. Толькі рукі нэрвова сьціскаюць пажоўклы тоненькі сшытачак, на якіх вучні пішуць у школцы дыктоўку.

Час-ад-часу прыпыняецца яна, каб паклікаць сабаку. Мацней накульгваючы, Кіяш падбягае тады і гэткімі разумнымі не-сабачымі вачыма сумна пазірае на Любу. Гэтак пяшчотна, гэтак шкадуючы гладзіць яго Люба—і ідзе паволі-паволі ўперад. Кіяш намагаецца не астацца, але відаць, што цяжка браць даўнейшы спрыт.

І на поваратцы, дзе дарога заломвае і цягне ў слаўнаўскі лес, не агукаецца Люба. Гутарка дзяўчат з настаўнікамі гучыць прыглушаная, як-бы праз туман, з далёкае далі, і сьмех іхны, сьмех ня зусім і вясёлы, такім рэзкім дысонансам урываецца ў яе адчуваньні, калі толькі яны яшчэ ёсьць, калі не закамянелі толькі з халоднага гора. Ні шалпаценьне задуменнае хвалістых жытоў, ні кволы ветрык ня ўзмозе абудзіць яе, закаванае ў кайданы надчалавечага гора.

Падыходзяць да кургану-магілы. Зялёны насып узвышаецца роўна з суседнімі ўзгорачкамі. Нечая турботная рука паставіла вявысокі ў чалавечы пояс крыж. Нешта і напісана было колісь на ім чорнаю булайкаю, але ад дажджу, сонца і часу павыліньвала і цяпер ужо не прачытаць нічога. Паабапал зялёнае, усяе ў траве, магілы расьце пахучая какалуша, прываблiваючы на свае кветачкі дзікіх пчол. У галавах разрастаецца куст шыпшыны. Лёгкакрылы ветрык, з пяшчотамі прылятаючы на курган-магілу, наколваецца на зялёныя іголачкі шыпшыны і з нячутным енкам-уздыхам успыхвае і ляціць далей.

Пры магіле абрываецца гутарка дзяўчат з настаўнікамі. Сьціхаюць як-бы па нейкаму загаду лёгкія бяскрыўдныя жарты і сьмех. Люба становіцца на калены, разгортае на магіле, дзе расьце шыпшына, пажоўклы сшытачак і прытульваецца да яго галавою. Плача... Бяз слоў, бяз гуку. Буйнымі сьлязьмі палівае магілу, каб расла лепш калючая шыпшына.

Паўнурваўшы галовы, ахопленыя бяскрайнасьцю чалавечага гора, стаяць настаўнікі. Непаслухмяна міргаюць вачыма

дзяўчаты—часта-часьценька. Сьляза за сьлязою бягуць па твары, капаюць на магілу-курган. Ад сэрца горны камяк падступаецца к горлу і няма ўжо сілы і жаданьня вытрываць.

Тымчасам па сьцежачцы з жыта выходзіць незнаёмы. Ён бачыць нейкіх людзей і нерашуча спыняецца. Ён думае: „Падысьці ці не?“ Асьцярожнасьць ніколі ня шкодзіць. Але бачачы, што асьцерагацца няма вельмі каго, што два мужчыны і дзьве дзяўчыны стаяць за блізкія сьведкі жанчынінаму гору на магіле, сьмела падыходзіць.

На гук яго крокаў паварочваюць узрокі мужчыны. Даўгі цень ад яго фігуры ўзыходзіць на курган-магілу якраз там, дзе прыпала галавою Люба. Чамусьці спалохана азіраецца яна і жахліва ўзіраецца ў твар незнаёмаму. Ці не пазнаць думае? Кіяш заскігітаў радасна і жалобна разам.

— Люба!—усклікнуў незнаёмы.

— Ах!..—жахліва-радасна адказала толькі яна і ўпала-б на магілу.

Незнаёмы выпусьціў з рук саквояж і капялюш, які скінуў быў ідучы, і падхапіў яе, паставіў на ногі.

— Люба! Дарагая! Вось дзе мы сустрэліся,—скрозь сьлёзы праказваў любоўным голасам ён.

Першыя цяжкія хвіліны прайшлі. Ні з мужчын ні з дзяўчат ніхто ня кінуўся пасабляць незнаёмаму. Дый не патрэбна было. Люба астаялася на нагах. На шчоках пад яснымі праменьнямі сонца іскрыліся ўжо апошнія сьлёзы.

— Выбачайце,—зьвярнулася яна да дзяўчат і настаўнікаў.—Я гэтак расстроілася была ўся з такіх перажываньняў і раптоўнае сустрэчы. Будзьце знаёмы... Мой добры сябра А...

— Аляксей Іванавіч Пятроў!—халодна перапыніў яе незнаёмы і прывітаўся па чарзе з кожным.—Я вельмі змарыўся за дарогу і вельмі прасіў-бы Любу Дарошаўну і вас таксама,—ён кіўнуў галавою да рэшты,—падтрымаць маю прапанову адпачыць у хаце.

— Добра, чаму-ж не,—сказала радасная Люба.

Яна ўзяла сшытачак, скруціла ў трубачку і ўсе гурмаю вышлі на шлях. Настаўнікі з дзяўчатамі пайшлі ўперад, а Люба са сваім спадарожнікам асталіся пазадзе.

— Арон!.. Як гэта нечакана і радасна! Колькі перажыла я за гэтыя два даўжэзныя гады. Цэлы век, век гора, тугі сьлёз,—шчыра прызнавала яна.—Каб ня прышоў ты... Я ня ведаю... Я ня ведаю, што зрабілася-б са мною. Я-б сама на сябе рукі налажыла.

— Навошта... Ну ня трэба ўспамінаць гэтага... Люба!.. Добрая, дарагая Люба! Так я кажу ці не?

Яна нічога не адказала, толькі зірнула на яго, а вочы ледзь-ледзь прыкметна міргнулі аб згодзе.

— Мы будзем таварышамі...—сказаў ён.

— І блізкімі сябрамі,—дадала яна.

— Што гэта за сшытак у цябе?—запытаўся Арон.

— Гэта ягоны... Як быў ён малым яшчэ, дык напісаў і потым аддаў мне. Я сама тады была яшчэ дзяўчынкаю,—першы раз за два гады пачырванеўшы, сказала Люба.—Пачытаеш пасьля.

— Ціха, нехта ідзе насустрач.

— Ды гэта ж Ясь!—угледзеўшыся добра, сказала Люба

— Ясь! А я і не пазнаў цябе,—зарадаваўся Арон.—Вось дык радасныя сустрэчы!

Яны абняліся і моцна-моцна пацалаваліся.

— Ну, брат, не чакаў-жа! Забі—не чакаў. Радасьць на радасьці едзе. Ішоў к Любе, а сустрэў цябе. Няхай жыве рэволюцыя!—упаўголаса крыкнуў ён.

— Ня крычы так, пачуюць,—дакорліва зірнуў на яго Арон.—Што такое важнае ў цябе, што аж пра рэволюцыю закрычаў?

— І да мяне прышоў,—дадала Люба.

— Ды вас сустрэў разам. Дуб уцёк з астрогу!—радасна паведаміў ён.

— Дуб! Дубок наш! Ну, цяпер мы наробім работы. Праўда Люба, Люба. Праўда, Ясь?—пытаўся захоплены ў радасьці заўсёды сур'ёзны Арон.—Дзе-ж ён хаця?

— Хаваецца.

— Добра. Заўтра давайце зьбярэмся.

— Там можна сабрацца—сказала Люба.

— Давайце там. Ля магілы, Ясь, пад вечар.

Зрабіўшы сваю справу, Ясь адвітаўся і пайшоў шырокім крокам наўздагон за пярэднімі.

— А Майзэль дзе, Люба?— папытаўся Арон.

— Ад сухотаў...

— Памёр?

— Памёр у астрозе.

Арон уздыхнуў. Цянёк пахмурны ўзьляцеў на лоб.

— Такі добры таварыш быў.

— Нічога, нас ужо нелапога... Раскажы, Арон, што з табою было?—папрасіла яна такім цёплым любым голасам.

— Нічога асаблівага, пасьля скажу... Так, нас цяпер нямала. Змаганьне ня прыбіта, яно толькі было прыпынілася на часіну, каб сабраць большыя сілы і кінуць іх у бойку!—натхнённа загаманіў Арон, горда падняўшы галаву.—І ты будзеш разам са мною, Люба, як блізкі таварыш, як?..

— Сябра

— На ўсё жыцьцё?

— На ўсё жыцьцё!

Ветраны віхор наляцеў, падхапіў пасмы Аронавых і Любіных валасоў, паблытаў і закруціў у паветры над галовамі.

Прагудзеў пад віхорам звонкі бярозавы шлях. Аблачынкі бялюткія гуляць пайшлі па небе. І сонца марудзіць, спынілася быццам, сыходзіць ня хоча на захад.

Бадзёрыя, прутка ішлі яны звонкім бярозавым шляхам

1926—1929 г.